# энцыклАпедыЯ беларускай папулярнай МУЗЫКІ



2008



# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ беларускай папулярнай МУЗЫКІ

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2008

УДК 78.071.1(476)(031)
ББК 85.313(4Беи)я2
Э68

*Укладальнікі:*
Дзмітрый Падбярэзскі, Генадзь Шостак,
Антон «Арыман» Іонін, Анастасія Прымака, Аляксандра Рогач,
Аляксандр Цыганок, Вольга Брылон, Вольга Палівода, N.N.,
Лілія Камлюк, Максім Жукаў, Павел Юрцэвіч, Севярын Квяткоўскі.

Э68 **Энцыклапедыя беларускай папулярнай музыкі** / Уклад. Дз. Падбярэзскі і інш. — Мінск : Зміцер Колас, 2008. — 368 с.: іл.
ISBN 978-985-6783-42-8

Гэтая кніга — першая ў гісторыі Беларусі спроба сабраць пад адной вокладкай інфармацыю пра асоб і калектывы, якія ў той ці іншай меры засведчылі сябе ў розных стылях і напрамках таго, што можна лічыць папулярнай музыкай. Даведнік, зроблены адпаведна стандартам зборнікаў «Хто ёсць хто», змяшчае інфармацыю пра творчы і жыццёвы шлях выканаўцаў, кампазітараў, паэтаў, прадзюсэраў, кліп-мэйкераў, гукарэжысёраў, выдаўцоў і іншых прадстаўнікоў папулярнай сцэны краіны, а таксама тых, хто нарадзіўся ў Беларусі і працуе цяпер па-за яе межамі.

Зборнік адрасаваны як даследчыкам гісторыі беларускай музыкі і арганізатарам канцэртнага жыцця, так і аматарам папулярнай музыкі.

**УДК 78.071.1(476)(031)**
**ББК 85.313(4Беи)я2**

**ISBN 978-985-6783-42-8**

© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2008
© Дзмітрый Падбярэзскі, канцэпцыя, 2008

# Прадмова

Можна шмат і зацята спрачацца адносна таго, ці існуе ў Беларусі музычны шоў-бізнэс. Аднак калі зыходзіць з таго, што ў краіне ёсць выканаўцы і калектывы папулярнай музыкі, якія ладзяць канцэрты, выдаюць дыскі, даюць інтэрвію сродкам масавай інфармацыі, што на радыё і тэлебачанні існуюць спецыяльныя музычныя праграмы, маюцца сякія-такія музычныя выданні ці асобныя рубрыкі ў многіх перыядычных выданнях, студыі гуказапісу, выдавецтвы, зарганізоўваюцца конкурсы ды фестывалі, нарэшце, прызначаюцца штогадовыя прэміі, пытанне «ёсць шоў-бізнэс ці яго няма» неяк паціху адыходзіць на задні план.

Так, ён ёсць. Не будзем тут абмяркоўваць ягоныя маштабы, якасць, фінансавы патэнцыял і г. д. Дастаткова будзе ўважліва прааналізаваць сабраную ў гэтым даведніку інфармацыю, каб пераканацца, што станаўленне і развіццё айчыннага музычнага шоў-бізнэсу адбываецца незалежна ад меркаванняў і крытыкаў, і саміх выканаўцаў, што гісторыя беларускай папулярнай музыкі налічвае ўжо некалькі дзесяткаў гадоў. Дык няўжо цягам гэтага часу ў нас так нічога й не нарадзілася, так нічога й не адбылося? Гэта не так! Мы маем што аналізаваць, сістэматызаваць. Больш за тое — мы маем багаты матэрыял, які, сабраны разам, здымае многія пытанні адносна таго, «ёсць» ці «няма».

Ідэя сабраць інфармацыю для гэтага даведніка ўзнікла больш за шэсць гадоў таму. Зразумела, асіліць такі аб'ём працы аднаму было заскладана. Некалькі чалавек адразу ж выказалі жаданне дапамагчы ў збіранні інфармацыі, выбраўшы сабе адну з тэм. Але практыка на першых кроках моцна ахаладзіла пачатковы энтузіязм. Аказалася, што: 1) абяцанкі большасці добраахвотных памочнікаў сталіся ўсяго толькі абяцанкамі; 2) такі даведнік менш за ўсё патрэбен самім музыкам: большасці з іх даводзілася нагадваць пра адказ на пытанні анкеты не раз, не два і не тры... Ад некаторых жа адказаў мы так і не дачакаліся.

Вось чаму ў гэтым даведніку напэўна будуць своеасаблівыя «белыя плямы». І калі вы заўважыце, што сярод прысутных тут прозвішчаў і назваў некага бракуе, не вінавацце аўтараў. Інфармацыя пра падрыхтоўку даведніка, анкеты былі раздадзены ці дасланы амаль усім калектывам і музыкам, хто, згодна з канцэпцыяй выдання, заслужыў атрымаць у ім месца. Зрэшты, сусветны досвед у складанні падобных даведнікаў сведчыць, што дасягнуць 100% ахопу магчыма хіба толькі тэарэтычна.

Таму пры напісанні асобных артыкулаў аўтары карысталіся як адказамі на пытанні анкеты, так і звесткамі, здабыванымі з адкрытых крыніц. Паўната ж інфармацыі, што датычыла таго ці іншага выканаўцы альбо калектыву, у канчатковым выніку залежала ад іх уласнага прафесійнага стаўлення да справы. Таму што прафесія музыкі – гэта не толькі выканальніцкае ўменне, але яшчэ здольнасць кантактаваць з грамадствам. І калі музыка ігнаруе падобныя просьбы, калі забываецца, дзе ляжыць прапанаваная анкета, ён дэманструе не толькі непавагу да іншых, а найперш узровень свайго прафесіяналізму.

Канцэпцыя даведніка засноўваецца на ўсведамленні таго, што можна лічыць папулярнай музыкай. Зрэшты, у этага паняцця маюцца два значэнні. Па-першае, папулярная музыка — гэта від музычнага мастацтва, звязаны найперш з камерцыяй. То бок папулярная музыка ў вузкім значэнні – перадусім музыка шлягерная, тое, што мы звыкліся называць «эстрадай», «папсой». У больш шырокім значэнні папулярная музыка — тое, што насамрэч карыстаецца папулярнасцю, няхай нават і не ў самых шырокіх колах. І таму гэта могуць быць некаторыя творы Моцарта і Шапэна, Армстранга і Высоцкага, Русланавай і Коэна. Вось чаму ў гэтым выданні адразу вырашана было разглядаць аўтараў і выканаўцаў папулярнай песні, року, джазу, этна і уолд музыкі, экстрэмальных гатункаў року і эксперыментальнай электроннай музыкі, часткова — выканаўцаў аўтарскай песні з умовай, што яны запісваліся ці выступалі з групамі. Сюды ж патрапілі прадстаўнікі прафесій, так ці інакш звязаных са светам папулярнай музыкі: паэты і кампазітары, аранжавальнікі, гукарэжысёры, кліпмэйкеры, прадзюсэры, мэнэджэры, выдаўцы і г. д. Яшчэ раз адзначым: не ўсе вартыя патрапіць у даведнік прысутнічаюць у ім, але дзве прычыны гэтага былі згаданы вышэй. Адначасова хочацца адзначыць, што дакладнасць выкладзенай тут інфармацыі амаль цалкам ляжыць на сумленні тых, хто даваў адказы на пытанні анкеты.

Умоў для таго, каб трапіць на старонкі даведніка, было тры. Першая: стаж прафесійнай работы — не менш за пяць гадоў. Другая: наяўнасць хоць бы аднаго выдадзенага заводскім спосабам трэку. Трэцяя: наяўнасць лаўрэацкага месца на конкурсе рангам не ніжэй за нацыянальны. Менавіта гэтыя крытэры на самым пачатку падаліся найбольш прымальнымі. Аднак з цягам часу высветлілася, што выдавецкая справа значна пасунулася наперад, што калектываў і выканаўцаў, якія атрымалі магчымасць выдаваць уласныя запісы, з кожным годам усё большае. Маем мы й прыклады таго, як малады калектыў хутка выдае дэбютны альбом

і амаль адразу ж распадаецца. Таму ў наступных выданнях гэтага даведніка (спадзяюся, яны будуць) крытэры адбору, відаць, давядзецца крыху пераглядаць, не чапаючы тых калектываў, якія працавалі у 60-я – 80-я гады мінулага стагоддзя, калі выдаць заводскім чынам хоць бы адну фанаграму было сапраўды вельмі няпроста.

Такім чынам, усе выканаўцы і калектывы размеркаваны ў даведніку ў алфавітным парадку. Калі ў тым ці іншым артыкуле вы сустрэнеце назву калектыву ці імя выканаўцы, пазначаныя курсівам, значыць гэты калектыў ці выканаўца маюць у даведніку асобны, прысвечаны ім артыкул. У якасці дадаткаў да публікаваных тут матэрыялаў змешчаны пералік выданняў беларускіх выканаўцаў такіх фірм, як «Ковчег», «Новая музыкальная компания», «West Records», «БМAgroup», «Vigma», а таксама ўзоры анкет, з дапамогай якіх збіралася патрэбная інфармацыя. Зроблена гэта невыпадкова: кожны з выканаўцаў ці калектываў, якія патрапілі ў даведнік ці жадаюць патрапіць у новыя яго выданні, могуць выправіць недакладнасці, нешта дапоўніць альбо даслаць цалкам новыя звесткі.

І яшчэ: уся гэтая праца будавалася як прыватная ініцыятыва, на безганарарнай аснове. Таму выказваем падзяку ўсім аўтарам скарытсаных здымкаў і просім прабачэння, што не здольныя годным чынам аддзячыць за іх працу. Паверце, нашай мэтай было выдаць сабраныя матэрыялы пра калектывы і асобных музыкаў, большасць з якіх, напэўна, ніколі не дачакалася б хоць бы пару радкоў у каторым іншым энцыклапедычным даведніку. Мы насамрэч зрабілі дзеля іх усё, што маглі. Амаль усё...

*Над слоўнікам працавалі:*

Д.П.— Дзмітрый Падбярэзскі
Г.Ш.— Генадзь Шостак
А.І. — Антон «Арыман» Іонін
А.П.— Анастасія Прымака
А.Р.— Аляксандра Рогач
А.Ц.— Аляксандр Цыганок
В.Б.— Вольга Брылон
В.П. — Вольга Палівода
Л.К. — Лілія Камлюк
М.Ж.— Максім Жукаў
П.Ю. — Павел Юрцэвіч
С.К. — Севярын Квяткоўскі
N.N. — N.N.

*Выказваем падзяку Юрыю Цыбіну, Івану Шумскаму, Юрыю Рагажынскаму, Пятру Марцаву за дапамогу ў падрыхтоўцы і выданні гэтай кнігі.*

# Умоўныя скарачэнні

АМА — Аб'яднанне музычных ансамбляў
АФВіС — Акадэмія фізічнага выхавання і спорту
БАМ — Беларуская акадэмія музыкі, Беларуская акадэмія мастацтва
БДА — Беларускі дзяржаўны ансамбль
БДІНГ — Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі
БДІФК — Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры
БДК — Беларуская дзяржаўная кансерваторыя
БДЛУ — Беларускі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
БДПА — Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія
БДПУ — Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
БДТМІ — Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут
БДУК — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры
БДФ — Беларуская дзяржаўная філармонія
БІНГ — Беларускі інстытут народнай гаспадаркі
БПІ — Беларускі політэхнічны інстытут
БУК — Беларускі ўніверсітэт культуры
ВІЗВР СПВА — Вышэйшая інжынерная зенітна-ракетная вучэльня супрацьпаветранай абароны
ГДУ — Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
ДКАБ — Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі
ДМЛ — Дзяржаўны музычны ліцэй
ДПУ — Дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
ІФК — Інстытут фізічнай культуры
ЛДІК — Ленінградскі дзяржаўны інстытут культуры
МВАІД — Мінскае вытворчае аб'яднанне індустрыяльнага домабудаўніцтва
МДМІ — Мінскі дзяржаўны медычны інстытут
МІК — Мінскі інстытут культуры
ММВ — Мінская музычная вучэльня
ММІ — Мінскі медычны інстытут
ММФР — Маскоўскі міжнародны фестываль рэкламы
МРТІ — Мінскі радыётэхнічны інстытут
МТРК — Міжнародная тэлерадыёкампанія
НДТРК — Нацыянальная тэлерадыёкампанія
РШІМВМ — Рэспубліканская школа-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве
ССМШ — сярэдняя спецыяльная музычная школа
СШ — сярэдняя школа
ЧБВА — Чырванасцяжная Беларуская вайсковая акруга

# А

**АБАЛЯН ІСКУІ (Абалян Искуи, Abalyan Iskui)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару, вядучая музычных праграм і канцэртаў. Нарадзілася 23.12.1970 у г. Бішкеку, Кіргізія. Вучылася ў музычнай школе, Смаленскай музычнай вучэльні па класе тэорыі музыкі (1986–90), скончыла БАМ у 1995 па спецыяльнасці дырыжор хору, выкладчык харавых дысцыплін. Працавала кіраўніком хору ў Магілёўскім ліцэі музыкі і харэаграфіі, салісткай студыі «Ремикс» Магілёўскай абласной філармоніі. У 1996 перамагла на нацыянальным тэлеконкурсе «Зорная ростань». На конкурсе «Памукале 1997» у Турцыі атрымала дыплом FIDOF за значны творчы патэнцыял.



Рэпертуар заснаваны на папулярных песнях, якія выконваюцца на расейскай, ангельскай мовах. Сярод найбольш вядомых песень «Это просто любовь», «Все останется», «Вечная весна», «Твои глаза», «Другая жизнь», «Девушка уходит из дома», «Сердце бьётся».

**Гастролі:** Расея, Украіна, Беларусь.

**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск, 1996), «Золотой шлягер» (Магілёў, 1997, 1998), «Discovery 1998» (Балгарыя).

**Узнагароды:** лаўрэат 3 прэміі і прызу глядацкіх сімпатый Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў «Vilnius 1996», уладальнік Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Золотой шлягер 1997», лаўрэат 1 прэміі Міжнароднага конкурсу песні «Discovery 1998».

**Дыскаграфія: альбом** CD «Другая жизнь» (2006); **трэкі** «Сердце бьётся» (у зборніку «Песня года Беларуси. Песни уходящей осени», 2005), «Другая жизнь» (дуэт з А. Патлісам, у зборніку «Перекрёстки Европы», 2005), «Девушка уходит из дома» (у зборніку «Золотая двадцатка. Весна 2006», 2006).

**Кіно, відэа: кліпы** «Мольберт», «Ночные дожди» (рэж. *Анатоль Вечар*), «Другая жизнь» (рэж. А. Бутар, 2005).

**Кантакт:** drugaya@mail.ru, kalina@tut.by; +375 (29) 645-27-02.

23.10.06//Л.К.

**АБАСАВА ГЮНЭШ (Абасова Гюнеш, Abasova Gunesh)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару. Нарадзілася 02.09.1979 у г. Баранавічы Брэсцкай вобл. У 2000 пачала працу артысткі-вакалісткі ў Тэатры моладзевай эстрады Мінску. Пазней працавала ў дзяржаўным аб'яднанні «Белканцэрт», студыі «Сябры». Ад 2003 – артыстка-вакалістка ў Тэатры моладзевай эстрады. Спявае на расейскай, беларускай мовах. Удзельнік запісу і паказаў праграмы «Радыё Крамбамбуля 0,33».

**Фестывалі:** міжнародны конкурс «Мальвы» (Польшча, 2000), Міжнародны конкурс украінскай песні імя В. Івасюка (Чарнаўцы, Украіна, 2002), міжнародны конкурс «Discovery 2003» (Балгарыя), міжнародны конкурс выканаўцаў сучаснай эстраднай песні «Море друзей» (Ялта, Украіна, 2003), «Славянский базар» (Віцебск, 2005).

**Узнагароды:** прыз глядацкіх сімпатый на міжнародным фестывалі «Мальвы 2000», 1 прэмія міжнароднага конкурсу ўкраінскай песні імя В. Івасюка (Чарнаўцы, Украіна, 2002), 1 прэмія міжнароднага конкурсу выканаўцаў сучаснай эстраднай песні «Море друзей 2003», Гран-пры конкурсу «Янтарная звезда 2003» (Юрмала), 1 прэмія конкурсу маладых выканаўцаў фестывалю «Славянский базар 2005».



**Дыскаграфія:** «Радыё Крамбамбуля 0,33» («West Records», 2004), CD «Гюнешь» («Vigma», 2006).

**Кіно, відэа: кліп** «Время прощаться» (рэж. *Уладзімір Максімкаў*, 2005).

**Кантакт:** www.gunesh.by.ru; +375 (29) 653-77-56.

05.11.06//Д.П.

**АВЕРЫН АЛЕГ (Аверин Олег, Averin Oleg)** – кампазітар, піяніст, вакаліст, аранжавальнік.

Нарадзіўся 19.06.1961 у г. Магнітагорску, Расея. Ад 1968 да 1973 вучыўся ў музычнай школе па класе фартэпіяна. Скончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут (1986). Дэбютаваў у Брэсце ў 1973 як піяніст і саліст аркестру народных інструментаў п/к С. Любчука. У 1974 упершыню выступіў на тэлебачанні з песняй пра Брэсцкую крэпасць. У верасні 1976 стаў асноўным кампазітарам, піяністам і вакалістам групы *«Золотая середина»*, у складзе якой выступаў да распаду калектыву ў 1990. Адначасова, ад 1986 да 1990, выступаў у складзе мінскай групы *«Кондор»*. Ад сакавіка 1993 – піяніст і вакаліст ансамбля *«Песняры»*, са студзеня 1999 – у складзе ансамбля *«Белорусские Песняры»*. Да 2003 выступаў пад прозвішчам Казловіч. Сярод найбольш вядомых песень «Белый пароход» (словы і музыка, група «На-На», 1992), «Зеркальце» (словы і музыка, К. Арбакайтэ, 1996), «Бялявая, чарнявая...» (на народныя словы, 1998), «Ночка цёмная» (1992), «Не люби нелюбимого» (словы і музыка, 2001).

**Гастролі:** у складзе «Золотой середины» – па СССР, Польшчы, ФРГ;



у складзе «Песняроў» і «Белорусских Песняров» – Расея, краіны Прыбалтыкі, Паўночная Карэя, Нямеччына, ЗША, Украіна, Малдова.
**Фестывалі:** у складзе «Золотой середины» – Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі (Наваполацк, 1987) – 1 месца, «Каспий – море дружбы» (Казахстан, 1987), «Парад надзей» (Мінск, 1988) – галоўны прыз, «Sopot» (Польшча, 1991); у складзе «Песняроў» – «Пхен'ян 1993», «Славянский базар» (Віцебск, 1993) і інш.
**Узнагароды:** у складзе «Золотой середины» – лаўрэат 1 прэміі на Рэспубліканскім фестывалі моладзевай музыкі (Наваполацк, 1987), лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі (1987), уладальнік 3 прэміі конкурсу кампазітараў на фестывалі «Sopot 1991» (за песню «Bądz razem z nami»).
**Дыскаграфия: трэкі** ў складзе «Золотой середины» – «Автобиография» і «Слова, слова...» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990); у складзе «Песняроў» – «Pesniary 25» («Philips», Нідэрланды, 1994), CD «Жывём» (аўт. выд., 2000); у складзе «Белорусских Песняров» – гл.; **сольныя CD** «Снег тополей» (2005), «В небе» («Белорусские Песняры Рекордз», 2004), «Чёрный ангел» («Белорусские Песняры Рекордз», 2005), «Запах солнца» («Белорусские Песняры Рекордз», 2006).
**Іншая інфармацыя:** аўтар дзіцячых казак; CD MP3 «Добрые сказки перед сном» («Автокнига», Расея, 2007).
**Кантакт:** www.belpesniary.ru; www.oleg-averin.ru
07.11.07//Д.П.

**АГУРБАШ-ЯЛІНСКАЯ АНЖАЛІКА (Агурбаш-Ялинская Анжелика, Agurbash-Jalinskaja Angelika)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару.
**Дыскаграфія: трэкі** «Бэд бой» (у складзе «*Верасоў*» – у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990); CD «Беларусачка» (2005).
**Кіно, відэа: кліп** «Новогодняя» (рэж. *Уладзімір Янкоўскі*, 2004).
**Кантакт:** www.agurbash.com
01.03.07//Д.П.

**«АКВАРЕЛИ»** – мінская група, утварылася ў 1969 як калектыў інстытуту «Белдзяржпраект».
Выступала складам: Сямён Гафштэйн – рытм-гітара, вакал (→ *«Зодчие»*), Генрыета Угрыновіч – вакал (→ «Зодчие»), Канстанцін Паніхін – сола-гітара, Анатоль Лаўрынаў – арган, баян, Віктар Іўлічаў – бас-гітара, Аляксандр Пітэрман – саксафон, Павел Піткевіч – барабаны, Віктар

Дудараў – гукарэжысёр. У рэпертуары калектыву былі песні на расейскай, беларускай і іншых мовах, песні савецкіх кампазітараў.
**Гастролі:** СССР (Валгаград, Ераван, Вільня, Масква), Чэхаславакія.
20.02.06//Д.П.

**АКСЁНЦАЎ ФЭЛІКС (Аксёнцев Феликс, Felix S. Aksentsev)** – паэт, аўтар тэкстаў.
Нарадзіўся 25.01.1964 у Мінску.
У 1986 скончыў МРТІ па спецыяльнасці «аўтаматычная электрасувязь». У 1996 выехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Ванкувер, Канада, дзе працаваў праграмістам, аналітыкам, праектным менеджэрам.
У 2006 атрымаў міжнародную кваліфікацыю менеджэра праектаў. Вершы пісаць пачаў у сярэдзіне 80-х.
У 1989 зблізіўся з удзельнікамі групы *«Ulis»* і пачаў выступаць як аўтар тэкстаў песень гэтага калектыву, якія, адрозна ад вершаў, пісаў па-беларуску. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Чужаніца», «Калі імпэрыя зьнікне», «Радыё Свабода», «Пляц Францыска», «Кругі па вадзе», «Краіна ў кратах».
**Гастролі:** разам з «Ulis» – Украіна, Польшча, Эстонія, Нямеччына (1990–93), Англія (клубныя канцэрты, 1993).
**Фестывалі:** разам з «Ulis» – «Басовішча» (1990–94), «Музыканты мира детям Чернобыля» (Мінск, 1990), «Рок чистой воды» (Мінск, 1990), «Тры колеры» (Гродна, 1990), «Rock Summer» (Талін, 1991), «Rock-maffia» (Сопат, Польшча, 1991), «29th Sopot Festival» (Польшча, 1992), «Сырок» (Масква, 1990).
**Дыскаграфія:** гл. «Ulis» 1990–2004.



**Кнігі:** зборнікі вершаў «После всего» (Мінск, 1991), «Пустая карта» (Мінск, 1996).
**Іншая інфармацыя:** аўтар Інтэрнэт-старонкі з блогам
www.stihi.ru/author.html?copperlynx;
felix-aksentsev.livejournal.com;
en.wikipedia.org/wiki/Felix_Aksentsev
**Кантакт:** goldenearscanada@gmail.com
24.07.07//Д.П.

**«АКЦЕНТ»** – мінская група, якая выступае ў стылі хард-энд-хэві.
Утварылася ў верасні 1987 на базе студэнцкай філармоніі МІКу. Праз год да калектыву далучыліся музыкі групы «Квинта», і калектыў выступаў наступным складам: Віктар Навумік – гітара, Аляксандр Дунскі – вакал (→ *«Blues Street Friends»*), Ігар Грыб – бас-гітара, Міхаіл Брусаванік – гітара, Павел Арахоўскі – клавішныя, Уладзімір Касаногаў – барабаны. У другой палове 90-х група некаторы час выступала і запісвалася ў Польшчы. Прыпыніла існаванне ў канцы 90-х, аднавіла дзейнасць у 2006. Рэпертуар заснаваны на аўтарскіх песнях, якія выконваліся



на расейскай і ангельскай мовах, у тым ліку «Актёр».

**Фестывалі:** II Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Навапалацк 1988», «Рок-фэст» (Чэхаславакія, 1989).

**Дыскаграфія:** МС «Ветер удачи» (1989).

**Кіно, відэа: кліп** «Воспоминания» (рэж. *Анатоль Вечар*).

**Кантакт:** + 375 (29) 787-50-87 (В. Навумік).

03.03.06//Д.П., фота С. Дзятко.

**«АЛГОРИТМЫ»** – мінскі калектыў, які выступаў у стылі біг-біт і рытм-энд-блюзу.

Утварыўся ў 1966 на базе МРТІ. Першапачатковы склад: Міхаіл Голад – барабаны, Пётр Вярлыга – гітара, Ігар Крупенка – бас-гітара, электраарган, Вячаслаў Ксяндзоў – электраарган, *Яўген Канавалаў* – вядучая гітара, Ларыса Лаўрышкова – вакал, Ленхард Йожэф Томас – вакал. На працягу 1969–71 у калектыве выступалі Уладзімір Бяляеў – гітара, вакал, *Генадзь Старыкаў* – гітара, вакал (→ «2+2», *«Верасы»*), *Яўген Атстаўноў* – бас-гітара, вакал, Яўген Батыркін – барабаны, вакал, Аляксандр Кукоўскі – барабаны. Песні выконваліся на расейскай, беларускай, ангельскай і вугорскай мовах, у рэпертуары былі як аўтарскія творы, апрацоўкі народных песень, так і стандарты заходняй рок-музыкі і блюзу. Менеджэрам калектыву выступаў Яўген Будзінас. Ансамбль спыніў існаванне ў 1971.

**Гастролі:** выступленні ў гарадах Сібіры (Цюменская вобл., 1966, 1967), Расеі, краінах Прыбалтыкі (1967–70), Грузіі (1968).

**Фестывалі:** 1 фестываль моладзевай музыкі ў МРТІ (1968).

**Узнагароды:** 1 месца ў конкурсе ансамбляў на фестывалі моладзевай музыкі ў МРТІ (1968).

**Дыскаграфія:** у Я. Канавалава захаваліся аматарскія канцэртныя запісы групы.



**Кіно, відэа:** дакументальны фільм «Маршрут №13» (рэж. І. Гаско, «Беларусьфільм», 1968).
**Кантакт:** +375 (29) 161-86-39 (Я. Канавалаў).
18.11.06//Д.П.

**«АЛЕГРИАС»** – гітарны дуэт з Мінску, які ўтварыўся ў 1995 і выступае складам: *Сяргей Анцішын* і Аляксандр Церахаў.
У рэпертуары дуэту музыка розных жанраў і стыляў: творы класічнай гітарнай літаратуры, джаз, фламенка, блюз, у тым ліку аўтарскія творы, якія выконваюцца на выразнай імправізацыйнай аснове.
**Дыскаграфія: альбом** МС «Вечерняя самба» («Ковчег», 2000).
**Кантакт:** +375 (29) 614-13-27 (С. Анцішын).
26.02.06//Д.П.

**АЛЕЙНІКАЎ МАКСІМ (Алейников Максим, Alejnikau Maksim)** – кампазітар, аранжавальнік.
**Дыскаграфія: трэкі** «Сахар» (сл. В. Чадзюка), «Сотни километров до любви» (сл. *Леаніда Шырына*), «Песня души» (сл. *Алены Туравай*), «Виноград» (сл. В. Кубышкіна).
01.03.07//Д.П.

**АЛЕН (Ален, Alen)** – спявак, выканаўца папулярнага рэпертуару, аўтар музыкі і тэкстаў.
Нарадзіўся 14.06.1969 у Наваполацку. Сапраўднае імя Сяргей Хамякоў. Па першым часе выступаў у жанры бардаўскай песні, пазней пачаў пісаць папулярныя песні, пасля чаго сам вырашыў прадстаўляць іх са



сцэны. Спявае пераважна на беларускай мове. У канцы 90-х пераехаў на пастаяннае месца жыхарства ў ЗША. Найбольш вядомыя творы «Яна», «Ученица Алиса», «Лёва з Магілёва», «Калі скончылась ноч».
**Фестывалі:** Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Мінск 1995», «Славянский базар» (Віцебск, 1995).
**Узнагароды:** Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў Нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі «Мінск 1995», ІІ прэмія ў конкурсе маладых выканаўцаў фестывалю «Славянский базар 1995».
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Нармалёк» (1995), CD «Толькі сон» (аўт. выд.).
26.02.06//Д.П.

**АЛЕСЯ (Ярмоленка Вольга, Ярмоленко Ольга)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару.
Скончыла БУК. Салістка ансамбля «*Сябры*». Спявае на беларускай і расейскай мовах.
**Дыскаграфія: альбомы** CD «От Алеси до Алеси» (2000), «Алеся» (2000);



МС «Алеся» (1995), «Соперница» (1997), «О главном» («West Records», крас. 2005); **трэкі** «Ваявода» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Сцежачка» (муз. У. Прохарава, сл. *Аляксандра Лягчылава*, у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999).
**Кіно, відэа: кліпы** «Птицы» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2003), «Не потеряй» (рэж. А. Вечар, 2004), «Эх, Ивашка!»
**Кантакт:** гл. «Сябры»; www.alesya.by
03.02.07//Д.П.

**АЛІПАВА ВОЛЬГА (Алипова Ольга, Alipava Volha)** – спявачка, аўтар музыкі і тэкстаў.
Нарадзілася 23.08.1952 у Маскве. У 1974 скончыла Мінскі інстытут замежных моў па спецыяльнасці выкладчык ангельскай мовы. На рокавай сцэне Беларусі дэбютавала ў 1968 як салістка-вакалістка групы «Наследники», з якой працавала да 1969. У 1970 разам з Я. Чаркасавым (бас-гітара, вакал), А. Дзевятковым (барабаны, вакал), *Уладзімірам Угольнікам* (гітара, вакал) прадставіла публіцы ўсю праграму альбому «Abbey Road» групы «Beatles». Годам пазней разам з *Андрэем Казлоўскім* – гітара, У. Гародкіным – барабаны, Я. Чаркасавым і *Валянцінам Пучынскім* – гітара выступала з праграмамі, заснаванымі на рэпертуары альбомаў «Led Zeppelin II», «Rampant» групы «Nazareth», «Machine Head» групы «Deep Purple», «Black Sabbath» і інш. Супрацоўнічала з рознымі музыкамі да 1977, калі ўвайшла ў першы склад групы *«Сузор'е»*, у якой выступала да 1978. Далей была запрошана ў склад групы «Лосвіда» БДФ, у 1980 пачала выступаць у складзе рэстарацыйных калектываў Мінску, у тым ліку ў групе «Планета». У 1989 сабрала першую ўласную групу, у складзе якой былі музыкі будучай групы *«Новый Иерусалим»*. У 1992 у новай групе *«Levee Break»* працавалі: Андрэй Маркуц – гітара (➔ *«Flammable»*, *«НЕО»*), Юрый Цынкевіч – барабаны, *Аляксей Казлоўскі* – бас-гітара, Святаслаў Чарнуха – барабаны, Аляксандр Ганапольскі – гітара, пазней Юрый Фядзюк – бас-гітара. З часам назва калектыву змянілася спачатку на «Twilight», потым – «Ольга и Ко». Ад 1992 да 1994 працавала студыйнай вакалісткай у Маскве, супрацоўнічала таксама з групай «Квартал». Пасля 1998 час ад часу выступала з канцэртамі, у тым ліку ў клубах Прыбалтыкі, з трыо *Аркадзя Эскіна*, дуэтам *Уладзімір*



Ткачэнка – *Віктар Малчанаў*. Адначасова працуе па спецыяльнасці. У творчасьці схіляецца да класічнага хард-року і блюзу. Найбольш вядомыя песні «Twilight», «Sorry For Love».

**Фестывалі:** у складзе групы «Сузор'е» – міжнародны фестываль палітычнай песні «Рыга 1978»; у складзе розных калектываў – «Блюз жыве ў Мінску» (1996, 1997).

**Узнагароды:** у складзе групы «Сузор'е» – лаўрэат 1 прэміі міжнароднага фестывалю палітычнай песні «Рыга 1978».

**Дыскаграфія: трэкі** «Самотны блюз» (у альбоме «Вялікае калі ласка» групы *«P.L.A.N.»* – «БМAgroup», 2004), «Мой путь» (у альбоме «Аэроплан» *Юрыя Міхайлава* – аўт. выд., 2005).

**Іншая інфармацыя:** займаецца графікай, жывапісам.

**Кантакт:** +375 (17) 255-38-38.

09.12.06//Д.П., фота Д.П.

**«АЛМАЗНЫЙ ФРОНТ»** – група з Віцебску, якая ўтварылася ў 1991. Пачаткова выступала такім складам: Эдуард Юдовін – акустычная гітара, вакал, Сяргей Жыгалаў – бас-гітара, Уладзімір Бярэзін – гітара, Андрэй Катачыгаў – блок-флейта, перкусія, Уладзімір Якаўлеў – гітара. Па першым часе група трымалася стылю класічнага року, ад 1993 пазначыўся ўхіл у бок хард-року, 1994–95 – полістыль (рэгей, панк, грандж, ньюуэйв, блюз), 1996–97 – цікавасць да блюзу, лацінаамерыканскай музыкі, рэгей, у 1998–99 – сыход у бок альтэрнатыўнай музыкі. Пасля аднаўлення ў 2003 калектыў выконвае пераважна рэгей. У розныя гады ў калектыве выступалі Павел Сарапеня – барабаны (1992–95), Вадзім «Джым Глюк» Сцепановіч – гітара (1994–99), Людміла Крукоўская – бас-гітара, акардэон, клавішныя (1995–96). На пачатку 2005 група складалася з Э. Юдовіна – бас-гітара, гітара, блок-флейта, вакал, Валянціна Касценкі – барабаны, Аляксандра Угорцына – гітара, Юрыя Грабарава – клавішныя (падчас канцэртаў), Максіма «Кубіка» Гайдукова – бас-гітара. Рэпертуар заснаваны на расейскамоўных і беларускамоўных песнях, сярод найбольш вядомых «Баунти», «Военный», «Права на танцы», «Хавайся ў бульбу».

**Фестывалі:** «Рок-кола» (Полацк/Наваполацк, 1995, 1999, 2000), «Другая вода» (Магілёў, 1995), «Студэнцкая вясна» (Віцебск, 1998, 1999), «Первый белорусский рэггей-фестиваль» (Мінск, 2003), «Второй белорусский рэггей-фестиваль» (2005).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Жизнь в городе без моря» («Ковчег»,

1999), «Солнечный свет» («B.U.T.T. Records», 2006); **трэкі** «Снег на крышах», «Запрещённая» (у зборніку «Первый белорусский рэггей-фестиваль» – 2003), «Братья по разуму» і «Джо любит Джа» (у зборніку «Рэггей восточных славян, вып. 1» – «Новая музыкальная компания», 2005).

**Кантакт:** +375 (212) 23-81-54 (Эдуард); af_suraleb@mail.ru

03.09.06//Г.Ш.

**АЛОЎНІКАЎ УЛАДЗІМІР (Оловников Владимир, Alounikau Uladzimer)** – кампазітар.

Нарадзіўся 16.01.1919 у Бабруйску, памёр у 1996 у Мінску. Скончыў БДК па класах кампазіцыі В. Залатарова і фартэпіяна М. Бергера ў 1941. Выкладчык БДК ад 1947 да 1994, рэктар кансерваторыі ў 1962–82. Прафесар БДК ад 1980. Працаваў у жанрах сімфанічнай, камерна-інструментальнай і вакальнай музыкі, пісаў музыку для драматычных спектакляў і кіно. Сярод найбольш вядомых песень «Радзіма мая дарагая» (сл. А. Бачылы), «Лясная песня» (сл. *Адама Русака*), «Песня пра Брэсцкую крэпасць» (сл. А. Лазнявога), «Песня аб Мінску» (сл. І. Пашкевіча), а таксама сюіта «Песні міру» (1958), араторыя «Партызанскія песні» (1994).

**Дыскаграфія: трэк** «Лясная песня» (вык. *«N.R.M.»*, у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004).

**Кіно:** музыка да мастацкіх фільмаў «Міколка-паравоз», «Дзяўчынка шукае бацьку» (абодва ў суаўтарстве з *Юрыем Бяльзацкім*).

Паводле Белэнцыклапедыі.

**«АЛЬТАНКА»** – трыо з Мінску, якое прытрымліваецца напрамку этнамузыкі.

Утварылася ў 2004 з ініцыятывы даўнейшых музыкаў групы *«Тройца»* Дзмітрыя Лук'янчыка – барабаны, перкусія, вакал і Віталя Шкілёнка – гітара, струнныя, бэк-вакал. Да калектыву далучыўся Аляксандр Джай, выканаўца на кантрабас-домры і бэк-вакаліст (← *«Jitter Band»*).

**Дыскаграфія:** сінгл «Альтанка» (аўт. выд., 2005); **трэк** «Казацкая» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006).

**Кантакт:** +375 (29) 636-34-07 (Д. Лук'янчык).

06.11.06//Д.П.

**«АЛЯКСАНДРА І КАНСТАНЦІН»** – вакальна-інструментальны дуэт з Барысава.

Утварыўся ў кастрычніку 1998 складам: Аляксандра Кірсанава (22.05.1980, Барысаў, студэнтка аддзялення мастацтва эстрады БДУК) – вакал, аранжаванне, флейта, акарына, перкусія, Канстанцін Драпеза (11.03.1972, Барысаў, выпускнік геафаку БДУ) – гітара, аранжаванне. Дуэт пачынаў з выканання стандартаў музыкі кантры і джазу на ангельскай мове, пазней стаў выконваць беларускія народныя песні ўласных апрацовак. Дэбютаваў 19 лістапада 1998 у мінскім «Стар-клубе». У чэрвені 2002 запрошаны ў склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі* як самастойная творчая адзінка. Вышлі са штату аркестру ўвосень 2007. Першымі з беларускіх артыстаў у 2004 удзельнічалі ў міжнародным конкурсе «Еўрабачанне». Найбольш папулярныя песні «Stairs Of




Separation», «Мой Галилей», «Пчолка», «Рана на Івана».

**Гастролі:** выступленні ў Расеі, Польшчы, Украіне, Нямеччыне, Турцыі, Літве, Эстоніі, Латвіі, Македоніі; Польшча, Балгарыя (2005), Казахстан (2006).

**Фестывалі:** Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна 2001, 2003», «Ethnosfera» (Скернявіцы, Польшча, 2002), «Славянский базар 2002», «Folk fest» (Остраў Велькапольскі, Польшча, 2002), Міжнародны конкурс маладых выканаўцаў імя В. Івасюка (Чарнаўцы, Украіна, 2002), сольны канцэрт у Этнаграфічным музеі Варшавы (2002), Міжнародны конкурс казахскай песні «Астана 2003», «Сярэднявечны Нясвіж» (2003), «Shanty Music» (Пайдэ, Хаапсалу, Эстонія, 2003), Дні культуры Беларусі ў Нямеччыне (2003), сольныя канцэрты ў клубе «Stodola» (Срэбрна Гура, Польшча), «Festiwal Wyszechradzki» (Вроцлаў, Польшча), «Winobranie» (Зялёна Гура, Польшча), Дні культуры Беларусі ў Маскве (2003), «Еўрабачанне 2004» (Стамбул, Турцыя), Дзень незалежнасці Украіны (Львоў, 2004), «Palangos Gaida» (Паланга, Літва, 2005), «Discovery» (Варна, Балгарыя, 2006).

**Узнагароды:** 3 прэмія ў конкурсе на фестывалі «Ethnosfera 2002», 2 прэмія конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Славянский базар 2002», уладальнікі прэміі за лепшае аранжаванне песні сваёй краіны і званне лаўрэата Міжнароднага конкурсу казахскай песні «Астана 2003», II прэмія ў конкурсе фестывалю «Discovery 2006».

**Дыскаграфія:** CD сінгл «Александра и Константин» (дэма, аўт. выд., 2000), **альбомы** «За ліхімі за марозамі» (аўт. выд./«Ковчег», 2001), «Сойка» (аўт. выд., 2003), «Мой Галілей. Лепшае» («West Records», 2004), «Аўтаномная навігацыя» («West Records», 2006).

**Кіно, відэа: кліпы** «My Galileo» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2004), «Мой Галилей» (рэж. М. Носаў, 2004), «Пара дамоў» (рэж. А. Вечар, 2004), «Пчолка» (2003, рэж. В. Свіягін, В. Сафонаў), «Святы вечар» (рэж. С. Маеўскі, 2004). «Stairs of Separation» (рэж. С. Маеўскі, 2005), «Рана на Івана» (рэж. С. Дзмітрэнка, 2006), «The Money & The Mountains» (рэж. С. Маеўскі, 2007).

**Іншая інфармацыя:** увосень 2007 пабраліся шлюбам; А. Кірсанава захапляецца жывёламі (сабакі, каты, коні), кветкамі і падарожжамі, К. Драпеза – падарожжамі.

**Кантакт:** a_and_k@tut.by; www.alexandrakonstantin.com

20.09.07//Д.П.

**АЛЯХНО РУСЛАН (Алехно Руслан, Aliakhno Ruslan)** – спявак, выканаўца папулярнага рэпертуару.
Нарадзіўся 14.10.1981 у Бабруйску. Скончыў музычную школу па класе фартэпіяна, засвоіў ударныя, падчас навучання ў аўтатранспартным каледжы выступаў у складзе групы, пазней – як саліст-вакаліст ансамбля рэстарану «Белая Русь». Па сканчэнні каледжу часам службы ў войску цягам чатырох гадоў выступаў салістам ансамбля песні і танца Узброеных сіл Беларусі. Удзельнічаў у расейскім тэлепраекце «Народный артист». Спявае на расейскай мове. Сярод найбольш вядомых песень «Звёздный дождь» (муз. *Генадзя Маркевіча*, сл. Ф. Баравога).
**Фестывалі:** «Виват, победа!» (Расея), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна», «Золотой шлягер» (Магілёў, 2003), «Мальвы» (Польшча, 2004). «Славянский базар» (Віцебск, 2005).
**Узнагароды:** Гран-пры на фестывалі «Виват, победа!» (Расея), лаўрэат Нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі ў Маладзечна, конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Золотой шлягер» (Магілёў), лаўрэат II прэміі міжнароднага конкурсу «Мальвы 2004», пераможца тэлеконкурсу «Народный артист 2004», I месца ў конкурсе патрыятычнай песні «Это Родина моя» (Расея, з песняй «Дом родной», сумесна з А. Гоманам).
**Кіно, відэа: кліп** «Необыкновенная» (2005).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Балалайка» («Родина Рекордз», 2005), «Рано или поздно» («Родина Рекордз», 2005); **трэкі** ў зборніках «Мальчишник» («Родина Рекордз», 2006), MP3 «Народный артист» («Родина Рекордз», 2005).
**Іншая інфармацыя:** захапляецца тэхнікай, аўтамабілямі, уладальнік зялёнага пояса па каратэ.
**Кантакт:** www.alehno.ru
16.04.06//Д.П.

**АНЕМПАДЫСТАЎ МІХАЛ (Анемподистов Михал, Anempadystau Michal)** – паэт, мастак-графік.
Нарадзіўся 16.03.1964 у Мінску. У 1983 скончыў Мінскую мастацкую вучэльню, ад 1985, пасля службы ў войску, пачаў працаваць вольным мастаком у галіне станковай графікі і плакату. У 1989–91, 1993–95 – мастацкі рэдактар часопісу «Бярозка». Аўтар тэкстаў песень для *Касі Камоцкай*, пачынаючы ад першага альбому *«Новага Неба»*. Аўтар ідэі, канцэпцыі і большасці тэкстаў песень супольнага музычнага праекту «Народны альбом» (1996), які быў прызнаны адной з дзесяці найбольш яскравых падзей у галіне культуры ў Польшчы за 1998 (паводле «Газэты выборчай»). Выступаў з персанальнымі выставамі графікі у Польшчы, Даніі, Нямеччыне. Ад 1997 сябра Саюзу дызайнэраў, працуе ў галіне графічнага дызайну, мастацкай фатаграфіі і станковай графікі, аўтар шматлікіх спеўных тэкстаў і п'есы «Народны альбом» (у суаўтарстве з *Лявонам Вольскім*). Аўтар плакату групы *«Бонда»*, вокладак альбомаў «Чужаніца» групы *«Ulis»*, «Go home» і «Cepeliny» групы «Новае Неба», «Дом культуры» групы *«N.R.M.»*, «Партызанская школа», «Танга з ружай», «Песьні з доўгай шуфляды» *Зміцера Вайцюшкевіча*, «Народнага альбому» (разам з Уладам



Казаноўскім) і інш. Сярод найбольш вядомых твораў: тэксты песень для «Новага Неба» – «Мая краіна», «Чаканьне калядаў», «На нашай вуліцы», «Цудоўны вечар», «Падае снег», «Цэпэліны»; тэксты песень для групы «N.R.M.» – «Лалалала» і «25, 26, 27 нармальна»; «Сьвятло ў цемры» і «Схаванае сэрца» – для групы *«IQ48»*. Пераклаў на беларускую мову тэксты польскіх груп «Republika», «Chlopcy z placu Broni», «Maanam», «Perfekt».

**Гастролі:** прадстаўленне «Народнага альбому» ў Польшчы (тройчы), Францыі, Украіне, удзельнік канцэрту «Solidarni z Białorusią» у Варшаве (сакавік 2006).

**Узнагароды:** «Рок-карона 1997» у намінацыях «Альбом году» («Народны альбом») і «Лепшыя тэксты».

**Дыскаграфія:** «Народны альбом» («Ковчег», 1997); **трэкі** «Падае снег», «Крот 2», «Электарат», «Цемра» – у альбоме К. Камоцкай і групы «Новае неба» «Go Home» («Ковчег», 1995); «Сьнежань, студзень, люты», «Чаканьне калядаў» – у зборніку «Калядныя песьні» («Ковчег», 1995); «Мая краіна», «Падводнае гета», «Болек і Лёлік», «Чаканьне калядаў» – у альбоме К. Камоцкай і групы «Новае неба» «Мая краіна» («Ковчег», 1996); «Вакно», «Мая краіна», «Чаканьне калядаў», «Здаецца», «Падводнае гета» – у зборніку К. Камоцкай і групы «Новае неба» «Песьні розных гадоў» («Ковчег», 1999); «Цэпэліны», «Начная варта» – у альбоме К. Камоцкай і групы «Новае неба» «Цэпэліны» («Ковчег», 1999); песні ў зборніках К. Камоцкай «The Best. Лепшае» (2005), «Акустыка» («БМAgroup», 2005), «Цэпэліны» – у альбоме групы *«Indiga»* «Дні» («БМAgroup», 2004).

**Кіно, відэа:** тэлеверсія «Народнага альбому» ў кракаўскім Барбакане.

**Кнігі:** зборнік вершаў «Атэкстацыі» («Ковчег», 1998), п'еса «Народны альбом» (сумесна з Л. Вольскім, перакл. на польскую мову Аліны і Міколы Ваўрэнюкоў, «Kartka», Беласток, 2000).

**Кантакт:** +375 (29) 653-80-12.

02.10.06//Д.П., фота Ю. Дарашкевіч.

**«АНЖЕЛИКА»** – гл. *Ют Анжаліка.*

**АНІШЧАНКА «АНІСА» СЯРГЕЙ (Анищенко «Аниса» Сергей, Anishchanka Siarhey)** – вакаліст, гітарыст, прадзюсэр.

Нарадзіўся 24.11.1963 у Наваполацку. У 1983 скончыў СПТВ-28 і паралельна – Смаленскую мастацкую вучэльню па спецыяльнасці мастак-афарміцель. Дэбютаваў як бас-

гітарыст і вакаліст у 1978 у складзе групы «Scale», у 1982–85 выступаў як гітарыст і вакаліст у складзе групы «Поиск». Ад 1987 да 1992 выконваў абавязкі дырэктара Наваполацкага рок-клубу, уваходзіў у склад мясцовых калектываў «Поиск» (1986–87), «Рокаш» (1988), «Кадэцкі корпус» (1989–90), «Грунвальд» (1991–92), працаваў як адміністратар з групай *«Мясцовы час»*. Ад 1990 і да гэтага часу – дырэктар рок-фестывалю «Рок-кола». Пасля закрыцця рок-клубу арганізаваў творчую майстэрню «Зьніч» (1993), якая й праводзіць «Рок-кола», дзіцячы рэспубліканскі фестываль «Халі-Хало», паказвае музычныя спектаклі, ладзіць канцэрты.

**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск 1999–2001 як вядучы канцэртаў «Рок апоўначы»), «Жемчужина Черного моря» (Феадосія, 1995), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1993).

**Дыскаграфія:** у складзе групы «Поиск» – 2МС «Наш абавязак заставацца жыць» («БМAgroup»), у складзе групы «Грунвальд» – МС «Старыя назовы» («БМAgroup»), сольныя МС «Сівізна на скронях» (1993), «Добрыя людзі, пусціце пагрэцца» (1994), «Ахрысціў мяне нехта» (1995), «Салёны вецер» (1997, усё – аўт. выд.), CD «Ночной капитан» (1998), «Мне сніўся сон» (2001), CD каталіцкіх песень «Царства любові» (2000, у дуэце з Т. Малухінай), CD «Е-міграцыя, альбо Гульня на звонкі» (1998), «Гедымін» (рок-опера, 2002).

**Кантакт:** www.anisa.by.ru; +375 (214) 51-74-14, 55-13-85 (клуб «Night City»), +375 (29) 714-93-87.

11.08.06//Д.П.

**АНЦІШЫН СЯРГЕЙ (Антишин Сергей, Antsishyn Siarhei)** – гітарыст, аранжавальнік.

Нарадзіўся 07.06.1964 у Мінску. Вучыўся ў МІКу (1985–88), выступаў як лідэр джазавага квартэту. Прафесійную кар'еру пачаў музыкам студыі *«Песняры»* ў 1987, ад 1988 з перапынкамі – вядучы гітарыст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Адначасова супрацоўнічаў з джазгрупай *«Apple Tea»*, групамі *«Сестра» Аляксея Шадзько* і *«Flat»*, Ю. Антонавым, выступае ў складзе гітарнага дуэту *«Алегриас»*, групы *«Acoustic Band»*. У рэпертуары – творы джазавай і рок-музыкі, кантры, фламенка.

**Фестывалі:** «Славянский базар» (неаднаразова, Віцебск), «Золотой шлягер» (Магілёў), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі (Маладзечна).

**Дыскаграфія:** у складзе групы «Сестра» – гл. 1998–2007; у складзе «Алегриас» – МС «Вечерняя самба» («Ковчег», 2000); сола «Прочти любовь» (2007).

**Кантакт:** +375 (29) 614-13-27.

25.05.07//Д.П.

**«АПОТОМ»** – мінскі калектыў, які, з уласнага вызначэння музыкаў, выконвае музыку для людзей у добрым стане духу.

Карані калектыву сягаюць 1992, калі пачалі супрацоўніцтва Канстанцін Жукаў і Кірыл Папакуль. Пазней да іх далучыліся Сяргей Севярынаў, Аляксандр Тыкун, DJ Гнев і іншыя. Склад калектыву неаднаразова змяняўся, у групе выступалі барабаншчык Аляксей Волкаў (→ *«Postscriptum»*, *«Нео»*, *«Клёндайк»*), піяніст *Дзяніс Варанцоў* (→ «Мантана», *«J:морс»*),

гітарыст *Андрэй Дзяменцьеў* (→ *«Калі Юга», «Flat», «P.L.A.N.»*). Назва «Апотом» замацавалася ў 2000. На пачатку 2006 група складалася з К. Папакуля, С. Севярынава, К. Жукава, А. «Волка» Волкава, «Дзешы», А. Тыкуна. У рэпертуары калектыву – песні на беларускай і расейскай мовах, сярод найбольш вядомых «Песня сапраўднага каўбоя», «Подружка». Група існуе практычна цалкам у віртуальнай прасторы, таму з канцэртамі амаль не выступае.

**Дыскаграфія: трэкі** «Развод мостов» (у зборніку «Ультра Хит», Расея); CD «Там посмотрим» (2001), «Вот-вот» (2003).

**Кантакт:** www.apotom.tk; zhuk76@inbox.ru; papacool@inbox.ru

16.04.06//Д.П.

**«АРГОНАВТЫ»** – мінская група, якая ўтварылася на пачатку 1970 і трымалася стылю арт-року, класічнага року.

У складзе калектыву выступалі: *Уладзімір Спірыдовіч* – лідэр, гітара, вакал, (← *«Весёлые лисы»* → *«Время»*), Леанід Кладухін – бас-гітара, вакал, Эдуард Петрашкевіч – скрыпка, Вячаслаў Ярэй – барабаны. Рэпертуар засноўваўся на песнях груп «Bee Gees», «Electric Light Orchestra», «Rolling Stones», а таксама на ўласных расейскамоў-ных творах пераважна аўтарства У. Спірыдовіча. Група першай у Беларусі пачала практыкаваць выступленні з камерным струнным ансамблем. Спыніла існаванне ў 1974.

**Фестывалі:** рок-фестываль (Мінск, 1971).

**Узнагароды:** 1 месца ў конкурсе рок-фестывалю (Мінск, 1971).



**Кантакт:** +375 (29) 362-34-77 (У. Спірыдовіч).

25.02.07//Д.П.

**АРЛОЎ УЛАДЗІМІР (Орлов Владимир, Orlov Uladzimir)** – рэжысёр кіно і тэатру, пісьменнік, паэт.

Нарадзіўся 06.01.1938 у г. Баку, Азербайджан. У 1963 скончыў рэжысёрскі факультэт БДТМІ па спецыяльнасці



рэжысёр-пастаноўшчык. Працаваць у кіно пачаў як памочнік рэжысёра, затым асістэнт рэжысёра ў 1956, ад 1963 стаў працаваць у ТА «Тэлефільм» Беларускага тэлебачання як рэжысёр-пастаноўшчык. Усяго зняў каля 100 дакументальных, мастацкіх стужак, а таксама фільмы-канцэрты. Сцэнарыст і вядучы тэматычных праграм-канцэртаў «Вместе с Утёсовым», «Дюк Эллингтон» і інш. Аўтар тэкстаў многіх папулярных песень, у тым ліку «На рассвете» (кінафільм «Любимая»), «Дом мой, столица», цыкл «Помню» (усё – на муз. *Яўгена Глебава*), тэксты песень для рэвю «Этот долгий короткий час», «Краски мира» (усё – на муз. *Васіля Раінчыка*), «Вы домой, журавли» (муз. Дз. Смольскага), «Солнечный вальс», «Ищу своё эхо», «Трубачи, трубачи» (усё – на муз. Я. Грышмана) і інш.
**Фестывалі:** удзельнік шматлікіх кінафестываляў.
**Узнагароды:** лаўрэат многіх кінафестываляў.
**Дыскаграфія: трэкі** «Немое кино» (муз. В. Раінчыка, у EP ансамбля *«Верасы»* – «Мелодия», 1978, у LP «Верасы»– «Balkanton», Балгарыя, 1978).
**Кіно, відэа:** фільмы «Чаму ж нам не пець» (1968), «Песняры» (1971), «Верасы» (1976), «Этот долгий короткий час» (фільм-канцэрт, 1977), «Ты – одна любовь» (ансамбль «Сябры», 1980), «И песня взлетает сама. Владимир Оловников» (1982), «А также цирк» (фільм-канцэрт, 1983), «Купалінка» (ансамбль «Купалінка», 1983), «Комедиант» (з музыкай *Уладзіміра Мулявіна* і *Дзмітрыя Яўтуховіча*, 1987), «3000 песень. Генадзь Цітовіч» (1986), «Свята» (ансамбль «Свята», 1988), «Отрывки из ненаписанного» (Я. Глебаў, 2000), «Як пайду я дарогаю» (М. Дрынеўскі, 2002), тэлесерыял «Этот проклятый уютный дом» (з муз. У. Солтана, 1998) і інш.
**Кнігі:** «Закадровые истории фильма «Вся королевская рать» («Ковчег», 2002), «Магия белого экрана» («Беларусь», 2002), аповесць «Детство с грушкой» (прысвячэнне У. Мулявіну, «Нёман», 2004), «Их портрет с обречённым императором» («Харвест», 2005).
**Кантакт:** +375 (17) 203-12-34, www.kvervi.com; orlovy@mail.by
01.04.07//Д.П.

**«АССА»** – група з Брэсту, якая ўтварылася ў 1996 і працуе ў стылі рок-н-ролу з элементамі блюзу, фанку і хард-року.

Першапачатковы склад: Юрый Кавалёў – гітара, вакал, Алег Ланец – бас-гітара, Дзмітрый Мікулік – гітара,



Віктар Дарапей – барабаны. У канцы 2006 у калектыве выступалі Ю. Кавалёў, А. Ланец, Канстанцін Марчук – гітара (← 2003), Алег Грода – барабаны (← 2003). Рэпертуар заснаваны на аўтарскіх песнях, якія выконваюцца на расейскай мове.

**Дыскаграфія: альбом** CD «Канатоходцы» (аўт. выд., 2005); **трэк** «Цветы» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», 2006).

**Кантакт:** navigator69@mail.ru; +375 (29) 721-78-69 (Алег), (29) 797-86-96 (Канстанцін).

14.10.06//Г.Ш.

**АТМАРАВІ (Атморави, Atmoravi)** – аўтар музыкі і тэкстаў, выканаўца на клавішных і гітары, спявак. Сапраўднае імя Аляксей Новікаў. Нарадзіўся 03.05.1974 у Мінску. Паступіў на філфак БДУ, кінуў вучобу на першым курсе. У 1995 самастойна стварыў і запісаў дэбютны альбом, пасля чаго выступаў у складзе групы «Аригато», ад 2003 займаецца сольнай кар'ерай, працуючы ў стылі электра-року. Выступіў з шэрагам клубных канцэртаў у Расеі, Украіне, Беларусі, Нямеччыне, часта выступае ў Беларусі і Украіне з канцэртамі-кватэрнікамі. Арганізатар канцэртаў расейскай групы «Аквариум» у Нямеччыне (1999, 2000). У 2006 песня «Твоя валюта» трапіла ў Інтэрнет-праграму кампаніі «Coca-cola» – «Coke on iTunes Podcast». Сярод найбольш вядомых песень, якія выконваюцца пераважна на расейскай мове: «Симферополь», «На ощупь».

**Гастролі:** тур па Беларусі (2006).

**Фестывалі:** «Deutche Jugend Europa» (Берлін, жнівень 2004), «Русский



акцент» (Нямеччына, 2004), выступы у клубах «Китайский летчик Джао Да» (Масква, снежань 2004), «МеццоФорте», «Матрица» (Масква).

**Узнагароды:** «Рок-карона 2006» у намінацыі «Рок-выканаўца году» (альбом «Романтика»).

**Дыскаграфія: альбомы** CD у складзе «Аригато» – MC «Апрельской ночью» (канцэртны, аўт. выд., 1997), «Цейлон» (аўт. выд, 1999), «Жизнь под облаками» (аўт. выд., 2001); сола «Черника» (аўт. выд., 1995), «Чертополох» (аўт. выд., 2004), «Романтика» («West Records», 2006); запіс жывога канцэрту на Інтэрнэт-партале «Liveradio.ru» (Масква, чэрв. 2006).

**Кіно, відэа: кліп** «Эфир» (рэж. М. Сіры, 2006).

**Кантакт:** www.atmoravi.net; live@atmoravi.net; atmoravi.livejournal.com

01.03.07//Д.П.

**АТСТАЎНОЎ ЯЎГЕН (Оставнов Евгений, Otstavnov Eugene)** – бас-гітарыст, вакаліст. Нарадзіўся 14.07.1950 у Мелітопалі

Запарожскай вобл., Украіна. У 1973 скончыў МРТІ. Музыкай пачаў займацца, калі вучыўся ў сярэдняй школе. У 1968 увайшоў у склад групы *«2+2»*, але неўзабаве, пасля паступлення ў інстытут, стаў удзельнікам ансамбля *«Алгоритмы»*. У 1971 пачаў выступаць як удзельнік групы *«Эльфы»*. У сярэдзіне 70-х адышоўся ад актыўных заняткаў музыкай.
**Кантакт:** +375 (29) 370-10-81, (29) 774-22-50.
07.09.03//Д.П.

**«АФАЗИЯ»** – група з Магілёву, трымаецца стылю хард-року. Утварылася ў 1995. У 2005 у складзе калектыву выступалі: Фёдар Трухачоў – гітара, Міхаіл Трухачоў – барабаны, Аляксандр Назаровіч – гітара (← 2005).
**Кіно, відэа: кліпы** «Я живой!», «Странник», «Нам нужна одна победа» (рэж. Ф. Трухачоў, 2005).
18.11.06//Д.П.

**АФАНАСЬЕВА ІНА (Афанасьева Инна, Afanasieva Inna)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару. Нарадзілася 23.10.1968 у Магілёве. У 1978 пачала заняткі ў дзіцячым эстрадным калектыве «Радуга» Магілёўскага палацу піянераў і школьнікаў. У 1987 перамагла на Рэспубліканскім конкурсе папулярнай маладзевай музыкі ў Наваполацку. Праз год удзельнічала ў конкурсе маладых выканаўцаў Усесаюзнага фестывалю польскай песні ў Віцебску, пасля чаго атрымала запрашэнне працаваць у *Дзяржаўным канцэртным аркестры Беларусі*. У 1990 скончыла Магілёўскую вучэльню культуры па класе харавога дырыжавання. Да сольнай кар'еры падалася ў 1996. Ад 1995 – арганізатар дабрачынных канцэртаў, прысвечаных Дню абароны дзяцей. У 1996 зрабіла тур па 22 гарадах Беларусі. У 2000 узначаліла ўласны творчы калектыў, а годам пазней выправілася ў чарговы тур па абласных і раённых цэнтрах Беларусі.
У 2002–03 выступала як вядучая забаўляльных праграм тэлеканалу СТВ. Шэраг твораў запісаны ў дуэце з *Валерыем Дайнэкам*, *Дзмітрыем Смольскім*. Найбольш вядомыя песні «Сбудется – не сбудется», «Зеркала», «Жемчуга».
**Гастролі:** Польшча (1999).
**Фестывалі:** Усесаюзны конкурс польскай песні «Віцебск 1988», конкурс эстраднай песні «Зялёна Гура 1989», «Славянский базар» (неаднаразова), фестываль папулярнай музыкі ў Нідзе (Літва, 1994), «Браціслаўская ліра 1995».
**Узнагароды:** лаўрэат 1 прэміі Рэспубліканскага конкурсу моладзевай музыкі «Наваполацк 1987», 3 прэміі ў конкурсе Усесаюзнага фестывалю



польскай песні «Віцебск 1988», 2 прэміі конкурсу на фестывалі «Славянский базар 1992».
**Дыскаграфія: альбомы** – CD «Инна Афанасьева» (2000), «Жемчуга» («West Records», 2003); **трэкі** «Все цветы июля» (у альбоме «Всесоюзный фестиваль польской песни» – «Мелодия», 1989), «Чёрный ветер», «Осенний дождь» (у альбоме *Валерыя Галаўко* «Исповедь» – аўт. выд., 1999), «Я буду петь» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Найди себя» (муз. *Алега Молчана*, сл. *Аляксандра Лягчылава*, у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999).
**Кіно, відэа: кліпы** «Сбудется – не сбудется»(1995), «Спелая любовь».
**Кантакт:** www.afanaseva.by; + 375 (29) 660-01-38 (менеджмэнт, Анжаліка).
03.09.06//Д.П.

**«АЦЕТИЛЕН»** – гомельская панк-група.
Утварылася восенню 1997 і першапачаткова выступала наступным складам: Сяргей Салаедаў – вакал, Аляксандр «Чуля» Чулікаў – гітара, Віталь Жук – бас-гітара, Мікалай Сядляраў – барабаны. У 2001–03 на барабанах часова паперамення гралі Аляксей Балотнікаў і Дзяніс «Сенатар» Сянатаў. У 2002 на месца В. Жука прыходзіць Дзяніс Куллікаў (адначасова «Оркестр ритуальных услуг»).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Панк-рок без купюр» (1998), «Всему п...ц, или 4» (1999), «Посрать на гениев!» (2003), «Не попса!» (2004).
8.11.06//Д.П.

**«ACOUSTIC BAND»** – мінская група, якая ўтварылася ў жніўні 2004 дзеля выканання інструментальнай музыкі.
У склад групы ўвайшлі вядомыя выступленнямі ў іншых калектывах музыкі: *Сяргей Анцішын* – гітара (адначасова *Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі*, *«Сестра»*, «Gee-teeks» і інш.), *Аляксандр Ванкевіч* – бас-гітара (адначасова «Green Card», *«Крама»* ← *«Верасы»*, *«Blues Street Friends»* і інш.), Аляксандр Абухоў – гітара («Blues Street Friends»), *Вячаслаў Булда* – барабаны (адначасова *«Гаер»*, «Green Card», «Сестра», ← «Песняры», «Blues Street Friends» і інш.). У рэпертуары калектыву – кавер-версіі і аўтарскія аранжаванні вядомых песень і мелодый у розных стылях: фламенка, фанк, лаціна і інш., што выконваюцца ў акустычным варыянце, а таксама аўтарскія творы. Група пастаянна выступае ў мінскіх клубах і рэстарацыях.
**Дыскаграфія: альбом** «Red Sunset» (канцэртны, аўт. выд., сакавік 2005).
**Кантакт:** acousticband.narod.ru; +375 (29) 631-89-53 (А. Ванкевіч).
05.04.07//Д.П.

**«AL NARRATOR ORCHESTRA»** – гомельскі калектыў, які трымаецца стылю класічнага блюзу.
Утварыўся ў 1994. Пачаткова выступаў пад назвай «Кофейные разговорчики», пазней – «Narrator». У першым складзе групы выступалі: *Аляксандр Цыганок* – вакал, гітара, Віктар Іваноў – гітара, Уладзімір Грамма – клавішныя, Аляксей Хадановіч – барабаны, Аляксей Зайцаў – бас-гітара. У розны час



у складзе калектыву выступалі *Аляксандр «Софікс» Сафонаў* – барабаны, перкусія, Валерый Кобызеў – гітара і інш. Аснову рэпертуару складаюць кавер-версіі стандартаў класічнага блюза, аранжаваныя ў стылі дэльта-блюзу, гарадскога блюзу і музыкі зайдэку. Песні выконваюцца на ангельскай і расейскай мовах. У канцы 2005 група выступала як квартэт складу: А. Цыганок, Дзмітрый Роба – гармоніка, гітара, вакал, Андрэй Васільеў – бас-гітара, *Аляксандр Гулай* – акардэон.

**Гастролі:** Францыя (2005).

**Фестывалі:** «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005), «Zaduszki bluesowe» (Беласток, 2005), «Блюз жыве ў Мінску» (2006).

**Узнагароды:** I месца ў міжнародным конкурсе на фестывалі «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005).

**Дыскаграфія:** дэма «Al Narrator Orchestra» (2004).

**Кантакт:** +375 (232) 77-59-95, (29) 113-78-10 (А. Цыганок).

20.12.06//N.N., фота Д.П.

**«AMBASSADOR21»** – музычны праект, заснаваны ў 2002 у Мінску Наташай – вакал, праграмаванне, тэксты і Аляксеем Пратасавым – вакал, праграмаванне, сэмплінг. Калектыў выступае ў стылі індастрыэл/брэйк-кор/пауэр нойз. У 2004 да дуэту далучыўся іспанскі гітарыст з псеўданімам J. aka CTRLer. Усе свае запісы ўдзельнікі калектыву выдаюць ва уласнай фірме «Invasion Wreck Chords».

**Гастролі:** Бельгія, Галандыя, Нямеччына, Аўстрыя, Францыя, Славакія (кастрычнік 2003 – кастрычнік 2004), Францыя, Вялікабрытанія, Нямеччына (сакавік–кастрычнік 2005), Нямеччына, Аўстрыя, Данія, Італія (вясна 2006), Нямеччына, Галандыя, Аўстрыя (кастрычнік 2006).

**Фестывалі:** «Unityfest» (Бельгія, 2003), «Resistance Festival» (Славакія, 2004), «Resistance Festival» (Вялікабрытанія, 2005), «Noxious Art Festival» (Францыя, 2005), «Maschinenfest» (Нямеччына, 2005), «Elektroanschlag» (Нямеччына), «Maschinenfest» (Крэфельд, Нямеччына, 2007) і інш.

**Дыскаграфія: альбомы** «Invitation To Execution» («Invasion Wreck Chords»), «People Vs. Ambassador21» («Invasion Wreck Chords»), «Split» («Invasion Wreck Chords»), «Ambassador21 Vs. The World» («D-Trash Records», Канада), «Rational Terror» («Invasion Wreck Chords», канцэртны), «Teper' Revolucija! (split with HYPERDRVER, Вялікабрытанія – «Invasion Wreck Chords»), EP «Belarus/Teenage Action» («Invasion Wreck Chords», рэміксы), «Akcija» («Invasion Wreck Chords»), «Dogma» («Invasion Wreck Chords»), EP «I Wanna Kill U.com» («Invasion Wreck Chords»/«Restroom

Records», Нямеччына), «Akcija! Tour 2004» («D-Trash Records», Канада, канцэртны), «Akcija v1.1» CD/2LP («Invasion Wreck Chords»/«Restroom Records», Нямеччына, 2005), «Weight Of Death» («Invasion Wreck Chords», 2006); «Good Morning W.» (with FRAGMENT KING, Нямеччына – «Invasion Wreck Chords», 2006), «Drunken, Crazy, With A Gun» («Invasion Wreck Chords», 2007); асобныя **трэкі** выдаваліся ў больш чым 30 альбомах па ўсім свеце.
**Кіно, відэа:** «Recognized Innocents» (рэж. А. Кляймёнаў, 2002), «Love» (рэж. А. Кляймёнаў, 2003), «All The Rest Like Animals Has» («Enemy Ltd.»., 2004), «Akcija! Tour 2003/2004» («Enemy Ltd.», full-length movie/«Invasion Wreck Chords», 2005), «I Wanna Kill U.com» (produced by t3RRORbit, Аўстрыя, 2005), «New Doctrine About Trinity» (with CONVERTER, produced by Enemy Ltd. & EyescorE VisuaL, Францыя, 2005), «Light My Fire. Live in Rock, Copenhagen» (produced by «Invasion Wreck Chords», 2006).
**Кантакт:** www.ambassador21.com; invasion@ambassador21.com; +375 (29) 372-12-17 (Аляксей).
23.07.07//Д.П.

**ANGELO TAYLOR** – гл. *Краўцоў Анджей.*

**«APOCRYPHAL»** – група з Рэчыцы, якая трымаецца стылю сімфа-блэк-дэз.

Утварылася ў верасні 1994. Першапачатковы склад: Ягор Руль – вакал, гітара, Андрэй Шэвяленка – гітара (→ 2004), Сяргей Броўка – барабаны, Віталь Атаманчук – бас-гітара (→ 2005). У 1997 да групы далучылася Крысціна Кураш – клавішныя, у жніўні 2004 – гітарыст Аляксандр Кароткін (← *«Evthanazia»*). На пачатку 2006 група складалася з Я. Руля, А. Кароткіна, С. Броўкі, К. Кураш і Андрэя Патаповіча – бас-гітара.
**Гастролі:** Масква, Санкт-Пецярбург, Украіна, канцэрты ў Беларусі.
**Фестывалі:** «The Great Commandment» (Кіеў, 1998–99, 2001–02), «Nihilistic Death Metal Assault» (Брэст, 2001), «Days of Darkness» (Гомель, 2001–02), «Спидобойка» (Чарнігаў, 2002), «Metal Heads' Mission 4» (Еўпаторыя, 2003), «Metal Crowd» (Рэчыца, 2005, 2006), «Unholy Storm» (Санкт-Пецярбург).
**Дыскаграфія: альбомы** МС дэма «Lustration» («Blacksmith' Production», 1996), МС дэма «Bacchanalia» («Menesk' Production», 1997), МС прома «The Agression Against of Mind» («Music Violence Production», 1998), МС «The Mask» («The Flaming Art's Production», 1999), MCD «In Labyrinth of Time» («Paradise' Records», 2003), «Hear My Call» (2006); **трэк** «Pahonia» (у зборніку «Hard Life Heavy Music» – «БМAgroup», 2003).
**Кантакт:** +375 (29) 657-96-58; apocryphal@tut.by; www.apocryphal.biz
01.10.06//A.I.

**«APPLE TEA»** – мінская джаз-група. Утварылася ў 1993 з мэтай выканання сучаснага джазу на аснове рэпертуару, створанага непасрэдна ўдзельнікамі калектыву. Першапачатковы склад: *Ігар Сацэвіч* – лідэр, кампазіцыя, аранжаванне, бас-гітара (← *«Рада»*), *Аляксандр Сапега* –

барабаны (← «Рада»), Алег Дарошын – гітара («Рада»), *Андрэй Матлін* – саксафоны, *Канстанцін Гарачы* – клавішныя, Сяргей Лапкоўскі – фартэпіяна, аранжаванне. У розныя гады ў складзе калектыву працавалі *Віталь Ямуцееў* і Андрэй Бандарэнка (саксафоны), *Максім Пугачоў* (клавішныя → *«Белорусские Песняры»*), Аляксандр Старажук (перкусія → *«Ляпис Трубецкой»* 2002). Група актыўна ўдзельнічала ў студыйных запісах шэрагу вядучых выканаўцаў Беларусі, у тым ліку *Аляксея Шадзько*, першай з беларускіх джазавых калектываў выдала альбом у Расеі, працавала па кантракце за мяжой і ўпершыню ў Беларусі выдала відэаверсію сольнага канцэрту. Ад 1994 да 1997 музыкі выступалі як малы склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, у 2000–01 – як студыйная група польскай фірмы «PGK Studio International». У 2005 група мела наступны склад: І. Сацэвіч, А. Сапега, Сяргей Аляксандраў – клавішныя, *Ігар Люты* – саксафоны, Андрэй Ускоў – гітара. У канцы 2005 на месца А. Ускова (→ *«Харли»*) прыйшоў Міхаіл Філіпеня-мал., ад 2006 з групай супрацоўнічаюць саксафаністы Аляксей Кляшчоў і Павел Аракелян.

**Гастролі:** Украіна, Літва, Азербайджан (травень 2007).

**Фестывалі:** «Birstonas» (Літва, 1994), «Kaunas Jazz» (Літва, 1998), «Klaipeda» (Літва, 2000) «Jazz Jamboree» (Польшча, 2000), «Rhein Kultur» (Нямеччына, 2002), «Rigas ritmi» (Латвія, 2003), «Saulkrasti Jazz» (Латвія, 2005), «Beatles Forever 3» (Лагойск, 2006), «Jazz Maratonas Nida» (Літва, 2006), «Джаз-Коктебель» (2006), Запарожжа (2006), «Джаз над Днепром» (Днепрапятроўск, 2006), «Sauliai Jazz» (Літва, 2007); удзел у шэрагу фестываляў у Мінску.

**Узнагароды:** «Рок-карона 2006» у намінацыі «Кліп году» («Apple Tea»).

**Дыскаграфія: альбомы** MC «Пчаліны танец» («Ковчег», 1996), CD «Apple Tea» («Boheme Music», Расея, 1999), «Bee Dance» (аўт. выд., 2000), «Warsaw Zoo» (аўт. выд., 2003), «Cover Band» (аўт. выд., 2004), «Instead Of You» (аўт. выд., 2006); з А. Шадзько: «Бэмс» (аўт. выд., 1997), «Я буду ждать» (аўт. выд., 1998); з *Сяргеем Трухановічам*: «Нараджэнне таямніцы» («БМAgroup», 2003); **трэкі** «It's No Good» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Solgier Of Fortune» (у зборніку «Tribute to «Deep Purple» – «MSH Records», 2006).

**Кіно, відэа:** VC «Angry Girls» («CDL Music», 1998), музыка для тэлесерыялу «Ускоренная помощь» (2001), мультфільмаў «Фантазёрка», «Дверь», «Ночёвка зверей», **кліп** «Apple Tea» (рэж. *Уладзімір Янкоўскі*, 2006).

**Кантакт:** www.apple-tea.com; appletea@apple-tea.com

01.06.07//Д.П.

**«AQUAMORTA»** – мінская група, якая трымаецца стылю традыцыйнага трэш-метал.

Утварылася ў жніўні 1997 на рэштках групы «Devil's Empire» з ініцыятывы Сяргея «Астрона» Азарэнкі і вакаліста Паўла «Джэрмака» Ермака. Цягам усёй дзейнасці група карысталася з паслуг сесійных музыкаў – такіх, як бэк-вакаліст *Пётр*

*Ялфімаў* («Эгоист», *БДК «Песняры»*), гітарыст Вадзім Калтыгін, бас-гітарыст Ціхан Золатаў (*«Divina Enema»*, *«Svet Boogie Band»*), барабаншчыкі Дзяніс Галіцкі (*«Znich»*), Аляксей Золатаў («Divina Enema», *«Svet Boogie Band»*), гітарыст Яўген Цылікаў (*«Partyzone»*, «Vir»). Пачаткова песні выконваліся на ангельскай мове, пазней рэпертуар сталі засноўваць на беларускамоўных песнях.
**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2000).
**Дыскаграфія:** MC «Zaklik kryvi» («Metal Records», 2000), CD сінгл «Ruzhy albo dym» («БМAgroup», 2002); **трэкі** «Krocym poplec» (у зборніку «Hard Life – Heavy Music 1» – «БМAgroup», 2001), «Ruzhy albo dym» (у зборніку «Hard Life – Heavy Music 2» – «БМAgroup», 2003).
**Кантакт:** www.aquamorta.com; aquamorta@aquamorta.com; +375 (29) 611-34-31.
14.07.04//A.I.

**«ASGUARD»** – магілёўская група, якая выступае ў стылі блэк-дэз метал.

Утварылася ў 1996 і пачаткова выступала пад назвай «Ancient Castle» складам: Аляксандр Афончанка – бас-гітара, вакал, Андрэй Цэлабёнак – гітара, Аляксандр Кротаў – гітара, Сяргей Цэлабёнак – барабаны. Увосень 2004 у калектыве выступалі А. Афончанка, А. Цэлабёнак, С. Цэлабёнак, Алег Маслакоў – гітара.
**Фестывалі:** цягам 1999–2003 група удзельнічала практычна ва ўсіх фестывалях металёвай скіраванасці, што адбываліся ў Беларусі.
**Дыскаграфія: альбомы** MC «In The Darkness of The Nigth» («Fatal Ecstasy Prod.», 1998), MC прома «Summis Desiderantes Effectibus» («Bloodhead Prod», 2000), CD «Black Fire Land» («This Dark Reigh»/«More Hate Prod», 2003), «Wikka» («This Dark Reigh»/ «More Hate Prod», 2004), «Dreamslave» («This Dark Reign Rec.», ЗША, 2005), «Awakening» («This Dark Reign Rec.», ЗША, 2007).
**Кантакт:** asguard@tut.by, asguardmetal@rambler.ru; +375 (29) 627-85-79 (Аляксандр).
11.06.07//A.I.

**«ATLANTICA»** – мінская група, працуе ў стылі сінты-пап.

Утварылася як дуэт у красавіку 2003 і выступала складам: Аляксей «Алекс Дэвід» Набееў і Дзмітрый «Дзі'Мітр». Група выконвае ўласныя песні і песні на вершы *Паўла Бараноўскага* на ангельскай, ад 2007 – і на расейскай мовах. Дэбютавала на мінскіх радыёстанцыях песняй «Behind The Destiny». У якасці госця ўдзельнічала ў фестывалі «Electromantica» (Мінск, 2004). Летам 2006 дуэт пакінуў Дзі'Мітр, на яго месца прыйшлі Vitaly (вакал) і Lena G. (бэк-вакал). Сярод найбольш вядомых твораў – «Shivering», «Gone (Remember My Love)», «Shopping».
**Гастролі:** Масква (сакавік 2005),



Даўгаўпілс (Латвія, чэрвень 2005).
**Узнагароды:** 1 месца цырымоніі «Мистерия звука 2005» у намінацыі «Рэлізы беларускіх пап-выканаўцаў», альбом «Heavenly».
**Дыскаграфія:** максі-сінгл «Atlantica» («West Records», 2004), CD «Heavenly» («West Records», 2005), «Urbanoid» («West Records», 2006); **трэк** «Real Love» (у зборніку «Первый Интернационал» – «Vigma», 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Gone (Remember My Love)» (рэж. М. Носаў, 2004), «Shivering» (2005).
**Кантакт:** www.theatlantica.com, +375 (29) 349-52-10; info@theatlantica.com; alex.atlantica@gmail.com.
27.02.07//Д.П.

**«AT LAST»** – гомельская блюзавая група, якая ўтварылася ў 1996 з ініцыятывы гітарыста і вакаліста *Сяргея Курэка*.
Пачаткова выступала як трыо складам: С. Курэк, Руслан Таргонскі – барабаны, Уладзімір Перагудаў – бас-гітара. Рэпертуар групы засноўваўся на творах са спадчыны Джымі Хендрыкса, пазней – Стыва Рэй Воэна. Дэбют трыо адбыўся ў мінскім «Стар-клубе». У 1997 да групы далучаецца вакалістка Юлія Петрушкевіч, рэпертуар пашыраецца за кошт песень Эты Джэймс і Джэніс Джоплін, а таксама аўтарскіх твораў. Група праіснавала да 1999, калі музыканты пакідаюць С. Курэка і сыходзяць у групу «The Dazers», якая неўзабаве змяніла назву на *«Бан-жвірба»*.
11.04.06//N.N.

**«AUTISM»** – мінская група. Утварылася ў студзені 1995.
У першым складзе калектыву, што выступае ў стылі intelligent dance music (IDM), эксперыментальная электроніка, выступалі Вадзім Міліцын (праграмаванне, сэмплінг) і Дзмітрый Юўчанка (аналагавыя сінтэзатары). Ад 1998 В. Міліцын – адзіны ўдзельнік праекту.
**Гастролі:** выступленні ў Нью-Йорку (2002–04).
**Фестывалі:** фестываль беларускай альтэрнатыўнай музыкі ў Эйндховене, Галандыя (верасень 1996), «The Future Sound of Minsk» (31 траўня 1997), удзел у шматлікіх перформансах у Мінску (1995–2000).
**Узнагароды:** прыз у намінацыі «Лепшая электронная група году» на цырымоніях «Пап-каранацыя 1997, 1998».
**Дыскаграфія: альбомы** «The Spiral Twist» (дэма, 1995), «Нурпорор» (дэма, 1996), «Ultramarine» («BMM»/«Delta 9», 1997), «Membrana» («Delta 9», 1997), «Pornojazz» («Delta 9», 1998), «Neverberator» («Delta 9»/«Segment», 2000), («vibro») («Segment», Нью-Йорк, 2002), «Gaijin» («Segment», Нью-Йорк, 2004).
**Кіно, відэа: кліп** «nero-zero». «Autism» feat. Alec Treecity (студыя «PixlMixl», 2004).
**Кантакт:** autism@mail.ru; www.autizm.com
15.07.04//А.П.

# Б

**БАГАТКЕВІЧ ЮРЫЙ (Богаткевич Юрий, Bogatkevich Yuriy)** – кампазітар, спявак, піяніст, гітарыст, аранжавальнік.

Нарадзіўся 05.08.1963 у Мінску. Скончыў БДУК у 1984 па класе дырыжора акадэмічнага хору А. Пякуткі. Дэбютаваў у 1979 у складзе мінскай групы «Красные звезды», у якой выступаў да 1984. У 1988 атрымаў запрашэнне на працу ў ансамбль *«Сябры»*. У 1992 заснаваў уласны праект – групу «Ражство». У 1997 разам з *Барысам Бернштэйнам*, *Віктарам Малчанавым* і Ю. Сцянко выехаў на працу па кантракце ў ЗША, дзе й застаўся. Выступае ў начных клубах і рэстарацыях, сачыняе музыку, адкрыў уласную студыю гуказапісу. Сярод найбольш вядомых твораў – песні «Жоўтыя вяргіні», «Яхта любві», «Ражство» (сл. *Леаніда Пранчака*), «Лодка белая», «Птушка пералётная» (сл. *Уладзіміра Някляева*), «Зорная ноч» (сл. А. Пісьмянкова), «Лим-Попо», «Сирень-разбойница» (сл. М. Рабініна).

**Гастролі:** гл. у складзе «Сяброў» (1988–92).

**Фестывалі:** у складзе «Сяброў» – Усесаюзны фестываль польскай песні (Віцебск, 1988, 1990), «Славянский базар» (1992), «Песня года» (на тэлеканале «Останкино», 1988–92); у складзе групы «Ражство» – «Славянский базар» (1993).

**Дыскаграфія: трэкі** «Яхта любві» (сл. Л. Пранчака, у зборніку «Між Ню-Ёркам і Менскам» – «Ковчег», 2000), «Беларуская самота» (сл. Л. Пранчака, у зборніку «Талака» – «Ковчег», 2000).

**Кантакт:** yuri5@optonline.net

30.09.04//Д.П.

**БАГДАНАВА ГАННА (Богданова Анна, Bagdanava Anna)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару.

Нарадзілася 25.03.1982 у Гудэрмесе, Чачня. Ад 1987 жыве ў Мінску. У 1998 скончыла ДМЛ пры БАМ па класе фартэпіяна. Спяваць пачала ў дзяцінстве, ад 1999 у складзе групы *«Лето»*, ад 2003 распачала сольную кар'еру, працуючы пераважна ў Маскве. Сярод найбольш вядомых твораў – «Понедельник без тебя» (муз. В. Пензіна, сл. У. Кубышкіна), «Февраль» (муз. і сл. *Леаніда Шырына*), «Горе от ума» (муз. А. Сланчынскага, сл. У. Кубышкіна), «Я буду самой-самой», «Просто слова» (абедзве – муз. В. Пензіна, сл. У. Кубышкіна).

**Гастролі:** краіны СНД, Нямеччына (у складзе групы «Лето»).

**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск, 1998), тэлефестываль «Песня года» (у складзе групы «Лето», 2000, 2001).

**Дыскаграфія: альбомы** «Краски ушедшего лета» («Real Records», Расея, 2000), «Горе от ума» («Aist Records», Беларусь, 2003);

**трэкі** «Понедельник без тебя», «Февраль» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000), «Краски ушедшего лета» (у зборніку «20 супер-хитов, рожденных в Беларуси-3» – «Bulba Records», 2000), «Лето – летать» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000).
**Кантакт:** +375 (29) 635-00-45, +7 (910) 450-08-08.
04.02.04//Д.П.

**БАГУСЛАЎСКАЯ НЭЛІ (Богуславская Нэлли, Baguslauskaja Neli)** – спявачка, выканаўца класічнага папулярнага рэпертуару.
Нарадзілася 21.06.1935 у Крывым Рогу, Украіна. Скончыла музычную вучэльню ў Душанбэ па класе вакалу (1958), працавала салісткай у Разані, Днепрапятроўску, Чарнігаве. Ад 1962 – салістка БДФ (да 1987). Ад 1995 выступае ў зборных канцэртах і з сольнымі праграмамі ў дуэце з мужам – піяністам, кампазітарам, аранжавальнікам і спеваком *Ізмаілам Капланавым*. Дыпламант I Усесаюзнага конкурсу савецкай песні (Масква, 1966). Спявае на расейскай, беларускай мовах, сярод найбольш вядомых песень – «Белая Русь» (муз. *Юрыя Семянякі*), «Спадчына» (муз. *Ігара Лучанка*), цыкл «Помню» (муз. *Яўгена Глебава*, сл. *Уладзіміра Арлова*), «Первый вальс» (муз. А. Шандароўскага, сл. Ю. Дзінава), «Рыжая осень» (муз. І. Лучанка, сл. А. Аўрынскай), «Собирала перышки» (муз. І. Капланава, сл. Н. Салодкай), «Исповедь» (муз. І. Капланава, сл. С. Капуцікян), «Тумановы вечар» (муз. Н. Яцкова, сл. А. Візіцкай), «Баллада о танго» (А. і М. Віцкія) і інш. Неаднаразовы ўдзельнік журы конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Золотой шлягер».
**Гастролі:** Канада, Польшча, Вугоршчына.
**Фестывалі:** «Золотой шлягер» (неаднаразова), «Славянский базар» (неаднаразова).
**Дыскаграфія:** 3 міньёны («Мелодия», 1969–75).
**Кантакт:** +375 (29) 672-73-43 (Ізмаіл Капланаў).
12.11.06//В.Б.

**БАДАК АЛЕСЬ (Бадак Алесь, Badak Ales)** – паэт.
Нарадзіўся 28.02.1966 у в. Туркі Ляхавіцкага р-ну Брэсцкай вобл. Скончыў філалагічны факультэт БДУ ў 1990 па спецыяльнасці філолаг, выкладчык беларускай і расейскай мовы і літаратуры. З першымі вершамі выступіў у друку ў 1979. Першыя песні былі напісаны і прагучалі на Беларускім радыё і тэлебачанні ў 1989. Служыў у войску, у 1990–91 – пазаштатны карэспандэнт-арганізатар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюзу пісьменнікаў Беларусі, у 1991–2001 – рэдактар аддзелу, адказны сакратар, намеснік галоўнага рэдактара часопісу «Бярозка». Пазней працаваў рэдактарам аддзелу часопісу «Полымя» (2001–02), у 2002–04 – рэдактар аддзелу, адказны сакратар часопісу «Маладосць». Ад лістапада 2004 да цяперашняга часу – намеснік галоўнага рэдактара часопісу «Маладосць». Сярод найбольш вядомых песень «Заварожаная фея» (муз. *Алега Елісеенкава*, вык. *Аляксандр Саладуха*), «Падаюць зоры» (муз. *Леаніда Захлеўнага*,

вык. Н. Раманская, *Якаў Навуменка*), «Сарамлівая дзяўчынка» (муз. А. Елісеенкава, вык. *Іна Афанасьева*), «Каралева зімы» (муз. А. Елісеенкава, вык. А. Саладуха), «Пазаві за небакрай» (муз. *Мікалая Сацуры*, вык. *Аляксей Хлястоў*), «Таму бывай назаўжды» (муз. Э. Агародніка, вык. *Юлія Скараход*, *Вольга Плотнікава*), «Позняе таксі» (муз. І. Цвятковай, вык. *Вікторыя Алешка*), «Не прывыкай да мяне» (муз. і вык. *Іскуі Абалян*), «Прыцягненне сэрца», «Салаўіная раніца» (муз. А. Елісеенкава, вык. *«Сябры»*), «Гаспадыня» (муз. *Эдуарда Зарыцкага*, вык. Я. Навуменка), «Будзем жыць як набяжыць» (муз. *Ізмаіла Капланава*, вык. Я. Навуменка), «Лёс» (муз. і вык. *Валерыя Разанава*), «Іншапланецянка» (муз. і вык. Я. Навуменка).

**Фестывалі:** пастаянны ўдзельнік нацыянальных тэлефестываляў.

**Узнагароды:** лаўрэат літаратурнай прэміі «Залаты апостраф» часопісу «Дзеяслоў» (2003).

**Дыскаграфія: трэкі** «Вяселле» (у вык. ансамбляў «Сябры» і «Церніца», CD «Музычная гасцёўня, вып. 3. За маладых» – «Ковчег», 1997).

**Кнігі:** аўтар паэтычных зборнікаў «Будзень» (1989), «За ценем самотнага сонца» (1995), «Маланкавы посах» (2004), вершаваных і празаічных кніг для дзяцей «Маленькі чалавек у вялікім свеце» (1995), «Верабей з рагаткай» (1999), «Незвычайнае падарожжа ў Краіну Ведзьмаў» (2001) і інш.

**Кантакт:** badak@cosmostv.by

04.11.06//Д.П.

**БАДЗЬЯРАЎ ВАЛЯНЦІН (Бадьяров Валентин, Badiarov Valentin)** – скрыпач, аранжавальнік, вакаліст, дырыжор.

Нарадзіўся 19.02.1947 у Мінску. Скончыў БДК у 1970 па класе скрыпкі М. Браценнікава, аспірантуру пры БДК у 1982. Творчы шлях распачаў у складзе ансамбля *«Песняры»* ў 1970. У 1973 заснаваў *«Группу Валентина Бадьярова-1»*. Ад 1974 да 1976 – артыст ансамбля «Поющие гитары», у 1976 стаў ля вытокаў стварэння ансамбля *«Сябры»*, на чале якога як мастацкі кіраўнік працаваў да 1981, калі была створана «Группа Валентина Бадьярова-2». Ад 1984 да 1989 – саліст-інструменталіст БДФ. Ад канца 80-х жыве і працуе ў Нямеччыне. Аўтар аранжаванняў песень «Алеся», «Родная деревня», «Лесная колдунья», «Глухариная заря» для ансамбля «Сябры», інструментальных п'ес і песень «Всем на планете» (сл. С. Кірсанава), «Баллада о сожженной деревне» (сл. *Анатоля Вярцінскага*), «Ты – одна любовь» (сл. А. Фета), «Для двоих» (сл. В. Гіна). Як скрыпач зрабіў шэраг запісаў акадэмічнай музыкі для Беларускага радыё разам з Літоўскім і Беларускім сімфанічнымі аркестрамі, салістамі К. Шаровым, Л. Рыдлеўскай, І. Алоўнікавым, І. Наймаркам. Удзельнічаў у запісе музыкі для фільму пра ансамбль «Поющие гитары».

**Гастролі:** гл. «Песняры» (1970–73), «Сябры» (1976–81).

**Фестывалі:** гл. «Песняры» (1970–73), «Сябры» (1976–81), «XV Masterplayers International Music and Conductors Competitions» (Лугана, Швейцарыя).

**Узнагароды:** у складзе «Сяброў» – лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1977), лаўрэат міжрэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў.

**Дыскаграфія: альбомы** LP «Песняры 1» («Мелодия»,1971), «Песняры 2» («Мелодия»,1973), у складзе ансамбля «Сябры»: «Всем на планете» («Мелодия», 1978), «Ты – одна любовь» («Мелодия», 1979); у складзе «Группы Валентина Бадьярова»: LP «Песни О. Иванова» («Мелодия», 1981), «Кружатся диски» («Мелодия»,1982), «Музыка для отдыха» («Мелодия»,1983), EP «Группа Валентина Бадьярова» («Мелодия», 1982), «Группа Валентина Бадьярова» («Мелодия», 1983); **трэкі** «Всем на планете», «Баллада о сожжённой деревне» («Сябры», LP «Всем на планете» – «Мелодия», 1978), «Ты – одна любовь», «Для двоих», «Разреши тебя любить» (сл. З. Бядулі) – («Сябры», LP «Ты – одна любовь» – «Мелодия», 1979), «Как случилось?» (сл. В. Фядотава, у EP «Группа Валентина Бадьярова» – «Мелодия», 1983), «Ритмы большого города» (у LP «Группа Валентина Бадьярова-2» «Дискоклуб 14 А» – «Мелодия», 1985).

**Кантакт:** www.valentin-badiarov.de.tt; www.badiarov.narod.ru; www.violinmusiker.de badiarov@mail.ru; +49 (241) 152-557

19.03.05//Д.П.

**«БАЗЫЛЬКІ»** – мінская група, якая спалучала фальклорныя элементы са стылістыкай класічнай рок-музыкі.

Была заснавана ў 1991 *Васілём Шугалеем* як своеасаблівы паралельны праект групы *«Ы.Ы.Ы.»*. Сярод удзельнікаў калектыву былі В. Шугалей – аранжаванне, Аляксей Кочкін (Любавін) – барабаны, Аляксандр Кандрацюк – альт, Алена Бабарыкіна – скрыпка, Юлія Глушыцкая – віяланчэль, Ганна Дубовік, Таццяна Звяздова, Вольга Рамановіч, Святлана Мезінцава – вакал. Група ўдзельнічала ў тэлепраграмах «А» ЦТ, «Крок-тусоўка» БТ, выступіла з некалькімі канцэртамі ў Мінску і неўзабаве спыніла існаванне.

**Дыскаграфія: альбом** MC «БазЫлькі» (аўт. выд., 1991).

11.12.04//П.Ю.

**«БАН-ЖВІРБА»** – гомельская група, якая выступае ў стылі фолк-мадэрну.

Утварылася ў 1999 на аснове дуэту Руслан Таргонскі – барабаны, гітара, вакал (← *«At Last»*) і Уладзімір Перагудаў – бас-гітара, вакал (← «At Last»), да якіх далучыліся вакалісты Сяргей Баброў – вакал (← *«Crane's Glee»*), Юлія Петрушкевіч – вакал (← «At Last»), Дзмітрый Гаўрылін – гітара, вакал, Дзмітрый Лазарэнка – гітара. Спачатку група выступала пад назвай «The Dazers» і выконвала музыку ў стылі хард-року. Ад верасня 1999 калектыў выступае пад сённяшняй назвай. У верасні 1999 у склад групы ўвайшла вакалістка Вольга Кузменка (→ травень 2000). У чэрвені 2000 яе змяніла Крысціна Прыходзька. У лістападзе 2001 адыходзіць Дз. Лазарэнка, якога змяніў Дзмітрый Вінаградаў. У 2004 група выступала ў складзе: Крысціна «Крыся» Прыходзька – вакал, Дзмітрый «Ментас» Гаўрылін – вакал, блок-флейта, Уладзімір «Вальдэмар» Перагудаў – бас-гітара, Руслан

«Рулет» Таргонскі – барабаны, вакал, мандаліна, Дзмітрый «Віні» Вінаградаў – гітара.
**Фестывалі:** «Спидобойка» (Гомель, 1999), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2000, 2001), «Таўкачыкі 2000, 2004», «Урожай» (Масква, 2006).
**Узнагароды:** прыз арганізатараў «Басовішча 2001».
**Дыскаграфія: альбомы** MC «The Dazers», (дэма, 1999), CD «Забабоны» («Sketis Music», Масква, 2007).
**Кіно, відэа: кліп** «Малпы» (2007).
Кантакт: www.banzhvirba.com
22.07.07//Д.П.

**БАННАЎ ВАСІЛЬ (Баннов Василий, Bannau Vasili)** – гітарыст, вакаліст, аўтар музыкі і тэкстаў.
Нарадзіўся 09.06.1966 у Краснаярску, Расея. У 1986 скончыў Троіцкую вучэльню грамадзянскай авіяцыі. Жыве ў Брэсце ад 1971. Песні пачаў пісаць у 1981, выступаць з канцэртамі – ад 1987. Працуе ў стылі бардроку, песні піша на расейскай мове.
**Гастролі:** канцэрты ў Брэсце, Магілёве, Мінску.
**Фестывалі:** «Новый город» (Магілёў, 1995), «Гродна 1995», фестываль аўтарскай песні «Мінск 2000».
**Дыскаграфія: альбом** MC «Помолись за меня» («Брестон», 2000).
**Кнігі:** паэтычныя зборнікі «Души слеза» (Брэст, выд. С.П. Лаўрова, 2000), «Между небом и землей» (Брэст, выд. С.П. Лаўрова, 2002).
**Іншая інфармацыя:** пастаянны сябра журы абласнога конкурсу дзіцячай паэзіі і аўтарскай песні.
**Кантакт:** +375 (162) 47-59-04.
17.06.04.//Г.Ш.

**БАРАБАНШЧЫКАВА ВОЛЬГА (Барабанщикова Ольга, Barabanshchikova Olga)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару.
Нарадзілася 02.11.1979 у Мінску. У 2007 скончыла БДАФВІС па спецыяльнасці трэнер па тэнісе. Ва ўзросце 7 гадоў пачала займацца вялікім тэнісам, у 1996 стала пераможцам турніру «Wimbledone» у парным разрадзе сярод юніёраў, чэмпіёнка Беларусі ў адзіночным разрадзе ў 2001–04, найлепшае дасягненне – 48 месца ў рэйтынгу WTA. Музыкай зацікавілася ў 2004. Першая запісаная песня «Было ли не было». Спявае на расейскай і ангельскай мовах, сярод найбольш вядомых песень – «Не поверю», «О тебе» (муз. і сл. *Яўгена Чалышава*), «Feel My Music», «Дорога в небо» (муз. і сл. *Паўла Бараноўскага*).



**Дыскаграфія:** максі-сінгл «Не поверю» (2005), CD «Дорога в небо» («West Records», верасень 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Не поверю» (рэж. С. Талыбаў, 2004), «Последний танец» (рэж. І. Пашкевіч, 2005), «Feel My Music» (рэж. У. Зінкевіч, 2006).
**Кантакт:** www.olgaB.by;
+375 (29) 656-67-42,
julia@olgaB.by, olga@olgaB.by.
08.10.06//Д.П.

**БАРАДУЛІН РЫГОР (Барадулин Рыгор, Baradulin Ryhor)** – паэт, перакладчык.

Нарадзіўся 24.02.1935 у в. Верасоўка (цяпер – в. Гарадок) Ушацкага р-ну Віцебскай вобл. У 1954 паступіў на філалагічны факультэт БДУ. Упершыню выступіў з вершамі ў друку ў 1953. Па сканчэнні ўніверсітэту працаваў у рэдакцыях шэрагу беларускіх газет і часопісаў, ад 1969 – рэдактар выдавецтва «Беларусь», ад 1972 – старшы рэдактар, ад 1985 – загадчык рэдакцыі выбраных твораў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Аўтар тэкстаў песень на музыку *Яўгена Глебава*, Дз. Смольскага, Г. Вагнера, *Зміцера Вайцюшкевіча*, *Алеся Камоцкага* і інш.

**Узнагароды:** срэбраны медаль VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў за кнігу вершаў «Маладзік над стэпам» (1957), кавалер ордэнаў Дружбы народаў, Знак Пашаны, медаля Ф. Скарыны; лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (за зборнік вершаў «Рум» і кнігу перакладаў «Блакітны звон Гранады» Ф. Гарсія Лоркі, 1976), прэміі ЛКСМБ (за паэму «Балада Брэсцкай крэпасці», 1976).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Паравоз каханьня» (З. Вайцюшкевіч і «WZ-Orchestra», «West Records», 2004), МС «Зорка спагады» (А. Камоцкі, «Grand Records», 2000), «Псальмы і баляды» (А. Камоцкі, 2000); **трэк** «Трэба дома бываць часцей» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987).

На падставе даведніка «Беларускія пісьменнікі», Д.П.

**БАРАНОЎСКІ ПАВЕЛ (Барановский Павел, Baranouski Pavel)** – ды-джэй, прадзюсэр, аўтар тэкстаў.

Нарадзіўся 31.10.1972 у Мінску. У 1996 скончыў факультэт перакладчыкаў (дыпламатычнае аддзяленне) Дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэту. У 1994 пачаў працаваць вядучым музычных праграм радыё «Би-Эй», у 1998 заняў пасаду праграмнага дырэктара гэтага радыё. У 1999 з уласнага жадання звальняецца і пераходзіць на працу ў «Альфа-радио». Годам пазней узначальвае праграмны аддзел радыё «Юнистар». У 2003 разам з Аляксеем Набеевым засноўвае музычны праект *«Atlantica»*, у складзе якога выступае як прадзюсэр, дырэктар і аўтар тэкстаў. У 2005 звальняецца з радыё «Юнистар». Найбольш вядомыя творы: тэксты песень «Behind The Destiny», «Strangers», «Shivering», «Real Love». Песні ягонага аўтарства маюцца ў рэпертуары *Вольгі Барабаншчыкавай.*

**Кантакт:** myproducer@yandex.ru

08.10.06//Д.П.

**БАРТКЕВІЧ ЛЕАНІД (Борткевич Леонид, Bortkevich Leonid)** – спявак.

Нарадзіўся 25.05.1949 у Мінску. У раннім дзяцінстве спяваў у хоры хлопчыкаў мінскага Палацу піянераў. Скончыў музычную школу па класе трубы, спяваў у харавым ансамблі «Юность». Падчас навучання ў архітэктурным тэхнікуме выступаў салістам аркестру гэтага тэхнікуму, пазней увайшоў у склад групы «Золотые яблоки». У канцы 1970 быў запрошаны ў ансамбль *«Песняры»*, у складзе якога працаваў да канца 1980. У гэтым жа годзе паступіў у ГИТИС на аддзяленне рэжысуры, пазней працаваў у групе «Мальвы», салістам Укрканцэрту, салістам-

вакалістам Дзяржтэлерадыё БССР. У 1989 выехаў у ЗША, вярнуўся ў Беларусь у 1999 і зноў увайшоў у склад «Песняроў». У жніўні 2003 звольніўся з БДА «Песняры» і арганізаваў пад гэтай жа назвай уласны калектыў.
**Гастролі:** гл. «Песняры».
**Фестывалі:** гл. «Песняры».
**Дыскаграфія:** гл. «Песняры»; **альбомы** сольныя «Мой родны кут» («Vigma», 2004), «Аксамітны вечар» («Vigma», 2004), «Березовый сок» («Vigma», 2004), MP3 (тры альбомы і «Не во сне ли», «Vigma», 2005); **трэкі** «Я не магу на вас забыцца» (у альбоме «Игорь Лученок. Песни и инструментальная музыка» – «Мелодия», 1983), «Трэба дома бываць часцей» (у LP зборніка «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Бярозка» (муз. *Ігара Лучанка*, сл. А. Вялюгіна, у LP «Песні Ігара Лучанка» – «Мелодия», 1978).
**Кантакт:** pesnyary.borda.ru
06.11.06//Д.П.

**БАШКОЎ ВАЛЕРЫЙ (Башков Валерий, Bashkou Valery)** – бас-гітарыст, прадзюсэр.
Нарадзіўся 30.10.1966 у Мінску. Скончыў Мінскі машынабудаўнічы тэхнікум у 1989. Актыўныя заняткі музыкай распачаў у 1988 у складзе групы «Ветер». Ад 1989 да студзеня 1996 – у складзе групы *«Зартипо»*, з якой выступаў на шэрагу міжнародных рок- і джаз-фестываляў у Расеі, Нямеччыне, Латвіі, Украіне. У студзені 1996 распачаў працу як студыйны музыка ў мінскай студыі «Меццо-фортэ», у якой два з палovай гады запісваўся і выступаў падчас канцэртаў з групамі *«Ляпис Трубецкой»*, *«Kriwi»*, *«По глазам»*, *«Любовь и спорт»*, *«Странник М»*, *«Чехов»*, *«Князь Мышкин»*, *«Крама»*, *«Мантана»*, *«beZ bileta»*, *«Mojo Blues»*, «Atava», *«Blues Street Friends»*, *Аляксеем Шадзько*, Карлам Хламкіным, *Карыянай*, *Ірынай Дарафеевай*, *Інай Афанасьевай*, *Людмілай Краўцовай*, Стэфанам, *Ганнай Багданавай*, *Тарыэлам Майсурадзэ*, Аляксандрам Маршалам, *Аляксандрам Саладухам*, *Аляксеем Хлястовым* і інш. У снежні 2000 выступаў у Мінску з польскім джазавым вакалістам Марэкам Балатам. Удзельнічаў у запісе музыкі для дакументальнага фільму «Человек-ящик», тэлесерыялу «Банка комиксов», мастацкіх фільмаў. Летам 1999 увайшоў у склад джаз-рокавага трыо «Geeteeks Band». Летам 2000 прайшоў курс навучання ў польскага бас-гітарыста Гжэгажа Надольнага. Летам 2004 стварыў першы ў Беларусі онлайнавы часопіс «BassBel». Ад восені 2004 – удзельнік трыо «Bass Connection». Разам з *Мікалаем Няронскім* і Уладам Кірушчанкам арганізаваў і правёў фестывалі бас-гітарыстаў «Bass Day» (2005, 2006). У 2004 удзельнічаў у кастынгу мюзіклу «We Will Rock You» у Маскве, дзе заняў 3 месца. Як прадзюсэр удзельнічаў у стварэнні праекту былога вакаліста групы *«Thank You Jesus» Улада Благуша «Странник М»*.
**Гастролі, фестывалі:** гл. «Зартипо».
**Дыскаграфія: альбомы** MC і CD «От солнца к дождю» (Л. Краўцова, 1998), «Ранетое сердце», «Любови капец» («Ляпис Трубецкой» – «Союз» 1996, 1998), «За туманам» («Kriwi», 1997), «Рэдкі госць» (І. Дарафеева, 2001), «Горячий финский зартипос» («Князь Мышкин», 1996),

«Грабёж» (Кеша Гомельскі, 1998) і інш.; CD «Людзям» («Kriwi», 1999), «Я буду ждать», «Моё!», «Несмотря ни на что» (А. Шадзько і «Сестра», 1998, 1999, 2000), «Любовь и спорт» (2002), «Hush» (Карыяна, 2003), «Ночной альбом» (Л. Краўцова, 2002), «Солнце разливается» («По глазам» – «Real Records», 2003), «Оранжевый рассвет» («Странник М», 2003), «Прости-прощай» (*«Лекарство от меланхолии»* – «West Records», 2004), «Narisovana» («beZ bileta», 2004), «Горячий финский зартипос» («Князь Мышкин» – «Геометрия», Расея, 2004) і інш.; у складзе «Зартипо» – гл. «Зартипо».
**Кантакт:** www.bashkov2.narod.ru; valbash@tut.by; www.bassbel.narod.ru
21.11.06//Д.П.

**БЕЗКАРАВАЙНЫ ДЗМІТРЫЙ (Безкоровайный Дмитрий, Bezkorovainyi Dmitri)** – журналіст, піяр-менеджэр, прадзюсэр.
Нарадзіўся 17.02.1978 у Вянёў-2 Тульскай вобл., Расея. Сярэднюю школу скончыў у Маладзечне, у 2000 – МДЛУ па спецыяльнасці перакладчык-рэферэнт, абараніўшы дыпломную работу «Пераклад лексікі шоў-бізнэсу з ангельскай на расейскую мову». Прафесійную дзейнасць у якасці журналіста распачаў напрыканцы 1996 як няштатны супрацоўнік «Музыкальной газеты». У 1997–99 – рэдактар аддзелу заходняй музыкі гэтай газеты, сябра рэдкалегіі. Працаваў музычным аглядальнікам у штотыднёвіках «Отдыхай» (2000–01) і «Белорусская газета» (2002–05). Як піяр-менеджэр/прэс-аташэ пачаў працаваць у 2000. У 2002–05 – піяр-менеджэр рэкард-кампаніі «West Records», у 2005–07 – расейскай рэкард-кампаніі «Студия Монолит». Прадзюсэрскую дзейнасць распачаў у 2003 на пасадзе менеджэра беларускага каталогу «West Records» (да 2005). Супрацоўнічаў у якасці піяр-менеджэра і прадзюсэра выпуску з групамі *«J:морс»* (альбомы «Web-дизайн», «Montevideo», «Апрель» і г.д.), *«Тяни-Толкай»* («Имей в виду», «Танцевальный», «3000 шагов – Баллады»), *«Крамбамбуля»* («Застольны альбом», «Каралі раёну», «Радыё Крамбамбуля 0,33 FM»), *«N.R.M.»* («Дом культуры», «Справаздача 1994–2004»), *«Ляпис Трубецкой»* («Чырвоны кальсоны», «Золотые яйцы»), *«Atlantica»* («Atlantica», «Heavenly»), *«Новый Иерусалим»* («Неба осколки»), *«Drum Ecstasy»* («Drum Ecstasy», «Drums Only») і інш. Адзін з аўтараў рэгламенту правядзення і сябра аргкамітэту цырымоніі «Рок-каранацыя 2002», аўтар/суарганізатар праекту «Першы беларускі Інтэрнэт-сінгл» («100 дорог» групы *«J:морс»*). На бягучы момант: прома-дырэктар групы *«J:морс»* ад 2005 году, прэс-аташэ ТА «Дети Солнца» (*«Ляпис Трубецкой»*, *«ТТ-34»*, *«Merry Poppins»*, *«Саша и Сирожа»*) ад 2006 году, прэс-аташэ гурту *«Крамбамбуля»* ад 2007.
**Кантакт:** +375 (29) 616-49-16; dmitri.bezkorovainyi@gmail.com
12.07.07//Д.П.

**БЕЛОРУССКИЙ ДИКСИЛЕНД** – мінскі калектыў традыцыйнага джазу, які склаўся ў канцы 60-х гадоў з ініцыятывы саксафаніста, кларнетыста і аранжавальніка *Авеніра Вайнштэйна*.
Рэпертуар калектыву засноўваўся

на класічных аранжаваннях сусветнай дыксілендавай літаратуры, апрацоўках мелодый савецкіх кампазітараў, народных мелодый і аўтарскіх творах лідэра. Першыя канцэрты калектыву, які выступаў у рамках праграмы «Беларускі сувенір», датаваныя 1969. У розныя гады ў яго складзе выступалі трубачы Міхаіл Гольдштэйн, Міхаіл Бэнц, Уладзімір Міхновіч, трамбаністы Анатоль Ларыёнаў і Уладзімір Шышыгін, саксафаніст Леанід Кабераў, піяністы *Андрэй Шпянёў*, *Аркадзь Эскін*, банджысты-гітарысты *Юрый Міхайлаў* і Юрый Хілавец, кантрабасіст *Браніслаў Сармонт*, барабаншчыкі Уладзімір «Фофа» Фядотаў, Яўген Батыркін, вакалісткі Вольга Балабанава і *Алена Свірыдава*. Апошнія радыйныя запісы гурту датаваныя 1988. Сярод найбольш вядомых аўтарскіх п'ес – творы А. Вайнштэйна «Кураняты» і «Песенка о диксиленде».

**Дыскаграфія:** CD «Белорусский диксиленд» («Ковчег», 2004).

**Кантакт:** +375 (17) 285-69-91 (А. Вайнштэйн).

11.03.07//Д.П.

**«БЕЛОРУСКИЙ СУВЕНИР»** – вакальна-інструментальны ансамбль, які працаваў пры Гомельскай абласной філармоніі ад 1969 да 1971. У складзе калектыву выступалі *Анатоль Ярмоленка* – вакал, кіраўнік, Рыма Зарова – вакал, Анвер Акжыгітаў – клавішныя, музычны кіраўнік, Аляксандр Вовінаў – гітара, Яфім Годкін – саксафон, Давід Угольнікаў – барабаны, Міхаіл Сладкоўскі – кантрабас.

08.03.05//www.syabry.com.

**«БЕЛОРУССКИЕ ПЕСНЯРЫ»** – ансамбль з Мінску.

Выступае ў стылі пап-року, часам з элементамі джазавай імправізацыі, выконваючы на беларускай, расейскай і ангельскай мовах як аўтарскія творы і апрацоўкі беларускіх народных песень, так і творы сусветнай папулярнай класікі. Утварыўся ў другой палове 1998 з ліку былых удзельнікаў БДА *«Песняры»* і пачаў выступаць самастойна наступным складам: *Уладзіслаў Місевіч* – саксафон, флейта, вакал, *Алег Аверын* – клавішныя, гітара, вакал, *Аляксандр Кацікаў* – бас-гітара, вакал, *Валерый Дайнэка* – вакал, *Ігар Пеня* – вакал, клавішныя, Ігар Бранкоўскі – клавішныя, *Уладзімір Марусіч* – барабаны, вакал, *Аляксандр Салаўёў* – гітара, вакал, *Аляксандр Папроцкі* – гукарэжысёр. У 2001 да калектыву далучыўся *Максім Пугачоў* (клавішныя, адначасова *«Apple Tea»*). Вясной 2004 на месца У. Марусіча прыйшоў Міхаіл Пенда, у лютым 2005 яго змяніў Андрэй Цераховіч (← *«Сябры»*, *«Палац»*), восенню гэтага ж году – Яўген Рабы.

**Гастролі:** Расея, Украіна.

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Только с тобой» (аўт. выд., 1999, «Ковчег», 1999), 2CD «Не люби нелюбимого» («Белорусские Песняры», 2002), «35+5» (2004), «Кремль Live 2004» («Белорусские Песняры Records», 2004), «Любимые песни.RU» («Белорусские Песняры Records», «Vigma», «Союз», 2005), «Концерт в Театре эстрады» («Kontramarka.ru», 2005), «Вологда. Легенды жанра» («Алмазов продакшн», 2004), «Скажи про любовь» («Классик компани», 2004), «Белорусские Песняры MP3» (2005), «Белорусские Песняры

МРЗ, вып. 2» (2006); **трэк** «Только с тобой» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000).
**Кіно, відэа: кліпы** «Только с тобой» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2002), «Не люби нелюбимого», «Хлопец, не журыся», «Знай, не забывай».
**Кантакт:** www.bel-pesniary.ru
28.01.06//Д.П.

**БЕРНШТЭЙН БАРЫС (Бернштейн Борис, Bernshtein Barys)** – скрыпач, бас-гітарыст, аранжавальнік.
Нарадзіўся 11.07.1952 у Мінску. Вучыўся ў БДК па класе скрыпкі Р. Нодэля, у 1975 скончыў Алма-Ацінскую дзяржаўную кансерваторыю па класе скрыпкі А. Когана. Ад 1978 да 1982 – музыка АМА Мінска. У 1982–86 – бас-гітарыст, скрыпач ансамбля *«Песняры»*. У 1986 вярнуўся ў АМА, выступаў у складзе джаз-ансамбля п/к *Ігара Сафонава.* У 1989 увайшоў у склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, выступаў як бас-гітарыст джаз-групы салістаў *«Пятый угол»*. У 1992–97 у складзе групы «Пятый угол» з салістамі *Валерыем Дайнэкам* і *Інай Афанасьевай* выступіў з серыяй канцэртаў габрэйскай музыкі ў Беларусі і па-за яе межамі. У 1994 на працягу 3 месяцаў выступаў у Японіі ў дуэце з піяністам *Аркадзем Эскіным.*
У 1997 выехаў у ЗША, дзе жыве й да гэтага часу. У 1997–98 – музыка групы «Weekend», Атланта. Ад 1998 – вольны мастак, выступае ў складзе розных калектываў, выконваючы джаз і габрэйскую музыку. Асноўныя творы: аранжаванні песень «Я не могу иначе», «Калядачкі», «Хлопец пашаньку пахае», «Плыве рэчанька», «Миша Каминский», «Баня», «Баллада о фотокарточке» і інш. для ансамбля «Песняры»; «Ой, рана на Йвана», «Бульба», «Лявоні-ха!», «Giant Steps», «Fly Me To The Moon», «Rimski» і інш. для джаз-групы «Пятый угол».
**Гастролі:** у складзе «Песняроў» – Вугоршчына, Польшча, Нямеччына, Індыя, Бірма.
**Фестывалі:** у складзе «Песняроў» – «Varadero» (Куба, 1983), у складзе джаз-групы І. Сафонава – «Віцебская восень» (1986–89), «Birstonas» (Літва, 1986), джаз-фестывалі ў Крывым Рогу, Днепрапятроўску (Украіна, 1987, 1988); у складзе джаз-групы «Пятый угол» – фестывалі ў Мінску, Маладзечне, Віцебску, «Boby Vasara» (Пасваліс, Літва, 1992).
**Дыскаграфія:** у складзе «Песняроў» – «Через всю войну» («Мелодия», 1985); у складзе джаз-групы І. Сафонава – МС «Misty» («Ковчег», 1996); сольныя дэма-CD – «With friends», «Kind of Jews… In Japan», «Weekend 1997» (2002).
**Іншая інфармацыя:** шлюб скасаваны.
**Кантакт:** +1 (770) 69-80-112 (х.), (404) 72-32-206 (пр.), bbernshteyn@yahoo.com
06.09.06//Д.П.

**БЛАГУШ УЛАДЗІМІР (Благуш Владимир, Blagush Uladzimir)** – аўтар музыкі і тэкстаў, вакаліст, гітарыст.
Нарадзіўся 28.04.1967 у Мінску. Вучыўся на гістарычным факультэце БДУ. Пачынаў як барабаншчык у 1985 у складзе мінскай групы «Стадион» (разам з В. Шкілёнкам і Ю. Сафонавым), ад 1987 да 1989 выступаў у складзе групы «Ветер», пасля чаго цягам трох гадоў

працаваў самастойна ў ролі аўтара-выканаўцы ўласных песень. У 1991–92, жывучы ў Полацку, браў удзел як барабаншчык у складзе калектыву «Шурик унд Pangalins». У 1992, вярнуўшыся ў Мінск, разам з Раманам Мікоцінам сабраў групу *«Буржуазия»*, у 1997 стаў ініцыятарам утварэння групы *«Thank You Jesus»*. Пасля 1999 часова адышоўся ад музыкі. У 2003 разам з сесійнымі музыкамі стварыў аўтарскі праект *«Странник М»*. Піша песні на расейскай і ангельскай мовах. Найбольш вядомыя творы ў складзе групы «Thank You Jesus»: «Let Me Be With You Baby», «Everybody's Lonely», «I Need Your Love», «We Could Be Together», «I Don't Know Why You Leave Me»; як «Странник М»: «Ангел», «Самолет», «Твои глаза», «Ино Планетянин».

**Фестывалі:** «Рок-каранацыя 1997, 1998», «Блюз жыве ў Мінску 1999».

**Узнагароды:** у складзе групы «Thank You Jesus» – «Рок-карона 1997» ў намінацыі «Дэбют году».

**Дыскаграфія:** у складзе «Thank You Jesus» – CD «Between No Distance» (Нямеччына, 1997); як «Странник М» – CD «Оранжевый рассвет» (аўт. выд., 2003).

**Кіно, відэа: кліпы** – у складзе «Thank You Jesus»: «Let Me Be With You Baby» (рэж. А. Грабенкін, 2000); як «Странник М»: «Ангел», «Рыбкин Данила» (2005).

**Кантакт:** +375 (29) 355-39-31; vladblagoev@mail.ru

23.09.05//Д.П.

**«БОБТАУН»** – група з Бабруйску, якая выконвала рок-музыку на аснове блюзу.

Утварылася ў канцы 1992 – пачатку 1993. У канцы 1993 у складзе калектыву выступалі Уладзімір Рудзік – вакал, Павел Панчанка – гітара, Аляксандра Шункевіч – бас-гітара, Багдан «Сайшык» Трыгубенка – гітара, Дзмітрый Сапаў – барабаны.

**Фестывалі:** «Рок-кола» (Навапалацк, 1993).

**Дыскаграфія:** МС «Бобтаун-блюз №1», «Бобтаун-блюз, или Сегодня и навсегда, ч. 2» (1993).

26.02.06//Д.П.

**«БОНДА»** – мінская група.

Утварылася на базе групы *«Studio-7»* у канцы 1984 і выконвала класічны аўтарскі рок на беларускай мове з элементамі рытм-энд-блюзу і панк-року, узяўшы за ўзор музыку польскай групы «Lady Punk». Група выступала складам: *Ігар Варашкевіч* – вакал, гармоніка, *Іван Маркаў* – гітара, *Вячаслаў Карань* – гітара (→ *«Ulis»*, кастрычнік 1988), *Сяргей Краўчанка* –



бас-гітара (→ «Ulis», кастрычнік 1988), Сяржук Кныш – барабаны. У запісе першага альбому ў 1986 удзельнічаў *Сяргей Брыкса* – барабаны. Некаторы час у складзе групы выступалі *Сяргей Зелянкевіч* – вакал, *Віктар Смольскі* – гітара, Сяргей Антонаў – гітара, *Аркадзь Юшын* – бас-гітара. Рэпертуар групы засноўваўся на ўласных беларускамоўных песнях. Найбольш вядомыя: «Слуцкая брама», «Стэфка», «На станцыі Койданава», «Шляхі ў ноч», «Хлопец дурны», «Песня падарожніка». Група праіснавала да пачатку 1990, на яе аснове ўтварыліся такія калектывы, як «Ulis», «Рокіс», *«Крама»*, *«Little Blues Band»*.

**Гастролі:** Польшча (1989).

**Фестывалі:** «Lithuanika» (Літва, 1986), «Магілёў» (1988), Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі (Наваполацк, 1988), «Парад надежд» (Мінск, 1988), «Рок-крок» (Гродна, 1989), «Тры колеры» (Мінск, 1990).

**Дыскаграфія: альбомы** MC «Месца пад сонцам» (запіс 1986, «Ковчег», 1996), 2CD «Бонда» – «Анталогія» і «Лепшыя песьні» («Ковчег», 1999), «Бонда» (у серыі «Залаты фонд беларускага рок-н-рола», «Ковчег», 1996); **трэкі** «Твая Атлантыда», «На станцыі Койданава» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Прыйдзе іх дзень» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМАgroup», 2004).

**Кіно, відэа: кліпы** «Ура!» (рэж. Г. Нікалаеў, 1988), «На станцыі Койданава» (рэж. Г. Нікалаеў, 1989).

05.02.05//Д.П.

**«БОРЖОМИ»** – інструментальная група, якая складаецца з музыкаў Барысава, Жодзіна і Мінску (адсюль і назва)

Выконвае аўтарскую музыку ў стылі, набліжаным да смус-джазу. Ад часу ўтварэння ў 2002 квартэт выступае нязменным складам: Аляксандр Отчанашанка – гітара, аўтар музыкі, *Аляксандр Каліноўскі* – бас-гітара, Юлія Сымановіч – скрыпка, Андрэй Мядзведскі – барабаны.



**Фестывалі:** «Грифомания» (Мінск, 2002).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Свет и тени» (аўт. выд., 2004), «Сезон дождей» (аўт. выд., 2005).

**Кантакт:** BorZhoMi@tut.by; www.BorZhoMi.net; +375 (29) 666-79-47.

23.04.06//Д.П.

**БРЫКСА СЯРГЕЙ (Брикса Сергей, Briksa Segre)** – барабаншчык, вакаліст, аўтар музыкі і тэкстаў. Нарадзіўся 16.10.1966 у Мінску. Ігрой на барабанах авалодаў самастойна. Творчую кар'еру распачаў у 1985, выступаючы ў складзе групы *«Метро»*. Удзельнічаў як барабаншчык у запісе першага альбому групы *«Бонда»*. У 1986 быў запрошаны ў склад ансамбля *«Верасы»*, у якім выступаў да 1989. У 1989–91 – вакаліст групы *«Рефлекс»*. На пачатку 90-х распачаў сольную кар'еру, у сярэдзіне 90-х выехаў у ЗША, дзе жыве і працуе й цяпер. Спявае на расейскай і ангельскай мовах аўтарскія творы пераважна хрысціянскай тэматыкі, найбольш вядомая песня «Вифлеемская Звезда».

**Фестывалі:** у складзе «Верасоў» – Усесаюзны фестываль польскай песні (Віцебск, 1988), «Фавориты года» (1993), міжнародны фестываль «Bridges of Love» (ЗША, 2000).

**Узнагароды:** уладальнік Гран-пры фестывалю «Фавориты года» (1993), лаўрэат міжнароднага фестывалю «Bridges of Love» (ЗША, 2000).




**Дыскаграфія: альбомы** «Вифлеемская Звезда» (1993), «Город света» (1996), «Когда-нибудь» (1997), «Я боль твою возьму» (1999), «Взятый в удел» (2001), «Ожидание» (2005), «Welcome To Your Life» (2006), «Гимны» (2007).

**Кіно, відэа: кліпы** «Вифлеемская Звезда» (рэж. І. Пашкевіч, 1993), «Я возвращаюсь домой» (рэж. І. Пашкевіч, 1995), «Молитва» (рэж. І. Пашкевич, 1999), «Мое рождество» (рэж. Р. Белас, 2005), «Somebody Say» (рэж. П. Уменскі, Р. Белас, 2006).

**Кантакт:** www.briksa.com

28.02.07//Д.П.

**БУБЕН УЛАДЗІСЛАЎ (Бубен Владислав, Buben Uladzislau)** – музыка, выканаўца электроннай музыкі. Нарадзіўся 29.01.1973 у Чачэрску, Гомельская вобл. Выступае як выканаўца ўсіх форм экстрэмальнай, альтэрнатыўнай і авангарднай музыкі. Удзельнік такіх праектаў, як «Fat Not Dead», «Over Voltage», «Envoi», «Socialist Construction», «I Me Mine», «Skvarka», «Bachus», «Q.Quantity», «Robobuns», «Buben», «The Last Chechenian Kamikadze», «Prus», «Barfly's Dreams» і інш.

**Дыскаграфія:** з групай «Pras» – «Invoit» («Tip Production», Нарвегія, 2006); з dj Dez – «Калабарацыя» («Tip Production», Нарвегія, 2006).

**Кантакт:** www.buben-info.narod.ru; buben_info@tut.by

22.01.06//Д.П.

**БУДАЙ ІГАР (Будай Игорь, Budaj Igor)** – гукарэжысёр, прадзюсэр. Нарадзіўся 26.09.1961 у Мінску. Скончыў ДМШ №6 па класе класічнай

гітары, у 1983 – геаграфічны факультэт БДУ. У 1987–90 працаваў гукарэжысёрам групы *«Сузор'е»*, пасля чаго выехаў у Польшчу. У 1991–93 – гукарэжысёр радыё «Plus» у Гданьску, ад 1992 да 1994 – суўладальнік рэкламнага агенцтва «Libra», ад 1994 да 2001 – суўладальнік і артыстычны дырэктар студыі гуказапісу «Active Sound», ад 2001 – уладальнік фірмы гуказапісу «Ariola» ў Гданьску. За гады працы запісаў больш за 150 альбомаў акадэмічнай, вакальнай, інструментальнай, папулярнай музыкі і джазу, музыку да больш чым 40 тэатральных пастановак. Апрача студыйнай працы, займаецца канцэртнымі і тэатральнымі праектамі. Быў гукарэжысёрам сусветнай прэм'еры мюзіклу «Wuthering Heights» Б. Тэйлара, агучваў у Лясной оперы Сопату пастаноўку «Князя Ігара» А. Барадзіна Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатру оперы Беларусі, канцэрты з удзелам зорак акадэмічнай музыкі М. Балдэры, Д. Джакаміні, Ч. Тайджы, Э. Мюрэй, Х. Бікерс, Х. Урбанака, Э. Леан, Ф. Караска, П. Бала, Б. Хендрыкс, К. Баман, Л. Аліберці, К. Цымермана, Д. Стахуры, В. Маліцкага, працаваў з такімі артыстамі джазу і року, як К. Дэнбскі, Бі Бі Кінг, Д. Замфір, У. Нагорны, Л. Можджэр, В. Млынарскі, Э. Бем, К. Скшынецка, «Phonda Larson Band» і інш. Сярод найбольш вядомых работ – альбомы «Jesu bleibet meine Freude. 18 твораў для флейты, габою і аргана» Й.-С. Баха (Э. Ланеўска, Т. Ланеўскі, Р. Пяруцкі), «Organ Works. Сусветныя шэдэўры арганнай музыкі» (Р. Пяруцкі), «Юбілейны канцэрт» Г. Гродберга, «Інаўгурацыйны канцэрт XLIV Міжнароднага фестывалю ў Аліўскім саборы» (Й. Рэйнбергер, З. Кручак – два канцэрты для сімфанічнага аркестру, хору і аргана), А. Вівальдзі «Поры года» (Т. Вайцяхоўскі, Н. Сталярская, Cappella Gedanensis), «The Globetrotters» і «Fairy Tales Of The Trees» (група «The Globetrotters»), «Road» («Mietek Blues Band»), «Modliszka» (рок-група «O.N.A.»), «Winna» (А. Хылінська, салістка групы «O.N.A.»).

**Гастролі, фестывалі:** удзельнік шэрагу нацыянальных і міжнародных музычных і рэкламных фестываляў, выстаў.

**Узнагароды:** Гран-пры за лепшую радыйную рэкламу на фестывалі «Crackfilm-93», першае месца, узнагарода глядацкіх сімпатый на фестывалі рэкламы «Crackfilm-94», Гран-пры за лепшыя візітоўкі еўрапейскіх радыёстанцый на міжнародных форумах галандскага штомесяцовіка «Music&Media» ў 1995 і 1996, II месца ў конкурсе штомесяцовіка «Звукорежиссёр» (Расея) на лепшы запіс 2000 («Юбілейны канцэрт» у гонар 70-годдзя Г. Гродберга); два Платынавыя і чатыры Залатыя дыскі за запіс і мастэрынг CD у Польшчы.

**Кантакт:** igor@budaj.eu

17.04.05//Д.П.

**БУДКІН СЯРГЕЙ (Будкин Сергей, Budkin Siarhej)** – журналіст.

Нарадзіўся 23.02.1982 у Мінску. Скончыў Беларускі калегіюм па спецыяльнасці журналістыка (2004) і факультэт журналістыкі БДУ (2005). Абараніў дыплом па тэме «Праблемы беларускага шоў-бізнэсу». Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў (2005). Дырэктар мінскай групы «Siver». Адзін з аўтараў і рэдактар кнігі «Залатыя дыскі беларускага



рок-н-ролу» (2004). Аўтар ідэі, адзін са стваральнікаў і каардынатар музычнага Інтэрнэт-парталу «Тузін Гітоў» (www.music.fromby.net). Аўтар і суаўтар сцэнарыяў для радыёпраграмы «Тузін Гітоў» з Алегам Хаменкам» (FM радыё «Мінск», 2005, ад 2006 – «Радыё Рацыя»). Друкаваўся ў часопісах «Мастацтва», «Студэнцкая думка»; «Белорусской деловой газете», «Музыкальной газете», «Салідарнасць». Ад 2002 – музычны аглядальнік газеты «Наша Ніва», ад 2006 – карэспандэнт «Радыё Рацыя». Менеджэр CD-выданьняў «Прэм'ер Тузін 2005, 2006», «Сьцяг брыгады» (група «Siver»), «Залаты дыск беларускага рок-н-ролу».

**Кантакт:** sb-1.livejournal.com; sb1@fromby.net; sb1@tut.by; +375 (29) 687-20-93.

22.11.06//Д.П.

**БУДНІК УЛАДЗІМІР (Будник Владимир, Budnik Uladzimir)** – кампазітар.

Нарадзіўся ў 1949 у г. Жыткавічы Гомельскай вобл., памёр 08.08.2007. Скончыў БДК па класе кампазіцыі А. Багатырова ў 1975. Працаваў пераважна ў жанрах інструментальнай музыкі і традыцыйнай папулярнай песні. Найбольш вядомыя творы: цыкл «Я твой трубач, таварыш камсамол» (1982), «На шляху дзікіх гусей» (сл. *Максіма Танка*, вык. група *«Сузор'е»*, 1982), «Янка Купала» (сл. *Уладзіміра Някляева*, вык. У. Кудрын), «Каця-Кацярына» (сл. А. Грачанікава, вык. Віктар Вуячыч), «Шумі, мой лес» (сл. *Генадзя Бураўкіна*, вык. *Мікалай Скорыкаў*), «Белая лілея», «Папараць-кветка».

**Узнагароды:** лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі (1982), лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (1993).

**Дыскаграфія: трэкі** «Жаданае каханне» (сл. *Аляксандра Лягчылава,* у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999), «Ты мне удачу нагадай» (сл. У. Някляева, у ЕР *«Группа Валентина Бадьярова»* – «Мелодия», 1983), «Кветка папараці» (сл. А. Грачанікава), «Два шчодрыя словы» (сл. А. Лойкі, ансамбль *«Сябры»*, абедзве ў LP «Шумите, березы» – «Мелодия», 1985), «На мяжы растанняў і сустрэч» (сл. У. Някляева, група «Планета», у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Я очарована тобой» (сл. У. Някляева), «Я жду тебя» (сл. А. Пятрова, абедзве ў LP *«Чараўніцы»* – «Мелодия», 1978), «Пах чаберовы» (сл. К. Кірэенкі, у ЕР «Чараўніцы» – «Мелодия», 1983),

«Кацярына» (у міньёне *Віктара Вуячыча* і ансамбля «*Тоніка*» «Песня, в которой ты» – «Мелодия», 1985), «Зямляне» (сл. У. Някляева, у зборніку «Как слово наше отзовется. Песни молодых композиторов» – «Мелодия», 1983).

Д.П., паводле Белэнцыклапедыі.

**БУЛАТНІКАЎ ПАВЕЛ (Булатников Павел, Bulatnikov Pavel)** – спявак.

Нарадзіўся 26.06.1972 у Аранбургу, Расея. Скончыў МІК у 1993. Выступаць на сцэне пачаў у канцы 80-х як удзельнік дуэту *«Лицей»*. У першай палове 90-х уваходзіў у склад групы «Bad Informers», ад 1997 – у складзе групы *«Ляпис Трубецкой»*. У 2000 стаў адным з заснавальнікаў творчага аб'яднання «Дети Солнца».

**Гастролі, фестывалі:** у складзе дуэту «Лицей» – гл., у складзе групы «Ляпис Трубецкой» – гл.

**Дыскаграфія:** гл. «Ляпис Трубецкой», пачынаючы ад альбому «Ты кинула»; саліруе ў трэку «Вопрос времени» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**Кантакт:** www.lyapis.com

27.02.05//Д.П.

**БУЛДА ВЯЧАСЛАЎ (Булда Вячеслав, Bulda Viachaslau)** – выканаўца на ўдарных, менеджэр.

Нарадзіўся 17.05.1964 у Мінску. Скончыў ММВ у 1986 па класе ўдарных Л. Капілава. Ад 1989 да 1991 працаваў у БДФ, ад 1991 да 1993 – у штаце ансамбля *«Песняры»*, ад 1993 да 1997 – у *Дзяржаўным канцэртным аркестры Беларусі*. У 1997 арганізаваў групу *«Гаер»* і ўзначаліў яе, ад 2006 паралельна супрацоўнічае з блюзавым трыо «Consul Band», групамі *«Acoustic Band»*, *«Сестра»*. Аўтар песні «Беларусь».

**Фестывалі:** у складзе групы «Гаер» – «Грифомания» (1999, 2000), «Рок-манеўры» (2001), радыёконкурс «Музычны рынг» (2001).

**Дыскаграфія:** дэма-сінглы «Облака», «Песенка», «Беларусь», «Одиночество», песня «Never Let Me Down Again» разам з *Аляксандрам Памідоравым* (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**Кантакт:** +375 (17) 263-22-89, (29) 672-37-59.

07.04.07//Д.П.

**БУМІН АЛЯКСЕЙ (Бумин Алексей, Bumin Aliaksey)** – гітарыст.

Нарадзіўся 17.04.1974 у Мінску. Музыкай пачаў займацца ва ўзросце 7 гадоў, спачатку – фартэпіяна, потым – гітара. Дэбютаваў у складзе ВІА ПТВ №117. На пачатку 90-х захапіўся джазам, выступаў у складзе многіх калектываў (найбольш вядомы – «Hard Rain»), выконваючы самую розную музыку. Ад 1996 да 2000 найбольш увагі аддаваў самастойным сольным праектам з акустычнай гітарай. Летам 2000 атрымаў запрашэнне ўвайсці ў склад групы *«Deadmarsh»*, у якой выступае й да сёння.

**Фестывалі:** у складзе «Deadmarsh» – «Грифомания 2004».

**Дыскаграфія:** у складзе «Deadmarsh» – CD «Грані» (2003).

10.07.04//Д.П.

**БУРАЎКІН ГЕНАДЗЬ (Буравкин Геннадий, Buraukin Henadz)** – паэт, сцэнарыст, перакладчык, грамадскі дзеяч.

Нарадзіўся 28.08.1936 у в. Шуляціна (цяпер в. Тродавіч) Расонскага р-ну Віцебскай вобл. У 1959 скончыў аддзяленне журналістыкі філфаку БДУ, працаваў стыль-рэдактарам, журналістам у шэрагу беларускіх выданняў, на Беларускім радыё. У 1968–72 – карэспандэнт газеты «Правда» па Беларусі, у 1972–78 – галоўны рэдактар часопісу «Маладосць». Ад 1978 да 1990 – старшыня Дзяржаўнага камітэту БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні. Ад 1990 – пастаянны прадстаўнік БССР пры ААН, пасля вяртання з ЗША – на творчай працы. Упершыню выступіў у прэсе з вершамі ў 1952. Аўтар тэкстаў шматлікіх песень, музыку да якіх напісалі *Яўген Глебаў*, *Ігар Лучанок*, *Эдуард Зарыцкі*, *Васіль Раінчык*, *Эдуард Ханок*, С. Картэс, А. Эшпай, *Уладзімір Мулявін* і інш. Сярод найбольш вядомых твораў – песні «Зачараваная мая» (муз. І. Лучанка, вык. *«Песняры»*), «Завіруха» (муз. Э. Ханка, вык. *«Верасы»*), «Молитва», «Конь незацугляны» (абедзве з муз. Э. Ханка).

**Узнагароды:** лаўрэат прэміі ЛКСМБ (1972), Дзяржаўнай прэміі БССР (за кнігу вершаў «Варта вернасці», 1980), кавалер ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцягу, Дружбы народаў.

**Дыскаграфія: трэкі** «Зачараваная мая» (LP «Зачараваная мая» – «Мелодия», 1983), «Дзякуй лёсу» (муз. Я. Глебава), «Жар-птушка» (муз. Э. Ханка, ансамбль *«Сябры»*, абедзве ў LP «Судьбе спасибо» – «Мелодия», 1985), «Спатканне з даўняю вясной» (муз. *Валерыя Іванова*, ансамбль «Сябры» ў LP «Далёкий свет» – «Мелодия», 1986), «Я ўдзячны лёсу» (муз. І. Лучанка, у LP «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985), «Завіруха» (муз. Э. Ханка, у зборніку «20 суперхитов, рождённых в Беларуси-3» – «Bulba Records», 2000).

**Кнігі:** збор песень «Табе, Беларусь» (1984).

На падставе даведніка «Беларускія пісьменнікі», Д.П.

**«БУРЖУАЗИЯ»** – група з Мінску. Утварылася ўвосень 1992 з ініцыятывы гітарыста і вакаліста *Уладзіміра «Улада» Благуша* і Рамана Мікоціна, апрача якіх у першым складзе калектыву выступалі бас-гітарыст Мікалай Шагаў (← *«Инспектор»*, «Денди»), барабаншчык Павел Заяц (← «Линда» → *«Лявоны»*), піяніст Георгій Высоцкі (← «Линда» → «Лявоны»), гітарыст Андрэй «Грыл» (← група А. Ціхановіча–Я. Паплаўскай). Пасля ўдзелу ў праграме БТ «Рок Айленд» і некалькіх дэма-запісаў група часова спыніла дзейнасць. У чэрвені 1993 у калектыў былі запрошаны гітарыст *Сяргей Мядзведзеў*, бас-гітарыст Андрэй Лукша і барабаншчык Генадзь Дорфман. У такім складзе група праіснавала да траўня 1995, зрабіўшы запісы ў студыі *«Песняроў»*, *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, здымалася для перадач БТ. Песня «Колесо» ўзяла другое месца ў хіт-парадзе радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная», пасля чаго летам 1995 шляхі музыкаў разышліся. На аснове гэтага калектыву ў 1997 утварылася група *«Thank You Jesus»*.

**Дыскаграфія: трэк** «What You Come Here Fore» (у зборніку

«FM перехват-1» – «TON-Records», 1996).
**Кіно, відэа: кліп** «The Spy» (рэж. *Анатоль Вечар*, 1995).
24.10.05//Д.П.

**БУРШТЭЙН АЛЯКСАНДР (Бурштейн Александр, Burshtein Aleksandr)** – джазавы піяніст, аранжавальнік, кампазітар.
Нарадзіўся ў Баранавічах. Скончыў ССМШ пры БДК па класе фартэпіяна, пасля БДК па класе фартэпіяна. Працаваў у БДФ, у тым ліку музычным кіраўніком ансамбля *«Тоніка»*, кіраваў аматарскім біг-бэндам «Зеленый огонек». Рабіў аранжаванні джазавых стандартаў і твораў савецкіх кампазітараў для ансамбляў «Тоніка», *«Чараўніцы»*, эстрадна-сімфанічнага аркестру Усесаюзнага радыё і тэлебачання п/к Ю. Сіланцьева. Ад 1986 выступаў з арганізаванымі ім трыо, квартэтам, квінтэтам, з якімі ўдзельнічаў у некалькіх джаз-фестывалях, запісваўся на Беларускім радыё. Выехаў на сталае жыхарства за мяжу ў 1991.
**Гастролі, фестывалі:** у складзе ўласных джаз-комба – «Віцебская восень 1987», «Дни фортепианного джаза» (Мінск, 1988), фестывалі ў Казані і Фергане (1988).
**Кантакт:** tachana@gmail.com
23.12.06//Д.П..

**БУТЭРУС ЖАНЕТ (Бутерус Жанет, Buterus Zhanet)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару. Выступае пад сцэнічным імем Жанет.
Нарадзілася ў г. Шаўляі, Літва. Пачатковую музычную адукацыю атрымала ў Літве, жыла з бацькамі ў Фінаў (ГДР), пасля чаго пераехала ў Мінск. Тут скончыла музычную школу, БДУК па класе эстраднага вакалу. Супрацоўнічае з прадзюсэрам Г. Мельнікавым. Спявае на расейскай, беларускай, ангельскай мовах.
**Кіно, відэа: кліп** «Калыханка» (рэж. А. Шульга).
**Кантакт:** producer@janet-show.com.
22.01.06//Д.П.

**БЯЛЬЗАЦКІ ЮРЫЙ (Бельзацкий Юрий, Belzacki Jerzy)** – кампазітар, дырыжор, піяніст.
Нарадзіўся 31.12.1909 у Варшаве, памёр 31.08.1963 у Мінску. Скончыў Варшаўскую вышэйшую музычную школу імя Шапэна па класах фартэпіяна і дырыжавання. Прафесійна выконваць музыку пачаў ва ўзросце 15 гадоў, выступаючы як піяніст у варшаўскіх кабарэ. Пазней працаваў у розных калектывах, пісаў інструментальную музыку, песні. З пачаткам II Сусветнай вайны перабраўся ў Беласток, дзе ў кастрычніку 1939 з ліку польскіх музыкаў-уцекачоў сабраў аркестр. У лістападзе 1939 выступіў з гэтым аркестрам у Мінску і атрымаў прапанову арганізаваць Дзяржаўны джаз-аркестр БССР. Неўзабаве ў склад аркестру ўвайшоў трубач *Эдзі Рознер*, які стаў кіраўніком калектыву. Тым часам Ю. Бяльзацкі прыняў абавязкі дырыжора і музычнага кіраўніка. Працаваў у складзе аркестру да 1947, кіраваў ім некаторы час пасля арышту Э. Рознера. У 1948 непрацяглы час кіраваў аркестрам аперэты ў Бабруйску, затым – канцэртмайстрам у тэатры оперы і балету, Белдзяржэстрадзе. У канцы 50-х



і да апошніх дзён быў галоўным дырыжорам аркестру Беларускага радыё. Выступаў з канцэртамі, у тым ліку джазавай музыкі («Rhapsody In Blue» Д. Гершвіна), пісаў музыку для драматычных спектакляў («Хижина дяди Тома») і кіно («Міколка-Паравоз», «Впереди – крутой поворот», «Слуга народа», «Зелёные огни», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Чырвонае лісце» і інш.), сімфанічную і камерную музыку, папулярныя інструментальныя п'есы, музыку для фізкультурных парадаў. Сярод найбольш вядомых твораў аперэта «Алазанская долина», ўверцюра на беларускія тэмы для духавога аркестру, араторыя «Маёй Радзіме», сюіты на тэмы польскіх народных танцаў, рэдакцыя оперы «Князь-озеро» В. Залатарова («Пламенные сердца»), фантазіі на тэмы песень *Уладзіміра Алоўнікава*, Ц. Хрэннікава, В. Салаўёва-Сядога, песні «Розита», «Никогда», «Тайный остров», «Добрый путь».

**Гастролі:** Бельгія (1935), ЗША (сяр. 30-х), СССР.

**Кнігі:** зборнік нот «Romans w trzech tomach. Tango» («Ge-Be», Варшава).

06.12.06//Д.П., фота з архіву Л. Бяльзацкай.

**«beZ bileta»** – група з Мінску, якая ўтварылася ў 1999.

Рэпертуар заснаваны на спалучэнні шматлікіх стылёвых элементаў, песні выконваюцца на беларускай і расейскай мовах. Першапачатковы склад: Віталь «Артыст» Герасімчык – гітара, вакал, Сяргей Бакавец – гітара, вакал, Яўген «Немец» Вайткевіч – барабаны, джамбі, Ксеня Мінчанка – скрыпка, флейта, тамбурын, вакал (→ *«WZ-Orkiestra»*, 2003), Алег Русак – бас-гітара, Наста Кісялёва – флейта, вакал. У канцы 2006 у складзе калектыву працавалі Віталь «Артыст», С. Бакавец, Ганна Харчанка – віяланчэль, Таццяна Кушнер – аранжаванне, web desing, Дзяніс Стурчанка – бас-гітара, Дзяніс Шураў – барабаны, Павел Кудрын – мультыінструменталіст (← «Rosary», «Папарис», *«Jitters»*, 2006). Сярод найбольш вядомых песень «Мая краіна – Беларусь», «Лодочки», «Шла дальше», «Нарисована».

**Фестывалі:** «Spirit Of Woodstoke» (Мірапуры, Італія, 1999, 2000), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2000), «Fiesta Borealis» (Алецка, Польшча, 2006), «Przystanek» (Польшча, 2006), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2007).

**Узнагароды:** «Рок-карона 2000» у намінацыі «Дэбют году», «Рок-карона 2001» у намінацыі «Песня году» («Мая краіна – Беларусь»), спецпрыз прэсы ў конкурсе фестывалю «Fiesta Borealis» (Алецка, Польшча, 2006).

**Дыскаграфія: альбомы** – «На неба» («beZ bileta», 2001), «Нарисована» («beZ bileta», 2004), максі-сінгл «Поправка 22» («beZ bileta», 2006), «Кино» («West Records», травень 2007), Інтэрнэт максі-сінгл «КИНОкадры» (2007); **трэкі** – «Мая краіна –

Беларусь» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000).
**Кіно, відэа: кліпы** «Stop Business» (рэж. Д. Волкаў, 2002), «Stop Business remix» (рэж. Н. Ждановіч, 2003), «Лодочки» (рэж. Т. Кушнер, 2003), «Нарисована» (рэж. Т. Кушнер, 2003), «Шла дальше» (рэж. Т. Кушнер, 2004), «Смотреть вверх» (рэж. Т. Кушнер, 2004), «Место для тебя» (рэж.Т. Кушнер, 2006), «Жираф» (рэж. М. Сабураў, 2006), «Никогда не умирай» (рэж. М. Сабураў, 2007); удзел у саўндтрэку да мультфільму «Мальчик с пальчик», мастацкага фільму «Охота на пиранью» (2006), музыка да спектаклю «После» тэатру «Инжест» (2006).
**Кантакт:** менеджмэнт Віктар Пазнякоў +375 (29) 679-32-95; www.bezbileta.net
12.09.07//Д.П.

**«BLUES STREET FRIENDS»** – група з Мінску.
У залежнасці ад задачы, выступае з праграмамі рознай музыкі, выконваючы блюз, класічны рок, лацінаамерыканскую музыку. Утварылася ў 1992 у Ленінградзе з ініцыятывы мінскага гітарыста *Уладзіміра Любінскага* (← студыя *«Песняры»*, *«Рада»*, «Доктор Моро»). Праіснавала непрацяглы час, пасля чаго ў 1994 была аднаўлена У. Любінскім у Мінску. Аснова рэпертуару – блюзавыя і рокавыя стандарты, а таксама джаз, лацінаамерыканская музыка. У розны час у складзе калектыву выступалі Вадзім Чайкоў, *Вячаслаў Булда*, Аляксандр Старажук – барабаны, *Аляксандр Ванкевіч* – бас-гітара, Аляксандр Дунскі, Стэфан, Фуат «Фучык» Сулейман – вакал, з групай супрацоўнічаў *Ігар Варашкевіч* – вакал (*«Крама»*). Ад восені 2004 калектыў выступае пад назвай «Blues Street». На пачатку 2006 група складалася з У. Любінскага, Анатоля «Тофіка» Каляды – барабаны (← «Форпост», *«Нео»*), Алега Тумашова – вакал, клавішныя (← *«Ulis»*), А. Дунскага, *Валерыя Башкова* – бас-гітара (← *«Зартипо»*), Мікалая «Баршча» Драніцкага – перкусія (← *«Postscriptum»*, *«Ur'ia»*).
**Фестывалі:** «Блюз в России» (1992), «Блюз жыве ў Мінску» (1995), «Грифомания» (Мінск, неаднаразова), «Beatles Forever» (Мінск, 2004).
**Дыскаграфія: альбом** CD «Blues Street Friends» (аўт. выд., 2003).
**Кантакт:** www.bluesstreet.narod.ru; liubinski@tut.by; +375 (29) 762-27-00.
21.01.06//Д.П.

**«B.N.» («Biaz Nazvy»)**– група з г. Бярозы Брэсцкай вобл., якая выконвае музыку ў стылі пост грандж-метал, альтэрнатыва на беларускай мове.
Утварылася ў снежні 1999 і першапачаткова выступала наступным складам: Алесь Лютыч – вакал, музыка, гітара, Рамуальд Пазьняк – барабаны, Юрый Сцяпанаў – бас-гітара. Аўтар тэкстаў – Сяргей Машковіч. У 2005 склад калектыву быў наступны: А. Лютыч, Р. Пазьняк, Максім Літвінец – гітара, Алесь Зайцаў – бас-гітара (← 2004), С. Машковіч.
**Гастролі:** Польшча (2005–07).
**Фестывалі:** «Рок-кола» (Навапалацк, 2001), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2002, 2005–07), «Union of Rock» (Венгажэва, Польшча, 2006), IV Flader Pop Festiwal (Гданьск, Польшча, 2006).



**Узнагароды:** пераможца ў наміначыі «Лепшая лірычная песня» на фестывалі «Рок-кола 2001», прыз гміны Гродка ў конкурсе фестывалю «Басовішча 2002».

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Не трывай» (MC «Vigma», 2003, перавыд. «БМAgroup», 2004), «Zyvie rock'n'roll!» («БМAgroup», 2006); **трэкі** «Дзед Мароз» (у зборніку «Viza N.R.M.» – «БМAgroup», 2003), «Не трывай» (у зборніку «Наша музыка» – «Arlo Music», 2003), «Гарады» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004), «Моднікі» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006).

**Іншая інфармацыя:** менеджмэнт *Ігар Знык* znycky@hotmail.com

**Кантакт:** www.biaznazvy.com; b_n@tut.by; +375 (1643) 45-189, +375 (29) 721-40-18.

06.11.06//Г.Ш.

**«BROS. IN BLUES»** – мінская група. Склалася ў 1996 дзеля выканання кавер-версій вядомых блюзавых стандартаў і часткова арыгінальных ангельскамоўных твораў блюзага характару. У складзе калектыву працавалі: *Андрэй Казлоўскі* – гітара, вакал (← *«Сузор'е»*), *Юрый Міхайлаў* – гітара, бэк-вакал (→ *«Мадера хард-блюз»*), *Аляксей Казлоўскі* – бас-гітара, вакал (← «Сузор'е», *«Zindan»*), *Андрэй Філатаў* – барабаны (← «Сузор'е», «Zindan»). У канцы 1997 група спыніла дзейнасць.

**Фестывалі:** «Блюз за мир» (Кіеў, 1997, у адным канцэрце з групай Міка Тэйлара).

**Дыскаграфія:** збярогся канцэртны запіс 1997.

**Кантакт:** andrew_koz55@yahoo.com; +375 (29) 557-04-44 (Андрэй Казлоўскі).

14.11.06//Д.П.

**ВАЙНШТЭЙН АВЕНІР (Вайнштейн Авенир, Vainshtein Avenir)** – музыка, кампазітар, аранжавальнік, паэт, менеджэр, журналіст.

Нарадзіўся 08.07.1934 у Харкаве.

У 1960 скончыў Калінінградскую музычную вучэльню (Расея). Ад 1960 пачаў працаваць як кларнетыст/саксафаніст у розных калектывах БДФ: Дзяржаўным ансамблі танца, малых саставах, запісваўся на радыё і тэлебачанні. Пазней працаваў загадчыкам музычнай часткі Дзяржаўнага тэатру лялек, падрыхтаваў больш за 25 партытур з музыкай да спектакляў. Пісаў музыку й для драматычных тэатраў, а таксама для мюзіклу «Пінская шляхта» БТ. У 70-я – 80-я быў лідэрам *Белорусского диксиленда*, выступаў у прэсе з публікацыямі на тэмы культуры, музыкі, у 90-я наладжваў у Мінску канцэрты расейскіх музыкаў і акторaў, вёў аўтарскія праграмы на 2 канале Беларускага радыё, радыё «Би-Эй». У сакавіку 2005 у канцэртнай зале БДФ прайшла аўтарская вечарына, прысвечаная 70-годдзю з дня яго нараджэння. Ад 2006 выступае як лідэр групы «В джазе только дедушки».

**Гастролі, фестывалі:** з Дзяржаўным ансамблем танца – Сірыя, Ліван, Чэхаславакія, рэспублікі СССР, у складзе эстрадных калектываў – рэспублікі СССР.

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Белорусский диксиленд» («Ковчег», 2004), «Песни и инструментальная музыка» («Ковчег», 2005).

**Кнігі:** зборнік паэзіі і прозы «Найди себя под знаком Зодиака» («Ковчег», 2000).

**Кантакт:** +375 (17) 285-69-91.

29.07.07//Д.П.

**ВАЙЦЮШКЕВІЧ ЗМІЦЕР (Войтюшкевич Дмитрий, Vajtsiushkevich Dzmitri)** – спявак, кларнетыст-саксафаніст, выканаўца на народных інструментах, кампазітар, аранжавальнік.

Нарадзіўся 20.07.1971 у п. Бярозаўка Гродзенскай вобл. Выступае пад сцэнічным псеўданімам Тодар.

У 1990 скончыў Лідскую музвучэльню па класе кларнета, у 1995 – БУК па класе кларнета і ММВ па класе вакалу. Ад 1992 да 1998 выступаў у складзе фолк-мадэрн групы



*«Палац»*, ад 1997 да 2002 – у складзе групы *«Kriwi»*. У 2002 стаў ініцыятарам стварэння групы *«WZ-Orkiestra»*. Удзельнічаў у стварэнні, запісе і паказе супольных музычных праектаў «Народны альбом» (1997), «Сьвяты вечар 2000» (2000), «Я нарадзіўся тут» (2001). Найбольш вядомыя творы: цыкл песень «Цацачная крама» на вершы *Леаніда Дранька-Майсюка*, музыка і аранжаванні для цыклу «Балады», музыка для праграмы на вершы У. Маякоўскага, песні «Беларуска» (верш *Ларысы Геніюш*, 2001), «Шчодры вечар, сьвяты вечар» (словы народныя, 2000), «Нямецкі коцік» (аўтар тэксту невядомы, 1999), «Бруклинский мост» (верш У. Маякоўскага, 2003). Піша музыку для тэатру і кіно, у 2006 пачаў выступаць на мінскім «Аўтарадыё» як аўтар і вядучы праграмы «Простыя словы». Кіраўнік запісу і выдання зборнага альбому «Калыханкі» (2006, з ініцыятывы Беларускага прадстаўніцтва UNISEF).

**Гастролі:** у складзе «Палацу», «Kriwi» – Польшча, Італія, Нямеччына, Францыя, Украіна, Казахстан, Літва, Латвія і інш.

**Фестывалі:** «Tanz & Folkfest» (Рудольштадт, Нямеччына, 1994), «Азія дауысы» (Алматы, 1995), «Славянский базар» (неаднаразова) і інш.

**Узнагароды:** у складзе «Палацу», «Kriwi» і самастойна – лаўрэат многіх міжнародных конкурсаў этнамузыкі ў Польшчы і Нямеччыне; уладальнік «Рок-карон» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць» (1996, 1997), намінацыі «Альбом году» («Народны альбом», 1998), «Лепшы кліп» («За туманам», 2000) і «Праект году» («Сьвяты вечар 2000»), «Падзея году» («Я нарадзіўся тут», 2001), «Музыкант году» і «Традыцыі і сучаснасць» (2002), «Рок-карона 2006» у намінацыі «Спеўная паэзія» (альбом «Танга з ружай»), пераможца на цырымоніі «Мистерия звука 2006» у намінацыі «Незалежная музыка. Альбом году».

**Дыскаграфія:** у складзе «Палацу» – гл. 1996–2000; у складзе «Крыві» – гл. 1997–2000; сола – «Цацачная крама» («Ковчег», 2001), «Балады» (аўт. выд., 2002), «Паравіны году» (аўт. выд., 2003), «Паравоз каханьня» («West Records», 2004), «MW» («West Records», 2005), «Месяц і сонца» («West Records», 2005), «Танга з ружай» («West Records», 2006), «Нявыдадзенае. Песьні з доўгай шуфляды» («West Records», 2006); **трэкі** «I Want You Now» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Bella ciao!» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006), «Пасьвіла Кася коні» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006), «Дарога» (у зборніку «Прэм'ер Тузін 2006» – «West Records», 2006).

**Кіно, відэа:** «Воўк», «Зубр», «Будзе дождж» (усе – рэж. Д. Адамкевіч, 2004, Польшча), «Piano» (рэж. У. Маркевіч, 2004).

**Кантакт:** www.todar.net; todar-vojt.livejournal.com; Todar@tut.by; +375 (29) 309-49-79.

21.07.07//Д.П.

**ВАНКЕВІЧ АЛЯКСАНДР (Ванкевич Александр, Vankevitch Aliaksandr)** – бас-гітарыст, аўтар музыкі і тэкстаў, аранжавальнік, гукарэжысёр, педагог.

Нарадзіўся 08.02.1961 у Слуцку Мінскай вобл. Скончыў ММВ па класе

бас-гітары ў 1985. Ад 1985 да 1987 працаваў у складзе ансамбля *«Тоніка»*, адначасова супрацоўнічаў з мінскай групай *«Метро»*. Ад 1987 да 1990 – бас-гітарыст ансамбля *«Верасы»*. Паралельна ўдзельнічаў у іншых праектах, – напрыклад, выступаў з *Сяргеем Брыксам* і групай «Рефлекс» (1989–92). У 1992 быў запрошаны ў *Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі*, дзе выступае як музыка малых складаў і да сёння. Адначасова супрацоўнічаў з групамі *«Little Blues Band» Івана Маркава* (1993–98), *«Blues Street Friends» Уладзіміра Любінскага* (1998 да с.д.), *«Крама»* (ад 2003). Як кампазітар напісаў песні «Старый пароход» для групы «Метро», «Танцы под дождем», «Зеленый змей», «Прощай» для групы «Рефлекс», стварыў шэраг аранжаванняў для розных калектываў і салістаў. Маючы хатнюю студыю, займаецца запісам фанаграм, аранжаваннямі. Ад 2004 выкладае ў ММВ па класе бас-гітары.

**Гастролі:** у складзе «Тонікі» і ансамбля «Верасы» гастраляваў па ўсім Савецкім Саюзе.

**Фестывалі:** у складзе групы «Метро» – «Lithuanika 1985», у складзе «Little Blues Band» – «Блюз жыве ў Мінску» (1996, 1997), у складзе «Blues Street Friends» – «Грифомания» (2000, 2002, 2003).

**Узнагароды:** Гран-пры фестывалю «Lithuanika» (Вільнюс, 1985), прыз «За ўнёсак у развіццё блюзу ў Беларусі» на «Рок-каранацыі 1996» (Мінск, у складзе «Little Blues Band»).

**Дыскаграфія:** LP «Поёт Виктор Вуячич» («Мелодия», 1986), дыскі ансамбля «Верасы», дэма МС «Метро» (1986), 2 дэма МС групы «Рефлекс» (абедзве 1991), CD «Blues Street Friends» (аўт. выд., 2003), на якім выступіў як музыка і прадзюсэр.

**Кантакт:** +375 (17) 231-89-53, (29) 631-89-53.

04.05.03.Д.П.

**ВАРАНЦОЎ ДЗЯНІС (Воронцов Денис, Varantsou Dzianis)** – аранжавальнік, саўнд-прадзюсэр, піяніст, кампазітар.

Нарадзіўся 17.04.1975 у Мінску. Скончыў ММВ па класе фартэпіяна ў 1996. Супрацоўнічаў з групамі *«J:морс»*, *«Тайланд»*, *«Merry Poppins»*, *Карыянай*, Верай Карэтнікавай, *Аляксандрам Ціхановічам* і *Ядвігай Паплаўскай*, *Палінай Смолавай*, *Ларысай Грыбалёвай*, Марыэль, *Нілсам*.

**Узнагароды:** узнагарода на цырымоніі «Мистерия звука 2005» у намінацыі «Альбомы белорусских исполнителей» («Апрель» групы «J:морс»).



**Дыскаграфія:** удзел у запісе альбомаў «Апрель» групы «J:морс» («West Records», красавік 2005, перавыд. 2006) і «Босиком по мостовой» («West Records», кастр. 2006).
**Кантакт:** dzianisv@me.by
01.11.06//А.Р.

**ВАРАШКЕВІЧ ІГАР (Ворошкевич Игорь, Varashkevich Ihar)** – вакаліст, гітарыст, аўтар музыкі. Нарадзіўся 15.08.1960 у Баранавічах. Скончыў БДТМІ па спецыяльнасці інтэр'ер і абсталяванне (1987). Актыўна заняўся музыкай у 1982 у складзе групы *«Studio-7»*, у 1984 стаў адным з заснавальнікаў групы *«Бонда»*, у 1991 узначаліў групу *«Крама»*. Найбольш вядомыя песні: «Стэфка», «Тата мае рацыю», «Слуцкая брама», «Будзь разам з намі», «Бяжы, бяжы, хлопец», «Хворы на рок-н-рол», «Гэй там, налівай!», «Камэндант», «Мама», «Выпіса мной да дна», «Што дапаможа нам», «Гомельскі вальс», «Хавайся ў бульбу», «Падае дождж».
**Гастролі:** у складзе «Крамы» – Расея, Польшча (1995–99).
**Фестывалі:** у складзе групы «Бонда» – «Lithuanika» (Вільня, 1986), «Магілёў 1988», Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Наваполацк 1988», «Рок-крок» (Гродна, 1989); у складзе «Крамы» – «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1992, 2004, 2006, 2007), «Славянский базар» (1993), «Поколение» (Масква, 1994), «Visagino Country» (Літва, 1996), «Маладзечна» (1994, 1995), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2002).
**Узнагароды:** у складзе «Крамы» – пераможца «Рок-каранацыі 1994», уладальнік «Рок-карон» у намінацыях «За адданасць жанру» (1995), «Традыцыі і сучаснасць» (1999), «Альбом году» (2001, «Хавайся



ў бульбу»); пераможца «Басовішча» (1992), 1 месца ў конкурсе фестывалю «Поколение 1994».

**Дыскаграфія:** у складзе «Бонды» – гл.; у складзе «Крамы» – гл.; **трэкі** ў складзе «Бонды» – «Твая Атлантыда», «На станцыі Койданава» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990); у складзе «Крамы» – «Run Boy Run», «Baby», «Rockin' & Rollin» (у зборніку «Western Dreams» – «RTX Records», 1993), «Мама, я ўжо не той», «We Are Going Down», «Сабака», «Гэй там, налівай», «Камэндант» (у зборніку «Живые концерты на «Радио Ракурс», т.1» – «Радио Ракурс», Расея, 1996), «Enjoy The Silence» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**Кіно, відэа:** у складзе «Бонды» – «Ура!» (рэж. Г. Нікалаеў, 1988), «На станцыі Койданава» (рэж. Г. Нікалаеў, 1989); у складзе «Крамы» – «Гомельскі вальс» (рэж. Я. Хрусталёў, 1996), «Хавайся ў бульбу» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2002).

**Кантакт:** +375 (29) 665-96-72.

16.05.05//Д.П., фота Д.П.

**«ВЕРАСЫ»** – вакальна-інструментальны ансамбль, які ўтварыўся як калектыў БДФ у 1971.

На пачатку – акампанавальная група *Эдуарда Міцуля* (музычны кіраўнік *Анатоль Гілевіч*), ад 1974 – самастойная творчая адзінка на чале з *Васілём Раінчыкам.* У рэпертуары былі песні моладзевай, папулярнай тэматыкі савецкіх кампазітараў, пазней – аўтарскія творы ўдзельнікаў калектыву. У першай палове 80-х актыўна супрацоўнічаў з амерыканскім спеваком Дзінам Рыдам. У канцы 80-х калектыў пачынае эксперыментаваць з электроннымі інструментамі, выкарыстоўваць камп'ютэрную музыку. У канцы 90-х практычна перастае існаваць. Сярод удзельнікаў калектыву былі *Уладзімір Угольнік, Генадзь Старыкаў, Ірына Цвяткова, Ядвіга Паплаўская, Аляксандр Ціхановіч, Надзея Мікуліч.*

**Гастролі:** ГДР, ПНР, ЧССР, Францыя, рэспублікі СССР, Балгарыя, Лаос, Сірыя, Бельгія, Фінляндыя, тур па Забайкаллі і БАМе з Дзінам Рыдам.

**Фестывалі:** фестываль палітычнай песні (Фінляндыя, 1975), «Ален мак» (Балгарыя, 1976), фестываль памяці Віктара Хары (Фінляндыя, 1978), V фестываль дружбы моладзі СССР і ГДР (ГДР, 1980), «Залаты Арфей» (Балгарыя, 1980), «Огни магистрали» (БАМ, 1984).

**Узнагароды:** лаўрэат V Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (Масква, 1974), лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі (1980), дыпламант Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1983).

**Дыскаграфія:** EP «Верасы» («Мелодия», 1975, 1976, 1978); **альбомы** LP «Верасы» (Balkanton», Балгарыя, 1978), LP «Наша дискотека» («Мелодия», 1980), «Музыка для всех» (2 LP, «Мелодия», 1985), CD «Популярные песни прошлых лет» («Vigma», 1996); **трэкі** «Караван» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Музыка для всех» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Если любишь – найди» (у LP «Для вас, женщины» – «Мелодия», 1980), «А любовь жива» (у LP «Наша дискотека» – «Мелодия», 1980), «Завіруха» (муз. *Эдуарда Ханка*, сл. *Генадзя Бураўкіна*,



у LP «С Новым годом!» – «Мелодия». 1983), «Страдания» (у LP «Комарово». Песни на стихи М. Танича» – «Мелодия», 1986), «Ты придёшь» (у зборніку «Лирические песни на стихи Л. Ошанина» – «Мелодия», 1978), «Наша дискотека» (у LP зборніку «А любовь жива» – «Мелодия», 1980), «Наша дискотека», «Снежный человек», «Цветные сны» (усе ў LP зборніку «Лётная погода. Песни на стихи М. Танича» – «Мелодия», 1980), «Прости меня, мама» (у LP зборніку «Не разлюблю тебя. Песни на стихи Н. Шумакова» – «Мелодия», 1980), «Белая вежа» (у LP зборніку «Золотая моя Москва» – «Мелодия», 1981, у зборніку «Как слово наше отзовётся. Песни молодых композиторов» – «Мелодия», 1983), «Я у бабушки живу» (у LP зборніку «Для вас, женщины» – «Мелодия», 1981), «Нявыказаная балада» (у LP зборніку «Как слово наше отзовётся. Песни молодых композиторов» – «Мелодия», 1983).

**Кантакт:** teatr_estrady@telegraf.by (В. Раінчык).

25.04.06//Д.П. і паводле Белэнцыклапедыі.

**«ВЕРНОСТЬ»** – віцебскі калектыў, які трымаўся джазавага стылю, выконваючы джаз-рок, ф'южн, джаз, арт-рок (як аўтарскія творы, так і стандарты).

Утварыўся ў сакавіку 1978 на базе Гарадскога цэнтру культуры Віцебску. У першым складзе групы выступалі Сяргей Бачынскі – гітара, Валерый Мітчанка – гітара, Уладзімір Нікан – клавішныя, Мікалай Юрчанка – бас-гітара, Аляксандр Мязенка – барабаны, Радзівон Бас – мастацкі кіраўнік. У розныя гады ў складзе групы выступалі Генадзь Вялічка – труба, Алег Крыжанюк – саксафоны, флейта, Аляксандр Сітаў і Аляксандр Старажук – барабаны, Валерый Лаўрыновіч – клавішныя, Алег Афанасьеў – бас-гітара. Група спыніла існаванне ў снежні 1983.

**Гастролі:** Літва, Расея, Беларусь; удзел у агітпоездзе «Комсомольская правда» 1979, 1980 (тур па Заходняй Сібіры), удзел у агітпералёце «50 гадоў ваенна-транспартнай авіяцыі СССР» 1981 (Чыта, Хабараўскі край, Фергана, Азербайджан).
**Фестывалі:** «Віцебская восень» (1978–83), «Янтарная труба» (Коўна, 1980), «Юность Балтики» (Паланга, 1981), «Ліда 1982».
**Узнагароды:** II месца на фестывалі «Янтарная труба» (Коўна, 1980), прыз Г. Вялічку як лепшаму трубачу фестывалю, I месца на фестывалі «Ліда 1982».
**Кантакт:** +375 (29) 633-46-07 (А. Афанасьеў).
04.06.06//Д.П.

**«ВЕСЁЛЫЕ ЛИСЫ»** – мінская біт-група, якая базавалася ў ДК камвольнага камбінату.

Існавала ад 1967 да 1969. У калектыве выступалі Андрэй Святаславаў –



бас-гітара, вакал, Уладзімір Пад'ельскі – гітара, вакал, *Уладзімір Спірыдовіч* – гітара, вакал (→ *«Аргонаўты»*), Сяргей Дзевяткоў – барабаны, вакал. Рэпертуар калектыву складаўся з песень груп «Beatles», «Rolling Stones», «Czerwone Gitary», а таксама аўтарскіх расейскамоўных твораў удзельнікаў калектыву. Група грала на танцавальных вечарынах у ДК, выступала з канцэртамі.
**Фестывалі:** 1 фестываль біт-музыкі (Мінск, 1968).
**Кантакт:** +375 (29) 362-34-77 (У. Спірыдовіч).
28.02.07//Д.П.

**ВЕЧАР АКСАНА (Вечер Оксана, Vecher Oksana)** – журналістка, вядучая тэлевізійных музычных праграм.

Нарадзілася 25.01.1971 у г.п. Мір Карэліцкага р-ну Гродзенскай вобл. Скончыла музычную школу па класе скрыпкі (1987), МІК па спецыяльнасці методыка культасветработы (1992). У 1991 пачала працаваць на радыё, годам пазней увайшла ў склад рэдакцыі радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» ў якасці вядучай праграм «Сёмая пятніца» і «10 хвілінаў з Санай». У 1993–94 вяла аўтарскую праграму «Тры апельсіны». У студзені 1995 заснавала аўтарскую музычную праграму «Акалада», выступала аўтарам і вядучай праграм «Музыкальная обойма» (тэлекампанія «Свой круг», 1996–97), «Беларускі хіт-парад» (Белтэлерадыёкампанія, 1997–2000). Ад 2000 – рэдактар, аўтар праграмы «5x5» (тэлекампанія «Око»), ад верасня 2001 – аўтар сцэнарыя, рэдактар праграмы «Беларуская дваццатка» («Око»), ад верасня 2002 да ліпеня 2004 – вядучая праграмы «Кліп-абойма» (Белтэлерадыёкампанія), ад верасня да снежня 2004 – вядучая рубрыкі «Азбука этыкету» (т/а «Карамболь»), ад 2005 – аўтар і вядучая праграмы «Вялікая энцыклапедыя Беларусі», ад 2007 –

вядучая «Просто программы». Выступала як вядучая, суаўтар сцэнарыяў цырымоній «Рок-каранацыя», фестываляў «Рок па вакацыях».
**Узнагароды:** «Рок-карона 1998» (як сцэнарыстка, разам з *Анатолем Вечарам*) у намінацыі «Кліп году» («Охотник и сайгак» групы *«Нейро Дюбель»*).
**Дыскаграфія:** сінгл «Over грусть» (разам з групай «Happy Face»).
**Кіно, відэа:** аўтар ідэі і сцэнарыяў кліпаў «Ангел» Алега Арлова (рэж. А. Вечар, 1997), «Песенька пра каханьне» групы *«N.R.M.»* (рэж. А. Вечар, 1997), «Охотник и сайгак» (рэж. А. Вечар, 1998), «Время распрощаться» (рэж. А. Вечар, 1999), «С праздником» групы «Нейро Дюбель» (рэж. А. Вечар, 1998), «Лето» *Сяргея Кавалёва* (рэж. А. Вечар, 2001), «Зеркало» *Аляксандра Сухарава* (рэж. А. Вечар, 2000).
**Кантакт:** avecher@tut.by, +375 (29) 629-38-56.
11.07.07//Д.П.

**ВЕЧАР АНАТОЛЬ (Вечер Анатолий, Vecher Anatoliy)** – тэлерэжысёр, вядучы канцэртных і тэлевізійных праграм.
Нарадзіўся 16.07.1962 у Мінску. Скончыў ГПТВ №9 металістаў па спецыяльнасці фрэзероўшчык (1980), МІК па спецыяльнасці рэжысура тэатральнага самадзейнага калектыву (1989). У гэтым жа годзе быў прыняты ў дыктарскую групу Беларускага радыё на пасаду дыктара-практыканта. У 1990 – адміністратар Галоўнай рэдакцыі інфармацыі, вядучы праграмы «Панарама», ад 1991 – малодшы рэдактар Галоўнай рэдакцыі моладзевага вяшчання Беларускага тэлебачання, вядучы праграмы «Крок». Ад 1992 – суаўтар і вядучы праграмы «Сёмая пятніца» радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». У гэтым жа годзе выступіў як аўтар ідэі і рэдактар тэлегульні «Пяць зорак», быў вядучым праграмы «Правінцыя». Ад 1994 – рэдактар рэдакцыі музычных і пацяшальных праграм БТ, суаўтар і вядучы праграмы «Тры апельсіны», ад 1995 – аўтар і вядучы праграмы «Акалада», у 1996–97 – рэдактар праграмы «Музычная абойма» (тэлекампанія «Свой круг»), у 1997–2000 – рэдактар тэлепраграмы «Беларускі хіт-парад» (Белтэлерадыёкампанія), у 2000 – рэжысёр праграмы «5х5» (тэлекампанія «Око»), ад верасня 2001 – рэдактар «Беларускай дваццаткі» (тэлекампанія «Око»), ад верасня 2002 да ліпеня 2004 – рэжысёр праграмы «Кліп-абойма» (Белтэлерадыёкампанія). У 2005 запусціў праграму «Вялікая энцыклапедыя Беларусі», у якой выступіў як аўтар ідэі і вядучы. Вядучы, суаўтар сцэнарыяў цырымоній «Рок-каранацыя», фестывалю «Рок па вакацыях».
**Узнагароды:** «Рок-кароны 1998» у намінацыі «Кліп году» («Охотник и сайгак» групы *«Нейро дюбель»*), «Рок-кароны 1999» («За туманам», група *«Kriwi»*).
**Кіно, відэа:** рэжысёр кліпаў «За туманам» («Kriwi», 1999), «The Spy» (група *«Буржуазия»*, 1995), «Каменные джунгли» (*Ірына Відава*, 1999), «Агу, вясна» («Kriwi»), «Паветраны шар» (*«N.R.M.»*), «Ночные дожди» (*Іскуі Абалян*), «Время распрощаться» («Нейро дюбель», 1999), «Ты достал» (*«Синица»*), «Тяни-Толкай» (*«Тяни-Толкай»*), «Шапка ондатровая» (*«Экивоки»*), «Птицы» (*Алеся*, 2003), «Хавайся ў бульбу» (*«Крама»*,

2002), «Дом» (*«Новае неба»*), «Ангел» (А. Арлоў), «Гагарин» («Нейро дюбель», 1997), «Голос мамы» (*Алег Елісеенкаў*), «Импровизация в стиле буги-вуги» (*Васіль Раінчык*), «Охотник и сайгак» («Нейро дюбель», 1999), «Только с тобой» (*«Белорусские Песняры»*, 2002), «Не уходи» (*«The Ravens»*), «Песенька пра каханьне» («N.R.M.»), «Переехало комбайном» («Нейро дюбель», 1998), «Заколдованный рай» (*Анжаліка Ют*, 1998), «П.И.О.Т.К.У.К.У.К.» («Нейро дюбель», 2002), «Очень лень» (*Сяргей Кавалёў*, 2002), «Командировочный роман» (С. Кавалёў), «Неба мяняе колер» (*Кася Камоцкая* і *«Новае Неба»*), «Там, за рекою» («Парадокс»), «Зеркало» («Экивоки»), «I'm 18» (Карыяна, 2002), «Монтевидео» (*«J:морс»*, 2004), «My Galileo» (*«Аляксандра і Канстанцін»*, канцэртны варыянт, 2004), «Пара дамоў» («Аляксандра і Канстанцін», 2004), «Чердак» (*«Пани Хида»*), «Халі-галі» («Верасяты»), «С праздником» («Нейро дюбель», 1999), «Никита» («Дон Санчес»), «Самолёты» («Нейро дюбель», 1999), «Чыстае-сьветлае» («N.R.M.»), «А ў лузе» (*«Палац»*, 2003), «Запрещу тишину» (Анжаліка Ют, 2001), «Я памру тут» («Нейро дюбель», 2002), «З Новым годам!» («Нейро дюбель», 2003), «Лето» (С. Кавалёў, 2000), «Одзірыдзідзіна» («N.R.M.»), «Большая мечта» («Нейро дюбель», 2001), «Не потеряй» (Алеся, 2004), «Офицеры Беларуси» (*Анатоль Ярмоленка*), «В синее/Осень» (*«ЛОМ»*, 2005), «С чистого листа» (*Ганна Мушак*).

**Кантакт:** avecher@all.tvr.by, +375 (29) 619-38-56.

11.06.05//Д.П.

**ВІДАВА ІРЫНА (Видова Ирина, Vidova Irina)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару, аўтар тэкстаў.

Нарадзілася 15.11.1972 у Мінску. У 1993 скончыла музычна-педагагічны факультэт БДПУ імя Максіма Танка па спецыяльнасці музыка. У 1995 дэбютавала на аўтарскім вечары паэта *Аляксандра Лягчылава*, выканаўшы на ягоныя вершы песні *Алега Молчана* «Осень-досада», «Не грусти, король». Выступіла ў шэрагу тэлевізійных праграм, у клубах Мінску і Масквы. У 1998–2000 – артыстка-вакалістка Магілёўскай абласной



філармоніі, у 2000–03 супрацоўнічала з гуманітарна-творчым цэнтрам «Ювентус» Дзяржкамітэту па справах моладзі. У 2002–04 супрацоўнічала з расейскімі фірмамі «Артес продакшн», «Biz Enterprises». Рэпертуар заснаваны на расейскамоўных песнях пераважна аўтарства прадзюсэра А. Молчана. Сярод найбольш папулярных песень «Бабочки», «Любовь сказала Да!», «Лунные танцы», «Мы не чужие», «Думала», «Поцелуи», «Falling In Love», «Блондинки».

**Фестывалі:** расейска-беларускі фестываль «За Союз» (2001).
**Гастролі:** Магілёўская вобл. (1999).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Все очень хорошо» («ПанРекордз», 1999), «Улетай» («OVM Production»/«Подземка», 2002), «Любовь сказала Да!» («Vigma», 2006); **трэкі** «Улетай, душа» (у зборніку «Мешок с хитами 6: русский хит» – «Мир видео», 2001), «Мы не чужие» (у зборнику «Хит мейкер 4» – «Biz Enterprises»/«Монолит», 2003), «Поцелуи» (у зборніку «Хит мейкер» – «Biz Enterprises»/«Монолит», 2003), «Любовь сказала Да!» (у зборніку «Любовь + Хит FM» – «Biz Enterprises»/ «Монолит», Расея, 2004), «Не нужны слова» (у зборніку «Песня года Беларуси, ч.2» – «Проспект», 2005).
**Кіно, відэа: кліпы** «Города», «Близко или далеко» (абодва – рэж. *Уладзімір Максімкаў*, 1998), «Каменные джунгли» (рэж. *Анатоль Вечар*, 1999), «Это просто любовь» (рэж. А. Шульга, 2000), «Самба Листопад» (рэж. У. Максімкаў, 2006).
**Кантакт:** vidova@mail.ru
12.11.06//Д.П., фота Д.П.

**ВІНАКУРАЎ АЛЕГ (Винокуров Олег, Vinakurau Aleh)** – бас-гітарыст, вакаліст, аўтар музыкі і тэкстаў.
Нарадзіўся 03.07.1966 у Мінску. Скончыў тры курсы БПІ. У 1989 стаў адным з заснавальнікаў групы *«Flat»*, у складзе якой выступае й да сёння. Ад пачатку 2002 і да вясны 2003 аднначасова выступаў у складзе групы *«Mojo Blues»*. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Because», «Rain», «Sleeping Love», «Sunrise Above The Town».
**Фестывалі:** у складзе «Flat» – «Тры колеры» (Мінск, 1990); у складзе «Mojo Blues» – «Blues na Kujawach» (2002), «Olsztynskie nocy bluesowe» (2002).



**Узнагароды:** у складзе «Flat» – прыз «Адкрыццё году» на фестывалі «Тры колеры» (Мінск, 1990).
**Дыскаграфія: альбом** MC «Street Boogie» («Vigma», 1997); **трэкі** «The Dead of Night» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Write Me a Letter» (у зборніку «Первый Интернационал» – «Vigma», 2006), «Elizabeth» і «Write Me a Letter» (у зборніку «Рок за бобров 2005» – «West Records», 2005).
**Кантакт:** oleg@data.minsk.by; +375 (29) 620-31-55.
20.06.04//Д.П., фота К. Сарокінай

**«ВІРУС ЛІХА»** – мінская група, якая ўтварылася 25 сакавіка 1999.
Першапачаткова выступала наступным складам: Вадзім Шклярык – бас-гітара, Аляксей Тарасевіч – барабаны, Аляксей «Лешы» Машчэнікаў – гітара, Таццяна Каробка-Машчэнікава – акардэон, Сяргей Краўчанка – перкусія. Ад самага пачатку група трымалася эстэтыкі музыкі рэгей.
**Гастролі:** Масква (2003).
**Фестывалі:** «Darom» (Вільня, 2005).
**Дыскаграфія: альбомы** «Совершенно

летний концерт» (канцэртны, Масква, 2003), «Жизнь бьет ключом» (2006).
**Кантакт:** virus_liha@tut.by; virusliha.com; +375 (29) 578-49-06 (Таццяна), (29) 750-32-99 (Аляксей).
06.11.06//Д.П.

**ВЛАДА** – спявачка, працуе ў стылі эўра-пап, выконваючы песні на расейскай мове.
Нарадзілася 21.12.1984 у Мінску. У 2001 скончыла музычную школу, у 2003 – Беларускі дзяржаўны ліцэй №2, філалагічны факультэт. У тым жа годзе паступіла ў БДУК на факультэт культуралогіі, спецыяльнасць «менеджмэнт СКС». Упершыню на сцэну выйшла ва ўзросце 6 гадоў у тэлеконкурсе «Телебом», ад траўня 1996 да лістапада 2000 выступала ў складзе ансамбля «Верасяты». З 2001 займаецца сольнай кар'ерай, ад пачатку 2003 супрацоўнічае з кампазітарам Сяргеем Ждановічам.
**Гастролі:** па гарадах Беларусі.
**Фестывалі:** у складзе «Верасят» – «Славянский базар» (Віцебск), «Кинотавр», «Площадь звёзд»; сола – Міжнародны фестываль краін СНД і Балтыі ў Маскве, «Славянский базар» (Віцебск).
**Узнагароды:** лаўрэат Міжнароднага фестывалю-конкурсу краін СНД і Балтыі ў Маскве.
**Дыскаграфія: альбом** CD «Новая история» («NonStopRecords», 2003).
**Кіно, відэа: кліпы** «Не торопись» (рэж. Ц. Велітоўскі, 2004), «Я люблю тебя» (рэж. Ц. Велітоўскі, 2004), «Позову» (рэж. С. Ждановіч, 2005).
**Кантакт:** www.wlada.com; nsr@tut.by +375 (29) 622-77-12, (29) 770-29-80 (С. Ждановіч).
23.12.06//Д.П.

**ВОЛКАЎ ІГАР (Волков Игорь, Volkau Ihar)** – гітарыст, кампазітар, аранжавальнік.
Нарадзіўся 22.04.1966 у г. Ровенькі, Украіна. У 1988 скончыў Курскую музычную вучэльню, народнае аддзяленне, па класе баяна. Дэбютаваў у 1984 у складзе групы «Штат» (Курск), якая ад 1988 базавалася ў Растове-на-Доне. Ад 1990 жыве і выступае ў Беларусі, пачаўшы з эстрадна-сімфанічнага аркестру Белсаўпрафу, у складзе якога як гітарыст выступаў па 2002. Ад 1994 да 1998 паралельна выступаў у складзе групы «Гай», адначасова ад 1996 – у групе «Моби Дик», разам з якой гастраляваў па Беларусі і Польшчы. У 1996 узначаліў уласны праект – групу *«Столица»*, у якой з'яўляецца лідэрам, аўтарам большасці п'ес і аранжаванняў. За аснову твораў бярэ вядомыя тэмы акадэмічнай, рокавай і джазавай музыкі. Найбольш вядомыя творы як аранжавальніка – «Караван» Х. Цізола – Д. Элінгтана,



«Турэцкае ронда» Моцарта, «Чардаш» Монці, «Когда не хватает техники» К. Бахолдзіна, шэраг беларускіх народных песень.
**Гастролі:** Расея, Беларусь, Польшча, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Швецыя.
**Фестывалі:** «Грифомания» (Мінск, 2000–03), шэраг рэгіянальных фестываляў у 2000–02.
**Узнагароды:** прыз глядацкіх сімпатый на «Грифомании 2001»; пераможца фестывалю «Грифомания 2002» (разам з групай «Столица»).
**Дыскаграфія:** дэма «Гарэла сосна» (2000), «Смотрите в небо» (аўт. выд., 2000), «Караван» (аўт. выд., 2002), «Космический мусор» (2005, не выдадзены), «Классика» (2006, не выдадзены).
**Кантакт:** +375 (17) 259-46-07, (29) 646-77-05.
19.11.06//Д.П., фота Д.П.

**ВОЛЬСКІ ЛЯВОН (Вольский Лявон, Volski Leanid)** – гітарыст, вакаліст, аўтар музыкі і тэкстаў, аранжавальнік, паэт, мастак.
Нарадзіўся 14.09.1965 у Мінску.
У 1984 скончыў Мінскую мастацкую вучэльню, падчас навучання ў якой у 1982 стаў адным з заснавальнікаў групы *«Мроя»*. У 1994, пасля пэўных зменаў складу, ініцыяваў пераўтварэнне «Мроі» ў групу *«N.R.M.»* («Народная Рэспубліка Мроя»), у якой па-ранейшаму выступаў як асноўны аўтар музыкі і тэкстаў песень. Паралельна (1990–98) выступаў як выканаўца на клавішных у групе *«Новае Неба»*. У 1997 напісаў музыку і стварыў аранжаванні большасці твораў для супольнага музычнага праекту «Народны альбом», удзельнічаў у падрыхтоўцы, запісе і паказе супольных музычных праектаў «Сьвяты вечар 2000» і «Я нарадзіўся тут» (2001). У 2001 стаў ініцыятарам утварэння групы *«ZET»*, на працягу 2002–07 распрацаваў і напісаў большасць песень для праграм «Крамбамбуля», «Крамбамбуля 1,5: Каралі раёну», «Крамбамбуля 0,33 FM», «Крамбамбуля» сьвяточная». У канцы 2004 у складзе праекту *«Крамбамбуля»* спяваў на плошчы Незалежнасці ў Кіеве. Выступае ў прэсе як паэт, празаік, журналіст, працаваў вядучым аўтарскай праграмы «Квадракола» на радыёстанцыях «Беларуская маладзёжная» і «101,2». Сярод найбольш вядомых твораў «Песьні пра каханьне», «Тры чарапахі», «Партызанская», «Паветраны шар», «Лёгкія-лёгкія», «Я нарадзіўся тут», «Абсэнт», «Госьці».
**Гастролі:** у складзе розных калектываў – Польшча, Украіна, Францыя, Данія, Нямеччына.
**Фестывалі:** у складзе розных калектываў «Рок-крок 1987, 1988»,



«Наваполацк 1988», «Рок-дыялог» (Магілёў, 1988, 1989), «Днепрадзяржынск 1989», «Тры колеры» (Мінск, 1990), «Басовішча» (неаднаразова – Гродэк, Польшча), «Belfort-Fimu» (Бельфар, Францыя, 1993), «Фестываль народных меншасцяў» (Гдыня, Польшча, 1993), «Rock-mafia» (Сопат, Польшча), «Roskilde» (Данія, 1993) і інш.
**Узнагароды:** прыз глядацкіх сімпатый на фестывалі «Рок-крок 1988»; лаўрэат фестывалю «Наваполацк 1988»; Гран-пры, прыз у намінацыі «Лепшы клавішнік» на фестывалі «Тры колеры 1990»; «Рок-кароны» ў намінацыях «Песня году» («Партызанская») – 1996, «Альбом году» («Народны альбом») – 1997, «Рок-карона 1997», «Праект году» («Сьвяты вечар 2000») – 1999, «Песня году» («Паветраны шар») – 1999, «Музыка году», «Падзея году» (праект «Я нарадзіўся тут»), «Лепшыя тэксты», «Песня году» («Тры чарапахі»), «Альбом году» («Тры чарапахі»), «Рок-карона» – усё 2000, «Выканаўца году» на «Рок-каранацыі 2004–05».
**Дыскаграфія:** у складзе «Мроі», «N.R.M.», «ZET» – гл.; «Народны альбом» (1997), «Сьвяты вечар 2000», «Я нарадзіўся тут» (2001); у складзе «Крамбамбулі» – гл.; **трэкі** «Тры чарапахі» (у зборніках «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000; «БелКП-ПрЕСсНЯ 2000» – «Bulba Records», 2000), «Катуй-ратуй» (у зборніку «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси. Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Najnajnaj», «Ja spiewam po-polsku» (у зборніку «Сэрца Эўропы» – «БМАgroup», 2001), «Песьні пра каханьне», «Песьня падземных жыхароў» (у зборніку «Вольныя танцы» – «БМАgroup», 1999), «Мая мэнтальнасьць» (у зборніку «Вольныя танцы: новая альтэрнатыва» – «БМАgroup», 2000), «Раз, два, тры» (у зборніку «Hard-coreманія: чаду!» – «БМАgroup», 2002), «Personal Jesus», «Useless» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).
**Кнігі:** паэтычныя зборнікі «Калідор» (1993), «Фотаальбом» (1998).
**Кантакт:** www.nrm.by.com; www.krambambulya.com; lvolski.livejournal.com; lvolcki@hotmail.com; +375 (29) 652-80-81.
04.03.06//Д.П., фота Д.П.

**«ВООБРАЖАЕМЫЕ ЛЮДИ»** – калектыў з Гродна, які трымаецца стылістыкі традыцыйнага гітарнага року, часам з элементамі арт-року. Група ўтварылася 3 верасня 1993. У першым складзе калектыву выступалі *Юрый «Смур» Дубовік* – гітара, вакал, Дзмітрый Скабкароў – бас-гітара, Сяргей Коўтун – гітара, Ігар Міхневіч – барабаны. Увосень 2005 у групе выступалі Дз. Скабкароў, Ю. Дубовік, Аляксандр Яфімаў – гітара (← 1997), Сяргей Халодны – барабаны (← 2000), Канстанцін Халодны – гукарэжысёр. У аснове рэпертуару – аўтарскія расейскамоўныя песні, найбольш вядомыя з якіх «Танцы с волками», «Письма без ответов».
**Гастролі:** канцэрты ў клубах Гродна, Брэсту, Мінску, Масквы.
**Фестывалі:** фестывалі нацыянальных культур (Гродна), «Рок против фашизма» (Гродна), «Три шурупа» (Гродна), «Люби настоящее» (Мінск).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «В комнате пустой» (аўт. выд., 1994), МС

«Татуированный мозг» («Русский стиль», 1995), «Клоун с глазами змеи» (аўт. выд., 1996), «Ультрамарин» («Рек-Рекорд», 1997), МС і CD «Выход в небо» («Ковчег», 2000).
**Кіно, відэа: кліпы** «Снежная весна» (рэж. П. Вераб'ёў, 1997), «Они сделали тебя» (рэж. Я. Фалееў, 1999), «Письма без ответов» (рэж. Я. Фалееў, 1999), «Танцы с волками» (рэж. Я. Фалееў, 2000), «Тайны» (рэж. Я. Фалееў, 2000).
**Кантакт:** Smur72@mail.ru; Aleksandor_3@mail.ru; +375 (152) 50-21-41; (29) 283-93-69.
03.12.05//Д.П.

**«ВРЕМЯ»** – група з Мінску, якая ў 1976–80 працавала на базе Міжнароднага моладзевага цэнтру «Юность», што на Мінскім моры.
У складзе калектыву выступалі *Уладзімір Спірыдовіч* – гітара, вакал (← *«Аргонавты»*, *«Весёлые лисы»*), Міхаіл Кулькоў – бас-гітара (→ *«Песняры»*), *Леанід Вярэніч* – гітара, Сяргей Мазур – клавішныя, Мікалай Навумаў – барабаны. Група не трымалася нейкага аднаго стылю, у рэпертуары былі стандарты заходняй рок-музыкі і блюзу, папулярная музыка, а таксама творы, напісаныя ўдзельнікамі калектыву.
**Кантакт:** +375 (29) 362-34-77 (У. Спірыдовіч).
25.02.07//Д.П.

**ВРОНСКАЯ ВОЛЬГА (Вронская Ольга, Vronskaya Olga)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару, педагог.
Нарадзілася ў 1971. Скончыла БУК па класе харавога дырыжавання.
Сярод найбольш вядомых песень, якія выконваюцца пераважна на расейскай мове, – «Ждать тебя», «Крестики-нолики».



**Фестывалі:** «Ялта 1999», «Славянский базар» (Віцебск, 1998), «Золотой шлягер» (Магілёў, 1999).
**Узнагароды:** лаўрэат міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Ялта 1999».
**Дыскаграфія: трэк** «Ты меня не бросил» (у зборніку «Красное танго. Песни на стихи *Александра Легчилова*» – «TON-Records», 1999).
**Кантакт:** +375 (29) 650-06-32.
23.12.06//Д.П.

**ВУЯЧЫЧ ВІКТАР (Вуячич Виктор, Vujachich Viktar)** – спявак, прадстаўнік класічнай савецкай папулярнай песні.
Нарадзіўся 11.07.1934 у Харкаве, памёр у Мінску 17.09.1999. Дзяцінства правёў на Алтаі, вучыўся музыцы ў Рубцоўску. Адбываў службу

ў войску на Балтыцы, быў салістам ансамбля Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту. У 1957 пераехаў у Мінск, працаваў артыстам Бела-



рускага дзяржаўнага народнага хору, хору Белдзяржтэлерадыё (ад 1959), ад 1963 – саліст Ансамбля песні і танца ЧБВА, ад 1963 – саліст БДФ. Выступаў пераважна як выканаўца класічнай папулярнай песні ваенна-патрыятычнай тэматыкі. Значная вядомасць да спевака прыйшла пасля перамогі на Усесаюзным конкурсе артыстаў эстрады. Пазней выконваў класічныя расейскія рамансы, уваходзіў у склад журы конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Золотой шлягер» і Нацыянальным фестывалі песні і паэзіі ў Маладзечне, узначальваў «Белканцэрт». Ад 2002 падчас конкурсу на фестывалі «Золотой шлягер» штораз уручаецца спецпрыз імя В. Вуячыча.

Найбольш вядомая песня «Память сердца» (муз. *Ігара Лучанка*, сл. М. Ясеня).

**Гастролі:** разам з ансамблем *«Тоніка»* – краіны Еўропы, Афрыкі.

**Фестывалі:** «Залаты Арфей» (Балгарыя, 1967), Міжнародны фестываль сучаснай эстраднай песні (Токіо, 1973), «Золотой шлягер 1998» (Магілёў).

**Узнагароды:** І прэмія Усесаюзнага конкурсу на лепшае выкананне савецкай песні (Масква, 1966), 2 прэмія міжнароднага фестывалю «Залаты Арфей» (Балгарыя, 1967), Вялікі спецыяльны прыз міжнароднага фестывалю сучаснай эстраднай песні (Токіо, 1973).

**Дыскаграфія: трэкі** «Заклинание» (LP «Песні Ігара Лучанка» – «Мелодия», 1978), «Поле памяти» (муз. *Леаніда Захлеўнага*, сл. *Уладзіміра Някляева*, у LP «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985); **альбомы** LP «Поет Виктор Вуячич» («Мелодия», 1986), «Я столько прошёл» («Мелодия», 1987), МС «Адрес моей любви» («Ковчег»), міньён «Песня, в которой ты» («Мелодия», 1985).

**Кіно, відэа:** «С чего начинается Родина» (у кінафільме «Граница. Таёжный роман», 2002).

19.11.06//Д.П.

**ВЫДРОНАК «ФРАНЦ» ЮРЫЙ (Выдронак «Франц» Юрий, Vydronak Yuri)** – выканаўца на клавішных інструментах, гітары, аранжавальнік, спявак, даследчык фальклору, відэарэжысёр, прадзюсэр.

Нарадзіўся 10.03.1966 у Койданаве Мінскай вобл. Як музыка пачаў выступаць ва ўзросце 12 гадоў, скончыў музычную школу па класе

трубы. У 1983–84 вучыўся ў ММВ па класе валторны, у 1990 скончыў БУК па класах духавога і эстраднага дырыжавання. Быў адным з ініцыятараў стварэння рэтра-джаз бэнду «Дворец кукурузных палочек», які ў 1992 прыняў назву *«Палац»*. У складзе гэтай групы быў мастацкім кіраўніком, выканаўцам на клавішных інструментах, вядучым аранжавальнікам, адначасова да 2000 – кіраўнік грамадскага аб'яднання «Фолк-мадэрн студыя «Палац». У 1996 у межах студыі «Палац» утварыў трыо *«Kriwi»*. У 1999 заснаваў праект *«Ur'ia»*. Працаваў навуковым супрацоўнікам, даследуючы фальклор, у БУКу (2000–02), Беларускім інстытуце праблем культуры (2002–03), у навукова-даследчай лабараторыі фальклору БДУ (2003–05). Зрабіў шэраг фальклорных экспедыцый, першым у Беларусі пачаў запісваць



аўтэнтычных выканаўцаў на лічбавыя носьбіты, сабраў і рэстаўраваў больш за 50 гадзін запісаў. У 1996 прэзентаваў лекцыю і зняты ім дакументальны фільм «Вяртанне да вытокаў» ва ўніверсітэце Канстанц (Нямеччына). Сабраў, апрацаваў і выдаў кампакт-дыск аўтэнтычных калядных песень (2006). Апошні час выступае рэжысёрам кліпаў групы «Ur'ia».

**Фестывалі:** у складзе «Палацу» (гл. «Палац»), у складзе «Kriwi» (гл. «Kriwi»), у складзе «Ur'ia» – «Таўкачыкі 2000» (Мінск), «Таўкачыкі 2003» (Мінск-Любань), «Славянский базар» (Віцебск, 2001).

**Узнагароды:** у складзе «Палацу» (гл. «Палац»), у складзе «Kriwi» (гл. «Kriwi»), у складзе «Ur'ia» – «Рок-кароны 2000, 2006» у намінацыі «Традыцыя і сучаснасць».

**Дыскаграфія:** у складзе «Палацу» – гл.; у складзе «Kriwi» – гл.; у складзе «Ur'ia» – гл.

**Кіно, відэа: кліпы** «Весначуха-балбатуха» (рэж. *Анатоль Вечар*, Юрый Выдронак, 2000; тое ж – рэж. Ю. Выдронак, Польшча, 2005), «Курка-рабушка» (рэж. Ю. Выдронак, 2006).

**Кантакт:** ur_ia@yandex.ru; ur_ia@yahoo.com; +375 (29) 669-75-19, (17) 256-75-19.

14.10.06//Д.П.

**ВЫДРЫН АЛЯКСАНДР (Выдрин Александр, Vydrin Aliaksandr)** – джазавы піяніст, кампазітар. Нарадзіўся ў 1964 у Мінску. Скончыў ССМШ пры БДК па класах фартэпіяна і дырыжавання, ММВ па класе фартэпіяна (1983). Джаз пачаў выконваць ад 1981, з канцэртамі выступае ад 1987. У рэпертуары – уласныя версіі



джазавых стандартаў, аўтарскія творы. Выступаў у дуэце з флейтыстам Міхаілам Сапожнікавым, з трыо, а таксама сола. У канцы 90-х з'ехаў за мяжу, жыве і працуе ў Нямеччыне.

**Фестывалі:** у складзе трыо фестываль «От рока к джазу» (Мінск, 1987), у складзе дуэту «Дни фортепианного джаза» (Мінск, 1989), сола на фестывалі фартэпіяннай імправізацыі (Крамянчуг, 1989).

**Узнагароды:** лаўрэат джаз-фестывалю «Хрустальный лев» (Львоў, 1989).

05.02.05//Д.П., фота А. Нямыцкага.

**ВЯРЦІНСКІ АНАТОЛЬ (Вертинский Анатолий, Viartsinski Anatol)** – паэт, журналіст, крытык, драматург, перакладчык.

Нарадзіўся 18.11.1931 у в. Дзямешкава Лепельскага р-ну. У 1956 скончыў аддзяленне журналістыкі філфаку БДУ. Працаваў у рэдакцыях шэрагу раённых газет, ад 1962 – у Мінску. Літработнік, загадчык аддзелу «ЛіМу», ад 1967 – літкансультант па паэзіі СП БССР. У 1975–82 – сакратар праўлення СП БССР, у 1986–90 – галоўны рэдактар «ЛіМу».

З вершамі ўпершыню выступіў у друку ў 1951. Аўтар многіх зборнікаў паэзіі. Вершы пакладзены на музыку *Яўгенам Глебавым*, *Леанідам Захлеўным*, *Ігарам Лучанком*, Дз. Смольскім, К. Цесаковым, *Эдуардам Зарыцкім*. Найбольш вядомая песня «Два полі» (муз. *Эдуарда Ханка*, вык. ансамбль *«Сябры»*).

**Дыскаграфія: трэкі** «Баллада о сожженной деревне» (муз. *Валянціна Бадзьярава*, ансамбль «Сябры» ў LP «Всем на планете» – «Мелодия», 1978), «Два полі» («Сябры» ў LP «Судьбе спасибо» – «Мелодия», 1986, у LP «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985).

Паводле даведніка «Беларускія пісьменнікі».

**ВЯРЭНІЧ ЛЕАНІД (Веренич Леонид, Verenich Leonid)** – гітарыст, спявак.

Нарадзіўся 20.05.1956 у Сарнах Ровенскай вобл., Украіна. У 1978 скончыў факультэт фізікі БДУ. Ігрой на гітары авалодаў самастойна. Падчас навучання ва ўніверсітэце выступаў у шэрагу студэнцкіх калектываў, у тым ліку ў групе *«Время»*. У 1979–84 працаваў як музыка ў Цюмені, Расея. У 1984–85 – удзельнік групы камсамольска-моладзевай кавярні «Сузор'е», у 1985–96 – гітарыст АМА і БДФ, у тым ліку ўдзельнік групы «Планета». У творчасці схіляецца найперш да блюзу, супрацоўнічаў і запісваўся з шэрагам блюзавых, рокавых і джазавых калектываў



(з *«Крамай»*, *«Apple Tea»*). Аўтар песні «Время», якая ў 1989 актыўна раціравалася на беларускім радыё і радыё «Люблін» (Польшча). Выступае й як студыйны музыка.
**Фестывалі:** у складзе групы «Планета» – Усесаюзны конкурс артыстаў эстрады (Масква, 1989), у складзе розных калектываў – неаднаразовы ўдзельнік фестываляў «Блюз нарадзіўся ў Мінску».
**Дыскаграфія: трэк** «Сябра мой Вярэніч Лёнік» (у альбоме «Крамы» «Хавайся ў бульбу» – «Bulba Records»/«БМAgroup», 2001).
**Кантакт:** +375 (17) 260-62-21, (29) 610-27-53.
07.04.07//Д.П., фота Д.П.

**«VELD»** – віцебская група.
Утварылася на пачатку 1995. Выконвае музыку ў стылі дэз/трэш метал.
**Гастролі:** Украіна-Беларусь (2005).
**Дыскаграфія: альбомы** MC «Time Is Now», CD «Infested With Rats Life» («Fatal Ecstasy Prod.», 2005), «End Of All» (2006).
**Кіно, відэа:** DVD «Pure Hatred – Live Ecstasy».
**Кантакт:** www.veld.by; catholicall@rambler.ru
10.12.06//М.Ж.

**«VICIOUS CRUSADE»** – мінская група, якая ўтварылася ў сакавіку 1996 і выступае ў стылі класічнага хэві-метал.
Першапачатковы склад: Дзмітрый Басік – вакал, гітара, Аляксей Верцель – гітара, Аляксей Гладыш – барабаны, Павел Рэўноў – бас-гітара, Алена Гаршчук – вакал. У 1997 на месца А. Гаршчук прыходзіць Алена Горных, у 2000 П. Рэўнова замяняюць Сяргей «Маркус» Адзінец і Баграт Вартанян.



У 2004 у складзе калектыву выступаюць Дз. Басік, А. Верцель, А. Гладыш – барабаны, клавішныя, С. Адзінец – бас-гітара, Б. Вартанян – скрыпка, Таццяна Лабода – вакал (← 2002).
Рэпертуар заснаваны на аўтарскіх

песнях, якія выконваюцца на ангельскай і беларускай мовах.
**Гастролі:** гарады Беларусі (1997–98), Масква (1999), Кіеў (2002).
**Дыскаграфія: альбомы** MC «Life That Kills» («Legion Productions», 1996), mini-MC «Facts Of Vice» («Legion Productions», 1997), MC «The Unbroken» («Legion Productions», 1999), CD «Messiah... Isn't It Me?/Faces of Vice» («Metal Records», 2001), CD/MC «Forbidden Tunes» («Metal Records», 2002); **трэкі** «Hymn To My Dying Land» (у зборніку «Legion» magazine compilation», 1997), «Theodore's Song» (у зборніку «M» magazine compilation, 1999), «Тодарава песня» (у зборніку «Hard Life – Heavy Music 1» – «БМAgroup», 2001.
**Кантакт:** www.vcrusade.com; ustinoff@vcrusade.com; dmitry@vcrusade.com; арганізацыя канцэртаў alex_vertel@mail.ru (А. Верцель).
27.07.04//A.I.

**«WEEPING TWILIGHT»** – група з Мінску, якая ўтварылася ў 1997 дзеля выканання музыкі ў стылі готык фолк-метал.

Па першым часе выступала пад назвай «Twilight». У пачатковым складзе ўдзельнічалі Аляксандр Глякаў – бас-гітара, вакал, Дзяніс Голін – гітара, вакал, Андрэй Куніца – вакал, Ягор Чалубееў – гітара, Алена Сімалацэр – вакал, Яўген Пляшэвіч – барабаны. На пачатку 2006 калектыў складаўся з А. Глякава (адначасова група «Damned Icon»), Віталя Абрамовіча – гітара (адначасова *«Нейро дюбель»*, «Crystal Lake»), Міхала Васількова – барабаны, Аляксея Бобрыкава– гітара (адначасова «Ossuary» і «Electricity»), Таццяны Васільковай – клавішныя. Удзельнік фіналу конкурсу на фестывалі «Басовішча 2007» (Гродэк, Польшча). Рэпертуар заснаваны на аўтарскіх беларускамоўных песнях.
**Фестывалі:** «Massa-Brutto» (Мінск), «No Presents for Christmass» (Мінск), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007).
**Дыскаграфія:** дэма «Twilight» (аўт. выд., 2001), MCD «Воддаль ад твару багоў» (аўт. выд., 2002).
**Кантакт:** www.weepingtwilight.com; twilight@tut.by; +375 (29) 765-01-32.
21.07.07//Д.П.

**«WHITESTREAM-X»** – група з Оршы, якая трымаецца стылю хард-энд-хэві.

Утварылася на пачатку 90-х. Група складалася з наступных музыкаў: Міхаіл Осіпаў – вакал, гітара, Мікалай Бахцін – гітара, Аляксандр Шаўцоў – барабаны, Уладзімір Лягаеў – бас-гітара, Дзмітрый Сямёнаў – клавішныя. Рэпертуар засноўваўся на аўтарскіх ангельскамоўных песнях.
**Дыскаграфія: трэкі** «I'm Crying», «Hi There», «Lost Chance» (у зборніку «Western Dreams» – «RTX Records», Вялікабрытанія, 1993).
30.07.07//Д.П.

**«WOLAND»** – група з Брэсту.

Утварылася ў 1990 складам: Анатоль Харытонаў – гітара, вакал, Мікалай Бегер – гітара, Аляксандр Пастаялка – бас-гітара, Сяргей Цімошык – барабаны. Працавала ў стылі нью-уэйв, арт-рок, псіхадэлік. У 1995 лідэр групы А. Харытонаў выступаў пад гэтай




жа назвай з музыкамі групы «Варштат» Віталем Жоглавым – бас-гітара, Дзмітрыем Пятручыкам – барабаны, Алегам Смірновым – клавішныя. У 1999 да групы далучылася флейтыстка Марына Карпук (Кунц). Неўзабаве пасля гэтага група спыніла існаванне. А. Харытонаў – пастаянны бас-гітарыст, клавішнік і гукарэжысёр групы *«Садъ»*, як сесійны музыка выступаў у групах «Рэспубліка ШКІД», *«Андрей Янушкевіч & Пополам»*, «Лайда» (Масква), прадзюсаваў запіс электрычнага альбому *Кацярыны Хасаншынай*.

**Дыскаграфія: трэкі** «Птицы» (у зборніку «Брест-рок-журнал» – «Брестон», 1998), «Охранник» (у зборніку «Брест-рок-журнал 2» – «Брестон», 1999, у зборніку «Я в Бресте» – «Art Classic Company», 2003), «Reggae» (у зборніку «Фиолетовым по сиреневому» – «Радио Би-Эй», 2000).

**Кантакт:** +375 (162) 42-94-94.

04.03.04//Г.Ш., фота А. Леўчука

**«WOLFSHADE»** – брэсцкая група, якая выконвае готык-метал з элементамі сімфанізму.

Утварылася ў 1992 пад назваю «Gladiator» і першапачаткова выконвала тэхна-трэш, выступаючы складам: Сяргей Стахоўскі – вакал, Уладзімір Стахоўскі – бас-гітара, Алег Юзэфовіч – гітара, Дзмітрый Худынюк – барабаны. У 1995 група «Gladiator» спыніла існаванне, і ў 1998 на яе аснове была створана група «Wolfshade», у склад якой увайшлі Сяргей (гітара) і Уладзімір (клавішныя) Стахоўскія, Вячаслаў Філімонаў – бас-гітара, Дз. Худынюк, А. Юзэфовіч. У 2000 у склад калектыву ўвайшоў Юрый Колычаў (← *«Удар»*), у 2002 групу пакінулі Дз. Худынюк і В. Філімонаў. У лютым 2004 да групы далучыліся Сяргей Ручкін – барабаны




і Станіслаў Сюзеў – бас-гітара (адначасова – *«Pulsar»*). Пры гэтым Ю. Колычаў з'яўляецца адначасова й лідэрам групы *«Pulsar»*. У 1998 група выступала ў праграме «Metal Shock» на адкрытай пляцоўцы мінскага парку Чалюскінцаў.

**Дыскаграфія: альбомы** дэма МС «Sun of The Sleepless» («S.L.L. Prod», Польшча, перавыд. «Sound Age», Масква, 2000; «Blacksmith», Іркуцк, 2000); МС «Bats in The Belfry» («Deathbell», Мінск, 2002), «Samhain» («Deathbell», Мінск, 2002); **трэкі** «Prophecy» (у зборніку-дадатку да «Музыкального журнала», №6/2001), «Blood» (для трыб'юту «Gods Tower» – «БМAgroup», 2005), «Win The Enemies» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», Брэст, 2006).

**Кантакт:** wolf_brest@mail.ru; +375 (29) 720-64-97 (Сяргей).

21.10.06//Г.Ш., фота А. Салановіча.

**«WZ-ORKIESTRA»** – мінскі калектыў, які акампануе *Зміцеру Вайцюшкевічу*.

Утварыўся ў 2002. Аснову калектыву ствараюць Зміцер Вайцюшкевіч – вакал, кларнет, гітара, Ксеня Мінчанка – скрыпка, дадатковы спеў (← *«beZ bileta»*, 2003), Алег Івановіч – гітары, дадатковы спеў, Аляксандр Шувалаў – баян, Вячаслаў Сяргеенка – кантрабас, бас-гітара, *Андрэй Лабчэўскі* – фартэпіяна (адначасова *«Дилижанс»*), Юрый Мартынаў – перкусія. З калектывам супрацоўнічалі Дзмітрый Бударын – трамбон, Алесь Пузыня – скрыпка і інш.

**Гастролі:** гл. З. Вайцюшкевіч.

**Фестывалі:** гл. З. Вайцюшкевіч.

**Дыскаграфія:** гл. З. Вайцюшкевіч.

**Кантакт:** гл. З. Вайцюшкевіч.

05.11.06//Д.П.

# Г

**«ГАЕР»** – мінская група, рэпертуар якой засноўваецца на кавер-версіях твораў класічнай рок-музыкі, а таксама аўтарскіх песнях.
Утварылася ў 1997 з ініцыятывы барабаншчыка *Вячаслава Булды* (← *«Песняры»*). Акрамя яго, у першапачатковым складзе выступалі Сяргей Крывашлык – гітара, Валерый Лакціёнаў – гітара, Юрый Аляшаў – бас-гітара, Ігар Вайцяхоўскі – вакал (→ 1998). Ад 1998 да 2000 вакалістам групы быў Андрэй Талкачоў, ад 2000 да 2001 – Алена Золатава.
**Фестывалі:** «Грифомания» (1999, 2000), «Рок-маневры» (2001), удзел у радыёконкурсе «Музычны рынг» (2001).
**Дыскаграфія:** дэма-сінглы «Облака», «Песенка», «Беларусь», «Одиночество»; **трэк** «Never Let Me Down Again» разам з *Аляксандрам Памідоравым* (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).
**Кантакт:** +375 (17) 263-22-89 (В. Булда), 211-90-79 (В. Лакціёнаў).
06.09.03//Д.П.

**ГАЛАЎКО ВАЛЕРЫЙ (Головко Валерий, Golovko Larry)** – піяніст, кампазітар, аранжавальнік, аўтар тэкстаў.
Нарадзіўся 06.09.1958 у Кіраваградзе, Расея. У 1977 скончыў Гомельскую музычную вучэльню, у 1977–79 адбываў вайсковую службу ў аркестры ганаровай варты БССР. У 1984 скончыў Ленінградскі інстытут культуры па класах фартэпіяна і саксафону, пасля чаго працаваў выкладчыкам эстраднага аддзялення МІК па класах аранжавання і фартэпіяна. У 1985–87 – піяніст у складзе ансамбля *«Песняры»*, у 1988 адыходзіць ад музыкі, у 1990 ад'язджае ў ЗША, дзе займаецца бізнэсам. Вярнуўся ў Беларусь у 1998. Выступіў з аўтарскімі канцэртамі ў Ленінградзе (1984, разам з аркестрам эстраднага аддзялення ЛДІК), Мінску – праграмы «Славянские мальчики» (2003, разам з *Дзяржаўным канцэртным аркестрам*



*Беларусі*) і «Три Ивана» (2005, разам з Прэзідэнцкім аркестрам Беларусі). Піша песні на расейскай мове. Сярод найбольш вядомых «Шапокляк», «Музыка», «Старый мотив», «Осенний дождь», «Мама», «Сонет №66» (верш У. Шэкспіра), «Исповедь поэта», «Славянские мальчики», «Три Ивана».
**Гастролі:** у складзе трупы «Звёзды СССР» па Заходняй Еўропе (10 канцэртаў), ЗША (40 канцэртаў), Канадзе (8 канцэртаў); у складзе «Песняроў» – СССР.
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Исповедь» (аўт. выд., 1999), «Славянские мальчики» (2002, не выдадзены), «Глаза – это песня души» (2004, не выдадзены).
**Кіно, відэа:** музыка да фільмаў «Loneliness» (2001), «Cobwebby» (2004), «Zero-gravity» (2006) – усе вытворчасці Галівуду; **кліп** «Мама» (рэж. І. Пашкевіч, 2000), DVD «Три Ивана» (аўт. выд., 2005).
**Кантакт:** +375 (29) 690-69-06.
03.10.06//Д.П.

**«ГАЛЕРЕЯ СНОВ»** – група з Гомелю, якая ўтварылася ў 1989. Пачаткова выступала пад назвай «Квентин Дорвард», выконвала інструментальную музыку ў стылі нэа хард-року, пазней – прагрэсіў-року. У першым складзе групы выступалі *Іван Піліпенка* – гітара, *Аляксандр «Софікс» Сафонаў* – барабаны, Ігар Голубеў – бас-гітара. Склад калектыву неаднаразова мяняўся. Група спыніла існаванне ў 1997.
**Гастролі:** канцэрты ў шэрагу гарадоў Беларусі.
**Фестывалі:** «Арт-сессия» (Гомель).
**Дыскаграфія:** MC дэма-альбомы «Для друзей» (1993), «Мечта по заказу» («Ковчег», 1995), «Примитив» (1997); **трэкі** ўваходзілі ў дэма-зборнікі «Ренессанс гитары» (1995, 1997, 2000).
12.02.06//N.N.

**ГАРАЧКА ЮРЫЙ (Горячко Юрий, Garachka Yuri)** – вакаліст, аўтар музыкі і тэкстаў, гукарэжысёр. Нарадзіўся 01.05.1972 у Мінску. Скончыў хімічны факультэт БДУ ў 1994. У 1992 даў першыя акустычныя канцэрты на кватэрах, заклаўшы асновы групы *«Кали Юга»*. Як лідэр гэтага калектыву ўвосень 1994 даў першы публічны электрычны канцэрт. У 1996 група перамагла падчас фестывалю «Рок-факультэт» і зрабіла запіс першага альбому. Гукарэжысёр Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі ад 2004. Піша песні на расейскай мове. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Дороги», «Золото», «Белая рубаха».



**Фестывалі:** у складзе групы «Кали Юга» – фестывалі «Блюз жыве ў Мінску» (1997), «Калининград In Rock» (Расея, 1999).
**Дыскаграфія:** у складзе групы «Кали

Юга» – гл.; **трэк** «В прицеле твоего ружья» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).
**Кіно, відэа:** у складзе «Кали Юга» – музыка да дакументальнага фільму «Легенды Беларусі» (Белтэлерадыёкампанія, 2000, не выдадзены); **кліпы** «Дом» (рэж. К. Марозаў, 2000), «Белая рубаха» (2001).
**Кантакт:** +375 (29) 639-48-69; yuzik_18@mail.ru (Ю. Гарачка).
28.03.05//Д.П.

**ГАРАЧЫ КАНСТАНЦІН (Горячий Константин, Harachy Kanstantsin) –** піяніст, аранжавальнік.
Нарадзіўся 22.01.1974 у Мінску, атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю, актыўна займаўся самаадукацыяй. У 1990–91 выступаў у складзе групы «Линда», ад 1993 да 2001 працаваў у *Дзяржаўным канцэртным аркестры Беларусі,* адначасова, ад 1993 (з перапынкам) – у складзе джаз-групы *«Apple Tea»*. Удзельнічаў у канцэртных паказах праграм *Іны Афанасьевай, Ірыны Дарафеевай*, рабіў аранжаванні для




*Валерыя Дайнэкі,* І. Афанасьевай і інш., запісваўся для альбомаў *Аляксея Шадзько*, В. Дайнэкі, *Валерыя Галаўко, Дзмітрыя Даўкша* і інш.
У 2004 перайшоў працаваць у групу *«Харлі»*. Актыўна запісваецца як сесійны музыка.
**Гастролі:** у складзе «Харлі» – Расея, Украіна, Беларусь.
**Фестывалі:** у складзе «Apple Tea» – джаз-фестывалі «Birstonas» (Літва, 1994), «Rein Kultur» (Бон, Нямеччына, 2002).
**Дыскаграфія:** у складзе «Apple Tea» – гл. 1996–2006; з А. Шадзько – гл. 1997–2002; з Дз. Даўкшам «Я верю» (2002); з В. Галаўко «Исповедь» (аўт. выд., 1999) і інш.
**Кіно, відэа:** VS «Angry Girls» («CDL Music», 1998).
**Кантакт:** +375 (17) 211-82-31, +375 (29) 611-82-31.
10.03.06//Д.П., фота Д.П.

**ГАРЫНА ЗОЯ (Гарина Зоя, Garina Zoja)** – спявачка, кампазітар, паэтка.
Пачынала як выканаўца расейскамоўнай аўтарскай песні пад прозвішчам Пархамчук, дала шэраг сольных канцэртаў, у тым ліку ў Цэнтральным доме актора ў Маскве. У сярэдзіне 90-х пачала запісвацца і выступаць з групай, працуючы ў стылі блюзу і сучаснага рамансу. Аўтар музыкі і тэкстаў песень, якія выконвае на расейскай і беларускай мовах. Разам са Славам Ковалем заснавала ў Гомелі прадзюсэрскі цэнтр «Банк-нота». Сярод найбольш вядомых песень – «Можешь дотронуться».
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Улыбка луны» («Ковчег», 1999), CD «Зеркало души» (аўт. выд., 2001),

**трэк** «Можешь дотронуться» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000).
**Кантакт:** +375 (29) 651-42-13.
03.03.07//Д.П.

**ГЕНІЮШ ЛАРЫСА (Гениюш Лариса, Geniush Larisa)** – паэтка.
Нарадзілася 27.07 (09.08) 1910 у б. маёнтку Жлобаўцы Ваўкавыскага р-ну Гродзенскай вобл., памерла 07.04.1983 у г.п. Зэльва Гродзенскай вобл. Пісаць вершы пачала ў 1935. Скончыла польскую гімназію ў Ваўкавыску, у канцы 1937 з мужам выехала ў Прагу, дзе друкавалася ў беларускамоўных выданнях. У 1948 разам з мужам была прымусова вывезена ў Мінск, дзе ў лютым 1949 засуджана на 25 гадоў папраўчапрацоўных лагераў. Выйшла на волю ў траўні 1956. Пераехала ў Зэльву, дзе жыла, не прыняўшы савецкага грамадзянства, да самай смерці.
**Дыскаграфія:** «Жывем» (вык. *«Песняры»*, аўт. выд., 2000), CD трыб'ют «Жыць для Беларусі» (розныя выканаўцы, «БМAgroup», 2005);
**трэк** «Беларуска» (муз. *Зміцера Вайцюшкевіча*, вык. Вераніка Круглова, у альбоме «Я нарадзіўся тут» – выд. А. Сушы, 2000).
**Кнігі:** «Ад родных ніў» (Прага, 1942), «Невадам з Нёмана» (Мінск, 1967), «На чабары настоена» (Мінск, 1982), «Белы сон» (Мінск, 1990).
На падставе даведніка «Беларускія пісьменнікі», Д.П.

**ГЕРАСІМОВІЧ АЛЯКСАНДР (Герасимович Александр, Gerasimovich Alex)** – гітарыст, гукарэжысёр.
Нарадзіўся 14.06.1955 у Мінску. У 1979 скончыў МРТІ, цягам трох гадоў навучаўся ў ММВ. Творчы шлях пачаў у складзе групы *«Эльфы»* (1977–78). Ад 1980 да 1984 быў гітарыстам групы «Квадрат». У 1985–86 выступаў у складзе групы *«Тоніка»*, у 1987 заснаваў першую ў Мінску кааператыўную студыю гуказапісу «Дублёр». У 1991 пераехаў на сталае месца жыхарства ў ЗША, дзе ў 1998 адкрыў студыю гуказапісу «Дублёр 2». Цяпер – удзельнік музычнага праекту «Damn Russians». Жыве ў Нью-Йорку. Як студыйны гітарыст запісваўся з *Ігарам Лучанком*, *Эдуардам Ханком*, ансамблямі *«Чараўніцы»*, «Рефлекс», *Аляксандрам Саладухам*, *Дзмітрыем Яўтуховічам*, як гукарэжысёр удзельнічаў у запісах груп *«Сузор'е»*, *«Сябры»*, «Рефлекс», *Аляксандра Растопчына*, Аляксандра Саладухі, дуэту *Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч*, *Яраслава Еўдакімава*, *Віктара Вуячыча* і інш.
**Гастролі:** цягам 1985–86 у складзе групы «Тоніка».
**Дыскаграфія:** CD «Sea Port Album. Alex Gerasimovich & Joel Kaminer» (1996).
**Кантакт:** Doubler2AG@netscape.net; agerasimovich@netscape.net
24.12.06//Д.П.

**ГЕРАШЧАНКА ЮРЫЙ (Геращенко Юрий, Herashchanka Yuri)** – піяніст, аранжавальнік, кампазітар.
Нарадзіўся 18.07.1976 у Мінску. Скончыў СШ №102 з музычным ухілам (1991), ММВ па класе фартэпіяна (1995), БУК па класе фартэпіана (2000). У 1997 удзельнічаў у стварэнні Тэатру моладзевай эстрады, працаваў музыкам ансамбля, у 1998 быў артыстам Ансамбля песні

і танца Унутраных войскаў, ад 1999 – артыст эстраднага аркестру УУС Мінгарвыканкаму. Адначасова ў 1995 узначаліў групу *«Новые джазеры»*. Ад 2006 – музыка групы, якая акампануе *Ірыне Дарафеевай*. Аўтар інструментальных кампазіцый «To You», «Посвящение А.С.».

**Фестывалі:** у складзе «Новых джазеров» – «Беларуская музычная восень 1995», Беларускі фестываль эстрадных аркестраў (1997, 1999, 2001), FIMU (Францыя, 2001), «Грифомания» (Мінск, 2002), «Саксомания» (Мінск, 2003).

**Кантакт:** gerajazzer@rambler.ru, +375 (29) 750-05-95.

10.03.07//Д.П.

**ГІЛЕВІЧ АНАТОЛЬ (Гилевич Анатолий, Gilevich Anatoli)** – піяніст, аранжавальнік.

Нарадзіўся 09.01.1940, памёр у Мінску 15.02.1999. У 1973–78 выступаў як піяніст у складзе ансамбля *«Песняры»*, пазней – піяніст аркестру



Мінскага цырку, ад 1987 – піяніст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*.

**Дыскаграфія:** гл. «Песняры»; LP «Минский эстрадный оркестр» («Мелодия», 1986).

03.03.07//Д.П., фота В. Лабко.

**ГІЛЕВІЧ НІЛ (Гилевич Нил, Gilevich Nil)** – паэт, перакладчык, драматург, фальклярыст, грамадскі дзеяч.

Нарадзіўся 30.09.1931 у в. Слабада Лагойскага р-ну Мінскай вобл. Пісаць вершы пачаў у 1940. У 1951 скончыў Мінскую педагагічную вучэльню, у 1959 – філфак БДУ. Ад 1960 – выкладчык кафедры беларускай літаратуры БДУ. Ад 1968 дацэнт, ад 1978 прафесар БДУ, у 1980–89 – першы сакратар праўлення СП БССР. Аўтар першага ў Беларусі вянка санетаў («Нарач», 1964). Музыку на ягоныя вершы пісалі М. Аладаў, *Уладзімір Буднік*, *Яўген Глебаў*, *Эдуард Зарыцкі*, *Ігар Лучанок*, *Эдуард Ханок*, Дз. Смольскі і інш.

**Узнагароды:** кавалер ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцягу, Дружбы народаў, Кірылы і Мяфодзія 1-й ступені (Балгарыя), Югаслаўскай зоркі са стужкай, лаўрэат міжнароднай прэміі імя Хрыста Боцева (1986), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (за кнігу паэзіі «У добрай згодзе», 1980).

**Дыскаграфія: альбом** «Пад родным небам. Песні Эдуарда Зарыцкага на вершы Ніла Гілевіча» («Ковчег»); **трэкі** «Палынная ростань» (LP зборнік «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Шуміце, бярозы» (муз. Э. Ханка, ансамбль *«Сябры»* ў LP «Шумите, берёзы» – «Мелодия», 1984).

На падставе даведніка «Беларускія пісьменнікі», Д.П.

**ГЛЕБАЎ ЯЎГЕН (Глебов Евгений, Glebow Ewgenij)** – кампазітар.
Нарадзіўся 10.09.1929 у Раслаўлі Смаленскай вобл., Расея, памёр 16.01.2000 у Мінску. Скончыў БДК па класе кампазіцыі А. Багатырова ў 1956. У 1953–56 выкладаў у ММВ, ад 1971 – выкладчык па класе кампазіцыі БДК. Сярод вучняў – *Васіль Раінчык*, *Ірына Цвяткова*, *Уладзімір Кандрусевіч*, Сяргей Бельцюкоў, *Дзмітрый Далгалёў*. Аўтар опернай, балетнай, сімфанічнай і камернай музыкі, музыкі для кіно і драматычных спектакляў, эстрадных інструментальных твораў і песень. Прафесар БДК (1984), акадэмік Міжнароднай славянскай акадэміі навук, адукацыі, мастацтваў і культуры (ад 1994).
**Узнагароды:** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1970).
**Дыскаграфія: трэкі** «Встреча» (сл. *Уладзіміра Арлова*, ансамбль *«Верасы»*, у LP «Верасы» – «Balkanton», 1978), «Белый парус» (сл. Б. Акуджавы, ансамбль «Верасы», у EP «Верасы» – «Мелодия», 1980, у «Наша дискотека» – «Мелодия», 1980), «Юмореска», «Летняя гроза», «Облака надежды», «Ночной дилижанс», «Улыбка» (*Мінскі эстрадны аркестр*, LP «Минский эстрадный оркестр» – «Мелодия», 1986) ), «Я ўдзячны лёсу» (сл. *Генадзя Бураўкіна*, у LP «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985, «Судьбе спасибо» ансамбля *«Сябры»* – «Мелодия», 1986).
**Кіно, відэа:** «Отрывки из ненаписанного» (рэж. *Уладзімір Арлоў*, «Тэлефільм», 2000)
03.03.07//Д.П.

**ГЛОБУС АДАМ (Глобус Адам, Hlobus Adam)** – мастак, журналіст, паэт, выдавец.
Нарадзіўся 29.09.1958 ў Койданаве Мінскай вобл. Сапраўднае імя – Уладзімір Адамчык. Скончыў Мінскую мастацкую вучэльню ў 1977 па спецыяльнасці выкладчык малявання і чарчэння, у 1982 – БДТМІ па спецыяльнасці манументальнае мастацтва. З артыкуламі на музычныя тэмы пачаў выступаць у прэсе ад 1979, друкаваўся ў часопісах «Крыніца», «Бярозка» і інш. выданнях.
**Дыскаграфія:** CD «Песні» («Ковчег», 2003); **трэкі** «На станцыі Койданава» (група *«Бонда»*, у зборніку «Хіт-парад «Беларускай Маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Божа, забяры маё жыцьцё», «Узыйдзі на гару», «Чарга па хлеб», «Ты прыходзіш», «Ёсьць», «Котка», «Сон у трамваі» (група *«Новае неба»*, у зборніку «Песьні розных гадоў» – «Ковчег», 1999), «Чарга па хлеб», «Замова», «Ёсьць», «Ты прыходзіш» (група «Новае неба», у альбоме «Дзеці чорнага гораду» – «Ковчег», 1991), «Сон у трамваі» (група «Новае неба», у альбоме «Сон у трамваі» – «Ковчег», 1994), «Чорная котка» (група «Новае неба», у альбоме «Цэпэліны» – «Ковчег», 1999), «Сіні апэльсын» (група *«Garadzkija»*, у аднайменным сінгле і альбоме «Nelehal» – аўт. выд., 2003).
**Кантакт:** +375 (29) 636-60-45; hlobus@litara.net, adam-hlobus.livejournal.com.
25.12.04//Д.П.

**«ГЛЮКІ»** – група з Магілёву. Выступае ў стылі панк-року, выконваючы ўласныя песні, напісаныя пераважна на беларускай мове.

У канцы 2005 выступала наступным складам: Аляксей «Лёпа» Паронкін – гітара, вакал, Раман «Рамэо» Жыгараў – бас-гітара, вакал, Рыгор «Грыф» Грыбаноўскі – барабаны, Марына Грыбаноўская – клавішныя.

**Дыскаграфія: альбом** CD «Humanoid» («Ковчег», 2007).

**Кантакт:** www.morok.ru

11.10.07//Д.П.

**«ГОЛАЯ МАНАШКА»** – мінская група. Утварылася ў канцы 1998 і першапачаткова выступала пад назвай «Дзень незалежнасці».

У музыцы групы спалучаюцца стылёвыя прыкметы гранджу, рэгей, панку. У 2006 выступала наступным складам: Фёдар «Крыс» Жывалеўскі – вакал, гітара, Дзмітрый «Орандж» – барабаны, Васіль – гітара, Павел – бас-гітара.

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2001).

**Дыскаграфія:** дэма-альбом «Папараць-кветка» (2003), спліт «Неба блакітнае»/«S.D.M.» – «demo» (2007), **трэкі** «Стандарты маралі» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМAgroup», 2002), «Лясная песня» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004), «Павязаны» (у зборніку «Дні лятуць. Песьні з-за кратаў» – «БМAgroup», 2005).

**Кантакт:** www.goman.iatp.by

15.05.07//Д.П.

**«ГОНГ»** – гомельская група, якая абрала за аснову выкананне стандартаў і аўтарскіх твораў у стылях соўл і фанк-року на ангельскай і расейскай мовах.

Утварылася ў 1979 з ініцыятывы гітарыста *Аляксандра Цыганка* і барабаншчыка, вакаліста Ігара Курашова, музыкаў, што выйшлі са складу ВІА *«Молодость планеты»*. Да іх далучыліся Уладзімір Ігнацьеў – гітара, Юрый Саломенка – бас-гітара. У канцы 1980 група спыніла існаванне.

20.02.06//А.Ц.

**«ГРУППА ВАЛЕНТИНА БАДЬЯРОВА»** – мінскі калектыў, які ў 1973 сабраў былы ўдзельнік ансамбля «Песняры» скрыпач *Валянцін Бадзьяраў*.

Сярод іншых у групе выступалі піяніст *Васіль Раінчык*, бас-гітарыст і вакаліст *Аляксандр Ціхановіч*, вакаліст *Валерый Дайнэка*. Група праіснавала нядоўга. Падрыхтаваную праграму мастацкая рада Белдзяржфілармоніі не прыняла з ідэалагічных меркаванняў, і музыкі разышліся па іншых калектывах. У 1983 ансамбль вярнуўся на сцэну пад назвай «Группа Валентина Бадьярова-2».

**Дыскаграфія:** EP «Группа Валентина Бадьярова» («Мелодия», 1983), LP «Дискоклуб 14. Группа Валентина Бадьярова» («Мелодия», 1985); **трэк** «Диалог» (у LP «Группа В. Бадьярова-2» «Дискоклуб 14 А» – «Мелодия», 1985, у LP «Парад ансамблей» – «Мелодия», 1985), «Музыкальный дом», «Может, это не любовь», «А я первую зову», «Уже не скрыть любовь», «Ближе к лету», «Твоя любовь» (усе на сл. У. Харытонава), «Мир для двоих»

(сл. *Уладзіміра Някляева*), «Любить друг друга» (сл. Р. Раждзественскага) – усе ў LP зборніку «Дискоклуб 3. Первая пластинка» – «Мелодия», 1981).

07.10.06//Д.П.

**ГРУПА ІГАРА САФОНАВА** – мінская джаз-група.

Утварылася ў 1983 на базе ансамбля музыкаў, якія працавалі ў АМА Мінску ў рэстарацыі «Каменная кветка» ў сярэдзіне 80-х. Лідэрам калектыву і асноўным салістам стаў альт-саксафаніст *Ігар «Стэф» Сафонаў*. Ансамбль трымаўся стылістыкі сучаснага джазу з ужываннем элементаў фальклорнай і этнічнай музыкі, выконваючы творы з рэпертуару «Yellowjackets», «String Connection», «Deep Purple», Ч. Паркера, М. Дэвіса, Ч. Мінгуса, Э. Гарнера ў аўтарскіх аранжаваннях, а таксама творы ўдзельнікаў калектыву. Першапачатковы склад: І. Сафонаў, *Уладзімір Ткачэнка* – гітара, скрыпка, сітар, Леанід Златкін – клавішныя, Юрый Пікус – рытм-камп'ютэр, *Барыс Бернштэйн* – бас-гітара. У 1989 Ю. Пікуса замяніў Валерый Камко – барабаны, Л. Златкіна – *Ігар Палівода.* У 1989 музыкі групы ўвайшлі ў склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі* як самастойны ансамбль салістаў пад неафіцыйнай назвай *«Пятый угол»*. Асноўныя творы: «Танец русалак» і Сюіта на тэмы беларускіх народных песень (У. Ткачэнка), «Misty» (Э. Гарнер), «Samurai Samba» («Yellowjackets»), «Four» (М. Дэвіс), «Ostinato» (Ч. Мінгус), «Berolino Foxtrot» (К. Дэнбскі), «Smoke on The Water» («Deep Purple»).

**Фестывалі:** джаз-фестывалі «Віцебская восень» (1986–89), «Birstonas» (Літва, 1988), «Крывы Рог 1989», «Джаз на Днепре» (Днепрапятроўск, 1988).

**Дыскаграфія: альбом** МС «Misty. Памяці Стэфа» («Ковчег», 1996).

06.09.03//Д.П..

**ГРЫБАЛЁВА ЛАРЫСА (Грибалева Лариса, Hrybaliova Larysa)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару, вядучая тэлевізійных і канцэртных праграм.

Нарадзілася 20.10.1973 у Віцебску. У 1994 скончыла Віцебскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці настаўніца пачатковых класаў, у 1999 – БУК па спецыяльнасці артыстка-вакалістка. У верасні 1994 была запрошана салісткай-вакалісткай у *Дзяржаўны канцэртны аркестр*



*Беларусі*, дзе працуе й цяпер. У 1995 стала вядучай тэлевізійнай музычна-забаўляльнай праграмы БТ «Все нормально, мама!», у 1999 была запрошана весці разам з Ю. Нікалаевым штотыднёвую тэлепраграму «Утренняя почта» (канал ОРТ, Расея). У 2001 выступіла з аўтарскай пацяшальнай праграмай «В постели с Ларисой Грибалевой» (8 канал, Мінск), ад 2002 – вядучая праграмы «Добрай раніцы, Беларусь» (1 нацыянальны канал). Спявае на расейскай і беларускай мовах. Найбольш вядомыя творы ў рэпертуары «Что-нибудь», «Новости».
**Гастролі:** Польшча, Італія, Расея.
**Фестывалі:** Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна 1994», у 1995–2006 – «Славянский базар».
**Узнагароды:** лаўрэат 2 прэміі конкурсу маладых выканаўцаў на Нацыянальным фестывалі песні і паэзіі «Маладзечна 1994»; прэмія ў намінацыі «Лепшая PR-персона» Першага нацыянальнага конкурсу ў галіне развіцця сувязяў з грамадскасцю.
**Дыскаграфія: альбом** CD «Что-нибудь» (2003).
**Кіно, відэа: кліпы** «Что-нибудь» (рэж. Я. Хрусталёў, 2004), «Я гуляю» (рэж. *Уладзімір Янкоўскі*, 2004), «Новости» (рэж. Я. Хрусталёў); удзел у здымках мастацкіх фільмаў «Привет от Чарли-трубача» (рэж. У. Грамацікаў), «Каменская» (рэж. Ю. Мароз), серыялаў «Закон» (рэж. Веляздзінскі), «Земля, небо...» (рэж. Сяргееў), «Воскресенье в женской бане» (рэж. Д. Астрахан, 2005), «На свете живут добрые и хорошие люди» (рэж. Д. Астрахан, 2006).
**Іншая інфармацыя:** у канцы 2004 адкрыла «Святочнае бюро Ларысы Грыбалёвай», якое займаецца падрыхтоўкай і правядзеннем семінараў, канферэнцый, прыватных і карпаратыўных свят.
**Кантакт:** gribaleva@tut.by; +375 (29) 634-22-08 (Таццяна).
25.09.05//Д.П.

**ГРЫШКО ВАЛІК (Гришко Валик, Grishko Valik)** – спявак, аўтар музыкі і тэкстаў, прадзюсэр.
Нарадзіўся 15.03.1968 у Мінску. Адукацыя – сярэдняя, выступаць на сцэне пачаў ад 1988. Да 1993 быў удзельнікам груп нефармальнага аб'яднання «Белорусский климат» і *«Drum Ecstasy»*. У 1993 распачаў сольную кар'еру. У ліпені 1992 выступіў як арганізатар і ўдзельнік музычнага фестывалю «КГ-сердитый праздник». Піша музыку для кіно і тэатру: спектакль «За закрытыми дверями» (Моладзевы тэатр, Мінск, рэж. В. Катавіцкі, 1993), мастацкі фільм «Легенда из небытия» («Беларусьфільм», 1993), выступае з клубнымі канцэртамі, у тым ліку па-за межамі Беларусі: «African National Unity Office» (Капенгаген, Данія, 1991), «AV-Art Gallery» (Капенгаген, 1991), «Tacheles» (Берлін, 1994), клубах Францыі і Іспаніі. Ад 2006 – дырэктар тэлеканалу «MTV Беларусь». Найбольш вядомыя творы «La-la-la», «Solei». У 2004 у складзе групы Валіка Грышко выступалі: В. Грышко – вакал, праграмінг, акустыка; Арцём Раменны – гітара, Андрэй «Граф» Чугуноў – бэк-вакал, бас-гітара, праграмінг.
**Дыскаграфія: альбомы** CD «La-la-la» (аўт. выд., 2001), «Solei» (аўт. выд., 2002); **трэкі** «Што за месяц» (у зборніку «Песнярок» –

«ПанРекордз», 1997), «Yellow» (у зборніку «Дети Солнца. Солнечная музыка» – «Children of The Sun» /«Bulba Records», 2001), «На далонях вясны» (у зборніку «Прэм'ер Тузін 2006» – «West Records», 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Солей» (рэж. В. Грышко, 2003), «Чап» (2003); хатняе відэа «Laily Day».
**Кантакт:** valikozo@tut.by
25.11.06//Д.П.

**ГУЛАЙ АЛЯКСАНДР (Гулай Александр, Gulaj Aliaksandr)** – кампазітар, аранжавальнік, мультыінструменталіст, педагог.
Нарадзіўся 28.01.1958 у Гомелі. Скончыў 4 класы ДМШ №5 Гомелю па класе баяна, дзе выступаў у складзе дзіцячага ВІА «Пеўнікі» як гітарыст, бас-гітарыст і барабаншчык. Пасля скончыў ССМШ пры БДК і БДК па класе баяна. Падчас службы ў войску (1981–83) выступаў у складзе ансамбля «Дорога к дому». Ад 1988 – кіраўнік ансамбля *«Узоры»* Гомельскага РДК. У 1991 пры Гомельскім палацы піянераў арганізаваў дзіцячы джаз-фолкавы калектыў. У 1994 сабраў джазавы калектыў, у складзе якога сам выступае як піяніст. У якасці акардэаніста ўдзельнічае ў праекце «Фальклорная музыка народаў свету», які падае кельцкую, цыганскую, бразільскую, габрэйскую музыку і творы кампазітараў-класікаў, як выканаўца на бас-балалайцы працуе ў фальклорным гурце «Скарб». Апошнім часам выступае як акардэаніст блюзавай групы *«Al Narrator Orchestra»*. Выкладчык каледжу мастацтваў імя *Нестара Сакалоўскага*.
**Фестывалі:** у складзе «Al Narrator Orchestra» – «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005).
**Узнагароды:** у складзе «Al Narrator Orchestra» – лаўрэат 1 прэміі ў конкурсе на фестывалі «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005).
11.04.06//N.N.

**ГУЦІН ЛЕАНІД (Гутин Леонид, Gutsin Leanid)** – кампазітар, аранжавальнік.
Нарадзіўся 16.06.1948 у Гомелі. Скончыў БДК па класе кампазіцыі П. Падкавырава ў 1974. Працуе ў жанрах сімфанічнай, камернай музыкі, піша песні, займаецца аранжаваннямі эстраднай і джазавай музыкі. Сярод найбольш вядомых твораў – уверцюра-фантазія «Раймонда» (музычны жарт паводле матываў песень Р. Паўлса для літаўры сола і вялікага камернага аркестру, у суаўтарстве з *Ігарам Палівода*м, 1985).
**Дыскаграфія:** як аранжавальнік – трэкі «Мікіта» (МС *«Рэнесанс»* – «Ковчег», 1994), «Muskrat Ramble», «Oh, Lady Be Good», «Чаму ж нам не пецъ?!» («Рэнесанс», CD «Swing Station» – «West Records», 2001).
23.02.06//Д.П.

**«GARADZKIJA»** – мінская група, якая ўтварылася ў 2002 і, згодна з вызначэннем яе лідэра, выконвае «сучасную гарадзкую музыку».
Калектыў выступае наступным складам: *Піт Паўлаў* – лідэр, вакал, гітара (адначасова *«N.R.M.»*, *«Pete-Paff»*), Алесь «Алезіс» Дземідовіч – барабаны, дадатковы спеў (адначасова «N.R.M.»), Аляксей «Рудольф» Рудаў – бас-гітара, дадатковы спеў,



Дзяніс Савік – гітара. Група была адзначана Гран-пры падчас зборнага канцэрту «Генэралы айчыннага року 2004».
**Дыскаграфія:** сінгл «Сіні апэльсын» (аўт. выд., 2003), **альбом** CD «Nelehal» (аўт. выд., 2003); **трэкі** «Адчуваю цябе» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Так ці не?» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004).
**Кіно, відэа: кліпы** «Як манэкен» (рэж. В. Чыжоў, 2004), «Каўбасіць і плюшчыць» (рэж. Ю. Стаюнічаў, 2007).
**Кантакт:** www.garadzkija.net; petepaff@tut.by; +375 (29) 677-17-66.
26.01.05//Д.П., фота Д.П.

**«GODS TOWER»** – група з Гомелю, якая дэбютавала ў 1989, сабраўшыся з ініцыятывы гітарыста Аляксандра Уракава.
Першапачаткова, да канца 1992, выступала пад назвай «Chemical Warfare». Склад 1992: А. Уракаў, Уладзімір «Леслі Найф» Наважылаў – гітара, вакал, Юрый Сіўцоў – бас-гітара, Уладзіслаў Сальцэвіч – барабаны. Група працавала ў стылі дэс/трэш-метал з элементамі гоцік-дум, пазней перайшла на стыль паган гоцік дум-метал з ужываннем фальклорных матываў. У складзе калектыву выступалі Аляксандр Эрыстаў – гітара (← лета 1994 → лета 1995), Дзмітрый Аўчыннікаў – клавішныя (← травень 1995). У 2000 групу пакінулі Дз. Аўчыннікаў і Ю. Сіўцоў, замест якіх у верасні прыйшлі бас-гітарыст Валерый Навасельцаў (← «Entry», «Voodoo», *«TT-34»*) і піяніст Сяргей Сяргейчыкаў («Voodoo»). Рэпертуар калектыву засноўваўся на аўтарскіх ангельскамоўных, часам – беларускамоўных песнях. Група спыніла існаванне летам 2002. 14.12.2003 памёр А. Уракаў. Большасць музыкаў выступае цяпер у складзе групы *«Rasta»*.
У 2006 «БМА-group» выдала 2CD «Tribute To Gods Tower», запісаны з удзелам калектываў з Беларусі, Расеі, Украіны.
**Гастролі:** Чэхія (1994), Украіна (1995, 1997), Расея (1997), Малдова (1997), Латвія (2000), Літва (2000).
**Фестывалі:** «Хайдэнбург» (Нямеччына, 1996), «Pepsy Sziget» (Вугоршчына, Будапешт, 2000).
**Дыскаграфія: альбомы** MC «Demolition Tape» (дэма, 1992), «The Eerie» (1993, перавыд. CD «Metal-Agen»/«Союз», Расея, 1997), «Canticles» (1993), CD «The Turns» (1994, перавыд. «Mordid Noizz», Польшча, 1997; «MetalAgen»/«Союз», Расея, 1998), «Ebony Birds» («Sturmesflugel»/«Prophesy Production», Нямеччына, 1998), «Abandon All Hope» (2002), «The Anthology» (2002), «The Greatest Arrows» (2004); **трэкі** «Immortal Dancing Hits» (у зборніку «Golden

Ballads Compilation. Vol.1», 1995), «Music Pause» (у зборніку «Golden Ballads Compilation. Vol.2», 1996), «Tops of the Devil» (у зборніку «Golden Ballads Compilation. Vol.1», 1997), «A Tribute to АРИЯ» (1997), «Ухвала сонца» (у зборніку «Hard Life – Heavy Music» – «БМAgroup», 2001).

**Кіно, відэа: кліпы** «Beyond Praying» (1994), «The Eerie» (1997), «An Eye For An Eye» (1997), VC «Twilight Lives 94-97».

19.09.06//Д.П.

**«GOLDPRICK»** – віцебская група, якая ўтварылася ў лютым 1999 дзеля выканання музыкі ў стылі грынд. У першым складзе калектыву выступалі Дзяніс «Батон» Хоцькін – бас-гітара, Дзмітрый «Шуберт» Шубара – гітара, Дзмітрый «Драгон» – голас, *Максім «Макс» Жукаў* – барабаны. У канцы 2006 група выступала як трыо: Дз. Шубара, Дз. «Драгон», М. Жукаў, выконваючы ўласныя песні на ангельскай мове. Цягам гадоў далі шэраг канцэртаў у клубах Віцебску, Мінску.

**Фестывалі:** «Затерянный мир 7» (Мінск, 2000).

**Дыскаграфія:** спліт MC «Goldprick» – «IQ 0,666»/«Brute Chant» – «Defect God» («Moral Insanity Prod.»/ «Maniacal Brutality Prod.», Беларусь/ Латвія, 1999), спліт MC «Goldprick» – «IQ 0,666»/«Brilliant Coldness» – «Messengers Of Godness Importality» («Bloodhead Prod.», Украіна, 2003); асобныя **трэкі** выдаваліся ў зборніках MC «Blow Up This Town, vol.1» («BUTT Rec.», Беларусь, 2000), CD «Российский панк-обстрел 2» («Neuro Empire Rec.», Расея, 2001), «Ушанаваньне Залатому Ярылу» (у зборніку «Hard Life – Heavy Music» – «БМAgroup», 2001), MC «Blow Up This Town, vol.2» («BUTT Rec.», Беларусь, 2002), MC «Punks vs Hardcore, vol.1» («BUTT Rec.», Беларусь, 2002), MC «Hellfire, vol. 5.2» («CDM», Расея, 2002), CD «Hardcore Respublika» («Aist Records», Беларусь, 2003).

**Кантакт:** www.zhukov.tv; goldprick@tut.by; 210032, а/с 11А, Віцебск, Беларусь, Жукаву Максіму Леанідавічу.

24.12.06//М.Ж.

# Д

**ДАВЫДОЎСКІ УЛАДЗІМІР (Давыдовский Владимир, Davydouski Uladzimir)** – гітарыст, спявак, журналіст.

Нарадзіўся 16.03.1964 у Мінску.

У 1984 скончыў Мінскую мастацкую вучэльню па спецыяльнасці мастак-педагог, у 1994 БДУ па спецыяльнасці журналістыка. Адзін з заснавальнікаў групы *«Мроя»*, у складзе якой выступаў ад 1981 да кастрычніка 1989. У 1992 заснаваў групу «Вялікае княства», у складзе якой выступаў як аўтар слоў і музыкі, гітарыст і спявак. Суаўтар песень «Стары храм», «Настальгія», «Белая вежа», «Ён яшчэ вернецца», «Я – рок-музыкант», «Покліч сурмы» і інш. з рэпертуару «Мроі»; «Свіцязь», «Каралеўна», «Зіма», «Рэквіем» і інш. з рэпертуару групы «Вялікае Княства».

**Гастролі, фестывалі:** гл. «Мроя» (1981–89).

**Узнагароды:** I прэмія на фестывалі «Тры колеры» (1990).

**Дыскаграфія:** гл. «Мроя» (1981–89); у складзе «Вялікага Княства» – МС «Голас Дажджу» (1993), CD «The Best. 1992–2004» (аўт. выд., 2004); **трэкі** «Каралеўна», «Свіцязь» (у зборніку «Легенды Вялікага княства» – «БМАgroup», 2001).

**Кіно, відэа:** у складзе «Мроі» **кліп** «Я – рок-музыкант» (рэж. Г. Нікалаеў).

**Іншая інфармацыя:** сябра СП Беларусі.

**Кантакт:** +375 (17) 233-60-25, (29) 697-60-80; dasu@list.ru, 3force.info.

19.06.05//Д.П.

**ДАДЗІЁМАЎ ІГАР (Дадиомов Игорь, Dadiomov Igor)** – педагог, джазавы гітарыст, кампазітар.

Нарадзіўся 05.03.1949 у Мінску, памёр 27.11.2002, пахаваны ў Ізраілі. У 1973 скончыў БДК па класе баяна Р. Назаранкі. Ад 1975 выкладаў у ДМШ №1 Мінску, паралельна выступаў у складзе мінскіх джаз-калектываў. Адзін з арганізатараў у 1977 Мінскага клубу аматараў джазавай музыкі, у якім выступаў з лекцыямі і канцэртамі. У 1980 са стану здароўя пераехаў у Сочы, дзе выкладаў класічную і джазавую гітару ў мясцовай музычнай вучэльні.

У 1992 пераехаў у Ізраіль, выкладаў у кансерваторыі гораду Беер-Шэва, выступаў з канцэртамі, у тым ліку ў дуэце з гітарыстам Гідонам Херцам. Актыўна працаваў у Саюзе кампазітараў Ізраілю, супрацоўнічаў з дырэктарам Ізраільскага музычнага цэнтру, музыкам і музыказнаўцам Душанам Міхалакам. Сярод найбольш вядомых твораў – п'еса «Frost».

**Фестывалі:** ад 1980 штогадова фестывалі ў Мінску, Маскве, Сочы, Эйлаце.

**Дыскаграфія:** дэма CD «Fantazy» (сумесна з Херцам, аўт. выд., 2000), сола «Post Scriptum» (2002).

**Кнігі:** ноты твораў, выдадзеных Ізраільскім музычным цэнтрам (IMC): Scherzo, for piano, 1990, 3:00; Romance No. 1, for guitar solo, 1977, 4:30; Romance No. 2, for guitar solo,

1982, 1:20; Romance No. 3, for guitar solo, 1992, 3:00; Romance for Two Guitars No. 3, 1992, 1:30; Three Romances, for guitar solo, 1977–92, 9:00; Jewish Fantasy, for guitar solo, 1993, 5:00; Capriccio, for guitar solo, 1995, 6:30; Gipsy Dance, for guitar solo, 1992, 4:00; Milonga, for guitar solo, 1997, 2:00; Journey, for guitar solo, 1983, 3:10; Frost, for guitar solo, 1975, 3:00; Chopin's Prelude No. 4, arr. 1993, 1:30; Study, for guitar solo, 1994, 1:00; Blues Study No. 1, for guitar solo, 1994, 1:30; Blues Study No. 2, for guitar solo, 1994, 1:30; Blues For Wes, for guitar & bass guitar, 1995, 4:00; Blues for S., for electric guitar, 1995, 6:00.

25.02.07//Д.П.

**«ДАЙ ДОРОГУ»** – група з Брэсту, якая выступае ў стылі еўра-панку. Утварылася ў 1998, першапачаткова выступаючы наступным складам: Юрый Стыльскі – гітара, тэксты, музыка, Васіль Капылоў – вакал, Кірыла Скам'ін – бас-гітара, Алег Фядоткін – барабаны. Ад 2002, пасля сыходу В. Капылова, група выступае як трыо з падтрымкай менеджэра Уладзіміра Ёдава, выконваючы ўласныя песні на расейскай мове, найбольш вядомыя з якіх «На Ямайке», «Баба-гром».

**Гастролі:** Украіна (2004).

**Дыскаграфія: альбомы** «20 см» («GO-Records», 2004), «На морозе!» («GO-Records», Гомель, 2005), «Supersession» («Special Radio»/ «Syntez Records», 2007), **сольны альбом Ю. Стыльскага** «Акустика 1» («Дай Дорогу», 2005); **трэкі** «Ехали мы, ехали» (у зборніку «Брест-рок-журнал» – «Брестон», 1999), «Я в Бресте» (у зборніку «Я в Бресте» – «Art Classic Company», 2002), «02», «Баба-гром», «Supersession»,



photo by Jodov Vova

«Аптечка» (у зборніку «Я в Бресте-2» – «Art Classic Company», 2003), «Она не знала» (MP3), «На Ямайке» (MP3+відэа) – у зборніку «Жёлтые страницы Интернета» («Агентство Владимира Гревцова», жнівень 2003), «Баба-гром» (MP3), «Она не знала», «На Ямайке» (відэа), «На Ямайке» (MP3 ремікс, «Агентство Владимира Гревцова»), «На Ямайке» (у зборніку «Жёлтые страницы Интернета», рэмікс MP3 + відэа, «Агентство Владимира Гревцова», лістапад 2003), «На Ямайке», «Баба-гром», «Она не знала» (у зборніку-дадатку да маскоўскага часопісу «Хакер», MP3, жнівень 2003), «На Ямайке» (у зборніку «Бешеные бабки» – «REAL Records», 2003; у зборніку «Recomendated Records №14», Масква), «На колёсах» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», Брэст, 2006).

**Кіно, відэа: кліпы** «Прыгай в коляску!» (рэж. У. Ёдаў, 2003), «На Ямайке» (рэж. У. Ёдаў, 2003), «Она не знала» (рэж. У. Ёдаў, 2003), «20 см.» (рэж. У. Ёдаў, 2004), «Новый год» (рэж. У. Ёдаў, 2004).

**Кантакт:** www.daidarogu.com; jodov@mail.ru**;** +375 (29) 723-98-39; Брэст, 224023, вул. Маскоўская, 267/3, кв. 5, УладзімірКівачук.

21.09.07//Г.Ш., фота У. Ёдава.

**ДАЙНЭКА ВАЛЕРЫЙ (Дайнеко Валерий, Dayneka Valeri)** – альтыст, вакаліст, аранжавальнік, педагог.

Нарадзіўся 29.11.1951 у Рудзенску Мінскай вобл. У 1959 паступіў у 1 клас ССМШ пры БДК, якую скончыў як альтыст. У старшых класах школы пачаў выступаць у групе *«Менестрели»* у якасці вакаліста. У 1970 быў прыняты адразу на 3 курс ММВ; атрымаў спецыяльнасці альтыста і педагога. Скончыў БУК па класе харавога дырыжавання (1988). У часе вучэльні выступаў у ансамблях мінскіх рэстарацыяў, працаваў у складзе эстрадна-джазавага вакальнага квартэту аркестру Беларускага радыё п/к *Барыса Райскага.* Ад 1972 да 1976 быў удзельнікам ансамбля «Ровесник» п/к Б. Скугарэўскага і групы *Валянціна Бадзьярава.* У 1976 – у складзе ансамбля «Червона рута» С. Ратару, разам з якім упершыню выступіў за мяжой. Ад 1977 да 1992 – вакаліст і альтыст ансамбля *«Песняры»*. Выступаў як саліст-вакаліст джаз-групы *«Пятый угол»*. Ад 1992 да 1997 – саліст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, дзе, апрача праграм эстрадных песень, падрыхтаваў і праграму з твораў джазавай класікі. У сярэдзіне 90-х разам з *Інай Афанасьевай* і групай «Пятый угол» выступаў з праграмай габрэйскай музыкі. Ад 1998 – у складзе ансамбля *«Белорусские Песняры»*. У 1996 пачаў выкладаць эстрадны і джазавы вакал у Мінскім інстытуце сучасных ведаў (сярод



вучняў – саліст групы *«Харли» Яўген Чалышаў*), выступаў як вядучы тэлевізійнай праграмы «Воскресный вечер с Валерием Дайнеко», запісваўся з шэрагам вядомых выканаўцаў краіны. Спявае на беларускай, расейскай, ангельскай мовах. Сярод найбольш вядомых твораў «Беловежская пуща», «Зачарованая мая», «Послушайте», «Калыханка», «Я все тот же»; аранжавальнік шэрагу акапэльных песень, у тым ліку «Ой, дзе ж мы ходзім», «А дзе была вуціца» для ансамбля «Песняры» і інш.
**Гастролі:** у складзе ансамбля «Чэрвона рута» – ГДР, ЧССР (1976); гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры».
**Фестывалі:** гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры».
**Узнагароды:** гл. «Песняры».
**Дыскаграфія:** гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры»; МС «Blasted» (саўндтрэк, муз. *Аляксандра Растопчына*, 1994), CD «Исповедь» (муз. *Валерыя Галаўко*, аўт. выд., 1999), **сольныя** CD «Буду помнить» («Квадро Диск», Расея, 2002), «Беларускі альбом» («Белорусские Песняры Рекордз», 2004), «Минск-Москва» («Алмазов продакшн», Расея, 2006), «Банальный сюжет» (2006).
**Кіно, відэа: кліп** «Погоди» (рэж. *Уладзімір Максімкаў*).
**Кантакт:** valeradaineko@rambler.ru
07.11.06//Д.П.

**ДАЛГАЛЁЎ ДЗМІТРЫЙ (Долгалёв Дмитрий, Dolgalev Dmitry)** – кампазітар, аранжавальнік, піяніст. Нарадзіўся 28.12.1962 у Гродне. Скончыў ССМШ пры БДК па класе кантрабаса ў 1981, БДК па класе кампазіцыі *Яўгена Глебава* ў 1987. Служыў у войску, дзе кіраваў ансамблем «Ровесник». У другой палове 80-х выступаў як піяніст групы «Красные звёзды». Ад 1989 працаваў у музычнай рэдакцыі Беларускага радыё, ад 2000 – артыстам ансамбля «Бліскавіца», ад 2003 – музыка ансамбля *«Песняры»*. Цяпер на творчай працы. Працуе ў жанрах сімфанічнай, опернай і камернай музыкі, піша электронную музыку, музыку для кіно і радыёспектакляў, эстрадныя песні, аўтар інструментальных твораў у стылях соўл, нью-эйдж, сімфа-джаз. Сярод найбольш вядомых твораў — Канцэрт для кантрабаса з аркестрам, араторыя «Зорка палын» (на вершы У. Пецюкевіча), песні «Гаю мой, не кліч», «Погоди», «А ты кажаш: вясна», «Зараніцы», «Обманите меня», «Белая лілея», «Не судьба», «Две звезды», «Мілая спадарыня», «Пажадай мне, мама», «Балада», «Азярцо», «Застольная», «Птицы», «Нарач», «Пани Гражина», «Калі скажаш», «Через все границы», «Вокзальная любовь», «Рэха жураўлінае», «Голуб галубку цалуе», музыка да 15 кінафільмаў.
**Фестывалі:** у складзе «Красных звёзд» – міжнародны фестываль «Мир. Музыка» (Тбілісі, 1986).
**Узнагароды:** лаўрэат фестывалю «Мир. Музыка» (Тбілісі, 1986) у намінацыях «Ансамбль» і «Кампазітар» (песня «Поле горкіх палыноў»).
**Дыскаграфія: трэкі** «Азярцо», «Баллада» (CD «Рано или поздно» *Ірыны Дарафеевай* – «Dorisrecords», 2000), «Голуб з галубкай», «Азярцо» (CD «Каханачка» І. Дарафеевай – «West Records», 2004); асобныя трэкі выдадзены ў зборніках фірм «Master Sound Records», «Квадро Диск», «West Records», «Classic

Company», «BoliDisk», «Белорусские Песняры Records».

**Кіно, відэа: кіно** – «Esse Homo. Композитор Дм. Долгалёв» (рэж. Л. Цітарэнка, СТВ, 2005); **кліпы** «Погоди» (*Валерый Дайнэка*), «Небесный рояль» (*Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч*), «Птицы» («Песняры»), «Спатканне» (С. Герасимов), «Навасельная» (ансамбль «Бяседа»).

**Кантакт:** dmidol62@mail.ru

03.02.07//Д.П.

**ДАРАФЕЕВА ІРЫНА (Дорофеева Ирина, Darafeeva Iryna)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару.

Нарадзілася 06.07.1977 у Магілёве. Займацца спевамі пачала ва ўзросце 12 гадоў у ВІА «Вясёлка». У 1989 перамагла ў І Рэспубліканскім конкурсе маладых выканаўцаў, у 1993 атрымала дыплом на конкурсе фестывалю «Славянский базар». Праз год была запрошана салісткай у ансамбль *«Верасы»*, адначасова атрымаўшы вызначэнне «Адкрыццё году» тэлеконкурсу «Фаварыты году». Ад 1997 да траўня 1999 – салістка *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, разам з якім выступіла ў канцэртах на Чырвонай плошчы ў гонар 850-годдзя Масквы, у аўтарскіх канцэртах *Яўгена Глебава, Алега Елісеенкава, Рыгора Барадуліна, Леаніда Дранька-Майсюка*. У 1998 дала некалькі канцэртаў як вакалістка джазтрыо *Аркадзя Эскіна*. Ад 1999 працуе разам з прадзюсэрам *Юрыем Савашам*. На працягу 2001–02 правяла ўнікальны ўсебеларускі тур, які ўключаў 435 канцэртаў. У рэпертуары песні беларускіх, украінскіх, румынскіх аўтараў, кавер-версіі твораў з рэпертуару М. Радовіч, У. Высоцкага, А. Панамарова, «Shoking Blue». Выконвае народныя песні, балады, творы ў стылі пап-рок, джазавыя стандарты, супрацоўнічае з вядучымі выканаўцамі і аранжавальнікамі краіны, а таксама Дзяржаўным ансамблем танца Беларусі і арт-праектам Я. Паўлінай «Зоркі гімнастыкі», спявае на беларускай, расейскай, польскай, ангельскай мовах. Найбольш вядомыя песні «Рэдкі госць» (муз. *Ігара Паліводы*, сп. *Леаніда Пранчака*), «Гора – не бяда» (муз. *Леаніда Шырына*, сп. *Аляксандра Лягчылава*), «Балада» (муз. *Дзмітрыя Далгалёва*, сп. У. Пецюкевіча).




**Гастролі:** Бельгія, Нямеччына, Люксембург, Польшча, Аўстрыя, Швейцарыя, Галандыя, Літва, Югаславія, Балгарыя, Украіна.

**Фестывалі:** I фестываль песні аб'яднанай Еўропы (Зялёна Гура, Польшча, 1999), «Золотой шлягер» (Магілёў, 1998, 1999), «Славянский базар» (неаднаразова).

**Узнагароды:** 2 прэмія конкурсу «Золотой шлягер 1998» (Магілёў), I прэмія конкурсу «Славянский базар 1999», I прэмія конкурсу «Vilnius 1999» і «Discovery 1999» (Балгарыя), 2 прэмія конкурсу на фестывалі ўкраінскай песні імя В. Івасюка 2000.

**Дыскаграфія: альбомы** MC і CD «Рэдкі госць» («Ковчег», 1999), CD «Рано или поздно» (аўт. выд., 2000), «Пульс маіх хвілін» (2003), CD і DVD «Каханачка» («West Records», 2005), «Как в первый раз» (2007), «Хочу быть мечтой» (2007), «Опусы» (MP3, 2007); **трэкі** «Гора – не бяда», «Тайна грэшнага спаткання» (у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999).

**Кіно, відэа:** фільмы «Рождение звезды» (жывы канцэрт э Дзяржаўным канцэртным аркестрам Беларусі, 1999), «Мгновения» (рэж. А. Суханава, 2000, 15 хв.), «Дарогі Ірыны Дарафеевай» (рэж. І. Тамашэўская, 2003, 55 хв.), «Под мирным небом» (рэж. А. Вавілаў, 2007), «Купалье Ирины Дорофеевой – фестиваль стихий» (канцэрт у Мірскім замку, 2007), **кліпы** «Рок-н-ролл» (БТРК, 1997), «Музыка ночи» (рэж. А. Грабёнкін, 1998), «Спадчына» (БТРК, 2006), «Так бывает» (рэж. А. Ражанскі, 2006), «Как сорочку вышивали» (рэж. А. Ткачэнка, 2006), «Вышита сорочка» (рэж. А. Бутар, 2006), «Беларусь сильная» (рэж. С. Новікаў, 2007), «Рэчанька» (рэж. А. Бутар, 2007), «Балада» (рэж. А. Бутар, 2007), «Город мой» (СТВ, 2007), «Сердце земли моей» (рэж. *Уладзімір Янкоўскі,* 2007), «Я хочу быть мечтой» (рэж. А. Адамчык, 2007).

**Кантакт:** www.irinadorofeeva.com; yuri@irinadorofeeva.com

01.11.07//Д.П.

**ДАЎКШ ДЗМІТРЫЙ (Даукш Дмитрий, Dauksh Dmitry)** – спявак, гітарыст, аўтар музыкі і тэкстаў.

Нарадзіўся 19.03.1968 у Вялікіх Луках, Расея. У 1995 скончыў БДАФВІС па спецыяльнасці трэнер па футболе. Творчы шлях пачаў у 1984 як выканаўца на бас-балалайцы ў складзе аркестру народных інструментаў «Вишенка» ў Вялікіх Луках. У 1988–89 выступаў як вакаліст і гітарыст у складзе полацкай групы «Высокое напряжение», ад 1993 распачаў сольную кар'еру. Піша і выконвае ўласныя песні хрысціянскай тэматыкі на расейскай мове. Найбольш вядомыя творы «А я смотрю в небо», «Ты скажи – я верю», «Если ты жив, есть еще шанс».

**Гастролі:** Украіна (чэрвень-ліпень 1997, чэрвень 1998), Расея (красавік, чэрвень-ліпень 1999), ЗША (сакавік-чэрвень 2000), Расея (студзень-сакавік 2001), ЗША (травень-чэрвень 2003), Латвія (снежань 2003), ЗША (травень-жнівень 2004, травень-чэрвень 2005, 2006), Нямеччына (2006), Бельгія, Нямеччына, Францыя (вясна 2007).

**Фестывалі:** «Bridges of Love» (Чыкага, 2000, 2005).

**Узнагароды:** лаўрэат фестывалю «Bridges of Love» у 2000 («Audience Choice Award»), 2003, 2004, ЗША, Чыкага.

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Когда тебе трудно» (1995), «А я смотрю в небо» (1998), «Я верю» (2002),

«Напои меня водой» (2004), «The Best» («Новая музыкальная культура», 2005), «Не говори «прощай» (2007).
**Кіно, відэа: кліпы** «А я смотрю в небо» (рэж. А. Грабёнкін, 1998), «Кто же этот парень?» (рэж. А. Грабёнкін, 1998), «Ты скажи – я верю» (рэж. І. Пашкевіч, 2001), «Океан» (рэж. А. Шульга, 2004), «Некуда бежать» (рэж. У. Зінкевіч, 2004), «Если ты жив, есть еще шанс» (2005).
**Кантакт:** www.dauksh.com; dauksh@mail.ru
28.09.07//Д.П.

**«ДЕТИ ЛЕЙТЕНАНТА ШМИДТА»** – мінская група, якая ўтварылася ў сакавіку 1990 і выконвала музыку, што злучала ў сабе мноства стыляў і напрамкаў.
Выступала ў складзе: Сяргей Козыраў – гітара, Аляксандр «Бахо-Баха» Раманоўскі – гітара, флейта, саксафон, Барыс Шыф – бас-гітара, вакал (→ люты 1992), Юрый Грышкоўскі – барабаны, Вячаслаў Рутман. У розны час у групе таксама выступалі Ганна Аладава – фартэпіяна, Яўген Хітрак – флейта. Гісторыя калектыву спынілася ў 1992.
05.08.07//Д.П.

**ДЗЕМЯНЧУК ВІКТОРЫЯ (Деменчук Виктория, Demenchuk Victoriya)** – спявачка, выканаўца твораў папулярнага і пап-рокавага рэпертуару.
Нарадзілася 27.06.1981 у Гродне. У 1992 скончыла ДМШ №1 па класе домры, ад 2000 – студэнтка музычна-педагагічнага факультэту БДПУ. Творчы шлях пачала ў 1997 як вакалістка гродзенскай студыі «East-star», у 2000 распачала канцэртную дзейнасць пад кіраўніцтвам прадзюсэра В. Лукашэвіча. Ад 1998 удзельнічае ў шэрагу спеўных конкурсаў, на якіх нязменна займае лаўрэацкія месцы. Ад 2003 супрацоўнічае з маскоўскай студыяй В. Салтыкова. Спявае пераважна на расейскай мове. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Орёл» (муз. і сл. В. Лукашэвіча), «Месяц ясны» і «Рэчанька» (народныя, апрацоўка В. Лукашэвіча), «Цвет любви» (муз. В. Лукашэвіча, сл. А. Мятліцкага і *Юрыя Дубовіка*), «Снег на кончиках пальцев», «Я жду тебя», «Не ты» (муз. В. Лукашэвіча, сл. Ю. Дубовіка), «Танцы с волками» (муз. і сл. Ю. Дубовіка).
**Узнагароды:** Гран-пры на беларускім тэлеконкурсе «Зорная ростань 1998», 2 прэмія конкурсу маладых выканаўцаў фестывалю «Славянский базар 1998», Гран-пры фестывалю імя К. Шульжэнкі (Харкаў, 1998), 1 прэмія фестывалю «Море друзей» (Ялта, 2000), Гран-пры міжнароднага конкурсу папулярнай




музыкі «Vilnius 2000», 1 прэмія конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Золотой шлягер 2000» (Магілёў), 2 прэмія конкурсу на фестывалі імя В. Івасюка (Украіна, Чарнаўцы, 2000), 2 прэмія на фестывалі «Золотой Скиф» (Украіна, Данецк, 2001),

Гран-пры фестывалю «Морской узел» (Расея, Наварасейск, 2003).
**Дыскаграфія:** дэма-альбом «Цвет любви» (2003); разам з групай «*Воображаемые люди*» – МС «Выход в небо» («Ковчег», 2000).
**Кіно, відэа: кліп** «Лети» (2003).
**Кантакт:** www.demenchuk.com
04.05.04//Д.П., фота А. Ліціна.

**ДЗЯМЕНЦЬЕЎ АНДРЭЙ (Дементьев Андрей, Dementyev Andrey)** – гітарыст.
Нарадзіўся 17.07.1974 у Мінску.
У 1991 скончыў СШ №102 Мінску з музычным ухілам па класе гітары, у 1991–93 вучыўся ў МРТІ па спецыяльнасці мікраэлектроніка. У 1982–91 выступаў у складзе школьных музычных калектываў – аркестры народных інструментаў (кантрабас-балалайка), эстрадна-духавым аркестры (бас-гітара, гітара), як гітарыст ВІА, трыо гітарыстаў. У 1992 сабраў першы ўласны калектыў «Гинденбург», граў у рэстарацыі ў складзе акустычнага трыо. У 1994 увайшоў у склад групы *«Кали Юга»*, на працягу 1995–96 паралельна супрацоўнічаў з групамі *«Partyzone»*, «Запад-2», камандай КВЗ БДУ.
У 1999–2000 быў запрошаны В. Бутусавым у склад праекту «Овалы», з якім даў шэраг канцэртаў у Маскве, Санкт-Пецярбургу і інш. гарадах. 2002 – удзел у запісе праграмы «Рисунок» В. Іванова. Ад 2003 пачаў супрацоўніцтва з групамі *«P.L.A.N.»*, *«Flat»*.
**Гастролі:** у складзе праекту «Овалы» – Расея (1999–2000).
**Фестывалі:** у складзе «Запад-2» – «Губерталіі» (Гродна, 1997); у складзе «Кали Юги» – «Блюз жыве ў Мінску» (1997), «Калининград In Rock» (Расея, 2000); у складзе групы «P.L.A.N.» – «Генэралы айчыннага року 2004»; сольна – «Грифомания 1998».
**Дыскаграфія:** у складзе «Partyzone» – «To Fly Or Not» (1996, не выдадзены); у складзе «Кали Юги» – гл.; для В. Іванова – «Рисунок» (2004, не выдадзены); для каманды КВЗ БДУ/праект «А потом» – «Там посмотрим» (2002); у складзе «P.L.A.N.» – гл. 2003–06; **трэк** у складзе «Кали Юги» – «В прицеле твоего ружья» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).
**Кіно, відэа:** у складзе «Кали Юги» – музыка да дакументальнага фільму «Легенды Беларусі» (Белтэлерадыёкампанія, 2000, не выдадзены); **кліпы** «Дом» (рэж. К. Марозаў, 2000), «Белая рубаха» (2001).
**Кантакт:** ade_market@autospace.by
27.02.05//Д.П.

**ДЗЯМЕШКА АЛЯКСАНДР (Демешко Александр, Demeshko Aleksandr)** – барабаншчык, вакаліст.
Нарадзіўся 24.04.1947 у Брэсце, памёр 08.05.2006 у Маскве. Скончыў Брэсцкую музычную вучэльню па класе ўдарных. Вайсковую службу адбываў у аркестры штабу ЧБВА разам з *Уладзіславам Місевічам*.
У 1968 пачаў выступаць у складзе ансамбля *«Лявоны»* (ад 1970 – *«Песняры»*). Як саліст-вакаліст выступаў у песнях «Чарачка мая», «З кірмашу», «Забалела ты ж мая галовачка...». У 1988 пакінуў «Песняроў», пераехаў на жыхарства ў Маскву, дзе ў 1991 стварыў кааператыў «Песня», які займаўся

арганізацыяй гастроляў у Расеі зорак замежнай папулярнай музыкі. У сярэдзіне 90-х сумесна з *Валерыем Яшкіным* падрыхтаваў і выдаў анталогію твораў «Песняроў» («Мороз Рекордз») на 8 CD. Ад пачатку 2005 – генеральны дырэктар расейскага ТАА «Песняры», адначасова – кіраўнік створанага з ягонай ініцыятывы ансамбля «Лявоны» з удзелам яшчэ аднаго ветэрана «Песняроў» *Уладзіміра Нікалаева*.

**Гастролі:** гл. «Песняры».

**Фестывалі:** гл. «Песняры».

**Дыскаграфія:** гл. «Песняры».

08.05.06//Д.П.

## ДЗЯРЖАЎНЫ КАНЦЭРТНЫ АРКЕСТР БЕЛАРУСІ

Утварыўся ў жніўні 1987 на базе аркестру Мінскага дзяржаўнага цырку і выпускнікоў-струннікаў БДК. Нязменны кіраўнік – *Міхаіл Фінберг*. У першым складзе калектыву сярод іншых выступалі трубачы *Валерый Шчэрыца*, Віталь Барма, Генадзь Літвак, трамбаністы Генадзь Грачухін, Леанід Бур'як, саксафаністы *Ігар Сафонаў*, Ігар Голікаў, *Андрэй Матлін*, гітарысты *Сяргей Анцішын*, *Уладзімір Ткачэнка*, бас-гітарыст Анатоль Архіпаў, піяністы *Анатоль Гілевіч*, Андрэй Гітгарц, *Андрэй Шпянёў*, барабаншчыкі Аляксандр Старажук, Кірыла Шэвандо, канцэртмайстар групы струнных Людміла Каліноў-ская. У розныя гады ў склад калектыву ўваходзілі трубач Уладзімір Семянюк, саксафаніст *Віталь Ямуцееў*, бас-гітарыст *Аляксандр Каліноўскі*, барабаншчыкі Вадзім Чайкоў і Андрэй Славінскі, трамбаніст Дзмітрый Бударын, піяніст Сяргей Аляксандраў. Пры калектыве ў розны час працавалі малыя склады: вакальная група «Джаз-Ко», *джаз-групы Ігара Сафонава* (пазней – *«Пятый угол»*), *«Apple Tea»*, вакальная група *«Camerata»*, джаз-квартэт Я. Уладзімірава, ансамбль традыцыйнага



джазу *«Рэнесанс»*, салістамі-вакалістамі выступалі *Валерый Дайнэка, Іна Афанасьева, Ірына Дарафеева, Наталля Тамела, Якаў Навуменка, Мікалай Скорыкаў* і інш. Дэбютаваў аркестр 1 верасня 1987 канцэртам у маскоўскай зале «Россия». Цягам некалькіх гадоў запісваўся для 5 каналу Італьянскага тэлебачання, падрыхтаваў шэраг праграм з рэпертуару аркестраў Д. Элінгтана, К. Бэйсі, Г. Мілера, Т. Джонса – М. Л'юіса, пап-оперу «Максім» (муз. *Ігара Паліводы*), праграмы з твораў савецкай джазавай музыкі, шэраг бенефісаў сваіх салістаў, даў шэраг канцэртаў з вядомымі салістамі-інструменталістамі – А. Казловым, Д. Галашчокіным. Запісваўся для расейскай тэлепраграмы «Угадай мелодию», суправаджаў конкурсы маладых выканаўцаў на фестывалях «Славянский базар», «Золотой шлягер», Нацыянальным фестывалі песні і паэзіі ў Маладзечне. На базе аркестру штогод у Мінску праходзіць фестываль джазавай музыкі.

**Фестывалі:** «Славянский базар», «Золотой шлягер», Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна», «Московская музыкальная осень» (1988).

**Дыскаграфія:** MC, CD «Песні Ігара Лучанка» («Ковчег»), «Рок-н-рол» («Ковчег»), «Джазавы канцэрт» («Ковчег», 1997), «Пад родным небам. Песні *Эдуарда Зарыцкага* на вершы *Ніла Гілевіча*» («Ковчег»).

**Кантакт:** + 375 (17) 284-68-88.

05.03.06//Д.П.

**«ДИ-БРОНКС И НАТАЛИ»** – дуэт з Мінску, які трымаўся стылю танцавальна-дыскатэчнай папулярнай песні.

У складзе дуэту выступалі Наталля Арцёмава і Дзяніс «Дзі-Бронкс» Шпітальнікаў. Рэпертуар засноўваўся на расейскамоўных песнях пераважна аўтарства Дз. Шпітальнікава. Пасля сыходу з дуэту Н. Арцёмавай у калектыве некаторы час выступала Наталля Кудрына.

**Дыскаграфія: альбом** CD «Зона всемирной вечеринки» («Polygram Russia», 1996); **трэк** «Навсегда» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000).

03.03.07//Д.П.

**«ДИЛИЖАНС»** – мінская джазавая група, рэпертуар якой заснаваны на творах класічнага джазу, а таксама джаз-року.

Быў арганізаваны з ініцыятывы піяніста ансамбля традыцыйнага джазу *«Рэнесанс» Андрэя Лабчэўскага* ў верасні 1998. Першы склад ансамбля: А. Лабчэўскі – фартэпіяна, аранжаванні, Кацярына Кошалева – вакал, Антон Машкала – тэнар-саксафон, Аляксандр Цэйтлін – скрыпка, Віктар Пыньцікаў – кантрабас, Ігар Піліпенка – гітара. У наступныя гады ў складзе калектыву выступалі сярод іншых С. Круглова, Яўгенія Лятун – вакал, Андрэй Сівец, Міхаіл Пенда, Андрэй Славінскі – барабаны, Алег Крылоў – кларнет, Андрэй Ускоў – гітара (→ *«Apple Tea»*, 2002). У 2003 ансамбль выступаў як квінтэт: А. Лабчэўскі, К. Кошалева, А. Машкала, *Карэн Карапецян* – скрыпка, Вячаслаў Сяргеенка – кантрабас. У 2000 ансамбль даў

сумесны канцэрт у Мінску з ізраільскім музыкам Дуду Фішарам. У 2002 музыкі калектыву ўдзельнічалі ў здымках мастацкіх фільмаў Д. Астрахана «Алхимики» и «Тихие ночи».
**Фестывалі:** міжнародны фестываль джазу і року «Grodno Union Fest» (Гродна, 1998), міжнародныя фестывалі «Блюз жыве ў Мінску» (1998, 1999), II міжнародны фестываль недзяржаўных моладзевых арганізацый (Мінск, 1999), II міжнародны фестываль эстрадных аркестраў (Мінск, 1999), IX міжнародны фестываль «Славянский базар» (Віцебск, 2000), міжнародны джаз-фестываль «RADO-jazz» (Мінск, 2000), «Саксомания» (Мінск, 2003).
**Кантакт:** dilizhans@mail.ru; dilizhans-jazz.nm.ru
07.09.03//Д.П.

**ДЛУСКІ АНАТОЛЬ (Длусский Анатолий, Dlusskyi Anatoly)** – спявак, аўтар музыкі і тэкстаў, актор. Выступае пераважна як прадстаўнік бардаўскай песні, робячы запісы ўласных расейскамоўных песень з далучэннем розных інструментаў. Працаваў актoрам тэатру сатыры і гумару «Христофор».
**Дыскаграфія: альбомы** LP «Я люблю жизнь» («Мелодия», 1990), MC «Только этого мало» («Ковчег», 1997), CD «Исповедь» («Ковчег», 2001).
**Кіно, відэа: кліп** «Буря мглою».
11.04.04//Д.П.

**ДРАЗДОЎ ВІТАЛЬ (Дроздов Виталий, Drozdov Vitaly)** – музыка, дыджэй, прадзюсэр.
Нарадзіўся 28.07.1971 у г. Бярозаўка Гродзенскай вобл. У 1993 скончыў МРТІ па спецыяльнасці інжынер-сістэматэхнік, у 1999 – Мінскі інстытут працоўных і сацыяльных адносін па спецыяльнасці юрыст. У 1993–95 працаваў ды-джэем і музычным рэдактарам на мінскім «Авторадио», у 1995–99 ды-джэем, музычным рэдактарам, гукарэжысёрам на радыё «Би-Эй». Ад 1999 да 2003 – музычны рэдактар, праграмны дырэктар «Альфа Радио». Ад 2005 – праграмны дырэктар, генеральны дырэктар радыё «ХитФМ», Украіна. Як музыка пачаў выступаць на сцэне ў 1985 у калектыве разам са *Зміцерам Вайцюшкевічам* (да 1988), у 1991–95 – удзельнік групы «Мама дала банку», у 1995–97 – скрыпач і выканаўца на перкусіі ў складзе групы *«Ляпис Трубецкой»*. Ад 2003 і да цяперашняга часу – сябра ТА «Дети Солнца», дзе адказны за кантакты з Украінай. У ролі прадзюсэра супрацоўнічае з такімі калектывамі, як «Ляпис Трубецкой», дуэт *«Саша и Сирожа»*, *«Merry Poppins»*, *«ТТ-34»*, *«Крамбамбуля»* і інш.
**Узнагароды:** прэмія Папова за лепшую расейскамоўную радыёстанцыю свету («ХитФМ», 2003).
**Кантакт:** drozz@mail.ru
24.11.06//Д.П.

**ДРАНЬКО-МАЙСЮК ЛЕАНІД (Дранько-Майсюк Леонид, Dranko-Maisiuk Leanid)** – паэт.
Нарадзіўся 10.10.1957 у Давыд-Гарадку Брэсцкай вобл. У 1982 скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага (Масква). Працаваў рэдактарам у беларускіх выдавецтвах. Сябра Саюзу пісьменнікаў Беларусі ад 1984. Піша на беларускай мове.



Аўтар тэкстаў многіх папулярных песень: «Полька беларуская», «Беларускае танга», «Курапаты», «Пілыножніцы наразаць!..», «Радзіма Беларусь» (муз. *Ігара Лучанка*), «Еўфрасіння» (муз. А. Балотніка), «Прысвячэнне гораду» (муз. С. Бельцюкова), «Песенька пра віно», «Верасень хрызантэмны» (муз. *Уладзіміра Будніка*), «Калі скажаш...» (муз. *Дзмітрыя Далгалёва*), «Былая страта», «Дон-Кіхот», «Любы князь» (муз. *Эдуарда Зарыцкага*), «Аксаміткі», «Песенька пра добрую Мышку і мудрую Кошку», «Бульба», (муз. *Леаніда Захлеўнага*), «Каб свяцілі зоры» (муз. В. Кузняцова), «Ты – паэзія» (муз. *Уладзіміра Кур'яна*), «Вязе мой, вязу...» (муз. *Якава Навуменкі*), «Анатоль», «На Каляды, на Каляды», «Навагодняя свечка», «Прынц і Ружа», «Два мядзведзікі», «Я з вамі не развітваўся ніколі» (муз. *Мікалая Сацуры*), «З табой навечна», «Ружа белая», «Восень у Версалі», «Цыганка» (муз. *Аляксандра Ціхановіча*), «Бо мы кахалі...», «Доўгая пакута» (муз. *Ядвігі Паплаўскай*), «Элада», «Люблю адзіноту» (муз. П. Яроменкі).

**Фестывалі:** «Славянский базар» (1995, 2001), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна».

**Узнагароды:** «Рок-карона 2001» у намінацыі «Лепшыя тексты году».

**Дыскаграфія:** CD «Цацачная крама» *Зміцера Вайцюшкевіча* («Ковчег», 2001); **трэкі** «Цыганка», «Осень в Версале» (у CD «От «Малиновки» и до...» *дуэту Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч* – «Bulba Records» 2001).

**Кнігі:** зборнікі вершаў «Вандроўнік» (1983), «Над пляцам» (1986), «Тут» (1990), «Проза радости» (пераклады на расейскую мову, Масква, 1991), «Пра тое, як я...» (1992), «Акропаль» (1994), «Стомленасць Парыжам» (1995), «Гаспода» (1998), «Места і свет» (2000), «Паэтаграфічны раман» (2002), «Вершы. Каханне. Проза» (2003), «Белая вежа» (на расейскай і беларускай мовах, Уладзівасток, 2004).

**Кантакт:** +375 (29) 619-57-81; dranko-maisiuk@mail.ru

17.09.05//Д.П.

**«ДРОЗДЫ»** – квартэт з Мінску, які ўтварыўся ў 2004 для выканання музыкі ў стылі сучаснага гарадскога шансону.

Першапачаткова выступаў як дуэт Віталь Капранаў – лідэр, балалайка, вакал, музыка і тэксты і Ілля Нямыцька – баян. Неўзабаве да гэтых музыкаў далучыліся іншыя, і ў канцы 2006 у групе выступалі В. Капранаў, І. Нямыцька, Алег Івановіч – гітара, Валерый Дасюкевіч – бас-гітара,

Андрэй Ганчарык – барабаны (← *«Killkitau»*). Свой стыль самі музыкі вызначаюць як баян-балалайка-джаз-дэнс, рэпертуар калектыву засынаваны пераважна на расейскамоўных аўтарскіх песнях і апрацоўках беларускіх народных песень. Найбольш вядомая песня «Наши движения».

**Фестывалі:** Першы ўсерасейскі конкурс маладых выканаўцаў «Пять звёзд» (Сочы, 2005).

**Узнагароды:** 3 прэмія на першым усерасейскім конкурсе маладых выканаўцаў «Пять звёзд» (Сочы, 2005).

**Дыскаграфія: альбом** CD «Прилетели» (2006 – Беларусь, Расея, Украіна).

**Кіно, відэа: кліп** «Море» (рэж. В. Гулевіч, мантаж І. Пашкевіча, 2006).

**Кантакт:** www.drozdy.net; drozdy@tut.by; +375 (29) 753-82-89, (29) 679-67-20.

11.11.06//А.Р.–Д.П.

**ДУБОВІК «СМУР» ЮРЫЙ (Дубовик Юрий, Dubovik Yury)** – аўтар музыкі і тэкстаў, гітарыст, спявак.

Нарадзіўся 21.12.1972 у Гродне. Скончыў СПТВ-225 па спецыяльнасці кухар. Ад 1994 да 2001 працаваў інжынерам у гімназіі №1 Гродна, ад 2002 па 2003 жыў і працаваў у Маскве, у 2003–05 – на Гродзенскім тэлебачанні. У 1993 арганізаваў групу *«Воображаемые люди»*, якая пачала актыўную канцэртную дзейнасць як у Гродне, так і па краіне. У 1998 паралельна з удзелам у групе пачаў працаваць са спявачкай *Вікторыяй Дзямянчук* як аўтар песень. Ад 2000 да 2002 разам з групай «Воображаемые люди» працаваў у маскоўскіх клубах. У 2003 у якасці аператара ўдзельнічаў у здымках серыі дакументальных фільмаў цыклу «Мгновения вечности». Ад 2003 як кампазітар і паэт супрацоўнічае з многімі выканаўцамі: Г. Шышковай («Не вспоминать»), В. Дземянчук («Она», «Утро», «Снежная весна», «Танцы с волками»), Т. Глазуновай, А. Звяровічам («Дзікая кветка», праграма «Это любовь»), групай «Свободные мысли» (альбом «Чтиво»), артыстамі Гродзенскай філармоніі, групай «De Predo» («Шок») і інш.

**Гастролі:** у складзе групы «Воображаемые люди» – канцэрты ў Гродне, Брэсце, Мінску, Маскве.

**Фестывалі:** фестывалі нацыянальных культур (Гродна), «Синий перец-5» (Мінск), «Люби настоящее» (Мінск), «Рок-каранацыя 2000» (Мінск).

**Дыскаграфія:** у складзе групы «Воображаемые люди» – гл.

**Кіно, відэа: кліпы** «Снежная весна» (рэж. П. Вераб'ёў, 1997), «Они сделали» (рэж. Я. Фалееў, 1999), «Письма без ответов» (рэж. Я. Фалееў, 1999), «Танцы с волками» (рэж. Я. Фалееў, 2000), «Тайны» (рэж. Я. Фалееў, 2000).

**Кантакт:** Smur72@mail.ru; +375 (152) 50-21-41.

03.12.05//Д.П.

**ДУЭТ ЯДВІГА ПАПЛАЎСКАЯ – АЛЯКСАНДР ЦІХАНОВІЧ**

Выступае ў стылі традыцыйнай папулярнай песні. Утварыўся як сямейна-творчы ансамбль у складзе ВІА *«Верасы»* ў 1976. Ад 1987 да 1989 працаваў у складзе *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, пасля чаго ўдзельнікі дуэту вырашылі рабіць самастойную кар'еру, і у выніку з'явілася група «Счастливый случай», на базе якой неўзабаве

быў створаны Тэатр песні Я. Паплаўскай – А. Ціхановіча. Новае творчае аб'яднанне выступіла ініцыятарам правядзення міжнародных фестываляў «Беларусь збірае сяброў», тэлемарафону «К Храму, Миру и Согласию», сумеснай беларуска-расейскай шоў-праграмы «Поп-ТВ», шэрагу іншых акцый з удзелам зорак эстрады СНД і беларускай творчай моладзі. У 1994 Тэатр песні ператварыўся ў «Студыю Я. Паплаўскай і А. Ціхановіча». Сярод найбольш вядомых твораў песні «Я у бабушки живу» (муз. *Эдуарда Ханка*, сл. І. Шаферана), «Морской прибой» (муз. *Ігара Лучанка*, сл. М. Траццякова), «Счастливый случай» (муз. Э. Ханка, сл. Л. Рубальскай), «Хозяйка бала», «Жизнь – прекрасный миг» (абедзве – муз. А. Ціхановіча, сл. *Уладзіміра Някляева*), «Малиновки заслыша голосок» (муз. Э. Ханка, сл. А. Папярэчнага), «Цыганка», «Белая ружа», «Осень в Версале» (усе – муз. А. Ціхановіча, сл. *Леаніда Дранька-Майсюка*) і інш.



**Гастролі:** дзяржавы СНД, Балгарыя, Польшча, Вугоршчына, Чэхія, Славакія, Славенія, Манголія, Ізраіль.
**Фестывалі:** «Славянский базар» (неаднаразова), тэлеконкурсы «С песней по жизни», «Песня года» (Расея), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (неаднаразова), «Мелодии двух сердец» (Украіна), «Звезды Амура» (Расея), «Магутны Божа» (Беларусь) і інш.
**Дыскаграфія: альбомы** LP «Счастливый случай» («Мелодия», 1989), «Музыка любви» («Eddy Studio», 1997), «Жизнь – прекрасный миг» («Master Sound», 1997), «От «Малиновки» и до...» («Bulba Records», 2001); **трэкі** «Завіруха» (муз. Э. Ханка, сл. *Генадзя Бураўкіна*, у зборніку «20 суперхитов, рожденных в Беларуси-3» – «Bulba Records», 2000), «Жаданае каханне» (муз. *Уладзіміра Будніка*, сл. *Аляксандра Лягчылава*, у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999), «Дамское танго» (муз. Л. Захлеўнага, сл. А. Лягчылава, тамсама).
**Кантакт:** n-tihanovich@mail.ru, isz@mail.ru; +375 (17) 236-95-03.
08.05.04//Д.П.

**«DEADMARSH»** – мінская група, якая па стылі набліжаная да музыкі трэш-метал.

Утварылася ў пачатку студзеня 1998. У першым складзе выступалі гітарысты Генадзь Гардон і Валерый Зварыка, да якіх далучыўся Аляксей Гладыш – барабаны (← *«Vicious Crusade»*), а пазней Дзяніс Тушканаў – бас-гітара і Мікалай Гідлеўскі – вакал. Першы канцэрт група дала 20.06.1999 у мінскім клубе

«Альтернатива», паказаўшы праграму з кавераў класікі метал-року. Летам 2000 у групу на месца Г. Гардона прыйшоў гітарыст *Аляксей Бумін* (← «Hard Rain»). Ад 2003 большасць рэпертуару засноўваецца на беларускамоўных песнях. У 2004 група выступала наступным складам:
М. Гідлеўскі – вакал, А. Бумін, В. Зварыка – гітара, Павел Корань – бас-гітара (← 2000), А. Гладыш, Вячаслаў Цімошын – гукарэжысёр.
**Фестывалі:** «Затерянный мир» (Мінск, 1999), «Рок-кола» (Навапалацк, 2001), «Рок апоўначы» (у рамках «Славянского базара», Віцебск, 2001), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2002), «Грифомания» (Мінск, 2003).
**Дыскаграфія:** сінгл «Bleeding Dirt» (2000), **альбомы** MC дэма «Harmony Prevails» (2001), CD «Грані» (2003); **трэкі** «Колы і агонь» (у зборніку «Hard Life – Heavy Music 1» – «БМАgroup», 2001), «Люстэрка ночы» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМАgroup», 2002), «Апошні жах «Няміга» (у зборніку «Hard Life – Heavy Music II» – «БМАgroup», 2003), «Ня больш за дым» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМАgroup», 2004).
**Кіно, відэа: кліп** «De la musique avant toutes choses» (2003).
**Кантакт:** deathbellprods@tut.by, deadmarsh-band@tut.by.
11.04.06//Д.П.

**«DEATHBRINGER»** – група з Гродна, якая выступае ў стылі прагрэсіўнага тэхна-дэз-метал.
Утварылася ўвесну 2002, першапачаткова выступаючы складам: Арцём Сярдзюк – лідэр, гітара, Віталь «Змей» Сілюк – барабаны, Дзмітрый Малочнікаў – вакал, Валерый Пазьняк – бас-гітара, Аляксандр Карпач – гітара (→ 2003). У лютым 2003 у калектыў прыходзіць гітарыст Сяргей «Сяды» Каваленкаў.
**Гастролі:** канцэрты ў клубах Мінску і Гомелю.
**Фестывалі:** «3 шурупа» (Гродна, 2003, 2004), «Massa Brutto 4» (Мінск, 2003), «Snowstorm» (Мінск, 2004).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Symbolic Sounds. A Tribute To Chuck Schuldiner» (дэма, 2002), сінгл «Keeper Of Pain» (аўт. выд., 2004), CD «Circle Of What Was.» (аўт. выд., 2004), «A Tribute To Death – Underground» («Under Black Water production», Расея, 2005).
**Кантакт:** deathbringer@tut.by; contact@deathbringer-band.net; +375 (29) 652-37-32; (152) 78-09-99.
23.03.05//A.I.

**«DIVINA ENEMA»** – мінская група, якая выступае ў стылі готык.
Утварылася ў жніўні 1997, дэбютаваўшы ў наступным складзе: Яраслаў Буракоў – вакал, Раман Крыўцоў – гітара, Ігар Ераксін – клавішныя, Ціхан Золатаў – бас-гітара, Аляксандр Ракецкі – барабаны, Уладзімір Буракоў – гукарэжысёр. У розныя гады ў складзе калектыву выступалі Цімафей Каспяровіч – клавішныя (1999–2001), Аляксандр Каленік – гітара (2001–02), Аляксандр Савянок – гітара (2003).
У 2004 група складалася з наступных выканаўцаў: Я. Буракоў, Арцём Атрашэўскі – гітара, Ц. Золатаў (→ *«Svet Boogie Band»*, 2005), Таццяна Цвірко – клавішныя, Аляксей Золатаў – барабаны (→ «Svet Boogie

Band», 2004), У. Буракоў.
**Фестывалі:** «Metal Shock» (Мінск, 1998), «Massa Brutto» (Мінск, 2001–04), «No Presents for X-Mass» (Мінск, 2002, 2003).
**Дыскаграфія: альбомы** MC «To Wight Shalt Never Shine» («iDaemon Inside»/«More Hate», перавыд. Расея, 1999), CD «At The Conclave» («Eldritch Music»/«Great White North Records», перавыд. Канада, 2001), «Under Phoenix Phenomenon» («More Hate»/«Great White North Records», перавыд., 2003).
**Кантакт:** www.divinaenema.com; divina@divinaenema.com; yaroslav234@tut.by; +375 (29) 681-99-24.
15.05.06//A.I.

**«DREAMLIN»** – мінская група, якая выконвае электронную музыку з выкарыстаннем «жывых» інструментаў.
Утварылася ў лютым 2000 складам: Дзяніс Карабкоў, Ягор Куноўскі. На цяперашні час дуэт складаюць Я. Куноўскі, Андрэй Карповіч (← 2003). У 2003 дуэт даў канцэрт у клубе Грыбаедава, Санкт-Пецярбург.
**Фестывалі:** «Система электронного безумия» (Мінск, 2002–04), «Plug'n'Play» (Мінск, 2003), «Update Music 3» (Санкт-Пецярбург, 2004), «Cyberpunk» (Мінск, 2000, заахвочвальны прыз).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «The Color of The City» («Gizmo Lab Records», Мінск, 2004, перавыд. «Shum Records», Масква, 2004); **трэкі** «Digital Angel» (amcast.com, ЗША, 2001), «No Computers» (у зборніку «Recomputerization: Collective Decomputerization» – amcast.com, ЗША, 2001), «Bit Mountain» (у зборніку «SWAT Productions LLC» – ЗША, 2002), «Dreamlin – Communication Theory» (у зборніку «Заквадраченная жизнь» – discoteq.com, Мінск, 2002), «Upside Dawn» (у зборніку «70x60 The Sampler» – «Raw42 Music LTD», Вялікабрытанія, 2003), «Nostalji Dreamlin – Roll-Tone» (у зборніку «Система электронного безумия» – «Gizmo Lab Records», Мінск, 2003), «Upside Dawn» (у зборніку «Global Chilled 2003» – «Raw42 Music LTD», Вялікабрытанія, 2004), «The Light Of The Night» (у зборніку «ELKAmpilation» – «Gizmo Lab Records», Мінск, 2003), «Kaufkassette – Reduktion» (у зборніку «Sunny» – «Different Listening», Санкт-Пецярбург, 2003), «Nostalji» (у дыску-дадатку «Жёлтые страницы» – «Grevtsov.by №7», 2003), «Nostalji» (у зборніку «System Of Electronic Madness» – «Shum Records», Масква, 2003).
**Кантакт:** www.dreamlin.com; www.electrokids.org/keys/dreamlin; egor@dreamlin.com; +375 (29) 708-84-11.
30.09.04//А.П.

**«DROMOS»** – дуэт з Мінску, які працуе ў стылі дарк-уэйв, індастрыял, эксперыментальнае тэхна.
Ад пачатку 2000 выступае складам: Ірына «Шаманка» Шумская і Артур «Лорд Хаос» Невяроўскі з падтрымкай перформенс-групы. За гады існавання група дала звыш 20 канцэртаў пераважна на клубных сцэнах.
**Фестывалі:** «Дети Ночи: Чорна Рада» (Украіна, 2005), «Radio Inferno IV» (Расея, 2006).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Sacrifice to Abyss» («Somord Prods.»,

2002), «Voices» («Somord Prods.», 2004).
**Кіно, відэа: кліп** «Access Denied» (рэж. І. «Кефір» Бажко, 2005).
**Кантакт:** +375 (29) 778-75-31 (Ірына); http://somord.org; somord@tut.by.
12.04.06//Д.П.

**«DRUM ECSTASY»** – мінская група, якая выступае ў жанры інструментальнай музыкі.

Утварылася ў 1993 як квартэт выканаўцаў на ўдарных інструментах з ініцыятывы Філіпа Чмыра. У розны час у складзе калектыву выступалі Марат Жумагулаў (→ Казахстан), Андрэй «Граф» Чугуноў (→ «Vacuumable», Валік Грышко), *Валік Грышко*. Час ад часу як спецыяльна запрошаны ў выступленнях групы ўдзельнічае Дзмітрый Лук'янчык (экс- *«Тройца»*, *«Альтанка»*). Група актыўна ўдзельнічае ў прома-акцыях вядомых фірм («Lucky Strike», «Orbit», «Volkswagen», «Mazda», «Castrol», «Gallina Blanca», «Microsoft» і інш.), дабрачынных канцэртах, экалагічных праектах, вядзе клубную дзейнасць у Беларусі і па-за яе межамі, удзельнічала ў адкрыцці байк-цэнтру і байк-шоў у Маскве, выставачных гульнях NHL у Маскве, адкрыцці 6 фестывалю кінакаскадзёраў «Прометей», Нацыянальнага чэмпіянату Літвы па баскетболе, адкрыцці выстаў «Аўташоў» у Мінску і Кіеве, «TIBO», «Аграбел» (Мінск), «Intercom 2003» (Масква). Група – актыўны ўдзельнік моладзевага руху (грамадская арганізацыя «Новыя твары»), удзельнік праектаў «Стоп СНІД», «Защити себя», «Скажи детям да», праекту У. Пуціна супраць наркотыкаў. Раз на год згодна з традыцыяй дае канцэрт пад адным з гарадскіх мастоў Мінску. «DE» выступалі ў такіх вядомых клубах, як «Tacheles» і «Eimer» (Берлін), «Stubnitz» (Расток), «AV-Art Gallery» і «African National Unity Office» (Капенгаген), «Effenaar» (Эйндховен), «Караван Сараи» (Тбілісі), «44» (Кіеў). На



пачатку 2006 у складзе групы выступалі Філіп Чмыр – бас-гітара, ударныя, Аляксандр Краўцоў – ударныя, Аляксандр Гарох – ударныя, Сцяпан Бітус – ударныя.

**Гастролі:** Бельгія, Нямеччына, Галандыя, Італія, Іспанія, Расея (неаднаразова), Украіна, Грузія, Літва (2005), Кіеў (2007).

**Фестывалі:** «SKIF» (Санкт-Пецярбург, 2000–02), «Shine Festival» (Галандыя), «Kirklesas» (Літва), «Крылья» (Расея, 2005), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2006) і інш.

**Дыскаграфія: альбомы** MC «Drum Ecstasy. Беларускі клімат» (аўт. выд., 1999), CD «Drum Ecstasy» («ТАББАК»/«West Records», 2004), «Drums Only» («ТАББАК»/«West Records», 2004), «H.D.M.» («West Records», 2006); **трэкі** «Los 4» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006), «Farshistic» (у зборніку «Басовішча XVII», 2007).

**Кіно, відэа:** удзел у запісе саўндтрэку да фільму «Ночной дозор» (рэж. Ц. Бакмамбетаў, 2004), **кліп** «Oh, Empire» (рэж. Ф. Чмыр, 2000).

**Кантакт:** www.drumecstasy.com

11.06.07//Д.П., фота Д.П.

**«DTS band»** – мінская джаз-група, якая трымаецца стыляў джаз-року і ф'южн.

Утварылася ў 1997 з ініцыятывы бас-гітарыста *Аляксандра Каліноўскага* на базе музыкаў *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*.

У першым складзе калектыву выступалі Аляксандр Каліноўскі – бас-гітара, Дзмітрый Бударын – трамбон, Ігар Мішура – саксафон, Андрэй Славінскі – барабаны, Сяргей Аляксандраў – клавішныя. Апошнім часам на клавішных грае Альберт Кандрач'ян.

**Фестывалі:** «Мінск 1999, 2000, 2001», «Херфорд» (Нямеччына, 1999), «Флото» (Нямеччына).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «DTS Jazz» («DTS band», 2004), «Funkomania» («DTS band», 2006).

**Кантакт:** www.jazz.euroartwork.com; a_kalinovsky@mail.ru; +375 (29) 639-79-09.

28.05.06//Д.П.

**«JITTERS»** – мінская група, якая ўтварылася ў 1998.

Пачаткова складалася з Канстанціна Кармана – бас-гітара, вакал, музыка, тэксты, Сяргея Кандрацэнкі – гітара і Яўгена Вяля – барабаны. Стыль – ангельскамоўны брыт-рок. На пачатку 2006 у групу ўваходзілі К. Карман, С. Кандрацэнка, Артур Лучкоў – барабаны і Іван Барзенка – гітара, вакал, музыка (← восень 2005, «Rosary», «Папарис»). Увосень 2007 калектыў спыніў існаванне, К. Карман далучыўся да групы *«Hair Peace Salon»*.

**Фестывалі:** «Рок-кола» (Полацк, 2001), «Музыка без границ» (Нарва-Йесу, Эстонія, 2004), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2004, вольная сцэна), «Fiesta Borealis» (Алецка, Польшча, 2006).

**Узнагароды:** 1 месца ў намінацыі «Рок-музыка» на фестывалі «Музыка без границ» (Нарва-Йесу, Эстонія, 2004).

**Дыскаграфія:** сінгл «Pick Me Up» (аўт. выд., 2006) , CD «Split Before, Together Now» (сумесна з «Hair Peace Salon» – «West Records», кастр. 2007).

**Кантакт:** s_jitters@yahoo.com, k25detsea@yahoo.com, aluchkov@mail.ru, bayanich@yandex.ru; +375 (29) 315-44-02 (Канстанцін), 664-65-46 (Артур).
25.10.07//Д.П.

**«J:МОРС»** – мінская група, якая працуе ў стылі пап-року. Утварылася ў 1999 на базе дуэту *«No Logo»* складам: Уладзімір Пугач і Арцём Ледаўскі. Пасля сыходу вясной 2002 А. Ледаўскога касцяк групы склалі У. Пугач – вакал, гітара, музыка, тэксты і Раман Арлоў – гітара, музыка, тэксты. Да 2005 для запісаў і выступленняў запрашалі сесійных музыкаў, сярод якіх былі Юрый Вялюга *(«Стокс»)*, Міхаіл Пенда *(«Харлі»)*, Антон Арлоў *(«Куклы»)* – барабаны, Кірыла Сенін («Стокс»), Сяргей Храмцоў («Экивоки»), Аляксей Зайцаў («Ляпис Трубецкой», «Харлі») – бас-гітара, *Сяргей Анцішын* – гітара (*Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі*, *«Flat»*), *Макс Івашын* (*«Нейро дюбель»*), *Канстанцін Гарачы* (*«Apple Tea»*, «Харлі»), *Дзяніс Варанцоў* (*«Мантана», Алена Свірыдава*) – клавішныя, *Ігар Люты* – саксафон («Apple Tea»). Ад кастрычніка 2005, калі група правяла вялікі тур па Беларусі, замацаваўся наступны склад: У. Пугач, Р. Арлоў, Д. Варанцоў, А. Зайцаў, М. Пенда, Уладзімір Пазьняк – бэк-вакал. Група пачынала з выканання песень на расейскай мове, ад 2002 у рэпертуар уключаюцца й песні па-беларуску. У снежні 2004 група выдала першы беларускі Інтэрнэт-сінгл «100 дорог». Найбольш вядомыя песні «Web-дизайн», «Монтевидео», «Вместе навсегда (100 дорог)», «Апрель», «Мое Солнце», «Так-ціктак», «Принцесса», «Не умирай», «Босиком по мостовой».



**Гастролі:** тур «Моё Солнце» (Беларусь, восень 2005), тур «Босиком по мостовой» (Беларусь, восень 2006).
**Фестывалі:** «Хохлабуль 2002», «Рок-каранацыя» (2005, 2006), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2007).
**Узнагароды:** галоўны прыз на цырымоніі «Мистерия звука 2005» (па продажах) за альбом «Апрель»; «Рок-карона 2004–05» у намінацыі «Група году»; галоўны прыз на цырымоніі «Мистерия звука 2006» за альбом «Босиком по мостовой» (па продажах); «Рок-карона 2006» у намінацыях «Альбом году» («Босиком по мостовой») і «Пап-рок-выканаўца году».
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Ассорти» («Bulba-Records», 2000), максісінгл «Web-дизайн» («West Records», 2002), «Монтевидео» («West Records», 2004), Інтэрнэт-сінгл «100 дорог» («Green Music», 2004), «Апрель» («West Records», красавік 2005, перавыд. 2006), зборнік «Моё солнце: правдивая история 2000–05» («West Records», 2005), Інтэрнэт-сінгл «Не умирай» (2006), «Босиком по мостовой» («West Records», 2006), канцэртны CD «Ледоколы Live» («West Records», 2007), Інтэрнэт-сінгл «Беларускае золата» (2007); **трэкі** «Октябрь» (у зборніку «20 супер-хитов, рожденных в Беларуси» – «Bulba Records», 2000), «Ода вечной любви» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Прапанова» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМА-group», 2002), «Глядзі» (у зборніку «Наша музыка 1» – «Arlo Music», 2003), «Альбион» (у зборніку «Русские горки» – «Aist Music», 2004), «Землянка» (у зборніку «Белорусский вокзал» – «Aist Music», 2004), «Так-цік-так» (у зборніку «Наша музыка 2» – «Arlo Music», 2004), «Так-цік-так» (у зборніку «Прэм'ер Тузін 2005» – «West Records», 2005), «Мое солнце – remix» («Золотая Двадцатка. Зима 2006» – «West Records», 2006), «Мятное лето – remix» (у зборніку «Золотая Двадцатка. Весна 2006» – «West Records», 2006), «Не умирай» (у зборніку «Песня года Беларуси 2006. Часть вторая» – «Vigma», 2006), «Босиком по мостовой (у зборніку «Золотая двадцатка. Зима 2007» – «West Records», 2007).
**Кіно, відэа: DVD** канцэрт «Ледоколы Live» («West Records», 2007), **кліпы** «Октябрь» (рэж. М. Пінігін, 2000), «Web-дизайн» (рэж. А. Кляймёнаў, М. Бацвіннік, 2002), «Монтевидео» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2004), «Альбион» (рэж. А. Лескін, прадзюсэр А. Бартлава, 2004), «Так-цік-так» (рэж. У. Мядзведзеў, прадзюсэр А. Бартлава, 2004), «Принцесса» (рэж. М. Сіры, 2006), «Не умирай» (рэж. А. Гележюнас, 2006), «Ледоколы (live)» (рэж. М. Сіры, 2007), «Matter Of Trust» (рэж. У. Маркевіч, 2005); удзел у саўндтрэку да серыялу «Фабрика Грез» (рэж. Д. Астрахан, 2004).
**Кантакт:** www.jmors.by; j_mors@tut.by; +375 (29) 672-67-26.
06.10.07//А.Р.

# Е

**ЕЛІСЕЕНКАЎ АЛЕГ (Елисеенков Олег, Eliseenkau Aleh)** – кампазітар, аранжавальнік, спявак.
Нарадзіўся 21.09.1958 у Спас-Дзяменску Калужскай вобл., Расея.
У 1982 скончыў БДК па класе кампазіцыі Дз. Смольскага, у 1986 – у яго ж асістэнтуру-стажыроўку па класе кампазіцыі. У 1986–97 выкладаў аранжаванне ў МІКу, ад 1995 да 2000 – музычны кіраўнік тэлеконкурсу «Зорная ростань», ад 1997 да 2001 – галоўны рэдактар Галоўнай рэдакцыі музычных праграм БТ. Ад 2004 – кіраўнік студыі «Гран-при».
Працуе ў жанрах сімфанічнай музыкі, папулярнай песні. Ягоныя творы ўваходзяць у рэпертуар *Аляксандра Саладухі*, ансамбля *«Сябры»*, *Іны Афанасьевай*, *Валерыя Дайнэкі*, *Алесі*, А. Буйнова, А. Булдакова, У. Ухцінскага, *Ганны Мушак*, *Андрэя Хлястова*, *Аляксея Хлястова*, *Пятра Ялфімава* і інш. Найбольш вядомыя песні «Неравный брак», «Карусель», «Зелёные глаза».



**Фестывалі:** «Славянский базар» (неаднаразова), «Золотой скиф» (Данецк, Украіна).
**Узнагароды:** прыз «Хрустальный аист» за лепшае музычнае вырашэнне фільму на V Нацыянальным фестывалі беларускага кіно (2005).
**Дыскаграфія: альбомы** «Любовь и небо» на вершы *Юрыя Цыбіна* («Ковчег»), «Не надо слов» на вершы В. Кавальчука («Ковчег»); **трэкі** «Не переживай» (сл. *Алега Жукава*), «Неравный брак» (сл. М. Трацциякова), «Туманы-растуманы» (сл. В. Кавальчука), «Поздняя любовь» (remix) (сл. В. Кавальчука), «Карусель» (remix) (сл. Ю. Кручанка), «Зелёные глаза» (сл. *Алены Туравай*), «Посвящение женщине» (сл. К. Навагрудскага) – у альбоме Аляксандра Саладухі «Сотни километров до любви» («Vigma», 2005).
**Кіно, відэа: кліп** «Голос мамы» (рэж. *Анатоль Вечар*).
**Іншая інфармацыя:** сябра Саюзу кампазітараў Беларусі ад 1982.
**Кантакт:** eliseenkov@tut.by
19.06.05//Д.П.

**ЕЎДАКІМАЎ ЯРАСЛАЎ (Евдокимов Ярослав, Eudakimau Juraslau)** – спявак, выканаўца традыцыйнага папулярнага рэпертуару. Нарадзіўся 22.11.1946 у в. Карысць Карэцкага р-ну Ровенскай вобл. Скончыў ММВ у 1981. Творчую дзейнасць пачаў у 1975 як саліст-вакаліст БДФ, ад 1977 – саліст Ансамбля песні і танца ЧБВА, у 1980–90 – саліст Беларускага радыё і тэлебачання. Ад другой паловы 90-х жыве і працуе пераважна ў Маскве. У рэпертуары – песні на беларускай, украінскай, расейскай мовах, у тым ліку аўтарства *Яўгена Глебава*, *Валерыя Іванова*, *Ігара Лучанка*, Дз. Смольскага, народныя песні, творы духоўнай музыкі. Дыпламант Усесаюзнага конкурсу «С песней по жизни» (1979).

**Фестывалі:** «Славянский базар», «Золотой шлягер» (Магілёў, 1998).

**Дыскаграфія: альбомы** LP «Все сбудется» («Мелодия», 1988), CD «Не рви рубаху!» (1994), «Любовное настроение» («Никитин», 2004); **трэкі** «Письмо из 45-го» (у альбоме «Игорь Лученок. Песни и инструментальная музыка» – «Мелодия», 1983), «Снимок в газете», «Полынная ростань» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Майский вальс», «Берег юности», «Снимок в газете», «Кветка шчасця», «И пока на земле существует любовь» (у альбоме «И пока на земле существует любовь» І. Лучанка – «Мелодия», 1988), «Набат тишины», «Письмо из 45-го», «Так пришла к нам победа» (у LP зборніку «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985).

**Кіно, відэа: кліп** «Только ночь».

**Кантакт:** ya_evdokimov.ru, yaroslav@ya_yevdokimov.ru

Паводле Белэнцыклапедыі, Д.П.

**«EVTHANAZIA A.D.»** – група з Рэчыцы.

**Фестывалі:** «Massa Brutto 8» (Мінск, 2006).

**Дыскаграфія: альбомы** MC «Apocalypse Of Human» (дэма, 1994), «Pathological Madness» (дэма, 1995), CD «No Longer Forces» (1997), «Captured By Instincts» (2000), «The Hate Exhumation» («Fatal Ecstasy Prods.»).

03.03.07//Д.П.

**«EXHUMATOR»** – мінская група, якая трымалася стылю дэз/трэшметал.

Утварылася ў 1990, рэпертуар заснаваны на ангельскамоўных аўтарскіх песнях. У 1997 у групе выступалі Ігар Сільнічэнка – бас-гітара, Валерый Каліна – вакал, Дзмітрый Гарбачоў – гітара і Антон Архіпаў – барабаны. Выглядае на тое, што спыніла існаванне пасля 2000.

# Ж

**ЖАНЕТ** – гл. Бутэрус Жанет.

**ЖУКАЎ АЛЕГ (Жуков Олег, Zhukov Oleg)** – паэт, сцэнарыст, бас-гітарыст.

Нарадзіўся 01.01.1937 у Днепрапятроўску, Украіна. У 1959 скончыў Данецкі індустрыяльны інстытут. Выступаў у самадзейнасці, у 1967 быў запрошаны як бас-гітарыст у склад ансамбля *«Тоніка»* БДФ, у якім працаваў да 1970. Ад 1969 пачаў выступаць як паэт-песеннік, напісаўшы тэксты песень для Ю. Антонава, К. Сямёнавай, Л. Лешчанкі, С. Лазаравай, *Алесі*, *Аляксандра Саладухі*, У. Ухцінскага, *Іны Афанасьевай*, М. Гнацюка, М. Баскава, *Дзмітрыя Смольскага*, У. Кудрына, *Анжалікі Агурбаш*, ансамбляў *«Сябры»*, *«Верасы»*, «Поющие гитары», «Веселые ребята», «Калинка», «Добры молодцы», «Смеричка», *«Синяя птица»*, «Ариель», «Девчата» і інш. Аўтар тэкстаў да гімнаў фестываляў «Славянский базар» («Все цветы июля», муз. *Леаніда Захлеўнага*, 1988) і «Золотой шлягер» («Песни возвращаются», муз. *Ізмаіла Капланава*, 2000). Сябра журы на фестывалі «Золотой шлягер» і тэлефестывалі «Зорная ростань» (1997–99), ад 1997 выступае як выканаўца песень на ўласныя вершы ў зборных канцэртах («Старики-разбойники», 1997–2001). Аўтарскі канцэрт на Кастрычніцкай плошчы Мінску ў рамках свята гораду (2004). Аўтар сцэнарыяў фільмаў-канцэртаў «И песня взлетает сама. Владимир Оловников» («Тэлефільм», рэж. *Уладзімір Арлоў*, 1982), «Купалінка» («Тэлефільм», рэж. У. Арлоў, 1983). Найбольш вядомыя песні «Люди встречаются», «О добрых молодцах и красных девицах», «Жизнь играет с нами в прятки», «Наташка», «Одинокий», «Гном», «Тройка», «Теплоход», «А я не плачу», «Не переживай!», «Птицы», «Давай сегодня встретимся».

**Гастролі:** у складзе «Тонікі» – Польшча, Вугоршчына, Балгарыя.

**Фестывалі:** «Золотой шлягер» (Магілёў, 1998).

**Узнагароды:** лаўрэат тэлефестывалю «Песня года 2004», Расея.

**Дыскаграфія: альбом** CD «Люди встречаются, влюбляются, женятся…» (2004); **трэкі** «Жизнь» (у EP Ю. Антонава – «Мелодия», 1981, у LP Ю. Антонава «Крыша дома твоего» – «Мелодия», 1983), «Мой путь прост» (у LP Ю. Антонова «Поверь в мечту» – «Мелодия», 1985), «Я поеду в Париж» (муз. *Эдуарда Ханка*), «Ты зачем на мне женился?» (муз. *Ядвігі Паплаўскай*), «Скрипачка» (разам з М. Траццяковым, муз. Я. Паплаўскай) – усе ў LP *дуэту Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч* «Счастливый случай» («Мелодия», 1990).

**Кіно, відэа:** песні гучаць у кінафільмах «Берегите женщин» (1981), «Приказ» («Беларусьфільм», 1988);

**кліпы** «Скрипачка», «Ты зачем на мне женился?», «Я поеду в Париж» (усе – Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч), «Одинокий» (А. Саладуха, 1995), «Тройка» (У. Ухцінскі, 1998), «Теплоход» (*Мікалай Скорыкаў*, 2001), «Птицы» (*Алеся*, 2004), «Люди встречаются» (А. Папоў, 2005).

12.06.05//Д.П.

**«ZYGIMONT VAZA»** – мінская група, якая трымаецца стылю класічнага року.

Утварылася ў 1987 і першапачаткова выступала пад назвай «Bastinda». Ад 1989 – «Zygimont Vaza». Першы склад: Сяргей «Скрыпа MX» Скрыпнічэнка – гітара, вакал, Уладзімір «Вуля» Зарубкін – вакал, Сяргей «Серы» – бас-гітара, Леанід Патэнт – барабаны. Цягам гадоў у групе выступалі наступныя музыкі: Алесь «Цімоха» Цімошчанка – гітара, вакал (1991–93), Дзяніс «Аліса» Борбух (1992–93), Уладзімір Мулявін-малодшы (1993), Яўген «Рыжы» Собалеў (1989–92), Алег «Паганіні» Усціновіч (1994, ← *«Ы.Ы.Ы.»*), Вадзім «Вад» Юрэвіч (1993–94), Юрый «Гранж» Касьянаў (1994–97), Павел Заручэўскі (2002) – усе бас-гітара,



Сяргей Ражноў (1992–93), Віктар Літвіноўскі (1993–94), Хатаб (1994), Цыпрыян «Цыпрык» Натовіч (1995–2000), Йонас Буткевічус (2000, 2004) – усе барабаны, Дамінікас «Гілеп» Антанаўскас – бас-гітара, віяланчэль, духавыя (1995–2000), *Аляксандр Памідораў* – вакал (2002). На пачатку 2005 група складалася з С. Скрыпнічэнкі, Андрэя Сапоненкі – барабаны (адначасова *«P.L.A.N.»*), *Канстанціна Калеснікава* – бас-гітара (← 2003, адначасова *«IQ48»* і *«Пару рублей»*), Машы «Яр» Лагодзіч – вакал (→), Паўла Яноўскага – гітара (адначасова *«Пару рублей»*), Вольгі Самусік – вакал (← 2007, адначасова *«Тарпач»*). Рэпертуар групы трымаецца на беларускамоўных песнях аўтарства С. Скрыпнічэнкі.

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2004, 2005, 2006).

**Дыскаграфія: альбомы** МС і CD «Шыба 48» (1993), «Stotis» (1994), «Стан галюцынацыі» (1995), «Prezydent Collection» (1996), «Der dritte Krieg» (1998), «Камбінат» (2000), «Цар Максымільян» (музыка да спектаклю, 2004), CD «Kajin» (2004) – усё аўтарскія выданні; «Contrabanda» (музыка да фільму, непастаўлены, 1989–91), «Distortion» («БМAgroup», 2007); **трэкі** «Alarm» (у зборніку «Вольныя танцы – слухай сваё» – «БМAgroup», 1999), «Nowe sytuacje» (у зборніку «Сэрца Эўропы in rock» – «БМAgroup», 2001), «Паліцэйскі sex» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМAgroup», 2002), «Казарма» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004).

**Кантакт:** www.zygvaza.net; skrypa@tut.by

04.09.07//Д.П., фота Д.П.

# З

**ЗАГУМЁНАЎ ІГАР (Загуменов Игорь, Zagumionof Igor)** – музыка, аўтар тэкстаў і музыкі.

Нарадзіўся 18.02.1981 у Мінску. Скончыў Беларускі інстытут прававоўства па спецыяльнасці міжнароднае права ў 2002. Творчы шлях пачынаў як вакаліст андэграўнднай групы «Rodeo» (2000–02), супрацоўнічаў з групамі «Volk», «Мания величия». У канцы 2002 вырашыў распачаць сольную кар'еру, зняў кліп на песню «Кастрычнік» з удзелам Сяргея Волка – клавішныя, *Сяргея Анцішына* – гітара і Юрыя Мазырына – бас-гітара. У кастрычніку 2003 пачаў выступаць выключна пад назвай *«Zigzag»* у кампаніі з Сяргеем Аруцюнянам – аранжаванне, клавішныя, кларнет і Юрыем Кашыным – гітара. Запісаў першыя песні, у тым ліку на беларускай мове. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Кастрычнік», «Палымянае неба». Даў шэраг выступаў у мінскіх клубах, удзельнічаў у адкрытых эфірах радыё «Мир» (праграма «Легенды ритм-энд-блюза»), арганізатар і ўдзельнік трыб'ют-канцэрту «Radiohead» (сакавік 2003).



**Гастролі:** Докум (Нямеччына, 1998).
**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007).
**Кіно, відэа: кліпы** «Гульня» (2003), «Кастрычнік» (2003), «Пабудзі мяне» (рэж. А. Несцераў, 2004), «Гара».
**Дыскаграфія: альбом** CD «Bionic@» («БМAgroup», 2005), «Тры расейскія літары» («Ковчег», 2007); **трэкі** «Кастрычнік» (у зборніку «Жыць для Беларусі» – «БМAgroup», 2005), «Song Of The Wave» (у зборніку «Первый Интернационал» – «Vigma», 2006).
**Іншая інфармацыя:** дэлегат III сусветнага кангрэсу моладзі (Сцірлінг, Шатландыя, 2005).
**Кантакт:** izag@tut.by; +375 (29) 634-37-45.

21.09.07//Д.П., фота А. Малышава.

**ЗАЙЧАНКА УЛАДЗІМІР (Зайченко Владимир, Zaitchenko Wladimir)** – музыка, гукарэжысёр, прадзюсэр.

Нарадзіўся 09.01 у год Каня ў Чаля-

бінску, Расея. Скончыў БІНГ і сярэднюю музычную школу па класе фартэпіяна. Ад канца 70-х пачаў выступаць у складзе школьнага ансамблю, потым граў у адным з калектываў інстытуту, пасля – у групе «ZPG», працаваў у складзе груп «Модуль» А. Спіцына (1986), *«Князь Мышкин»* (1993). У 1987 быў абраны прэзідэнтам Мінскага рок-клубу. Арганізатар і ўдзельнік штогадовых фестываляў «Дзень нараджэння Рычы Блэкмара» (ад 1981), «Сустрэчы на Доўгім бродзе» (1989), «Рок-рынг» (1992), «Дзень нараджэння Джымі Хендрыкса» (ад 1996), аўтар і вядучы тэлепраграмы «Рок-архіў» (1992–93). Асноўны напрамак дзейнасці – запіс сольных альбомаў: ад канца 70-х да 1997 на хатняй студыі «Fanatic Records» запісаў 78 дэма-альбомаў. Ад лютага 1998 перавёў студыю на лічбавы фармат, апрача запісаў чарговых альбомаў інструментальнай музыкі дапамагае музыкам-пачаткоўцам у стварэнні дэма-запісаў.

**Дыскаграфія:** (усё дэма): «Лабиринты канализации», «Рак ушей», «Красное и белое», «Импровизация и экспромт» (усе – 1998), «Мир иллюзий» (1999), «Демон зла», «Звуки радуги» (усе – 2000), «Время вечности» (2001), «Карнавал аномалий», «Лесной кайф-ч» (усе – 2002), «Юбилей монстра. The Best of Z.V. 1998–2002» («ZV Fanatic Records», 2003), «Замкнутый круг III» («ZV Fanatic Records Ltd», 2006).

**Кантакт:** +375 (17) 236-57-93.

05.01.05//Д.П.

**ЗАЙЦАЎ АЛЯКСЕЙ (Зайцев Алексей, Zaitsev Alexei)** – барабаншчык, гукарэжысёр.

Нарадзіўся 11.06.1967 у Мінску. У 2005 скончыў БАМ па спецыяльнасці гукарэжысура. Як музыка дэбютаваў у 1988 у складзе мінскай групы *«Зартипо»*, у якой выступаў да 1995. Пакінуўшы калектыў, заняўся гукарэжысурай, працуючы на розных студыях – «Меццо-форте», «Скат», студыя Белдзяржтэлерадыёкампаніі, «Селах», «Арт-студыя» ў Мазыры, ад 2006 – мінская студыя «Бегемот». Удзельнічаў у запісе шэрагу альбомаў *Аляксея Шадзько* і групы *«Сестра»*, *Аляксандра Саладухі, Аляксея Хлястова, Тарыэла Майсурадзэ*, груп *«J:морс», «Чехов», «Харлі», «Ляпис Трубецкой», «Леприконсы»*, «Запрещённые барабанщики», *«НЕО»*, «Виниловые сны», «Ночной портье», *«Slang»* і інш. Запісваў музыку для мастацкіх фільмаў «На безымянной высоте» (рэж. В. Нікіфараў, «Белпартнёр» на замову ОРТ, Масква, 2003), «Человек войны» (рэж. Мурадов, «Белпартнёр» на замову ОРТ, Масква, 2004), «Армия спасения» (рэж. Я. Краўцоў, «Видеофакт», 1998), тэлепраграмы «Тарарам» (для каналу НТВ, Масква, 2003). У якасці мастэрынг-інжынера ўдзельнічаў у падрыхтоўцы да выдання альбомаў А. Саладухі, Аляксея Хлястова, *Наталлі Тамелы*, «Чехов», «J:морс», «Харлі», серый «Бульба-хит», «Беларускі турбаміксер», «Slang», «Наша музыка» і інш. Адначасова выступаў як сесійны барабаншчык, запісваючыся з Л. Краўцовай, *Алесяй*, А. Берулавай і інш. Выступаў у прэсе (часопіс «Музыкальное оборудование», Расея) як аўтар артыкулаў, прысвечаных пытанням гукарэжысуры.

**Кантакт:** +375 (29) 631-90-08; tiredsun@mail.ru
25.12.04//Д.П.



**ЗАЛЕСКАЯ ВОЛЬГА (Залесская Ольга, Zalesskaya Olga)** – спявачка, аўтар тэкстаў і музыкі. Нарадзілася 26.03.1969 у Віцебску. Скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, у 1993 – факультэт журналістыкі БДУ. Працавала карэспандэнтам у віцебскіх газетах, адміністратарам тэатру «Этап», супрацоўнічала з «Белвідэацэнтрам» як сцэнарыст і мастацкі кіраўнік праекту аб аўтарскай песні Беларусі. Як аўтар і выканаўца ўласных песень пачала выступаць на сцэне ў другой палове 80-х, трымаючыся жанру бардаўскай песні. Ад вясны 1999 да лета 2000 вяла праграмы аб аўтарскай песні «На кухні з Вольгай Залескай» на «Альфа-радио» ў Мінску. У 2002 зрабіла запіс шэрагу ўласных песень у суправаджэнні джазавага трыо *Аркадзя Эскіна* (праграма «Безумная Марта»). У 2006 запісала альбом уласных песень, вытрыманы ў стылі сучаснага гарадскога рамансу, сумесна з групай *«WZ-Orchestra»* пад агульным кіраўніцтвам *Зміцера Вайцюшкевіча*. Спявае на расейскай мове. Сярод найбольш вядомых песень «Золотая мельница», «Безумная Марта», «Шахматы», «Журавлики», «Августин», «Шампиньоны».

**Гастролі:** Ізраіль (1999, 2000), Расея (2006).

**Фестывалі:** Усесаюзны фестываль аўтарскай песні (Кіеў, 1990), «Норильск 1999», моладзевы Пушкінскі фестываль (Масква, 1999), Міжнародны паэтычны фестываль (Варшава, 2002), фестываль аўтарскай песні (Більштайн, Нямеччына, 2004), Грушынскія фестывалі (неаднаразова), рэгіянальныя і нацыянальныя фестывалі аўтарскай песні.

**Узнагароды:** лаўрэат Усесаюзнага фестывалю аўтарскай песні (Кіеў, 1990), моладзевага Пушкінскага фестывалю (Масква, 1999), шэрагу нацыянальных і рэгіянальных фестываляў аўтарскай песні.

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Небесной лодки тень» (аўт. выд.,1994), «Египетские сны» (аўт. выд.,1995), «Гадание на зеркале» («Ковчег», 1996), «Гадание на яблоке» («Ковчег», 1997), «Шахматы» (аўт. выд., 1999), CD «Золотая мельница» (Масква, «Восточный ветер», 2000), «Небесная таверна» («Vigma», 2006).

**Кнігі:** зборнікі вершаў «Голуби и крошки», «Август» (аўт. выд., 2000).

**Кантакт:** olga_zaless@tut.by; olga_zaless@pochtamt.ru
05.11.06//Д.П., фота Д.П.



**ЗАМІРОЎСКАЯ ТАЦЦЯНА (Замировская Татьяна, Zamirovskaya Tatyana)** – журналістка.

Нарадзілася 11.04.1980 у Барысаве. У 2002 скончыла факультэт журналістыкі БДУ, у 2006 – там жа аспірантуру. Выступаць у прэсе пачала ў 1997 – пісала нататкі, артыкулы, партрэты, рэпартажы, рэцэнзіі, інтэрв'ю для «Музыкальной газеты» (сярод іншага – цыкл артыкулаў «Семь дней белорусского рок-н-ролла» ў суаўтарстве з Максімам Івашчанкам) і часопісу «НОТ-7». У 1998–2001 – супрацоўнік газеты «Молодёжный проспект», аўтар матэрыялаў на тэмы культуры, музыкі. Ад 2002 пастаянны аўтар украінскага расейскамоўнага контркультурнага часопісу «Наш» (Днепрапятроўск). Ад 2002 да восені 2003 – рэдактар часопісу «Джаз-квадрат», у 2002–03 – аўтар рубрыкі «Саўндтрэкі» моладзевай перадачы «Адкрытая пляцоўка» на першым канале Нацыянальнага радыё Беларусі.
У 2004–06 – музычны аглядальнік штотыднёвіка «Развлечения и отдых», ад 2005 і да цяперашняга часу – музычны аглядальнік «Белгазеты». Выступала з публікацыямі на партале tochka.by, у часопісах «21 век», «Music Box» (Масква), на сайтах mixtura.org и delta.by, у газеце «Человек и Интернет» і інш.
**Кантакт:** cloud_9@tut.by; vinah.livejournal.com
18.11.06//Д.П.

**«ЗАРТИПО»** – мінская група, утварылася на пачатку 1988 з асноўнага складу групы «Близнецы».

Пачаткова выступала ў стылі постпанку, потым перайшла на рэйкі інтуітыўнай імправізацыі і скончыла сваё існаванне на пачатку 1996, выступаючы ў стылі псіхадэлік фанк-року. У першапачатковым складзе калектыву выступалі Андрэй Іваноў –

гітара, Сяргей Старыковіч – барабаны, Валерый Шашок – вакал, Андрэй Саўчанка – бас-гітара, вакал, Уладзімір Вуколаў – гітара, вакал, *Алесь Камоцкі* – саксафон, Дзмітрый Плотка – гукааператар. Пэўны час у групе выступаў Леанід Нарушэвіч – гітара (→ «Князь Мышкин»). У канцы існавання група выступала ўжо як чыста інструментальнае трыо складам: А. Іваноў, *Валерый Башкоў* – бас-гітара, *Аляксей Зайцаў* – барабаны. Адным з першых беларускіх калектываў група пачала актыўна выступаць на клубных сцэнах Нямеччыны, даўшы ад верасня 1992 да снежня 1995 каля 70 канцэртаў у клубах розных гарадоў краіны.
У апошнія гады пад гэтай назвай выступае практычна адзін А. Іваноў.
**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Наваполацк» (1988), «Рок-диалог» (Магілёў, 1989), «Рок-форум» (Вільня, 1989), «Сырок-3» (Масква, 1990), міжнародны джазавы фестываль «ММК Джаз» (Ніжні Ноўгарад, 1992), міжнародны джаз-фестываль «Vasaras ritmi» (Рыга, 1992), фестываль авангардных мастацтваў (Вільня, 1992), фестываль расейска-фінскай дружбы «У Петлюры» (Масква, 1991), «Cultur Brauerei» (Нямеччына, 1992) і інш.
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Час дантиста» (1988), «Лю» (1989/90), «Ым» (1990), «Счушо» (1991), «Зартипо» (1991), «Noise» (1994), «Satur Ventur Non Studit Libentor» (1994), «Overpsycho Live» («Zartipo Records», 2001); **трэкі** «Люлиляка-я» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990).
21.10.06//Д.П.

**ЗАРЫЦКІ ЭДУАРД (Зарицкий Эдуард, Zarytski Eduard)** – кампазітар.

Нарадзіўся 09.02.1946 у Чырвоным Куце Саратаўскай вобл., Расея. Скончыў БДК па класе кампазіцыі А. Багатырова ў 1970. У 1973–82 загадчык музычнай часткі Рэспубліканскага тэатру юнага гледача. Піша сімфанічную і камерную музыку, аўтар вакальнага цыклу на вершы *Анатоля Вярцінскага* (1971), музыкі для спектакляў і мультфільмаў, шматлікіх песень. Сярод найбольш вядомых «Палыновая ростань» (вык. *Мікалай Скорыкаў*), «У бацькоўскім кутку» (вык. *Юлія Скараход*), «Мара Скарыны».
**Узнагароды:** лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.
**Дыскаграфія:** CD «Пад родным небам. Песні Эдуарда Зарыцкага на вершы *Ніла Гілевіча*» («Ковчег»); **трэкі** «Палыновая ростань» – *Яраслаў Еўдакімаў* (сл. Н. Гілевіча, у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Набат тишины» (у зборніку «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985), «Незабудкі» (сл. *Уладзіміра Карызны*, ансамбль *«Сябры»* ў LP «Далёкий свет» – «Мелодия», 1986), «Музыка» (сл. У. Карызны), «Такі сон» (сл. Зм. Бядулі), абедзве ў ЕР «Чараўніцы» – «Мелодия», 1983).
Паводле Белэнцыклапедыі/Д.П.

**ЗАХЛЕЎНЫ ЛЕАНІД (Захлевный Леонид, Zakhleuny Leanid)** – кампазітар.

Нарадзіўся 16.01.1947 у Гродне. Скончыў БДК у 1972 па класе кампазіцыі А. Багатырова, асістэнтуру-стажыроўку пад кіраўніцтвам *Яўгена*

*Глебава* (1976). Ад 1976 да 1978 – выкладчык ММВ, ад 1978 да 1989 – музычны рэдактар «Беларусьфільму». У 1990 узначаліў ансамбль народнай музыкі «Бяседа» Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі. Працуе ў жанрах сімфанічнай і камернай музыкі, піша эстрадныя песні, музыку для кіно і тэатру. Аўтар песеннага цыклу «Памяць» (1980), рамансаў і вакальных цыклаў на вершы К. Буйлы, *Уладзіміра Карызны*, М. Багдановіча, музыкі да драматычных спектакляў і кінафільмаў.

**Узнагароды:** лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі (1980), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994).

**Дыскаграфія: трэкі** «Все цветы июля» – *Іна Афанасьева* (сл. *Алега Жукава*, у альбоме «Лауреаты Всесоюзного конкурса польской песни, Витебск 1988» – «Мелодия», 1989), «Дамское танго», «Лазня» (сл. *Аляксандра Лягчылава*, у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999), «Вясенняя песня Радзіме», «Зялёны паром» – *«Сябры»* (абедзве на сл. У. Карызны, у LP «Далёкий свет» – «Мелодия», 1986), «Ноч без цябе» – *Ірына Дарафеева* (МС «Рэдкі госць» – «Ковчег», 1999), «Зямля мая», «Поле памяці» (сл. *Уладзіміра Някляева*, LP «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985), «Белая вежа» (ансамбль *«Верасы»*, у LP зборніку «Золотая моя Москва» – «Мелодия», 1981), «И поэтому жизнь продолжается» (сл. У. Някляева) і «Белая вежа» (сл. А. Ульяновіча) – абедзве ў зборніку «Как слово наше отзовётся. Песни молодых композиторов» – «Мелодия», 1983.

25.11.06//Д.П.

**ЗЕЛЯНКЕВІЧ СЯРГЕЙ (Зеленкевич Сергей, Zeliankevitch Siarhey)** – спявак, кампазітар. Нарадзіўся 10.09.1961 ў Мінску. Скончыў ММВ па класе ўдарных Л. Капілава (1984), у 1991–93 вучыўся ў МІКу па спецыяльнасцях эстраднага дырыжавання (клас В. Бартноўскага) і ўдарных (клас С. Лапташова). У 1995 скончыў Мінскі інстытут кіравання па спецыяльнасці эканаміст-менеджэр. Працаваў музыкам БДФ, у 1986 некаторы час уваходзіў у склад групы *«Бонда»*. У 1989–90 – саліст-вакаліст групы *«Рада»*. Як сольны выканаўца карыстаўся псеўданімам «Сяргей Грын». У другой палове 90-х адышоўся ад музыкі. Спяваў на беларускай і расейскай мовах. Сярод найбольш вядомых песень «Телефонный звонок», «Сколько раз говорил я себе...».

**Дыскаграфія: трэк** «Телефонный звонок» (у LP зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990); дэма-альбом «Серёжка».

03.03.07//Д.П.

**ЗНЫК ІГАР (Зных Игорь, Znyk Ihar)** – прадзюсэр, менеджэр. Нарадзіўся 27.08.1970 у Варшаве. Цягам 11 гадоў вучыўся ў Тэатральнай акадэміі, на факультэце эканомікі Варшаўскага ўніверсітэту. Ад 2004 актыўна займаецца прапагандай беларускай рок-музыкі ў Польшчы. Найперш пачаў там каардынаваць паказ праекту «Партызанская школа», ад 2005 – менеджэр групы «Recha», ад 2006 – груп *«B.N.»* і *«Сьцяна»*. Выканаўчы прадзюсэр канцэрту «Solidarni z Białorusią» ў Варшаве (сакавік 2006) з удзелам





групы *«N.R.M.»*, *Лявона Вольскага*, *Ігара Варашкевіча, Зміцера Вайцюшкевіча*, *Касі Камоцкай*, Русі, *Аляксандра Кулінковіча*, *Вячаслава Кораня* і інш. Арганізатар імпрэзаў «Культурныя вычварэнцы – Беларусь» (23–25 сакавіка 2006, Варшава) з удзелам К. Камоцкай, З. Вайцюшкевіча, груп *«Яр»*, *«Нагуаль»*, «B.N.», *«IQ48»*. Арганізатар канцэртаў у Польшчы К. Камоцкай, груп *«Этна-трыо «Тройца»*, *«WZ-Orkiestra»*, *«Indiga»*, «B.N.», «Сьцяна», «IQ48», «Recha», «Далі», *«Крамбамбуля»* і інш. Дапамагаў у выданні альбому «Zyvie rock&roll» групы «B.N.».

**Фестывалі:** «Басовішча 2005–07», «Бардаўская восень 2006» (фундаванне ад сайту www.lacinka.org).

**Іншая інфармацыя:** ад 2005 – старшыня сайту www.lacinka.org.

**Кантакт:** www.lacinka.org;
znycky@hotmail.com;
+48 (50) 427-25-34,
+375 (29) 253-42-45.

18.11.06//Д.П., фота Д.П.

**«ЗОДЧИЕ»** – вакальна-інструментальны ансамбль з Мінску.

Утварыўся ў 1968 з намаганняў студэнтаў політэхнічнага інстытуту. У першым складзе ансамбля выступалі Юрый Пікус – клавішныя, вакал, Уладзімір Акуліч – сола-гітара, Цімафей Ельskaновіч – барабаны, Мурат Смольскі – гітара, вакал (← 1969), Мацвей Рабкін – бас-гітара, Сямён Гафштэйн – гітара, вакал. Рэпертуар калектыву складаўся з уласных апрацовак беларускіх народных песень, песень савецкіх кампазітараў патрыятычнага гучання, аўтарскіх твораў, падчас ігры на танцах ансамбль выконваў на мове арыгіналу творы заходняй рок-музыкі. Найбольш вядомыя творы таго часу «Касіў Ясь канюшыну», «Стой, не стреляй, солдат». Пасля паспяховага ўдзелу ва Усесаюзным тэлеконкурсе «Алло, мы ищем таланты» цягам трох гадоў ансамбль працаваў як адзінка Расканцэрту, ад 1974 году распачаў працу ў мінскіх рэстарацыях як калектыў АМА складам: М. Смольскі, Ю. Пікус, Зіновій Фарбер – клавішныя, Ігар Волчак – клавішныя. На пачатку 80-х ансамбль прыпыніў існаванне.

Аднавіўся ў 2004. У 2006 выступаў складам: М. Смольскі – бас-гітара, вакал, С. Гафштэйн, У. Акуліч, Яўген Батыркін – барабаны, Аляксандр Палішчук – клавішныя. Рэпертуар гэтага часу засноўваўся на песнях груп «Beatles», «Czerwone gitary», аўтарскіх творах, папулярных савецкіх песнях 70-х.

**Гастролі:** СССР (1971–74).

**Фестывалі:** «Beatles Forever» (Мінск/Лагойск, 2006).

**Узнагароды:** лаўрэаты Усесаюзнага тэлеконкурсу «Алло, мы ищем таланты» (Масква, 1971).

**Кіно, відэа:** у М. Смольскага захоўваецца аматарская 8-міліметровая кінастужка – здымкі фіналу конкурсу «Алло, мы ищем таланты».

**Кантакт:** +375 (29) 634-61-75 (М. Смольскі); gal_fenix@tut.by

14.10.06//Д.П., фота Д.П.

**«ЗОЛОТАЯ СЕРЕДИНА»** – група з Брэсту, утвораная ў 1974 студэнтамі на базе Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытуту.

Першапачатковы склад: Аркадзь Клябанаў – клавішныя, лідэр, Яўген Клябанаў – бас-гітара, Яўген Прыступа – барабаны, Валерый Гуранчук – гітара, Алег Шусцікаў, Мікалай Парфянюк, Мікалай Маскаленка – вакал, Аляксандр Ільенка – клавішныя, Юрый Сініца – гукарэжысёр. Калектыў выконваў пераважна ўласныя расейскамоўныя песні ў стылі класічнага року, а таксама кавер-версіі. У 1976 у склад калектыву ўваходзіць *Алег Аверын (Казловіч)* – клавішныя, вакал, які неўзабаве становіцца асноўным кампазітарам. У 1980 адыходзяць А. Ільенка, М. Маскаленка, М. Парфянюк (→ тэатр «Ленком»), у 1984 В. Гуранчука змяняюць Рыгор Крупін і Аляксандр Вераб'ёў – гітары. Група перастала існаваць у 1990 пасля ад'езду братоў Клябанавых і А. Вераб'ёва ў Ізраіль, А. Аверын з 1993 пачаў выступаць у ансамблі *«Песняры»*.

**Гастролі:** СССР, Польшча (1988), ФРГ.

**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі ў Наваполацку (1987), «Каспий – море дружбы» (Казахстан, 1987), «Парад надежд» (Мінск, 1988).

**Узнагароды:** 1 месца на Рэспубліканскім фестывалі моладзевай музыкі ў Наваполацку (1987), лаўрэат



прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі за антываенную праграму песень (1987), галоўны прыз на фестывалі «Парад надежд» (Мінск, 1988).
**Дыскаграфія: трэкі** – «Автобиография» і «Слова, слова...» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990).

08.04.03//Д.П., фота Я. Мяцеліцы.

**«ЗЬМЯЯ»** – мінская група. Аформілася ў канцы лета 2003, калі пачала выступаць пад гэтай назвай, выконваючы беларускамоўную рок-музыку, у якой сплятаюцца элементы многіх стыляў – ад хард-кору да рэгей. Дэбютавала група на сцэне вясной 2004. У канцы 2006 выступала наступным складам: Яўген «Бровіч» Броўка – бас-гітара, Уладзімір «Сакс» Сахончык – гітара (абодва ад канца 2003, адначасова – *«Нейро дюбель»*), Зоя «Зьмяя» Каральчук – вакал, варган (← «Псыхоз», бас-гітара), Аляксандр «Нармальны» Кузьмук – барабаны (← кастр. 2004).
**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2005, 2006).



**Узнагароды:** прыз Саюзу беларусаў Польшчы ў конкурсе на фестывалі «Басовішча 2005».
**Дыскаграфія: альбомы** «Кідай зброю» (дэма, 2004), CD «Усё дзеля вас!» («БМAgroup», 2005), «Гост густа дусту» («БМAgroup», 2007);
**трэкі** «Усё дзеля вас!» (у зборніку «Metallection III» – «БМAgroup», 2004), «Антанаўка» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006).
**Кантакт:** www.zmeya.tk; zmeya@tut.by

22.07.07//Д.П.

**«ZЕМЛЯ КОРОЛЕВЫ МОД»** – група з Бабруйску, вытокі ўтварэння якой у 1991.
У першым складзе калектыву, які пачаткова называўся «Акелла», выступалі Мікалай «КолКа» Алфімаў – тэксты, музыка, вакал, гітара, Сяргей Чыжанок – клавішныя, Эдуард Аляксееў – гітара, Валерый Луцкі – бас-гітара, Ігар Выхота – барабаны. У наступныя гады склад калектыву неаднаразова змяняўся, у лютым 1994 група абрала цяперашнюю назву, выконваючы расейскамоўную музыку ў рэчышчы мэйнстрыму року. Склад групы напрыканцы вясны 2007: Мікалай Алфімаў – тэксты, музыка, гітара, вакал, Сяргей Чыжонак – камп'ютэры, клавішныя, вакал, Яўген Аляхновіч – гітара, вакал, Віталь Сідарэнка – бас-гітара, Аляксандр Мядзведзеў – барабаны. Група неаднаразова выступала на рэгіянальных байк-фэстах, у клубах Мінску, Магілёву і Бабруйску, удзельнічала ў музычных праграмах тэлеканалу «Лад». Сярод найбольш вядомых песень «Прощай, Земля», «Сердце дурака», «Герои», «Белая-белая», «Сойти с ума».
**Фестывалі:** «Дубинушка», «Рок против наркотиков» (Бабруйск).

**Дыскаграфія: альбом** «Сердце Дурака» («Vigma», 2007).
**Кіно, відэа: кліпы** «Прощай, Земля» (рэж. *Уладзімір Максімкаў*, 2006), «Герой бесконечности» (рэж. У. Максімкаў, Б. Швайбовіч, 2006), «Весна-Невеста» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2007).
**Кантакт:** 3km@inbox.ru; +375 (29) 749-14-62.
14.06.07//Д.П.

**«ZET»** – група з Мінску. Утварылася ў 2000 і выконвае рок-музыку з элементамі гранджу і хард-кору. Ад заснавання група выступае нязменным складам: *Лявон «Канцлер» Вольскі* – гітара, вакал, Уладзімір Плюшчаў – бас-гітара (← *«Hasta la fillsta»*), Аляксандр Быкаў – барабаны (← *«Sacrastic Green»*, *«Новае Неба»*, *«Ulis»*), Сяргей Кананові́ч – гітара (← *«Hasta la fillsta»*). Падчас канцэртаў удзельнікі калектыву выступаюць у масках, захоўваючы ананімнасць. Рэпертуар калектыву заснаваны на аўтарскіх беларускамоўных песнях з выразным сацыяльным, палітычным акцэнтам.
**Узнагароды:** «Рок-карона 2004–05» у намінацыі «Песня году» («Белакрылы анёл»).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «З новым годам!» («Ковчег», 2003), «Radzima.com» («GO-Records», 2006); **трэкі** «Useless» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Раз, два, тры» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМАgroup», 2002), «Краіна дурняў» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМАgroup», 2004), «Радзіма-Свабода!» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006).
**Кіно, відэа: кліп** «Калгас» (рэж. У. Біндзюкоў, 2003).
15.07.06//Д.П.

**«ZIGZAG»** – мінская група, якая ўтварылася ў канцы 2002 з ініцыятывы *Ігара Загумёнава*. Склад групы ўсталяваўся ўвосень 2003, у ёй, апрача лідэра, выступаюць Сяргей Аруцюнян – аранжаванне, клавішныя, кларнет і Юрый Кашын – гітара. Група трымаецца рокавага стылю з акцэнтам на меладычнасць песень. Сярод найбольш вядомых твораў, якія выконваюцца на расейскай, беларускай і ангельскай мовах, песні «Кастрычнік», «Палымянае неба», «Малітва», «Mine-Free World». Прэм'ера апошняй адбылася на гала-канцэрце «Свет без мін» у Найробі (Кенія) у лістападзе 2004.
**Фестывалі:** «У Лявоніхі» (Навасібірск, 2005), III сусветны кангрэс моладзі (Сцірлінг, Шатландыя, 2005), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007).
**Дыскаграфія: альбом** CD «Bionic@» («БМАgroup», 2005), «Тры расейскія літары» («Ковчег», 2007); **трэкі** «Кастрычнік» (у зборніку «Жыць для Беларусі» – «БМАgroup», 2005), «Song Of The Wave» (у зборніку «Первый Интернационал» – «Vigma», 2006), «Дзіўны май», «Пурга» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМАgroup», 2004), «Кастрычнік» (у зборніку «Прэм'ер Тузін 2006» – «West Records», 2006).
**Відэа, кіно: кліпы** «Гульня» (2003), «Кастрычнік» (2003), «Пабудзі мяне» (рэж. А. Несцераў, 2004), «Гара» (2005), «Mine-Free World» (2005), «Song Of The Wave» (2006), «Тры расейскія літары» (2006), «Кастрычнік 2» (рэж. М. Сіры, 2007).

**Кантакт:** izag@tut.by;
+375 (29) 634-37-45.
28.10.06//Д.П.

**«ZINDAN»** – мінская група, створаная ў 1992 музыкамі, што раней выступалі ў складзе групы *«Сузор'е»*. Асноўны стыль – блюз, рытм-энд-блюз, рок-н-рол, большасць рэпертуару складалі як аўтарскія творы, так і стандарты заходніх аўтараў. Першапачатковы склад: Нэлі Дзянісава – вакал (← «Сузор'е», *«Университет»*), *Аляксей Казлоўскі* – бас-гітара, вакал (←«Сузор'е», «Университет»), *Андрэй Філатаў* – барабаны (← «Сузор'е»), Сяргей Гірута – клавішныя.
**Дыскаграфія: трэк** «Let Him Go» (у зборніку «FM перехват-1» – «TON-Records», 1996, LP «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), дэма МС «Zindan» («Ковчег», 1996).
20.09.04//Д.П.

**«ZNICH»** – мінская група, заснавалася ў 1996.
Першапачатковы склад: Алесь Таболіч – лідэр, вакал, Алесь Гарох – барабаны (→ 1998 *«Drum Ecstasy»*), Алесь Беленькі – клавішныя (да 1998), Віка Сыцэвіч – бас-гітара, Аляксей Таргонскі – гітара. Па першым часе ўласны стыль музыкі вызначалі як паган-метал, цяпер трымаюцца стылю, які самі называюць фолк-арт-метал. Творчасць калектыву угрунтавана на спалучэнні народных тэкстаў з цяжкай музыкай, націскам на ўласны музычны матэрыял. Песні выконваюцца на беларускай мове. У розныя гады ў калектыве выступалі Сяржук Малінін – гітара (1998–2001, → «Vir»), Алесь Савінок – гітара (2001–03, → *«Divina Enema»)*, Наталля Валынец – вакал, Дзяніс Галіцкі – барабаны (→ 2003), Павел Заручэўскі – бас-гітара (→ 2003). Летам 2004 група выступіла з міні-турам па Беларусі практычна першапачатковым складам без Н. Валынец і з гітарыстам С. Стэцам. У 2005 у складзе групы выступалі: А. Таболіч, Вячаслаў Плашчынскі – гітара, Кастусь Трамбіцкі – дуда, Зміцер Сырэц – барабаны, Цімур Ганбараў – бас-гітара.
**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1997, 1998, 2000, 2001, 2007), «Baltic Thunder» (Мінск, 1998), «Рок-купалле» (Мінск, 1999), «Рок-каранацыя 2001», «Metal Golds» (Кіеў, 2001), «Red Alert Open Air» (Еўпаторыя, 2007).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Язычнік я...» («Procl Ent.», 1997), «Дух зямлі» («Cosmopolitan», 1998), «Адчуваньні вясны» (сінгл, аўт. выд., 2000), «Запаветы апошняга старца» («БМАgroup», 2003), CD «Язычнік я...» (перавыд. «БМАgroup», 2004), «Крыжы-абярэгі» («БМАgroup», 2006); **трэкі** «Чорны зьніч» (у зборніку «Hard Life – Heavy Music» – «БМАgroup», 2001), «Крыжы-абярэгі» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМАgroup», 2004).
**Кіно, відэа: кліп** «Што за ўсё тлусьцейшае?» (рэж. Л. Архіпцава, 2001).
**Кантакт:** www.znich.org, manager@znich.org;
+375 (29) 630-19-29 (А. Таболіч).
15.01.05//Д.П.

# І

**ІВАНОЎ ВАЛЕРЫЙ (Иванов Валерий, Ivanou Valeri)** – кампазітар.
Нарадзіўся 4.01.1948 у г.п. Глуск Магілёўскай вобл. Скончыў БДК у 1975 па класе кампазіцыі П. Падкавырава і асістэнтуру-стажыроўку ў Віленскай дзяржаўнай кансерваторыі пад кіраўніцтвам Ю. Юзелюнаса (1980).
Ад 1977 – выкладчык БДК, ад 2005 – галоўны рэдактар дырэкцыі музычнага вяшчання Нацыянальнага радыё. Працуе ў розных жанрах сімфанічнай і камернай музыкі, аўтар музыкі для кіно і тэатру, інструментальных эстрадных твораў і песень. Найбольш вядомыя песні «Пахне чабор», «Тапаліны звон», «Гуляць дык гуляць», «Ты да я да мы с тобой», «Каханая».
**Узнагароды:** лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі (1978).
**Дыскаграфія: трэкі** «Тапаліны звон» – ансамбль *«Сябры»* (у LP «Живая вода» – «Мелодия», 1982), «Спатканне з даўняю вясной» – ансамбль «Сябры» (сл. *Генадзя Бураўкіна*, у LP «Далёкий свет» – «Мелодия», 1986), «Пахне чабор» – ансамбль *«Верасы»* (у EP «Верасы» – «Мелодия», 1976), «Прощай», «Дамское танго» *– дуэт Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч* (у CD «От «Малиновки» и до...» – «Bulba Records», 2001) , «Зарянка» (сл. С. Давідовіча, у LP ансамбля «Верасы» «Наша дискотека» – «Мелодия», 1980), «Нявыказаная балада» (сл. А. Разанава, у зборніку «Как слово наше отзовётся. Песни молодых композиторов» – «Мелодия», 1983).
26.11.06//Д.П.

**ІВАШЫН МАКС (Ивашин Макс, Ivashyn Max)** – піяніст, аранжавальнік, журналіст.
Нарадзіўся 25.11.1969 у Мінску. Скончыў ССМШ пры БДК па класах фартэпіяна і тэорыі музыкі ў 1985, гістарычны факультэт Мінскага педінстытуту (1992), University of Missouri School of Journalism (2001). Цягам 1993–2004 выступаў як выканаўца на клавішных у складзе групы *«Нейро дюбель»*, у якасці сесійнага музыкі супрацоўнічаў з групамі *«Post-scriptum»*, *«J:морс»*, удзельнічаў у паказах супольных музычных праектаў «Сьвяты вечар 2000» і *«Крамбамбуля»*. Быў музычным аглядальнікам газеты «Знамя юности», выступаў у рэспубліканскай прэсе з артыкуламі на музычную тэматыку. Суаўтар «Беларускага хіт-параду» 1 праграмы Беларускага радыё, аўтар і вядучы праграмы «Пятачок» 2 каналу Беларускага радыё, заснавальнік рубрыкі «Наушник» у газеце «Вечерний Минск». Карэспандэнт часопісу «Billboard» у Беларусі (ад 1996), карэспандэнт радыёстанцыі «Voice of America» ў Беларусі (ад 2001).
У 2004 выехаў у ЗША, вярнуўся ў 2005, паўторна з’ехаў у ліпені 2007.
**Гастролі:** у складзе «Нейро дюбель» – тур па Беларусі (жнівень–




верасень 2001), канцэрты ў клубе «Sexton» (Масква, 2003), выступленне на байк-шоў у Санкт-Пецярбургу (жнівень 2003).

**Фестывалі:** «Рок-каранацыі» (ад 1995), «Балтийский берег» (Санкт-Пецярбург, 1998), «Большие маневры» (там жа, 2001).

**Узнагароды:** у складзе «Нейро дюбель» – «Рок-карона 1996» у намінацыі «За лепшую інтэрпрэтацыю эстраднага шлягеру» («Здравствуй, чужая милая»), «Рок-карона 1998», прызы ў намінацыях «Лепшы кліп» («Охотник и сайгак»), «Альбом году» («Охотник и сайгак», 1998), «Альбом году» («Ворсинки и катышки», 1999), Гран-пры і прыз глядацкіх сімпатый фестывалю «Балтийский берег» (1998), уладальнік «Залатога пяра» Саюзу журналістаў Швецыі (1995).

**Дыскаграфія:** гл. «Нейро дюбель»; сольныя **альбомы** «Песенки пожилого гоблина» («Ковчег», 1997), «Manual» (аўт. выд., 2004); удзел у запісе альбому «Montevideo» групы «J:морс».

**Кантакт:** maxivas@rin.ru

11.06.05//Д.П., фота Д.П.

**«ІМПЭТ»** – мінская група.

**Дыскаграфія: трэк** «In Your Room» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**«ИНСПЕКТОР»** – мінская група, якая ўтварылася ў 1988 на аснове групы, што працавала ў студыі ансамбля *«Песняры»*.

Група выступала ў стылі арт-року. У першы склад калектыву ўваходзілі *Віктар Смольскі* – гітара, Андрэй Зубрыч – вакал, клавішныя, гітара, Дзмітрый Зубрыч – клавішныя, вакал, да якіх далучыліся Алег Мартыненка – бас-гітара, Анатоль Горбач – барабаны (→ *«Крама»*), Віктар Шот – гітара. У хуткім часе група перабралася на працу ў Нямеччыну, дзе запісала і выдала першы ў гісторыі беларускай папулярнай музыкі кампакт-дыск. Рэпертуар калектыву складаўся з аўтарскіх ангельскамоўных песень. У 1993 (неўзабаве перад тым, як група спыніла існаванне) у яе склад уваходзілі В. Смольскі, А. Зубрыч, Дз. Зубрыч, А. Мартыненка, *Уладзімір Марусіч* – барабаны, *Аляксандр Несцяровіч* – клавішныя (← *«Сузор'е»*), Аляксандр Брынцаў – вакал (← «Сузор'е»), *Алег «Джагер» Мінакоў* – вакал (→ *«Rouble Zone»*).

**Гастролі:** Беларусь, Расея, Нямеччына.

**Фестывалі:** «Jarocin» (Польшча), шэраг рок-фестываляў у Нямеччыне.

**Дыскаграфія: альбом** «Russian Prayer» («Ariola-BMG», Нямеччына, 1993).

**Кантакт:** www.victorsmolski.de

17.04.06//Д.П.

**«IMPRUDENCE»** – мінская група, якая трымаецца стылю дэз-метал. Рэпертуар заснаваны на ангельска- і беларускамоўных аўтарскіх творах. У 2005 выступала наступным складам: Павел Карнюшын – вакал, бас-гітара, Рыгор Дзейчык – гітары, Юрый Шаўкоў – барабаны.
**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2005).
**Узнагароды:** прыз Беларускага аб'яднання студэнтаў Польшчы ў конкурсе на фестывалі «Басовішча 2005».
**Дыскаграфія: альбом** CD «Road To Nowhere» («БМAgroup», 2005); **трэкі** «Зямля на маёй крыві» («БМAgroup», 2005), «Цемра пакрыўджанай душы» («БМAgroup», 2005).
**Кантакт:** +375 (29) 774-74-71.
25.09.05//Д.П.

**«INDIGA»** – мінская група, якая, у шырокім сэнсе, трымаецца стылю альтэрнатыўнага року.
Утварылася ў жніўні 2002, выступаючы першапачаткова пад назвай «Indigo» ў складзе Маруся (Руся) Шукюрава – вакал, Аляксей Паўловіч – бас-гітара, (← *«Ulis»*, *«Новае неба»*, да жніўня 2003), Дзмітрый Дзямідаў – гітара, Андрэй Ганчарык – барабаны. У жніўні 2003 да групы далучаецца бас-гітарыст Дзмітрый Астроўскі (← *«Кали-Юга»*, *«Partizone»*, *«Impett»*). У 2005 адбываецца змена барабаншчыка: да калектыву далучаецца Уладзімір Бегер. Найбольш вядомыя песні «Тры сонцы», «Танцы на краі», «Заенька» (разам з *Ігарам Варашкевічам*), «Маё сэрца» (разам з Я. Цылікавым), «Бяжы за мной».
**Гастролі:** канцэрты ў клубах Мінску, Украіны (2005, 2006), выступленне на байк-шоў у Віцебску (2003).
**Фестывалі:** «Свежий ветер» (Мінск, 2003), «Рок против наркотиков» (Мінск, 2003), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2003–05), «ДніпРОК 2006» (Днепрапятроўск, Украіна).
**Узнагароды:** прыз радыё «Беласток» на фестывалі «Басовішча 2003» (запіс альбому).
**Дыскаграфія: альбом** CD «Dni» («БМAgroup», 2004), сінгл «Заенька» («БМAgroup», 2006); **трэкі** «Это не важно» (у зборніку «Неформатный-2» – «Aist Music», 2003), «Тры сонцы» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004), «Бяжы за мной» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006), «Заенька» (у зборніку «Басовішча XVII», 2007).
**Кантакт:** indiga@tut.by;
+375 (29) 620-24-75, (29) 620-65-94.
06.09.07//Д.П.

**«INDRA»** – група, якая ўтварылася напрыканцы лістапада 2003 дзеля выканання, з вызначэння ўдзельнікаў калектыву, прагрэсіўнага беларускага року.
У першым складзе калектыву выступалі Марына Шэф – гітара, Вольга Андрэева – гітара, вакал, Галіна Сандова – віяланчэль, Павел Кухто – барабаны, Андрэй Галынскі – бас-гітара. З групай супрацоўнічаюць Аляксей Кустаў – бас-гітара, гукарэжысёр, *Вячаслаў Корань* – прадзюсэр. Увесну 2007 група выступала такім складам: Марына Шэф – гітара, Вольга Андрэева – гітара, вакал, Галіна Сандова – віяланчэль, Павел Кухто – барабаны, Аляксей Панятаеў – бас-гітара. Рэпертуар калектыву базуецца пераважна на беларускамоўных аўтарскіх песнях,

група выступае з канцэртамі ў клубах Мінску, Полацку, удзельнічала ў шэрагу рэгіянальных фестываляў.
**Фестывалі:** «Антыснід» (Мінск, 2003, прыз у намінацыі «Адкрыццё году»), «Рок-кола» (Полацк, 2004, 2005).
**Узнагароды:** лаўрэат 3 прэміі на фестывалі «Рок-кола» (Полацк, 2005).
**Дыскаграфія:** «Ёсць Кантакт!» (дэма, «Indra», 2005), CD «Сонцавакол» («Indra», 2007).
**Кантакт:** Indra2003@tut.by; +375 (29) 711-60-56 (Марына), (29) 517-60-30 (Павал).
13.06.07//Д.П.

**«IQ48»** – мінская група. Выступае ў стылі «пазытыўны фанк-рэп-кор» (вызначэнне музыкаў).
Утварылася як дуэт увосень 2001 складам: Павел «Фрэйд» Зыгмантовіч – вакал і Яўген «Буза» Бузоўскі – гітара. Афіцыйнай датай нараджэння лічыцца красавік 2003, калі да дуэту далучыліся басіст *Канстанцін Калеснікаў* (← *«Леприконсы»*, адначасова *«Zygimont Vaza»* → 2003) і барабаншчык Антон «Сатана» Мацулевіч (← «Твар»). Восенню гэтага ж году ў групу прыйшоў саксафаніст Іван Зуеў (→ 2004 ← Дзяніс Дзеравянка, «Meduza»). У 2004 з групай выступалі вакаліст Аляксандр «Эш» Ракавец і гукарэжысёр Антон Стаўскі. У пачатку 2004 лідэр групы Фрэйд распачаў сольную кар'еру. На пачатку 2007 у групе выступалі А. Ракавец, К. Калеснікаў, Дз. Дзеравянка, Я. Бузоўскі, А. Мацулевіч. Рэпертуар групы заснаваны на аўтарскіх беларускамоўных песнях. Найбольш вядомыя «Таполі», «Выйсьце» (сумесна з *Аляксандрам Памідоравым*), «Сьвятло ў цемры», «Схаванае сэрца» (абедзве – сл. *Міхала Анемпадыстава*).
**Фестывалі:** беларуска-ўкраінскі фестываль «Хахлабуль» (Мінск, 2002), «Спидобойка» (Светлагорск, 2002), «Басовішча» (2003, 2004, 2006, 2007), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2005), «Рок-кола» (Полацк, 2006).
**Гастролі:** канцэрты ў Беларусі і Польшчы.
**Узнагароды:** прыз Беларускага аб'яднання студэнтаў Польшчы на фестывалі «Басовішча 2003».
**Дыскаграфія:** CD «Сорок восемь попугаев» (дэма, 2002), «Вар'яты» («West Records», 2005); **трэкі** «Кумба» (у зборніку «Віза N.R.M.» – «БМAgroup», 2003), «Таполі» (у зборніку «Наша музыка» – «Arlo Music», 2003), «Толян, поверь» (у зборніку «Fuck The Show-business», 2003), «Мой клён» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМAgroup», 2002), «Сьвятло ў цемры» (у зборніках «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006, «Прэм'ер Тузін 2006» – «West Records», 2006), «Схаванае сэрца» (у зборніку «Басовішча XVII», 2007).
**Кіно, відэа: кліп** «Таполі» (рэж. М. Вашкевіч, 2005).
**Кантакт:** kostya2002@tut.by; iq48.net; 375 (29) 647-31-33 (Канстанцін), (29) 778-01-47 (Яўген), (29) 689-40-48.
11.06.07//Д.П.

# К

**КАВАЛЕЎСКАЯ АКСАНА (Ковалевская Оксана, Kavaleuskaja Aksana)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару.

Нарадзілася 06.05.1983 у г.п. Смілавічы. Увосень 1999 уваходзіць у склад групы *«Лето»* і неўзабаве пачынае з ёй гастраляваць. У траўні 2001 прадзюсэры выводзяць яе са складу групы, калі «Лета» запісала ўжо дэбютны альбом. Літаральна праз тры тыдні пачынае супрацоўніцтва з прадзюсэрам А. Воранавым у рамках групы *«Краски»*. Спявае на расейскай мове, найбольш папулярныя песні – «Я люблю тебя, Сергей», «Сегодня к маме я приехала домой», «Старший брат», «Оранжевое солнце». У 2005 у выніку канфлікту з мясцовай уладай, выкліканага парушэннем аўтарскіх правоў, група на чале з прадзюсэрам А. Воранавым пакінула Беларусь і ад канца г.г. знаходзіцца ў ЗША.

**Гастролі:** Беларусь, Расея, Украіна, Казахстан, Эстонія, Ізраіль, Галандыя, Англія, Ірландыя, ЗША.

**Дыскаграфія: альбомы** складам групы «Лето» – «Краски ушедшего лета» («REAL Records», Расея, 2000); складам групы «Краски» – «Старший брат/Жёлтый альбом» («REAL Records», 2002), «Я люблю тебя, Сергей/Красный альбом» (2003), «Оранжевое солнце/Оранжевый альбом» (2003), «Весна/Синий альбом» («Iceberg Music», 2004), «Те, кто любит/Фиолетовый альбом» (2004); **трэкі** «Старший брат» (у зборніку «Точка отрыва» – «REAL Records», 2002), «Сегодня к маме я приехала домой» (у зборніку «Формула-3» – Расея, 2002), «Я люблю тебя, Сергей!» (у зборніку «Союз XXXII» – «СОЮЗ», 2003), «Ты пишешь мне письмо» (у зборніку «Большая стирка 4» – «REAL Records», 2003), «Мне сегодня грустно» (у зборніку «Русская тридцатка 9» – «Квадро-диск», 2003), «Старший брат-2» (у зборніку «5 звезд. Классный 3» – «Iceberg Music», 2004), «Метели» (у зборніку «5 звезд. Романтический 3» – «Iceberg Music», 2004), «Весна» (у зборніках «5 звезд. Танцевальный 3», «Красочный 5» – «Iceberg Music», 2004), «Оранжевое солнце» (у зборніку «Большая стирка 5 звезд» – «Iceberg Music», 2004).

**Кіно, відэа: кліпы** «Мамочка моя» (рэж. Мурго, 2003), «Сегодня к маме я приехала домой» (рэж. А. Ігудзін, 2002), «Оранжевое солнце» (рэж. Р. Нурыеў, 2003), «Старший брат» (рэж. А. Ігудзін, 2002), «Старший брат-2» (рэж. А. Ігудзін, 2004), «Те, кто любит» (рэж. Д. Захараў).

**Кантакт:** www.kraski.org

16.11.06//Д.П.

**КАВАЛЁЎ СЯРГЕЙ (Ковалев Сергей, Kovalev Sergei)** – спявак, кампазітар, аўтар тэкстаў, аранжавальнік.

Нарадзіўся 01.03.1962 у Лагойску.

У 1984 скончыў МДМІ. Музычную кар'еру распачаў у 1980 як лідэр-гітарыст, аранжавальнік і аўтар музыкі рок-групы «Пульс», якая базавалася ў МДМІ. У 1985–89 – мастацкі кіраўнік і ўдзельнік вакальнага квартэту *«Пари»*, што працаваў пры Магілёўскай абласной філармоніі. У 1989– 94 – сябра аўтарскай групы, музычны кіраўнік каманды КВЗ МДМІ. Ад 1996 – удзельнік дуэту *«КаСлука ДаКавалёв»*. У 2000 распачаў сольную кар'еру, у 2002 выступіў ініцыятарам стварэння праекту «Ковалев и Содружество музыкантов». Піша песні і спявае на расейскай мове. Сярод найбольш вядомых твораў «Минск – это я», «Трамвай» (абедзве – вык. «КаСлука ДаКавалёв»), «Минские окна», «Точка.by», цыкл песень «Времена года» (усе ў аўт. вык.). Піша песні, робіць аранжаванні для многіх салістаў папулярнай музыкі.

**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль



моладзевай музыкі «Наваполацк 1987», «Славянский базар» (Віцебск, 1998), «Песня года России» (Масква, 1998), «Песня года Беларуси» (2005).

**Узнагароды:** лаўрэат конкурсу Рэспубліканскага фестывалю моладзевай музыкі «Наваполацк 1987», лаўрэат Другога ўсесаюзнага фестывалю народнай творчасці (1986), лаўрэат тэлефестывалю «Песня года России» (1998, з песняй «Трамвай»).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Несогретое солнцем» (акустыка, С. Кавалёў, *Аркадзь Юшын*, *Ігар Будай*, 1989, аўт. выд.), у складзе «КаСлука ДаКавалёв» – «На потом» («Smeet Records», 1997), «Песни о Родине» («Art House Rec.», 1999); сола – «Песни о Родине-2» («Smeet Records»/«Art House Rec.», 2000), С. Ковалев & А.М.С.В. «Альтернатива» (студыя С. Кавалёва, 2004), «Точка.by» («Vigma», 2007); **трэкі** «Минские окна» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000).

**Кіно, відэа: кліпы** – у складзе «КаСлука ДаКавалёв»: «Осень» (рэж. *Кірыла Слука*, 1997), «Трамвай» (рэж. К. Слука і С. Кавалёў, 1997), «На потом» (рэж.М. Носаў, 1997), «Трамвай» (рэж. М. Носаў, 1998), «Минск – это я» (рэж. Н. Язоўскіх, 1998); сола – «Солнце» (рэж. М. Носаў, 1997), «Лето» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2000), «Командировочный роман» (рэж. А. Вечар), «Очень лень» (рэж. *Уладзімір Максімкаў*, мантаж А. Вечара, 2002), «За тобой» (рэж. М. Носаў, 2005), «200 шагов» (рэж. А. Вечар, 2006).

**Іншая інфармацыя:** заняткі музыкай сумяшчае з асноўнай прафесіяй – доктара-ультрадыягностыка.

**Кантакт:** Dr.kovalev@rambler.ru

01.03.07//А.Р.

**КАЗЛОВІЧ АЛЕГ** – гл. Аверын Алег.

**КАЗЛОЎСКІ АЛЯКСЕЙ (Козловский Алексей, Kazlouski Aliaksei)** – бас-гітарыст, вакаліст, аўтар музыкі і ангельскамоўных тэкстаў. Нарадзіўся 23.01.1955 у Ленінградзе. У 1977 скончыў геаграфічны факультэт БДУ. Ігрой на бас-гітары авалодаў самастойна. Як музыка пачаў выступаць на сцэне ў 1978 з групай *«Университет»*. Ад 1982 – у складзе групы *«Сузор'е»*, у 1991–93 выступаў у складзе групы *«Zindan»*, у 1996–97 – бас-гітарыст і вакаліст групы *«Bros. In Blues»*. Ад 1997 да 1999 – удзельнік групы *«Mojo Blues»*. У снежні 1999 выехаў на пастаяннае жыхарства ў ЗША, дзе час ад часу выступае ў складзе зборных калектываў у блюзавых клубах. Супрацоўнічаў з групай *«Палац»*, пісаў тэксты песень для груп *«Rouble Zone»*, «Zindan» і інш., сярод найбольш вядомых песень «I Gotta Move», «Love Across The Ocean», «Same Kind Of Woman».




**Гастролі:** у складзе «Сузор'я» – СССР, Польшча; у складзе «Zindan» – Непал (1992).
**Фестывалі:** у складзе «Университета» – студэнцкія фестывалі ў Ніжнім Ноўгарадзе (1977), Ераване (1978), Пскове (1980); у складзе «Bros. In Blues» – «Блюз против войны» (Кіеў, 1997); у складзе «Сузор'я» – Другі ўсесаюзны фестываль польскай песні «Віцебск 1990»; у складзе «Палацу» – «Славянский базар» (1998).
**Дыскаграфія:** у складзе «Сузор'я» – LP «Сентябрьская река» («Мелодия», 1987), CD «Кафе», «Рок-терапия», «Нелли + «Сузор'е» (аўт. выд., 2002), **трэкі** «Let Him Go» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Песня о Родине» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987); у складзе «Mojo Blues» – «Love Across The Ocean» («Ковчег», 1998), «I Gotta Move» («Ковчег», 1999); у складзе «Zindan» – MC «Zindan» («Ковчег», 1996); **трэкі** «Came Out The Wilderness», «Freeze To Me Mama» («Палац», альбом «Дарожка» – «БелСаціс», 1996, перавыд. «БМAgroup», 2006).
**Кантакт:** +1 (914) 864-14-43 (х.); (914) 621-16-72 (маб.); kozlovski@optonline.net.

23.12.06//Д.П., фота Д.П.

**КАЗЛОЎСКІ АНДРЭЙ (Козловский Андрей, Kazlouski Andrei)** – гітарыст, аранжавальнік, аўтар музыкі, гукарэжысёр, прадзюсэр. Нарадзіўся 16.12.1953 у Ленінградзе. У 1976 скончыў МРТІ па спецыяль-



насці інжынер-канструктар радыёэлектроннай апаратуры. Грацъ на гітары пачаў у 1970, выступаў у калектывах мастацкай самадзейнасці ДК МАЗ, МРТІ, ад 1974 граў у складзе розных калектываў на танцавальных пляцоўках у Мінску. У 1977 стаў адным з заснавальнікаў групы *«Сузор'е»*, у складзе якой выступаў да 1991. У 1996–97 – гітарыст і вакаліст групы *«Bros. In Blues»*. Актыўна працуе як студыйны музыка, запісваўся з многімі выканаўцамі папі рок-музыкі, ад 2004 – гукарэжысёр «Русского радио» ў Мінску. У 2006 выступіў ініцыятарам стварэньня групы «V.S.O.P.». Сярод найбольш вядомых твораў – музыка «Песні пра зубра» (ч.2), песні «Зрелый возраст», аўтар шэрагу аранжаваньняў для групы «Сузор'е».

**Гастролі:** СССР, Польшча.

**Фестывалі:** міжнародны фестываль палітычнай песні «Рыга 1978», Усесаюзны конкурс эстраднай песні «Ялта 1981» (дыплом); Другі ўсесаюзны фестываль польскай песні (Віцебск, 1990).

**Узнагароды:** лаўрэат 1 прэміі міжнароднага фестывалю палітычнай песні «Рыга 1978», «Рок-карона 2001: За ўнёсак у развіццё беларускай рок-музыкі».

**Дыскаграфія:** міньён «Старый мост» («Мелодия», 1983), магнітаальбом «Рок-терапия» (1984, самвыдат), LP «Сентябрьская река» («Мелодия», 1987), CD «Кафе», «Рок-терапия», «Нелли + «Сузор'е» (аўт. выд., 2002). «Песня пра зубра» (2007); **трэкі** «Let Him Go» (у LP зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Песня о Родине» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987.

**Кіно, відэа: кліп** «Я вернусь» (БТ, 1981), музыка да мультфільму «Про кота Васю и катавасию» (муз. *Эдуарда Ханка*, «Беларусьфільм», 1982).

**Іншая інфармацыя:** захапляецца рыбалкай.

**Кантакт:** andrew_koz55@yahoo.com; +375 (29) 557-04-44.

14.09.07//Д.П.

**«КАЛЕЙДОСКОП»** – мінскі эстрадны аркестр, утвораны ў 1981 на базе Палацу культуры Белсаўпрафу. Кіраўнік – В. Сярдзюк. У рэпертуары калектыву былі інструментальныя творы і песні савецкіх кампазітараў, апрацоўкі народных песень, кампазіцыі традыцыйнага джазу, свінгавыя і джаз-рокавыя творы.

**Гастролі:** Літва.

**Фестывалі:** «Юность Полесья» (1984, 1987), «Витебская осень 1987», І Рэспубліканскі фестываль выканаўцаў джазавай музыкі (Віцебск, 1989).

**Узнагароды:** І месца на фестывалі «Юность Полесья 1984», Гран-пры фестывалю «Юность Полесья 1989».

05.03.06//Д.П.

**КАЛЕСНІКАЎ КАНСТАНЦІН (Колесников Константин, Kalesnikau Kanstantsin)** – бас-гітарыст.
Нарадзіўся 15.09.1971 у Мінску.
У 1992 скончыў ІФК па спецыяльнасці выкладчык фізічнай культуры, трэнер па фехтаванні. Ігрой на бас-гітары авалодаў самастойна. Творчы шлях распачаў у 1993 у складзе групы «Jar Jabber», у 1996–98 – удзельнік групы *«Hasta la fillsta»*, ад 1999 да 2001 выступаў у складзе групы *«Леприконсы»*, ад 2001 – у складзе групы *«IQ48»*, адначасова ад 2003 – бас-гітарыст групы *«Zygimont Vaza»* і ад 2004 – групы *«Пару рублей»*.
**Фестывалі:** «Басовішча 1996, 1997, 2003–05, 2007» (у складзе розных калектываў), у складзе «Леприконсов» – «Нашествие» (Масква, 2000), у складзе «IQ48» – «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2003, 2004, 2006, 2007), «Рок за бобров» (Бабруйск,



2005), «Рок-кола» (Наваполацк, 2005, 2006).
**Дыскаграфія:** у складзе «Jar Jabber» – MC «I Live In A City» (1995); у складзе «Hasta la fillsta» – MC «Hasta la fillsta» («Скат рекордс», 1997); у складзе «Леприконсов» – гл. 1999–2001; у складзе «Zygimont Vaza» – «Kajin» (аўт. выд., 2004), «Distortion» (аўт. выд., 2006); у складзе «IQ48» – «Вар'яты» («West Records», 2005); у складзе «Пару рублей» – «Трезвый расчёт» («НМК», 2006).
**Кантакт:** kosty2002@tut.by; +375 (29) 647-31-33.
24.09.07//Д.П., фота Д.П.

**КАЛІНОЎСКІ АЛЯКСАНДР (Калиновский Александр, Kalinouski Aliaksandr)** – бас-гітарыст, кампазітар, аранжавальнік.
Нарадзіўся 09.01.1962 у Мінску.
У 1986 скончыў БДК па класе скрыпкі. Ад 1987 з перапынкамі – музыка *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, у 1988–89 выступаў у складзе ансамбля *«Тоніка»*. У 1997 у рамках аркестру ўтварыў джаз-групу *«DTS-band»*, ад 2001 супрацоўнічае з групай *«Сестра» Аляксея Шадзько*, ад 2004 – з групай *«БорЖоМи»*, ад 2003 – з групай «ДНК» Р. Газманава, ад 2005 – з групай «Вступление» А. Баля. Спарадычна выступае як удзельнік трыо «Bass Connection». У якасці сесійнага музыкі запісваецца з многімі салістамі-вакалістамі.
**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск, неаднаразова), «Золотой шлягер» (Магілёў), фестываль біг-бэндаў (Масква), «Ступень к Парнасу» (Масква, 1994), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (неаднаразова), Джаз-карнавал

(Адэса), джаз-фестывалі ў Сочы, Ялце, Херфардзе (Нямеччына).
**Дыскаграфія:** у складзе групы «DTS-band» – МС «DTS Jazz»(аўт. выд., 2000, перавыд. CD 2004), «Funkomania» (аўт. выд., 2006); у складзе групы «Сестра» – гл. 2001–04; у складзе «БорЖоМи» – «Свет и тени» (аўт. выд., 2004), «Сезон дождей» (аўт. выд., 2005); разам з групай *«Ляпис Трубецкой»* – «Золотые яйца» («West Records», Беларусь, 2004, «Lavina Music» і «Союз», Украіна), «Мужчины не плачут. Песни для кино» («Глория Медиа», 2006) разам з дуэтам *«Аляксандра і Канстанцін»* – «Аўтаномная навігацыя» («West Records», 2006).
**Кантакт:** http://jazz.euroartwork.com; www.kalinovsky.medialogs.de; a_kalinovsky@mail.ru; +375 (29) 639-79-09.
05.11.06//Д.П.

**«КАЛИ ЮГА»** – група з Мінску. Паўстала ў 1992. Тады ж былі створаны першыя песні, аднак дэбютаваў калектыў увосень 1994 наступным складам: *Юрый Гарачка* – акустычная гітара, вакал, Аляксандр Зуеў – барабаны, Віктар Ступчык – бас-гітара, *Андрэй Дзяменцьеў* – гітара, Канстанцін Марозаў – акардэон. Працуе ў стылі класічнага року з элементамі музыкі псіхадэлік, выконвае песні аўтарства Ю. Гарачкі на расейскай мове. У розныя гады ў складзе групы выступалі Наталля Шпакоўская – скрыпка (ад 1994), Аляксей Яфрэменка – барабаны (ад 1996), Яўген Цылікаў – бас-гітара (ад 1996, аднначасова *«Partyzone»*), Андрэй Вераб'ёў – клавішныя (ад 1996), Дзмітрый Астроўскі – бас-гітара (ад 1998 → *«Impatt»*, *«Indiga»*), Аляксандр Цэйтлін – скрыпка (ад 1998 аднначасова *«Дыліжанс»*), Алег Рыбалка – перкусія (ад 2001), Яўген Хітрак – флейта (ад 2001 аднначасова *«Князь Мышкин»*), Аляксандр Красноўскі – бас-гітара (ад 2002). На пачатку 2005 група складалася з А. Яфрэменкі, А. Красноўскага, А. Дзяменцьева (аднначасова *«P.L.A.N.»*), А. Вераб'ёва, А. Рыбалкі, Ю. Гарачкі, аднак творчай актыўнасці не выказвала. Найбольш вядомыя песні «Дороги», «Золото», «Белая рубаха».
**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (1997), «Калининград In Rock» (Расея, 2000).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Дороги» (1997), CD «Дороги» («TON-Records», 2002), «Руны» («ПанРекордз», 1999), «Ноль по Кельвину» («Bulba Records», 2001); **трэкі** «В прицеле твоего ружья» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).
**Кіно, відэа:** музыка да дакументальнага фільму «Легенды Беларусі» (Белтэлерадыёкампанія, 2000, не выдадзены); **кліпы** «Золото» (1999), «Дом» (рэж. К. Марозаў, 2000), «Белая рубаха» (2001).
**Кантакт:** +375 (29) 639-48-69; yuzik_18@mail.ru (Ю. Гарачка).
27.02.05//Д.П.

**КАЛМЫКОЎ ЯЎГЕН (Колмыков Евгений, Kalmikov Yauheni)** – рэжысёр, прадзюсэр.
Нарадзіўся 24.12.1967 у Мінску. У 1993 скончыў МІК па спецыяльнасці рэжысёр масавых свят. У 1992–94 працаваў рэжысёрам тэатру «Эскулап», наступныя два гады



займаў пасаду рэжысёра-пастаноўшчыка ТА «Эстрада». Ад 1995 – прадзюсэр групы *«Ляпис Трубецкой»*. Ад 1997 працаваў рэдактарам музычнага часопісу «Уши». Рэжысёр-пастаноўшчык многіх канцэртаў і музычных фестываляў. Ад 2001 – прадзюсэр і адзін з заснавальнікаў ТА «Дети Солнца», прадзюсэр музычных калектываў *«Мантана», «Merry Poppins»*, *«ТТ-34», «Крамбамбуля»* (супрадзюсэр у 2004–05), а таксама такіх праектаў, як дуэт *«Саша и Сирожа»*, Інтэрнэт-тэлебачання «Sasi.tv». Музычны прадзюсэр такіх кінафільмаў і тэлесерыялаў, як «Последний забой», «Королева бензоколонки-2», «Реальный папа», «Тиски», «Стикс», «Шутка», супрадзюсэр фільму «Охота на пиранью», серыялу «Мужчины не плачут, 1 і 2», «Трое с верху».

**Кантакт:** Kolmikov@mail.ru

24.11.06//Д.П., фота Д.П.

**«КАЛЬЯН»** – група з Гродна. Карані групы – у восені 1996, калі быў утвораны напачатку акустычны дуэт Дзмітрый «Вундэр» Антаневіч – перкусія і Аляксандр Дзянісаў – вакал, гармоніка, да якіх неўзабаве далучыліся Ілля Прошкін – гітара і Аляксандр «Бітнік» – акустычны бас. Гэты склад праіснаваў нядоўга. У лютым 1997 Антаневіч і Дзянісаў запісалі ў хатніх умовах акустычны альбом «Перекопало середину». Вясной 1997 да групы далучыліся Андрэй Сакалоў – гітара, акардэон і Юлія Юркавец – бас-гітара. Пасля запісу дэбютнага альбому музыкі групы вызначылі яе стыль як анарха-фолк-панк-рок. Цягам гадоў праз калектыў прайшло шмат музыкаў. У 2004 у складзе калектыву выступалі А. Дзянісаў, Ілля «Ільябл» Пячынін – гітара, вакал, акардэон, Канстанцін «Кот» Хробак – бас-гітара, бэк-вакал, Лізавета Мерляк – скрыпка, Аляксандр «Сыр» Сыраежка – барабаны. Апошнім часам група адышлася ад фолк-панку, шмат эксперыментуе з гучаннем. Найбольш вядомая песня «Радыёактыўны снег».

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1997, 1998).

**Узнагароды:** лаўрэаты конкурсу на фестывалі «Басовішча 1998».

**Дыскаграфія: альбомы** МС «У краіне цудаў» (аўт. выд., 1997), «Парагвай» (акустычны, 1998), «Б.Н.» (аўт. выд., 1999), «Ноўбадзі» (аўт. выд., 2002), «Hate!» (аўт. выд., 2004), «Голая правда» (аўт. выд., 2005); **трэк** «Радыёактыўны снег» (у зборніку «Прэм'ер Тузін 2006» – «West Records», 2006).

**Кантакт:** www.kalian.grodno.by

16.03.07//Д.П.

**КАМОЦКАЯ КАСЯ (Камоцкая Кася, Kamockaja Kasia)** – спявачка, якая ў творчасці трымаецца стылю бард-року.

Нарадзілася 22.06.1963 у Мінску.
У 1985 скончыла гістарычны факультэт БДУ, там жа – аспірантуру (1989). Музыкай захапілася ў канцы 80-х, калі пачала выступаць у дуэце з тагачасным мужам *Алесем Камоцкім*, выконваючы песні ў рэчышчы бардаўскай творчасці. У 1991 пачала супрацоўніцтва з групай *«Новае Неба»*, абраўшы за аснову стылю мэйнстрым рок-музыкі з філасофска-сацыяльным падтэкстам. Ад пачатку XXI ст. праект існуе ў акустычным варыянце. Аўтар і вядоўца музычнай праграмы «ПраРок» спачатку на мінскім тэлеканале «8 канал» (1994–95), пазней на інфармацыйна-музычнай радыёстанцыі «101,2» (1995–96). Удзельніца супольнага музычнага праекту «Народны альбом» (1997). У рэпертуары – песні на вершы сучасных беларускіх паэтаў, сярод найбольш вядомых «Шостае падарожжа» (сл. І. Бабкова), «Сон у трамваі» (сл. *Адама Глёбуса*), «Белая лебедзь» (сл. А. Сыса), «Мая краіна» (сл. *Міхала Анемпадыстава*).
**Фестывалі:** многія імпрэзы ў Беларусі, Польшчы («Басовішча»), Украіне, Францыі, Даніі, Літве, Вялікабрытаніі, у тым ліку «Roskild» (Данія, 1993).
**Узнагароды:** «Рок-карона» ў намінацыі «Рок-князёўна» на цырымоніях 1994, 1995.
**Дыскаграфія:** гл. «Новае Неба»; **трэкі** «Котка» (у зборніку «Вольныя танцы: новая альтэрнатыва» – «БМAgroup», 2000), «Белая лебедзь», «Сон у трамваі» (у зборніку



«Вольныя танцы: слухай сваё» – «БМAgroup», 1999), «У небе зьнічаваньняў» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004), «Мая краіна» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Дом» (рэж. *Анатоль Вечар*), «Спыніліся на дарозе» (рэж. А. Вечар), «Неба мяняе колер» (рэж. А. Вечар), «Цэпэліны» (рэж. У. Маркевіч, 1999), «Мая краіна».
**Кантакт:** kkasia@tut.by, Kassia@tut.by
06.08.07//С.К.–Д.П., фота Д.П.

**КАМОЦКІ АЛЕСЬ (Камоцкий Алесь, Kamocki Ales)** – паэт, гітарыст, аўтар музыкі.

Нарадзіўся 09.06.1958 у Барысаве.
У 1986 скончыў аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэту БДУ.
У сярэдзіне 80-х выступаў як саксафаніст у складзе груп «Близнецы», пазней – *«Зартипо»*, у другой палове 80-х пачаў выступаць як выканаўца ўласных беларускамоўных песень і песень на вершы вядомых паэтаў.
У канцы 90-х стаў запісваць уласныя творы ў хатніх умовах, абсталяваўшы для гэтага кампакт-студыю. Супрацоўнічае з гітарыстам *Уладзімірам Ткачэнкам*, піша песні для

іншых выканаўцаў («Абарваная струна» для Стэфана, у суаўтарстве з *Леанідам Шырыным*). Актыўна выступае з канцэртамі. Аўтар некалькіх зборнікаў паэзіі. У 2006 упершыню ажыццявіў запіс уласных песень разам з інструментальнай групай. Сярод найбольш вядомых твораў: праграмы «Паравіны году», «Дах»; песня «Абарваная струна».

**Дыскаграфія: альбомы** MC і CD «Першы сшытак» (1986), «Як усё ў жыцьці» (1998), «Зорка спагады» (на вершы *Рыгора Барадуліна*, «Grand Records», 2000), «Псальмы і балады» (на вершы Р. Барадуліна, 2000), «Асяніна» (2001), «Віно дажджоў» (2002), «Дым» (2002), «Дом» (2003), «Дах» («Aist Music», 2006), «Паравіны году» (вык. *Зміцер Вайцюшкевіч* і *«WZ-Orkiestra»*, аўт. выд., 2003), «Месяц і сонца» (вык. З. Вайцюшкевіч і «WZ-Orkiestra», «West Records», 2005); **трэкі** «Кастрычнік», «Княгіня хараства», «Спадарыня», «Я выдумаў цябе», «Восень», «Я гадоў пержытых помню», «Людзі на балоце» (у MC зборніку «Нябачны мур» – «Культурны кантакт», 1999).

**Кантакт:** http://by-kraj.com; ales@by-kraj.com

11.03.07//Д.П.

**«КАМЭЛОТ»** – мінская творчая музычная суполка аўтараў, якая ў сваіх творах стылізавала гарадскую музыку мінулага з акцэнтам на жанр гістарычнай балады і акустычнае гучанне.

Утварылася восенню 1991 і пачаткова выступала наступным складам: *Зміцер Сідаровіч* – гітара, вакал, Алесь Кішкін – гітара, флейта, вакал, Валянцін Агееў – барабаны, Уладзімір Бярбераў – дуда (→ 1992 «Ліцьвіны»). У 1992 да суполкі далучыўся Ігар Войніч – бас-гітара, вакал. У 1994–95 у складзе калектыву выступаў Ігар Вяжэвіч – скрыпка, у 1994 Кастусь Герашчанка – гітара, флейта, вакал. Музыка групы выкарыстоўвалася ў спектаклі «Заложніца кахання» (тэатр «Вольная сцэна», рэж. В. Мазынскі, 1996). Калектыў спыніў існаванне ў кастрычніку 1996.

**Фестывалі:** «Губерталіі» (Гродна, 1992), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1992, 1994), фестываль, прысвечаны гадавіне бітвы пад Оршай (1994).

**Дыскаграфія: альбом** CD «У краіне талераў» («TON-Records», 1995), **трэк** «Грай, дудар» (у зборніку «Вольныя танцы – слухай сваё» – «БМAgroup», 1999).

**Кіно, відэа: кліп** «Неківай галавой» (рэж. *Анатоль Вечар*, 1995), песня «Краіна талераў» гучыць у дакументальным фільме «Беларусь, лета 1991» (рэж. У. Колас, 1991), песня «А дзе ж тыя ваяры?» у дакументальным фільме «Турнір» (рэж. І. Волах, 1994); музыка да мастацкага фільму «Шукальнікі скарбаў» (рэж. І. Волах, 1993).

18.05.04//Д.П.

**КАНАВАЛАЎ ЯЎГЕН (Коновалов Евгений, Kanavalau Jauheniy)** – гітарыст, аранжавальнік.

Нарадзіўся 22.09.1947 у Гродне. Скончыў МРТІ ў 1971. Падчас навучання ў інстытуце, самастойна авалодаўшы гітарай, увайшоў у склад ансамбля *«Алгоритмы»*. У 1972 выступаў у складзе ансамбля «Гусляры», наступныя два гады граў

у складзе калектыву, які працаваў у т.зв. «Біржы» у часе танцаў.
У 1977–78 удзельнічаў у розных калектывах, пасля чаго адхіліўся ад актыўнай канцэртнай дзейнасці. У канцы 90-х пачаў выступаць падчас джэм-сесій у мінскім «Стар-клубе», удзельнічаў у паказе некалькіх праграм групы *«Князь Мышкин»*. Пазней заняўся запісам сольных праграм.
**Гастролі:** у складзе «Алгоритмов» – выступленні ў гарадах Расеі, у т.л. Цюменскай вобл. (1966, 1967), краінах Прыбалтыкі (1967–70), Грузіі (1968).
**Фестывалі:** у складзе «Алгоритмов» – 1 фестываль моладзевай музыкі ў МРТІ (1968).
**Узнагароды:** у складзе «Алгоритмов» – 1 месца ў конкурсе ансамбляў на фестывалі моладзевай музыкі ў МРТІ (1968).
**Дыскаграфія:** аматарскія запісы «Алгоритмов», сольныя дэма-альбомы «Параллельный мир №1, 2, 3» (1999–2000), «Коридор зеркал» (2001), «Кривой блюз» (2002), «Новогодний сон» (2002), «Настроение» (2003), «Сумерки» (2005).
**Кіно, відэа:** дакументальны фільм «Маршрут №13» (рэж. І. Гаско, «Беларусьфільм», 1968).
27.04.04//Д.П.

**КАНДРУСЕВІЧ УЛАДЗІМІР (Кондрусевич Владимир, Kandrusevich Uladzimir)** – гітарыст, піяніст, кампазітар.
Нарадзіўся 29.09.1949 у Гродне. Скончыў БДК па класах фартэпіяна Л. Юшкевіча (1973) і кампазіцыі *Яўгена Глебава* (1979) і пад яго ж кіраўніцтвам асістэнтуру-стажыроўку (1981). Як музыка дэбютаваў у 1965



у складзе гродзенскай групы «Гродняне», ад 1968 быў удзельнікам мінскай групы «Ключи», з 1969 да 1971 – лідэр мінскай групы *«Панебраце»*. Сябра Саюзу кампазітараў Беларусі з 1979. Ад 2005 – мастацкі кіраўнік прадзюсэрскага цэнтру «Спамаш». Працуе ў жанрах сімфанічнай, камернай музыкі, аўтар балетаў і мюзіклаў «Крылы памяці» (паст. ДАВТ БССР, 1986), «Мефистофель» (паст. тэатру оперы і балету Ніжняга Ноўгараду, 1991), «Джулия» (1990), «Шклянка вады» (1994),– абедзве пастаўлены ў Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі, інструментальных эстрадных твораў, музыкі для тэатру (спектаклі «Бура» паводле Шэкспіра, «Сымон-музыка» паводле Якуба Коласа, «Цар Ірад» – усе ў Дзяржаўным тэатры лялек). Аўтар музыкі да больш чым 50 кінафільмаў, у тым ліку «Плач перапёлкі» (1990), «Эпилог» (рэж. І. Дабралюбаў, 1994).
**Фестывалі:** Францыя, Польшча, Нямеччына, Югаславія, Літва, краіны СНД.
**Узнагароды:** лаўрэат міжнароднага тэатральнага фестывалю ў Торуні (Польшча) і інш.
**Кантакт:** V.Kondrusevich@tut.by
27.01.07//Д.П.

**КАПЛАНАЎ ІЗМАІЛ (Капланов Измаил, Kaplanau Izmail)** – спявак, кампазітар, аўтар песень папулярнага рэпертуару.

Нарадзіўся 12.06.1938 у Гомелі. Сапраўднае імя Ісак Каплан. У 1957 скончыў Віленскую музычную вучэльню па класе акардэона. У гэтым жа годзе распачаў прафесійную кар'еру музыкі. У 1967 стаў заснавальнікам і музычным кіраўніком ансамбля БДФ «Орбита-67». Ад 1961 актыўна займаецца напісаннем музыкі і аранжаваннямі інструментальнай музыкі. У апошнія гады выступае як спявак у дуэце з сужэнкай *Нэлі Багуслаўскай,* выконваючы песні на розных мовах. Сярод найбольш вядомых «Одинокий», «Минский вечер», «Я возьму тебя с собой», «Песни возвращаются» (гімн фестывалю «Золотой шлягер»), «Ах, эта ночь», «Земляки», «А я не плачу» (усе на словы *Алега Жукава*), «Давай, гитара», «Оглянись, моя любовь», «Годы-годы» (усе на словы В. Тулінава), «О любви и печали», «Признание», «І змаўчала гітара. Памяці У. Мулявіна», «Застольная», «Ой, не клён рыпіць» (усе на словы Н. Салодкай), «А вода течёт-течёт», «Река и берега», «Потому что» (усе на словы М. Геца) і інш. Ягоныя песні выконваюць *Аляксандр Саладуха, Анжаліка Агурбаш, Іна Афанасьева, Якаў Навуменка, Іскуі Абалян,* Нэлі Багуслаўская, М. Баскаў і інш. Аўтар музыкі да трох радыёспектакляў, тэлефільмаў, у тым ліку фільму «Хлопец з вёскі Белае» (рэж. *Уладзімір Арлоў*).

**Фестывалі:** «Славянский базар» (неаднаразова), «Золотой шлягер» (неаднаразова).

**Узнагароды:** лаўрэат тэлефестывалю «Песня года 2004» (Расея).

**Дыскаграфія:** «Еврейский альбом» (2006).

**Кантакт:** +375 (29) 672-73-43.

12.11.06//В.Б.

**КАРАПЕЦЯН КАРЭН (Карапетян Карен, Karapetyan Karen)** – скрыпач, педагог, аранжавальнік.

Нарадзіўся 20.04.1977 у Магдэбургу, Нямеччына. Скончыў БДІК па спецыяльнасці артыст эстрады, выкладчык па класе скрыпкі (2002), Маскоўскі новы юрыдычны інстытут па спецыяльнасці юрыст-спецыяліст (2006). Выступаў як спецыяльна запрошаны музыка ў шэрагу калектываў, у тым ліку камернай музыкі. Супрацоўнічае з ансамблямі «Calypso», *«Дилижанс»*, *«Kriwi»*, *«Харлі»*, *«Саванна»* і інш.

**Фестывалі:** у складзе «Calypso» – джаз-фестываль «Мінск 1997», фестываль джазавых аркестраў (Мінск, 1998). «Студенческая весна» (Віцебск, 1998), у складзе «Дилижанса» – «Славянский базар» (Віцебск,



2000), «Rado-Jazz» (Мінск, 2002), у складзе «Kriwi» – XXVI фестываль «Dzwięki pólnocy» (Польшча, 2002), «Fete Des Cultures» (Люксембург, 2002), «Radio MultiCulti Party» (Берлін, 2002), «Pogranicze» (Франкфурт-над-Одэрам, Нямеччына, 2002), «Festival Fur Folk, Lied und Weltmusik» (Перлеберг, Нямеччына, 2003); у складзе «Харлі» – «Славянский базар» (Віцебск, 2003, 2004), «Наша музыка» (2003), «Золотой шлягер» (Магілёў, 2003), «Еўрабачанне» (Кіеў, 2005), «Siabrouskaja Biaseda» (Гродэк, Польшча, 2005), «Блюз без границ» (ЦДМ, Москва, 2002, разам з групай «Фонограф» і Юляй Смалянін), сольныя канцэрты папулярнай джазавай музыкі ў Зялёнай Гуры (Польшча, 2001), Швейцарыі (Базель, Цурых, Берн, 2001).

**Узнагароды:** Гран-пры фестывалю «Студенческая весна 1998», у складзе «Харлі» – 1 прэмія конкурсу ВІА на фестывалі «Золотой шлягер 2003».

**Дыскаграфія:** удзел у запісе альбомаў і трэкаў груп *«J:морс»* – «Ассорти» («Bulba-Records», 2000), Леаніда Гурвіча – «All That…» (аўт. выд., 2001), *«ZET»* – «Марны» ў трыб'юце «Personal Depeche»(«MSH Records», 2003), *«Саванна»* – «Волна» (аўт. выд., 2003), *«ЛОМ»* – «Прости-прощай» («West Records», 2004), дуэту *«Аляксандра і Канстанцін»* – «Сойка» (аўт. выд., 2003), «Харлі» – «Родныя мясціны» («Vigma», 2004), «Любовь – имя твоё» («Новая музыкальная культура», травень 2007), В. Каліны – «Озорной гуляка», «На личном фронте все без перемен».

**Кіно, відэа: кліпы** – дуэт «Аляксандра і Канстанцін»: «Пчолка» (рэж. В. Свіягін, В. Сафонаў, 2003); «Харлі»: «Танцы на палянцы» (рэж. К. Наважылава, 2004); «Саванна»: «Не исчезай» (2003).

**Іншая інфармацыя:** студыйныя сесіі і супрацоўніцтва з *Гюнэш Абасавай*, Шыр, *Ізмаілам Каплановым*, В. Калінам, *Вольгай Барабаншчыкавай*, «Kriwi», «Дилижансом», «Меркавай», Н. Пальчэўскай, *Янай*, У. Ухцінскім, *«Леприконсами»*, *«Крамбамбуляй»*, *Аркадзем Эскіным*, *Валерыем Шчэрыцам* і інш.

**Кантакт:** karenviolin@yahoo.com; +375 (29) 755-91-36.

05.11.06//Д.П.

**КАРЫЗНА ЎЛАДЗІМІР (Коризно Владимир, Karyzna Uladzimir)** – паэт.

Нарадзіўся 25.05.1938 у в. Закружжа Мінскага р-ну. Выступаць з вершамі ў друку пачаў у 1956. У 1961 скончыў філалагічны факультэт БДУ. Цягам некалькіх гадоў выкладаў мову і літаратуру ў вясковай школе.

У 1967–80 працаваў рэдактарам, старшым рэдактарам, загадчыкам аддзелу беларускай музыкі Рэспубліканскага радыё, ад 1981 – старшы рэдактар выдавецтва «Юнацтва». Аўтар тэкстаў шматлікіх песень, у тым ліку на музыку *Уладзіміра Будніка, Яўгена Глебава, Леаніда Захлеўнага, Эдуарда Зарыцкага, Ігара Лучанка, Юрыя Семянякі, Эдуарда Ханка* і інш.

**Дыскаграфія:** МС альбом «Люблю цябе, Белая Русь. Песні на вершы Уладзіміра Карызны» («Ковчег»); **трэкі** «Салавей спявае» (муз. Э. Ханка, ансамбль *«Сябры»* ў LP «Шумите, берёзы» – «Мелодия», 1984), «Вясенняя песня Радзіме», «Зялёны паром» – *«Сябры»*

(абедзве на муз. Л. Захлеўнага), «Незабудкі» (муз. Э. Зарыцкага), «Зязюльчына раніца» (муз. *Мікалая Сацуры*, усе – ансамбль «Сябры» ў LP «Далёкий свет» – «Мелодия», 1986), «Пацалунак» (муз. І. Лучанка, у LP «Чараўніцы» – «Мелодия», 1978), «Салавей спявае» («Сябры», у LP «Шумите, берёзы» – «Мелодия», 1985).
**Кнігі:** песенныя зборнікі «Клубныя вечары» (Мінск, 1979). «Люблю цябе, Белая Русь» (Мінск, 1984).
Паводле даведніка «Беларускія пісьменнікі», Д.П.

**КАРЫЯНА (Корриана, Corriana)** – спявачка, выканаўца пап-рокавага рэпертуару, аўтар тэкстаў.
Сапраўднае імя – Кацярына Качына. Нарадзілася 28.08.1984 у Мінску. Займацца музыкай пачала ва ўзросце 6 гадоў, падчас навучання ў сярэдняй школе спявала ў хоры «Журавінка», пазней выступала як салістка школьнага ансамбля. Скончыла ўсходняе аддзяленне БДУ па спецыяльнасці кітайская мова (2006), падчас навучання ва ўніверсітэце пачала супрацоўнічаць з кампазітарам і аранжавальнікам *Леанідам Шырыным*. Рэпертуар заснаваны на песнях на ўласныя ангельскамоўныя тэксты. Сярод найбольш вядомых песень «Hush», «Freedom», «You Break Me», «Для тебя» (сумесна з *Нілсам*).
**Фестывалі:** «Ялта 2004».
**Узнагароды:** Гран-пры фестывалю «Ялта 2004».
**Дыскаграфія:** CD-дэма «Hush» (2004); **трэк** «You Break Me» (у зборніку «Первый Интернационал» – «Vigma», 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «I'm 18» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2002), «Forever» (рэж. *Уладзімір Максімкаў*, 2002).
**Іншая інфармацыя:** захапляецца катаннем на ролікавых каньках, кітайскай мовай.
**Кантакт:** corriana4ever@yandex.ru; www.corianna4ever.narod.ru; +375 (29) 749-09-08.
05.11.06//Д.П.

**«КаСлука ДаКавалёв»** – мінскі дуэт.
Выконваў аўтарскія расейскамоўныя песні ў стылі папулярнай моладзевай музыкі. Утварыўся ў 1996, у складзе дуэту выступалі *Кірыла Слука* – вакал, аўтар музыкі і тэкстаў і *Сяргей Кавалёў* – аўтар музыкі і тэкстаў, клавішныя, аранжаванні. Дуэт праіснаваў да канца 90-х, калі творчыя шляхі музыкаў разышліся.
**Дыскаграфія: альбом** МС «На потом» («Vigma», «Smeet Records», 1997), «Песни о Родине» («Art House Rec.», 1999).
27.11.06//Д.П.

**«КАТАФАЛК»** – віцебская група, якая ўтварылася ў 1993 дзеля выканання рок-музыкі ў стылі грындкору.
Першапачатковы склад: Аляксандр «Удаф» Анціпенка – гітара, Дзмітрый «Дыяген» – бас-гітара, Аляксей «Кен Лард» Кавалеўскі – барабаны, Іван «Бацыла» Маркоўскі – вакал, Андрэй «Лёва Задаў» Ляухін – вакал. У канцы 2006 група выступала наступным складам: А. Анціпенка, Дзяніс «Батон» Хоцькін – бас-гітара, *Максім «Макс» Жукаў* – барабаны, Вячаслаў «Слава» Равер – вакал, А. Ляўхін, Сяргей «Кіт» Кузьмін. Цягам

гадоў група брала ўдзел у шэрагу рэгіянальных фестываляў.

**Дыскаграфія: альбомы** «Катафалк» (дэма, 1993), MC «The Bad Of 1993–96» («BUTT Records», 1997), «Катафалк» (дэма, 1998); **трэк** у зборніку «Blow Up This Town, vol. 2» («BUTT Records», 2002).

**Кантакт:** www.zhukov.tv; maximzhukov@tut.by; 210032, а/с 11А, Віцебск, Беларусь, Жукаву Максіму Леанідавічу.

24.12.06//М.Ж.

**КАЦІКАЎ АЛЯКСАНДР (Катиков Александр, Katikov Aleksandr)** – гітарыст, вакаліст, аранжавальнік, кампазітар.

Нарадзіўся 31.03.1959 у в. Ромуцi Воранаўскага р-ну Гродзенскай вобл. Ва ўзросце 8 гадоў пачаў вучыцца музыцы па класе баяна. У 1982 скончыў ММВ па класе флейты. Вучыўся на завочным аддзяленні МІКу. Ад 1982 да 1984 выступаў у складзе мінскай групы *«Диалог»* М. Самусевіча, ад 1984 да 1987 працаваў музыкам у Ніжнім Урангоі (Расея), наступныя пяць гадоў – музыкам ансамбля мінскай рэстарацыі «Планета», у 1992 быў запрошаны ў ансамбль *«Песняры»*. У 1998 пасля падзелу ансамбля пачаў працаваць у ансамблі *«Белорусские Песняры»*. Падчас працы ў складзе «Песняроў» стаў ініцыятарам напісання, кампазітарам і аранжавальнікам праграмы «Жывем» на вершы *Ларысы Геніюш*, выдадзенай у 2000 асобным дыскам. У запісе ўдзельнічалі *Уладзімір Мулявін*, музыкі «Песняроў» і спецыяльна запрошаныя выканаўцы. Рабіў песні і аранжаванні для многіх выканаўцаў папулярнай музыкі Беларусі.

**Гастролі:** гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры».

**Фестывалі:** гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры».

**Дыскаграфія:** гл. «Песняры» 1994–2000; «Белорусские Песняры»; **трэк** «Только с тобой» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000).

**Кіно, відэа: кліпы** «Только с тобой» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2002), «Не люби нелюбимого», «Хлопец, не журыся», «Знай, не забывай».

**Кантакт:** +375 (17) 274-02-32, (29) 674-02-32; Katikov@mail.ru

19.04.03//Д.П.

**КАШАПАРАЎ АНАТОЛЬ (Кашепаров Анатолий, Kasheparov Anatoliy)** – спявак.

Нарадзіўся 15.10.1950 у Мінску. Скончыў БПІ, МІК, ГІТІС (1989) па спецыяльнасці эстрадная рэжысура. Выступаць на сцэне пачаў у 1967 як вакаліст мінскай групы «Синие гитары». У 1971 быў запрошаны ў склад



ансамбля «*Песняры*», у якім выступаў да 1989. У 1990 выехаў у ЗША, дзе не пакідаў заняткаў музыкай. У 2006 на некалькі месяцаў вярнуўся на радзіму, выступіў з шэрагам канцэртаў у Беларусі і Расеі. Сярод найбольш вядомых твораў у ягоным выкананні – «Вологда», партыя ў оперы-прытчы «Песня пра долю».
**Гастролі:** гл. «Песняры».
**Фестывалі:** гл. «Песняры».
**Дыскаграфія:** гл. «Песняры».
**Кантакт:** www.kasheparov.narod.ru; kosha2816@yahoo.com
07.11.06//Д.П.

**КАЧАРОЎСКІ ДЗМІТРЫЙ (Кочаровский Дмитрий, Katcharouski Dzmitri)** – спявак, выканаўца традыцыйнага папулярнага рэпертуару.
Нарадзіўся 20.05.1976 у Гродзенскай вобл. Скончыў музычную школу, у 1999 – Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. У гэтым жа годзе быў прыняты салістам-вакалістам у склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі.* Ад 2003 жыве ў Маскве, працуе пераважна як актор кіно. Сярод найбольш вядомых песень, якія выконваліся пераважна на расейскай мове, – «Лодка белая», «Ты одна», «Музыкант», «Синеокая».
**Фестывалі:** «Золотой Скиф» (Данецк, 2000), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна 2001», «Славянский базар 2001», «Море друзей».
**Узнагароды:** спецыяльны прыз журы конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Золотой Скиф 2000», спецыяльны прыз конкурсу Нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі «Маладзечна 2001», лаўрэат І прэміі конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Славянский базар 2001».
07.11.06//Д.П.

**КАЧЫНА КАЦЯРЫНА** – гл. Карыяна.

**КІРЧУК ІВАН (Кирчук Иван, Kirchuk Ivan)** – фалькларыст, педагог, выканаўца на народных музычных інструментах, аранжавальнік, заснавальнік і лідэр груп *«Тройца»* і *«Этна-трыо «Тройца».*
Нарадзіўся 14.09.1958 у Лідзе, у 1977 скончыў Лідскую музычную вучэльню, у 1985 – БУК, аспірантуру Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі (1988). Выкладчык кафедры этнаграфіі і этналогіі ДПУ імя М. Танка. Ад 1984 да 1995 кіраваў фальклорнымі калектывамі «Прадвесне», «Бліскавіцы», «Дабрадзеі», «Агняцвет», «Дзіва», у 1995 сабраў групу «Тройца», якая выконвала фолк-



ф'южн на аснове старажытнага беларускага музычнага фальклору. Са студзеня 1999 група называецца «Этна-трыо «Тройца» і выступае ў новым складзе з траўня гэтага ж году. Гэтыя калектывы ўдзельнічалі ў шэрагу фальклорных і джазавых фестываляў у Еўропе і Азіі, неаднаразова запісваліся для тэлевізійных і радыёпраграм, запісалі і выдалі ў апрацоўках І. Кірчука ў Галандыі два альбомы, пазней перавыдадзеныя ў Беларусі. У ліпені 1996 «Тройца» была адзначана дыпломам І ступені конкурсу «Саступі дарогу!» Фонду Сораса-Беларусь, а ў чэрвені 1997 – дыпломам Фонду Генры Форда ў рамках праекту «Спадчына».

**Гастролі:** гл. «Тройца» і «Этна-трыо «Тройца».

**Фестывалі:** гл. «Тройца» і «Этна-трыо «Тройца».

**Узнагароды:** дыплом у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць» цырымоніі «Рок-каранацыя 1998», «Рок-карона 2004–05» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць».

**Дыскаграфія:** гл. «Тройца» і «Этна-трыо «Тройца»; сольны CD «Heritage Of The Lost Villages» («PAN Records», Галандыя, 2000, перавыд. MC «Спадчына загінуўшых вёсак» – «Bulba Records», Беларусь, 2000), ініцыятар выдання альбому аўтэнтычных запісаў «Століншчына» (2005).

**Кіно, відэа:** гл. «Тройца» і «Этна-трыо «Тройца».

**Хобі:** збіранне народных музычных інструментаў з розных краін, якія актыўна выкарыстоўвае падчас канцэртаў.

**Кантакт:** troitsa_folk@mail.ru

05.11.06//Д.П., фота Д.П.

**«КЛЕЙ!»** – калектыў з Брэсту, які ўтварыўся ў 1997 і першапачаткова, да 1999, меў назву «Funny House».

Група на працягу ўсяго існавання трымалася стылю гранджу ў спалучэнні з элементамі панку. Першапачатковы склад: Ілля Курачкін (← «Eternal Eclips») – вакал, гітара, барабаны, Алег Малейка – вакал, гітара, Руслан Крапчук – бас-гітара.



У 1999 месца за барабанамі заняў Андрэй «Дрын» Дранюк, у 2000 на месца бас-гітарыста прыйшоў Леанід Багдановіч, праз год вярнуўся Р. Крапчук, і калектыў выступаў з двума выканаўцамі на бас-гітары аж да распаду ў другой палове 2002. Пасля гэтага І. Курачкін і Л. Багдановіч утварылі хард-коравы праект «D_tails».

**Дыскаграфія: трэкі** «Шмаль» (у зборніку «Я в Бресте» – «Art Classic Company», Мінск, 2002), «Все нормально» (у зборніку «Я в Бресте 2» – «Art Classic Company», Мінск, 2003).

**Кантакт:** +375 (162) 26-49-40 (Ілля), (162) 26-60-77 (Леанід).

27.03.04//Г.Ш.

**«КЛЁНДАЙК»** – мінская група, якая ўтварылася ўвосень 2003. Выконвае папулярную рок-музыку, рэпертуар заснаваны на аўтарскіх расейскамоўных песнях. У першым складзе групы выступалі *Макс Івашын* – клавішныя, Аляксандр Красноўскі – бас-гітара, Дзмітрый Пронін – гітара (→ 2004), Аляксей Волкаў – барабаны (← *«Postscriptum»*, *«NEO»*), *Каця Пытлева* – вакал, аўтар тэкстаў. На пачатку 2004 да групы часова далучыўся гітарыст і саўндпрадзюсэр В. Марголін, цяпер група складаецца з К. Пытлевай, А. Волкава, Ігара Норыка – гітара, Сяргея Бялова – бас-гітара (←2006), Паўла Углова – клавішныя. З вынікаў 2005 група была прызнана лепшай сярод маладых калектываў краіны паводле апытання «Музыкальной газеты». Найбольш вядомыя песні «Не важно», «Я знаю», «Не получится».

**Гастролі:** клубныя канцэрты ў Маскве (2005–06).

**Фестывалі:** «Открытое небо» (Мінск, 2005), «ВотСтог» (Навапалацк, 2005), «Танцы на палянцы» (Мінск, 2005), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2006).

**Дыскаграфія:** максі-сінгл «Я знаю» («West Records», 2006), CD «Разное время» («West Records», 2007); **трэк** «Не получится» (у зборніку «Все звёзды» – «Record Service», 2005).

**Кіно, відэа: кліпы** «Не важно» (2005), «Не получится» (2006), «Подарить» (2007) – усе ў рэжысуры К. Пытлевай; **трэк** «Не важно» (у DVD зборніку «Горячая 20» – «Монолит», Расея, 2006).

**Кантакт:** www.tez-z-z.boxmail.biz; kp@one.by; tez-z-z@mail.ru; +375 (29) 775-27-00.

02.06.07//Д.П.

**КЛІМАЎ АЛЕГ (Климов Олег, Klimau Aleh)** – журналіст. Нарадзіўся 24.12.1964 у Ленінску (Байканур), Казахстан. У 1988 скончыў філію «Восход» МАІ, у 1988–93 працаваў на мінскім заводзе вылічальнай тэхнікі ім. Арджанікідзэ, пазней два гады займаўся прыватным прадпрымальніцтвам, у журналістыцы – ад 1995. З 1997 – у «Музыкальной газете», цяпер шэф-рэдактар. Друкаваўся ў часопісах «Несси», «Золотая орхидея», «НОТ-7».



Аўтар шматлікіх рэцэнзій на дыскі і канцэрты, публіцыстычных артыкулаў. У 2006–07 выступіў як адзін з вядучых беларускага тэлевізійнага адборачнага туру сусветнага конкурсу «The Global Battle of The Bands».

**Кантакт:** www.nestor.minsk.by/mg; mg@nestormedia.com; +375 (17) 234-63-11.

16.04.06//Д.П., фота Д.П.

«**КНЯЗЬ МЫШКИН**» – мінская група. Выконвае музыку, якую самі музыканты вызначаюць як інтуітыўная імправізацыя.

Група ўтварылася ў 1991 з ініцыятывы гітарыста Леаніда Нарушэвіча (← *«Зартипо»*, «Интер»), калі да яго далучыўся барабаншчык Юрый Паўлоўскі (→ *«Этна-трыю «Тройца»*, студзень 1999). Ад самага пачатку музыкі трымаюцца прынцыпу выканання твораў на канцэртах і падчас запісаў у студыі без аніякага папярэдняга ўзгаднення матэрыялу і налажэнняў гуку, выключна на пачуццях і інтуіцыі. Асноўныя музычныя арыенціры – творчасць Джона Зорна, Біла Ласвэла, Чыка Карыа, Ігара Стравінскага, Сяргея Пракоф'ева, фальклор Азіі і Афрыкі. У розны час у калектыве выступалі Юрый Васільеў і Уладзімір Сівіцкі – фартэпіяна, *Валерый Башкоў* і Андрэй Брусіненка – бас-гітара, Аляксей Кузняцоў – перкусія, Яўген Хітрак – флейта.

У 2004 калектыў вярнуўся да формы дуэту Л. Нарушэвіч – Віктар Сямашка – кларнет, ударныя, запрашаючы на асобныя канцэрты іншых салістаў, да прыкладу, *Яўгена Канавалава* – гітара. Група дала шэраг канцэртаў у клубах Масквы, Санкт-Пецярбургу, удзельнічала ў тэлепраграме «Антропология» (канал «НТВ»).

**Гастролі:** неаднаразовыя выступленні ў клубах Расеі.

**Фестывалі:** «Spotkania Gospel & Jazz» (Сувалкі, Польшча, 2004), «Сырок-5» (Масква, 1992), «Скиф-5» (Санкт-Пецярбург, 2001), «Альтернатива в Праге» (2001), «Артишок» (Мінск, 1992), «Мир как тайна» (Масква, 2003), «Блюз жыве ў Мінску» (1996, 1998), «Синий перец» (Мінск, 1994–2003), «Грифомания» (Мінск, 2001, 2003), «Альтернатива 19» (Масква, 2005), «Восточноевропейский музыкальный конвент ЕЕСМ» (Санкт-Пецярбург, чэрвень 2005).

**Дыскаграфія:** «Послеполуденный отдых Корягина» (1991), «Мономпровизации» (1991), «От лени фейгину» (1992), «Петин домик» (1992), «Мазки» (1993), «Примитивная память носа» (1993), «Пельмени декабря» (1994), «Изыскания полезных ископаемых» (1994 – усе аўтарскія выданні), «Жеко» («Ковчег», 1995), «Вальсики» («Ковчег», 1995), «10 пьес и синий синий» (аўт. выд., 1996), «Кошык» (1997, перавыд. «Geometria», Расея, 2004), «Даруй» (1997), «Горячий финский зартипос» («Ковчег», 1998, перавыд. «Geometria», Расея, 2004), «Волшебник и баба» («Habbal Charmin Records, Расея, 2000), «Summer Session» («Woodrecords», Расея, 2001), «тихо-tiho» (live, аўт. выд., 2002), «Lebedrakdashuka» («Woodrecords», Расея, 2003), «Покеда» (аўт. выд., 2005), «Волшебник и баба/Грифомания» («Triangle Records», Петразаводск, 2006), «Kniaz Myshkin In Dom» (2007), «Sector Geza» («Акация», Расея, 2007).

**Кіно, відэа:** музыка да кінафільму «Песнь Тела» (рэж. С. Памела, Вялікабрытанія, 2002).

**Кантакт:** www.knyazmishkin.narod.ru; leonid.narushevich@tut.by; mishkin@list.ru.

29.09.07//Д.П.

«**КОНДОР**» – мінская група, якая трымалася стылю хэві-метал.

Утварылася ў 1986 на базе Цэнтру эстэтычнага выхавання моладзі

Маскоўскага р-ну Мінску. У першапачатковым складзе групы выступалі Сяргей «Вайсман» Васільеў – вакал (➔ ЗША, 1989), *Аляксандр Папроцкі* – гітара (➔ 1989 *«Песняры»*), Ігар Капылоў – гітара (➔ *«Новый Иерусалим»*), Дзмітрый Пазьняк – бас-гітара, Мікалай Сяміжон – барабаны, *Уладзімір Зайчанка* – дырэктар. У 1986 да калектыву далучыўся *Алег Аверын*, які выступаў з групай да 1990 (➔ «Песняры»). У 1990 – перад тым, як група спыніла існаванне – у яе складзе граў на клавішных Вадзім Калацей (➔ «Новый Иерусалим»).

**Фестывалі:** «Тры колеры» (Мінск, 1987), «Металлопластика» (Свярдлоўск, 1988), «На Доўгім бродзе» (Мінск, 1988), «Горадня 1989», конкурс рок-груп Мінску (1989).

**Узнагароды:** прыз глядацкіх сімпатый на фестывалі «Тры колеры» (Мінск, 1987), 2 месца ў конкурсе рок-груп Мінску (1989).

29.05.06//Д.П.

**КОРАНЬ ВЯЧАСЛАЎ (Корень Вячеслав, Koran Viachaslau)** – гітарыст, спявак, аўтар музыкі і тэкстаў, саўнд-прадзюсэр.

Нарадзіўся 16.12.1955 у Пскове, Расея. У 1978 скончыў МРТІ па спецыяльнасці аўтаматычныя сістэмы кіравання. Творчы шлях у музыцы распачаў як гітарыст у мінскай групе «Лифт». У 1982 увайшоў у склад групы *«Studio-7»,* у 1984–88 быў гітарыстам групы *«Бонда».* У 1988 увайшоў у склад групы *«Ulis»,* з якой выступае й дагэтуль як лідэр-гітарыст і вакаліст, асноўны аўтар рэпертуару. Ад 1989 выступае й як саўнд-прадзюсэр (альбомы «LaLaLaLa», «Одзірыдзідзіна», «Made in N.R.M.» групы *«N.R.M.»,* «Мая краіна», «Цэпэліны» групы *«Новае Неба»*, «Сонцавакол» групы «Indra», удзельнічаў у запісе шэрагу праграм многіх беларускіх выканаўцаў. Выступаў як гітарыст і саўнд-прадзюсэр у складзе групы «Новае неба» (1994–99), быў удзельнікам запісу і канцэртных паказаў супольнага музычнага праекту «Народны альбом» (1996–2005). У 2003–05 быў сябрам журы конкурсу ў рамках фестывалю «Басовішча», а таксама фестывалю «Бардаўская восень». Суаўтар песень «Гэстапа», «Іржавыя дні», «Акторка», «Чужаніца», «Радыё Свабода», «Краіна доўгай белай хмары», «Ерусалім».

**Гастролі:** у складзе «Ulis» – Беларусь, Масква, Калінінград (Расея), Чарнаўцы, Цярнопаль, Луцк (Украіна), Сопат, Беласток (Польшча), Аўгсбург (Нямеччына), Лондан (Англія).

**Фестывалі:** у складзе «Ulis» – «Басовішча» (Гродэк, Польшча, неаднаразова), «Тры колеры» (Беларусь), «Сырок» (Расея), «Музыкі свету дзецям Чарнобылю» (Беларусь), «Рок чыстай вады» (Беларусь), «Рок па вакацыях» (Беларусь), «Rock Summer» (Эстонія), «Rock mafia» (Польшча), «Сопат» (Польшча), «Рок-купальле» (Беларусь), «Права быць свабодным» (Украіна), «Solidarni z Białorusią» (Польшча, 2006).

**Узнагароды:** лепшы гітарыст на фестывалі «Тры колеры» (1989), уладальнік трох узнагарод на фестывалі «Басовішча» (1993), уладальнік «Рок-кароны 1997» у намінацыі «Альбом году» («Народны альбом»).

**Дыскаграфія:** у складзе «Ulis» – гл.

**Кантакт:** ulisbel@yahoo.com; www.ulis.home.by;

старонка на Вікіпедыі be-x-old.wikipedia.org/wiki/Слава_Корань; strider-first.livejournal.com; +375 (17) 288-14-95, (29) 111-84-56.
11.10.07//Д.П.

**«КРАМА»** – мінская група, якая трымаецца стылістыкі блюз-року і рытм-энд-блюзу, выконваючы ўласныя творы і кавер-версіі блюзавых стандартаў на беларускай і ангельскай мовах.
Утварылася ў канцы 1991 на базе групы «Рокіс» і першапачаткова выступала наступным складам: *Ігар Варашкевіч* – вакал, гармоніка, *Сяргей Трухановіч* – гітара, *Ілля Шэўчык* – гітара, Руслан Праўда – бас-гітара, Андрэй Лявончык – клавішныя, Анатоль Горбач – барабаны, *Зміцер Лукашук* – тэксты, Андрэй «Клаўс» Белізяк – гукарэжысёр.
У розныя гады сярод іншых у калектыве выступалі Сяржук Кныш – барабаны, *Аркадзь Юшын* – гітара, Юрый Фядзюк – бас-гітара, Ігар Маскаленка – барабаны, Уладзімір Гаўрыленка – клавішныя, акардэон, *Аляксандр Салаўёў* – гітара (→ *«Белорусские Песняры»*). На пачатку 2005 група мела склад: І. Варашкевіч, С. Трухановіч, А. Лявончык, *Аляксандр Ванкевіч* – бас-гітара (← *«Верасы»*, *«Little Blues Band»*), *Андрэй Філатаў* – барабаны (← *«Сузор'е»*, *«Zindan»*, *«Mojo Blues»*), *Аляксандр Газізаў* – гітара (← *«Rouble Zone»*, *«Сябры»* → 2005). Найбольш вядомыя песні «Бяжы, бяжы, хлопец», «Што дапаможа нам», «Стэфка», «Гомельскі вальс» (сумесна з *Анатолем Ярмоленкам*), «Хавайся ў бульбу», «Гэй там, налівай».



**Гастролі:** Расея, Польшча (1995–99).
**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1992, 2004–07), «Славянский базар» (1993), «Поколение» (Масква, 1994), «Visagino Country» (Літва, 1996), «Маладзечна» (1994, 1995), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2002).
**Узнагароды:** пераможцы «Рок-каранацыі 1994», уладальнікі «Рок-карон» у намінацыях «За адданасць жанру» (1995), «Традыцыі і сучаснасць» (1999), «Альбом году» (2001, «Хавайся ў бульбу»); пераможцы «Басовішча» (1992), 1 месца ў конкурсе фестывалю «Поколение 1994», «Рок-карона 2004–05» у намінацыі «Блюз-рок выканаўца».
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Хворы на рок-н-рол» («Ковчег», 1993), CD «Vodka On Ice» («RTX Records», Вялікабрытанія, 1993, перавыд. «БМАgroup», 2004), МС «Гэй там, налівай!» («Ковчег», 1994), «Камэндант» («Ковчег», 1995), «The Best» («Ковчег», 1995), «Лянівыя танцы» («Ковчег», 1996), «Што дапаможа нам» («Ковчег», 1998), CD «Хавайся ў бульбу» («Bulba Records»/«БМАgroup», 2001), «Наваполацкі канцэрт» («БМАgroup», 2004), «The Best» («West Records», 2005), «Усё жыццё – дзіўны сон» («Go-Records», 2007); **трэкі** «Скажы мне, Ганулька» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Run Boy Run», «Baby», «Rockin' & Rollin» (у зборніку «Western Dreams» – «RTX Records», 1993), «Мама, я ўжо не той», «We Are Going Down», «Сабака», «Гэй там, налівай», «Камэндант» (у зборніку «Живые концерты на «Радио Ракурс», т.1» – «Радио Ракурс», Расея, 1996), «Enjoy The Silence» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Mein Faterland, auf wiedersehen» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМАgroup», 2004), «Слуцкая брама» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006), «Бяжы, хлопец!» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Гомельскі вальс» (рэж. Я. Хрусталёў, 1996), «Хавайся ў бульбу» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2002).
**Кантакт:** www.krama.by; s.trukhanovich@mail.ru; +375 (29) 665-96-72.
21.09.07//Д.П.

**«КРАМБАМБУЛЯ»** – мінская група, якая ўтварылася ў 2002 з музыкаў розных калектываў дзеля выканання жартаўліва-парадыйных песень, аб'яднаных у тэматычныя праграмы.
Аснову калектыву складаюць наступныя музыкі: *Лявон Вольскі* – гітара, вакал (адначасова *«N.R.M.»*, *«ZET»*), Уладзімір Плюшчаў – басгітара (← *«Hasta la fillsta»*, адначасова «ZET»), Аляксандр «Ганс» Быкаў – барабаны (← *«Sacrastic Green»*, *«Новае Неба»*, *«Ulis»*, адначасова «ZET»), Сяргей Кановіч – гітара (← *«Hasta la fillsta»*,



адначасова «ZET»), Аляксандр «Рыба» Хаўкін – скрыпка. У 2005 дадалася духавая секцыя: Кастусь Карповіч – трамбон, Юрась Жданаў – труба. У розны час у праекце ўдзельнічалі *Сяргей Міхалок* – вакал (*«Ляпіс Трубецкой»*, *«Саша и Сирожа»*), *Аляксандр Кулінковіч* – вакал (*«Нейро дюбель»*), *Гюнэш Абасава* – вакал, Андрэй Кузьменка – вакал («Скрябін»). У 2007 у групе выступалі Л. Вольскі, С. Кананові́ч, У. Плюшчаў, А. Хаўкін, Мікола Белановіч – барабаны, К. Карповіч. Найбольш вядомыя песні, якія вытрыманы ў розным стылі і выконваюцца на розных мовах: «Абсэнт», «Маленькі жаўнерык», «Пане Каханку», «Госьці», «Люблю», «Хочаш піва», «Турысты», «Суседзі».

**Гастролі:** тур па Беларусі, Украіна (2005), Польшча, Нямеччына (2007).

**Фестывалі:** «Вольнае паветра» (2007), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007), «Славське-фэст» (Украіна, 2007).

**Дыскаграфія: альбомы** «Застольны альбом/Паўлітра добрага настрою» («West Records», 2002), «Крамбамбуля 1,5. Каралі раёну» («West Records», 2003), «Радыё «Крамбамбуля 0,33» («West Records», 2004), «Крамбамбуля» (зборнік – «Moon Records», Украіна), «Сьвяточная» («Go-Records», травень 2007), «The Best» («West Records», 2007); **трэк** «Госьці» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006).

**Кіно, відэа:** «Абсэнт» (рэж. У. Маркевіч, 2002), «Госьці» (рэж. М. Сабураў, А. Хацкевіч, 2003), «Люблю» (рэж. У. Маркевіч, 2004), «4 pancerni» (рэж. У. Маркевіч, 2004), «Турысты» (рэж. браты Сідарукі, 2005).

**Кантакт:** www.krambambulya.com; handzia@tut.by

21.07.07//Д.П., фота Д.П..

**«КРАСКИ»** – мінскі калектыў папулярнай танцавальнай музыкі для падлеткаў.

Утварыўся ў 2001 і з'яўляецца, па сутнасці, сольным праектам спявачкі *Аксаны Кавалеўскай* (← *«Лето»*). Рэпертуар калектыву заснаваны на расейскамоўных песнях. Падчас канцэртаў А. Кавалеўскай у розны час акампанавалі выканаўцы на клавішных В. Багам'я, А. Чыгір, Д. Арлоўскі, Д. Каханоўскі, С. Шмыкаў. Найбольш вядомыя песні «Старший брат», «Я люблю тебя, Сергей», «Оранжевое солнце». У 2005 у выніку канфлікту з мясцовай уладай, выкліканага парушэннем аўтарскіх правоў, група на чале з прадзюсэрам Аляксеем Воранавым пакінула Беларусь і знаходзіцца ў ЗША.

**Гастролі:** Беларусь, Расея, Украіна, Казахстан, Эстонія, Ізраіль, Галандыя, Англія, Ірландыя, ЗША.

**Дыскаграфія: альбомы** «Старший брат/Жёлтый альбом» («REAL Records», 2002), «Я люблю тебя, Сергей/Красный альбом» (2003), «Оранжевое солнце/Оранжевый альбом» (2003), «Весна/Синий альбом» («Iceberg Music», 2004), «Те, кто любит/Фиолетовый альбом» (2004); **трэкі** «Старший брат» (у зборніку «Точка отрыва» – «REAL Records», 2002), «Сегодня к маме я приехала домой» (у зборніку «Формула-3» – Расея, 2002), «Я люблю тебя, Сергей!» (у зборніку «Союз XXXII» – «СОЮЗ», 2003), «Ты пишешь мне письмо» (у зборніку «Большая стирка 4» – «REAL Records», 2003),

«Мне сегодня грустно» (у зборніку «Русская тридцатка 9» – «Квадро-диск», 2003), «Старший брат-2» (у зборніку «5 звезд. Классный 3» – «Iceberg Music», 2004), «Метели» (у зборніку «5 звезд. Романтический 3» – «Iceberg Music», 2004), «Весна» (у зборніках «5 звезд. Танцевальный 3», «Красочный 5» – «Iceberg Music», 2004), «Оражевое солнце» (у зборніку «Большая стирка 5 звезд» – «Iceberg Music», 2004).
**Кіно, відэа: кліпы** «Мамочка моя» (рэж. Мурго, 2003), «Сегодня к маме я приехала домой» (рэж. А. Ігудзін, 2002), «Оранжевое солнце» (рэж. Р. Нурыеў, 2003), «Старший брат» (рэж. А. Ігудзін, 2002), «Старший брат-2» (рэж. А. Ігудзін, 2004), «Те, кто любит» (рэж. Д. Захараў).
**Кантакт:** www.kraski.org
11.11.06//Д.П.

**КРАЎЧАНКА СЯРГЕЙ (Кравченко Сергей, Kravchenko Sergey)** – бас-гітарыст.

Нарадзіўся 09.12.1963 у Мінску. Скончыў МРТІ ў 1987. Як бас-гітарыст дэбютаваў у складзе групы *«Метро»* ў 1983. Пазней выступаў у складзе групы *«Studio 7»*, ад 1983 да 1989 – у групе *«Бонда»*, ад 1989 да 1994 быў музыкам групы *«Ulis»*, пасля чаго пакінуў актыўныя заняткі музыкай, перайшоўшы ў сферу бізнэсу, прадстаўляючы ў Беларусі інтарэсы фірмы «A&T Trade». Аўтар песень з рэпертуару *«Ulis»* – «Пляц Францыска», «Краіна ў кратах», «Калі імпэрыя зьнікне».
**Дыскаграфія:** у складзе груп «Бонда» і «Ulis» (1990–91) – гл.
**Кантакт:** minsk@attrade.ru
20.09.05//Д.П.

**КРАЎЦОВА ЛЮДМІЛА (Кравцова Людмила, Krautsova Liudmila)** – спявачка, выканаўца пап-рокавага рэпертуару.

Выконвае песні розных аўтараў на расейскай мове. Найбольш вядомыя песні «Она ушла», «Увидеться вновь».
**Дыскаграфія: альбомы** MC і CD «От солнца к дождю» (1998), CD «Ночной альбом» («Меццо-форте», 2001); **трэкі** «Она ушла» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Увидеться вновь» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).



**Кіно, відэа: кліпы** «Весна», «Нейтральная земля», «Путник», «Серебрянный дождь».
03.03.07//Д.П.

**КРАЎЦОЎ АНДЖЭЙ (Кравцов Анджей, Kravtsov Andzhey)** – аўтар музыкі, піяніст.

Нарадзіўся 08.06.1973 у Нальчыку. Выступае пад псеўданімам Анжэло

Тэйлар (*Angelo Taylor*). Выканаўца электроннай музыкі. Вучыўся ў Кабардзіна-Балкарскай вучэльні культуры на акампаніятарскім факультэце па спецыяльнасці акампаніятар. Дэбютаваў у Нальчыку ў складзе групы «Аўра», у 1995 пераехаў у Брэст. Сольную працу распачаў у 1997. Ад 1999 да 2003 пражываў у Магілёве, пасля вярнуўся ў Брэст.

**Фестывалі:** міжнародны фестываль «Сто городов мира» (Мінск, 2001, Калінінград, 2002).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Космическая любовь» (запіс 1997, аўт. выд., 2003), «Дыхание тишины» (запіс 2000, аўт. выд., 2000); **трэк** «Open Space» (у зборніку «Сто городов мира»– «Белатон», СПб, 2003).

**Кантакт:** www.angelotaylor.narod.ru; angelotaylor@narod.ru; +375 (162) 45-88-52.

04.10.04//Г.Ш.

**КРУГЛОВА ВЕРАНІКА (Круглова Вероника, Kruhlova Veranika)** – спявачка, выканаўца музыкі ў стылі этна-ф'южн.

Нарадзілася 03.01.1966 у Мінску. Займацца музыкай пачала ў дзяцінстве, навучалася ў музычных ліцэі і каледжы па класах спеваў і фартэпіяна. У 1986 пачала працаваць у БДФ. Ад 1988 – удзельніца джазрокавай групы «Линда», у 1993 стала супрацоўнічаць з групай *«Палац»*. У 1996 увайшла ў склад *«Kriwi»*, пасля сыходу з групы найперш *Юрыя Выдронка*, а потым *Зміцера Вайцюшкевіча* практычна ўзначаліла гэты праект. У 2004 пераехала з сям'ёй у Берлін, дзе пад назовам Veranika Kruhlova & «Kriwi» зрэдзьчас дае канцэрты, запрашаючы выканаўцаў розных стылёвых памкненняў з розных краін свету. Апошні па часе выступ у Беларусі датаваны 13.01.2007 (канцэрт у Доме кіно на фестывалі «InterFilmWostok.net»).

**Гастролі:** у складзе групы «Палац» – краіны СНД; у складзе «Kriwi» – Беларусь, Нямеччына, Эстонія, Польшча, Расея, Швецыя, Літва, Люксембург, Латвія, Казахстан.

**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск, 1993), «Азія дауысы» (Алматы, 1997), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1998), «Festiwal folkloru ludów Pólnocy» (Польшча, 1998), «Karneval der Kulturen» (Берлін, 1998), «Musica Vitale» (Берлін, 2000), «Czeremcha» (Беласток, Польшча, 1997), «Noc Swiętojańska» (Люблін, Польшча, 1998), «Folk Festiwal» (Гдыня, Польшча, 1998–99), «Mediteran Festiwal» (Ізола, 2000), «Werkstatt der Kulturen-Festival» (Нямеччына, 2006), «Pogranicze Fest» (Нямеччына–Польшча, 2001), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (2003), «VolksBuehne. New Travel programme» (Берлін, 2006), «Folk Music in Dresden» (2007) і інш.

**Узнагароды:** прыз глядацкіх



сімпатый «За яскравае ўвасабленне славянскай тэмы ў папулярнай песні» конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Славянский базар» (Віцебск, 1993), «Рок-князёўна 1998, 1999» на цырымоніях «Рок-каранацыі», I месца на міжнародным конкурсе «Musica Vitale» (Берлін, 2000).

**Дыскаграфія:** у складзе «Kriwi» – гл.; **трэкі** «За туманам» (у зборніку «БелКП- ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Бяз гучных слоў» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**Кіно, відэа:** фільм «Kriwi» (рэж. А. Лукашэвіч, «Belpunkt–A.L. Studio», 2002); **кліпы** «Агу, вясна!» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2000), «За туманам» (рэж. А. Вечар, 1999), «Ніначка» (рэж. «Kriwi», 2000); удзел у мастацкіх фільмах «Свежанина с салютом» (рэж. І. Паўлаў, «Беларусьфільм», 2001), «Анастасия Слуцкая» (рэж. Ю. Ялхоў, «Беларусьфільм», 2003).

**Кантакт:** veranika@belpunkt.de; www.kriwi.com; +49 (172) 315-01-08.

12.03.07//Д.П.

**КСЯНДЗОЎ ГЕНАДЗЬ (Ксендзов Геннадий, Ksendzov Guennady)** – гукарэжысёр.

Нарадзіўся 20.01.1965 у Мінску. У 1987 скончыў МРТІ. Ад 1987 да 1989 працаваў у *Дзяржаўным канцэртным аркестры Беларусі*. Ад 1989 і да сённяшняга часу – гукарэжысёр дуэту *Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч*. Удзельнічаў у запісе песень і альбомаў *Віктара Вуячыча*, *Валерыя Дайнэкі*, *Іны Афанасьевай*, *Аляксандра Саладухі*, А. Гайдук, Т. Арлоўскай, У. Праналінскага, У. Ухцінскага, груп *«Camerata»*, *«Саванна»*, *Нэлі Багуслаўскай*, *Ізмаіла Капланава*, *Анжалікі Агурбаш*, *Надзеі Мікуліч*, А. Штэйнберга (Ізраіль), І. Менскай (ЗША), Я. Паплаўскай і А. Ціхановіча, *Настассі Ціхановіч, Сяргея Анцішына* і многіх іншых. У 2002 быў адзначаны спецыяльным прызам у намінацыі «Лепшы гукарэжысёр» тэлеконкурсу «Хит-момент».

**Кантакт:** gksendzov@tut.by

29.08.07//Д.П.

**КУЗІН СЯРГЕЙ (Кузин Сергей, Kuzin Sergey)** – ды-джэй, прадзюсэр, менеджэр.

Нарадзіўся 20.05.1963 у Патсдаме, Нямеччына. Ад 1980 да 1992 вучыўся ў ВІЗРВ СПВА (Мінск) і служыў у войску. Па дэмабілізацыі прайшоў навучаньне ў «High Radio Programming School» (Сіэтл, ЗША), у 2000 і 2003 – стажыроўкі па праграме Дзяржпэпартаменту ЗША ў сферы камерцыйнага радыёвяшчання. Ад 1996 да 1998 працаваў ды-джэем на радыё «Би-Эй», ад 1997 – праграмны дырэктар гэтага радыё. Ад 1999 – суўладальнік і генеральны прадзюсэр радыёстанцыі «Альфа-радио», адначасова – вядучы праграм, вядучы ток-шоў «Будні» (БТ-1, 2001), тэлевізійнай праграмы «На перекрестках Европы» (БТ-1). Аўтар і вядучы семінараў «Интерньюс» для супрацоўнікаў радыёстанцый: «Упраўленне СМІ», «Антыкрызісны менеджмэнт на радыёстанцыях», «Крэатыўная распрацоўка канцэпцыі сетак вяшчання на FM-радыё», «Работа прадзюсэра на FM-радыё». У 1998– 2002 паводле апытанняў прызнаны лепшым сярод радыйных ды-джэяў Беларусі.

У пачатку 2004 на знак нязгоды з прызначэннем новага кіраўніцтва «Альфа-радио» сышоў з радыёстанцыі і пераехаў на працу ва Украіну.

**Узнагароды:** Гран-пры Маскоўскага міжнароднага фестывалю рэкламы ў намінацыі «Крэатыўная серыя рэкламных ролікаў» (1997), Гран-пры фестывалю «Евролиния» ў намінацыі «Крэатыўная серыя рэкламных ролікаў» (Мінск, 1997), 1 прэмія ў намінацыі «Камерцыйная радыёрэклама» на ММФР (Масква, 1998), Гран-пры Кіеўскага міжнароднага фестывалю рэкламы (1999), 1 прэмія на ММФР у намінацыі «Радыёрэклама» (1999), прэмія за лепшую гумарыстычную праграму «Радиомания 2002» (Масква, 2002), пераможца прэміі імя Папова ў намінацыях «Лепшая радыёстанцыя», «Лепшы ды-джэй» (Масква, 2003), «Медыяперсона году» (нацыянальная прэмія, 2002), уладальнік прызу «Піяр-персона году» ад агенцтва «Деловые связи» (2003).

**Іншая інфармацыя:** сябра журы XII ММФР (2002), старшыня журы Кіеўскага міжнароднага фестывалю рэкламы (2003), арганізатар разві-тальнага матчу С. Алейнікава з удзелам зборнай СССР па футболе 1982 (1999), арганізатар міжнароднага свята графіці (2001), распрацоўшчык ідэалогіі, дызайну, брэндынгу клубу-рэстарацыі «Гудвін» у Мінску (2002).

**Кантакт:** serg_kuzin@tut.by; +375 (29) 683-81-35.

04.07.04//Д.П.

**«КУКЛЫ»** – хард-кор група з Мінску. Утварылася ў сакавіку 1997. Рэпертуар заснаваны на аўтарскіх расейскамоўных песнях, вытрыманых пачаткова ў стылі хард-кору і панк-рэпу. Цяпер сваю музыку група акрэслівае як стрыт-кор. Склад напрыканцы 2006: Сяргей «Санкі» Дубовік – бас-гітара, вакал, тэксты, Алесь «Аляксейт» Дрыго – гітара, тэксты, Аляксей «Генрых» Герман – гітара, Антон «Антуан» Арлоў – барабаны, Віктар «Піктар-Караман» Васіленка – шумавая дэструкцыя, шоў. За гады існавання група дала звыш 600 канцэртаў, у 2005 зладзіла ў Мінску ўласны «Sankicrew Fest». Найбольш вядомая песня «От заката до рассвета».

**Гастролі:** Расея, Украіна.

**Фестывалі:** «Сканг-фест» (Санкт-Пецярбург), «Центр тяжести 2» (Масква, 2003), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2003), «Рок-каранацыя 2003», «АнтиСПИД фест» (Мінск, 2005).

**Узнагароды:** «Рок-карона 2003» у намінацыі «Адкрыццё году», 1 месца на цырымоніі «Мистерия звука 2005» у намінацыі «Рэлізы беларускіх выканаўцаў альтэрнатыўнай музыкі» (альбом «Дисциплина хаоса»).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Пластилин замедленного действия» (аўт. выд., 1999), «Производство звукового оружия» («Sound Stream», 2002), «Звуковое оружие» («Master Records», Мінск, 2003, перавыд. «Никитин», Расея, 2004), зборнік «Рожденный быть плохим» («Moon Records», Украіна, 2004; «Мистерия звука», Расея, 2005), EP «Sanki Crew» («Aistmusic»/«West Records», 2004), CD «Дисциплина хаоса» («West Records», 2005; «Moon Records», Украіна, 2005; «Мистерия звука», Расея, 2005); **трэкі** «Хлопчык» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» –

«БМAgroup», 2002), «Кібер» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004).
**Кіно, відэа: кліпы** «Все как 1» (студыя «ОКО», 2003), «Главарь» (рэж. Санкі, 2004), «Ужасы» (2005), «От заката до рассвета» (ТА «Lis», 2005).
**Кантакт:** www.kukly.com; sankicrew@mail.ru; icq 23934784.
06.04.06//Д.П.

**КУЛІНКОВІЧ АЛЯКСАНДР (Кулинкович Александр, Kulinkovich Aliaksandr)** – спявак, аўтар музыкі і тэкстаў.
Нарадзіўся 18.05.1972 у Смалявічах. У 5-гадовым узросце пераехаў у Мінск. Скончыў ПТВ-23 па спецыяльнасці сантэхнік, паўгоду вучыўся на журфаку БДУ. У 1989 разам з Г. Агейчыкам заснаваў групу *«Нейро дюбель»*, у складзе якой выступае й да сёння. Удзельнік групы *«Крамбамбуля»*. Піша песні на расейскай і апошні час – на беларускай мовах. Найбольш вядомыя песні «Каникулы с Чичолиной»,«Петрова, подай воды», «Резиновый дом», «Гузік», «Жыцьцё».
**Гастролі:** гл. «Нейро дюбель».
**Фестывалі:** гл. «Нейро дюбель».
Узнагароды: «Рок-кароны» ў намінацыях «За лепшую інтэрпрэтацыю эстраднага шлягеру» (1996, «Здравствуй, чужая милая»), «Лепшы кліп» (1998, «Охотник и сайгак»), «Альбом году» (1998, «Охотник и сайгак»), «Рок-карона 1998», «Альбом году» (1999, «Ворсинки и катышки»), «Рок-карона 2004–05» у намінацыі «Альбом году» («Tanki»).
**Дыскаграфія:** гл. «Нейро дюбель».
**Кіно, відэа:** гл. «Нейро дюбель».
**Кантакт:** www.neurodubel.com; фан-сайт www.neurodubel.info; jim@neurodubel.com; +375 (29) 664-02-06.
02.05.06//Д.П.

**КУЛЯШОЎ АРКАДЗЬ (Кулешов Аркадий, Kuliashou Arkadz)** – паэт, сцэнарыст, перакладчык.
Нарадзіўся 24.01. (06.02) 1914 у м. Саматэвічы Клімавіцкага павету Магілёўскай губ., цяпер – Касцюковіцкага р-ну Магілёўскай вобл., памёр 04.02.1978, пахаваны ў Мінску. Першы ягоны верш на беларускай мове быў надрукаваны ў 1926. У 1928 паступіў у Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум, у 1933 скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытуту, працаваў у рэдакцыях газет, радыё, ад ліпеня 1941 – у рэдакцыі армейскай газеты «Знамя Советов», у 1945–46 – рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва». У 1958–67 – начальнік сцэнарнага аддзелу, галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм», сумесна з А. Кучарам напісаў сцэнарый фільму «Чырвонае лісце». Ад 1967 – на творчай рабоце. На ягоныя вершы пісалі музыку *Ігар Лучанок* («Алеся»), *Ісак Любан*, А. Фляркоўскі, *Уладзімір Мулявін*, група «Siver» («Сцяг брыгады»).
**Узнагароды:** лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР (за паэму «Сцяг брыгады», 1946, за паэму «Новае рэчышча», 1949), Дзяржаўнай прэміі БССР (за пераклады паэзіі М. Лермантава, паэм «Энеіда» І. Катлярэўскага, «Спеў аб Гаяваце» Лангфела, 1970), лаўрэат прэміі ЛКСМБ (за паэмы «Грозная пушча», «Толькі ўперад», «Песня аб слаўным

паходзе», 1968), кавалер двух ордэнаў Леніна, ордэна Чырвонага Сцягу, двух ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцягу, многіх медалёў.

**Дыскаграфія: трэкі** «Камсамольскі білет» (у CD «Tanki» групы *«Нейро дюбель»* – «Master Records», 2004), «Камсамольскі білет» (муз. У. Мулявіна, у EP ансамбля «Песняры» – «Мелодия», 1978), «Ты вспомни все» (муз І. Лучанка, у LP «Чараўніцы» – «Мелодия», 1978).

Паводле даведніка «Беларускія пісьменнікі», Д.П.

**КУР'ЯН УЛАДЗІМІР (Курьян Владимир, Kuryan Uladzimir)** – кампазітар.

Нарадзіўся 25.03.1954 у Мінску. Скончыў БДК па класе кампазіцыі Дз. Смольскага (1984) і пад яго ж кіраўніцтвам асістэнтуру-стажыроўку (1986). Працуе ў жанрах сімфанічнай і камернай музыкі, асноўную ўвагу надае музыцы для тэатру. Сярод найбольш вядомых твораў – рок-опера «Масфан», мюзіклы «Чароўныя прыгоды ў навагоднюю ноч», «Зоркі сёмага неба», музыка да драматычных спектакляў «Інтымны тэатр Еўсцігнея Міровіча», «Срэбраная табакерка», «Гаралд і Мод», «Тутэйшыя», «Ідылія».

**Узнагароды:** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992).

**Дыскаграфія: альбом** 2CD «Музыка Уладзіміра Кур'яна» («Ковчег», 2002).

**Кантакт:** +375 (29) 704-22-76, (17) 290-15-11.

24.10.07//Д.П.

**КУРЭК СЯРГЕЙ (Курек Сергей, Kurek Siarhej)** – гітарыст, вакаліст.

Нарадзіўся 21.11.1980 у Барысаве. Ад 1986 жыве ў Гомелі. Музычную кар'еру распачаў у 1995 у палацы творчасці «Юнацтва», дзе сабраў першы свой гурт «Big Dolls», які трымаўся стылю блюзу. Праз год стварае новае трыо *«At last»* (+ Руслан Таргонскі – барабаны, Уладзімір Перагудаў – бас-гітара, ← Юлія Петрушкевіч – вакал, 1998), якое засноўвала рэпертуар на творах Джымі Хендрыкса і Стыві Рэй Воэна. У 1999 музыкі сыходзяць з групы ў гурт «The Dazers», С. Курэк збірае новы склад, які праіснаваў нядоўга. Некаторы час працаваў у Польшчы, па вяртанні ў Гомель адначасова з музыкай пачаў займацца грамадскай дзейнасцю ў Асацыяцыі дзяцей і моладзі (АсДеМо), дзе курыруе міжнародныя культурныя праекты. Збірае «Трыо Сяргея Курэка» (+ Дзмітрый Кірчанка – барабаны, Дзмітрый Чарнякоў – бас-гітара), якое праіснавала да 2001. Ад 2001 – гукарэжысёр у студыі гуказапісу палацу творчасці «Юнацтва» і адначасова – лідэр групы «Blues Access Band» (+ Дз. Кірчанка, Андрэй Васільеў – бас-гітара, Васіль Кушняроў – гітара). У 2003 пэўны час працаваў у Нямеччыне, у Гомелі сабраў новы калектыў «3D-blues», які вясной 2004 пераўтвараецца ў «Night Drive» (+ Сяргей Сямуткін – бас-гітара, Віталь Смыкалаў – барабаны), зарыентаваны на сучасную аўтарскую джазавую музыку. У канцы 2005 распускае й гэты калектыў і пачынае працаваць сола.

**Гастролі:** у складзе «Трыо Сяргея Курэка» – 2-тыднёвы тур па Беларусі; у складзе «Blues Access Band» – Бранск (2002).

**Фестывалі:** у складзе «Трыо Сяргея Курэка» – «Ренессанс гитары» (Гомель, 1999), «Арт-сессия 2000»; у складзе «Blues Access Band» – «Арт-сессия 2002»; у складзе «Night drive» – «Ренессанс гитары» (2004).
**Кантакт:** www.kurek.nm.ru
11.04.06//N.N.

**КУЧЫНСКІ ВАЛЕРЫЙ (Кучинский Валерий, Kuchynski Valeri)** – спявак, выканаўца традыцыйнага песеннага рэпертуару.
Нарадзіўся 23.02.1947 у Нікалаеве, Украіна. Скончыў БДК у 1970 па класе вакалу. Ад 1967 – саліст Ансамбля песні і танца ЧБВА, у 1970–73 і 1976–79 – Дзяржаўнага тэатру оперы і балету Беларусі, у 1973–76 працаваў у БДФ, у 1979–82 – у Ансамблі песні і танца Паўночнай групы войскаў у Польшчы. Ад 1983 – саліст Белтэлерадыёкампаніі. У рэпертуары – пераважна песні беларускіх кампазітараў, камерная лірыка, оперныя арыі.
**Узнагароды:** лаўрэат IV Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя М. Глінкі (1968), IУ Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага (1970), Усесаюзнага конкурсу савецкай песні (Мінск, 1972), IV Міжнароднага конкурсу артыстаў эстрады (1974), лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі (1972).
Паводле Белэнцыклапедыі.

**«KAMAEDZITSA»** – мінская група, якая выступае ў стылі паган-метал, выконваючы песні на беларускай мове.
Працэс стварэння калектыву распачаўся у 2000, склад сфармаваўся ў 2002. У 2005 група выступала ў складзе: Алег Губіч – вакал, жалейка, блок-флейта, Ігар Шасцярнёў – гітара, клавішныя, Павел Котаў – гітара, Максім Шыфрын – бас-гітара, Антон Кагаткоў – барабаны.
**Дыскаграфія: альбом** CD «Дзеці леса» («Strong Music Prodution s», 2004).
**Кіно, відэа: кліп** «Дзеці леса» (2004).
**Кантакт:** manager55@tut.by
15.07.06//Д.П.

**«KILLKITAU»** – мінская група, якая ўтварылася ў сакавіку 2001 і выступае ў стылі красовер/лайт кор.
Першапачатковы склад: Алег Каменскі – вакал, гітара, Аляксандр Татун – гітара, вакал, тэксты, Аляксей «Лешы» Машчэнікаў – бас-гітара (→ 2002, *«Вірус ліха»*), Андрэй Ганчарык – барабаны (→ 2004, *«Indiga»*, *«Дрозды»*, *«По глазам»*). Група выступала ў маскоўскім клубе «Сафари» (2003), у адным канцэрце з расейскімі групамі «Чичерина», «Звери». У канцы 2005 у групе выступалі: А. Каменскі, А. Татун, Валерый Кутасевіч – бас-гітара, Уладзімір Звонік – барабаны.
**Фестывалі:** «Большие маневры» (Мінск, 2001), «Рок против наркотиков» (Мінск, 2003), «4 шурупа» (Гродна, 2004).
**Дыскаграфія: трэк** «Счастлив ли ты?» (у зборніку «Fuck show business» – 2004).
**Кіно, відэа: кліп** «Меня накрыло» (рэж. *Валік Грышко*, 2006).
**Кантакт:** www.killkitau.com; killkitau@tut.by, +375 (29) 688-29-27.
18.11.06//Д.П.



**«KNOCKLEDUSTER»** – калектыў з Брэсту, які трымаецца стылю хард-кору.

Утварыўся ў 1997 і пачаткова называўся «Have No Choise», маючы ў складзе Дзмітрыя Пінчука – вакал, Вячаслава Ванькова – гітара, Сяргея Ванькова – барабаны, Дзмітрыя «Металыча» Зарэцкага – гітара, Аляксандра «Кашчэя» Скам'іна – бас-гітара. У 1998 на месца Дз. Зарэцкага, Дз. Пінчука і А. Скам'іна прыходзяць Рыгор Карпяк – вакал і Аляксей Мішын – бас-гітара (→ 2001). У гэтым жа годзе група прымае сённяшнюю назву. Р. Карпяк ад 2001 паралельна выступае з уласным праектам «Діс-Плей», а з 2004 разам з В. Ваньковым – у «Dream 664». Такім чынам, у 2004 група выступала як трыо Р. Карпяк – вакал, бас-гітара, В. Ванькоў, С. Ванькоў.

**Фестывалі:** «Next Stop New Life» (2000, 2001), «Red Alert Open Air» (Еўпаторыя, 2007).

**Дыскаграфія:** MC **альбом** «Cutting The Navelstring» («Metal Records», 2001); **трэкі** «Падманула» (у зборніку «Hardcore-mania: чаду!» – «БМА-group», 2002; у зборніку «Я в Бресте 2» – «Art Classic Company», 2003), «Fuck» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», 2006).

**Кантакт:** www.knuckleduster.by.ru; vansla@tut.by; +375 (162) 43-44-24.

21.10.06//Г.Ш.

**«KRIWI»** – група з Мінску, якая ўтварылася ў 1996 з удзельнікаў групы *«Палац»*. Група выступае ў стылі ўолд-мюзік/фолк-ф'южн, ствараючы рэпертуар перадусім на аснове беларускіх народных песень.

У першым складзе выступалі *Юрый «Франц» Выдронак* – клавішныя, праграмаванне, *Зміцер «Тодар» Вайцюшкевіч* – духавыя, вакал, *Вераніка Круглова* – вакал. Вясной 1998 у трыо замест Ю. Выдронка прыйшоў гітарыст *Піт Паўлаў*. У розныя гады, у залежнасці ад




задач, да трыо далучаліся Кірыла Шэвандо – барабаны, *Валерый Башкоў* – бас-гітара, Масуд Талібані – перкусія, вакал, музыкі з Польшчы, Нямеччыны, Ізраілю і інш. краін. У 2004 група практычна спыніла дзейнасць і складаецца, па сутнасці, з адной В. Кругловай, якая пастаянна пражывае з сям'ёй у Нямеччыне.
**Гастролі:** Польшча, Нямеччына (неаднаразова).
**Фестывалі:** больш за дзесятак фестываляў фальклорнай і ўолд-музыкі ў краінах Еўропы, у тым ліку XXVI фестываль «Dzwięki Północy» (Польшча, 2002), «Fete Des Cultures» (Люксембург, 2002), «Radio MultiCulti Party» (Берлін, 2002), «Pogranicze» (Франкфурт-над-Одэрам, Нямеччына, 2002), «Festival Fur Folk, Lied und Weltmusik» (Перлеберг, Нямеччына, 2003)
**Узнагароды:** «Рок-карона 1997» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць», «Рок-карона 1999» у намінацыі «Кліп году» («За туманам»).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Хэйолі» («Belpunkt»/«Ковчег», 1996 ), «За туманам» («Belpunkt»/«Ковчег», 1997), CD «Людзям...» («Belpunkt»/ «Ковчег», 1999), «Мінск-Бэрлін» («Belpunkt», 2003); **трэкі** «За туманам» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Бяз гучных слоў» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).
**Кіно, відэа: кліпы** «Агу, вясна!» (рэж. *Анатоль Вечар*), «За туманам» (рэж. А. Вечар, 1999), «Ніначка» (рэж. «Kriwi»).
**Кантакт:** kriwi.com;
veranika@belpunkt.de;
+49 (172) 315-01-08.
08.10.06//Д.П..

**«KROK»** – мінская група, якая ўтварылася вясной 2001 і трымаецца стылю гранджу.
У першым складзе калектыву выступалі Раман Сухоцкі – вакал, Андрэй Глотаў – бас-гітара, Сяргей Старалаўнікаў – гітара, Уладзіслаў Валадзько – бас-гітара, Аляксей Сідаровіч – барабаны. У 2003 да групы далучаюцца Аляксей Худніцкі – бас-гітара і Аляксей Камоцкі – барабаны, адыходзіць С. Старалаўнікаў.

У пачатку 2007 у групе выступалі Р. Сухоцкі, А. Худніцкі, А. Камоцкі, Андрэй Глотаў – гітара. У рэпертуары калектыву – аўтарскія песні, якія выконваюцца на беларускай мове. Група дала шэраг канцэртаў у Віцебску і Гомелі.

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2006).

**Дыскаграфія: альбом** «Крок» («West Records», 2006); **трэк** «Адно і тое ж» (у зборніку «Басовішча XVII», 2007).

**Кіно, відэа: кліп** «Рай» (рэж. Д. Маркін, 2006).

**Кантакт:** www.thekrok.com; info@thekrok.com

03.02.07//Д.П.

**«CAMERATA»** – вакальная група з Мінску.

Выконвае акапэльныя творы з ужываннем мікрафоннай апрацоўкі галасоў, імітацыі гучання натуральных інструментаў на аснове джазавага фразавання. Уласны стыль музыкі вызначаюць як этна-сімфанічны вакал. Утварылася ў 1986 з ліку выпускнікоў Беларускай і Маскоўскай кансерваторый. Першы кіраўнік – кампазітар і аранжавальнік А. Шыкуноў (1995 → ЗША). Першапачаткова ўдзельнікі калектыву трактавалі выкананне акапэльных твораў акадэмічнага напрамку як хобі, на распеўках выконваючы творы класічнай джазавай літаратуры. Хутка асновай рэпертуару стаў менавіта джаз, які выконваўся з ужываннем амбушурнай тэхнікі і мікрафонаў з электроннай апрацоўкай галасоў. У канцы 80-х у рэпертуары калектыву з'явіліся аўтарскія, пераважна беларускамоўныя творы і апрацоўкі В. Вераб'ёвай, А. Доўнара, І. Мельнікава (кіраўнік калектыву ад 1995). З 1998 група нязменна выступае складам: Ігар Мельнікаў, Вольга Вераб'ёва, Галіна Гардынец, Таццяна Драбышэўская, Юлія Караткевіч, Аляксей Бурдзялёў, Аляксандр Доўнар, Ігар Шлопак



(гукарэжысёр) – у 2002 да яго месца прыйшоў Аляксей Багатчанка. Найбольш вядомыя творы: праграма «Музыка падсвядомасці» (1989), містэрыя «Бог среди нас» А. Шыкунова (1995) з удзелам А. Янчанкі і джаз-групы «Архангельск», «Снега, снега...», «Ангел мой». Ад 1996 па 1998 група працавала як самастойны калектыў у складзе *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, пасля – штатная адзінка БДФ. Выступае з сольнымі праграмамі, у якасці бэк-вакалістаў вядомых артыстаў беларускай эстрады, давала сольныя канцэрты ў зале «Россия» (Масква, 1989), прыдворнай капэле Санкт-Пецярбургу (1992), Маскоўскай філармоніі (1994), з нагоды адкрыцця новай залы Траццякоўскай галерэі (Масква, 1992), удзельнічала ў прэм'еры сімфоніі «Микельанджело» А. Янчанкі (Масква, 1994).

**Гастролі:** Польшча, Швейцарыя (1991, 1994, 1996), Нямеччына, Нарвегія (неаднаразова), ЗША (1991, 1995), Расея, Украіна.

**Фестывалі:** «Vasaras ritmi» (Рыга, 1988, 1989), фестываль сучаснага джазу «Джаз перед Рождеством» (Масква, 1991), міжнародны джазфестываль у Кракаве (1992), «Джазянтарь» (Калінінград, 1994), «Мінск 1997», «Варна 1998» (Балгарыя), ад 1997 – пастаянны ўдзельнік «Molde Jazz Festival» (Нарвегія), фестывалі ў Мурманску, Петразаводску, Коўне, Панявежысе (двойчы), Бірштанасе, Ніжнім Ноўгарадзе (двойчы), Кацярынбургу, Новакузнецку, Яраслаўлі і інш.

**Узнагароды:** лаўрэат вакальнага конкурсу ў Грацы, Аўстрыя (2000).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Бог среди нас. Мистерия» («Magic Jazz Agency Records», 1995), «Spleen» (аўт. выд., 1994), CD «Снега, снега...» («Camerata», 1998), «My Angel» («Camerata», 2000), «Just» («Camerata», 2001), «Дзіва» («Camerata», 2006).

**Кіно, відэа: кліп** «Асенняя ночка» (2005).

**Кантакт:** www.camerata-by.com; vorobievao@mail.ru, +375 (29) 615-08-29 (В. Вераб'ёва), (29) 643-41-29 (А. Доўнар), (29) 696-80-03 (І. Мельнікаў).

03.09.06//Д.П.

**«CAPRICE»** – жаночы біг-бэнд, які ўтварыўся ў 1995 пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце пад кіраўніцтвам Раісы Левінай (← ВІА *«Чараўніцы»*) дзеля выканання беларускай песеннай класікі, папулярнай эстраднай музыкі, твораў джазавай класікі.

Першы склад калектыву налічваў 14 чалавек, уключна з секцыямі духавых інструментаў, рытм-групу і вакалістаў. У пачатку 2007 у калектыве выступалі 18 чалавек, у тым ліку флейтыстка, 6 саксафаністак, 2 выканаўцы на трубе, 3 трамбаністкі, музыкі рытм-групы і 3 вакалісты. Сярод найбольш вядомых музыкаў, якія ў розны час выступалі ў складзе біг-бэнду, – бас-гітарыстка Таццяна Фралова, спявачка Алена Стэльмах, альт-саксафаністка Юлія Амельчанка. У якасці пастаяннага аранжавальніка з калектывам супрацоўнічае *Уладзімір Ткачэнка*.

**Гастролі:** Беларусь, Польшча.

**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль эстрадных аркестраў (1997, 1999, 2001), міжнародны музычны фестываль у Бельфары (Францыя,

травень 2002), «Парад оркестров» (у рамках фестывалю «Беларуская музычная восень», 2003–06).
**Дыскаграфія: альбомы** «Caprice» (ГДУ, 1997), «Пяшчотнасць» (ГДУ, 2000), «В джазе только девушки» (ГДУ, 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Каб любіць Беларусь» (рэж. В. Куц, 1998), «Caprice» (рэж. В. Куц, 2000).
**Кантакт:** мастацкі кіраўнік Р. Левіна caprice@grsu.by;
+375 (152) 73-19-71, (152) 74-31-19, (29) 628-49-99.
25.02.07//Д.П.

**«COBRA»** – група з Брэсту, якая выступала ў стылі хард-энд-хэві.
Утварылася ў 1992, выступаючы як квартэт наступным складам: Алег Панеўскі – вакал, Генадзь Люлькові́ч – бас-гітара, Аляксандр Чарко – барабаны, Юрый Колычаў – гітара (экс- *«Удар»* → 2000 *«Wolfshade»*, → *«Pulsar»* 2002). У 1999 калектыў удзельнічаў у фестывалі «Металёлочка» ў мінскім Палацы шахмат і шашак, пасля чаго неўзабаве спыніў існаванне.
**Дыскаграфія: трэкі** «Листопад» (у зборніку «Брест-рок-журнал» – «Брестон», 1998), «Радуга» (у зборніку «Брест-рок-журнал-2» – «Брестон», 1999).
**Кантакт:** +375 (162) 46-11-03 (Юрый).
18.03.04//Г.Ш.

**«CRANE'S GLEE»** – гомельскі калектыў, які трымаўся стылю блюз-року і класічнага року.
Утварыўся ў 1994. Першапачатковы склад: Сяргей Баброў – вакал, Леанід Дакучаеў – гітара, Мікалай Ушакоў – бас-гітара, вакал, Андрэй Фацін – барабаны. На пачатку 2005 група выступала як трыо: М. Ушакоў, Максім Здаравец – гітара, Ігар Антановіч – барабаны. Група выконвае на ангельскай мове як аўтарскія творы М. Ушакова, так і стандарты блюзавай музыкі і класічнага року.
**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (1998), «Арт-сессия» (Гомель, 2000).
**Дыскаграфія: альбом** «Come On» («Shaggy Granny Records», 2000).
**Кантакт:** +375 (232) 53-49-53 (М. Ушакоў).
12.02.06//N.N.

# Л

**ЛАБАНДЗІЕЎСКІ СЯРГЕЙ «ШЛЁМА» (Лобандиевский Сергей «Шлёма», Labandziewski Siarhiej)** – гукарэжысёр: запіс студыйны і канцэртны, звядзенне, мастэрынг, рэстаўрацыя фанаграм, гук у радыё- і відэарэкламе, агучванне відэа.

Нарадзіўся 19.06.1964 у в. Залессе Барысаўскага р-ну Мінскай вобл. Скончыў факультэт робататэхнічных сістэм БПІ ў 1991. Ад 1988 да 1992 працаваў тэхнікам, інжынерам ва ўстановах АН БССР, ад 1992 да 2001 – музычны рэдактар на Беларускім радыё. У 1995–96 – музычны рэдактар і гукарэжысёр FM радыё «101.2», у 1997–2001 – гукарэжысёр радыё «РОКС», ад 1998 да 2003 – гукарэжысёр тэлерадыёкампаніі «Мир». Асноўныя работы: «Народны альбом» (часткова: запіс, звядзенне), *«N.R.M.»* – «Самотнік» (звядзенне), «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.», «Акустычныя канцэрты XX ст.» (мастэрынг), «Сьвяты вечар 2000» (мастэрынг), «Я нарадзіўся тут» (часткова запіс і звядзенне, мастэрынг), *«Новае неба»* – «Цэпэліны» (мастэрынг), *«Kriwi»* – «Людзям» (мастэрынг), *Зміцер Вайцюшкевіч* – «Цацачная крама» (мастэрынг), *«ZET»* – «З новым годам» (запіс, звядзенне, мастэрынг), «Personal Depeche» (запіс, звядзенне), *«Крамбамбуля»* – «Застольны альбом», «Каралі раёну» (запіс, звядзенне), *Аляксандр Памідораў* – «Сьвята пакрадзенае» (запіс, звядзенне), *«Zygimont Vaza»* – «Der Dritte Krieg», «Kajin» (запіс, звядзенне, мастэрынг), *«Крама»* – «Vodka On Ice» (рэмастэрынг), *«IQ48»* – «Вар'яты» (запіс, звядзенне, мастэрынг), *«Л.О.М»* – «Прости-прощай» (часткова запіс, звядзенне), Данчык – «Я ад вас далёка» (рэстаўрацыя) і многія інш. Выстаўляў канцэртнае гучанне падчас выступленняў груп «Новае неба», «N.R.M.», «Kriwi», «Палац», «Zet», «Pomidor/off», *«Нейро дюбель»*, *«Ulis»*, «Zygimont Vaza», сумесных музычных праектаў «Народны альбом», «Я нарадзіўся тут», на фестывалях «Басовішча», «Рок па вакацыях», «Рок-каранацыя» і інш.



**Кантакт:** sound@biz.by; +375 (29) 636-67-81.

25.09.05//Д.П., фота Д.П.

**ЛАБЧЭЎСКІ АНДРЭЙ (Лабчевский Андрей, Labchevsky Andrew)** – піяніст, аранжавальнік.
Нарадзіўся 09.05.1974 у Мінску. У 1989 скончыў СШ №115 з харавым ухілам, у 1993 – аддзяленне музычнага мастацтва эстрады ММВ па класе фартэпіяна *Андрэя Пыталева*, у 1996 – БАМ па класе кампазіцыі Дз. Смольскага, у 2001 – факультэт павышэння кваліфікацыі кіраўнічых работнікаў і спецыялістаў галіны культуры Беларускага інстытуту праблем культуры. На прафесійнай музычнай сцэне дэбютаваў як піяніст у складзе аркестру ММВ п/к *Браніслава Сармонта* (1990–93), далей працаваў піяністам у складзе «Мінск джаз-квартэту» Я. Уладзімірава (1993), у гэтым жа годзе быў запрошаны як піяніст і аранжавальнік у ансамбль традыцыйнага джаза *«Рэнесанс»*, у складзе якога выступаў да 1999. У 1998 узначаліў уласны праект – джаз-ансамбль *«Дилижанс»*, адначасова з якім у 2002 утварыў ансамбль клезмерскай музыкі *«Меркава»*. Ад 2003 як піяніст супрацоўнічае з *«WZ-Orkiestra» Зміцера Вайцюшкевіча* (праграмы на вершы У. Маякоўскага, «Паравіны году», «Паравоз каханьня», «Танга з ружай»). Выступае й як студыйны музыка.
**Фестывалі:** «Vilnius Jazz Piano» (Літва, 1993), Дні беларускай культуры ў Кёльне (1997), «Old Jazz Meeting» (Ілава, Польшча, 1998), «Grodno Union Fest» (1998), «Блюз жыве ў Мінску» (1998, 1999) – усе ў складзе ансамбля «Рэнесанс»; II Міжнародны фестываль недзяржаўных моладзевых арганізацый (Мінск, 1999), II Міжнародны фестываль эстрадных аркестраў (Мінск, 1999), «Славянский базар» (Віцебск, 2000), Міжнародны джаз-фестываль «RADO-jazz» (Мінск, 2000) – усе ў складзе «Дилижанса»; фестываль, прысвечаны юбілею У. Маякоўскага (Масква, 2003), «Саксомания» (Мінск, 2003).
**Узнагароды:** у складзе ансамбля «Рэнесанс» – Гран-пры конкурсу «Złota tarka» на міжнародным фестывалі «Old Jazz Meeting» (Ілава, Польшча, 1998).
**Дыскаграфія:** у складзе ансамбля «Рэнесанс» – МС «Рэнесанс» («Ковчег», 1994), CD «Swing Station» («West Records», 2001); у складзе «WZ-Orkiestra» – гл. 2003–06.
**Кантакт:** dil@belarustoday.info, dilizhans@mail.ru;
+375 (17) 262-50-03, (29) 754-80-53.
06.10.06//Д.П.

**ЛАПЦЁНАК МІКАЛАЙ (Лаптенок Николай, Laptyonok Nikolay)** – бэнд-лідэр, барабаншчык, аранжавальнік, педагог.
Нарадзіўся 05.05.1956 у Мінску. У 1970 скончыў ДМШ №6 па класе баяна С. Кухты, у 1984 – ММВ па класе ўдарных Л. Капілава, у 1992 – МІК па класе ўдарных С. Лапташова. Першыя музычныя вопыты меў у 1972, калі граў у складзе школьнага ВІА на гітары, бас-гітары і ўдарных. У 1974–76 служыў у войску, выступаў як барабаншчык у ВІА «Товарищ» і «Морзянка». У 1977 увайшоў у склад ансамбля «Маэстро диксиленд» (ад 1980 – *«Рэнесанс»*), у якім выступае, з двума невялікімі перапынкамі, да гэтага часу, узначаліўшы яго ў 1989. Сярод найбольш вядомых твораў як аранжавальніка – апрацоўкі п'ес «Them There Eyes»,



Узнагароды: у складзе ВІА «Товарищ» – лаўрэат Усесаюзнага тэлевізійнага конкурсу «Алло, мы ищем таланты» (1975), у складзе ВІА «Морзянка» – Гран-пры Усесаюзнага тэлевізійнага конкурсу «Алло, мы ищем таланты» (1976), у складзе «Рэнесанса» – Гран-пры конкурсу «Old Jazz Meeting. Zlota tarka» (Ілава, Польшча, 1998).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Рэнесанс» («Ковчег», 1994), CD «Swing Station» («West Records», 2001).

**Кантакт:** renaissance@yandex.ru; +375 (29) 639-67-28, (17) 293-67-28; 220071, Беларусь, Мінск, вул. Берасцянская, д.15, кв.35.

07.01.04//Д.П., фота Д.П.

«Stumbling All Around», «Bill Bailey, Won't You Come Home?», «Livery Stable Blues», «The Jazz – Me Blues» і інш. Выкладае па класе ўдарных інструментаў у ДМШ.

**Гастролі:** у складзе «Рэнесанса» – Расея (Куйбышаў, 1980, Калінінград, 1993), Грузія (Горы, 1988), Душанбэ (1989), Люблін, Пулавы (Польшча, 1992), Бон, Кёльн (Нямеччына, 1995), Масква, Яраслаўль (Расея, 1998), Беларусь.

**Фестывалі:** у складзе «Рэнесанса» – «Куйбышев 1980», Мінск (1981, 1984, 1986, 1993, 1997–99, 2001, 2003, 2004, 2006, 2007), «Віцебская восень» і Міжнародны парад дыксілендаў у Віцебску (1980, 1981, 1983, 1985, 1986, 1989, 1991–93), «Славянский базар» (Віцебск, 1998–2000), «Джаз-янтарь» (Калінінград, 1993), «Old Jazz Meeting. Złota tarka» (Ілава, Польшча, 1998), Міжнародны фестываль біг-бэндаў і дыксілендаў (Вільня, Літва, 2002), «Мюльхайм 2002» (Нямеччына).

**«ЛЕПРИКОНСЫ»** – група з Мінску. Утварылася ў 1995.

У сярэдзіне 2007 у групе выступалі: Ілля Міцько – вакал, гітара, Дзмітрый Харытановіч – барабаны (→), Кірыла Канюшык – бас-гітара (адначасова *«Фестиваль»*), Уладзімір Федарук – акардэон (адначасова «Фестиваль»), Радаслаў Сасноўцаў – труба, Яўген Пахомаў – трамбон, Аляксандр Ліпніцкі – барабаны (← чэрвень 2007).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Нам с тобою было супер» («Союз», 1999), «Все ребята перцы» («Союз», 2000), «...ля Тополя» («Союз», 2001), «С запада на восток» (2004), «Без даты» («Vigma», красавік 2007); **трэкі** «Хали-гали, пара трупер» (у зборніках «Сто пудов хитов 6» – «Зажигай Music», 2000, «Звезды из будущего 1» – «Союз», 1999, «Нашествие. Шаг третий» – «REAL Records», 1999, «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000),

«Песенка зайца и Волка на карнавале» (у зборніку «Детский сад. Штаны на лямочках» – «REAL Records», 2002), «Море» (у зборніку «Фільтр-02» – «REAL Records», 2002), «Лена» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000), «Москвич» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000).

**Кіно, відэа: кліпы** «Хали-гали» (2003), «Снегурочка» (рэж. С. Талыбаў, 2004), «Настя» (рэж. С. Талыбаў, 2004), «Москвич», «Девчонки полюбили не меня», «Городок» (рэж. М. Шэлепаў, Кіеў, 2004).

**Кантакт:** www.leprikonsy.com

06.05.07//Д.П..

**«ЛЕТО»** – вакальная група з Мінску. Была ўтворана ў 1999 з ініцыятывы прадзюсэра У. Кубышкіна. У першым складзе выступалі *Ганна Багданава*, бэк-вакалісткі *Аксана Кавалеўская* (→ 2001 *«Краски»*) і Кацярына Бакіноўская. Група трымалася стылю еўрапейскай танцавальнай музыкі. Праз пэўны час на месца бэк-вакалістак прыйшлі танцоры, і, па сутнасці, спыніўшы існаванне ў 2003, група трансфармавалася ў сольны праект Ганны Багданавай.

**Гастролі:** краіны СНД, Нямеччына.

**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск, 1998), тэлефестываль «Песня года» (2000, 2001).

**Дыскаграфія: альбомы** «Краски ушедшего лета» («REAL Records», Расея, 2000), «Горе от ума» («Aist Records», Беларусь, 2003); **трэкі** «Понедельник без тебя» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000, CD зборніках «Сто пудов хитов 6» – «Зажигай Music», 2000; «Айсберг. Второе приближение» – «Iceberg Music», 2000; «Двойной удар» – «Iceberg Music», 2000), «Моя любовь» (у зборніку «Двойной удар» – «Iceberg Music», 2000), «Краски ушедшего лета» (у зборніках «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000; «Айсберг. Третье приближение» – «Iceberg Music», 2000), «Лето – летать» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Весна» (у зборніку «Точка отрыва» – «REAL Records», 2002).

**Кантакт:** aistmusic@tut.by; +375 (29) 635-00-45, +7 (910) 450-08-08.

04.02.04//Д.П.

**«ЛИМОННЫЙ СОК»** – група з Брэсту, якая выконвала арт-рок з элементамі блюза і інструментальную музыку.

Утварылася ў 1985 у наступным складзе: Ігар Прахін – гітара, Сяргей Шэян – бас-гітара, Анатоль Грыцэнка – клавішныя, Уладзімір Балееў – барабаны. У 1986 на месца С. Шэяна прыйшоў Віктар Лазюк, у 1987 група выступала такім складам: І. Прахін, Вячаслаў Брашко – гітара; Аляксандр Брашко – бас-гітара, Юрый Відзібор – барабаны (на месца яго ў 1991 прыйшоў Уладзімір Тэвасян → «Империя»). У 1992 група спыніла існаванне.

**Фестывалі:** выезды ў Польшчу на мясцовыя лакальныя фестывалі (1990–91); Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Наваполацк 1988».

**Кантакт:** +375 (162) 25-83-61 (І. Прахін).

20.02.05//Г.Ш.

**ЛІСІЦКАЯ ТАМАРА (Лисицкая Тамара, Lisitskaya Tamara)** – дыджэй, вядучая радыё- і тэлепраграм, тэлерэжысёр.

Нарадзілася 02.01.1973 у Мінску.
У пачатку 80-х выступала ў складзе хору СШ №123 Мінску, тады ж стала лаўрэатам тэлеконкурсу «Чырвоныя гваздзікі». У 1990 паступіла на факультэт журналістыкі БДУ. На другім годзе навучання перавялася на завочнае аддзяленне, пачала працаваць у часопісе «Пралеска». У 1992 стала паралельна працаваць ды-джэем радыё «Би-Эй», праз год перайшла на тэлевізійны «8 канал», дзе была аўтарам і вядучай праграмы «Фоксі Мьюзік». Годам пазней – аўтар і вядучая праграмы «12, или На ночь глядя» прыватнай тэлекампаніі «Свой круг». У 1995 паехала ў Маскву, працавала ў тэлекампаніі «ВИД» рэжысёрам адкрытага эфіру праграмы «Час Пик». Паралельна супрацоўнічала з тэлекампаніяй «Интер-С» (музычная праграма «Клипса», вядучая і рэжысёр). У 1998 – на тэлеканале «Россия», карэспандэнт праграмы «Доброе утро, Россия» і вядучая праграмы «Толстый и Тонкий». Там жа, у Расеі, агучвала кінафільмы, пісала кнігі пад чужымі прозвішчамі, здымала кліпы для расейскіх эмігрантаў. У 1999 вярнулася ў Мінск, пачала працу на «Альфа-радио» (аўтарская праграма «Извращенцы»).
У 2002 выдала кнігі «Двенадцать» і «3 кита, 7 слоников», пачала працаваць вядучай на 1 канале БТ у праграме «Дневник женщины», там жа ў 2004 вяла праграму «Кстати». Падчас працы ў кампаніі «Свой круг» у якасці рэжысёра здымала музычнае відэа для такіх груп, як *«Лявоны»* («Мілая дзяўчына»), *«Rouble Zone»*,



*«Нейро дюбель»*, «Аусвайс», «Вокзал», «НХЛ», *«Flammable»*, «Beauty By Mistake», *Альберта Скарахода*, *Валіка Грышко*, *«Sarcastic Green»* («I Want Live Tomorrow») і інш.
**Іншая інфармацыя:** шмат гадоў пакутуе над пытаннем, ці не перафарбавацца ў бландзінку.
**Кантакт:** +375 (29) 674-11-74; tamara_lisitskaya@tut.by; toma-lisitskaya.livejournal.com
06.02.05//Д.П.

**«ЛИЦЕЙ»** – мінскі дуэт, які выступаў у стылі тэхна-пап.

Утварыўся ў 1989. У першым складзе выступалі *Павел Булатнікаў* – клавішныя, вакал і Ягор Стражэвіч – клавішныя, вакал. Пазней з дуэтам супрацоўнічаў Юрый Геўрасеў. Дуэт выконваў песні на ангельскай і расейскай мовах, зрабіў шэраг запісаў, рыхтаваў дэбютны альбом, аднак шляхі музыкаў разышліся на пачатку 90-х.
**Фестывалі:** «Звездный дождь» (Рыга, 1990), Санкт-Пецярбург (1989), «Новая версия» (Масква).
**Узнагароды:** лаўрэат фестывалю тэхна- і хіп-хоп музыкі «Новая версия» (Масква, 1991).
**Кантакт:** праз www.lyapis.com
27.02.05//Д.П.



**«ЛОМ» («Лекарство от меланхолии»)** – мінская група.
Утварылася ў канцы 80-х як студэнцкі калектыў, выконваючы цалкам на самадзейных пачатках хард-рокавыя кампазіцыі, у тым ліку і ўласнага аўтарства. Лідэрам групы і аўтарам песень выступаў Яўген Салдаценка. Група спыніла існаванне ў 1991 і адрадзілася толькі ў канцы 2003, з'яўляючыся, па сутнасці, сольным праектам Я. Салдаценкі. Песні выконваюцца на расейскай мове ў стылі баладнага меладычнага софт-року. Працуе група са спецыяльна запрошанымі музыкамі: *Сяргеем Анцішыным* – гітара, Кірылам Шэвандо – барабаны, *Валерыем Башковым* – бас-гітара, *Канстанцінам Гарачым* – клавішныя, *Карэнам Карапецянам* – скрыпка. Найбольш вядомыя песні «Солнце», «Прости-прощай», «Скрипка и осень».
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Прости-прощай!» («West Records», 2004), «Ломтик манго» («West Records», 2007).
**Кіно, відэа: кліпы** «Скрипка и осень» (рэж. А. Бутар, 2004), «Прости-прощай» (рэж. М. Носаў, 2004), «Синее» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2005).
**Кантакт:** www.lomproject.com
03.03.07//Д.П.

**ЛУКАШУК ЗМІЦЕР (Лукашук Дмитрий, Lukashuk Zmicer)** – журналіст, аўтар тэкстаў.
Нарадзіўся 10.12.1969 у Мінску. У 1991 скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Ад 1989 як аўтар тэкстаў і менеджэр пачаў супрацоўніцтва з групай *«Крама»*, якое працягваецца з перапынкам (1999–2004) да гэтага часу. Аўтар тэкстаў такіх песень, як «Будзь разам з намі», «Гэй, там, налівай!», «Хворы на рок-н-рол», «Бяжы, хлопец!», «Гомельскі вальс», «Свабоды мне дай!», «Выпі са мной да дна», «Што дапаможа нам», «Камэндант», «Паходная». Акрамя таго, напісаў тэксты песень для *Касі Камоцкай* («Той, хто стаіць

у мяне за плячыма»), *Зміцера Вайцюшкевіча* («Зоя»), групы *«Indiga»* («Па-за межамі», «Хвалі чорных рэк»).
**Гастролі:** гл. «Крама».
**Фестывалі:** гл. «Крама».
**Дыскаграфія:** гл. «Крама»
**Кантакт:** zlukasuk@yandex.ru
28.07.07//Д.П.

**ЛУКАШЭВІЧ ЮРЫЙ (Лукашевич Юрий, Lukashevitch Youri)** – піяніст, кампазітар, аранжавальнік. Нарадзіўся 28.09.1958 у Полацку. У 1983 скончыў БДК па класе фартэпіяна І. Цвятаевай. У 1985–86 выступаў у складзе ансамбля *«Песняры»*, наступныя два гады з'яўляўся музычным кіраўніком ансамбля *«Тоніка» Віктара Вуячыча*. Ад 1988 да 1993 – піяніст сімфанічнага аркестру Дзяржтэлерадыё БССР, ад 1993 да 1997 – вольны мастак-кампазітар, супрацоўнічаў з шэрагам беларускіх і расейскіх выканаўцаў. У 1997–99 – дырэктар Аб'яднання музычных калектываў Беларускай тэлерадыёкампаніі. Ад лістапада 1999 жыве і працуе ў Швецыі. Быў у складзе сімфанічнага аркестру опернага тэатру. Як піяніст выступаў з сольнымі праграмамі «Толькі Бах» і «Эрал Гарнэр» у прэстыжных рэстарацыях Стакгольму. Найбольш вядомыя творы: як кампазітара – «Окольцованная птица» (сл. М. Траццякова, вык. *Мікалай Скорыкаў*), «Телеграммы» (сл. С. Шынкарэнкі) і «Я по тебе схожу с ума» (сл. А. Дзяменцьева, вык. В. Касенка), «Уезжай» (сл. А. Вавілава, вык. *Юлія Скараход* і В. Касенка), «Абуджэнне» (сл. А. Емельянава, вык. група салістаў, хор і *Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі*, фінальная песня фестывалю «Славянский базар 1992»), гімн Белдзяржуніверсітэту (сл. Ю. Кручонка, вык. *Валерый Дайнэка, Іна Афанасьева*, В. Касенка, *Алена Свірыдава*, К. Арбакайтэ), «Улетай» (сл. Ю. Кручонка, вык. *Ірына Дарафеева*), «Письмо» і «Рука в руке» (сл. Ю. Кручонка, вык. В. Дайнэка), «Странная луна» (сл. Ю. Кручонка, вык. *Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч*). «Джонни Уолкер» (сл. Ю. Кручонка, вык. *Ларыса Грыбалёва*), «Не улетай» (сл. Ю. Светлага, вык. А. Іваноў). Многія песні выдаваліся у альбомах І. Дарафеевай («Рано или поздно»), В. Дайнэкі («Буду помнить»), А. Іванова («Когда вырастут крылья»).
**Кантакт:** ylouka@rambler.ru
13.04.04//Д.П.

**ЛУЧАНОК ІГАР (Лученок Игорь, Luchanok Igar)** – кампазітар. Нарадзіўся 06.08.1938 у Мар'інай Горцы Мінскай вобл. Скончыў БДК па класе кампазіцыі А. Багатырова (1961), асістэнтуру-стажыроўку Ленінградскай кансерваторыі пад кіраўніцтвам В. Салманава (1965), аспірантуру БДК пад кіраўніцтвам Ц. Хрэннікава (1970). Працуе ў жанрах сімфанічнай і камернай музыкі, аўтар шматлікіх папулярных песень, інструментальнай эстраднай музыкі, музыкі для кіно і тэатру. Старшыня праўлення Саюзу кампазітараў Беларусі ад 1980. Сябра журы конкурсаў маладых выканаўцаў на шэрагу фестываляў, сярод іншых – Нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі ў Маладзечне, «Славянский базар», «Золотой шлягер». Сярод найбольш вядомых твораў – паэма-легенда



«Гусляр» для вакальна-інструментальнага ансамблю, песні «Спадчына», «Зачарованая мая», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Вераніка», «Алеся».

**Узнагароды:** лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі (1969), лаўрэат прэміі Усесаюзнага Ленінскага камсамолу (1972), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976).

**Дыскаграфія: альбомы** «Песни Игоря Лученка» («Мелодия», 1978), «Игорь Лученок. Песни и инструментальная музыка» («Мелодия», 1983), «И пока на земле существует любовь» («Мелодия», 1988), МС «Зачарованая мая» (розныя выканаўцы, «Ковчег»), «Спадчына» (розныя выканаўцы, «Ковчег»), «Гусляр» (вык. *«Песняры»*, «Мелодия», 1979, «Ковчег»), «Лучанок Ігар і ансамбль «Сябры» («Ковчег»); **трэкі** «Снимок в газете», «Белы бусел», «Трэба дома бываць часцей», «Рассвет» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Зачарованая мая» – *«Песняры»* («Зачарованая мая» – «Мелодия», 1983), «Красавица-невеста» (у ЕР *«Группа Валентина Бадьярова»* – «Мелодия», 1983), «Кася» (у LP «Всем на планете» – «Мелодия», 1978), «Высокие звёзды» (LP «Ты – одна любовь» – «Мелодия», 1980), «Вот и наша пора», «Жураўлі на Палессе ляцяць» (абедзве ў LP ансамбля *«Сябры»* «Живая вода» – «Мелодия», 1982), «Колыбельная» (у LP ансамбля «Сябры» «Судьбе спасибо» – «Мелодия», 1985), «Ночной оркестр», «Воспоминание», «Миниатюра для трубы» (у LP «Минский эстрадный оркестр» – «Мелодия», 1986), «Ты вспомни все» (сл. *Аркадзя Куляшова*), «Я не магу на вас забыцца» (сл. П. Броўкі), «Пацалунак» (сл. *Уладзіміра Карызны*) – усе ў LP «Чараўніцы» – «Мелодия», 1978), «Письмо из 45-го» (у аднайменным LP – «Мелодия», 1985), «Мы идем по стране» (у LP «Нас подружила Москва» – «Мелодия», 1985), «Морской прибой» (дуэт *Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч*, у LP «Счастливый случай» – «Мелодия», 1990), «Диалог» (у LP «Группа В. Бадьярова-2» «Дискоклуб 14 А» – «Мелодия»,1985, у LP «Парад ансамблей» – «Мелодия», 1985), «Заклинание» (сл. Я. Еўтушэнкі, у LP ансамбля *«Верасы»* «Наша дискотека» – «Мелодия», 1980), «Мой родны кут» (у LP «Сентябрьская мелодия» Н. Панцялеевай – «Мелодия», 1983).

12.03.06//Д.П., фота Я. Мяцеліцы

**ЛЫШЧЫК ВЯЧАСЛАЎ** – гл. Nils.

**ЛЮБАН ІСАК (Любан Исаак, Luban Isaak)** – кампазітар.
Нарадзіўся 23.03.1906 у Чэрыкаве Магілёўскай вобл., памёр 07.11.1975 у Маскве. У 1928 скончыў Беларускі музычны тэхнікум па класе кампазіцыі М. Аладава. Ад 1928 да 1936 – мастацкі кіраўнік музычнага вяшчання Беларускага радыё, у 1937–41 – Ансамбля песні і танца Беларускай філармоніі. Ад 1932 да 1938 – старшыня праўлення Саюзу кампазітараў Беларусі. У 1945 пераехаў на жыхарства ў Маскву. Аўтар песень «Бывайце здаровы», «Не глядзі на другіх», «Толькі з табою», «Не шукай» (усе – на сл. *Адама Русака*), «Дарагая Беларусь» (на сл. П. Броўкі). Аўтар музыкі да спектакляў і кінафільмаў, у тым ліку «Новы дом» (разам з І. Дунаеўскім), «Палеская легенда», «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (разам з *Юрыем Бяльзацкім*).
**Узнагароды:** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946).
**Дыскаграфія: альбом** LP «Песни Исаака Любана» («Мелодия», 1975).
Паводле Белэнцыклапедыі.

**ЛЮБІНСКІ ЎЛАДЗІМІР (Любинский Владимир, Liubinski Vladimir)** – гітарыст, аранжавальнік.
Нарадзіўся 10.03.1963 у Мінску. Дэбютаваў у складзе групы «Лифт». Ад 1986 да 1987 быў музыкам студыі *«Песняры»*, у 1988 перайшоў у групу *«Рада»*. Годам пазней разам з *Аляксеем Шадзько* сабраў групу «Доктор Моро», у якой на пачатку 90-х пэўны час працаваў у Ленінградзе. Пасля распаду групы «Доктор Моро» выступаў у Ленінградзе як сесійны музыка, а таксама як гітарыст блюзавай групы, якая ў 1992 прыняла назву *«Blues Street Friends»*. Пасля вяртання ў Мінск у 1994 рэанімаваў групу пад гэтай жа назвай, у склад якой запрасіў мінскіх выканаўцаў. Падчас выступленняў выкарыстоўвае рэдкую для гітарыстаў тэхніку, граючы зверху грыфу на пакладзенай на калені гітары. Аснова рэпертуару – блюзавыя і рокавыя стандарты, а таксама папулярная музыка.
**Фестывалі:** «Блюз в России» (1992), «Блюз жыве ў Мінску» (1995), «Грифомания» (неаднаразова), «Beatles forever» (Мінск, 2004).
**Кантакт:** www.bluesstreet.narod.ru; liubinski@tut.by; +375 (29) 762-27-00.
21.01.06//Д.П.

**«ЛЮБОВЬ И СПОРТ»** – мінская група.
Выступала ў складзе: Андрэй Вашкевіч – гітара, вакал, музыка, тэксты, Аляксей Кустаў – бас-гітара, Арцём Залескі – барабаны, Дзмітрый Фрыга – клавішныя. Дэбютны альбом запісваўся з удзелам *Валерыя Башкова* – бас-гітара і Ягора Стражэвіча – клавішныя. Група выконвала песні на расейскай і ангельскай мовах, сярод найбольш вядомых – «Без тебя», «Засыпаю рано», «Во сне».
**Дыскаграфія: альбом** CD «Любовь и спорт» («Vigma», 2002); **трэк** «Героев больше нет» (у зборніку «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000).
11.12.06//Д.П.

**ЛЮТЫ ІГАР (Лютый Игорь, Liuty Igor)** – саксафаніст.
Нарадзіўся 26.08.1967 у Крывым Рогу, Украіна. Заняткі музыкай



распачаў як удзельнік духавога аркестру, дзе граў на духавым тэнары, альце і вялікім барабане. Пазней выступаў у складзе дзіцячага джаз-аркестру ДМШ №10 п/к А. Гебеля, вучыўся ў музычных вучэльнях Крывога Рогу і Мінску. Ад 1985 працаваў саксафаністам у аркестры цырку Крывога Рогу. У 1991–98 выступаў у складзе групы, якая акампанавала *дуэту Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч*. У 1998 быў запрошаны ў склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. У кастрычніку 2002 увайшоў у склад джаз-групы *«Apple Tea»*. Актыўна працуе як студыйны музыка, запісваўся і выступаў з *Аляксеем Шадзько* і групай *«Сестра»*, *Валерыем Дайнэкам*, *Інай Афанасьевай*, *Сяргеем Брыксам*, *«Песнярамі»* і інш.

**Гастролі:** гл. «дуэт Я. Паплаўская – А. Ціхановіч», Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, «Apple Tea».

**Фестывалі:** гл. «дуэт Я. Паплаўская – А. Ціхановіч», Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, «Apple Tea».

**Дыскаграфія:** гл. «дуэт Я. Паплаўская – А. Ціхановіч», Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, А. Шадзько, «Apple Tea».

**Кантакт:** www.apple-tea.com; appletea@apple-tea.com

08.11.06//Д.П., фота Д.П..

**«ЛЯВОНЫ»** – мінская група, якая была створана ў 1996 пры БДА «Песняры» ў якасці базавага калектыву для падрыхтоўкі маладых музыкаў да працы на прафесійнай сцэне.

У першым складзе калектыву выступалі Павел Заяц – музыка, вакал, клавішныя, барабаны (← *«Буржуазия»* → 1998 БДА *«Песняры»*), Юрый Задзіран – музыка, гітара (→ канец 1997, *«Ur'ia»*), Алег «Паганіні» Усціновіч – тэксты, бас-гітара (→ 1998 БДА «Песняры»), Юрый Маленькі – барабаны (→ канец 1997), *Сяргей Осіпаў* – аранжаванне, музыка, клавішныя, перкусія, флейта (→ канец 1997). Праз паўгода да калектыву далучыўся Георгій Высоцкі – клавішныя (← «Буржуазия»), у канцы 1997 *Сяргей Мядзведзеў* – аранжаванне, гітара (→ 1998 БДА «Песняры»), Андрэй Юшко – барабаны. Рэпертуар калектыву засноўваўся на народных і аўтарскіх песнях, якія выконваліся пераважна на беларускай мове. Сярод найбольш вядомых твораў «Мілая дзяўчына». Калектыў існуе й цяпер, не яўляючы, аднак, актыўнай дзейнасці. Удзельнічаў у нацыянальным адборачным туры на фестываль «Еўрабачанне 2006». Аснову калектыву складаюць П. Заяц і А. Юшко.

**Дыскаграфія: трэк** «Листья желтые» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000),

**Кіно, відэа: кліп** «Мілая дзяўчына» (рэж. *Тамара Лісіцкая*, 1996).
05.11.06//Д.П.

**ЛЯГЧЫЛАЎ АЛЯКСАНДР (Легчилов Александр, Liakhtchylau Aliaksandr)** – паэт.

Сярод найбольш вядомых твораў цыкл «Ave sole, альбо Слова Скарыны» для ансамбля *«Песняры»* (муз. *Алега Молчана*, 1990).

**Дыскаграфія: альбом** MC «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» («TON-Records», 1999); **трэкі** «Музыка ночы», «Век рок-нрола», «Горе – не беда» (*Ірына Дарафеева*, у альбоме «Рано или поздно» – аўт. выд., 2000), «Чарка на пасашок» (ансамбль «Бяседа», у альбоме «Музычная гасцёўня. Вып. 3. За маладых» – «Ковчег», 1997), «Белы бусел» (у LP зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Жёлтый лист» (муз. *Аляксандра Ціхановіча*, у LP *дуэту Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч* «Счастливый случай» – «Мелодия», 1990).
11.12.06//Д.П.

**«ЛЯПИС ТРУБЕЦКОЙ»** – мінская група, утварылася ў лютым 1990, дэбютаваўшы на фестывалі «Тры колеры» (Мінск).

Першапачатковы склад: *Сяргей Міхалок* – гітара, вакал, Дзмітрый Свірыдовіч – бас-гітара, Аляксей Любавін – барабаны, Руслан Уладыка – гітара. Спачатку рэпертуар засноўваўся выключна на расейскамоўных песнях, аднак, з сярэдзіны 90-х стала з'яўляцца ўсё больш песень на беларускай мове. У 1994 падчас першага туру па Беларусі разам з тэатральнай трупай «Бамбуки» была паказана рок-опера «Покорение космоса». У 1996 склад калектыву ўзмацніўся за кошт *Валерыя Башкова* – бас-гітара (← *«Зартипо»*), Ягора Дрындзіна – труба, *Віталя Драздова* – скрыпка, вакал (→1997), Паўла Кузюковіча – валторна і Аляксандра Ролава – гітара. Канец 1997 – пачатак 1998 – перыяд чарговых змен у складзе: часова вяртаецца В. Башкоў, якога хутка змяняе Дз. Свірыдовіч, на месца другога вакаліста прыходзіць *Павел Булатнікаў* (← дуэт *«Лицей»*). Усяго праз калектыў прайшло каля 30 музыкаў, у тым ліку Алег Ладо, Юрый Задзіран (→ *«Ur'ia»*), *Аляксей Зайцаў*. У 2004 група выступала наступным складам: С. Міхалок, П. Булатнікаў, Руслан «Пан» Уладыка – гітара, Уладзімір «Ёлкін» Эгліціс – бас-гітара, П. Кузюковіч – труба, валторна, Аляксандр Старажук – барабаны, Іван «Вася» Галушка – трамбон, Аляксандр Ляшкевіч – гукааператар. У 2003 на базе калектыву было створана творчае таварыства «Дети Солнца», якое аб'ядноўвае шэраг калектываў, у т.л. *«ТТ-34»*, «Пиво Вдвоем», *«Merry Poppins»*, *«Саша и Сирожа»*.

**Гастролі:** тур па Беларусі ў рамках «Next Stop New Life» (1994), Расея (2006), Украіна, Латвія, тур па Беларусі «Па радзіме» (1998).

**Фестывалі:** фестывалі «Музычных меншасцяў» (Мінск, 1993), «КГ. Сердитый праздник» (Мінск, 1994), «Славянский базар Одесса-Саратов» (1998), «Максидром» (Масква, 2000), «Старый мельник» (Кішынёў, 2004), «Таврийские игры» (Украіна, тройчы), «Чайка» (Украіна), «Хлев культуры» (Вільня, 2004),



«Нашествие» (Казахстан, Эмаўс, 2005, Разань 2006), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2007) і інш.

**Узнагароды:** «Рок-кароны 1996» у намінацыях «Група году», «Альбом году» («Ранетое сердце») і «Лепшы тэкст песні».

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Любови капец» («Клубный стиль»/«Satis», 1995), «Ранетое сердце» («Satis», 1996), МС «Смяротнае вяселле» (1997), CD «Ты кинула» («Союз», 1998), CD «Ляпис дэнс» (зборнік рэміксаў – «Союз», Расея, 1999), «Ляпис дэнс-2» («Союз», 2000), CD «Любови капец» (зборнік архіўных запісаў – «Союз», 1999), «Красота» («Союз», 1999), «Тяжкий» («REAL Records», Расея, 2000), «Всем девчонкам нравится...» (перавыд. альбому «Красота» – «Союз», 2000), «Юность» («Гранд рекордз», 2001), сінгл «Чырвоны кальсоны» («West Records», «Hunter Music», Украіна, «Birds Fabric», Расея, 2003), CD «Золотые яйцы» («West Records», «Lavina Music», Украіна, «Союз», Расея, 2004), «Мужчины не плачут. Песни для кино» («Глория Медиа», «Никитин», Расея, «Moon Records», Украіна, 2006), «Капитал» («Глория Медиа»/«Vigma», «Никитин», Расея, «Астра Рекордс», Украіна, 2007); **трэкі** «За полчаса до весны» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Снежная королева» (у зборніку «Russian Lyric Collection 2» – «Союз», 1999), «Любовь отвернулась ко мне задом» (у зборніку «FUZZbox, vol.10» – Ц. Валееў, 2000), «Государство» (у зборніку «Гражданская оборона. Трибьют» – «Мистерия звука», 2002), «Дождь льет» (у зборніку «Нашествие. Шаг пятый» – «REAL Records», Расея, 2000), «По аллеям» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Спорт прошел» (данс-рэмікс, у зборніку «20 суперхитов, рожденных в Беларуси» –

«Bulba Records», 2000), «Девочка с бездонными глазами» (у зборніку «Девишник» – «REAL Records», 2003), «НЛО» (у зборніку «Дети Солнца. Солнечная музыка» – «Children of The Sun»/«Bulba Records», 2001; данс-рэмікс у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Танцевали до утра» (разам з К. Хламкіным, у зборніку «Дети Солнца. Адис Абеба» – «Children of The Sun»/ «Bulba Records», 2001, «Рок-фронт: бой первый» – «Мистерия звука», Расея, 2003), «Солнце скрылось» (разам з «Netslov», у зборніку «Дети Солнца. Адис Абеба» – «Children of The Sun»/«Bulba Records», 2001), «Вопрос времени» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Красивая» (у зборніку «Антифабрика – Саншайн рэгги №1» – «Союз», 2004), «Почтальоны» (у зборніку «Нашествие. Шаг шестнадцатый» – «REAL Records», 2004), «Рамонкі» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Ау» (рэж. М. Тымінька, А. Церахаў, 1998), «Ты кинула» (рэж. Б. Дзедзянёў, 1998), «В платье белом» (рэж. Б. Дзедзянёў, 1998), «Розочка» (рэж. М. Тымінька, А. Церахаў, 1999), «Яблони» (рэж. І. Пашкевіч, 1999), «Спорт прошёл» (рэж. Я. Мітрафанаў, 2000), «Дружбан» («Дзеці Сонца», 2000), «НЛО» (рэж. М. Сабураў, А. Хацкевіч, 2000), «По аллеям» (рэж. Г. Дэліеў, 2000), «Голуби» (рэж. І. Пашкевіч, 2001), «Сочи» (рэж. Л. Залесскі, 2001), «Некрасавица» (рэж. Я. Карпаў, М. Сабураў, 2001), «Юность» (рэж. І. Пашкевіч, 2002), «Гоп-хип-хоп (КДБ remix)» (рэж. М. Сабураў, А. Хацкевіч, 2002), «Ласточки» (рэж. М. Сабураў, А. Хацкевіч, 2003), «Раинька» (рэж. І. Пашкевіч, 2004), «Золотые яйцы» (рэж. Э. і В. Сідарукі, 2004), «Почтальоны» (рэж. К. Джэксан, Р. Васьянаў 2004), «Андрюша» (рэж. М. Сабураў, 2006), «Саяны» (рэж. І. Пашкевіч, 2006), «Харэ» (рэж. У. Епіфанцаў, 2007), «Капитал» (рэж. А. Церахаў, 2007); фільм «Всем девчонкам нравится...» (Расея, 2000), удзел у фільме «Королева бензоколонки-2» (Украіна, 2004).
**Кантакт:** www.lyapis.com; 6506321@mail.ru, +375 (29) 650-63-21.
11.07.07//Д.П.

**«LEVEE BREAK»** – мінскі калектыў, які ўтварыўся ў лютым 1993 з ініцыятывы вакалісткі *Вольгі Аліпавай*.

Група выконвала як аўтарскія ангельскамоўныя творы, так і класічныя творы заходняй рок-музыкі ў стылі хард-энд-хэві. У канцы 1993 калектыў складаўся з В. Аліпавай, Юрыя Федзюка – бас-гітара (→ *«Крама»*), Андрэя Маркуца – гітара (→ *«Flammable»*, *«НЕО»*, *«Atlantica»*), Святаслава Чарнухі – барабаны (→ «Карлик поп»).
**Фестывалі:** «Рок па вакацыях» (Мінск, 1993), «Рок Айленд шоў» (Мінск, 1993).
26.02.06//Д.П.

**«LITTLE BLUES BAND»** – мінскае рытм-энд-блюзавае трыо, якое ўтварылася з ініцыятывы гітарыста *Івана Маркава* ў 1991.

Першапачатковы склад: І. Маркаў – гітара, аранжаванні, аўтарства музыкі і тэкстаў, Віктар Бахур – бас-

гітара, Аркадзь Дорфман – барабаны. Трыо выконвала на ангельскай мове блюзавыя стандарты і аўтарскія творы лідэра. У 1993 на месца бас-гітарыста прыходзіць *Аляксандр Ванкевіч*, у 1998 месца за барабанамі займае Генадзь Дорфман (← *«Thank You Jesus»*). У розны час у складзе групы выступалі барабаншчыкі Вадзім Чайкоў, *Уладзімір Марусіч*. Ад 1998 група існавала як сольны праект І. Маркава з удзелам спецыяльна запрошаных музыкаў. У 2005 трыо аднавіла канцэртную дзейнасць складам: І. Маркаў, Руслан Праўда – бас-гітара (← *«Крама»*, адначасова *«40+–»*), Андрэй Сапоненка – барабаны (адначасова *«P.L.A.N.»*, *«Flat»*).

**Гастролі:** Расея (1996–98), Нямеччына (1998).

**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (1995, 1998); «Рок-каранацыя» (1996–98).

**Дыскаграфія: альбом** МС «Live In Studio» («Ковчег», 1998); **трэк** «My Friend» (у зборніку «Blues In The Stockland» – 1996).

**Кантакт:** hot-line@list.ru (І. Маркаў).

23.01.06//Д.П.

**«LOGIKA METRO»** – мінская група, якая выступае ў жанры электроннай музыкі, трымаючыся стылю сінты-пап.

Дэбютавала 9 траўня 2001 складам: Сяргей Максімчук – вакал, праграмаванне, сінтэзатары, Андрэй Шылак – сінтэзатары, праграмаванне. Пэўны час з дуэтам супрацоўнічаў Р. Шчэрыца – сінтэзатары. У другой палове 2006 калектыў складаўся з С. Максімчука, А. Шылака, Аляксея Шуцкага – сінтэзатары, праграмаванне, бэк-вакал, Рыгора Круkoўскага – гітара, сінтэзатары, праграмаванне, бэк-вакал.

**Фестывалі:** «Майский гром» (Масква, 2005).

**Дыскаграфія:** дэма «Inheritense For Next Generation» (2001), «Стресс-атака» (2003), «Эра злого вдохновения» (2004); **трэкі** «Without Happyness» (у зборніку «Sampler 2001», Нью-Йорк), «Freestate» (у зборніку «Personal Depeche, ed. 2» – «MSH Records», 2003), «Time to Believe» (у зборніку «SET-1» – «CD Land», 2005), «Вясна красна», «Салдацкая» – рэміксы (у альбоме «Вясна красна» дуэту *«Yar»* – «БМAgroup», 2004).

**Кантакт:** a_logic@mail.ru; +375 (29) 775-15-03, (29) 644-23-70 (С. Максімчук).

21.08.06//Д.П.

# М

**МАГАЛІФ ЯЎГЕН (Магалиф Евгений, Magalif Eugene)** – кампазітар, прадзюсэр.

Нарадзіўся 11.06.1957 у Віцебску. Скончыў тэарэтычнае аддзяленне Віцебскай музычнай вучэльні (1976), вучыўся ў БДК па класе кампазіцыі А. Багатырова, завяршыў у ёй навучанне музыказнаўству па класе Р. Аладавай (1981). Служыў у войску, ад 1983 выкладаў у музычных школах Мінскага раёну, пазней кіраваў канцэртнай брыгадай БДФ. Ад 1987 – кіраўнік сімфанічнага аркестру і салістаў аддзелу музычных калектываў



Беларускага радыё і тэлебачання. Ад 1990 жыве і працуе ў ЗША, выкладае ў школе, кіруе хорам і выступае як арганіст у пратэстанцкай царкве, час ад часу дае канцэрты на фартэпіяна і клавішных. Сябра ASCAP (Амерыканскае таварыства кампазітараў, аўтараў і выдаўцоў). Аўтар мюзіклу «Свінапас», кантаты «Бармалей», музыкі для тэатру і тэлебачання, песень для салістаў-вакалістаў. Дэбютаваў як кампазітар у 1974. У 1988 песня «Играл рояль» на аўтарскі тэкст была запісана Л. Сярэбранікавым і аркестрам п/к А. Петухова ў фонд Усесаюзнага радыё і ТБ. Песні «Больш табе я не пазваню», «Два Полацкі», «На апошняй вярсце», «Толькі ўчора», «Ядлаўцовы лес» і інш. на словы *Генадзя Бураўкіна*, С. Грахоўскага, Н. Арсенневай, С. Сокалава-Воюша, *Адама Глобуса* запісваліся *Леанідам Барткевічам*, *Мікалаем Скорыкавым*, Данчыкам, *Інай Афанасьевай,* Э. Сіпавічусам, часта гучалі ў праграмах БТ «Прэм'ера песні», «Песню бярыце з сабой», «Сустрэнемся пасля 11». У 1989 прадстаўляў Беларусь на фестывалі маладых кампазітараў СССР–ЗША ў Кіславодску, песня «Она была, её уж нет» на словы амерыканскага паэта Дж. Расела Лоўэла ў 1989 заняла 8 месца ва Усесаюзным конкурсе. У 1992 у ЗША прадзюсаваў альбом «Мы яшчэ сустрэнемся» Данчыка, у які ўвайшлі пяць ягоных песень на беларускай мове.

**Дыскаграфія:** інструментальны альбом «10 любімых хрысціянскіх песень» (Sound-Arts Co., 1997), 2CD «Не исчезай. Песни разных лет» (Sound-Arts Co., 2003).
**Хобі:** даследуе ўласны радавод, любіць рыбалку, чытаць, ліставанне, вядзе дзённік, збірае сувенірныя лыжачкі і званочкі.
**Кантакт:** +1 (732) 651-84-72; emcomposer@comcast.net; mojkotik@mail.ru; 47 Pennsbury Way, East Brunswick, NJ 08816-5267 USA.
06.04.03//Д.П.

**«МАДЭРА ХАРД БЛЮЗ»** – мінскі квартэт.
Трымаецца стылю гітарнага тэхаскага блюзу, засноўваючы рэпертуар на расейскамоўных творах аўтарства Ю. Міхайлава, а таксама кавер-версіях класічных блюзавых твораў. Група была створана ў Мінску з ініцыятывы гітарыста, аўтара музыкі і тэкстаў *Юрыя Міхайлава* ў 2000. Першапачатковы склад: Юрый Міхайлаў – лідэр, гітара, вакал, Сяргей Агарак – вакал, гармоніка, гітара, Віталь Самахвалаў – барабаны, Вячаслаў Фёдараў – бас-гітара. Ад 2002 у складзе групы працуе бас-гітарыст Андрэй Дастанка. Ад жніўня 2007 вядучым вакалістам групы з'яўляецца Георгій Высоцкі (← *«Лявоны»*, *«Буржуазия»*). Група актыўна выступае ў мінскіх клубах, дае сольныя канцэрты. Найбольш вядомыя песні «Свобода», «Белый пароход», «Бред», «Напишу блюз».
**Гастролі:** канцэрты ў Расеі, клубах Масквы (2004).
**Фестывалі:** «Калининград In Rock» (Расея, 2000), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2005), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Китайская невеста» («Vigma», 2002), «Amina» (аўт. выд., 2004).
**Кіно, відэа: кліпы** «Свобода» (рэж. М. Субоцін, 2002), «Харли Дэвидсон» (рэж. А. Буйніцкі, 2004).
**Кантакт:** www.maderahardblues.com; group@maderahardblues.com
21.09.07//Д.П., фота Д.П.



**МАЙСУРАДЗЭ ТАРЫЭЛ (Майсурадзе Тариел, Majsuradze Tariel)** – спявак, выканаўца класічнага папулярнага рэпертуару, аўтар музыкі, аранжавальнік, актор, педагог. Нарадзіўся 24.07.1970 у г. Гудаўта Абхазскай АССР, Грузія. У 1996 скончыў БДУК па спецыяльнасьці культурна-асветная работа і арганізацыя народнай творчасці, кіраўнік эстраднага ансамбля. У 1991–94 – саліст ленінградскай групы «Дальний рейс», ад 1994 да 1998 – саліст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. У 1995–99 – выкладчык эстраднага аддзялення Інстытуту сучасных ведаў па класе «Сучасныя прыкладныя камп'ютэрныя праграмы ў шоў-бізнэсе». У 1999–2000 – музычны рэдактар радыё «Би-Эй», пазней цягам году працаваў намеснікам дырэктара па вяшчанні радыё «Стиль». У 2001–04 – саліст аркестру МУС Беларусі. У 2004–06 – вядучы тэлепраграмы «Планета развлечений» (канал «СТВ», Мінск). Спявае на расейскай, беларускай, грузінскай, ангельскай мовах. Сярод найбольш вядомых песень «Это всё любовь моя», «Я без тебя – не я», «По следам».

**Фестывалі:** «Euroecomeeting» (Злотув, Польшча, 1995), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (1996), «Славянский базар» (1993).

**Гастролі:** у складзе *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі* – Італія (1996); у складзе аркестру МУС – Іспанія, Нямеччына (2003–04).

**Узнагароды:** Гран-пры фестывалю «Euroecomeeting» (Злотув, Польшча, 1995), лаўрэат нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі «Маладзечна» (1996).



**Дыскаграфія: альбомы** «Это всё любовь моя» («Проспект», 2006); **трэкі** «Мерцхало» (у зборніку «Первый Интернационал» – «Vigma», 2006, у зборніку «Кама-Сутра», «Vigma», 2006), «Это всё любовь моя» (у зборніку «Музыка здесь» – «Союз», Расея, 2000), «По следам» (у зборніку «Песня года Беларуси – 2005» – «Проспект», 2005), «Чужая роль» (дуэт з *Гюнэш Абасавай*, у альбоме «Дочь Востока» – «Проспект», 2006), «Песня гениального сыщика» (у зборніку «Песни из мультфильмов» – «Vigma», 2006).

**Кіно, відэа:** ролі другога плану ў мастацкіх фільмах «Супермаркет» (рэж. П. Снісарэнка, 2006), «Стикс» (рэж. Д. Канстанцінаў, 2006), «Пантера» (рэж. М. Шаўчук, 2006), удзел у мастацкіх фільмах «Призвание» (2004), «Глубокое течение» (2005), «Вокзал» (2003), «Отель исполнения желаний» (2003), «Ускоренная помощь» (2000); **кліп** «С высоких гор

спускается туман» (рэж. *Уладзімір Янкоўскі*, 1999).
**Кантакт:** +375 (29) 676-86-31, (29) 699-14-14; tarielm@list.ru
18.03.07//Д.П.

**МАКАРАЎ РУСЛАН (Макаров Руслан, Makarov Ruslan)** – прадзюсэр, менеджэр.
Нарадзіўся 10.05.1968 у Мінску. У 1991 скончыў Дыпламатычную акадэмію СССР па спецыяльнасці знешнеэканамічныя адносіны і замежныя біржы, у 1992 – тэатральную вучэльню імя Шчукіна ў Маскве па спецыяльнасці актор тэатру і кіно, у 1999 – Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт па спецыяльнасці філасофія. У галіне папулярнай музыкі пачаў працаваць у 1994, калі арганізаваў у мінскім Палацы спорту канцэрт груп «Алиса», «Ва банк» і «Чайф». У гэтым жа годзе пачаў прадзюсаваць групу *«Rouble Zone»*, выступіў як прадзюсэр яе альбому. У 2000 працаваў прадзюсэрам пацяшальнага комплексу «Alkatraz» у Мінску, у 2001 заснаваў выдавецкую фірму «MSH Records». У 2003 як прадзюсэр здзейсніў праект «Руны» з удзелам групы *«Этна-трыо «Тройца»*. Ад 1997 – сябра Саюзу дызайнераў Беларусі, ад 2004 – аўтар і кіраўнік мультымедыйнай культура-краязнаўчай анталогіі «Вся Россия», ад 2006 – прэзідэнт Міжнароднай гільдыі прадзюсэраў, прамотараў і гуказапісвальных кампаній (Масква).
**Узнагароды:** як прадзюсэр – «Рок-карона 1996» у намінацыі «Альбом году» («Put Your Money… Now!» групы «Rouble Zone»).
**Дыскаграфія:** у якасці прадзюсэра «Rouble Zone» – «Put Your Money… Now!» («Dar Veter Records», 1996), розныя выканаўцы – «Personal Depeche. Belorusian DM Tribute» («MSH Records», 2003), «ПИПЛ про/to PURPLE. Российское (Российско-белорусское) посвящение «Deep Purple» («MSH Records», 2006), група «Чехов» – «… все что движется» («MSH Records», 2006).
**Іншая інфармацыя:** уладальнік 9 прэмій на міжнародных конкурсах дызайнераў (афармленне вокладак CD).
**Кантакт:** veter@minsk2000.to
13.01.07//Д.П.

**МАКСІМКАЎ УЛАДЗІМІР (Максимков Владимир, Maksimkau Uladzimir)** – рэжысёр тэлебачання, менеджэр, прадзюсэр.
Нарадзіўся 15.05.1964 у Патсдаме, Нямеччына. У 1986 скончыў БДУ па спецыяльнасці радыёфізіка і электроніка. Працаваў у АН Беларусі, на тэлебачанне прыйшоў у 1994, дзе да 2005 працаваў рэжысёрам, генеральным дырэктарам вяшчання, генеральным прадзюсэрам. Ад 2005 – прадзюсэр тэлекампаніі «Карамболь», музычны прадзюсэр выдавецкай кампаніі «Vigma». У 2006 утварыў «Музыкальное агентство Владимира Максимкова». У якасці рэжысёра працаваў над праграмамі «Не спи и смотри», «Не забудьте включить телевизор» (РТР), «Утренняя почта» (ОРТ). У якасці рэжысёра і прадзюсэра ажыццявіў такія тэлепраекты, як «Все нормально, мама!», «Падарожжа дылетанта». Быў рэжысёрам-кансультантам і адным з аўтараў каманды КВЗ БДУ, рэжысёрам-пастаноўшчыкам гульняў Еўралігі КВЗ у Мінску. У рознай

ступені кансультаваў такіх выканаўцаў, як *Аляксей і Андрэй Хлястовы*, *Сяргей Кавалёў*, Ілля Міцько (*«Леприконсы»*), *Карыяна*, дуэт *«Аляксандра і Канстанцін»*, *Паліна Смолава*, *Гюнэш Абасава*, *Наталля Тамела*, групы *«Лявоны»*, *«Спасение»*. У 2006 «Музыкальное агентство Владимира Максимкова» сумесна з каналам «Муз-ТВ» (Беларусь) і газетай «Аргументы и факты в Беларуси» прадстаўляла Нацыянальную тэлевізійную прэмію ў галіне папулярнай музыкі. Аўтар і рэжысёр многіх відэакліпаў для выканаўцаў папулярнай музыкі краіны.

**Кіно, відэа:** у якасці рэжысёра – «Время прощаться» (Г. Абасава, 2005), «На восток» (Менуа, 2006), «Шоссе в никуда» (Натана, 2005), «Страницы» (Натана, 2006), «Магнитные волны» (В. Пшанічны, 2005), «Не сошлись» (П. Смолава, 2005), «Погоди» (*Валерый Дайнэка*), «Где ты» (Аляксей і Андрэй Хлястовы), «Прощай, Земля» (*«Zемля королевы мод»*, 2006), «Журавли» (А. Сямёнаў, 2006), «Синьорина» (*Кірыла Слука*), «Короткие каникулы» (Саша Белая, 2005); у якасці аператара – «I'm 18» (Карыяна, рэж. *Анатоль Вечар*, 2002), «Герой бесконечности» («Zемля королевы мод», рэж. Б. Швайбовіч, 2006); у якасці рэжысёра і аператара – «Дождись» (Н. Тамела, 2004), «Прости» (Н. Тамела, 2006), «Дождь» (П. Смолава, 2005), «Forever» (Карыяна, 2002), «Мой Галилей» («Аляксандра і Канстанцін», разам з М. Носавым, 2004).

**Кантакт:** maksimkov_v@mail.ru; +375 (29) 636-11-18.

05.11.06//A.P.

**«МАЛО МЕСТА»** – група, якая ўтварылася ў Гомелі ў траўні 2000 дзеля выканання акустычнай версіі рок-музыкі з элементамі музыкі рэгей.

Першапачаткова выступала як трыо складам Цімафей Яжоў – вакал, гітара, Люся Дземідзенка – скрыпка, Дзмітрый «Уры» Гешын – барабаны. У 2005 музыкі пераехалі ў Мінск, выступаючы складам: Ц. Яжоў, Л. Дземідзенка, Д. Гешын (→ канец 2005), Арцём Губанаў – перкусія, Юм – кантрабас. Рэпертуар заснаваны на расейскамоўных песнях пераважна аўтарства Ц. Яжова. Сярод найбольш вядомых песень «Если придет весна», «Цепные собаки», «Осень», «Чисто и светло».

**Фестывалі:** Першы беларускі рэгей-фестываль (Мінск), «Арт-сессия» (Гомель), «Свежий ветер» (Мінск, 2005), «Ліепайя» (Латвія, 2005).

**Дыскаграфія:** дэма «Учиться дышать» (2002).

12.02.06//N.N.

**МАЛЧАНАЎ ВІКТАР (Молчанов «Малыш» Виктор, Malchanau Viktar)** – гітарыст, аранжавальнік, гукарэжысёр, аўтар музыкі.

Нарадзіўся 05.05.1954 у г. Буй Кастрамской вобл., Расея. У канцы 60-х – пачатку 70-х вучыўся ў Гродзенскай музвучэльні па класах духавых, ударных. Творчы шлях распачаў як артыст БДФ у 1975, працаваў у ансамблі *«Орбита-67»* п/к *Ізмаіла Капланава*, *«Тоніка»* п/к *Аркадзя Эскіна*, «Лосвіда» п/к *Аляксандра Бурштэйна*, «Планета» п/к А. Архіпава. У 1983–87 – музыка аркестру Мінскага цырку. Ад 1991 да 1993 у складзе групы «Round midnight»

працаваў у клубах і на дыскатэках у Славеніі, Харватыі, Аўстрыі.
У 1993–94 – гітарыст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Супрацоўнічаў з джаз-квартэтам п/к А. Эскіна. У 1994–97 – удзельнік ансамбля *«Песняры»*. У 1997 выехаў у ЗША, дзе ў Атланце выступаў у складзе групы «Weekend» п/к *Барыса Бернштэйна*. У 2001 вярнуўся ў Беларусь, працаваў як сесійны музыка, выступаў у дуэце з *Уладзімірам Ткачэнкам*, у складзе праектаў «Виктор и Виктория», «Цмок і Малыш», супрацоўнічаў з духавым аркестрам «Няміга», дуэтам *«Аляксандра і Канстанцін»*, групамі *«Flat»*, *«Боржоми»*. Ад 2005 супрацоўнічае з ансамблем *«Песняры» п/к І. Свечкіна*. Апрача акустычнай і электрагітары, выкарыстоўвае й педал стыл гітару. Найбольш вядомыя творы як кампазітара «Баба Лена» (разам з *Ігарам Варашкевічам*), «Я інакш не магу» (разам з Аляксандрай Кірсанавай).
**Гастролі:** гл. па гадах «Тоніка», «Песняры»; Дні беларускай культуры ў Нямеччыне.
**Фестывалі:** гл. «Песняры»; два Усесаюзныя конкурсы артыстаў эстрады, конкурс песень краін сацыялістычнай садружнасці (Ялта).
**Узнагароды:** дыпламант Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (Ленінград, 1979, у складзе ансамбля «Лосвіда»).
**Дыскаграфія:** «Ткаченко и Молчанов играют «Beatles» (Санкт-Пецярбург, 2006, не для продажу).
**Кантакт:** vikmol@bk.ru; +375 (29) 308-58-73.

14.10.06//Д.П.

**«МАНТАНА»** – гурт з Мінску, які ў музыцы трымаўся стылю пап-року, з перавагай у бок папулярнай музыкі.

Гурт утварыўся ў 1998 годзе вакол сясцёр Берулава: Алесі (вакал, аўтар музыкі і тэкстаў) і Марыны (вакал). Іншыя ўдзельнікі: Раман Арлоў – гітара (адначасова *«J:морс»*), *Дзяніс Варанцоў* – клавішныя (*«J:морс»*), Алег «Паганіні» Усціновіч – бас-гітара (← *«Ляпис Трубецкой»*, *«Лявоны»*, *БДА «Песняры»* → *«Песняры» п/к Л. Барткевіча*), Андрэй «Чарлі» Сівец – барабаны (пазней *«Ur'ia»*, *«WZ-Orkiestra»*). Даволі хутка склад змяніўся: на месца Р. Арлова прыйшоў Павел Трацяк (пазней *«Тайланд»*). У 2000 «Мантана» падпісала кантракт з расейскай гуказапісвальнай кампаніяй «Саюз». У 2001 на месца А. Сіўца прыйшоў Ігар Маскаленка (← *«Торнадо», БДА «Песняры», «Крама», Ігар Загумёнаў*). У 2005 сёстры Берулава склалі пап-групу *«Merry Poppins»*.
**Гастролі, фестывалі:** Беларусь (2001–02).
**Дыскаграфія: альбомы** CD сінгл «Потому что» («Союз», Расея, 2001), «Маникюры» («Союз», Расея, 2001); **трэкі** «Холодок» (у зборніку «Бульбахіт 2000» – «Bulba Records», 2000), «Потому что» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000).
**Кіно, відэа: кліп** «Маникюры» (рэж. Л. Залесскі, 2001).

06.08.07//Д.П.

**МАРГОЛІН ВАДЗІМ (Марголин Вадим, Margolin Vadzim)** – гітарыст, аранжавальнік.

Скончыў музычную школу па класе балалайкі, другі інструмент – гітара.

Дэбютаваў у 1993 у складзе школьнага калектыву «Вершина». Летам 1996 быў запрошаны ў фолк-рок групу *«Postscriptum»*, у якой выступаў да 2002. Заснаваў сольны праект «Моно», на аснове якога паўстала група «Мачо не плачут». Некаторы час выступаў у складзе групы *«Нейро дюбель»*, як сесійны музыка супрацоўнічаў з групай *«Vicious Crusade»*. У канцы 2004 пачаў супрацоўніцтва з групай *«Клёндайк»*, у 2007 з'ехаў за мяжу.

19.07.07//Д.П.

**МАРКАЎ ІВАН (Марков Иван, Markov Ivan)** – гітарыст, аранжавальнік, аўтар музыкі і тэкстаў.

Нарадзіўся 30.04.1962 у Мінску. Займацца музыкай пачаў ва ўзросце 13 гадоў. Ад 1974 да 1980 вучыўся ў РШІМВМ імя Ахрэмчыка на аддзяленні скульптуры ў Л. Давыдзенкі. У 1986 скончыў БДТМІ, аддзяленне скульптуры. У 1980 увайшоў у склад групы *«Studio-7»*. Пасля яе распаду ў 1984 пачаў выступаць як гітарыст групы *«Бонда»*. У 1991 сабраў групу *«Little Blues Band»*. У 1998 распачаў сольную кар'еру, выступаючы як блюз-рокавы гітарыст з выкарыстаннем фанаграмы «–1», час ад часу дае канцэрты ў трыо пад назвай «Little Blues Band». Выконвае песні на ангельскай мове, у тым ліку аўтарскія. Адна з найбольш вядомых аўтарскіх песень «My Friend».

**Гастролі:** у складзе «Бонды» – Польшча (1989); у складзе «Little Blues Band» – Расея (1996–98), Нямеччына (1998).

**Фестывалі:** у складзе «Studio-7» – Рэспубліканскі агляд-конкурс ВІА (1982); у складзе «Бонды» – «Lithuanika» (Літва, 1986); у складзе «Little Blues Band» – «Блюз жыве ў Мінску» (1995, 1998), «Рок-каранацыя» (1996–98).

**Узнагароды:** у складзе «Studio-7» – лаўрэат 1 прэміі Рэспубліканскага агляду-конкурсу ВІА (1982); уладальнік спецпрызу «За вялікі ўнёсак у развіццё беларускага рок-н-ролу» на цырымоніі «Рок-каранацыя 1996».

**Дыскаграфія: альбомы** – у складзе «Little Blues Band» МС «Live In Studio» («Ковчег», 1998); у складзе «Бонды» – гл.; **трэкі** – у складзе «Бонды» «Твая Атлантыда», «На станцыі Койданава» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990); у складзе «Little Blues Band» «My Friend» (у зборніку «Blues In The Stockland» – 1996).

**Кіно, відэа: кліпы** ў складзе «Бонды» «Ура!» (рэж. Г. Нікалаеў, 1988), «На станцыі Койданава» (рэж. Г. Нікалаеў, 1989).

**Іншая інфармацыя:** займаецца спортам (веласіпед).

**Кантакт:** hot-line@list.ru

23.01.06//Д.П.

**МАРКЕВІЧ ГЕНАДЗЬ (Маркевич Геннадий, Markevich Genadz)** – кампазітар, аранжавальнік, гукарэжысёр, прадзюсэр.

Нарадзіўся 06.11.1966 у Наваградку Гродзенскай вобл. У 2001 скончыў БДУК па класе харавога дырыжавання. Творчы шлях распачаў у 1987 як вакаліст і гітарыст студыі «Красные звезды». Ад 1991 да 1994 працаваў у Мінску як гукарэжысёр і сесійны музыка. У 1994–96 – гітарыст групы «Ражство». Пазней два гады працаваў як кампазітар,

аранжавальнік і гукарэжысёр у тэатры «ТИМ», ад 1998 да 2001 – гукарэжысёр Беларускага тэлебачання. Пасля пачаў працу як кампазітар і аранжавальнік з *Аляксеем Хлястовым*, Т. Арлоўскай, А. Гайдук, *Валерыем Дайнэкам*, С. Мінскім, *Владай*, дуэтам «Овация», *Інай Афанасьевай*, *Русланам Аляхно*, *Вольгай Плотнікавай*, А. Грышанавай і інш. Ад 2002 – кіраўнік студыі «Красные звёзды», ад 2003 – прадзюсэр В. Плотнікавай. Найбольш вядомыя песні «Я схожу по тебе с ума» (вык. В. Дайнэка), «Звёзды», «Жемчуга» (вык. І. Афанасьева), «Без тебя» (вык. дуэт «Овация»), «Звёздный дождь», «Чужая» (вык. Р. Аляхно), «Они», «Где-то», «Падает снег», «Знали» (вык. В. Плотнікава).

**Гастролі:** канцэрты і выступленні ў Беларусі, ГДР, Нямеччыне, Польшчы, Расеі.

**Дыскаграфія:** шэраг песень пададзены у многіх спеўных зборніках, выдадзеных у Беларусі.

**Кантакт:** www.plotnikova.com; markevich@plotnikova.com; +375 (29) 629-91-15.

14.10.06//А.Р.

**МАРТЫНЕНКА ВІТАЎТ (Мартыненко Витовт, Martynenka Vitaut)** – журналіст, аўтар тэкстаў.

Нарадзіўся 29.09.1959 у Мінску. У 1982 скончыў журфак БДУ, у 1982–94 рэдагаваў музычную рубрыку «Нотны аркуш» у газеце «Чырвоная змена», ад 1982 да 1997 – музычны каментатар радыё «Свабода», у 1989–99 – намеснік рэдактара газеты «Кинонеделя Минска», у 1994–2006 – музычны кансультант лейблу «БМAgroup». Аўтар тэкстаў для груп *«Тэзаўрус»*, *«P.L.A.N.»*, *«Deadmarsh»*. Удзельнік арганізацыі фэстаў «Тры колеры» (1986), «Басовішча» (1990).

**Кнігі:** «Праз рок-прызму» (у суаўтарстве з *Анатолем Мяльгуем*, Нью-Йорк, «БІНІМ», 1989), «222 альбомы беларускага року і ня толькі» (у суаўтарстве з А. Мяльгуем, «Медысонт», 2006), рэдакцыя тэксту рамана Сянкевіча «Quo Vadis…» («Медысонт», 2002), аповесці і апавяданні ў розных калектыўных зборніках, часопісах.

**Кантакт:** +375 (17) 243-59-27; w1979@tut.by

15.12.06//Д.П.

**МАРУСІЧ УЛАДЗІМІР (Марусич Владимир, Marusich Vladimir)** – барабаншчык.

Нарадзіўся 09.09.1957 у Мінску. У 1977 скончыў ММВ па класе ўдарных Л. Капілава. Як музыка дэбютаваў у складзе мінскай групы *«Эльфы»* (1974–77), ад 1980 да 1987 працаваў музыкам Сочынскага АМА, выступаючы ў складзе рэстарацыйных калектываў. Там жа супрацоўнічаў



з калінінградскім калектывам А. Газманава. У 1987 вярнуўся ў Мінск і тры гады выступаў як музыка ансамбля ў рэстарацыі «Журавінка». Ад 1990 да 1993 – удзельнік групы *«Инспектор»*. Ад 1993 да 1998 – музыка ансамбля *«Песняры»*, ад 1998 – удзельнік *«Белорусских Песняров»*. На пачатку 2004 пакінуў калектыў і пачаў працу ў складзе аднаго з рэстарацыйных ансамбляў Мінску. Летам 2005 заснаваў уласную групу «Prior-band», выступае як сесійны музыка, супрацоўнічае ў тым ліку й з *«Песнярамі» п/к І. Свечкіна*.
**Гастролі:** гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры».
**Фестывалі:** міжнародны фестываль «Дзецям Чарнобылю: Мінск-Ліверпуль» (Мінск, 1991), «World Unity» (ЗША, 1994).
**Дыскаграфія:** у складзе «Инспектора» «Russian Prayer» («Ariola-BMG», Нямеччына, 1993); у складзе «Песняроў» – гл. 1994; у складзе «Белорусских Песняров» – гл. 1999–2003.
**Кантакт:** www.prbd.narod.ru; marusich@mail.ru; +375 (29) 616-61-96, (17) 216-61-96.
06.05.07//Д.П., фота Д.П.

**МАРЦІНОВІЧ АНАТОЛЬ (Мартинович Анатолий, Martsinovich Anatoli)** – піяніст, прадзюсэр.
Нарадзіўся 09.09.1960 у Мазыры. У 1980 скончыў Мазырскую музычную вучэльню па класе кантрабаса, у 1982 – Беламорскую марскую вучэльню. Ад 1983 да 1995 выступаў як выканаўца на клавішных інструментах у складзе мазырскай групы *«Отражение»*. У 1997–2001 – прадзюсэр і суўладальнік кампаніі «ПанРекордз» (супрацоўніцтва з групамі *«Нейро дюбель»*, *«Леприконсы»*), ад 2002 – прадзюсэр кампаніі «АТ Паблишинг» (супрацоўніцтва з групамі «Лаки», «Механика», «Сваякі»). У складзе групы «Отражение» вызначыўся як аўтар музыкі песні «Кто вы?» (сл. У. Калеснікава).
**Гастролі:** у складзе групы «Отражение» – Польшча (1987).
**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі ў Наваполацку (1987), рок-фестываль у Чэшска-Будзеёвіцах (Чэхаславакія, 1987).
**Узнагароды:** у складзе групы «Отражение» – першая прэмія на Рэспубліканскім фестывалі моладзевай музыкі ў Наваполацку (1987), першая прэмія на рок-фестывалі ў Чэшска-Будзеёвіцах (Чэхаславакія, 1987).
**Дыскаграфія:** у складзе групы «Отражение» – гл. 1984–2001; **трэкі** «Come Back To Me», «I'm Crazy Now», «Terri» (у зборніку «Western Dreams» – «RTX Records», 1993).
**Кантакт:** martinovich@rambler.ru; +375 (29) 688-20-46.
11.06.07//Д.П.

**МАТЛІН АНДРЭЙ (Матлин Андрей, Matlin Andrej)** – тэнар-саксафаніст.
Нарадзіўся 15.02.1967 у Брэсце. У 1985 скончыў эстраднае аддзяленне ММВ па класе саксафона, пасля чаго быў запрошаны ў аркестр Мінскага дзяржаўнага цырку. Служыў у войску музыкам аркестру (1985–87), у 1987 увайшоў у склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі.* Адначасова выступаў як саксафаніст у многіх джаз-групах, у тым ліку ў *«Apple Tea»* і *«Пятый угол»*.



У складзе Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі запісаў шэраг праграм на 5 канале Італьянскага тэлебачання ў Мілане. У 1995 выехаў на пастаяннае жыхарства ў ЗША, Мемфіс, дзе працуе з такімі выканаўцамі блюзу і рытм-энд-блюзу, як Эн Піблс, Джойс Коб. У складзе аркестру Бобі «Блю» Блэнда ўдзельнічаў у сумесным канцэрце з Бі Бі Кінгам. Пастаянны ўдзельнік «Memphis Jazz Orchestra», «The Jazz Orchestra of The Delta».
**Фестывалі:** «Осенние ритмы 1984» (Ленінград, у складзе біг-бэнду ММВ), «Zielona Góra» (Польшча, 1989), джаз-фестываль (Югаславія, 1991), Маскоўскі фестываль біг-бэндаў (1993), «Славянский базар» (Віцебск), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна», у складзе Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі – джаз-фестывалі ў Мінску, «Boby Vasara» (Пасваліс, Літва, 1992), у складзе групы «Пятый угол» – «Віцебская восень 1994», у складзе «Apple Tea» – «Birstonas 1994».
**Гастролі:** у складзе джаз-групы «Transsibiria Express» – Нямеччына (1992), «Ann Peebles World Tour» (1997), у складзе «Bobby «Blue» Band» – «Austin City Limits Show in The US» (1999).
**Дыскаграфія:** у складзе «Apple Tea» – гл. 1996–2006; сольны «Reflections of Cole Porter» (2003).
**Кіно, відэа:** у складзе «Apple Tea» – VC «Angry Girls» («CDL Music», 1998).
**Кантакт:** +1 (901) 759-79-35, (901) 351-96-88 (маб.); andrey.matlin@stjude.org; 8164 Oak Moss Cove, Cordova, TN 38018 USA.

21.11.06//Д.П., фота Ж. Маёравай

**«МЕНЕСТРЕЛИ»** – група з Мінску, якая ўтварылася ў 1967 дзеля выканання стандартаў рытм-энд-блюзу пераважна ва ўласных аранжаваннях, а таксама ўласных твораў. Базавалася пры клубе заводу зборнага жалезабетону ДБК-1 і пачаткова складалася з Эдуарда Фрыдлянда – гітара-сола, Сяргея Шульгі – вакал, *Валянціна Пучынскага* – бас-гітара. Пазней у групу прыйшлі *Валерый Дайнэка* – вакал, Барыс Косціч – рытм-гітара, Валерый Рондэль – гітара, Яўген Грэцкі – барабаны, *Барыс Бернштэйн* – бас-гітара, клавішныя. Неўзабаве месцам прапіскі калектыву стаў Дом архітэктара. Група выступала пераважна на вяселлях, грала на танцах, святочных вечарынах. Недзе ў 1970 спыніла існаванне.

03.04.06//Д.П.

**«МЕТЕОР»** – мінская група з ліку студэнтаў БДІНГ, якая дэбютавала 29.12.1992 дзеля выканання музыкі рокабілі, рок-н-ролу, твісту і падобных стыляў.

Першапачаткова выступала пад назвай «ХБДБ, или 60 лет монгольской милиции» наступным складам: Дзяніс Архіпаў – кантрабас, Вячаслаў «Чрэватых» Батурыцкі – гітара, Барыс Стругальскі – акардэон, Юрый Лапацін – барабаны, ад 1994 да 1999 ударныя, Аляксандр Кажухоўскі – барабаны (→ 1994), Павел Шчарбакоў – гітара (→ 1995). У 1994–96 у групе выступала Ганна Аладава – клавішныя. На пачатку 2007 група складалася з Дз. Архіпава, В. Батурыцкага, Паўла Троцкага – барабаны, Яраслава Гардзіенкі – акардэон, Уладзіслава Няжурына – саксафон (← 1998). Песні, у тым ліку й аўтарскія, выконваюцца на расейскай і ангельскай мовах.

***Фестывалі:*** «Хахлабуль» (2002), «Блюз жыве ў Мінску» (2002), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2007).

**Дыскаграфія: трэкі** «Red Rockin' Guitar» (у МС зборніку «FM перехват-1» – «TON-Records», 1996), «Пельмени» (у зборніку «Спидола 1», Расея, 2006), «Микки Маус» (у CD зборніку «Дети Солнца. Адис Абеба» – «Children of The Sun»/ «Bulba Records», 2001, у MP3 зборніку «Russian Roots Reggae», Расея, 2005); удзел у запісе альбому «СкаТЫ!» дуэту *«Саша и Сирожа»* («Go Records», 2005).

**Кантакт:** supermegavaldis@mail.ru

11.06.07//Д.П.

**«МЕТРО»** – мінская група. Утварылася ў 1983, выступала ў стылі папулярнага року, выконваючы аўтарскія песні пераважна на расейскай мове.

У складзе калектыву выступалі Вячаслаў Сцяпанаў – вакал, гітара, клавішныя, аўтар музыкі і тэкстаў, *Сяргей Брыкса* – барабаны, вакал (→ *«Верасы»*, 1986), *Уладзімір Любінскі* – гітара (→ *«Рада»*, 1989), *Сяргей Краўчанка* – бас-гітара (→ *«Studio-7»*, *«Бонда»*), *Дзмітрый Смольскі* – вакал (→ *«Рада»*, 1989). Група спыніла існаванне ў канцы 80-х.

**Дыскаграфія:** МС «Весенний балаган» (1987).

25.09.05//Д.П.

**МІКУЛІЧ НАДЗЕЯ (Микулич Надежда, Mikulich Nadzeya)** – спявачка, аўтар музыкі, выканаўца на гітары, гармоніку.

Нарадзілася 14.01.1953 у пасёлку Цукровы завод Гродзенскай вобл. Творчую кар'еру пачала як бас-гітарыстка ВІА *«Чараўніцы»* ў 1971. У 1972 скончыла Гродзенскую музычную вучэльню па класе акардэона, у гэтым жа годзе была запрошана як вакалістка, выканаўца на банджа, бас-гітары і гітары ў склад ансамбля *«Верасы»*, у якім адпрацавала да 1980. Тады ж пачала сольную кар'еру, некаторы час выступала разам з групай *«Сузор'е»*. Удзельнік Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1983). Ад 1984 да 1990 – артыстка-вакалістка эстрады БДФ, адначасова да 1993 супрацоўнічала з ансамблем сучаснага балету Л. і А. Яфрэмавых. Ад 1990 да 1993 – салістка «Минскконцерта».

У 1997 выступала ў складзе «Толстого бенефиса» (разам з Л. Клунным, Р. Палішчуком). Часта спявае сола пад акампанемэнт гітары, гармоніка, у рэпертуары як аўтарскія творы, так і песні беларускіх кампазітараў, апрацоўкі народных песень. Сярод найбольш вядомых «Клёны-ясені» (муз. *Уладзіміра Будніка*, сл. *Ніла Гілевіча*), «Я вернусь» (муз. *Эдуарда Зарыцкага*, сл. В. Гіна), «Ой, бяда» (муз. Н. Мікуліч, сл. Я. Бароўскага), «Госці мае» (муз. П. Яроменкі, сл. Я. Бароўскага), «Не за вочы чорныя» (муз. *Юрыя Семянякі*, сл. *Адама Русака*), «Мая адзінота» (муз. Н. Санамян, сл. В. Ермаленкі), «Берега» (муз. і сл. С. Наско).
**Гастролі:** гл. «Верасы».
**Фестывалі:** гл. «Верасы».
**Узнагароды:** у складзе «Верасоў» – прэмія Ленінскага камсамолу Беларусі (1980).
**Дыскаграфія:** гл. «Верасы»; сольныя МС «В саду вселенной» («Ковчег»), «Я – артыстка» («Ковчег»), «Тем, кто любит» («Ковчег»), CD «Ах, любовь моя» («Ковчег», 2006), «Святая муза» («Ковчег»).
**Кіно, відэа:** фільм «Верасы» (рэж. *Уладзімір Арлоў*, 1976); **кліпы** «Мая адзінота» (рэж. Н. Сідзельнікава, 2000), «Кумок» (рэж. Н. Сідзельнікава, 2001), песня «Я живу в заповедном краю» гучыць у фільме «Звон уходящего лета».
**Кантакт:** +375 (29) 615-53-35.
21.11.06//Д.П.

**МІНАКОЎ АЛЕГ «ДЖАГЕР» (Минаков Олег «Джаггер», Minakov Oleg «Jagger»)**– спявак, аўтар музыкі і тэкстаў, аранжавальнік, гітарыст.
Нарадзіўся 21.07.1964 у п. Узда Дзяржынскага р-ну Мінскай вобл. У 1987 скончыў Мінскую ваенна-палітычную вучэльню, звольніўся з вайсковай службы ў студзені 1989. Займацца музыкай пачаў ва ўзросце 9 гадоў, з 1975 вучыўся па класе гітары ў ДМШ. Выконвае рок ад канца 70-х, утварыўшы калектыў пад назвай «В.О.С.», які трымаўся музычнага стылю хард-року, а тэксты сатырычнага зместу пісаліся на трасянцы. Група запісала тры дэма-альбомы «Прыма ў сэрцы», «Сярод людзей», «Ухалодскі самагон». У 1987–88 –



удзельнік мінскай групы «Квінта», ад 1988 – музыка групы «Проспект» БДФ. На пачатку 1990 звольнены з БДФ за ангельскамоўную праграму. У верасні 1990 атрымаў запрашэнне ў групу *«Инспектор»*, у складзе якой працаваў да 1993, калі, вярнуўшыся

з Нямеччыны, зыніцыяваў стварэнне групы *«Rouble Zone»*. У сакавіку 1997 выехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Бельгію, дзе працуе як аранжавальнік і кампазітар. Сярод найбольш вядомых твораў песні «I'm Not Forgiving You», «Day Without Your Love» (для групы «Rouble Zone»), «Here She Comes» (для бельгійскага спевака Дзімітрыя).

**Фестывалі:** у складзе групы «Инспектор» – шэраг рок-фестываляў у Нямеччыне, у складзе групы «Rouble Zone» – «Славянский базар» (Віцебск, 1996), «Таврийские игры» (Украіна, 1996), «Осенний марафон» (1996), фестываль у гонар 100-годдзя губнога гармоніка (Масква, 1996), «Чыстае неба» (Мінск, 1996), сольна – фестываль «Guinness Book of Records» (1997), карнавал у Ніцы (1998), «Night of The Proms» (2006).

**Гастролі:** у складзе групы «Проспект» – па СССР, у складзе групы «Инспектор» – Нямеччына, у складзе групы «Rouble Zone» – клубныя і стадыённыя выступы ў Беларусі, сольна – канцэрты ў «Disney Land» (Парыж, 1998), туры ў Манака, Люксембургу, Галандыі (1999–2000), шэраг канцэртаў у Парыжы, тур па Бельгіі «Miss Belgian Beauty 2007».

**Узнагароды:** у складзе групы «Rouble Zone» – «Рок-кароны 1995» у намінацыях «Група году» і «Альбом году» («Put Your Money… Now!»), там жа – спецыяльны прыз «Лепшы шоўмэн году».

**Дыскаграфія: альбомы** ў складзе групы «Инспектор» – «Russian Prayer» («Ariola-BMG», Нямеччына, 1993); у складзе групы «Rouble Zone» – «Put Your Money… Now!» («Dar Veter Records», 1996); **трэкі** «Dreaming A Dream» (Міс Кэці, у зборніку «Pop-MIDEM 2001 Cannes» – «Sabam», Бельгія, 2001), «Day Without Your Love» («Rouble Zone», у зборніку «Rock-MIDEM 2001 Cannes» – «Sabam», Бельгія, 2001), «Into the Vibe» (Міс Кэці, у зборніку «Techno Dance & House-MIDEM 2001 Cannes» – «Sabam», Бельгія, 2001), «Day Without Your Love» і «I'm Not Forgiving You» (сінглы пад псеўданімам Томас Мун, разам з музыкамі групы «Clousou», 2004), «No Angel» і «Tell Me Why» (CD спявачкі НоаНіл «Naked On The Inside», 2005), сінгл, відэа і LP «Here She Comes» спевака Дзімітрыя (2006), «Dance With Me» для спевака Бандыта, удзел у запісе саўндтрэку да кароткаметражнага фільму «Blasted» з музыкай *Аляксандра Растопчына* (1989–93).

**Кіно, відэа:** музыка да двух кліпаў *Уладзіміра Янкоўскага*, кліпы тэлекампаніі «Свой круг» (рэж. *Тамара Лісіцкая*), «There's No Reason» (рэж. Ю. Бяржыцкі, 1997, не скончаны), «Here She Comes» (Дзімітр, рэж. Паскаль Байле, 2007).

**Кантакт:** oleg.minakov@telenet.be

26.05.07//Д.П.

**«МИНСКИЙ ЭСТРАДНЫЙ ОРКЕСТР»** – калектыў фармату біг-бэнду, які пастаянна працаваў у Мінскім дзяржаўным цырку. У 1970–87 выступаў пад гэтай назвай з арыгінальнымі праграмамі, складзенымі з твораў савецкіх кампазітараў, аўтарскімі канцэртамі беларускіх кампазітараў, творамі джазавай класікі. Кіраўнікамі аркестру і дырыжорамі ў розны час былі сярод іншых *Барыс Райскі*, *Міхаіл Фінберг*. У розныя гады ў складзе

калектыву выступалі такія салісты-інструменталісты, як Анатоль Азаронак і Рымас Кіблярыс – саксафоны, *Валерый Шчэрыца* – труба, *Анатоль Гілевіч* – фартэпіяна, *Віктар Малчанаў* – гітара і інш. У 1987 многія ўдзельнікі калектыву ўвайшлі ў склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*.

**Гастролі:** канцэрты ў Маскве, Мінску.

**Дыскаграфія: альбом** LP «Минский эстрадный оркестр» («Мелодия», 1986); **трэкі** «Воспоминание», «В час рассвета», «В мире праздничных чудес», «Ночной оркестр» (усе з музыкай *Ігара Лучанка* ў альбоме «Игорь Лученок. Песни и инструментальная музыка» – «Мелодия», 1983), у альбоме «И пока на земле существует любовь» І. Лучанка («Мелодия», 1988).

12.03.06//Д.П.

**МІСЕВІЧ УЛАДЗІСЛАЎ (Мисевич Владислав, Misevich Uladzislau)** – саксафаніст, флейтыст, вакаліст.

Нарадзіўся 08.05.1945 у Арэнбургу, Расея. Займацца музыкай пачаў у школе, вучыўся ў ДМШ па класе фартэпіяна, быў музычным выхаванцам ваеннага аркестру, дзе асвоіў кларнет, а пасля й саксафон. Быў выхаванцам аркестру Арэнбургскай сувораўскай вучэльні, аркестру Вышэйшай вайсковай лётнай вучэльні, служыў ва Узорна-паказальным аркестры ЧБВА. Скончыў 4 курсы ММВ (1963–67), МІК (1988). Ад 1967 – артыст ансамбля «Орбита-67» п/к *Ізмаіла Капланава* БДФ, ад 1968 – ансамбля *«Лявоны»*, які ў 1970 атрымаў назву *«Песняры»*. Працаваў у ім да 1993. На пэўны час адышоўся ад музыкі, заняўшыся бізнэсам. Вярнуўся ў «Песняры» ў 1998, дзе нецягглы час быў артыстам і дырэктарам. Ад 1998 – у ансамблі *«Белорусские Песняры»*.

**Гастролі:** гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры».

**Фестывалі:** гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры».

**Узнагароды:** у складзе «Песняроў» – лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (2 прэмія, Масква, 1970), усесаюзных конкурсаў выканаўцаў савецкай песні (1969, 1973, 1 прэмія), Х сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў (Берлін, 1973, 1 прэмія), міжнароднага фестывалю песні «Залаты леў» (Лейпцыг, 1973, 1 прэмія), II фестывалю палітычнай песні (Хельсінкі, 1978), дыпламант міжнароднага фестывалю палітычнай песні «Varadero» (Куба, 1982), лаўрэат прэмій Ленінскага камсамолу Беларусі (1976), Ленінскага камсамолу (1977) – у складзе «Песняроў».

**Дыскаграфія:** гл. «Песняры» і «Белорусские Песняры».

**Кантакт:** www.bel-pesniary.ru

07.11.06//Д.П.

**МІХАЙЛАЎ ЮРЫЙ (Михайлов Юрий, Michajlau Jury)** – блюзавы і джазавы гітарыст, аўтар музыкі і тэкстаў, аранжавальнік.

Нарадзіўся 09.01.1957 у Мінску. Скончыў БДТМІ, аддзяленне керамікі (1979). Выконваць музыку пачаў падчас навучання ў школе, калі стварыў інструментальную групу. Далей працаваў у групе «Антиквар» (1975–84), джаз-групе «Стандарт» (1982–83), групе Віт. Навіцкага, якая выступала ў кавярні «Сузор'е» (1983–86), ад Ашхабадскай філармоніі працаваў у рэстарацыях Мінску,

Масквы, Ялты (1987). У канцы 80-х выступаў як выканаўца на банджа ў складзе *Белорусского диксиленда*. На некалькі гадоў пакінуў актыўныя заняткі музыкай, ад 1996 да 1997 – удзельнік групы *«Bros. In Blues»*, у 1998–2000 кіраваў уласнымі групамі. У 2000 узначаліў квартэт *«Мадера хард блюз»*. Найбольш вядомыя песні, якія ён піша на расейскай мове, – «Белый пароход», «Свобода», «Самый главный юбилей».
**Фестывалі:** у складзе «Стандарту» – джаз-фестывалі «Ритмы Хибин» (1982) і «Віцебская восень» (1983); у складзе «Bros. In Blues» – блюзавы фестываль у Кіеве (1997, у адным канцэрце з Мікам Тэйларам), як лідэр «Мадеры хард блюз» – «Калининград In Rock» (Расея, 2000), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2005), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005).
**Дыскаграфія:** у складзе «Мадера хард блюз» – гл.; сола «Не для FM» (аўт. выд., 2005), «Аэроплан» (аўт. выд., 2005).
**Іншая інфармацыя:** вядомы мастак-карыкатурыст, удзельнік шматлікіх выстаў у Еўропе, Амерыцы, Азіі.
**Кантакт:** www.maderahardblues.com; group@maderahardblues.com; +375 (17) 254 43-65 (х).
02.10.05//Д.П.

**МІХАЛОК СЯРГЕЙ (Михалок Сергей, Mihalok Siarhey)** – спявак, аўтар музыкі і тэкстаў, актор.
Нарадзіўся 19.01.1972 у Дрэздэне, Нямеччына. Скончыў БІК. У 1990 стаў ініцыятарам стварэння групы *«Ляпис Трубецкой»*, у сярэдзіне 90-х супрацоўнічаў з тэатрам «Бамбуки» як рэжысёр, сцэнарыст і актор, пазней, паралельна з працай у групе, арт-дырэктар рэгей-клубу «Адис-Абеба» ў Мінску. Ад 2000 – удзельнік комік-дуэту *«Саша и Сирожа»*, у гэтым жа годзе стаў адным з заснавальнікаў творчага аб'яднання «Дети Солнца». Ад 2003 пачаў супрацоўніцтва з групай *«Крамбамбуля»*.
**Гастролі:** у складзе групы «Ляпис Трубецкой» – гл.; у складзе праекту «Крамбамбуля» – Украіна (2004, 2005).
**Фестывалі:** у складзе групы «Ляпис Трубецкой» – гл.
**Узнагароды:** «Рок-карона 1996», «Рок-кароны 1996» у намінацыях «Альбом году» («Ранетое сердце») і «Лепшы тэкст песні».
**Дыскаграфія:** у складзе групы «Ляпис Трубецкой» – гл.; у складзе групы «Крамбамбуля» – гл. 2003–07; у складзе дуэту «Саша и Сирожа» – «Опера для ленивых, ч. 1 і 2» (аўт. выд., 2003), «СкаТы!» («Go Records», 2005).
**Кіно, відэа:** VHS «Саша и Сирожа – самае чоткае», «Саша и Сирожа – непаказанае» («К-видео», 2001), DVD, VHS, VCD «Новыя калыханкі» («К-видео», Беларусь і «Lavina



Music», Украіна, 2005), музыка да мастацкага фільму «Последний забой» (рэж. С. Баброў, 2007); **кліпы** – гл. «Ляпис Трубецкой»; у складзе дуэту «Саша и Сирожа» – «Калыханка» (рэж. М. Сабураў, 2005); у складзе «Крамбамбулі» – «Госьці» (рэж. М. Сабураў, 2005), «Турысты» (рэж. Э. і В. Сідарукі, 2005).
**Кантакт:** www.lyapis.com; drozz@lyapis.com; lyapis@mail.ru
25.06.07//Д.П., фота Д.П.

**МІЦУЛЬ ЭДУАРД (Мицуль Эдуард, Mitsul Eduard)** – спявак, выканаўца традыцыйнага папулярнага рэпертуару, педагог.
Нарадзіўся 09.05.1924 на станцыі Добрык Унецкага р-ну Бранскай вобл., памёр 02.11.2002 у Мінску. Вучыўся на вакальным аддзяленні Гомельскай музычнай вучэльні (ад 1950), у БДК па класе вакалу М. Сярдобава (1952–55). Ад 1952 – артыст хору Беларускага тэлебачання і радыё, ад 1953 – артыст Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР, з 1955 да 1981 – артыст эстрады БДФ. У ансамблі, які яму акампанаваў, працаваў *Уладзімір Мулявін*, і аранжаваў для Э. Міцуля «Ямщик, не гони лошадей», «Вдоль по Питерской». У 1971 сабраў акампанавальны калектыў, які атрымаў назву *«Верасы»*. Займаўся пастаноўкай вакалу з *Леанідам Барткевічам*, *Анатолем Кашапаравым*. Усесаюзную вядомасць спеваку прынесла песня «Ты одна» (муз. *Юрыя Семянякі*, сл. С. Глейзерава), якая прагучала ў мастацкім фільме «Любовью нужно дорожить» (1960). Рэпертуар спевака складаўся з эстрадных песень беларускіх, савецкіх і замежных кампазітараў, рамансаў, апрацовак народных песень, найбольш вядомыя з якіх «Сена маладое» (муз. А .Чыркуна, сл. В. Мысліўца). Песні ў ягоным выкананні гучаць у мастацкіх фільмах, у т.л. «Я родам з дзяцінства». У 1996 запісаў на Беларускім радыё шэраг старадаўніх рамансаў.
**Гастролі:** СССР, Вугоршчына, Нямеччына, Манголія, Балгарыя, Польшча, Англія, Егіпет.
**Фестывалі:** «Золотой шлягер» (Магілёў, 1995, 1998).
12.11.06//В.Б.–Белэнцыклапедыя.

**МОЛЕР ЛЕЎ (Моллер Лев, Moller Lev)** – піяніст, кампазітар.
Нарадзіўся 04.09.1930 у Баку, Азербайджан. У 1950 скончыў Бакінскую музычную вучэльню. Прафесійна выступаць на сцэне пачаў як кіраўнік аркестру Азербайджанскага індустрыяльнага інстытуту (1948–49), у 1953–58 працаваў канцэртмайстам у Мінскім акруговым доме афіцэраў, стаяў на чале эстрадных аркестраў БПІ і Мінскага радыёзаводу. У 1958–91 – музычны кіраўнік Беларускай эстрады, ад 1991 да 1994 – канцэртмайстар *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. У 1994 пераехаў на пастаяннае жыхарства ў Ізраіль. Сярод найбольш вядомых твораў – музыка танца «Паўлінка» для Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі, песні «Любы край» (сл. В. Душкевіча), «Вечерняя песня» (сл. М. Алтухова), музыка да цыркавых атракцыёнаў Т. Дуравай, І. Кіо, В. і Я. Барысавых, Н. Рубанавай, А. Фурманава, А. Зотавай, музыка да спектакляў Цырку на лёдзе, Цырку ліліпутаў і Цырку на вадзе. Сябра Саюзу тэатральных

дзеячаў СССР, цягам гадоў кіраўнік эстраднай секцыі Саюзу кампазітараў БССР.
**Гастролі:** шматлікія выступленні на тэрыторыі СССР цягам 1968–90.
**Фестывалі:** I усесаюзны конкурс на лепшае выкананне савецкай песні і лепшую савецкую песню (1966), Усесаюзныя фестывалі моладзі (неаднаразова), конкурсы на лепшае выкананне моладзевых песень (Рыга, Мінск, Днепрапятроўск і інш.), Усесаюзныя конкурсы артыстаў эстрады (неаднаразова).
**Узнагароды:** ганаровыя граматы прэзідыюму Вярхоўнага Савету БССР, медаль «Ветэран працы».
**Дыскаграфія:** асобныя творы выдадзены ў LP «Чараўніцы» («Мелодия», 1978).
**Кіно, відэа:** музыка да фільмаў «Дзед Яўсей і Палашка» (Беларускае тэлебачанне), «Збянтэжаны Саўка» (прыбл. 1970), «Вот и лето прошло» («Беларусьфільм»), «Быть человеком» (рэж. Ігішаў, «Беларусьфільм», канец 70-х), «Не опоздал» («Союзмультфильм»).
11.12.06//Д.П.

**«МОЛОДОСТЬ ПЛАНЕТЫ»** – ВІА. Утварыўся ў 1974 пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце.
У першым складзе ансамбля выступалі Фелікс Круглянскі – фартэпіяна, арган, Віктар Марчук – барабаны, Анатоль Смірноў – бас-гітара, Вячаслаў Корзун – гітара, Сяргей Лабяк – гітара, Лідзія Габеева – вакал. У 1976 ансамбль стаў штатным калектывам ДК «Гомельбудматэрыялы» і абраў за аснову стылю джазрок, выступаючы наступным складам: Ф. Круглянскі, Віктар Махаты – сінтэзатары, Уладзімір Калтуноў – бас-гітара, Ігар Курашоў – барабаны, *Аляксандр Цыганок* – гітара плюс вакалісты і група духавых. Рэпертуар грунтаваўся на творах, якія выконваліся на расейскай, беларускай, ангельскай мовах. Калектыў спыніў існаванне ў 1979.
**Фестывалі:** фестываль рок-музыкі «Віцебск 1977».
20.02.06//А.Ц.

**МОЛЧАН АЛЕГ (Молчан Олег, Molchan Oleh)** – піяніст, кампазітар, аранжавальнік, прадзюсэр.
Нарадзіўся 11.04.1965 у Мінску.
У 1983 скончыў ССМШ пры БДК па класе харавога дырыжавання Т. Міронавай, ад 1991 вучыўся ў БАМе па класе кампазіцыі А. Мдывані. Дэбютаваў у складзе ансамбля «Диалог» М. Самусевіча (1983–84), кіраваў ансамблем «Ассорти» БДФ (1987).
У 1991 быў запрошаны ў ансамбль *«Песняры»*, у 2000 прызначаны на пасаду начальніка Упраўлення па рабоце з творчай моладдзю РУП



«Ювентус» пры Дзяржкаммоладзі (да 2002). Ад 1995 – прадзюсэр спявачкі *Ірыны Відавай*. У 2000 стварыў студыю гуказапісу пры Саюзе кампазітараў Беларусі. Сярод найбольш вядомых твораў праграма «Ave sole, альбо Слова Скарыны» (для ансамбля «Песняры», 1990, на сл. *Аляксандра Лягчылава*), праграма «Голас душы» (сумесна з *Уладзімірам Мулявіным*, 1993), песні «Малітва» (сл. Янкі Купалы), «Обманите меня» (сл. М. Валошына), «Юность» (сл. Ю. Рыбчынскага), «Гуляй, казак!» – для ансамбля «Песняры», «Поцелуи» (сл. К. Бальманта), «Лунные танцы» (сл. І. Відавай), «Бабочки» (сл. І. Відавай, А. Стрыгалёва) – для І. Відавай, «Милый мой» (сл. А. Лягчылава) – для *Іны Афанасьевай*, «Ненавязчивый блюз» (сл. А. Лягчылава) – для *Валерыя Дайнэкі*, песні для ансамбля *«Сябры»*, У. Ухцінскага, праграма на вершы В. Аколавай для *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, харавая праграма «Я нясу вам дар» (сл. Янкі Купалы) для Дзяржаўнай харавой капэлы імя Р. Шырмы. Як аранжавальнік зрабіў больш за 50 апрацовак мелодый для ансамбля «Песняры», у тым ліку а капэльную «Миленький ты мой», а таксама «Русской песни» для Н. Бабкінай. Аўтар музыкі да спектаклю «Ниночка» Рускага драматычнага тэатру імя М. Горкага (2005).
**Гастролі:** гл. «Песняры» (1991–2000).
**Фестывалі:** гл. «Песняры» (1991–2000); «За Союз!» (2001).
**Узнагароды:** лаўрэат рэспубліканскай прэміі імя Ф. Скарыны сярод твораў буйных форм за праграму «Ave sole, альбо Слова Скарыны» (1991).
**Дыскаграфія: альбомы** у складзе «Песняроў» – гл. 1994–2001, альбомы І. Відавай «Все очень хорошо» («ПАН-Рекордз», 1999), «Улетай» («OVM Production»/«Подземка», 2002), «Любовь сказала Да!» («Vigma», 2006); **трэкі** «Найди себя» (на сл. А. Лягчылава, у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999), «Улетай, душа» (І. Відава, у зборніку «Мешок с хитами 6: русский хит» – «Мир видео», 2001), «Мы не чужие» (І. Відава, у зборніку «Хит мейкер 4» – «Biz enterprises»/«Монолит», 2003), «Поцелуи» (І. Відава, у зборніку «Хит Мейкер» – «Biz enterprises»/«Монолит», 2003), «Любовь сказала Да!» (І. Відава, у зборніку «Любовь + Хит FM» – «Biz enterprises»/«Монолит», 2004), «Маргарита», «Стася», «У высокім небе» (у «Белорусском альбоме» В. Дайнэкі – «Белорусские Песняры Рекордз», 2004), «Не нужны слова» (І. Відава, у зборніку «Песня году Беларусі, ч.2» – «Проспект», 2005), «У высокім небе» (у альбоме «Минск-Москва» В. Дайнэкі – «Белорусские Песняры Рекордз», 2005), «Юность», «Чужая», «Гуляй, казак!» (у альбоме *Ігара Пені* «Когда мы были юны» – «Белорусские Песняры Рекордз», 2005), «Маргарита» (у альбоме «Белорусские Песняры. Лучшее, ч. 2» – «Проспект», 2006), «Рождественская колыбельная» (у альбоме «Белорусские Песняры. Лучшее, ч. 3» – «Проспект», 2006), «Рождественская колыбельная», «Стася», «Острова счастья», «Селезень», «Маргарита» (у зборніку «Белорусских Песняров» «35+5» – «Никитин», 2004), «Христос воскрес», «Кума», «Малітва» (у альбоме У. Мулявіна «Голос души, ч.1» – «Vigma», 2006).
**Кантакт:** o.molchan@mail.ru; +375 (17) 255-14-81.
21.11.06//Д.П., фота Д.П.

**МОНІН ЮРЫЙ (Монин Юрий, Monin Yuri)** – гітарыст, вакаліст, аўтар музыкі і тэкстаў. Нарадзіўся 11.07.1975 у Івацэвічах Брэсцкай вобл. У 1997 скончыў геаграфічны факультэт Брэсцкага ўніверсітэту па спецыяльнасці выкладчык геаграфіі і біялогіі. Песні пачаў пісаць у 1995, выступаючы з канцэртамі ў клубах і бібліятэках. Нягледзячы на ўдзел у фестывалях аўтарскай песні, да бардаў сябе не адносіць, выступаючы, як сам акрэслівае, у стылі акустычнага блюзу, а таксама «расейскага стылю» (стылізацыя фальклору). З'яўляецца кіраўніком клубу самадзейнай песні Брэсту «Аккорд», ад 2001 выступае ў дуэце з гітарыстам Аляксандрам Леўчанкам і паралельна – у складзе групы «Плохие дети».
**Фестывалі:** «Мартовский кот» (Магілёў, 1999), «Витебский листопад» (1999), «Менестрель» (Мінск, 2000).
**Кантакт:** +375 (162) 26-33-47.
17.06.04.//Г.Ш.

**«МРОЯ»** – мінская група. Утварылася ў 1982 з ініцыятывы навучэнцаў Мінскай мастацкай вучэльні і трымалася стылю хард-року. Калектыў выступаў у складзе *Лявон Вольскі* – гітара, вакал, Юрась Ляўкоў – бас-гітара, бэк-вакал, *Уладзімір Давыдоўскі* – гітара, Алесь Дземідовіч – барабаны. Група стала першай у гісторыі беларускай папулярнай музыкі, якая запісала і выдала на Усесаюзнай фірме «Мелодия» альбом з аўтарскімі творамі рок-музыкі, цалкам створанымі па-беларуску. У розны час лідэр-гітарыстамі калектыву выступалі Венэдыкт Конеў-Петушковіч, *Леанід Шырын*, *Віктар Смольскі*. У 1993 у склад калектыву ўвайшоў *Піт Паўлаў*. У верасні 1994 удзельнікі групы вырашылі змяніць яе стыль і назву. Ад гэтага часу на сцэне выступае група пад назвай *«N.R.M.»*. Найбольш вядомыя творы «Я – рок-музыкант», «Кастрычніцкі цягнік», «Апошні інспектар», «Мама-мафія».
**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Наваполацк» (1988), «Рок-диалог» (Магілёў, 1989), «Рок-богема» (Днепрадзяржынск, Украіна, 1989), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1991).



**Узнагароды:** лаўрэаты фестывалю «Наваполацк 1988», І прэмія на фестывалі «Тры колеры» (1990), лаўрэаты «Басовішча 1991».

**Дыскаграфія: альбомы** LP «28 зорка» («Мелодия», 1990), MC «Стары храм» (аўт. выд., 1983, перавыд. 1986), «Зрок» (аўт. выд., 1987), «Студыя БМ» (аўт. выд., 1988), «Біяполе» (аўт. выд., 1991, перавыд. CD «Ковчег», 1997), «Лепшыя песні з альбомаў 1988–90» («Ковчег», 1992); **трэкі** «Ён яшчэ вернецца» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Я – рок-музыкант» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМАgroup», 2004), «Краіна крывавых дажджоў» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006).

**Кіно, відэа: кліп** «Я – рок-музыкант» (рэж. Г. Нікалаеў, 1989).

06.11.06//Д.П., фота А. Адамчык.

**МУЛЯВІН УЛАДЗІМІР (Мулявин Владимир, Muliavin Wladimir)** – кампазітар, аранжавальнік, спявак, гітарыст.

Нарадзіўся 12.01.1941 у Свярдлоўску, Расея. У 1956–58 вучыўся ў Свярдлоўскай музычнай вучэльні на аддзяленні струнных народных інструментаў па класе А. Наўроцкага. Як музыка-гітарыст пачаў выступаць яшчэ падчас навучання.

У 1958–63 – артыст-інструменталіст шэрагу абласных філармоній (Цюмень, Томск, Калінінград, Кемерава, Чыта). На пачатку 1963 прыязджае ў Мінск, дзе пачынае працаваць у канцэртна-эстрадным бюро БДФ. Падчас службы ў войску стварыў ротны вакальны квартэт, а ў 1967 увайшоў у склад філарманічнага ВІА «Орбита-67». Праз год сабраў групу «Лявоны» – акампанавальны склад эстраднага рэвю «Лявоніха», для якога пачаў пісаць уласныя песні і апрацоўваць беларускі фальклор.

У верасні 1969 стаў на чале ВІА *«Песняры»*, для якога напісаў шэраг песень на творы беларускіх і савецкіх паэтаў, зрабіў апрацоўкі беларускіх народных песень. Найбольш вядомыя з іх – «Александрына» (сл. П. Броўкі), «Завушніцы» (сл. *Максіма Танка*), «Крик птицы» (сл. Ю. Рыбчынскага), «Ванька-встанька» (сл. Я. Еўтушэнкі), «Чырвоная ружа» (на народныя словы), аранжаванні народных песень «Скрыпяць мае лапці», «Касіў Ясь канюшыну», «Ой, рана на Йвана», «Купалінка», «А ў полі вярба», «Перапёлачка», «У месяцы верасні», «Калядачкі», «Машанька» і інш. Аўтар музыкі оперы-прытчы «Песня пра долю» (паводле паэмы Янкі Купалы «Адвечная песня», 1976), праграмы каляндарна-абрадавых песень (1980), «Я не паэта» (на вершы Янкі Купалы, 1982), «Через всю войну» (на вершы савецкіх паэтаў, 1984), «Во весь голос» (на



вершы У. Маякоўскага, 1987), вакальна-інструментальнай праграмы на вершы Янкі Купалы (1988), «Вянок» (на вершы М. Багдановіча, 1991), аранжавальнік праграмы «Гусляр» (паводле паэмы «Курган» Янкі Купалы на музыку *Ігара Лучанка*). Першы сярод беларускіх артыстаў, у гонар якіх у Маскве была закладзена Зорка на Алеі Зорак (2001). Сябра Саюзу кампазітараў СССР (1986). 14 мая 2002 быў цяжка паранены ў аўтакатастрофе пад Мінскам, памёр у Маскве 26.01.2003. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

**Гастролі:** Чэхаславакія (1971), Балгарыя, ФРГ, Швейцарыя, Румынія (1974), Польшча, Вугоршчына (1975), Францыя, Югаславія, ЗША, Канада (1976), ЗША (1977), Фінляндыя, Югаславія (1978), краіны Цэнтральнай Амерыкі (1981), Вугоршчына (1983), Польшча (1984), Індыя, Бірма, Манголія (1985), В'етнам (1989), краіны Афрыкі (1991), КНДР (1992), ФРГ (1993).

**Фестывалі:** міжнародны фестываль «Sopot» (1971), музычны кірмаш MIDEM (Каны, 1975), фестываль палітычнай песні ў Хельсінкі (1978), фестываль «Varadero» (Гавана, 1983), фестываль духоўнага адзінства (ЗША, Арызона, 1994), міжнародны фестываль «Millenium» (Нью-Йорк, 2001).

**Узнагароды:** лаўрэат II прэміі IV Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады, лаўрэат I прэміі Усесаюзнага конкурсу савецкай песні (Мінск, 1973), фестывалю савецкай песні ў Зялёнай Гуры (Польшча) і X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў (Берлін, 1973), міжнароднага фестывалю песні «Залаты леў» (Лейпцыг), міжнароднага конкурсу артыстаў эстрады «Залаты Арфей» (Балгарыя), «Золотой диск» фірмы «Мелодия» (1982); медаль Францыска Скарыны (1994), ордэн Францыска Скарыны (2001).

**Дыскаграфія:** гл. «Песняры»; «Голос души. Нерастиражированное» («Vigma», 2006); **трэк** «Тальяночка» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987),

**Кіно, відэа:** «Песняры» («Тэлефільм» Дзяржтэлерадыё БССР, рэж. *Уладзімір Арлоў*, 1971), «Ясь і Яніна» («Беларусьфільм», рэж. Ю. Цвяткоў, 1976), «Диск» («Мосфильм», рэж. А. Стэфановіч, 1978), «20 минут с «Песнярами» («Ленфильм», 1980), «А также цирк» (рэж. У. Арлоў, 1983), «Через всю войну» (рэж. С. Лук'янчыкаў, 1984), песні і аранжаванні У. Мулявіна выкарыстоўваліся ў спектаклі «Мікітаў лапаць» (па п'есе М. Чарота, ТЮГ, Мінск, 1974), кінафільмах «В земле нашей корни» («Беларусьфільм», 1975), «Камедыянт» (рэж. У. Арлоў, 1987).

Д.П., Барыс Крэпак (паводле кнігі «Нота судьбы»).

**МУСВІДАС РУСЛАН СТАСІО (Мусвидас Руслан Стасио, Musvidas Ruslan Stasio)** – спявак, выканаўца папулярнага рэпертуару, гукарэжысёр, педагог.

Нарадзіўся 03.10.1977 у Брэсце ў сям'і патомных музыкаў. Музыкай пачаў займацца у раннім дзяцінстве, дэбютаваў на сцэне ва ўзросце пяці гадоў. Скончыў народнае аддзяленне музычнай школы па класе акардэона, Брэсцкі музычны каледж імя Р. Шырмы, БДУК па спецыяльнасці майстэрства эстрады, вакал у 2004.

У 1998 стаў лаўрэатам Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу маладых артыстаў эстрады «Зорная ростань», пасля чаго атрымаў запрашэнне на працу салістам-вакалістам у *Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі*. Ад 1996 да 2001 выкладаў эстрадны вакал, працуючы адначасова й як гукарэжысёр. Найбольш вядомыя песні «Победа», «Портреты», «Листья-корабли», «Новогодняя», «Чужое море», «Мама». Спявае на расейскай і беларускай мовах.
**Фестывалі:** «Мальвы» (Седльцы, Польшча, 2003), «Золотой шлягер» (Магілёў, 2002), «Славянский базар» (Віцебск, 2002–04).
**Узнагароды:** спецыяльная ўзнагарода журы І Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў папулярнай песні «Золотой скиф» і ўладальнік прызу глядацкіх сімпатый (Данецк, Украіна, 1999), спецыяльная ўзнагарода журы Міжнароднага фестывалю песні «Мальвы» (Седльцы, Польшча, 2003).
**Кіно, відэа: кліпы** «Блюз» (рэж. І. Асіпенка, 2003), «Листья-корабли» (рэж. Р. Ічытоўкін, 2004), «Чужое море» (рэж. В. Волкаў, 2005).
**Кантакт:** musvidas@tut.by; vermus@tut.by; +375 (29) 696-76-46, (29) 626-76-46.
03.12.05//Д.П.

**МУШАК ГАННА (Мушак Анна, Mushak Anna)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару.
Нарадзілася 29.12.1985 у Магілёве. Спевамі займаецца з маленства. Цягам дзевяці гадоў удзельнічала ў тэатры-студыі «Радуга». Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 2003 пачала браць прыватныя ўрокі спеваў, рыхтуючыся да паступлення на вакальнае аддзяленне адной з ВНУ. Працуе ў Магілёўскім палацы піянераў і школьнікаў. З 2005 – студэнтка Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэту культуры і мастацтва.
**Фестывалі:** тэлефестываль «Зорная ростань» (2000), міжнародны конкурс «Зямля пад белымі крыламі» (2001), «Золотой шлягер» (2003), «Славянский базар» (2004).
**Узнагароды:** лаўрэат І прэміі міжнароднага конкурсу «Зямля пад белымі крыламі» (2001), Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў фестывалю «Золотой шлягер 2003», лаўрэат ІІ прэміі конкурсу маладых выканаўцаў фестывалю «Славянский базар 2004», уладальніца спецыяльнай прэміі імя У. Мулявіна за лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы і высокае выканальніцкае майстэрства.
**Кіно, відэа: кліп** «С чистого листа» (рэж. *Анатоль Вечар*).
03.12.05//Д.П.

**«МУШКЕТЕРЫ»** – брэсцкая група, выступала ў стылі класічнага року.
Утварылася ў верасні 1971 наступным складам: Анатоль Хвораст – бас-гітара, вакал, Вячаслаў Хвораст – гітара, вакал, Іван Халмоў – клавішныя, вакал, Дзмітрый Макаранка – барабаны. У 1975 да калектыву далучыліся Алег Шусцікаў і Юрый Кузьмін (надалей → *«Золотая середина»*). У пачатку 2004 група выступала складам: А. Хвораст, В. Хвораст, Алег Хвораст – барабаны, Аляксандр Бакуменка – бас-гітара, Аляксандр Дземка – клавішныя, Валерый Каратынскі – вакал.
У 1985 калектыў удзельнічаў ва Усесаюзным аглядзе самадзейнай

мастацкай творчасці, прысвечаным 40-годдзю перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1987 сакратарыят Белсаўпрафу прысвоіў групе званне «народны калектыў».
**Гастролі:** Польшча, ГДР, Украіна, Літва, Расея.
**Фестывалі:** фестываль папулярнай музыкі (Ліда, 1982), «Тры колеры» (Гродна, 1983).
**Узнагароды:** дыплом Саюзу кампазітараў СССР (1985), Ганаровая грамата Прэзідыюму Савету федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў сувязі з 25-годдзем калектыву (1996), лаўрэат Першага фестывалю народнай творчасці «Беларусь – мая песня» (1998).



**Дыскаграфія:** зборнік «Не гони меня. Песни А. Хвороста» (Брэст, АКЦ, 2002); **трэк** «Дурная привычка» (у зборніку «Брест-рок-журнал 2» – «Брестон», 1999).
**Кантакт:** +375 (162) 23-08-66; 224016, Брэст, Міцкевіча 62–65.

04.03.04.//Г.Ш., фото Э. Кабяка.

**МЯЛЬГУЙ АНАТОЛЬ (Мельгуй Анатолий, Mjalgouj Anatol)** – журналіст.
Нарадзіўся 14.12.1957 у Мінску. У 1989 скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Ад 1983 да 1993 працаваў музычным аглядальнікам газеты «Чырвоная змена», у 1985 стаў пераможцам усесаюзнага конкурсу знаўцаў рок-музыкі пад эгідай часопісу «Студенческий меридиан». Ад 1985 да 1988 – старшыня Мінскага рок-клубу «Няміга», у 1993–2001 выступаў як музычны аглядальнік шэрагу рэспубліканскіх выданняў, ад 1999 – музычны кансультант лэйблу «БМAgroup». У 2001–05 – вядучы музычных рубрык і аглядальнік газет «Новы час», «Наша слова», «Знамя юности», «Белорусский рынок», часопісаў «Дзеяслоў», «Роднае слова», ад 2005 – музычны карэспандэнт і аналітык Інтэрнэт-парталу «Тузін Гітоў». У суаўтарстве з *Вітаўтам Мартыненкам* падрыхтаваў і выдаў зборнік матэрыялаў «Праз рок-прызму» (БІНІМ, 1989, Нью-Йорк), а таксама «222 альбомы беларускага року і ня толькі» («Медысонт», 2006), напісаў шэраг уступных артыкулаў да альбомаў «БМAgroup». Удзельнічаў у арганізацыі фестываляў «Тры колеры» (1986 і 1988),



выступаў як сябра журы на фестывалі «Lithuanica» (1986), удзельнічаў ва Усесаюзнай рок-канферэнцыі ў Свярдлоўску (1988).
**Кантакт:** +375 (17) 201-12-68 (х), 203-51-16 (пр.); njamiga-86@tut.by
28.01.06//Д.П.

**«МЯСЦОВЫ ЧАС»** – група з Навапалацку, якая ўтварылася ў 1987 і выступала ў стылі хард-энд-хэві. Першапачатковую аснову калектыву склалі Аляксандр «Алуф» Кузьмін – вакал, гітара і Вячаслаў Макас – бас-гітара, вакал. Амаль адразу квартэт быў адзначаны прызам «Надзея» на гарадскім рок-фестывалі. Крыху пазней да групы далучыліся Алесь Свідрыцкі – барабаны і Валерый Драко – гітара, а ў 1989 – гітарыст і піяніст Руслан Парфёнаў (→ *«The Stokes»*). Пачаткова выконвала ўласныя творы на расейскай мове, але ў канцы 80-х перайшла на беларускамоўны рэпертуар. Група спыніла дзейнасць у 1991, адрадзілася, але ненадоўга, у 1996, даўшы шэраг канцэртаў у Беларусі і запісаўшы новы альбом. Аднак неўзабаве лідэр групы Алесь Кузьмін выехаў у Нямеччыну, і калектыў канчаткова спыніў існаванне. Найбольш вядомыя песні «Песня пра любоў», «Вартаўнік», «Ноч у Караліне».
**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Навапалацк 1988», «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1991).
**Узнагароды:** прыз глядацкіх сімпатый на фестывалі «Навапалацк 1988».
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Местное время» (дэма, 1987), «Слота» (1990), «Наша ўскраіна» («Ковчег», 1991), «Халі-галі» (аўт. выд./«БМАgroup», 1999), «Мой дом»/«Ускраіна» («БМАgroup», 2006); **трэкі** «Песня пра любоў» (у зборніку «Вольныя танцы» – «БМАgroup», 1999), «Будзе так» і «Вартаўнік» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Наш шлях» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМАgroup», 2004).
12.09.06//Д.П.

**«MEDEA»** – група з Гродна, якая ўтварылася вясной 1999 і выступае ў стылі сімфа-дарк-метал. У першым складзе выступалі Андрэй «Філ» Філонік – гітары, Дзяніс Атаманаў – гітары, Дзяніс Мацяс – бас-гітара, Аляксей Немчанка – барабаны, Валерый Шчарбун – вакал. У розны час у групе выступалі Андрэй Немчанка – вакал (← «Hallowed», 2002), Дзмітрый Малочнікаў – вакал (← *«Deathbringer»*, 2004), Антон Панасік – клавішныя (← «Новый рубеж», 2004). У 2005 група складалася з Дз. Мацяса, Дз. Атаманава, А. Філоніка, А. Панасіка і Дз. Малочнікава.
**Фестывалі:** «Три Шурупа» (Гродна, 1999, 2004), «Masso Brutto Fest 8».
**Дыскаграфія: альбом** МС «Реквием» («Metal Dark», 2002).
**Кантакт:** www.ladymedea.narod.ru; medea@km.ru
13.02.05//A.I.

**«MERRY POPPINS»** – пап-група з Мінску, якая працуе ў стылі папулярнай танцавальнай музыкі. Утварылася ў 2005 як дуэт былых удзельніц і вакалістак групы *«Мантана»* – сясцёр Алесі і Марыны Берулава. У запісах удзельнічалі Уладзімір

«Ёлкін» Эгліціс – аранжаванне, кампазітар (раней *«Ляпис Трубецкой»*), *Дзяніс Варанцоў* – аранжаванні (*«J:морс»*). У верасні 2006 група пераўтварылася ў трыо, калі да яе далучылася малодшая сястра Люся Берулава. У тым жа годзе ўдзельніцы трыо пераехалі ў Маскву, дзе ўвёсну 2007 дэбютаваў «жывы» склад гру-



пы з расейскіх музыкаў. Рэпертуар заснаваны на расейскамоўных аўтарскіх песнях, найбольш вядомыя «Меня зовут любовь», «Картинки».

**Дыскаграфія: альбомы** CD максісінгл «Merry Poppins» («Глория Медиа», 2006); **трэкі** «Картинки» (у зборніку «Золотая двадцатка. Зима 2006» – «West Records», 2005), «Крылья» (у зборніку «Золотая двадцатка. Весна 2006» – «West Records», 2006).

**Узнагароды:** «Сінгл году» на цырымоніі «Мистерия звука 2006» за сінгл «Merry Poppins» (па продажах).

**Кіно, відэа: кліпы** «Меня зовут любовь» (рэж. Р. Васьянаў, 2005), «Картинки» (рэж. Р. Васьянаў, 2006), «Любовь» (рэж. А.Церахаў, 2007).

**Кантакт:** www.merrypoppins.ru

03.03.07//Д.П.

**«MISS BONS»** – група з Брэсту, якая ўтварылася ў 1990.

Першапачаткова выступала ў стылі хард-року, у канцы 90-х адбылася пераарыентацыя ў бок пап-року. Першы склад: Дзмітрый Бандаровіч – гітара, вакал, Мікалай Місько – гітара, Аляксандр Пятроў – бас-гітара, Вячаслаў Швічкоў – барабаны, вакал. Група існавала да 2000. Пасля распаду В. Швічкоў заняўся аранжаваннем, напісаннем тэкстаў песень і музыкі,



выступае як сесійны музыка, у 2003 арганізаваў праект «Спортфак».

**Дыскаграфія: альбом** MC «Titanic» («Брестон», 1999); **трэкі** «Реквием» (у зборніку «Брест-рок-журнал» – «Брестон», 1998), «Далеко (За второй)» (у зборніку «Брест-рок-журнал 2» – «Брестон», 1999).

**Кантакт:** shvak@tut.by; +375 (29) 640-01-08; (162) 23-96-78.

27.02.04//Г.Ш.

**«MITCHIBITCHI»** – група з Віцебску, якая ўтварылася ў 1995 і трымаецца стылю мэшын фэкторі нойз/даб індастрыэл.

Група ўяўляе з сябе дуэт, што выступае складам: Аляксандр «Удаф»

Анціпенка – сэмплы, гітара, Максім «Макс» Жукаў – голас. Існуе выключна як студыйны праект.

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Mitchibitchi» («BUTT records», 2003), split CD «Mitchibitchi» – «Anyday Now» & «Aesar» – «Into Self» («BUTT records», 2005); **трэк** у MC зборніку «Blow Up This Town, №2» («BUTT records», 2002).

**Кантакт:** www.zhukov.tv; mitchibitchi@tut.by; 210032, а/я 11А, Віцебск, Беларусь, Жукаву Максіму Леанідавічу.

15.12.06//М.Ж.

**«MOJO BLUES»** – мінская група. Утварылася ў 1997 з ініцыятывы гітарыста *Іллі Шэўчыка* (← *«Крама»*).

Першапачатковы склад: І. Шэўчык, *Аляксей Казлоўскі* – бас-гітара, вакал (← *«Bros. In Blues»*, *«Zindan»*, *«Сузор'е»*, *«Университет»*), Сяргей «Боршч» Кныш (← *«Крама»*, *«Ulis»*, *«Бонда»*). Рэпертуар засноўваецца на аўтарскіх творах і стандартах блюзу і рытм-энд-блюзу, якія й склалі праграму першага блюзавага альбому ў гісторыі беларускай папулярнай музыкі. У 1998 у якасці бэк-вакалістак з групай пачаў працаваць дуэт *«ЛІН'с»*. У канцы 1998 замест С. Кныша ў групе пачынае выступаць *Андрэй Філатаў* (← *«Сузор'е»*, *«Bros. In Blues»*, *«Zindan»*). Пасля ад'езду А. Казлоўскага ў ЗША ў складзе трыо выступалі бас-гітарысты А. Пурус (2000–02 ← *«Rouble Zone»* → *«Новые джазеры»*, *«НЕО»*), *Алег Вінакураў* (адначасова *«Flat»*, 2002–03). Вакалістам быў І. Шэўчык. У гэтым складзе трыо бярэ ўдзел у некалькіх фестывалях, дае канцэрты ў блюзавых клубах Польшчы. На пачатку 2003 да групы далучаецца вакалістка Юлія Петрушкевіч (→ 2005), месца бас-гітарыста і бэк-вакаліста займае Дзмітрый Андросік (→ лета 2006). Як квартэт калектыў удзельнічае ў чарговых блюзавых фестывалях у Польшчы, у канцы 2003 – пачатку 2004 цягам 4 месяцаў працуе ў адным з клубаў гораду Чунь-Чань (Кітай). У 2005 група чарговы раз на доўгі тэрмін з'язджае на працу ў Кітай, каб урэшце ў 2006 прыпыніць існаванне.



**Гастролі:** Польшча, Кітай.
**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (1998–2002), «Blues na Kujawach» (Польшча, 2002, 2003), «Olsztyńskie nocy bluesowe» (Ольштын, Польшча, 2002), «Toruń Blues Meeting» (Торунь, Польшча, 2003), «Blues Express» (2003), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2004).
**Узнагароды:** Гран-пры конкурсу імя Рышка Рыдля (Тыхі, Польшча, 2003).
**Дыскаграфія: альбомы** MC і CD «Love Across The Ocean» («Ковчег», 1998), «I Gotta Move» («Ковчег», 1999), «Against The Destiny» («Ковчег», 2004).
**Кіно, відэа: кліп** «Turn My One».
**Кантакт:** www.mojoblues.info; mojoblues@mail.ru;
+375 (29) 659-49-78 (І. Шэўчык), (29) 637-34-72 (А. Філатаў).
18.10.06//Д.П.

**«MOYA»** – мінская група, якая выступае ў жанры інструментальнай музыкі і трымаецца стылю построк/нэа-класік.

Утварылася ў чэрвені 2005 як дуэт Васіль «Моя» Маронаў – клавішныя, гітара, праграмаванне струнных, Аляксандр Кузьмук – барабаны. Да іх пазней далучыўся Сяргей Волчак – гітара. Сярод найбольш вядомых кампазіцый – «Вальс цветных», «Мочи беломазых», «Шопенг», «Пост-советский пост-рок».
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Общество чертовски плохо разбирается не только в людях, но и в музыке» («Triangle Records», Расея, 2006), «Медовое демо» («Triangle Records», 2006).
**Кантакт:** www.moyaband.com; moyaband.livejournal.com; moyaband@gmail.com;
+375 (29) 261-71-81.
16.04.06//Д.П.

# Н

**НАВУМЕНКА ЯКАЎ (Науменко Яков, Naumenko Yakov)** – спявак, выканаўца традыцыйных папулярных і народных песень, кампазітар. Нарадзіўся 28.03.1959 у Оршы. У 1974 скончыў Аршанскую музычную школу па класе акардэона, у 1984 – ММВ па класе харавога дырыжавання, у 1994 – Маскоўскі музычна-педагагічны інстытут імя Гнесіных па класе вакалу. Выступаць на прафесійнай сцэне пачаў у 1984 як удзельнік ансамбля народнай музыкі «Свята» БДФ. У 1985–90 – артыст Дзяржаўнага народнага хору Беларусі, пасля чаго цягам трох гадоў быў салістам ансамбля «Бяседа» Дзяржтэлерадыё Беларусі. У 1993 быў запрошаны ў *Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі* ў якасці саліста-вакаліста, ад 2002 працаваў у Тэатры моладзевай эстрады, ад 2004 – саліст Белканцэрту, дзе выступае разам з шоў-групай «Карусель». Удзельнік шэрагу тэлевізійных праграм. Выконвае песні, у тым ліку і аўтарскія, на беларускай і расейскай мовах, сярод найбольш вядомых твораў «Ночка-чараўніца» і «Лілеі» (сл. І. Цітаўца), «Колькі год Беларусі» (сл. *Рыгора Барадуліна*), «Іншапланецянка», «Белы парасон», «Дзіўны лістапад» (сл. *Алеся Бадака*), «Родны Мінск» (сл. *Аляксандра Лягчылава*), «Не хадзіце, мае хлопчыкі», «Мне ўсё верыцца», «Гадзіна пік», «На Нямізе» (сл. У. Мазго), «Арабінавы сум», «Я вымалю цябе», «Светлая замова» (сл. А. Фіялкоўскай), «Хто мае хату» (сл. *Леаніда Дранька-Майсюка*).



**Гастролі:** Дні культуры Беларусі ў Малдове (2000), Дні культуры Беларусі ў Санкт-Пецярбургу (2000, 2004), Іран (2003), тур па Беларусі разам з Прэзідэнцкім аркестрам (2005).

**Фестывалі:** «Славянский базар» (неаднаразова), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (неаднаразова), «Золотой шлягер», «Мальвы» (1999, 2002, Беласток, Польшча), тэлекінафорум «Вместе» (2004, 2005, Ялта).

**Узнагароды:** лаўрэат II ўсесаюзнага радыёконкурсу «Новые имена» (1988).

**Дыскаграфія: альбомы** MC «Сіні сон» («Ковчег»), CD «Кружева сирени» («Ковчег», 2006).

**Кантакт:** +375 (29) 628-03-59.
04.10.06//Д.П.

**«НАГУАЛЬ»** – мінская група, якая выконвае, з вызначэньня саміх музыкаў, псіха-фолк і этна-авангард. Утварылася ў снежні 2000 наступным складам: Леанід Паўлёнак – вакал, барабаны, гітара, дудка, Баграт Вартанян – скрыпка, Арцём Гаўрушын – кантрабас, Васіль – гітара, Лёшык Ячнік – вакал, трамбон, Маша Гарэлік – вакал, перкусія. У розны час праз склад калектыву прайшлі Саха Бохан – гармоніка, труба, вакал, танец, Ксеня Мінчанка – скрыпка, вакал, джамбей, варган (➔ «*WZ Orkestra*»), Аляксей Кульпін – бас, сапілка, дуда, банборы, Валянцін Ткачэнка – фагот, Бенджамін Коўп – кларнет, вакал, танец, Дзмітрый Гаўрушын – гітара, Аляксей Кузняцоў – вакал, дарбука. На пачатку 2004 калектыў выступаў наступным складам: Л. Паўлёнак – вакал, джамбеі, барабаны, гітара, дыджэрыду, елкін нос, банборы, акарына, лыжкі, флейта Пана, сапілка, саломка, гляк, танец, Ганна Шапашнікава – вакал, цымбалы, джамбеі, сінтэзатар, банборы, варган, гаршчок з вішнёвымі косткамі, Марына Неўгень – вакал, Аляксей Тарасевіч – вакал, джамбеі, сінтэзатар, Вадзім Шклярык – бас-гитара, Віктар Кульпін – дуда. Цягам трох год ансамбль удзельнічаў у клубных, акустычных канцэртах у музеях, на адкрытым паветры, даў сольны канцэрт «Песні аўтэнтычных перасяленцаў + цела Сахі Бохана» ў малой зале Палацу Рэспублікі (сакавік 2003), выступаў у дабрачынным канцэрце ў Цэнтральным Доме мастакоў (Масква, 2003). Намаганнямі калектыву напісана музыка да спектаклю «Прыгоды Пін-Піна» для Дзяржаўнага тэатру лялек Беларусі (рэж. С. Бень, 2003).

**Гастролі:** Расея (2006, 2007).

**Фестывалі:** фестываль індустрыяльнай музыкі (Мінск, лістапад 2002), фестываль новай музыкі «Свежы вецер» (Мінск, верасень 2002), фестываль авангарднай музыкі «Сіні перац» (Мінск, люты 2002), фестываль альтэрнатыўнай музыкі «Потёмки» (Мінск, студзень 2003), «Зажигалово» (Москва, 2003), «Вне формата» (Растоў-на-Доне, 2003), «Fiesta Borealis» (Алецка, Польшча, 2004), «Альтернет» (Мінск, травень 2004), «Никола-ленивец» (Калуга, Расея, 2006), Грушаўскі фестываль (Расея, 2006), «[другие][чужие]» (Расея, 2006), «Шэшоры» (Украіна, 2006) і інш.

**Узнагароды:** «Рок-карона 2006» у намінацыі «Пазітыўная музыка» (альбом «У Земли под юбкой»).

**Дыскаграфія:** нябачны канцэрт «Словеник дрымба» (дэма, снежань 2001), студыйна-палявы альбом «Забвения, ощущения...» (дэма, сакавік 2002), саўндтрэк «Прыгоды Пін-Піна» (дэма, снежань 2003), сінгл «У Земли под юбкой» (дэма, верасень 2003), **альбом** CD «У Земли под юбкой» («Новая музыкальная компания», 2005).

**Кіно, відэа: кліпы** «Утешение снегом» (рэж. Д. Маркін, 2004), «У Земли под юбкой» (2005); музыка для дакументальнага фільму «Возвращение лунного света» (рэж. С. Агеенка, 2006).

**Кантакт:** www.nagualia.net; nagual@tut.by
01.03.07//Д.П.

**«НАИЗНАНКУ»** – калектыў з Брэсту. Сабраўся ў чэрвені 1998 наступным складам: Дзмітрый Маслоўскі – гітара, вакал (← *«Негатив»*, адначасова «Рациональная диета»), Алег «Пацям» Сцепанюк – бас-гітара, вакал (← «Refuse», «Кола», «Капішча», «Негатив» → *«Onegin»*), Віталь Эпаў – духавыя (адначасова «Рациональная диета» → *«Охрана природы»*), Мікалай Сямітка – барабаны, перкусія (адначасова «Рациональная диета» → *«Onegin»*). Згодна з меркаваннем саміх музыкаў, група трымалася стылю «ўсходне-еўрапейскай прыгодніцкай музыкі», якая сумяшчала элементы прагрэсіў-року, фры-джазу, новай імправізаванай музыкі і інш. Падчас канцэртаў да групы далучаліся іншыя спецыяльна запрошаныя выканаўцы. У красавіку 2000 групу пакінуў А. Сцепанюк, і неўзабаве калектыў спыніў існаванне.

**Гастролі:** Польшча (цягам 1999–2000).

**Дыскаграфія: альбом** МС «Остатки событий» («Moral Insanity», Брэст, 1999); **трэкі** «Мыс Доброй Надежды» (у зборніку «Брест рок-журнал 2» – «Брестон», 1999), «Good kolbaski» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», 2006).

**Кантакт:** +375 (162) 42-50-94 (Андрэй Багданаў).

21.10.06//Г.Ш.

**НАСКОВІЧ АЛЯКСАНДР (Носкович Александр, Noskovich Alexandr)** – гітарыст, аўтар музыкі і тэкстаў.

Нарадзіўся 12.01.1965 у Мінску. У 1987 скончыў БПІ, факультэт гідратэхнічнага будаўніцтва па спецыяльнасці інжынер-гідратэхнік. Ігрой



на гітары авалодаў самастойна. У 1998–2000 выступаў у складзе групы *«Flat»* як спецыяльна запрошаны гітарыст. У 2001 заснаваў групу *«Slang»*, у складзе якой выступаў да 2004. У тым жа годзе ўвайшоў у склад групы *«40+–»*. Найбольш вядомыя песні «Три кота», «Другая весна», «Я буду ждать», «Блюз реки».

**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (штогод, 2001–06), удзел у тэлепраекце «Живой звук» (2006), «The Global Battle Of The Bands» (2006).

**Дыскаграфія:** у складзе групы «Slang» – CD «Другая дорога» (2004), у складзе групы «40+–» – сінгл «Дай мне слово» (2007).

**Іншая інфармацыя:** хобі – баскетбол, музычныя інструменты (гітары), аўтамабілі.

**Кантакт:** alanslang@tut.by

03.06.07//Д.П., фота Д.П.

**НАХМАНОВІЧ ЯКАЎ (Нахманович Яков, Nachmanovitch Jakov)** – кампазітар, аранжавальнік, саксафаніст.

Жыве і працуе ў ЗША.

**Дыскаграфія: трэкі** «Старт», «Танцуем», «Свет», «Мираж» (*«Группа*

*Валентина Бадьярова-2»*, LP «Дискоклуб 14 А» – «Мелодия», 1985).
**Кантакт:** jakobnakh@yahoo.com
10.02.07//Д.П.

**«НЕБОСКРЁБЫ»** – віцебская група.
Сабралася ў красавіку 1994 на аснове груп «Плинтус» і «Мама дала банку» з ініцыятывы Генадзя Контурава – гітара, вакал і Аляксандра Логвіна (Ролава), да якіх далучыліся Алег Абакунчык – бас-гітара, тэксты, Дзяніс Суліма – гітара, тэксты, Дзмітрый Герасімовіч – барабаны, Ігар Багачоў – баян, Глеб Падшывалаў – вакал, клавішныя. Восенню 1996 група як трыо (А. Абакунчык, І. Багачоў, Дз. Герасімовіч) запісвае другі альбом, на пачатку 1997 да іх далучаецца Кірыла Буланкоў – бас-гітара, вяртаецца Г. Падшывалаў, летам 2001 прыйшоў барабаншчык Аляксандр Кланюк. Склад калектыву напрыканцы 2004: Дз. Герасімовіч, Аляксандр Дзянісаў – гітара, Валянцін Касценка – барабаны, Мікіта Качурын – бас-гітара (→ студзень 2006). Рэпертуар групы заснаваны на расейскамоўных песнях, найбольш вядомая – «Пейнтбол».
**Гастролі:** канцэрты ў клубах Беларусі і Санкт-Пецярбургу.
**Фестывалі:** «Другая вода» (Магілёў, 1995).
**Дыскаграфія:** дэма «У соседа» (1994), «Кризис» (1996), **альбомы** CD «Придумали» (аўт. выд., 2001), EP «4» («BUTT-Records», Віцебск, 2003), «Между нами...» (аўт. выд., 2006).
16.04.06//Д.П.

**«НЕГАТИВ»** – брэсцкая група, якая працавала ў стылі гранджу.
Утварылася ў 1995, выступаючы першапачаткова складам: Алег Сцепанюк – гітара, вакал (← «Кола», → «Киндерсюрприз», *«Наизнанку»*, *«Onegin»*), Дзмітрый Маслоўскі – бас-гітара (→ «Рациональная диета», «Наизнанку»), Генадзь Дзедух – барабаны. У 1998 у групу прыйшоў барабаншчык Дзмітрый Пятручык (адначасова «Варштат», *«Woland»*). Летам 1998 група спыніла існаванне.
**Дыскаграфія: трэк** «Прошлогоднее солнце» (у зборніку «Брест-рок-журнал» – «Брестон», 1998).
**Кантакт:** +375 (29) 689-70-97 (Дз. Маслоўскі).
13.06.04.//Г.Ш.

**«НЕЙРО ДЮБЕЛЬ»** – мінская група. За аснову абрала стыль панкроку ці, як акрэсліваюць самі музыкі, – «дзвюхмоўны ракенрол».
Утварылася ў 1989 з ініцыятывы *Аляксандра Кулінковіча* і Генадзя Агейчыка. Дэбютавала на сцэне 4 кастрычніка 1991. У 1995 усталяваўся класічны склад групы: Аляксандр Кулінковіч – вакал, аўтар музыкі і тэкстаў, Юрый «Паскуда» Навумаў – гітара, падпеўкі, Максім Паравой – гітара, Стас Паплаўскі – бас-гітара, *Макс Івашын* – клавішныя, Андрэй Сцепанюк – барабаны.
У розны час у складзе калектыву выступалі *Ілля Шэўчык* – гітара, Андрэй Лявончык – клавішныя. Склад 2006: А. Кулінковіч, Ю. Навумаў, Віталь Абрамовіч – гітара, Уладзімір Сахончык – гітара (адначасова *«Зьмяя»*), Яўген Броўка – бас-гітара (адначасова «Зьмяя»), А. Сцепанюк.



Удзельнік канцэрту «Solidarni z Białorusią» (Варшава, 2006). Найбольш вядомыя песні «Каникулы с Чиччолиной», «Петрова, подай воды», «Резиновый дом», «Жыццё», «Гузік».
**Гастролі:** Расея, Польшча.
**Фестывалі:** «Балтийский берег» (Санкт-Пецярбург, 1998), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2006, 2007).
**Узнагароды:** «Рок-кароны» ў намінацыях «За лепшую інтэрпрэтацыю эстраднага шлягеру» («Здравствуй, чужая милая», 1996), «Лепшы кліп» («Охотник и сайгак», 1998), «Альбом году» («Охотник и сайгак», 1998), «Рок-карона 1998», «Альбом году» («Ворсинки и катышки», 1999), «Рок-карона 2004–05» у намінацыі «Альбом году» («Tanki»), Гран-пры Ленінградскага рок-клубу і прыз глядацкіх сімпатый на фестывалі «Балтийский берег» (Санкт-Пецярбург, 1998).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Тотальная дефлорация» («ГангрЭна Продакшн», 1991), «В жопе» («ГангрЭна Продакшн»,1991), «Ромашка. Из жопы с любовью» («ГангрЭна Продакшн»,1992), 2МС «Битва на мотоциклах» («ГангрЭна Продакшн»,1994), «Министерство» («ГангрЭна Продакшн»,1994), «Умные вещи. The Best, vol. 1&2» («Magic ART», 1995), «Жестокое самоубийство универсальной нарезкой Бернера» («ГангрЭна Продакшн», 1996), CD «Охотник и сайгак» («ПанРекордз», 1998), МС «Ворсинки и катышки» («Ковчег», 1999), CD «Народное достояние» (2000), «Пиар во время чумы» (аўт. выд., 2002), «П.И.О.Т.К.У.К.У.К.» («БМАgroup», 2002), «ПИАР во время чумы» («West Records», 2003), «Комиксы» («West Records», 2004), «Tanki» («Master Records», 2004), 2CD MP3 «Нейро дюбель» («Vigma», 2006); **трэкі** «Вологда» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Переехало комбайном» (у зборніку «20 супер-хитов, рожденных в Беларуси» – «Bulba Records», 2000), «I Feel You» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003),

«Вай-вай» (у зборніку «United We Stand» – «United Records», Канада, 1997), «Трамваи» (у зборніку «Digging It Up» – «Grob Records», ЗША, 1998), «Belarus uber alles» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004, у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006), «Охотник и сайгак» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006), «Das Piche» (у зборніку «Басовішча XVII», 2007).

**Кіно, відэа: кліпы** «Большая мечта» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2001), «Вася пьёт» (рэж. Ю. Бяржыцкі, 2001), «Время распрощаться» (рэж. А. Вечар, 1999), «Гагарин» (рэж. А. Вечар, 1997), «З Новым годам» (рэж. А. Вечар, 2003), «Каникулы с Чиччолиной» (рэж. А. Вечар, 2000), «Охотник и сайгак» (рэж. А. Вечар, 1998), «Переехало комбайном» (рэж. А. Вечар, 1998), «П.И.О.Т.К.У.К.У.К.» (рэж. А. Вечар, 2002), «С праздником» (рэж. А. Вечар, 1999), «Самолёты» (рэж. А. Вечар, 1999), «Я памру тут» (рэж. А. Вечар, 2002), «Гузік» (рэж. А. Вечар, 2005).

**Кантакт:** www.neurodubel.com; фан-сайт www.neurodubel.info; jim@neurodubel.com; +375 (29) 664-02-06 (А. Кулінковіч).

21.07.07//Д.П., фота С. Чарвякова.

**«НЕМО»** – рок-група, якая працуе ў Лідзе, Гродзенскай вобл.

Утварылася летам 1997, засноўваючы ўласную музыку на традыцыях рок-н-ролу і т.зв. «расейскага року». Пазней, з далучэннем новых музыкаў, саўнд і стыль групы змяніліся ў бок, як вызначаюць самі музыкі, рамантык-арт-року. Першапачатковы склад: Аляксандр Блахін – гітара, вакал, экзатычныя інструменты, Андрэй Рамашэўскі – гітара, вакал, Наталля Ваяйкова – віяланчэль, вакал, Юлія Яблонская – флейта, Павел Данілаў – дудка. Цягам гадоў у групе выступалі многія музыкі. У 2000 прыйшоў флейтыст Віталь Жыдаловіч, у запісе дагэтуль ня выдадзенага альбому «Чертополохам цвесть» у 2000 удзельнічаў гродзенскі барабаншчык Дзмітрый «Шаман» Драгуноў («POST», «Гравицаппа»). У 2003 склад групы павялічыўся за конт Дзмітрыя Красы – перкусія і Наталлі Батаргіной – скрыпка, вакал. На пачатку 2005 група выступала ў гэтым жа складзе, за выключэннем А. Рамашэўскага.

**Кантакт:** www.realmusic.ru/nemo; sadko_litsky@mail.ru; +375 (1561) 33-553; (29) 587-15-45.

06.02.05//Г.Ш.

**«НЕО»** – група з Мінску.

Утварылася летам 1995 пад назвай «Flammable». Працуе ў стылі прагрэсіў-року і выконвае пераважна ўласныя песні на ангельскай мове. Першапачатковы склад: Андрэй Маркуц – гітара, бэк-вакал (← *«Levee Break»*), Андрэй Краўцэвіч – вакал (1996 → *«Stokes»*, «Стереотипы»),



Алег Пастухоў – клавішныя, Кірыла Сенін – бас-гітара (→ «Stokes»), Анатоль «Тофік» Каляда – барабаны (1995–96, 1999–2002). Склад калектыву неаднаразова змяняўся.
У 1997 да групы далучыўся вакаліст Вадзім Касалапаў. 7 снежня 2000 група ўпершыню дала канцэрт пад новай назвай «НЕО», выступіўшы ў складзе В. Касалапаў, А. Маркуц, Юрый Фядзюк – бас-гітара (→ 1997–2002, *«Крама»*), А. Каляда, А. Пастухоў. Ад гэтага часу група заснавала рэпертуар на расейскамоўных песнях. У канцы 2004 група складалася з В. Касалапава, А. Маркуца, Валянціна Мяцельскага – клавішныя (← сакавік 2001), Івана Махновіча – барабаны (← сакавік 2003), Ціхана Золатава – бас-гітара (← лістапад 2002, адначасова *«Divina Enema»* → 2005 *«Svet Boogie Band»*).
Вясной 2001 група выступала ў Маскве ў рамках міжнароднай выставы «Record» разам з шэрагам вядучых расейскіх калектываў. У 2005 упершыню ў гісторыі беларускай музыкі, разам з сімфанічным аркестрам быў запісаны альбом «Дикая охота. Микст», заснаваны на матывах музыкі У. Солтана да оперы «Дзікае паляванне караля Стаха». У траўні 2007 калектыў пакінуў А. Маркуц, пасля чаго ў ім, апрача В. Касалапава, пачалі выступаць Святаслаў Чарнуха – барабаны, Уладзімір Міхновіч – клавішныя. Найбольш вядомыя песні «Ева», «Не волшебный», «Слышишь, Земля!», «Город снов».
**Гастролі:** выступленні ў гарадах Беларусі.
**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск, 2002).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Слышишь, Земля!» («West Records», 2002); сінгл «Душа» (аўт. выд., 2004), «Дикая охота. Микст» («West Records», 2005); **трэк** «Слышишь, Земля!» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000).
**Кіно, відэа: кліпы** – як «Flammable»: «Mariah Story» (1997); «Ева» (рэж. В. Касалапаў, А. Маркуц, 2002), «Вчерашний день» (рэж. А. Любецкі, 2005).
**Кантакт:** www.neo.byroot.com; multique@rambler.ru; +375 (29) 658-66-36.
16.05.05//Д.П.

**«НЕСТАНДАРТНЫЙ ВАРИАНТ»** – мінскае трыю, якое працуе ў стылі рэпу, выконваючы свае творы на расейскай і беларускай мовах.
Утварылася ў Барысаве ў 1998 як квінтэт. Выступалі складам: Васіль «Базыль» Садкоўскі, «Огурец», «Кузэн», Дзмітрый «Міх» Міхневіч, Аляксандр D.J.Шлаг Шалягін. Група дэбютавала на сцэне ў красавіку 1999. Ад лета 1999 выступае як трыо без «Огурца» і «Кузэна». Найбольш вядомыя песні «Легче станет», «Холод», «Бомж», «Не последнее слово», «Паветраны шар» (разам з *Лявонам Вольскім* і *«IQ48»*).
**Фестывалі:** «Adidas Streetball Challenge» (Масква, 2000), «Rap Music» (Санкт-Пецярбург, 2002), «In Da House» (Харкаў, 2002, 2003).
**Узнагароды:** 1 месца на фестывалі «Хіп-хоп нацыя 1999» у намінацыі «Лепшая маладая група», перамога ў намінацыі «Лепшая група году» на фестывалі «Хіп-хоп нацыя 2000»; 1 месца на цырымоніі «Мистерия звука 2005» у намінацыі «Рэлізы беларускіх выканаўцаў рэпу і хіп-хопу» (альбом «Не как все»).

**Дыскаграфія: альбом** CD «Не как все» («West Records», люты 2004); **трэкі** «Легче станет» (у зборніку «Beatsound №1» – 2000), «Паветраны шар» (у зборніку «Віза N.R.M.» – «БМAgroup», 2003); удзел у зборніках, выдадзеных у Расеі, Нямеччыне, ва Украіне.
**Кіно, відэа: кліпы** «Не последнее слова» (рэж. Лешы, 2004), «Разные судьбы» (рэж. Лешы, 2005), «Видят зло» (2005).
**Кантакт:** www.nestanda.com
24.10.05//Д.П.

**НЕСЦЯРОВІЧ АЛЯКСАНДР «ПРОКЛ» (Нестерович Александр, Nesterovich Aleksandr)** – піяніст, аўтар музыкі, аранжавальнік, гукарэжысёр.



Нарадзіўся 07.04.1955 у Калінінградзе, Расея. Ад самага дзяцінства жыве ў Мінску. У 1972–78 вучыўся ў БДК па класе фартэпіяна В. Шацкага. Рок-музыкай захапіўся падчас навучання ў сярэдняй школе.
У 1980–88 – музычны кіраўнік групы *«Сузор'е»*, пазней удзельнічаў у супольным праекце з Д. Зубрычам «Shugarfree» (альбо «NZ»).
У 1989–93 – аранжавальнік, піяніст, суаўтар музыкі групы *«Инспектор»*. Пазней працаваў як студыйны музыка, аранжавальнік, саўндпрадзюсэр, супрацоўнічаў з многімі маскоўскімі групамі, сярод іншых – з групай «Калинов мост». Апошнім часам займаецца як прадзюсэр такімі праектамі, як «Окно», «Виктория», *«По глазам»*, а таксама кіруе ўласным праектам музыкі ню-метал «Гетто».
**Гастролі:** СССР, Польшча (1981–85).
**Фестывалі:** у складзе групы «Сузор'е» – Усесаюзны конкурс «Крымские зори», конкурс «Юрмала 1988», Другі ўсесаюзны фестываль польскай песні «Віцебск 1990».
**Узнагароды:** у складзе групы «Сузор'е» – «Рок-карона 2001: За ўнёсак у развіццё беларускай рок-музыкі».
**Дыскаграфія:** у складзе групы «Сузор'е» – гл. 1983–87, CD «Кафе», «Рок-терапия», «Нелли + «Сузор'е» (аўт. выданні, 2002), «Песня пра зубра» (2007); **трэкі** «Let Him Go» (у LP зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Песня о Родине» (у LP зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987); у складзе групы «Инспектор» – «Russian Prayer» («Ariola-BMG», Нямеччына, 1993).
**Кіно, відэа:** аўтар саўндтрэку да фільму «Дьявольская карусель» (рэж. В. Крэчатаў, 1995).
**Кантакт:** +375 (17) 230-51-68.
15.09.07//Д.П., фота Д.П.

**НЕСЦЯРЭНКА ЮРЫЙ (Нестеренко Юрий, Nesciarenka Yuri)** – гітарыст, аўтар музыкі, выдавец, педагог.

Нарадзіўся 26.06.1965 у в. Прыбор Быхаўскага р-ну Магілёўскай вобл. У 1992 скончыў МІК па спецыяльнасці арганізацыя і методыка культурна-асветнай работы. Прафесійна займацца музыкай пачаў у 1982, калі стаў ініцыятарам стварэння групы «Последний шанс», рэпертуар якой быў заснаваны на расейскамоўных песнях груп «Воскресение», «Машина времени», «Динамик», «Круиз», а таксама песнях з рэпертуару груп «*Песняры*», «*Сузор'е*», аўтарскіх творах і інструментальных кампазіцыях. Падчас службы ў войску (1984–86) удзельнічаў у самадзейных калектывах ЧБВА. У часе навучання ў МІКу стварыў групу «Рок-транс-авто», удзельнічаў у мінска-полацкім праекце «Тутэйшыя», у 1997–98 – у магілёўскіх групах «Ринко», «Фэт Джон» і інш. У 1999 у Бялынічах сабраў групу блюзавай арыентацыі «White Night Blues», якая ў 2002 пераўтварылася ў «Нестар-бэнд», ад 2005 выступае пад назвай «Nestarы band». У 2002 распачаў выданне фэнзіну «Грифоман», у 2003 удзельнічаў у стварэнні музычнага праекту «Картинки Садовой улицы». У 2004 выступаў у складзе мінскай групы «*Blues Street Friends*», у 2006 стварыў праект «Call-Toll-Free». Аўтар музыкі да тэатральных пастановак. Найбольш вядомыя творы «Блюз белай ночы» (сл. А. Вайлаковай, сумесна з групай «*Крама*»), «Дзьве сьлязы» (сл. В. Слінко, сумесна з групай «*Палац*»), «Знаю столькі пяшчотаў» (сл. Б. Лесмяна), «Кветка» (сл. В. Слінко), «Лирическая пронзительная», «Эмигрантская», «Минорная» (усе на сл. Я. Лукіна), «Уже ударили дожди», «Не для нас», «Так любить» (сл. А. Салдаценка). Выступае й як журналіст, празаік, друкаваўся ў часопісах «Дзеяслоў», «РиО», газетах «Весь Могилёв», «Могилёвские ведомости», «Вестник Могилёва», «Знамя юности», «Weekend», «Немига», «Краязнаўчая газета» і інш.

**Фестывалі:** «Наваполацк 1989», фестываль аўтарскай песні (Магілёў, 1991, 1996), «Рок-акустика» (Магілёў, 1998), «Последний эшелон» (Магілёў, 1999), «Протяг-VI» (Роўна, Украіна, 2000), «Рок-фэст» (Слуцк, 2000), «Rock-n-roll Party» (Бабруйск, 2000), «Большие маневры» (Мінск, 2001), «Рок-кола» (Полацк/Наваполацк, 2001, 2005), «Рок апоўначы» (Віцебск, 2000, 2001, 2004), «Rock-Time» (Магілёў, 2002), «Рок-вакцина» (Магілёў, 2002), «Блюз жыве ў Мінску» (2005), «отНАШЕния» (Магілёў, 2006), «Varg-show» (Мінск, 2006).

**Дыскаграфія: альбомы** дэма МС «Последний шанс» (1988), «Советы, повести и приказы» (1999), «Жизнь с пиротехником» (2001), «Живьём с пиротехником» (канцэртныя запісы ў Брэсте, Магілёве, Гомелі, Мінску, Бялынічах, 2001), «Ordinary Jam» (канцэртны, 2002), «Сьвята вялікіх дажджоў» («Ковчег», 2006), «Пиротехнические этюды» («Ковчег», 2007); **трэкі** «Рок-кола 2001» (канцэртны запіс фестывалю), «Восточный рубеж» (зборнік груп Магілёўшчыны, 2001), «Блюз белай ночы» (разам з групай «*Крама*», у зборніку «Прэм'ер Тузін 2005» – «West Records», 2005), «Знаю столькі пяшчотаў» (у зборніку «Прэм'ер Тузін

2006» – «West Records», 2006).
**Кіно, відэа: кліп** «Подарите себе роман» (у выкананні Наталлі Батраковай і Сяргея Сухамліна, рэж. *Тамара Лісіцкая*, 2005).
**Кантакт:** +375 (2232) 52-458, (29) 557-87-95.
25.10.07//Д.П.

**«НЕУМОЛКАЕМЫЕ»** – мінская рэп-каманда.
**Дыскаграфія: альбом** CD «Пойдём с нами» («West Records», 2006).
**Кіно, відэа: кліп** «Сияние» (2006).
06.04.06//Д.П.

**НІКАЛАЕЎ УЛАДЗІМІР (Николаев Владимир, Nikolaev Vladimir)** – мультыінструменталіст.
Нарадзіўся 22.06.1947 у с. Шалыгіна Сумской вобл., Украіна. Скончыў музычную вучэльню, працаваў музычным кіраўніком клубу ў г. Красавіна, Расея, пасля быў запрошаны піяністам і артыстам мімансу ў ансамбль «Новый электрон». У 1972 прыехаў у Мінск і быў прыняты ў склад ансамбля *«Песняры»*, дзе граў на клавішных, трамбоне, саксафоне. У 1983 пакідае «Песняроў», ад 1985 некаторы час працаваў піяністам у складзе ансамбля С. Беліkава. У канцы 80-х пакідае сцэну, з'язджае на радзіму, жыве на пенсію па інваліднасці. У 1999 перанёс складаную аперацыю, грошы на якую збіралі, сярод іншых, і *«Белорусские Песняры»*, А. Макарэвіч. У 2005 далучыўся да праекту *Аляксандра Дзямешкі «Лявоны-Песняры»*, удзельнічаў у шэрагу канцэртаў, у тым ліку з БДА *«Песняры»*, *Анатолем Кашапаравым.*
**Гастролі:** гл. «Песняры».
**Фестывалі:** гл. «Песняры».
**Дыскаграфія:** гл. «Песняры».
**Узнагароды:** гл. «Песняры».
**Кнігі:** аўтар успамінаў «Записки песняра».
**Кантакт:** праз Ігара Елісейкіна eliseykin@region.adm.yar.ru
07.11.06//Д.П.

**«НОВАЕ НЕБА»** – мінская група.
Утварылася ў 1991 з ініцыятывы выканаўцы аўтарскай песні *Касі Камоцкай* і гітарыста *Леаніда Шырына.*
У аснову творчасці была пакладзена філасофская і сацыяльная паэзія сучасных беларускіх аўтараў. Песні выконваліся на беларускай мове. На працягу некалькіх гадоў у складзе калектыву выступалі ўдзельнікі групы *«Мроя»*, з 1997 іх змянілі музыкі групы *«Ulis»*. Пасля 2000 група практычна спыніла існаванне, адно К. Камоцкая час ад часу выступае з акустычнымі канцэртамі. Сярод найбольш вядомых песень «Чарга па хлеб», «Котка», «Сон у трамваі» (усе – сл. *Адама Глёбуса*), «Людзі на балоце» (сл. *Лявона Вольскага*), «Мая краіна», «Чаканне калядаў», «Цэпэліны» (усе – сл. *Міхала Анемпадыстава*), «Белая лебедзь» (сл. А. Сыса).
**Фестывалі:** «Рок-каранацыя» (1994–96), «Roskild» (Данія, 1993).
**Узнагароды:** «Рок-карона 1994» у намінацыі «Альбом году» («Сон у трамваі»).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Дзеці чорнага гораду» («Ковчег», 1991), «Сон у трамваі» («Ковчег», 1994), «Go home» («Ковчег», 1995), «Мая краіна» («Ковчег», 1996), «Выбранае» («Ковчег», 1997), CD «Novaje

Nieba. Лепшае» («Ковчег», 1999, перавыд. 2006), «Cepieliny» («Ковчег», 1999), «Акустыка» («БМAgroup», 2005); **трэкі** «Котка» (у зборніку «Вольныя танцы: новая альтэрнатыва» – «БМAgroup», 2000), «Белая лебедзь», «Сон у трамваі» (у зборніку «Вольныя танцы: слухай сваё» – «БМAgroup», 1999).

**Кіно, відэа: кліпы** «Дом» (рэж. *Анатоль Вечар*), «Неба мяняе колер» (рэж. А. Вечар), «Цэпэліны» (рэж. У. Маркевіч, 1999).

**Кантакт:** kkasia@tut.by

21.01.06//Д.П.

**НОВІК-ПЯЮН СЯРГЕЙ (Новик-Пеюн Сергей, Novik-Piajun Siarhey)** – паэт, празаік, аўтар музыкі.

Нарадзіўся 14 (27).08.1906 у в. Лявонавічы Слуцкага павету Менскай губ., цяпер – Нясвіжскі р-н Мінскай вобл., памёр 26.08.1994, пахаваны на радзіме. У 1918–24 вучыўся ў расейскай гімназіі Нясвіжу, у 1926 скончыў беларускія настаўніцкія курсы ў Вільні.

У 1926 стварыў у в. Лявонавічы беларускі народны хор і беларускі народны тэатр. Быў тройчы арыштаваны польскімі ўладамі. У 1939–40 працаваў інспектарам Слонімскага райаддзелу народнай адукацыі. Яго арыштаваў слонімскі СД у 1943. Падчас расстрэлу ў ліпені 1944 цудам выратаваўся.

У снежні 1944 арыштаваны Савецкай уладай, асуджаны на 10 гадоў лагераў. Рэабілітаваны ў 1958. Ад 1960 жыў у Мінску. Упершыню выступіў у друку з вершамі ў 1925. Часта пісаў музыку да ўласных вершаў («Квітней, мой горад»). Сярод найбольш вядомых песень «Зорачкі», «Над Шчарай», якія, па сутнасці, набылі статус народных.

**Дыскаграфія: трэкі** «Зорачкі» (у зборніку «Я нарадзіўся тут», *Аляксандр Памідораў* – выд. А. Сушы, 2000), трыб'ют «Дні лятуць. Песьні з-за кратаў» (розныя выканаўцы, «БМAgroup», 2006).

**Кнігі:** зборнікі вершаў «Заўсёды з песняй», «Песьні з-за кратаў», нявыдадзеная кніга песень.

**Кіно:** песня ягонага аўтарства «Сэрца, не плач!» гучыць у дакументальным фільме «Боль мой – Хатынь» (1969).

На падставе даведніка «Беларускія пісьменнікі», Д.П.

**«НОВЫЕ ДЖАЗЕРЫ»** – мінская джаз-група, якая засноўвае рэпертуар на класічных п'есах джазу і аўтарскіх творах.

Утварылася на пачатку 1995 і па першым часе называлася «Power Mind». Працуе ў стылях джаз-року, фанку, пап-джазу. У першым складзе калектыву выступалі *Юрый Герашчанка* – лідэр, клавішныя, Андрэй Церабеж – альт-саксафон, Сяргей Пузевіч – бас-гітара, Станіслаў Дуброўскі – барабаны. У розныя гады ў калектыве выступалі Міхаіл Пенда – барабаны (→ *«Белорусские Песняры»*, *«J:морс»*), Андрэй Сівец – барабаны, Аляксандр Саліенка – гітара. У 2003 група выступала наступным складам: Ю. Герашчанка (адначасова група *Ірыны Дарафеевай*), А. Церабеж, Антон Машкала – тэнар-саксафон, флейта, Уладзіслаў Мазуркевіч – гітара, С. Пузевіч, С. Дуброўскі.

**Фестывалі:** «Беларуская музычная восень 1995», Беларускі фестываль эстрадных аркестраў (1997, 1999, 2001), FIMU (Францыя, 2001), «Грифомания» (Мінск, 2002), «Саксомания» (Мінск, 2003).

**Кантакт:** nwjaz.narod.ru; gerajazzer@rambler.ru, +375 (29) 750-05-95, (29) 771-59-15.
10.09.07//Д.П.

**«НОВЫЙ ИЕРУСАЛИМ»** – група з Мінску, якая ўтварылася ў 1992. Выконвае песні хрысціянскай тэматыкі на расейскай і ангельскай (за мяжой) мовах у стылі класічнага року. Ад пачатку заснавання калектыву ягоны склад застаецца нязменным. У 2005 у групе выступалі Аляксандр Патліс – вакал, Ігар Капылоў – гітара, вакал, Ігар Сарокін – бас-гітара, Вадзім Калацей – клавішныя, Аляксандр Манецкі – барабаны, Эльшад Бабаханаў – перкусія. Праз год пасля ўтварэння група здзейсніла першае турнэ па ЗША, даўшы на працягу 30 дзён 26 канцэртаў. Пазней многія свае альбомы група запісвала менавіта ў час наведання ЗША. Найбольш вядомыя песні «Я знаю любовь», «Неба осколки», «Любовь в ладонях». У 2006 А. Патліс пайшоў з калектыву, распачаўшы сольную кар'еру.

**Гастролі:** Расея (2004, 2006), Латвія (2004), Ізраіль (2004), Украіна, ЗША (1993–95, 1997, 1999, 2005), Эстонія (2005).

**Фестывалі:** «Мосты любви» (Санкт-Пецярбург, 2001), «Рок-каранацыя 1997» (Мінск), «Белые ночи на Тарханкуте» (Еўпаторыя, 2005).

**Узнагароды:** Гран-пры фестывалю «Мосты любви» за песню «Глаза цвета неба» (2001), «Рок-карона 1997» у намінацыі «Песня году» («Я знаю любовь»).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Бог святой» (аўт. выд., 1993), «Возвращайся домой» (аўт. выд., 1995),



«Ну что ты думаешь об этом?» (аўт. выд., 1997), «Novi Ierusalim Live In Concert» (канцэртная версія альбому «Ну что ты думаешь об этом?» – аўт. выд., 1998), «Новый Иерусалим» (аўт. выд., 1999), «Novi Ierusalim» (аўт. выд., 2001), «The Best» (аўт. выд., 2002), «Неба осколки» (аўт. выд., 2002, перавыд. «West Records», 2004), «The Fragments Of Heaven» (ангельскамоўная версія альбому «Неба осколки» – аўт. выд., 2002), «Время благоприятное» (аўт. выд., 2004), «Линии сердца» (2007), сінгл «Я подарю тебе» («West Records», 2005).

**Кіно, відэа: кліпы** «I Know That Love» (1997), «Дверь» (рэж. Д. Гудман), «Любовь в ладонях» (рэж. А. Шульга, 2004), «Неба осколки» (рэж. А. Шульга, 2004), «Это любовь» (рэж. А. Шульга), «Другая жизнь» (разам з *Іскуі Абалян*, рэж. А. Бутар, 2005), «Дети одной любви» (2007); DVD «Новый Иерусалим» (аўт. выд., 2005).

**Кантакт:** афіцыйны сайт www.newjerusalemnow.com; неафіцыйны сайт www.novi.name; pr_novi@tut.by; +375 (29) 642-87-01 (Святлана Агейчык).
30.09.07//Д.П.

**НЯКЛЯЕЎ УЛАДЗІМІР (Некляев Владимир, Nekliaev Vladimir)** – паэт, празаік, эсэіст, аўтар песенных тэкстаў.

Нарадзіўся 09.07.1946 у Смаргоні Гродзенскай вобл. Вучыўся ў Мінскім электратэхнікуме сувязі (1966), па сканчэнні працаваў сувязістам на Поўначы СССР, у Сібіры, на Далёкім Усходзе, радыёмеханікам у тэлеатэлье Мінску. З 1971 вучыўся на аддзяленні паэзіі Літаратурнага інстытуту ў Маскве, ад 1973 – на філалагічным факультэце педагагічнага інстытуту імя М. Горкага, Мінск. У 1972–75 займаўся журналістыкай, у 1975–78 рэдагаваў бюлетэнь «Театральный Минск», у 1978–80 – рэдактар, аглядальнік Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм БТ, у 1980–87 – кіраўнік літаратурнага аб'яднання пры газеце «Знамя юности», у 1987–98 – галоўны рэдактар часопісу «Крыніца» («Родник») і штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Ад 1998 да 2001 – старшыня Саюзу беларускіх пісьменнікаў. У 2001–04 жыў і працаваў у Варшаве і Хельсінкі. Ад 2005 – старшыня Беларускага ПЕН-цэнтру. Першыя літаратурныя публікацыі з'явіліся ў перыядычным друку ў 1970. Першы зборнік вершаў «Адкрыццё» выдадзены ў 1976.



Аўтар тэкстаў мноства вядомых песень, напісаных на музыку вядучых беларускіх кампазітараў, – *Яўгена Глебава*, *Ігара Лучанка*, *Валерыя Іванова*, *Уладзіміра Будніка*, *Васіля Раінчыка*, *Уладзіміра Кандрусевіча* і інш. Першая песня «Два неба» на музыку *Эдуарда Зарыцкага* датаваная 1973. У 1983–85 разам з *Леанідам Захлеўным* стварыў цыкл патрыятычных песень «Поле памяці», якія прынёс вядомасць першаму яго выканаўцу *Яраславу Еўдакімаву*. Найбольш вядомыя песні «Любви прощальный бал», «Карнавал», «Караван» (для ансамбля *«Верасы»*), «Сёння ў нашай хаце свята», «Гуляць дык гуляць» (для ансамбля *«Сябры»*), «Милую тебя», «Честь имею» (для ансамбля *«Песняры»*), «Світанак» (муз. І. Лучанка). Аўтар тэкстаў песень для кіно і тэатру. Мастацкі кіраўнік праекту «Беларусачка» – альбому аўтарскіх і народных песень *Анжалікі Агурбаш*.

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Замова. Песні на вершы У. Някляева» («Vigma», 1996), CD «Танга з ружай» (*Зміцер Вайцюшкевіч*, «West Records», 2006); **трэкі** «На мяжы растанняў і сустрэч», «Рассвет», «Музыка для всех» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), у 2 LP «Музыка для всех» ансамбля

«Верасы» («Мелодия», 1985), «Ты мне удачу нагадай» (муз. У. Буднiка, у EP *«Группа Валентина Бадьярова»* – «Мелодия», 1983), «Вот и наша пора» (муз. I. Лучанка, ансамбль «Сябры», у LP «Живая вода» – «Мелодия», 1982), «Зямля мая», «Поле памяцi» (муз. Л. Захлеўнага, у LP «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985), «Чур-чура» (муз. В. Раiнчыка, у LP ансамбля «Верасы» «Наша дискотека» – «Мелодия», 1980), «И поэтому жизнь продолжается» (муз. Л. Захлеўнага), «Зямляне» (муз. У. Буднiка), абедзве ў зборнiку «Как слово наше отзовётся. Песни молодых композиторов» – «Мелодия», 1983.
**Кнiгi:** «Вынаходцы вятроў» (Мiнск, 1979), «Знак аховы» (Мiнск, 1983), «Местное время» (Масква, 1983), «Наскрозь» (Мiнск, 1985), «Дерево боли» (Масква, 1986), «Галубiная пошта» (Мiнск, 1987), «Веда» (Мiнск, 1989), «Прошча» (Мiнск, 1996), «Выбранае» (Мiнск, 1998), «Так» (Мiнск, 2004); раман на тэму музыкi «Лабух» (2004).
**Кантакт:** http://nekliaev.by; neklyaev@yandex.ru
24.11.06//Д.П., фота С. Шапрана.

**НЯРОНСКI МIКАЛАЙ (Неронский Николай, Niaronski Mikalay)** – гiтарыст, бас-гiтарыст, кампазiтар, аранжавальнiк, гукарэжысёр.
Нарадзiўся 18.12.1959 у Мiнску. Iгрой на гiтары, пазней – на бас-гiтары авалодаў самастойна. У 1977 пачаў працу ў БДФ у ансамблi В. Шутавай. Ад 1981 – бас-гiтарыст ансамбля *«Песняры»*, у 1987–89 – музыка ансамбля *«Тонiка» Вiктара Вуячыча*, ад 1990 – у *Дзяржаўным канцэртным аркестры*



*Беларусi*. З 1996 – штатны супрацоўнiк Тэатру моладзевай эстрады, удзельнiк джаз-трыо *Аркадзя Эскiна* (2001–03), пазней выступаў з уласным трыо. Аўтар iнструментальных п'ес «Мiленiум», «Привет, Марк!», «Сайгон», кампазiтар i аранжавальнiк песень для *Iрыны Дарафеевай, Мiкалая Скорыкава, Ларысы Грыбалёвай, Анжалiкi Агурбаш* («Останься!»), А. Цiвунова, А. Сямёнава.
**Дыскаграфiя:** удзельнiчаў у запiсе альбомаў «Песняроў», I. Дарафеевай («Рано или поздно» – «Doris-records», 2000), трыо А. Эскiна «What's News?» («Ковчег», 2005); **трэкi** «Расцвела сирень» (у зборнiку «Красное танго. Песни на стихи *Александра Легчилова*» – «TON-Records», 1999).
**Кантакт:** www.nikobass.com
05.03.06//Д.П., фота Д.П.

**«NAKA»** – мінская група. Утварылася ў ліпені 2004, выконваючы музыку ў стылі альтэрнатыўнага року. Ініцыятарам стварэння гэтага расейскамоўнага калектыву стала актрыса Дзяржаўнага расейскага драматычнага тэатру імя М. Горкага Настасся Шпакоўская, да якой найперш далучыліся выканаўца на клавішных і акардэаніст Антон Бароўскі і гітарыст Андрэй Папкоў. У верасні 2004 група пабагацела на бас-гітарыста Сяргея Пузевіча і гітарыста Аляксандра Лантуха. У снежні ў калектыў прыйшоў барабаншчык Дзмітрый Рыбакоў. Цяперашні склад калектыву: Н. Шпакоўская – вакал, музыка і тэксты, Ірына Кліменка – клавішныя, Mr. Nekto – бас-гітара, Дз. Рыбакоў, Дзяніс Тарасенка – гітара, Сяргей Гарбатскі – гітара. У студзені 2005 група падпісала кантракт з маскоўскай кампаніяй «Прологмьюзик» (RDM). Найбольш вядомыя песні «Кома», «За дождем», «Дорога».

**Фестывалі:** «Окна открой!» (Санкт-Пецярбург, 2005), фестываль-конкурс «MuseOn 2006» (Масква), «Крылья» (Масква, 2006).

**Узнагароды:** 2 месца на фестывалі-конкурсе «MuseOn 2006» (Масква).

**Дыскаграфія: альбом** «Тебе» («West Records», 2005); **трэкі** «Дорога» (у зборніку «15 НАШИХ» – «Прологмьюзик», Расея, 2005), «Кома» (у зборніку «16 НАШИХ» – «Прологмьюзик», 2005), «Крылья» (у зборніку «Даешь рок!» – «Grand Records», 2005), «По нулям» (у зборніку «Охота-14» – «Бомба-Питер», 2005).

**Кіно, відэа: кліпы** «Нака» (рэж. А. Канановіч, 2005), «Гопница» (2005), «Хочу уснуть я» (рэж. А. Кановіч, 2006), «Дорога» (рэж. Ю. Стаюнічаў, 2007), «Фабрика звёзд» (2007), «Нет меня» (2007), «Мой герой – Таня Буланова» (рэж. М. Сіры, 2007).



**Кантакт:** www.naka.by.com; менеджэр Андрэй Ісачэнка a-isa@mail.ru, +375 (29) 681-37-77.

03.09.07//Д.П., фота Д.П.

**NILS** – артыстычны псеўданім выканаўца папулярных песень Вячаслава Лышчыка.

Нарадзіўся 21.02.1981 у Мінску. Вучыўся ў музычнай школе па класе гітары. Скончыў Інстытут права па спецыяльнасці юрыст. Дэбютаваў на сцэне ў складзе дуэту «XL», які спыніў існаванне ў 2003, пасля чага распачаў сольную кар'еру. Спявае на расейскай мове. У 2004 удзельнічаў

у двух расейскіх песенных конкурсах: «Новая волна» (дайшоў да паўфіналу) і «Народны артыст» (трапіў у фінальную трыццатку).
**Дыскаграфія: альбом** CD «Виновата любовь» (2005).
**Іншая інфармацыя:** захапляецца каратэ.
06.04.06//Д.П.

**«NITKIE»** – віцебская група, вытокі якой – у 1996.
У студзені 1998 сфармаваўся першы склад, які праз месяц даў першы канцэрт: *Максім «Макс» Жукаў* – барабаны, голас, Уладзімір «Усы» Зайцаў – бас-гітара, Сяргей «Дэз» Дасужаў – гітара. Рэпертуар групы заснаваны на ангельскамоўных аўтарскіх песнях, вытрыманых у стылі псіхабілі. Ад заснавання калектыву яго-ны склад не мяняўся. Група дала шэраг канцэртаў у клубах Віцебску, Масквы, Санкт-Пецярбургу.
**Фестывалі:** агляд-конкурс «Беларусь – мая песня» (Віцебск, 1998), «Студэнцкая вясна 1998» (Віцебск), «Экосток» (Магілёў, 1999), «Next Stop – New Life» (Віцебск, 2000).
**Дыскаграфія: альбомы** EP «XXX» («BUTT Rec.», 1999), CD «Twelve Radio Knives» («Кап-Кан Records», Расея, 2003), «Rita Gerro's Head» («FCR Records», Расея, 2006); **асобныя трэкі** выдаваліся ў зборніках CD «High Voltage, vol. 2-3» («Black Sky Records», Нямеччына, 2000), MC «Blow Up This Town, vol.1» («BUTT Rec.», 2000), CD «Psychoburg. The Happy End» («Кап-Кан Records», Расея, 2001), CD «Клаустрофобия» («Aist Records», Беларусь, 2001), CD «Российский панк-обстрел 2» («Neuro Empire Rec.», Расея, 2001), CD «Psychobilly Frenzy» («Downer Records», Японія, 2001), CD «Типа… панки и все такое 5» («FeeLee Records», Расея, 2002), MC «Punks vs Hardcore, vol.1» («BUTT Rec.», 2002), CD «Aloha from East Europe» («BRP Records», Расея, 2004).
**Кантакт:** www.zhukov.tv; nitkie@tut.by; 210032, а/с 11А, Віцебск, Беларусь, Жукаву Максіму Леанідавічу.
23.12.06//М.Ж.

**«N.R.M.» («НЕЗАЛЕЖНАЯ РЭСПУБЛІКА МРОЯ»)** – група з Мінску.
Утворана ў 1994 музыкамі групы *«Мроя»*. Склад: *Лявон Вольскі* – гітара, вакал, аўтар музыкі і тэкстаў, Алесь Дземідовіч – барабаны, *Піт Паўлаў* – гітара, бэк-вакал, Юрась Ляўкоў – бас-гітара, бэк-вакал. Выступае ў стылі альтэрнатыўнай эклектыкі (з вызначэння саміх музыкаў). У гонар групы быў выдадзены трыб'ют «Віза «N.R.M.» («БМАgroup», 2003). Сярод найбольш вядомых песень, якія выконваюцца на беларускай мове, «Песьні пра каханьне», «Тры чарапахі», «Партызанская», «Паветраны шар», «Лёгкія-лёгкія».
**Фестывалі:** «Рок-каранацыя», «Басовішча» (неаднаразова – Гродэк, Польшча).
**Узнагароды:** «Рок-карона 1996» у намінацыі «Песня году» («Партызанская»), «Рок-карона 1997» і ў намінацыі «Альбом году» («Народны альбом»), «Рок-карона 1999» у намінацыях «Праект году» («Сьвяты вечар 2000»), «Песня году» («Паветраны шар»), «Музыкант году» (Піт Паўлаў), «Рок-карона 2000» і ў намінацыях «Падзея году» (праект



«Я нарадзіўся тут»), «Лепшыя тэксты», «Песня году» («Тры чарапахі»), «Альбом году» («Тры чарапахі»), «Рок-карона 2006» у намінацыі «Песня году» («Гадзючнік»).

**Дыскаграфія: альбомы** MC «LaLaLaLa» («Ковчег», 1995), «Одзірыдзідзіна» («Ковчег», 1996), «Made In N.R.M. Песьні 95-96» («Ковчег», 1997), CD «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.» («Ковчег», 1998), 2CD «Акустычныя канцэрты канца 20 стагоддзя» («Ковчег», 1999), сінгл «Самотнік» («Ковчег», 2000), CD «Тры чарапахі» («Bulba Records», 2000), «Дом культуры» («N.R.M.», 2002), «Справаздача» («БМAgroup», 2004), «06» («N.R.M.», 2007); **трэкі** «Я паставіў коніка» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Тры чарапахі» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000, у зборніку «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000), «Катуй-ратуй» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Песьні пра каханьне», «Песьня падземных жыхароў» (у зборніку «Вольныя танцы» – «БМAgroup», 1999), «Мая мэнтальнасьць» (у зборніку «Вольныя танцы: новая альтэрнатыва» – «БМAgroup», 2000), «Personal Jesus» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Лясная песьня» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004), «Гадзючнік» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006), «Тры чарапахі» і «Маё пакаленьне» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006).

**Кіно, відэа: кліпы** «Одзірыдзідзіна» (рэж. *Анатоль Вечар*), «Паветраны шар» (рэж. А. Вечар), «Песьні пра каханьне» (рэж. А. Вечар), «Чыстая-сьветлая» (рэж. А. Вечар).

**Кантакт:** www.nrm.by.com; lvolski@hotmail.com (Л. Вольскі); petepaff@tut.by (П. Паўлаў); +375 (29) 652-80-81 (Л. Вольскі).

21.07.07/Д.П.




**«ОКРУГ СВОБОДНОГО ИСКУССТВА»** – група з Магілёву. Ад канца 2004 выступае пад назвай *«Osimira»*.

**Дыскаграфія:** «Кола» (2001).

**ОСІПАЎ СЯРГЕЙ (Осипов Сергей, Osipau Siarhei)** – флейтыст, аранжавальнік, гукарэжысёр.

Нарадзіўся 29.08.1971 у Мінску. У 1985 скончыў ДМШ па класе ўдарных, ад 1989 правучыўся два гады ў ММВ, служыў у войску, ад 2003 да сёння – студэнт дыстанцыйнага навучання «Berklee College of Music» (Бостан, ЗША). Творчы шлях пачаў у 1982 як барабаншчык групы «Дом кино», ад 1985 выступаў у складзе ансамбля народных інструментаў ДК прафтэхадукацыі, у 1992 граў на флейце, гітары, барабанах у групе «Nevermore», у 1993–94 жыў у Англіі, выступаў як флейтыст і гітарыст у складзе групы «Amalgamated Passages», у 1995–97 – кампазітар, аранжавальнік, флейтыст і вакаліст групы *«Лявоны»* пры БДА *«Песняры»*. У 2001–02 працаваў у студыі Ч. Немэна (Польшча), ад 2004 – аранжавальнік, гукарэжысёр ансамбля *«Песняры» п/к Л. Барткевіча*. Як аранжавальнік працаваў з «Лявонамі» («Мілая дзяўчына», 1996), *Якавам Навуменкам* («Крынічанька», «Дарожка буйная», 1997), БДА «Песняры» («Спадчына», 1997), дуэтам «Овация» («Холодно», 2001), *Сяргеем Кавалёвым* («Точка.by», 2003); як прадзюсэр працаваў з мінскай групай *«Чистое серебро»*; як студыйны гукарэжысёр – з Я. Навуменкам, Т. Молчан, БДА «Песняры», групамі «Чистое серебро», «Овация», *«Любовь и спорт»*, С. Кавалёвым, «Песнярамі» п/к Л. Барткевіча; як канцэртны гукарэжысёр – з ВІА *«Синяя птица»*, Н. Бабкінай, І. Кабзонам, А. Пахмутавай, В. Талкуновай, сімфанічным аркестрам Масквы «Русская филармония», ВІА «Песняры» п/к Л. Барткевіча.

**Гастролі:** у складзе ВІА п/к Л. Барткевіча – Расея.

**Фестывалі:** Усесаюзны фестываль моладзі (1989), «Славянский базар» (1997, 2002), фестываль беларускай культуры (Польшча, 2002).

**Кіно, відэа: кліпы** «Мілая дзяўчына» (рэж. *Тамара Лісіцкая*, 1996), «Дарожка буйная» (БТ, 1998), «Морем-небом» (рэж. М. Носаў, 2004).

**Кантакт:** amcb@mail.ru

24.12.06//Д.П.

**«ОТРАЖЕНИЕ»** – група з Мазыру. Утварылася летам 1980 і ад пачатку трымалася стылю хард-року і хард-энд-хэві, выконваючы пераважна аўтарскія творы на расейскай, пазней – ангельскай мовах. Вядомасць атрымала пасля ўдзелу ў фестывалі «Наваполацк 1987». Тады ў складзе групы выступалі Уладзімір Клименка – лідэр, гітара, Уладзімір



Калеснікаў – вакал, гітара, Васіль Кандрацюк – бас-гітара, *Анатоль Марціновіч* – клавішныя, Міхаіл Усаў – барабаны. У розны час у групе выступалі Васіль Кнышчук – барабаны (1991–95), Міхаіл Брусаванік – гітара (1980–81), Генадзь Койфман – клавішныя (1982–85), Леанід Конанаў – вакал (1982). На пачатку 2006 група працавала як квартэт У. Кліменка, У. Калеснікаў, В. Кандрацюк, М. Усаў. Найбольш вядомыя песні «Микрофон» (сл У. Высоцкага), «Держись, я с тобой!», «Мы там, где льют металл».

**Гастролі:** Польшча, Чэхаславакія (1987).

**Фестывалі:** I Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Наваполацк 1987», «Рок-фэст» (Чэхаславакія), «Парад надежд» (Мінск, 1988).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Фортуна» (аўт. выд., 1986), «Мы там, где льют металл» (аўт. выд., 1987), «В пещере Горного Короля» (аўт. выд., 1989), CD «Goodbye, USSR» («RTX-Records», Вялікабрытанія, 1993), «Держись, я с тобой!» (Аўстрыя, 2001); **трэкі** «Нашто бабе агарод» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Come Back To Me», «I'm Crazy Now», «Terri» (у зборніку «Western Dreams» – «RTX Records», 1993).

**Кіно, відэа: кліпы** «Держись, я с тобой!» (рэж. А. Дзебалюк, 1999), «Блюз» (рэж. А. Дзебалюк, 1999), «Не плачь» (рэж. А. Дзебалюк, 1999), «Wild Cat» (рэж. *Тамара Лісіцкая*, 1999), «Верь только в любовь» (рэж. Т. Лісіцкая, 2000).

**Кантакты:** www.artstudiopro.com; +375 (29) 738-26-29 (У. Калесьнікаў).

25.04.06//Д.П., фота Я. Мяцеліцы

**«ОХРАНА ПРИРОДЫ»** – група з Брэсту. Утварылася ў 1996 і выступала, паводле саміх музыкаў, у стылі бард-року, гаражнага року, графт-року і таталітарнай акустыкі. Першапачатковы склад: Дзмітрый «Палярнік» Мішын – вакал, гітары, тэксты, Ігар «Торч» Галаўко – вакал, гітара, тэксты, Аляксей «Гарын» Лагашоў – бас-гітара, Генадзь «Дос» Гурпа – барабаны. Пры гэтым ад 1997 да 1998 група выступала як дуэт Мішын-Гурпа, наступныя два гады гэта быў наагул сольны праект





Дз. Мішына. У 2000–03, апрача Дз. Мішына, у групе выступалі Аляксей Бергамотаў – кантрабас, Аляксандр Костамозгаў – акардэон, Віталь Эпаў (← *«Наизнанку»*, «Рациональная диета») – фагот, саксафон, кларнет, Аляксандр «Ляснік» Міхальчык – флейты, пластыка, Яўген Аляксееў (адначасова «Рациональная диета») – электраарган. Склад 2004: Дз. Мішын, В. Эпаў, А. Бергамотаў, Анатоль Тадорскі – барабаны (← *«Дай дорогу!»*).

**Фестывалі:** міжнародны фестываль андэграўнднай музыкі «БелЭльба» (Брэст, 2000–03), «Свежий ветер» (Мінск, 2003).

**Дыскаграфія: трэк** «Pirvolajnen» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», Брэст, 2006).

**Кантакт:** polyarnik@tut.by; +375 (162) 43-58-84, (162) 23-73-25.

21.10.06//Г.Ш.

**«ONEGIN»** – брэсцкі калектыў. Утварыўся ў траўні 2000 і першапачаткова выступаў пад назваю «Снайперы» (да кастрычніка 2000). Першы склад: Юрый Юрчык – басгітара (← *«Peacemaker»*), Алег «Пацям» Сцепанюк – гітара, вакал (← *«Негатив»*, «Кола», «Киндерсюрприз», *«Наизнанку»*), Мікалай Сямітка – барабаны (← «Рациональная диета», «Наизнанку»), Юрый Карагода – гітара (← «Peacemaker»). Група выступае ў стылі гранджу, пост-гранджу, альтэрнатывы, выконваючы песні па-расейску.

**Гастролі:** тур па Польшчы разам з групамі «Myslovitz», «De Mono», «Mafia», «Hey», «Bracia Cugowscy» (2003).

**Фестывалі:** «Belarusification» (Мінск, 2001).

**Дыскаграфія: альбомы** MC «Город дорог» (Брэст, «Спасение», 2001), CD «Не верь никому!» (аўт. выд., 2004); **трэкі** «Поломанные» (у зборніку «БульбаШок» – «Bulba Records», 2002), «Так чисто» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», Брэст, 2006).

**Кіно, відэа: кліп** «Мария» (2005).

**Кантакт:** www.onegin.org; onegin@popstar.com; +375 (29) 721-42-20, (29) 655-75-51.

21.10.06//Г.Ш., фота М. Чыберкуса

**«OSIMIRA»** – калектыў з Магілёву, які да траўня 2002 працаваў пад назвай *«Округ свободного искусства»*. Трымаецца стылю этнамузыкі. З першым сольным канцэртам група выступіла ў Магілёве ў лістападзе 2002. Склад на пачатку 2005: Андрусь Палаўчэня – дуда, вакал, жалейка, альт-домра, флейты, перкусія,



Кацярына Донда – скрыпка, Кастусь Канцавы – дуда, варган, жалейка, саломка, мандаліна, сурма, флейты, Аляксей Палаўчэня – перкусія, барабаны, вакал, Ілля Далжанкоў – басэтля, бас-гітара, Андрэй Біндасаў – барабаны, перкусія, домра, вакал, Ларыса Праабражэнская – скрыпка.

**Гастролі:** Масква, Санкт-Пецярбург, Францыя (2006), Польшча (2006), Чэхія (2006).

**Фестывалі:** «Ethnosfera» (Скернэвіцэ, Польшча, 2002), «Folkfest» (Острув-Велькапольскі, Польшча, 2002), «Зямля пад белымі крыламі» (Магілёў, 2003), «Славянский базар» (Віцебск, 2003, 2004), «Menuo Juodaragis» (Кернавэ, Літва, 2003), «Festiwal Wyszehradski» (Вроцлаў, Польшча, 2003, 2006), «Swiatowody» (Кашалін, Польшча, 2004), ганаровыя госці «Летняй акадэміі фільмовай» (Звежынец, Польшча, 2004), «Eurofolk» (Санок, Польшча, 2004), «Miodobranie» (Дзержонюў, Польшча, 2004), «Viljandi Folk Music Festival» (Вільяндзі, Эстонія, 2005), «Ethnoline» (Расея, 2006), «Laba Daba» (Латвія, 2006), «Фолк-рок-форум 3» (Масква, 2006).

**Узнагароды:** І месца ў конкурсе на фестывалі «Ethnosfera» (Скернэвіцэ, Польшча, 2002), там жа – прыз глядацкіх сімпатый.

**Дыскаграфія: альбом** CD «Прошча» («БМА-group», 2004, «Sketis Music», Расея), «Druva» («Sketis Music», Расея, красавік 2007).

**Кантакт:** osimira.com; diarado@mail.ru; менеджэр Алег Ціханаў +375 (29) 430-93-36; icq 225716220.

06.08.07//Д.П.

# П

**ПАДБЯРЭЗСКІ ДЗМІТРЫЙ (Подберезский Дмитрий, Padbiarezski Dzmitri)** – журналіст, аўтар і вядучы тэле- і радыёпраграм, літаратар, перакладчык.

Нарадзіўся 20.08.1952 у Мінску.

У 1974 скончыў беларускае аддзяленне філфаку БДУ. Два гады настаўнічаў на вёсцы, наступныя два гады працаваў адміністратарам аб'яднання «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм». Ад канца 1978 да канца 1982 – рэдактар літаратурна-драматычнай, пасля – музычнай рэдакцый БТ. Старшы рэдактар аддзелу музыкі часопісу «Мастацтва», ад лета 1991 – намеснік галоўнага рэдактара гэтага часопісу. Ад 2000 – карэспандэнт беларускай службы радыё «Свабода». З публікацыямі ў прэсе на музычныя тэмы пачаў выступаць у сярэдзіне 70-х, друкаваўся ў бюлетэні «Рабочая смена» («Парус»), газетах «Знамя юности», «Літаратура і мастацтва», «Имя», «Белорусская деловая газета», «Музыкальная газета», «Наша Ніва», часопісах «Клуб и художественная самодеятельность» (Расея), «Маладосць», «Бездельник», «Крыніца», «Jazz квадрат», «Melodie» (ЧССР), «Jazz Forum» (Польшча) і інш., музычным партале «Тузін Гітоў». У 70–80 – вядучы тэлепраграм «Тэледыскатэка», «Сустрэнемся пасля 11-ці», вядучы беларускага выдання праграмы «Песня-85», разам з *Аленай Спірыдовіч* – аўтар і вядучы дзённікаў Усесаюзнага фестывалю польскай песні ў Віцебску (1988). У 80-я – старшыня Мінскага клубу аматараў джазу. Аўтар і вядучы штотыднёвай праграмы джазу «Музыка тоўстых» (радыёстанцыя «Беларуская маладзёжная», потым – радыё «101,2»). У 2001 – аўтар і вядучы штодзённай праграмы «Мэлёдыя дня» на радыё «Свабода», пазней – аўтар і вядучы штотыднёвай праграмы «Па-за тактам», аўтар штотыднёвых музычных сюжэтаў для праграмы «Дом літаратара». Аўтар прадмоў да шэрагу дыскаў беларускіх выканаўцаў, шматлікіх інтэрв'ю, рэцэнзій, аналітычных матэрыялаў. Сябра журы міжнароднага конкурсу на фестывалі «Noc bluesowa» (2000–05), сябра



журы конкурсу на фестывалі «Басовішча» (2006–07). Сябра Саюзу пісьменнікаў Беларусі ад 1994, Беларускай асацыяцыі журналістаў ад 1998.
**Фестывалі:** «Парад дыксілендаў» і «Віцебская восень» (Віцебск, неаднаразова). «Осенние ритмы» (Ленінград, неаднаразова), «Vasaras ritmi» (Рыга, неаднаразова), «Birstonas» (Літва, неаднаразова), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, неаднаразова), «Славянский базар» (Віцебск, неаднаразова), «Золотой шлягер» (Магілёў, неаднаразова), «Tanz und Folkfest» (Рудольштадт, Нямеччына, 1994), «Азія дауысы» (Алматы, 1995), джаз-фестывалі ў Днепрапятроўску, Крывым Рогу, Кіеве і інш.
**Узнагароды:** прыз аргкамітэту Усесаюзнага фестывалю польскай песні за лепшае асвятленне фестывалю ў друку (1990), спецпрыз на цырымоніі «Рок-каранацыі 1999» (з вызначэннем «Рок-архіварыўс тысячагоддзя»).
**Кнігі:** аўтар-складальнік фотаальбому «Усесаюзны фестываль польскай песні. Віцебск 1988» (Мінск, 1989), аўтар «Толкового словаря терминов популярной музыки» (у суаўтарстве з Ю. Будзько і У. Касперчыкам, Мінск, 1994, пашыранае і дапоўненае перавыданне ў «Музычным слоўніку» – «Беларуская навука», 1999); пераклады з польскай мовы кніг «Татуировка» («МЕТ», Мінск, 1997), «От рэга до рока» («Jazz квадрат», друкуецца ад 2006), аўтар кніг прозы «Уверцюра» («Мастацкая літаратура», 1990), «Саксафон Чынгісхана» («БТН-Інфарм», 2000).
**Кіно, відэа:** аўтар сцэнарыя фільму «Палац» (рэж. Ю. Ялхоў, «Белвідэацэнтр», 1988, 55 хв.).
**Кантакт:** padbiarez.livejournal.com; padbiareskiz_rs@tut.by; +375 (29) 631-66-19.
17.05.07//Д.П.

**ПАДОЛЬСКАЯ НАТАЛЛЯ (Подольская Наталья, Padolskaja Natalia)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару.
Нарадзілася 20.05.1982 у Магілёве. Скончыла музычную школу па класе фартэпіяна. Спевамі пачала займацца ў 1991 у групе «Студия «W» Магілёўскага ліцэю музыкі і харэаграфіі. У складзе гэтага калектыву стала лаўрэатам конкурсаў «Зорная ростань», «Магутны Божа» (Беларусь), «Goldenfest» (Польшча). У 2004 скончыла юрыдычны факультэт Беларускага інстытуту правазнаўства, ад 2002 вучыцца на вакальным факультэце Маскоўскага інстытуту сучаснага мастацтва. Спявае на расейскай, беларускай, ангельскай мовах. Найбольш вядомыя песні «Времени нет», «Unstoppable», «Давай потанцуем вместе».
**Гастролі:** Бельгія, Нямеччына, Польшча.
**Фестывалі:** «Золотой шлягер» (Магілёў, 2000), «Славянский базар» (Віцебск, 2002), «Universetalent» (Прага, 2002).
**Узнагароды:** 3 прэмія ў конкурсе маладых выканаўцаў на фестывалі «Славянский базар 2002», уладальніца прызоў «За лепшую песню» і «Лепшаму выканаўцу» на фестывалі «Universetalent 2002».
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Поздно» («Iceberg Music», Расея, 2004), «Nobody Hurt No One» («Студия Монолит», Расея, 2005).
**Кантакт:** www.podolskaya.info
16.04.06//Д.П.

**«ПАЛАЦ»** – мінская група, якая выступае ў стылі фолк-мадэрн з ужываннем элементаў рок-музыкі. Утворана ў красавіку 1992 з выпускнікоў і студэнтаў БДУКу, першапачаткова выступала пад назвай «Дворец кукурузных палочек». Першы склад: *Алег Хаменка* – вакал, гітара, *Юрый «Франц» Выдронак* – клавішныя, праграмаванне, аранжаванне, Юрый Бялякоў – труба, бэк-вакал, Дзмітрый Карабач – акардэон, бэк-вакал, ліра. У верасні 1992 да калектыву далучыўся *Зміцер Вайцюшкевіч* – вакал, саксафон, кларнет, жалейка, дуда. За аснову рэпертуару быў узяты беларускі спеўны фальклор, які аранжаваўся адпаведна з сучаснымі тэндэнцыямі папулярнай музыкі і актыўным ужываннем сэмплерных тэхналогій. У канцы 90-х група пачынае ўсё больш схіляцца да жывога выканання. У розныя гады з калектывам супрацоўнічалі *Аляксей Казлоўскі* – бас-гітара (*«Mojo Blues»*), *Вераніка Круглова* – вакал (*«Kriwi»*), Сяргей Кагановіч – гітара (*«Крамбамбуля»*), Андрэй Шчыткавец – бас-гітара і інш. На пачатку 2004 група выступала наступным складам: А. Хаменка, Ю. Бялякоў (→ 2005), Д. Карабач, *Андрэй Хвісевіч* – dj, клавішныя, дуда, Дзмітрый Жыгараў – бас-гітара, Усевалад Гроднікаў – гукарэжысёр, *Сяргей Трухановіч* – гітара, Андрэй Цераховіч – барабаны. У 1993 песня «Русалкі» ў аранжаванні Ю. Выдронка была адзначана III прэміяй міжнароднага конкурсу «Discovery», арганізаваным радыё «France Internacional». Найбольш вядомыя песні «Борам», «Дарожка», «Русалкі», «Страла», «Каліначка», «Канюшня», «Волы», «Чужыя дзеўкі», «Кола».

**Узнагароды:** «Рок-карона 1996» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць», «Рок-карона 2001» у намінацыі «Кліп году» («На турэцкіх палях»).

**Гастролі:** краіны Усходняй і Заходняй Еўропы, Азіі, Расея (2004, сумесна з ансамблем «Русская песня» Н. Бабкінай).

**Фестывалі:** «Tanz und Folkfest» (Рудольштадт, Нямеччына, 1994),



«Азія дауысы» (Алматы, Казахстан, 1995), «Славянский базар», «Muzyka ludów Północy» (Польшча), «Suklegos» (Літва), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007) і інш.
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Палац» (аўт. выд., 1994, перавыд. «БМAgroup», 2006), «Дарожка» («БелСаціс», 1996, перавыд. «БМAgroup», 2006), CD «Лепшае» («Ковчег», 2000), «Чужыя дзеўкі» («Aist Music», 2001), «Танчыць «Палац» («Aist Records»/«Bulba Records», 2001), «Сьвяточны» («Aist Music», 2003); **трэкі** «Ночы» (у зборніках «Нашествие. Шаг второй» – «REAL Records», Расея, 1999, «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000).), «Чужыя дзеўкі» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Русалкі» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Кола грукатала» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006, у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006), «Праваджала маці сына» (у зборніку «Прэм'ер Тузін 2006» – «West Records», 2006).
**Кіно, відэа:** фільм «Палац» (рэж. Ю. Ялхоў, «Белвідэацэнтр», 1998, 55 хв.), **кліпы** «На турэцкіх палях» (рэж. А. Хаменка, 2000), «А ў лузе» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2003), удзел у мастацкім фільме «Анастасия Слуцкая» (рэж. Ю. Ялхоў, «Беларусьфільм», 2003).
**Кантакт:** www.palac.org; palace@tut.by; +375 (29) 616-51-81 (А. Хаменка).
21.07.07//Д.П., фота Д.П.

**ПАЛІВОДА ІГАР (Паливода Игорь, Palivoda Ihar)** – піяніст, аранжавальнік, кампазітар.
Нарадзіўся 16.05.1950 у Стэрлітамаку, Башкірыя, памёр 28.02.1996 у Мінску. У 1972 скончыў БДК па класе фартэпіяна Р. Шаршэўскага, у 1988 – па класе кампазіцыі Дз. Смольскага. Ад 1978 па 1984 працаваў піяністам ў складзе БДА *«Песняры»*, паўторна вярнуўся ў калектыў у чэрвені 1988. У жніўні 1989 увайшоў у склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Сябра Саюзу кампазітараў Беларусі ад траўня 1993. Працаваў у жанрах сімфанічнай, камернай і папулярнай музыкі, выступаў як піяніст джазгрупы *Ігара Сафонава*. Найбольш значныя творы «Раймонда» (уверцюра-фантазія для літаўры сола і вялікага камернага аркестру на тэмы песень Р. Паўлса, сумесна з *Леанідам Гуцінам,* 1985), Таката для віяланчэлі і фартэпіяна, Музыка для чатырох валторнаў, Саната для фартэпіяна, цыкл песень «Весёлые нищие» (на вершы Р. Бёрнса, 1981),



пап-опера «Максім» (на вершы М. Багдановіча, 1991), цыкл песень «Беларушчына» (на вершы Янкі Купалы, 1992), цыкл песень «Матчын спеў» (на вершы *Аркадзя Куляшова*, 1993), «Калядкі» для ансамбля цымбалаў, 10 інтэрлюдый для двух фартэпіяна і сінтэзатара, Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам (1987), кантата «Слова» для хору і сімфанічнага аркестру (1988), фуга «Урок сольфеджио» для вакальнай групы (1992), Скерца для драўляных духавых (1995), Прэлюдыя і фуга для струннага аркестру (1995), апрацоўка цыклу народных песень («Прала б я кудзелачку») для *Надзеі Мікуліч* і групы *«Сузор'е»* (1985), песень «Маладэчна», «Кахаймася», «Маналог сабакі» (сл. П. Макаля), «Сівы голуб» (сл. *Леаніда Пранчака*), «Нёман» (на народныя словы), песень на вершы *Леаніда Пранчака, Генадзя Бураўкіна, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Максіма Танка*, С. Законнікава, В. Іпатавай. Ад 1997 да 2001, а таксама ў 2005 з ініцыятывы ягонай удавы В. Паліводы ў Мінску праводзіліся вечары-канцэрты памяці кампазітара.

**Гастролі:** у складзе ансамбля «Песняры» – гл.; у складзе джаз-групы І. Сафонава – «Витебская осень 1989».

**Фестывалі:** у складзе ансамбля «Песняры» – гл.; у складзе ДКАБ – «Славянский базар», Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна».

**Дыскаграфія: альбомы** – «Максім» (MC «Ковчег», перавыд. CD 2005); **трэкі** «Сівы голуб» (CD «Песняры 2001» – «Ковчег», 2001), «Рэдкі госць» (*Ірына Дарафеева*, MC «Рэдкі госць» – «Ковчег», 1999, CD «Кахачка» – «West Records», 2004), «Маналог сабакі» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990).

**Кіно, відэа:** дакументальны фільм «Родной песни воевода» («Белвідэацэнтр», рэж. Б. Бахціяраў, 2001); музыка для фільму «Мелодии любви» («Тэлефільм», 1986), аранжаванне музыкі да кінафільму «Был месяц май» для ансамбля *«Тоніка»*.

02.02.06//В.П.

**ПАЛКОЎНІКАВА ЛЮДМІЛА (Полковникова Людмила, Palkounikava Liudmila)** – журналістка радыё і тэлебачання.

Нарадзілася 24.02.1946 у Навасібірску, Расея. У 1968 скончыла музычную вучэльню па класе фартэпіяна, у 1978 – факультэт журналістыкі БДУ. У 1966 працавала акампаніятарам у Мінскай харэаграфічнай вучэльні, выкладала фартэпіяна ў музычнай школе (1967–78), у 1978–84 – музычны рэдактар дзіцячай рэдакцыі і музычны рэдактар музычнай рэдакцыі Беларускага радыё, у 1984–2001 – музычны рэдактар музычнай рэдакцыі Беларускага тэлебачання, ад 2001 – старшы прадзюсэр Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мир». Сярод найбольш значных работ – радыйныя музычна-пацяшальныя праграмы «Голубой вагон», «Сустрэчы з кампазітарамі», штотыднёвая «Прэм'ера песні» (адначасова з тэлеверсіяй), «Эстрадная студыя прадстаўляе...», аўтар і вядучая цыклу праграм аб *Дзяржаўным канцэртным аркестры Беларусі* (адначасова з тэлеверсіяй), арганізатар першага ў Беларусі радыёконкурсу «Лепшыя песні году», арганізатар першых радыётрансляцый

з фестывалю польскай песні ў Віцебску і «Славянского базара», работа ў арганізатарскай і творчай групах Рэспубліканскага тэлерадыёконкурсу «Чырвоныя гваздзікі». Падчас працы на тэлебачанні ўдзельнічала ў правядзенні такіх праграм, як «Песню бярыце з сабой», Першы тэлевізійны конкурс лепшых песень году «Залатая ліра». Аўтар і рэдактар цыклу праграм пра духавы аркестр Міністэрства абароны Беларусі, адна з арганізатараў і аўтар першых фестываляў працаўнікоў вёскі «Дажынкі» (Столін, Масты, Нясвіж). Рэдактар, адна з арганізатараў і аўтараў тэлемарафону па зборы сродкаў на рэстаўрацыю Брэсцкай крэпасці-героя (1996). Аўтар і адна з арганізатараў Міжнароднага тэлефестывалю патрыятычнай песні «Память», аўтар і рэдактар першага беларускага «Навагодняга агеньчыка». У прадстаўніцтве МТРК «Мир» у Беларусі арганізавала паказ кліпаў беларускіх выканаўцаў на краіны Садружнасці, падрыхтавала тэлевізійную версію «Рок-каранацыі 2005», тэлевізійныя версіі канцэртаў *Аркадзя Эскіна* «50 лет в джазе» і «Встреча друзей» (А. Эскін і «Уральский диксиленд»), праграмы аб арт-групе «Беларусы».

**Фестывалі:** музычны рэдактар і аўтар радыёпраграм «Дні культуры Беларускай ССР у Эстоніі», «Дні культуры Беларускай ССР у Латвіі», а таксама фестываляў польскай песні ў Віцебску, музычны рэдактар тэлевізійных трансляцый фестываляў «Славянский базар», «Золотой шлягер», «Дажынкі».

**Кантакт:** polk46@tut.by

18.11.06//Д.П.

**ПАЛЯНСКАЯ ІРЫНА (Полянская Ирина, Palianskaja Irina)** – спявачка, выканаўца папулярнага эстраднага рэпертуару, педагог.

Нарадзілася 22.04.1918 у с. Трыгорскае Пушкінагорскага р-ну Ленінградскай вобл. Вучылася па класе вакалу ў студыі пры Малым оперным тэатры Ленінграду (1937), брала прыватныя ўрокі. Удзельнічала ў мастацкай самадзейнасці Ленінградскага клубу будаўнікоў.

У 1938–40 – салістка сімфа-джазу Сміта/Б. Карамышава, у 1940–41 выступала ў Камышлове Свярдлоўскай вобл. Падчас вайны ў 1941–42 удзельнічала на Украінскім фронце ў франтавых брыгадах, пазней давала канцэрты ў Чыце, Маскве, працавала ў Запаляр'і ў складзе джаз-аркестру Я. Скамароўскага. Ад 1945 працавала ў Кіеве, у 1951–55 – салістка Грузінскай філармоніі. Ад 1955 жыве і працуе ў Беларусі. Пакінула актыўныя выступленні ў 1973. У 1978–90 працавала педагогам па вакале і майстэрстве эстрады ў канцэртна-эстрадным бюро БДФ. Сярод найбольш вядомых песень «Приходи поскорей», «Нищая» (сл. Беранжэ), «Стоит девчонка с папиросой» (сл. М. Дарызо), «Письмо к лётчику» (сл. М. Сіманава), «Подписан будет мир» (сл. М. Сіманава) – усе на музыку Э. Разнікоўскага.

**Гастролі:** Вугоршчына (1945–46).

**Фестывалі:** «Золотой шлягер 1998» (Магілёў).

12.11.06//В.Б.

**ПАМІДОРАЎ (КРЫВАШЭЕЎ) АЛЯКСАНДР (Помидоров/Кривошеев Александр, Pamidorau/Kryvasheeu Aliaksandr)** – аўтар музыкі і тэкстаў, вакаліст, ды-джэй, вядучы канцэртаў.

Нарадзіўся 21.12.1971 у Мінску, у 1994 скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці рэжысёр. У 1988 стварыў групу «Пьяные гости» (Ленінград-Мінск), у 1996– 2000 браў удзел у супольных музычных праектах «Народны альбом», «Сьвяты вечар 2000», «Я нарадзіўся тут». Ад 1989 выступае як вядучы радыё- («Беларуская маладзёжная», радыё «Би-Эй», «Альфарадио», радыё «Рацыя») і тэлепраграм, музычны крытык, журналіст. Супрацоўнічаў з групамі *«Kriwi»* і *«Экивоки»*, апошнім часам выступае з групай спецыяльна запрошаных музыкаў пад назвай «Pomidor/Off». У 2006 выступіў як прадзюсэр запісу зборнага дыску «Дыхаць!». Ад 2007 – аўтар і вядучы штодзённай праграмы «Гукапіс» на радыё «Свабода». Найбольш вядомыя песні «Цуд на Каляды», «Lomir zeh iberbetn», «Крывавае сьвята», «Выйсьце» (разам з *«IQ48»*), «Шабаны».

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2001, 2002, 2005, 2007), «Синий перец 1998» і інш.

**Дыскаграфія: альбомы** – у складзе «Пьяных гостей» – ЕР «Нечаянная смерть» (1990), «Дерево» (1991), CD «Уровень жизни» (канцэртны, 1998, 2001 – «Pomidoroff Rec. Ltd»); сольны CD «Сьвята пакрадзенае» («Pomidoroff Rec. Ltd», 2002), супольныя музычныя праекты «Народны альбом», «Сьвяты вечар 2000», «Я нарадзіўся тут»; **трэкі:** «Вітальная» (у зборніку «Сэрца Эўропы» – «БМAgroup», 2001), «Never Let Me Down Again» (разам з групай *«Гаер»* – зборнік «Personal Depeche» – «MSH Records», 2002) «Цуд на



Каляды» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000, у зборніку «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000), «Новы марш» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМА-group», 2002), «Шабаны» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006).
**Кантакт:** www.pomidoroff.net; tomat.livejournal.com; pomidorro@mail.ru

06.09.07//Д.П., фота Ю. Дзядзінкіна

**«ПАНЕ-БРАЦЕ»** – мінская група, якая ўтварылася ў 1969 і працавала ў стылях класічнага і прагрэсіўнага року, рытм-энд-блюзу з элементамі хард-року.

У 1971 у групе выступалі *Уладзімір Кандрусевіч* – бас-гітара, вакал, гармоніка, тэксты, музыка і аранжаванне, *Уладзімір Угольнік* – вядучая гітара, бэк-вакал, аранжаванне, Віталь Раманаў – барабаны, бэк-вакал, аранжаванне, Андрэй Гітгарц – клавішныя. Рэпертуар складаўся з аўтарскіх апрацовак песень з рэпертуару «Beatles», «Rolling Stones», «Creedence Clearwater Revivle», «Kinks», «Led Zeppelin», «Deep Purple», «Rare Bird», Донавана, расейскіх і беларускіх народных песень («По диким степям Забайкалья») ва ўласных аранжаваннях і аўтарскіх песень У. Кандрусевіча, сярод якіх найбольш вядомыя «Я не могу, нет сил сопротивляться...», «Солнце сквозь листву...» («Ночь как в сказке»), «Не часто я бываю пьян...», «Я хочу, чтобы было лето», «Я нуждаюсь в твоей ласке», «Epitaph» (з рэпертуару «King Crimson» з тэкстам У. Кандрусевіча). У 1971 група выступіла ініцыятарам правядзення ў Мінску рок-фестывалю, але пасля ўмяшальніцтва ўладаў фестываль быў спынены, У. Кандрусевіч адлічаны з БДК, і група неўзабаве спыніла існаванне.
**Кантакт:** +375 (29) 400-09-18 (Уладзімір Лазараў).

27.01.07//Д.П.

**«ПАНИ ХИДА»** – група з Оршы.
**Узнагароды:** «Рок-карона 1997» у намінацыях «Песня году» («Таниц»), «Кліп году» («Слёзы на соснах»).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Истории» («Ковчег»), «Рай для фей» («Ковчег»); **трэкі** «Хлопец пашаньку пахае» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Стреляться» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000).
**Кіно, відэа: кліпы** «Слёзы на соснах» (1997), «Таниц» (1997), «Чердак» (рэж. *Анатоль Вечар*).

03.03.07//Д.П.

**ПАПЛАЎСКАЯ ЯДВІГА (Поплавская Ядвига, Poplavskaya Yadviga)** – кампазітар, аранжавальнік, спявачка.

Нарадзілася 25.04.1949 у в. Далідовічы Валожынскага р-ну Мінскай вобл. У 1972 скончыла БДК па класе фартэпіяна Л. Тэрмінасян, у 1988 – па класе кампазіцыі *Яўгена Глебава*. Ад 1968 да 1971 працавала ў розных харавых калектывах і ансамблях папулярнай музыкі. У 1971 стала адным з ініцыятараў стварэння ВІА *«Верасы»*, у складзе якога выступала як аранжавальнік, выканаўца на клавішных, вакалістка. Унутры «Верасоў» у 1976 утварыўся сямейна-творчы *дуэт Ядвіга Паплаўская* –

*Аляксандр Ціхановіч*. Ад 1987 да 1989 – салістка *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. У 1989 разам з А. Ціхановічам узначаліла групу «Счастливый случай», на глебе якой неўзабаве ўзнік Тэатр песні. Неаднаразова ўдзельнічала ў фестывалях папулярнай музыкі як выканаўца, так і сябра журы, з'яўляецца вядучай тэлепраграмы «Театральные истории» (канал «СТВ»), мастацкі кіраўнік прадзюсэрскага цэнтру «Профиартвидеон». Сябра Саюзу кампазітараў Беларусі. Сярод найбольш вядомых твораў: як кампазітара – «Святло вачэй», «Развітанне», «Звонкие дождинки», «Ты зачем на мне женился?», «Толькі ты», «Бела-Беларусь», «Это просто», «Обман», «Две дороги», сімфанічная паэма, паэма-кантата «Сын Зямлі» для сапрана, тэнару і дзіцячага хору, цыкл фартэпіянных прэлюдый, п'есы для дзяцей, харавыя творы; як аранжавальніка – «Я у бабушки живу» (муз. *Эдуарда Ханка*, сл І. Шаферана), «Морской прибой» (муз. *Ігара Лучанка*, сл. М. Траццякова), «Счастливый случай» (муз. Э. Ханка, сл. Л. Рубальскай), «Осень в Версале» (муз. А. Ціхановіча, сл. *Леаніда Дранька-Майсюка*), «Хозяйка бала» (муз. А. Ціхановіча, сл. *Уладзіміра Някляева*) і інш.

**Гастролі:** дзяржавы СНД, Балгарыя, Польшча, Вугоршчына, Чэхія, Славакія, Нямеччына, Фінляндыя, Славенія, Манголія, Францыя, Канада, Ізраіль.

**Фестывалі:** фестывалі палітычнай песні ў Фінляндыі, Балгарыі, Югаславіі, Расеі, «Славянский базар», тэлеконкурс «С песней по жизни», «Песня года» (Расея), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна», «Мелодии двух сердец» (Украіна), «Звёзды Амура» (Расея), «Магутны Божа» (Беларусь) і інш.

**Узнагароды:** лаўрэат прэміі Ленінскага камсамолу Беларусі (у складзе «Верасоў», 1979), Ганаровая грамата Вярхоўнага Савету БССР (1986).

**Дыскаграфія:** у складзе «Верасоў» – LP «Наша дискотека» («Мелодия», 1980), 2LP «Музыка для всех» («Мелодия», 1984); у складзе дуэту – гл.; **трэкі** – «Завіруха» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Звонкие дождинки», «Роман», «Друзьям» (усе на сл. М. Траццякова), «Песня о друге» (сл. Б. Салібава), «Ты зачем на мне женился?» (сл. *Алега Жукава*), «Скрипачка» (сл. М. Траццякова, А. Жукава) – усе ў LP «Счастливый случай» («Мелодия», 1990).

**Кантакт:** n-tihanovich@mail.ru, isz@mail.ru; +375 (17) 236-95-03.

08.05.04//Д.П.

**ПАПРОЦКІ АЛЯКСАНДР (Попроцкий Александр, Paprotski Aliaksandr)** – гітарыст, гукарэжысёр.

Нарадзіўся 12.08.1960 у г. Антопаль Драгічынскага р-ну Брэсцкай вобл. У 1970 г разам з бацькамі пераехаў у Мінск. Пачатковую музычную адукацыю атрымаў у СМШ №15 Мінску. Скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці гукарэжысёр кіно, тэлебачання і тэатру ў 2002. У 1984 узначаліў групу *«Кондор»*, у складзе якой быў гітарыстам, непрацяглы час выступаў як гітарыст групы *«Новый Иерусалим»*. У канцы 1989 быў прыняты на працу ў БДА *«Песняры»* у якасці гукарэжысёра. З ягоным удзелам былі запісаны альбомы «Хворы на рок-н-

рол» групы *«Крама»* («Ковчег», 1993), «CD «Pesniary 25» («Philips», Галандыя, 1994), ансамбляў «KIT» і «Liritsa» (2002). Ад 1998 пасля падзелу «Песняроў» працуе з музыкамі *«Белорусских Песняров»*, з якімі запісаў альбомы «Только с тобой» (1999), «Не люби нелюбимого» (2003), «35+5» (2004), «Кремль Live 2004» («Белорусские Песняры Records», 2005), «Любимые песни.RU» («Белорусские Песняры Records», «Vigma», «Союз», 2005), «Концерт в Театре эстрады» («Kontramarka.ru», 2004), «Вологда. Легенды жанра» («Алмазов продакшн», 2004), «Скажи про любовь» («Классик компани», 2004) і інш.

**Фестывалі:** «Славянский базар» (пастаянна), Сусветны фестываль «For Peace» (Арызона, ЗША, 1995).

**Узнагароды:** Ганаровая грамата Вярхоўнага Савету Беларусі «За ўклад у развіццё культуры Рэспублікі Беларусь» (1993).

**Кантакт:** sasha@belpesniary.ru

29.05.06//Д.П.

**«ПАРАДОКС»** – група з Мазыру. Працавала ў першай палове 90-х, трымаючыся стылю хэві-метал.

У групе выступалі Сяргей Шафарэнка – вакал, Сяргей Кудраўцаў – клавішныя, Эдуард Міхайлаў – гітара, Валерый Жэлянок – бас-гітара, Аляксандр Бельскі – гітара, Віктар Жэлянок – барабаны. Група выконвала аўтарскія песні на ангельскай і расейскай мовах.

**Узнагароды:** «Рок-карона 1995» у намінацыі «Дэбют году».

**Дыскаграфія: трэкі** «I Believe In Fortune», «Environment», «Without You» (у MC зборніку «Western Dreams» – «RTX Records», 1993).

**Кіно, відэа: кліп** «Там, за рекой» (рэж. А. Вечар).

**«ПАРИ»** – магілёўскі вакальны квартэт.

У яго рэпертуары былі дзіцячыя песні, пародыі, творы сусветнай папулярнай класікі і джазу, аўтарскія песні. Утварыўся ў 1986 пры Магілёўскай абласной бальніцы, нязменна выступаючы складам: Алена Царык, Людміла Ляйко, Валянціна Сычыкава – вакал, *Сяргей Кавалёў* – лідэр, вакал, гітара, аранжаванні. Калектыў спыніў існаванне ў 1990.

**Гастролі:** Дні культуры Магілёву і Магілёўскай вобласці ў Польшчы (1988).

**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Навапалацк 1987».

**Узнагароды:** лаўрэат конкурсу фестывалю «Навапалацк 1987».

05.08.07//Д.П.

**ПАРКОЎ АЛЯКСЕЙ (Парков Алексей, Parkou Aliaksey)** – кампазітар, аранжавальнік, гітарыст, гукарэжысёр, прадзюсэр.

Нарадзіўся 01.11.1974 у Свярдлоўску, Расея. Скончыў гомельскі каледж мастацтваў імя *Нестара Сакалоўскага* па класе класічнай гітары. Ад 1992 да 1994 выступаў як мастацкі кіраўнік, гітарыст, аранжавальнік камернага гітарнага ансамбля «La Bella», ад 1994 і да цяперашняга часу ўзначальвае хатнюю студыю «La Bella Classic». У 1994–95 сумесна з *Ігарам Шошыным* арганізаваў у Гомелі першы міжнародны гітарны фестываль, які пазней атрымаў

назву «Ренессанс гитары», у 1995 падрыхтаваў і правёў вакальны конкурс «Песнь над Сожем». Удзельнічаў у падрыхтоўцы і выданні альбому «Пусть огни погаснут» У. Прывалава, падрыхтоўцы музычных нумароў для цыклу праграм «Эрудит лото», піша і аранжуе музыку для розных выканаўцаў, калектываў, тэатру, рэкламы. У 2005 сумесна з Анатолем Шаўцовым і Аляксандрам Лемяшковым сабраў групу «Дранікі».
**Дыскаграфія:** МС «Лучшие произведения для гитары. Камерный гитарный ансамбль «La Bella» (аўт. выд., 1993), 3 CD дэма з лепшымі аўтарскімі кампазіцыямі (1998–2000).
**Кантакт:** http://parkov.narod.ru; parkov@narod.ru; +375 (29) 691-17-71.
11.04.06//N.N.

**«ПАРУ РУБЛЕЙ»** – група з Мінску, трымаецца стылю музыкі ска.
Утварылася ў канцы 1999 з ініцыятывы Паўла Яноўскага і Міхаіла Краўцова (← *«Леприконсы»,* «Йо-Йо»).
У канцы 2006 у групе выступалі Павел «Янок» Яноўскі – гітары, вакал, Міхаіл «Мядзведзь» Краўцоў – вакал, Антон «Фагундэс» Мацулевіч – барабаны, *Канстанцін Калеснікаў* – басгітара (адначасова *«IQ48»*, *«Zygimont vaza»*), Іван «Вано» Запруцкі – труба, Юрый «Гаўрош» Ятусевіч – трамбон.
**Дыскаграфія: альбом** CD «Трезвый расчет» («Новая музыкальная компания», 2006).
**Кіно, відэа: кліп** «Напролом» (рэж. М. Міхальцоў, 2007).
**Кантакт:** kosty2002@tut.by; +375 (29) 647-31-33 (К. Калеснікаў).
06.02.07//Д.П.

**ПАЎЛАЎ ПІТ (Павлов Пит, Paulau Pit)** – гітарыст, спявак, аўтар музыкі і тэкстаў.
Нарадзіўся 07.11.1966 у Мінску.
У 1991 скончыў МРТІ. Дэбютаваў у 1991 у складзе групы *«Мроя»* (ад 1994 – *«N.R.M»*). У 1997 пачаў супрацоўніцтва з групай *«Kriwi»*, у 1997 выступаў у складзе групы *«Flat»*, пазней з'яўляўся ўдзельнікам групы *«Сестра» Аляксея Шадзько*. У 2002, паралельна з працай у «N.R.M», заснаваў уласны праект – групу *«Garadzkija»*, годам пазней – групу *«Pete Paff»*.
Удзельнічаў у запісе і паказе супольных музычных праектаў «Народны альбом», «Сьвяты вечар 2000», «Я нарадзіўся тут».
**Гастролі:** у складзе розных калектываў выступаў у Нямеччыне (Берлін, Аахен, Дрэздэн, Магдэбург, Франкфурт-над-Одэрам, Хузум, Марне, Дзюсельдорф, Фленсбург, Патсдам, Глюксбург), Люксембургу, Даніі, Францыі (Ля Рош Сур Йон), Польшчы (Варшава, Беласток, Познань, Кракаў, Вроцлаў, Гданьск, Сопат, Сэйны, Лодзь, Шчэцін, Катавіцэ, Гдыня, Кратошын, Зембковіце-Шлёнске, Алецка, Гайнаўка, Чэрэмха, Гродэк, Нарэў), Украіне, Расеі, Эстоніі, Латвіі.



**Фестывалі:** неаднаразовы удзельнік «Рок-каранацый», «Басовішча» і інш.
**Узнагароды:** медаль «За отличие в воинской службе» 2-ой ступені; «Рок-карона 1996» у намінацыі «Песня году» («N.R.M.», «Партызанская»), «Рок-карона 1997» (група «N.R.M.») і ў намінацыі «Традыцыі і сучаснасць» (група «Kriwi»), «Рок-карона 1998» у намінацыях «Альбом году» (праект «Народны альбом») і «Музыка году», «Рок-карона 1999» у намінацыях «Група году» («Kriwi»), «Кліп году» («Kriwi» – «За туманам»), «Песня году» («N.R.M» – «Паветраны шар»), «Рок-карона 2000» у намінацыях «Група году» («N.R.M.»), «Альбом году» («N.R.M.» – «Тры чарапахі»), «Песня году» («N.R.M.» – «Тры чарапахі»), «Кліп году» («N.R.M.» – «Чыстае, сьветлае»), «Рок-карона 2001» (праект «Я нарадзіўся тут»).
**Дыскаграфія: альбомы** – у складзе «N.R.M.» – гл.; у складзе «Kriwi» – гл. 1995–2003; **трэкі** «Народны альбом» («Ковчег», 1997), «Сьвяты вечар 2000» («Ковчег», 2000), «Я нарадзіўся тут» (А. Суша, 2001); у складзе «Garadzkija» – сінгл «Сіні апэльсын» («Garadzkija», 2003), CD «Nielehal» («Garadzkija», 2003); у складзе «Pete Paff» – CD «Pahlyblennie» («Pete Paff», 2006); у складзе групы «Сестра» – CD «Я буду ждать» (1998); **трэкі** «Nir-Nor» («Pete Paff» у зборніку «Hard-core манія: чаду!» – «БМAgroup», 2002), «Александрына» (разам з А. Шадзько ў зборніку «Песнярок» – «ПАНРекордз», 1997), «Адчуваю сябе» («Garadzkija» ў зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).
**Кіно, відэа: кліпы** «Як манэкен» («Garadzkija», рэж. В. Чыжоў, 2004), у складзе «N.R.M» і «Kriwi» – гл.
**Кантакт:** www.garadzkija.net; www.nrm.by.com; petepaff@tut.by
27.10.06//Д.П.

**ПЕНЯ ІГАР (Пеня Игорь, Penia Ihar)** – спявак, піяніст.
Нарадзіўся 29.10.1952 у Астрахані. Пазней сям'я пераехала ў Днепрапятроўск, дзе ён скончыў музычную школу і музычную вучэльню па класе акардэона. Ад 1975 да 1977 – у складзе ансамбля «Водограй», з якім запісаў музыку да фільму «Дорогой мальчик». Ад 1977 да 1980 працаваў у Сочы, выступаў у шэрагу рэстарацыйных ансамбляў, ад 1980 да 1998 – у складзе ансамбля *«Песняры»*, ад 1998 – у *«Белорусских Песнярах»*. Аўтар песні «О, дай мне, Господи, забыть» (на верш А. Блока).
**Гастролі:** гл. «Песняры», «Белорусские Песняры».
**Фестывалі:** гл. «Песняры», «Белорусские Песняры».
**Дыскаграфія:** гл. «Песняры», «Белорусские Песняры»; сольны CD «Когда мы были юны» («Белорусские Песняры Рекордз», 2005).
**Кантакт:** www.bel-pesniary.ru
03.04.06//Д.П.

**«ПЕСНИ НАД СОЖЕМ»** – вакальна-інструментальны ансамбль Гомельскай абласной філармоніі.
Існаваў ад 1971 да 1974. У складзе калектыву выступалі *Анатоль Ярмоленка* – вакал, *Мікалай Сацура* – клавішныя (← 1974), Міхаіл Смаль – музычны кіраўнік, баян, Андрэй Луцай – гітара, домра, Валерый Прыгожаў – гітара (→ 1974), Марк Зялінскі – балалайка, Анатоль Шчытаў – бас-гітара, баян, Анатоль

Торбачкін – барабаны, вакал, Генадзь Балабанаў – барабаны, Віктар Ананчанка – клавішныя, вакал, Аляксандр Аўдзевіч – трамбон, Віктар Клімовіч – флейта, саксафон, Анатоль Аляксандраў, салісты-вакалісты Юлія Казлова, Уладзімір Смірноў, Васіль Ліфанаў, Алег Дзегцяроў. Гэты ансамбль быў непасрэдным папярэднікам ВІА *«Сябры»*.

08.03.05//www.syabry.com.

**«ПЕСНЯРЫ»** – вакальна-інструментальны ансамбль.
Утварыўся ў верасні 1969 у Мінску на базе ансамбля «Лявоны» – акампанавальнага складу эстраднага рэвю «Лявоніха» БДФ. Першапачатковы склад: *Уладзімір Мулявін* – гітара, вакал, Валерый Мулявін – вакал, *Валерый Яшкін* – клавішныя, ліра, *Леанід Тышко* – бас-гітара, *Уладзіслаў Місевіч* – флейта, саксафон, вакал, *Аляксандр Дзямешка* – барабаны, вакал, *Валянцін Бадзьяраў* – скрыпка, Валерый Гурдызыяні – трамбон. Аснову рэпертуару калектыву складалі апрацоўкі беларускіх народных песень, песні савецкіх кампазітараў, аўтарскія песні ўдзельнікаў ансамбля, якія выконваліся пераважна на беларускай і расейскай мовах. Цягам гадоў калектыў падрыхтаваў і падаў са сцэны такія праграмы, як «Песня пра долю» (муз. У. Мулявіна на вершы Янкі Купалы, 1976), цыкл апрацовак абрадавага фальклору (1980), «Гусляр» (муз. *Ігара Лучанка*, 1978), «Я не паэта» (муз. У. Мулявіна, сл. Янкі Купалы, 1982), «Через всю войну» (муз. У. Мулявіна, сл. розных паэтаў, 1984), «Во весь голос» (муз. У. Мулявіна, сл. У. Маякоўскага, 1987), «Вянок» (муз. У. Мулявіна, сл. М. Багдановіча) і інш.
У 1976 калектыў першым з ліку ансамбляў папулярнай музыкі СССР ажыццявіў гастрольны тур па ЗША.
У розныя гады ў складзе калектыву



выступалі *Анатоль Кашапараў*, *Леанід Барткевіч*, *Валерый Дайнэка*, *Ігар Пеня* – вакал, *Уладзімір Нікалаеў, Аркадзь Эскін*, *Ігар Палівода, Алег Молчан* – клавішныя, *Барыс Бернштэйн*, *Мікалай Няронскі* – бас-гітара, *Уладзімір Ткачэнка*, *Аляксандр Растопчын*, *Віктар Малчанаў* – гітары, *Алег Аверын* – гітара, вакал. У 1998 у выніку творчага канфлікту большасць музыкаў пакідае ансамбль, утвараючы групу *«Белорусские Песняры»*. У. Мулявін набірае новы склад. Па ягонай смерці з ансамбля летам 2003 сыходзіць чарговая група музыкаў на чале з Л. Барткевічам. У канцы 2006 у ансамблі выступалі: *Валерый Скаражонак* – вакал (← жнівень 2003), *Вячаслаў Шарапаў* – вакал, клавішныя (← жнівень 2003), Сяргей Шкурдзэ – барабаны, вакал (← жнівень 2003), Алег Жалезнякоў – вакал, гітара (← жнівень 2003), Раман Козыраў – клавішныя, вакал (← жнівень 2003), Андрэй Шчыткавец – бас-гітара, вакал (← *«Палац»*, жнівень 2003), Аляксандр Камлюк – гітара (← студзень 2004, «Эгоист» → 2007), Вячаслаў Ісачэнка – гітара, вакал (← травень 2005).

**Гастролі:** Чэхаславакія (1971), Балгарыя, ФРГ, Швейцарыя, Румынія (1974), Польшча, Вугоршчына (1975), Францыя, Югаславія, ЗША, Канада (1976), ЗША (1977), Фінляндыя, Югаславія (1978), краіны Цэнтральнай Амерыкі (1981), Вугоршчына (1983), Польшча (1984), Індыя, Бірма, Манголія (1985), В'етнам (1989), краіны Афрыкі (1991), КНДР (1992), ФРГ (1993),

**Фестывалі:** «Sopot» (Польшча, 1971), музычны кірмаш MIDEM (Каны, Францыя, 1975), фестываль палітычнай песні ў Хельсінкі (1978), «Varadero» (Гавана, 1983), фестываль духоўнага адзінства (ЗША, Арызона, 1994), міжнародны фестываль «Millenium» (Нью-Йорк, 2001) і інш.

**Узнагароды:** лаўрэат II прэміі IV Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (Масква, 1970), лаўрэат I прэміі Усесаюзнага конкурсу савецкай песні (Мінск, 1973), фестывалю савецкай песні ў Зялёнай Гуры (Польшча, 1973), X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў (Берлін, 1973), міжнароднага фестывалю песні «Залаты леў» (Лейпцыг, 1974), міжнароднага конкурсу артыстаў эстрады «Залаты Арфей» (Балгарыя, 1974), «Золотой диск» фірмы «Мелодия» (1982), лаўрэат прэміі ЛКСМБ (1976), ВЛКСМ (1977).

**Дыскаграфія: альбомы** «Песняры» («Мелодия», 1970), «Песняры 2» («Мелодия», 1974), «Песняры 3» («Мелодия», 1978), «Песняры 4» («Мелодия», 1978), «Гусляр» («Мелодия», 1979), «Зачарованая мая» («Мелодия», 1983), «Через всю войну» («Мелодия», 1985), «Pesnyary» («United Artists», ЗША, 1978), CD «Песняры 2001» («Ковчег», 2001, перавыд. як «Молодость моя...» – «Союз», 2003), «Песняры». Лучшее, ч. 1, 2» («Никитин», 2003), «Песняры». Лучшие песни, ч. 1, 2» («Альфа-Стиль», 2003), «Песняры». «Антология» (8 альбомаў, «Moroz Records», 1998), «Гусляр» («Boheme Music», 2000), «Песняры» («Philips», 1994), «Песняры» («SNC Records», 1995), «Наши любимые» («Мелодия», 1998), «Песняры» («Moroz Records», 1998), «Песняры» (MP3 зборнік, «РМГ Рекордз», 2000), «Золотой диск» (зборнік, «Vigma», 2005), «Распавядальная» («West Records»,

2007); **міньёны** «Песняры» («Мелодия», 1971), «Песняры» («Мелодия», 1972), «Песняры» («Мелодия», 1973), «Песняры» («Мелодия», 1974), «Песни из кинофильма «Ясь і Яніна» («Мелодия», 1975), «Песняры» («Мелодия», 1976), «Песняры» («Мелодия», 1977), «Песняры» («Мелодия», 1979), «Зачарованая мая» («Мелодия», 1982); **трэкі** «Дрозды» і «Наши любимые» (у зборніку без назвы – «Мелодия», 1973), «Берёзовый сок» (у зборніку «Всем, кто любит песню» – «Мелодия», 1973), «Дрозды» і «Берёзовый сок» (у зборніку «С Новым годом!» – «Мелодия», 1973), «Наши любимые» (у альбомах Д. Тухманава «Эта весёлая планета» – «Мелодия», 1974, «Белый танец» – «Мелодия», 1976, у зборніках «Есть глаза у цветов» – «Мелодия», 1976, «Песни на стихи И. Шаферана» – «Мелодия», 1976), «Белоруссия» (у зборніку «Вокально-инструментальные ансамбли» – «Мелодия», 1976, «Песни А. Пахмутовой» – «Мелодия», 1977), «За полчаса до весны» (у зборніку без назвы – «Мелодия», 1978; зборніку «Песняры», Алла Пугачёва, «Поющие сердца...» – «Мелодия», 1978), «Вологда» (у зборніку «Для вас, женщины!» – «Мелодия», 1978), «Перапёлачка», «Машанька», «У месяцы верасні» (у альбоме «Песняры» – «Орэра» – «Мелодия», 1978), «Белоруссия», «До третьих петухов», «Беловежская пуща» (у альбоме «Песни Александры Пахмутовой» – «Мелодия», 1978), «Ой, рана на Йвана» (у зборніку «Наша песня» – «Мелодия», 1978), «30.000 дней» (у альбоме «30.000 дней. Песни О. Иванова» – «Мелодия», 1988, у альбоме «Признание. Песни на стихи А. Жигарева» – «Мелодия», 1989), «Маналог сабакі» (муз. І. Паліводы, сл. П. Макаля, у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Тальяночка», «Беловежская пуща» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Мой родны кут» (муз. І. Лучанка, сл. Якуба Коласа), «Балада аб маці» (муз. І. Лучанка, сл. *Аркадзя Куляшова*), «Вераніка» (муз. І. Лучанка, сл. М. Багдановіча), «Добры вечар, дзяўчыначка» (муз. І. Лучанка, сл. народныя) – усе ў альбоме «Песні Ігара Лучанка» – «Мелодия», 1978), «Белоруссия», «Каждый четвёртый», «Ты мне вясною прыснілася», «Добры вечар, дзяўчыначка» (усе ў зборніку «Мінскі сувенір» – «Мелодия», 1980).

**Кіно, відэа:** «Песняры» («Тэлефільм» Дзяржтэлерадыё БССР, рэж. *Уладзімір Арлоў*, 1971), «Ясь і Яніна» («Беларусьфільм», рэж. Ю. Цвяткоў, 1976), «Диск» («Мосфильм», рэж. А. Стэфановіч, 1978), «20 минут с «Песнярами» («Ленфильм», 1980), «А также цирк» (рэж. У. Арлоў, 1983), «Через всю войну» (рэж. С. Лук'янчыкаў, 1984), песні і аранжаванні У. Мулявіна выкарыстоўваліся ў спектаклі «Мікітаў лапаць» (па п'есе М. Чарота, ТЮГ, Мінск, 1974), кінафільмах «В земле нашей корни» («Беларусьфільм», 1975), «Камедыянт» (рэж. У. Арлоў, 1987); **кліп** «Распавядальная» (2007).

**Кантакт:** www.pesnyary.by

15.07.07//Д.П., фота У. Парфянка.

**«ПЕСНЯРЫ» п/к Л. Барткевіча** – вакальна-інструментальны ансамбль.

Утварыўся з ініцыятывы *Леаніда*

*Барткевіча* ў жніўні 2003 пасля таго, як група музыкаў БДА *«Песняры»* пакінула гэты калектыў. Склад: Л. Барткевіч – мастацкі кіраўнік, вакал, Сяргей Мядзведзеў – гітара, Алег «Паганіні» Усціновіч – бас-гітара, аранжаванне, кампазіцыя, Павел Заяц – вакал, клавішныя, барабаны, кампазіцыя (→ люты 2004, *«Песняры» п/к І. Свечкіна*), Вадзім Касенка – вакал, бас-гітара, клавішныя (→ люты 2004, «Песняры» п/к І. Свечкіна), Уладзімір Стамаці – вакал (→ люты 2004, «Песняры» п/к І. Свечкіна), Міхаіл Долатаў – вакал (← 2004), Ян Жанчак – вакал, альт (← 2004), Юрый Рудакоўскі – барабаны (← 2004), Павел Хасанаў – клавішныя (← 2004 → 2006), Генадзь Бліноў – клавішныя (← 2006). Рэпертуар калектыву заснаваны на вядомых песнях, якія выконваў ансамбль «Песняры», песнях кампазітараў савецкага часу, а таксама на арыгінальных творах і апрацоўках беларускіх народных мелодый.
**Гастролі:** пераважна па Расеі.
**Дыскаграфія:** «Не во сне ли» («Vigma», «Никитин», 2005).
**Кантакт:** www.pesnyary.borda.ru
07.11.06//Д.П.

**«ПЕСНЯРЫ» п/к І. Свечкіна** – вакальна-інструментальны ансамбль.
Утварыўся ў лютым 2004 пасля таго, як частка музыкаў пакінула склад калектыву *«Песняры» п/к Л. Барткевіча*. У ансамблі выступаюць: Аляксандр Віслаўскі – клавішныя (← *«Rouble Zone»*), *Віктар Малчанаў* – гітара (← *«Песняры»*, *Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі*), Павел Заяц – вакал, клавішныя, барабаны, кампазіцыя (адначасова *«Лявоны»*, ← *БДА «Песняры»*), Вадзім Касенка – вакал, клавішныя, бас-гітара (← Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, БДА «Песняры»), Уладзімір Стамаці – вакал, Аляксандр Марозаў – бас-гітара, бэк-вакал (← 2006 Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, БДА «Песняры»). Рэпертуар калектыву заснаваны найперш на вядомых шлягерах са спадчыны «Песняроў».
**Гастролі:** пераважна па Расеі.
07.11.06//Д.П.

**ПІЛІПЕНКА ІВАН (Пилипенко Иван, Pilipenka Ivan)** – гітарыст, кампазітар.
Нарадзіўся 11.04.1964 у Гомелі. Авалодаў гітарай самастойна. Апрача гэтага, грае на гуслях, бандуры, цымбалах, сітары, тары, сазе, мандаліне, арфе. Як музыка дэбютаваў у першай палове 80-х, супрацоўнічаў з У. Ухцінскім, *Віктарам Вуячычам*, групамі *«Галерея снов»*, *«Сябры»*, «Эдгар По». Выступае пераважна сола, часам – з сесійнымі музыкамі, выконваючы эксперыментальную аўтарскую гітарную музыку з ужываннем электроннай апрацоўкі гуку.
**Гастролі:** канцэрты ва Уладзівастоку, на Сахаліне, у Яраслаўлі, Мінску.
**Фестывалі:** «Ренессанс гитары» (Гомель, 1995, 1997, 2000, 2004).
**Дыскаграфія: альбомы** – у складзе «Галереи снов» дэма-альбомы «Для друзей» (1993), «Мечта по заказу» («Ковчег», 1995), «Примитив» (1997), сольны CD «Рисунки на воде. Акустика-импрессио» (аўт. выд., 2004); **трэкі** на дэма-альбомах «Ренессанс гитары» (1995, 1997, 2000, 2004).
**Кантакт:** +375 (1232) 53-83-91 (пр.).
12.02.06//N.N.

**«ПИНГВИНЫ»** – група з Мінску. Утварылася ў 1965, выконвала як вядомыя песні заходніх калектываў, так і ўласныя творы, трымаючыся стылю біг-біту, рок-н-ролу і блюзу, спяваючы на расейскай і ангельскай мовах. Група выступала складам: Аляксандр Няхайчык – гітара, Уладзімір Іванін – барабаны, Аляксандр Валодзькін – сола-гітара, *Андрэй Плясанаў* – бас-гітара. Спыніла існаванне ў 1968.
**Фестывалі:** І Рэспубліканскі фестываль біт-музыкі (Мінск, 1968).
**Кантакт:** aplesanov@mail.ru; +375 (17) 206-59-43
07.01.06//Д.П.

**ПЛОТНІКАВА ВОЛЬГА (Плотникова Ольга, Plotnikava Volha)** – спявачка, выканаўца сучаснай папулярнай песні, аўтар тэкстаў. Нарадзілася 16.05.1980 у Івацэвічах Брэсцкай вобл. У 2003 скончыла БДПУ ім. М. Танка па спецыяльнасці біёлаг-валеёлаг. Творчы шлях распачала ў 1998 як салістка студыі «Красные звёзды». У 2001–02



працавала ў складзе музычнага калектыву за мяжой. Ад 2003 распачала сольную кар'еру. Спявае пераважна на расейскай мове. Прадзюсаваннем яе займаецца *Генадзь Маркевіч*. Найбольш вядомыя песні «Любовь под дождем», «Все не беда», «Они», «Падает снег».
**Гастролі:** Белгарад, Санкт-Пецярбург (2005).
**Фестывалі:** «Славянский базар 2004», «Мальвы» (Беласток, Польшча, 2004).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Где-то» (2005), «Так бывает» («West Records», 2007).
**Кіно, відэа: кліпы** «Любовь под дождем», «Они», «Где-то» (рэж. А. Коршак, 2004), «Так бывает» (2006).
**Кантакт:** www.plotnikova.com; olga@plotnikova.com; +375 (29) 629-91-15
14.11.07//Д.П.–А.Р.

**«ПЛОХИЕ ДЕТИ»** – брэсцкі калектыў, які выступае ў стылі пап-року. Утварыўся ў 1997 складам: Георгій Кяскевіч – гітара, Кірыла Самойлаў – бас-гітара, Юрый Монін – гітара, вакал, Мікіта Монін – вакал плюс запрошаныя барабаншчыкі. У 1998 на месцы Г. Кяскевіча і М. Моніна прыйшлі Мікалай Сурмач – гітара (→ 2002), Ірына Чашанок – клавішныя, вакал (→ 1998 ← Наталля Руцкая), Уладзімір Старавойтаў – барабаны. У сярэдзіне 2004 група выступала складам: Ю. Монін, Аляксандр Леўчанка – бас-гітара (← 1999), Юрый Галоўчанка – гітара (← 2002) плюс запрошаныя барабаншчыкі.
**Дыскаграфія: трэк** «Осенний дождь» (у зборніку «Брест-рок-журнал 2» – «Брестон», 1999).

**Кантакт:** +375 (162) 26-33-71 (пр. Ю. Моніна).
17.06.04//Г.Ш.

**ПЛЯСАНАЎ АНДРЭЙ (Плесанов Андрей, Plesanau Andrei)** – гітарыст, вакаліст, аўтар музыкі і тэкстаў.

Нарадзіўся 11.12.1948 у Мінску. У 1980 скончыў рэжысёрскі факультэт БДТМІ па спецыяльнасці рэжысёр драмы. Творчы шлях у музыцы пачаў як бас-гітарыст мінскай групы *«Пингвины»* ў 1965. Ад 1968 да 1970 працаваў артыстам эстрады БДФ, ад 1970 да 1972 – музыка групы «Пралескі» ДК МВАІД, пасля чаго на працягу году з'яўляўся ўдзельнікам ансамбля «Славяне» ДК чыгуначнікаў. Ад 1973 да 1980 выступаў у складзе мінскіх рэстарацыйных калектываў, у 1980–92 – рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм». У 1998 вярнуўся да музыкі, заснаваўшы групу «Прощай, молодость» (ад 2001 – *«P.L.A.N.»*).



У творчасці трымаецца традыцый рок-н-ролу і блюзу, піша і выконвае песні пераважна па-беларуску. Сярод найбольш вядомых песень «Шукальнікі сэнсу», «Шынкарачка», «Рок-н-рол шанц», «Вялікае калі ласка», «Купальскі рок-н-рол».

**Фестывалі:** у складзе «Пингвинов» – I Рэспубліканскі фестываль біт-музыкі (Мінск, 1968), фестывалі «Студенческая весна» (Мінск, 1971, 1972, 1973), «Рок против СПИДа» (Мінск, 2000), «Рок-каранацыя» (2001, 2006), «Блюз жыве ў Мінску» (2002), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2003).

**Дыскаграфія:** гл. «P.L.A.N.».

**Іншая інфармацыя:** ад сярэдзіны 60-х займаецца жывапісам. У 2002 ягоная карціна «Матылі тут больш не жывуць» была ўключана ў галандскі каталог «Сусветная арт-калекцыя. Сучаснае мастацтва канца XX ст.».

**Кантакт:** aplesanov@mail.ru; +375 (17) 206-59-43
07.01.06//Д.П., фота Д.П.

**«ПО ГЛАЗАМ»** – група з Мінску, якая, згодна з вызначэннем С. Зылікавай, выконвае на расейскай мове «жаночы гламурны рок».

Утварылася ў 1999. Першапачатковы склад: Станіслава Зылікава – вакал, тэксты, Максім Самос – гітара, Кірыла Канюшык – бас-гітара (адначасова *«Леприконсы»*, *«Фестиваль»*), Яўген Найдовіч – барабаны. У розны час з калектывам супрацоўнічалі Дзяніс Савік – гітара, Кірыла Казакоў – басгітара, Аляксей Лапух – клавішныя, Андрэй Драмс – барабаны, а таксама саўндпрадзюсэры М. Фадзееў, А. Жукаў. У 2006 аснову калектыву склалі С. Зылікава, К. Казакоў і Яўген



Шакола – клавішныя, якія працуюць са спецыяльна запрошанымі музыкамі. Найбольш вядомыя песні «Принцесса на горошине», «Солнце разливается».

**Гастролі:** серыя клубных канцэртаў у Маскве (2002–05).

**Фестывалі:** «Нашествие» (Масква, 2003), «Новая волна» (Расея, 2002).

**Дыскаграфія: альбом** CD «Солнце разливается» («REAL Records», Расея, 2003); **трэкі** «Солнце разливается» (у зборніках «Нашествие. Шаг десятый» – «REAL Records», Расея, 2002, «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000), «Принцесса на горошине» (у зборніку «Девишник» – «REAL Records», Расея, 2003).

**Кіно, відэа: кліп** «H2O» (рэж. З. Панцялейка, 2003).

**Кантакт:** stasya2005@list.ru; +375 (29) 640-42-22; менеджэр Раман Саўранскі: +375 (29) 689-79-78; romario_agro76@mail.ru.

21.10.06//Д.П.–А.Р.

**ПРАНЧАК ЛЕАНІД (Прончак Леонид, Pranchak Leanid)** – паэт, журналіст, перакладчык, драматург. Нарадзіўся 12.11.1958 у в. Пранчакі Ляхавіцкага р-ну Брэсцкай вобл. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1981), БДЛУ (1999), вучыўся ў аспірантуры Інстытуту сусветнай літаратуры АН СССР (1989–92). Пачынаў як журналіст на Магілёўскім абласным радыё (1981–83), працаваў у Рэспубліканскім штабе студэнцкіх будаўнічых атрадаў (1983–91), тэатры-студыі *«Верасы»* (1992), *Дзяржаўным канцэртным аркестры Беларусі* (1992–93), уласным карэспандэнтам газеты «Рэспубліка» ў ЗША (1994–95), першым намеснікам галоўнага рэдактара часопісу «Вожык» (2001–02). Сябра Саюзу журналістаў Беларусі і Саюзу пісьменнікаў Беларусі. Больш за 500 вершаў пакладзена на музыку. Сярод найбольш вядомых песень «Даставай, Язэп, гармонік», «Пад зоркаю Пагоні», «Калыханка» (муз. *Дзмітрыя Яўтуховіча*), «Жыве Беларусь!» (муз. *Васіля Раінчыка*), «Сумны саксафон», «Паклонніца» (муз. *Эдуарда Ханка*), «Сто гадоў!» (муз. *Мікалая Сацуры*), «Талака», «Цёмнавокая пані» (муз. *Ігара Паліводы*), «Каханая» (муз. *Валерыя Іванова*), якія выдаваліся ў Расеі, Польшчы, ЗША. Аўтар лібрэта пап-опер «Максім», «Беларушчына» (муз. І. Паліводы), мюзіклу «Афрыка» (муз. *Уладзіміра Кандрусевіча*). Браў удзел у шматлікіх фестывалях у Беларусі і па-за межамі краіны.

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Талака» (1998), «Галоўныя словы», «Пад зоркаю Пагоні» (1999), «Цік-так, ходзікі» (1999), «Між Нью-Ёркам і Менскам» (2000), «Пяшчота» (2000) – усё «Ковчег».

**Кнігі:** зборнікі вершаў «Ясак любові» (1988), «Першапутак» (1988), «Дзяўчынка беларуска» (1993), «Вольны птах» (1998), «Біблія для каханай» (1998), «Пра дзядулю, пра бабулю і пра іх унучку Юлю» (1999), «Ціт-так, ходзікі» (2001), «Цар-царэвіч з Івацэвіч» (2001), «Мама, тата і Агата» (2002), мастацка-дакументальная кніга «Беларуская Амэрыка» (1994).
**Іншая інфармацыя:** валодае беларускай, ангельскай, расейскай, польскай мовамі.
**Кантакт:** +375 (17) 228-64-96; pranchak@mail.ru; 220007, Мінск-7, а/с 198.
03.03.04//Д.П.

**«ПРИНЦИП ДОМИНО»** – мінская група.
Утварылася ў студзені 1988 году і першапачаткова выступала пад назвай «Домино». Дэбютавала канцэртам 23 лютага 1988 у Мінску. Музыка засноўвалася на расейскамоўных і ангельскамоўных аўтарскіх песнях у стылі хард-року і блюзу. У першым складзе калектыву выступалі Мікалай Чарнаокі – гітара, аўтар музыкі, аранжавальнік, лідэр, Уладзімір Патэнт – барабаны, перкусія, Уладзімір Плотнікаў – бас-гітара, Сяргей Марозаў – клавішныя, саксафон, Аляксандр Казлоў – гітара, Сяргей Дзямідаў – гукарэжысёр, Алег Цім – тэксты, адміністратар. У 1988 склад групы дапаўняецца вакалісты Святлана Гаўрыленка і Аляксандр Перцаў, С. Марозава і С. Дзямідава змяняюць Пётр Анікееў – клавішныя і Ігар Арцёмкаў – гукарэжысёр. У 1989 група прымае назву «Принцип домино», на месца А. Ціма прыходзіць Андрэй Рымашэўскі, якога ў наступным годзе змяняюць Юрый Лапкоўскі і Валянціна Караева. У 1991 у групе выступалі: М. Чарнаокі, У. Плотнікаў, С. Гаўрыленка, П. Анікееў, Аляксандр Сазонаў – барабаны, Віталь «Пашка» Шастаковіч – піратэхнік. Найбольш вядомыя песні «Ворона», «Город велик».
**Гастролі:** Літва (1988), Украіна, Туркменія і Узбекістан (1991), канцэрты па Беларусі.
**Фестывалі:** «На доўгім бродзе» (Мінск), «Рок-крок», «Штурмуем музыкальный олимп» (Масква, 1989), «Горадня 1989», «Памяці Джона Ленана» (Мінск, 1990), адны з арганізатараў і ўдзельнікаў канцэрту ў гонар дня народзінаў Рычы Блэкмара (Мінск).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Парк» (1989), CD «Домино. The Best» («Rat Records», Ізраіль, 2005).
**Кіно, відэа: кліп** «Sky Boat Song» (рэж. Б. Бахціяраў, 1990).
13.03.06//Д.П.

**ПРОХАРАЎ СЯРГЕЙ (Прохоров Сергей, Prokharau Siarhey)** – дыджэй, вядучы радыёпраграм і канцэртаў, гукарэжысёр.
Нарадзіўся 20.01.1964 у Мінску. Скончыў МІК у 1988 па спецыяльнасці культурна-асветная работа. Па сканчэнні працаваў у інстытуце на кафедры рэжысуры масавых святаў, выкладаў асновы гукарэжысуры. Ад чэрвеня 1993 да траўня 1996 – вядучы музычных праграм на радыё «Би-Эй» (сярод іншага – штотыднёвыя праграмы «Весь этот джаз», «Стёб да стёб»), ад лютага 1997 і да сёньняшняга дня – супрацоўнік радыё «РОКС». Адначасова супрацоўнічаў



з тэлепраграмай «Акалада» як аўтар сюжэтаў і вядучы. Аўтар і вядучы штодзённай праграмы «Посторонись, Бетховен!» (ад красавіка 2002 да кастрычніка 2004), аўтар і вядучы многіх жывых эфіраў з выканаўцамі заходняй, расейскай і беларускай музыкі на радыё «РОКС». Вядучы першага фестывалю «Грифомания», фестывалю «Первая площадка». У пачатку 2005 адхіліўся ад працы ў жывым эфіры, засяродзіўшыся на гукарэжысуры.
**Кантакт:** prosha@roks.com, sergey.borisich@gmail.com; +375 (29) 656-12-42.
28.04.07//Д.П.

**ПУГАЧОЎ МАКСІМ (Пугачев Максим, Pugachou Maksim)** – піяніст, аранжавальнік, кампазітар.

Нарадзіўся ў Мінску 30.12.1971. Скончыў ДМШ №1 Мінску па класе фартэпіяна, у 1990 – ССМШ пры БДК, у 1989 БДК па класе фартэпіяна Л. Малышавай-Матукоўскай. Адначасова з вучобай у кансерваторыі выступаў у рэстарацыйных калектывах, займаўся аранжаваннямі і кампазіцыяй, працаваў як канцэртмайстар. Працягваў навучанне ў асістэнтуры БДК, атрымаўшы ў 1995 запрашэнне ў малы склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Вайсковую службу праходзіў у аркестры штабу Мінабароны (1996–97), пасля чаго быў паўторна запрошаны ў аркестр, дзе кароткі час працаваў як піяніст. У 1998 стаў удзельнікам малой групы аркестру *«Apple Tea»*, у складзе якой працаваў да снежня 2000, калі яго запрасілі ў ансамбль *«Белорусские Песняры»*. Напісаў інструментальныя п'есы «Сюіта», «Danat's Tune», «Kupala's Night», «Apple World» для групы «Apple Tea», зрабіў шэраг аранжаванняў песень для «Белорусских Песняров». Адначасова працягвае супрацоўніцтва з «Apple Tea» як спецыяльна запрошаны музыка.
**Фестывалі:** «Мінск 1997» (разам з *Уладзімірам Ткачэнкам*, В. Чайковым, *Аляксандрам Ванкевічам*), у складзе «Apple Tea» – «Kaunas Jazz 1998» (Літва), «Klaipeda Jazz» (Літва, 1999, 2000), «Jazz Jamboree» (Варшава, Польшча, 2000), у складзе «Белорусских Песняров» – «Фестиваль славянской письменности» (Калуга, 2001), «Даже не пробуй» (Калининград, 2002), «Славянский базар» (Віцебск, 2001).
**Дыскаграфія:** у складзе «Apple Tea» – гл. 1998–2000; у складзе «Белорусских Песняров» – гл. 2003–04; сола – «4U» («One Records»/«Белорусские Песняры Records», 2007).
**Кантакт:** www.max-band.com
27.12.07/Д.П.

**ПУКСТ СЯРГЕЙ (Пукст Сергей, Pukst Sergey)** – кампазітар, аранжавальнік, піяніст, гітарыст.

Нарадзіўся 14.10.1972 у Мінску. У 1986 скончыў ССМШ пры БДК па класе кларнета, у 1991 – Мінскую мастацкую вучэльню па спецыяльнасці апрацоўка дрэва, косці, каменя,



у 1996 – Інстытут замежных моў у Мінску. У 1997–99 вучыўся на падрыхтоўчым аддзяленні БАМ (вакал). Сістэмна займацца музыкай пачаў ва ўзросце 14 гадоў. На пачатку 90-х быў удзельнікам панк-групы «Король пчел», якая падчас выступленняў вялікую ўвагу надавала візуальнаму боку канцэртаў. Ад 1993 да 1998 выступаў з сольнымі канцэртамі на кватэрах, пазней у дуэце з Антонам Крывулем даў шэраг паказаў у мінскіх клубах і навучальных установах, якія былі пазначаны авангарднымі вырашэннямі формы і зместу. Ад 2005 выступае як лідэр групы «Pukstband» (Антон Ганькоў – клавішныя, Максім Кот-Кузьма – басгітара, Арцём Залескі – барабаны), якая выконвае эклектычнага характару музыку з элементамі розных стыляў. Найбольш вядомыя песні «Не было тебя», «Триумф воли».

**Фестывалі:** «SKIF» (Санкт-Пецярбург, 2007).
**Гастролі:** Расея, Украіна (вясна 2007).
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Сны» (аўт. выд., 1997), CD «Strange Glamour» (аўт. выд., 2001), «Пукст джаз» (аўт. выд., 2005), максі-сінгл «Триумф Воли» (аўт. выд., 2006).
**Кнігі:** «Чужой воздух» (2004).
**Кіно, відэа: кліпы** «Странный блеск» (рэж. М. Сіры, 2006), «Не было тебя» (рэж. М. Сіры, 2007).
**Кантакт:** www.pukst.com; +375 (29) 640-39-40.
28.04.07//Д.П.

**ПУЧЫНСКІ ВАЛЯНЦІН (Пучинский Валентин, Putchinsky Valentin)** – кампазітар, паэт, спявак, бас-гітарыст.

Нарадзіўся 23.05.1956 у Мінску, памёр 26.09.2003 у Чыкага, ЗША. Скончыў БДУ па спецыяльнасці журналістыка ў 1978, працаваў у спартовай рэдакцыі БТ. Ад 1969 да 1971 выступаў у складзе ВІА *«Менестрели»*, спяваючы і граючы на бас-гітары, скрыпцы. Ад 1973 да 1977 – удзельнік ВІА БДУ, вакаліст і бас-гітарыст. Ад 1977 – бас-гітарыст, вакаліст, асноўны аўтар песень групы *«Сузор'е»*. Пісаў на расейскай і беларускай мовах. У сярэдзіне 90-х выехаў у ЗША, дзе выступаў з прыватнымі канцэртамі на кватэрах. Найбольш вядомыя песні «Старый мост», «Океан звезд», «Сладкая женщина», «Я вернусь», «Падарожжа», «И все-таки я верю», «Фортуна», «Во все времена», «Король и шут».
**Гастролі:** у складзе «Сузор'я» – больш за 1500 канцэртаў па ўсім СССР.

**Фестывалі:** міжнародны фестываль палітычнай песні «Рига 1978», Усесаюзны конкурс песні «Ялта 1981», Другі ўсесаюзны фестываль польскай песні «Віцебск 1990».

**Узнагароды:** у складзе «Сузор'я» – лаўрэат Міжнароднага фестывалю палітычнай песні «Рига 1978», дыпламант Усесаюзнага конкурсу песні «Ялта 1981».

**Дыскаграфія:** гл. «Сузор'е».

**Кіно, відэа: кліпы** «Я вернусь» (БТ, 1981), «Капитан»; музыка да мультфільму «Про кота Васю и катавасию» (муз. *Эдуарда Ханка*, «Беларусьфільм», 1982).

**Кантакт:** +375 (29) 637-34-72 (Андрэй Філатаў); +375 (29) 651-62-71, rii8@hotmail.com (Уладзімір Пучынскі).

23.09.05//Д.П.

**ПУЧЫНСКІ ЎЛАДЗІМІР (Пучинский Владимир, Puchinsky Uladzimir)** – гукарэжысёр, прадзюсэр. Нарадзіўся 02.03.1949 у Мінску. У 1979 скончыў МРТІ. Ад 1969 да 1971 быў кіраўніком студэнцкага ВІА МРТІ «Меридиан», ад 1977 да 1981 – гукарэжысёр групы *«Сузор'е»* ў часе яе працы ў аднайменнай кавярні, ад 1981 да 1983 – музычны кіраўнік і гукарэжысёр гэтай групы ў БДФ. Быў гукарэжысёрам аркестру ДК Белсаўпрафу п/к В. Сердзюка, пасля займаўся бізнэсам. У 2001 выступіў ініцыятарам і прадзюсэрам адраджэння групы «Сузор'е», правёў шэраг канцэртаў, адрэстаўраваў і падрыхтаваў да выдання альбомы калектыву «Кафе», «Нелли + Сузор'е», «Рок-терапия». У 2003, працуючы ў Беларускім інстытуце праблем культуры, выступіў як прадзюсэр праекту «Творчая спадчына народнага артыста СССР У.Г. Мулявіна і ансамбля «Песняры» на 21 кампакт-дыску. У 2004 пачаў працу ў якасці прадзюсэра над мультымедыйным праектам «Славянский базар в Витебске». У 2006 пакінуў працу ў БІПК і як прадзюсэр узначаліў дзіцячы Інтэрнет-партал deti.by.

**Фестывалі:** у складзе «Сузор'я» – Міжнародны фестываль палітычнай песні «Рыга 1978», Усесаюзны конкурс песень краін сацыялістычнай садружнасці «Ялта 1981».

**Узнагароды:** у складзе «Сузор'я» – лаўрэат Міжнароднага фестывалю палітычнай песні «Рыга 1978».

**Кантакт:** rii8@hotmail.com

19.06.06//Д.П.

**ПЫТАЛЕЎ АНДРЭЙ (Пыталев Андрей, Pytaleu Andrey)** – джазавы піяніст, кампазітар, аранжавальнік. Нарадзіўся ў Магілёве. Скончыў БДК па класе фартэпіяна І. Цвятаевай у 1985. Пасля службы ў войску звярнуўся да джазавага стылю. Выступаў сола, у 1988 стаў акампаніятарам вакальнай групы *«Camerata»*, у складзе



якой выступіў на шэрагу ўсесаюзных джаз-фестываляў. Выконвае як уласныя аранжаванні джазавых стандартаў, так і аўтарскія творы. Працаваў з сольнымі праграмамі за мяжой – у Бахрэйне, Паўднёвай Карэі.
**Фестывалі:** «Юность Полесья» (Гомель, 1988), Міжнародны фестываль вакальнага джазу ў Панявежысе (у складзе «*Camerata*», 1988), «Витебская осень» (1988), «Дни фортепианного джаза» (Мінск, 1989, 1990), «Vasaras ritmi» (Рыга, 1989), «Birstonas» (Літва, 1994), Ніжні Ноўгарад, Клайпеда.
**Узнагароды:** лаўрэат I прэміі Усесаюзнага конкурсу піяністаў-імправізатараў (Вільня, 1988).
05.02.05//Д.П., фота Д.П.

**ПЫТЛЕВА КАЦЯРЫНА (Пытлева Екатерина, Pytleva Katsiaryna)** – спявачка, рэжысёр кліпаў, аўтар музыкі і тэкстаў, вядучая тэле- і радыёпраграм.
Нарадзілася 06.06.1983 у Мінску. У 2005 скончыла біялагічны факультэт БДУ. Займацца музыкай пачала, выступаючы ва ўзорным дзіцячым хоры «Зорачка». У 1996–2001 – вакалістка групы «Персона», ад 1997 да 2002 – спецыяльны карэспандэнт і вядучая моладзева-пацяшальнай праграмы «5х5» на I нацыянальным тэлеканале. Ад 2001 – ды-джэй FM радыё «Мир», у 2002–03 – вядучая хіт-параду «Кліп абойма» на I нацыянальным тэлеканале, у 2003–04 – вядучая інтэрактыўнай праграмы «Клип боксинг» на I музычным тэлеканале. Ад 2004 – вядучая, спецыяльны карэспандэнт праграмы «120/80 news» на I музычным тэлеканале. Ад 2003 – вакалістка, аўтар музыкі і тэкстаў песень групы *«Клёндайк»*, у складзе якой выконвае ўласныя песні на расейскай мове. Найбольш вядомыя песні «Не важно», «Не получится», «Одна», «Не молчи».
**Фестывалі:** міжнародны фестываль дзіцячых народных калектываў у Велінградзе (Балгарыя), «Открытое небо 2005» (Мінск), «ВотСтог 2005» (2005, Наваполацк), «Танцы на палянцы» (2005, Мінск), «Рок за бобров 2006».
**Кіно, відэа:** сцэнарыст, рэжысёр кліпаў «Не важно», «Не получится», «Подарить» групы «Клёндайк».
**Узнагароды:** медаль «По труду и честь» за ўнёсак у пашырэнне і фармаванне інфармацыйнай прасторы краін Садружнасці.
**Дыскаграфія:** гл. «Клёндайк».
**Кантакт:** www.tez-z-z.boxmail.biz; ezhaka.livejournal.com; kp@one.by; tez-z-z@mail.ru; +375 (29) 775-27-00.
14.10.06//Д.П.

**ПЯТРОЎСКІ СЯРГЕЙ (Петровскій Сергей, Petrovski Sergey)** – выканаўца на клавішных, студыйны і канцэртны гукарэжысёр, акустык.
Нарадзіўся 07.03.1961 у Мінску. Ад 1968 пачаў выступаць як баяніст у складзе аркестру Палацу піянераў «Зорачка». Ва ўзросце 15 гадоў захапіўся гітарай, выступаў у складзе розных дваравых груп. Вучыўся ў гітарнай студыі пры ДК камвольнага камбінату. Пазней працаваў рабочым-геадэзістам, рабочым эстраднага аддзелу БДФ (ансамблі *«Верасы»*, *«Тоніка»*). У 1979–80 служыў у войску, дзе загадваў клубам, завочна вучыўся па класе гармоніі ў Маскоўскім інстытуце культуры. У 1981–87 працаваў гукарэжысёрам

і светлатэхнікам у тэатры пантамімы «Рух», дзе займаўся таксама падборам музыкі для пастановак трупы. Адвучыўся 4 курсы ў БДТМІ па спецыяльнасці тэатразнаўства (эканоміка). У 1985–95 – гукарэжысёр, піяніст, гітарыст джаз-бэнду ПК Белсаўпрафу п/к В. Сердзюка. У 1989–97 – музыка, аранжавальнік, гукарэжысёр групы *«Flat»*, ад 1991 да 1992 – гукарэжысёр вакальнай групы *«Camerata»*, у 1993–96 – мастак па святле трупы «Мінскі класічны балет». Пазней год адпрацаваў як гукарэжысёр ДКАБ, потым – БДА *«Песняры»*. З 1998 пачаў выступаць як незалежны гукарэжысёр і кіраўнік праектаў (канцэрты трыо Э. Ізмайлава, квінтэту М. Балаты, квартэту З. Намыслоўскага). У 2001 працаваў гукарэжысёрам аркестру мюзіклу «Норд-ост» (Масква), у 2003–05 супрацоўнічаў як гукарэжысёр з Прэзідэнцкім аркестрам Беларусі. Ад 2002 спецыялізуецца на выкананні электраакустычных разлікаў для тэатраў, аўдыторый і спартовых збудаванняў. Прадстаўнік «Tonstudio BEUSCH» (Швейцарыя) у Беларусі.

**Гастролі:** разам з «Camerata» – Швейцарыя (1991), разам з «Мінскім класічным балетам» – Іспанія (1996, 1997), Нямеччына, Швейцарыя (2000).

**Фестывалі:** разам з ДКАБ – «Славянский базар» (Віцебск, 1996, 1997), «Камерата» запрашае сяброў» (Мінск), міжнародная музычная акцыя «Jazz Forum» Express» (Варшава–Мінск–Масква–Санкт-Пецярбург).

**Дыскаграфія:** у складзе групы «Flat» – **альбом** MC «Street Boogie» («Vigma», 1997).

**Кантакт:** +375 (29) 684-26-58; psm777@inbox.ru

28.07.07//Д.П.

**ПЯТРЭНКА МІКАЛАЙ (Петренко Николай, Piatrenka Mikalai)** – кампазітар, педагог.

Нарадзіўся 19.12.1919 у в. Барбароў Мазырскага р-ну Гомельскай вобл., памёр 3.01.1997. Скончыў Мінскі педінстытут (1940), ад 1946 працаваў ва ўстановах народнай асветы, ад 1960 выкладаў у Полацкай педвучэльні. Сярод найбольш вядомых песень – «Ручнікі» (сл. В. Вярбы), «Прывітальная», «Вочы зямлі маёй». Аўтар зборніка песень «Беларусі мілай» (1997) на вершы айчынных паэтаў.

**Дыскаграфія: трэк** «Ручнікі» (альбом «Песняры 1» – «Мелодия», 1970).

Паводле Белэнцыклапедыі.

**«ПЯТЫЙ УГОЛ»** – мінская джазавая група. Утварылася на базе квінтэту *Ігара Сафонава* ў 1989. Выступала як малы склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. У калектыв уваходзілі *Барыс Бернштэйн* – бас-гітара, Вадзім Чайкоў – барабаны, *Уладзімір Ткачэнка* – скрыпка, гітара, Сяргей Аляксандраў – клавішныя, *Ігар Палівода* – клавішныя, *Анатоль Радзюкоў* – саксафон, флейта, *Валерый Дайнэка* – вакал. Рэпертуар складаўся як з джазавых стандартаў ва ўласных аранжаваннях, так і з аўтарскіх твораў У. Ткачэнкі, часта заснаваных на фальклорных матывах. Выконваў калектыў і габрэйскія мелодыі са спецыяльна запрошанай салісткай *Інай Афанасьевай*. Ансамбль праіснаваў да 1997, калі яго ідэйны натхняльнік Б. Бернштэйн выехаў за мяжу. Захаваны канцэртныя запісы, зробленыя музычнай рэдакцыяй Беларускага радыё.




**Фестывалі:** фестывалі ў Мінску, Маладзечне, Віцебску, «Boby Vasara» (Пасваліс, Літва, 1992).

05.02.05//Д.П.

**«PARTYZONE»** – мінская група. Утварылася ў 1994 з ініцыятывы вакаліста Уладзіміра Гнутава. Трымаецца стылю класічнага року, рэпертуар засноўвае на аўтарскіх беларускамоўных песнях. У канцы 1995 усталяваўся наступны склад калектыву: У. Гнутаў, Віктар Ступчык – бас-гітара, Яўген Цылікаў – гітара, аўтар песень, *Андрэй Дзяменцьеў* – гітара, Дзяніс Вячэрскі – клавішныя, Зміцер Гунько – барабаны. Неўзабаве на некаторы час група спыніла існаванне. Зноў вярнулася да дзейнасці ў 2000. У 2005 выступалі наступным складам: Дз. Вячэрскі, Яўген «Ebtehun» Цылікаў, Сяргей «Hell» Малінін – гітара, Андрэй «Maestro» Вераб'ёў – клавішныя, Алег «Отец» Клімчанка – бас-гітара, Аляксей Яфрэменка – барабаны. Найбольш вядомыя песні «Маё сэрца» (сумесна з Русяй).

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2002, 2003).

**Узнагароды:** прыз радыё «Беласток» на фестывалі «Басовішча 2002».

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Can't Fly» (дэма, 1996), CD «Трэба рабіць» («БМAgroup», 2002), «Сьмерці няма» («БМAgroup», 2005); **трэкі** «Бывайце» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМAgroup», 2002), «Парай дарогу» (у зборніку «Hard Life Heavy Music II» – «БМAgroup», 2003), «Сьмерці няма» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004).

**Кантакт:** www.party-zone.org

23.09.05//Д.П.

**«PEACEMAKER»** – група з Брэсту, якая выступала ў стылях грандж/альтэрнатыва.

Дэбютавала на брэсцкай сцэне 14 студзеня 1997 наступным складам: Юрый Карагода – музыка, тэксты,



гітара, вакал, Юрый Юрчык – бас-гітара, часам бэк-вакал, гармоніка, Юрый Мазалеўскі – барабаны. Да таго моманту, як на пачатку 2000 калектыў спыніў існаванне, ён выступаў тым самым складам. Неўзабаве Ю. Карагода і Ю. Юрчык сабралі групу «Снайперы», якая ўвосень 2000 атрымала назву *«Onegin»*, Ю. Мазалеўскі цягам 2000–01 выступаў у складзе групы «Век», у 2002 аднначасова з'яўляўся ўдзельнікам груп «Республика ШКИД» і «Шестой эпизод».

**Дыскаграфія: альбом** MC «Second Hand Souls» («Брестон», 1999), **трэкі** «Monday» (у зборніку «Брест-рок-журнал» – «Брестон», 1998), «The New Guard» (у зборніку «Брест-рок-журнал 2» – «Брестон», 1999).

**Кантакт:** +375 (162) 41-91-58 (Ю. Карагода).

28.03.04//Г.Ш., фота М. Карагоды

**«PETE-PAFF»** – мінская група.

Утварылася з ініцыятывы гітарыста групы *«N.R.M.»* Піта Паўлава ў 2003 і трымаецца стылю этнамузыкі.

Першапачатковы склад: *Піт Паўлаў* – вакал, домра, гітара, Андрэй Сапоненка – барабаны, перкусія, дадатковы вакал, Сяргей Шэпелеў – туба, Наста Нямшон – цымбалы, Кастусь Карповіч – трамбон, Яраш Малішэўскі – дуда, колавая ліра, акарыны, пішчыкі, дудкі, варган. У 2004 на месца Н. Нямшон прыйшла Алеся Шагун.

**Гастролі:** канцэрты ў Паўночнай Нямеччыне (2004), Польшчы (2005), Варшаве (студзень 2007).

**Дыскаграфія: альбом** CD «Pahlyblennie» (аўт. выд., 2006); **трэкі:** «Nir-Nor» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМAgroup», 2002).

**Кантакт:** www.garadzkija.net; petepaff@tut.by; +375 (29) 677-17-66.

12.01.07//Д.П.

**«PET NIHIL»** – гродзенская група.

Спалучае ў творчасці панк-рок, хард-кор, элементы хард-энд-хэві, выконваючы песні на расейскай і беларускай мовах. Утварылася ў пачатку 2000, дэбютавала з канцэртамі ў Гродне ў сакавіку–траўні 2001. Нязменна выступае складам: Юрый «Karosas» Лакціёнаў – гітара, вакал, Дзмітрый «Burik» Бур'ян – бас-гітара, Аляксей «Chelrock» Лепяшко – бара-

баны, Юрый «Kasper» Ламашэвіч – перкусія, Дзмітрый «DonZi» Ткач – кібер-гук. На працягу 2001 група ўдзельнічала ў фэсце «Молодежь против рассовых предрассудков» у Мінску, рок-фестывалі ў Маладзечне. У лютым 2002 выступіла ў віленскім клубе «Green Club», удзельнічала ў Мінскім экалагічным фестывалі «Зелёный шабаш». У 2004, у сувязі з запісам новага альбому, група скарэктавала свае стылёвыя арыентацыі на альтэрнатыўны смеш хард-кор. Паводле некаторых звестак, група спыніла існаванне ў жніўні 2005.
**Гастролі:** тур па Літве (вясна 2003).
**Фестывалі:** «Podpunkt» (Седльцы, Польшча, 2003), «Вест-Балт-Фест» (Калінінград, 2003).
**Дыскаграфія: альбомы** «Tanatos» («Sound & Light Studio», Гродна, 2001), «Saint Lie» («Crystal Studio», Гродна, 2004); **трэкі** «Менталитет» (у зборніку «Punks vs. Hardcore» – «B.U.T.T. Records», Віцебск, 2002), «Менталитет» (у зборніку «Ervas Daninhas Fanzine» – «Punk'n'Gil Records», Партугалія, 2002), «Прэч!» (у зборніку «Music Against Racism» – «RU Rec»/«U Michelsona», Расея, 2002), «Клиническая смерть» (у зборніку «Anti-Rock Collection» – «Anti-Rock Records», 2002), «Revolt» (у зборніку «Антифа, vol.1» – «Rock Against The Rich Rec.», Расея, 2003), «The Warriors Lives Again» (у зборніку «Let's Start The Action (An Electronic Tribute To D.O.A.» – «Sudden Death Records»/ «Invation Wreck Chords», 2003).
**Кантакт:** www.petnihil.grodno.by
15.07.06//Д.П.

**«P.L.A.N.»**– мінская група, выступае ў стылі рок-н-ролу і блюз-року. Утварылася ў 1998 пад назвай «Прощай, молодость». Ад 2001 выступае пад цяперашняй назвай. У першым складзе групы значыліся наступныя музыкі: *Андрэй Плясанаў* – гітара, вакал, гармоніка, Аляксей Мароз – гітара, Ігар Галіцын – бас-гітара, Андрэй Сапоненка – барабаны. У розны час у складзе групы выступалі *Георгій Станкевіч* – гітара (2001–03), *Андрэй Дзяменцьеў* – гітара (1998–2002, 2004 да цяперашняга часу). На пачатку 2006 калектыў складаўся з А. Плясанава, А. Дзяменцьева, А. Сапоненкі, Анатоля Стэцэнкі – бас-гітара, баян (← 2002). Рэпертуар групы пераважна заснаваны на беларускамоўных песнях (перадусім аўтарства А. Плясанава), найбольш вядомыя з якіх «Шукальнікі сэнсу», «Шынкарачка», «Рок-н-рол шанц», «Вялікае калі ласка», «Купальскі рок-н-рол».
**Фестывалі:** «Рок против СПИДа» (2000, Мінск), «Рок-каранацыя» (2001), «Блюз жыве ў Мінску» (2002), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2003).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Блюз у канцы тунэля» (аўт. выд., 2003), «Вам слова, Джон-Ячмень» (аўт. выд., 2003), «Вялікае калі ласка» («БМAgroup», 2004), «Зьніч надзеі» (2006); **трэкі** «Шынкарачка» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМА group», 2004), «Краскі шчасьця» (у зборніку «Дні лятуць. Песьні з-за кратаў» – «БМА group», 2005).
**Кіно, відэа: кліп** «Шлях да каханай» (2006).
**Кантакт:** www.p-l-a-n.com; aplesanov@mail.ru, +375 (17) 206-59-43.
07.12.06//Д.П.

**«POLATSK ANIMA QUARTET»** – вакальная група з Полацку. Утварылася ў траўні 1995 з ліку выпускнікоў БДК, якія да стварэння квартэту 6 гадоў выступалі са складам Полацкага камернага хору. У складзе квартэту – Святлана Трушына, Святлана Заборская, Аляксандр Старасценкаў, Віталь Эрпарт, а таксама канцэртмайстар Марына Старасценкава. Рэпертуар калектыву складаецца са спірычуэлаў, твораў класічнага джазу, папулярных эстрадных тэм, якія выконваюцца пераважна а капэла, а таксама апрацовак у джазавым стылі беларускіх фальклорных мелодый.
**Фестывалі:** «Eurotreff» (Нямеччына, 1995), «Bodensee» (Нямеччына, 1996), «Birstonas» (Літва, 1998), «Славянский базар» (Віцебск, 1997), джазфестывалі ў Мінску (1997, 1998).
07.12.06//Д.П.

**«POSTHUMOUS BLASPHEMER»** – мінскі калектыў, які трымаецца стылю брутал тэхна дэз-метал. Утварыўся ў 2001 з ініцыятывы Аляксандра «Fiendharon» Гайдукевіча – гітара, бас-гітара, вакал. Рэпертуар заснаваны на аўтарскіх ангельскамоўных песнях. У пачатку 2006 група складалася з А. Гайдукевіча, Аляксандра «Alexzonder» Гарона – бас-гітара і Дзмітрыя «Biven» Зубава – вакал.
**Гастролі:** канцэрты ў клубах Масквы (2005, 2006).
**Фестывалі:** «Massa Brutto Fest-5» (Мінск, 2004), «Petrogrind Fest-1» (Санкт-Пецярбург, 2004), «Metal Dazhynki» (Мінск, 2005), «No Presents for Christmas-5» (Мінск,2005), «Murder Art» (Масква, 2006).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Avantground Undergrind» («DAC prods», 2003, Расея), «Putrespermfaction Versus Fertiholyzation» («Relics rec.»/«Monsters corp.», 2004, Расея), «Crucified Humiliation» («Relics rec.»/«Sound Age prods.», 2005, Расея), split CD «Katalepsy»/«Barbarity»/«Smersh»/«Posthumous Blasphemer» («More Hate prods.», 2004, Расея), split CD «Posthumous Blasphemer»/«Mutanl Factor»/«Anal Nosorog»/«Prichudlivyi Zarodysh» («More Hate prods.», 2005).
**Кіно, відэа: кліпы** «Obedience Necessary» (рэж. А. Гайдукевіч, Глеб «Жалезны» Сівалобчык, 2004), «Accusation in Existence» (рэж. А. Гайдукевіч, Глеб «Жалезны» Сівалобчык, 2006).
**Кантакт:** www.pblasphemer.zoo.by; christfuck@tut.by;
+375 (29) 277-31-49 (Аляксандр); 220017, Мінск-17, а/с 54, Беларусь.
01.10.06//Д.П.

**«POSTSCRIPTUM»** – група з Мінску. Утварылася ў чэрвені 1995 як расейскамоўны акустычны калектыў дзеля выканання музыкі ў стылі фолк-року. Першы склад калектыву: Юлія Сеўрук – вакал, Кацярына Кузняцова – вакал, Аляксандр Шаламаеў, Максім Кобзеў. Ад 1997 група пераходзіць на выкананне ўласных песень і апрацовак народных твораў на беларускай, расейскай і ангельскай мовах. У 1996 у калектыве выступалі Ю. Сеўрук, К. Кузняцова, *Вадзім Марголін* – гітара, Віктар Галавачэнка – бас-гітара, Сяргей «Змей» Грынкевіч – барабаны, *Макс Івашын* – клавішныя (← 1998 *«Нейро дюбель»*), Мікалай «Боршч»

Драніцкі – перкусія (→ *«Blues Street»*). У 1997 у групу прыходзіць вакалістка Яна Савіцкая, у 1998 сыходзіць С. Грынкевіч (→ «Long Play»), прыходзяць Аляксей Волкаў – барабаны і Аляксандр Мілевіч – клавішныя. У 2000 сыходзяць Я. Савіцкая і К. Кузняцова. На пэўны час група спыніла актыўную дзейнасць. Аднавілася ў 2005, калі ў калектыве выступалі Юлія Белізяк (Сеўрук) – вакал, Віктар Галавачэнка – бас-гітара, Аляксандр Івашкевіч – гітара, Мікалай Белановіч – барабаны. Найбольш вядомыя песні «Кароль залатой травы», «Сонейка», «Званы», «Вандроўка».

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1999, 2000).

**Узнагароды:** Гран-пры фестывалю «Басовішча 2000».

**Дыскаграфія: альбомы** MC «Дом на синих холмах» («Ковчег», 1997), CD «Вандроўка» («БМAgroup», 2005).

**Кіно, відэа: кліп** «Март» (рэж. В. Смірнова, 2002).

**Кантакт:** www.ps-band.narod.ru; Vicg2@tut.by

03.04.06//Д.П.

**«PULSAR»** – група з Брэсту, якая працуе ў стылі паўэр-метал. Утварылася ў снежні 2002. Першапачаткова выступала наступным складам: Юрый Колычаў – гітара (экс- *«Удар»*, *«Cobra»*, *«Wolfshade»*), Андрэй Бантыш – клавішныя, Сяргей



Філіпаў – вакал (экс- «Вітраж», «Hard'n'light»), Вадзім Шубіч – бас-гітара (экс- «Wolfshade»). Пастаяннага барабаншчыка ў калектыве не было. У 2003–04 падчас сесій запісаў да групы далучаўся Павел Карпаў. У 2003 С. Філіпава змяніў Аляксандр Пакроўскі, але ў канцы гэтага ж году адбылася замена наадварот. На пачатку 2003 на месца бас-гітарыста прыйшоў Станіслаў Сюзеў (← «Республика ШКИД»). Дагэтуль група выступае тым самым складам з рознымі барабаншчыкамі, выконваючы аўтарскія песні на ангельскай і расейскай мовах.

**Дыскаграфія: альбомы** міні CD «Солнце бессмертных» (2003), CD «Civilization» («Flaming Arts», Брэст, 2004, перавыд. «Союз», Расея, 2004); **трэкі** «Пегас» (інстр.), «Орден креста» (у зборніку «DeMONSTRation of Power» – «M.Power Records», 2003, Расея).

**Кантакт:** a_bantysh@mail.ru; +375 (162) 28-94-20; (29) 720-32-03 (Андрэй).

20.06.04//Г.Ш., фота І. Грыговіч.

# Р

**«РАДА»** – рок-група. Сабралася летам 1987 пры Гродзенскай абласной філармоніі з ліку музыкаў моладзевай студыі ансамбля *«Песняры»*.
Першы склад: *Ігар Сацэвіч* – лідэр, бас-гітара, *Аляксандр Сапега* – барабаны, Міхаіл Філіпеня – клавішныя, Віктар Корык – гітара, Аляксандр Маскальчук – вакал. Вясной 1988 мастацкая рада прыняла першую праграму калектыву ў стылі папулярнага року з ліку песень, напісаных на вершы М. Багдановіча. Летам 1988 групу пакінулі М. Філіпеня, В. Корык і А. Маскальчук, на іх месца прыйшлі *Аляксей Шадзько* – вакал і *Уладзімір Любінскі* – гітара, а таксама Вячаслаў Пазьняк – клавішныя. Вясной 1989 з групы сыходзяць А. Шадзько і У. Любінскі, прыходзяць Алег Дарошын – гітара і *Сяргей Зелянкевіч* – вакал, якога праз некалькі месяцаў змяняе *Дзмітрый Смольскі*. Вясной 1990 рэшткі калектыву перабіраюцца ў Мінск, некаторы час гастралююць (Далёкі Усход) пад назвай «Восточная Европа». У канцы 1990 група спыняе існаванне. Рэпертуар быў заснаваны пераважна на аўтарскіх расейскамоўных песнях, найбольш вядомыя з якіх «Острова» (муз. І. Сацэвіча, А. Сапегі, сл. В. Коўзуся) у выкананні Дз. Смольскага, «Мы», «Я там был».
**Гастролі:** Паволжа (1988), цягам месяца (снежань 1988 – студзень 1989) выступы ў канцэртнай зале «Россия» ў адной праграме з Л. Долінай, І. Тальковым.
**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Навапалацк» (1988).
**Узнагароды:** лаўрэат Усесаюзнага конкурсу эстраднай публіцыстыкі і палітычнай сатыры (Масква, 1988).
**Дыскаграфія:** праграма песень на вершы М. Багдановіча была запісана для фонду Беларускага радыё.
**Кіно, відэа: кліп** «Мы» («Взгляд», 1989).
**Кантакт:** appleigor@yahoo.com; +375 (29) 623-65-41 (І. Сацэвіч).
17.12.06//Д.П.

**РАДЗЮКОЎ АНАТОЛЬ (Радюков Анатолий, Radziukou Anatoliy)** – саксафаніст-флейтыст, аранжавальнік, педагог.
Нарадзіўся 12.12.1948 у Рубцоўску, Алтайскі край, Расея. У 1952 разам з сям'ёй пераехаў у Мінск. Падчас навучання ў сярэдняй школе наведваў школьны хор, якім кіраваў У. Роўда. У 1958 пачаў навучанне ў музычнай школе па класе баяна, неўзабаве перайшоў у клас флейты. У 1963 паступіў у ММВ па класе флейты, дзе захапіўся саксафонам. Неўзабаве стаў удзельнікам эстраднага аркестру Палацу прафсаюзаў п/к Л. Ляноўскага. Ад 1964 працаваў у складзе калектываў АМА Мінску. Скончыў ММВ у 1969. У другой палове 70-х – у складзе квартэту «Няміга» Ігара Дадзіёмава, з якім выступаў у Маскве, некаторы час

працаваў у складзе аркестру Мінскага цырку. Ад 1977 – удзельнік ансамбля «Тоніка». У 1981 увайшоў у склад групы «Планета» А. Архіпава, запісваў музыку да спектакляў, працаваў як студыйны калектыў, акампанаваў, між іншых, *Мікалаю Скорыкаву, Надзеі Мікуліч, Валерыю Кучынскаму,* Т. Арлоўскай, *Яраславу Еўдакімаву*. У 1981–87 выкладаў у ММВ па класе саксафона. Сярод вучняў *Андрэй Матлін,* П. Аракелян. Ад жніўня 1987 – музыка Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі, у 1991–97 – удзельнік малога складу аркестру «Пятый угол». У 1998 узначаліў групу «Анатолий Радюков и молодое поколение». Ад 1999 – музыка і аранжавальнік аркестру Беларускага дзяржаўнага цырку.

**Гастролі:** у складзе «Тонікі» – Мексіка, краіны Паўднёвай Амерыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі, ГДР; у складзе Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі – Расея, Італія, Польшча.

**Фестывалі:** у складзе «Тонікі» – конкурс краін сацыялістычнай садружнасці (Ялта, 1984); у складзе біг-бэнду ММВ – «Осенние ритмы» (Ленінград, 1984); у складзе Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі – Усесаюзны фестываль польскай песні (Віцебск, 1988); у складзе групы «Анатолий Радюков и молодое поколение» – фестываль у Мінску (1998), «Саксомания» (Мінск, 2003).

**Узнагароды:** у складзе «Тонікі» лаўрэат II прэміі Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (Ленінград, 1979).

**Кантакт:** anatol1948@tut.by

16.10.07//Д.П.

**РАЕЎСКАЯ ТАМАРА (Раевская Тамара, Raeuskaya Tamara)** – спявачка, выканаўца традыцыйнай папулярнай песні.

Нарадзілася 27.05.1940 у г. Асіповічы Магілёўскай вобл. Скончыла ММВ (1971). Ад 1963 працавала салісткай аркестру Дзяржтэлерадыё БССР. Аснову рэпертуару складалі песні беларускіх кампазітараў – *Уладзіміра Будніка*, Віктара Войціка, *Яўгена Глебава*, Уладзіміра Дарохіна, *Эдуарда Зарыцкага*, *Леаніда Захлеўнага*, *Ігара Лучанка*, *Юрыя Семянякі*, *Эдуарда Ханка*. На працягу многіх гадоў вяла радыёпраграму «Матчына песня».

**Фестывалі:** «Золотой шлягер» (Магілёў, 1998).

**Дыскаграфія: трэкі** «Дударыкі» (муз. І. Лучанка, сл. А. Грачанікава, у LP «Песні Ігара Лучанка» – «Мелодия», 1978) , «Баллада о девчонках» (Л. Мурашка – Ю. Друніна, у LP зборніка «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985), «Подари мне надежду» (у EP «Песни на стихи С. Красикова» – «Мелодия», 1983), «Зямляне» (муз. У. Будніка, у зборніку «Как слово наше отзовётся. Песни молодых композиторов» – «Мелодия», 1983).

Паводле Белэнцыклапедыі.

**РАЗАНАЎ ВАЛЕРЫЙ (Рязанов Валерий, Razanau Valery)** – спявак, гітарыст, кампазітар.

**Дыскаграфія:** гл. «Сябры» ад 1982; CD «Оглянись» (разам з «Сябрамі», 2001).

**Кіно, відэа: кліпы** «Встречи-расставания», «Разрешите».

03.03.07//Д.П.

**РАІНЧЫК ВАСІЛЬ (Раинчик Василий, Rainchik Vasiliy)** – піяніст, кампазітар, аранжавальнік, педагог. Нарадзіўся 07.03.1950 у в. Чарапы Шклоўскага р-ну Магілёўскай вобл. (1985), «Жыццё артыста» для электронных інструментаў, песні «Звезда любви», «Город юности», «Так не бывает», «Караван», «Музыка для всех», «Облака моей мечты».



У 1974 скончыў БДК па класе фартэпіяна В. Шацкага, у 1981 – па класе кампазіцыі *Яўгена Глебава*. Дэбютаваў на сцэне ў 1974, калі заняў пасаду піяніста і мастацкага кіраўніка ВІА *«Верасы»*. Ад 1997 музычны, ад 2000 – і мастацкі кіраўнік Тэатру моладзевай эстрады. З 1998 да 2003 – кіраўнік дзіцячага ансамбля «Верасяты», з 2000 – прафесар БДУКу. Аўтар музыкі для сімфанічнага аркестру, эстраднай, камерна-інструментальнай, электроннай музыкі, песень. Сярод найбольш вядомых твораў – араторыя «Хлапчыш-Кібальчыш» (на словы *Уладзіміра Някляева*, 1984), «Варыяцыі», Балеро для сінтэзатараў, камп'ютэраў і рытм-машыны, «Карнавал» (усе – 1984) для эстраднага аркестру, «Назад да зорак»

**Гастролі, фестывалі:** гл. «Верасы».
**Узнагароды:** лаўрэат прэміі ЛКСМБ (1980).
**Дыскаграфія:** гл. «Верасы»; **трэкі** «Музыка для всех» (сл. У. Някляева, «Верасы», у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Пусть греет мир в цветах» (сл. *Уладзіміра Арлова*, *Уладзіміра Угольніка*), «Немое кино» (сл. У. Арлова, абедзве ў EP «Верасы» – «Мелодия», 1978), «Наша дискотека» і «Снежный человек» (сл. М. Таніча), «Чур-чура» (сл. У. Някляева) – усе ў LP «Наша дискотека» – «Мелодия», 1980).
**Кіно, відэа: кліп** «Импровизация в стиле буги-вуги» (рэж. *Анатоль Вечар*).
**Кантакт:** teatr_estrady@telegraf.by

Паводле Белэнцыклапедыі//Д.П.

**РАЙСКІ БАРЫС (Райский Борис, Rajski Boris)** – дырыжор.
Нарадзіўся 21.08.(03.09).1915 у Іркуцку, СССР, памёр 17.02.1993. У 1932 скончыў Харбінскую вышэйшую музвучэльню па класе віяланчэлі. У 1947 пераехаў у СССР, працаваў у Кемераве, Рызе, Іванаве, Львове. Ад 1957 – галоўны дырыжор аркестру Мінскага цырку, ад 1961 – галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік канцэртна-эстраднага (пазней – эстрадна-сімфанічнага, сімфанічнага) аркестру Беларускага тэлебачання і радыё. Калектыў пад ягоным кіраўніцтвам ажыццявіў мноства запісаў музыкі розных жанраў для фонду радыё і фірмы грамзапісу «Мелодия», у тым ліку трох дыскаў з песнямі беларускіх кампазітараў. Выступаў таксама й як аўтар аранжаванняў твораў папулярнай інструментальнай музыкі.
Паводле Белэнцыклапедыі.

**РАСТОПЧЫН АЛЯКСАНДР (Растопчин Александр, Rastopchin Alexander)** – гітарыст, кампазітар, аранжавальнік, інжынер.
Нарадзіўся 09.01.1957 у Алма-Аце, Казахстан. У 1979 скончыў МРТІ па спецыяльнасці дызайн і тэхналогія радыёэлектроннай апаратуры. У гэтым жа годзе ўвайшоў у склад мінскай групы *«Университет»*, адначасова працуючы інжынерам-дызайнерам у МВАВТ імя Арджанікідзэ. Ад 1982 да 1984 выступаў у складзе рок-групы *«Сузор'е»*, у 1984–85 – у ансамблі *«Тоніка»*. У 1985 быў запрошаны ў склад ансамбля *«Песняры»*, у якім працаваў да ад'езду ў ЗША ў 1993. Жыве ў Нью-Йорку, дзе дае прыватныя ўрокі як гітарыст,




выступае ў блюзавых клубах, вырабляе разнастайныя прыстасаванні для апрацоўкі гуку і музычную апаратуру. Запісваўся і выступаў з такімі калектывамі і выканаўцамі, як «Average White Band», Фрэнкі Пэрыс, «Mark The Harper», «Moose and The Bulletproof Blues Band», Дзюран Дэніэл, «Flaming» Эмі Коўлмэн, Роксі Пэры, Джойс Пяры, Дэвід Грос, Джон Макалуза, Глен Бранка, Лора Берман, Порцыя Гёрл, Роберт Чарлз.
**Гастролі:** у складзе ансамбляў «Песняры» і «Тоніка» – ЗША (1991), Нямеччына, В'етнам, Лаос, Італія, Індыя, Бірма, краіны Афрыкі, Манголія, Афганістан; у складзе «Сузор'я» – СССР.
**Дыскаграфія: альбомы** «1989–93 Collection» (дэма, 1995), CD «Covers Collection» (сумесна з Дзюранам Дэніэлам, 1995), «Pieces Of Broken Heart» (1996), «AR2003 – Immigrant Album» (2003, сумесна з вакалістам Мус Э. Дж. Боўлзам), «Alexander

Rastopchin» («Rastopdesigns Records», 2003), «Wind of Change» («Rastopdesigns Records», 2006).
**Кіно, відэа:** саўндтрэк да кароткаметражнага фільму «Blasted» (сумесна з *Валерыем Дайнэкам*, 1989–93).
**Кантакт:** www.rastopdesigns.com; rastop-chin@netzero.net; +1 (718) 932-32-48.

02.05.06//Д.П., фота А. Прупаса.

**РАШЭТНІКАЎ ЮРЫЙ (Решетников Юрий, Reshetnikov Yuri)** – журналіст, прадзюсэр.

Нарадзіўся 08.05.1951 у Мар'інай Горцы Мінскай вобл. Скончыў МРТІ ў 1974. У 1978–79 працаваў ды-джэем дыскатэкі камсамольска-маладзевай кавярні «Сузор'е». У 1979–80 – няштатны аўтар музычнай рубрыкі газеты «Знамя юности», ад 1980 да 1990 – няштатны аўтар Беларускага радыё (праграма «Моладзі пра музычнае мастацтва»). У 1990–95 – рэдактар, старшы рэдактар, на-



меснік галоўнага рэдактара музычнай рэдакцыі Беларускага радыё, аўтар і вядучы праграмы «Беларускі хіт-парад». У 1998–2003 – рэдактар, спецыяльны карэспандэнт Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, аўтар і вядучы цыклу перадач аб вядучых беларускіх гітарыстах *Уладзіміры Угольніку*, *Сяргеі Анцішыне*, *Уладзіміры Любінскім*, *Сяргеі Труханговічы*. Аўтар тэлефільму пра групу *«Тройца»*, аўтар і вядучы музычных радыёпраграм «Зебра», «Альтэрнатыва», «Перпендикуляр». Ад сакавіка да чэрвеня 1993 – кіраўнік групы ды-джэяў радыё «Би-Эй», аўтар і вядучы музычных праграм. У 1999–2006 – прадзюсэр фестывалю гітарыстаў «Грифомания», прадзюсэр фестывалю «Саксомания» (Мінск, 2003). Як журналіст выступаў з публікацыямі ў газетах «Знамя юности», «Комсомольская правда», «Вечерний Минск», «Труд», часопісе «Рабочая смена», расейскім часопісе «IN OUT».
**Узнагароды:** «Рок-карона 1994» у намінацыі «Музычны журналіст году».
**Іншая інфармацыя:** калекцыянаванне вінілавых грампласцінак (рок, блюз 60–70-х гадоў).
**Кантакт:** vinyljoe@tut.by; +375 (29) 563-30-60.

18.03.06//Д.П., фота Д.П.

**РОЗНЭР «ЭДЗІ» АДОЛЬФ (Рознер «Эдди» Адольф, Rosner «Eddy» Adolf)** – трубач, скрыпач, кампазітар, аранжавальнік, бэнд-лідэр.

Нарадзіўся 13.05.1910 у Берліне, памёр там жа 08.08.1976. У 1925–27 вучыўся ў Берлінскай кансерваторыі



па класе скрыпкі, у 1928–29 вывучаў кампазіцыю і дырыжаванне ў Вышэйшай музычнай школе Берліну. Самастойна авалодаў трубой і ў 1929–38 з перапынкамі выступаў у складзе вядомага ў Еўропе аркестру «Weintraub Sincopators» (гастролі ў СССР 1935). У 1938 арганізаваў у Лодзі першы ўласны аркестр, неўзабаве пераехаў у Варшаву і ў верасні 1939 уцёк праз Львоў у Беласток, які адышоў да СССР. Затым быў запрошаны *Юрыем Бяльзацкім* у склад Дзяржаўнага джаз-аркестру БССР, які да пачатку Вялікай Айчыннай вайны актыўна гастраляваў па СССР. Падчас вайны аркестр выступаў на франтах і ў тыле. У рэпертуары – як джазавыя кампазіцыі («Караван», «Казкі Венскага лесу»), так і песні савецкіх кампазітараў. У 1946 аркестр быў распушчаны, з падробнымі дакументамі музыка ўвосень спрабаваў выехаць у Польшчу, аднак быў арыштаваны і засуджаны па артыкуле «Здрада Радзіме». У 1946– 53 адбываў тэрмін у лагерах у Магадане, дзе з просьбы начальства арганізаваў з ліку засуджаных джаз-аркестр. Пасля рэабілітацыі ў 1953 узначаліў у Маскве біг-бэнд, у складзе якога ў розныя гады выступалі піяніст і аранжавальнік Ю. Саульскі, аранжавальнік В. Далгоў, саксафаніст Г. Гальштэйн, трубач К. Носаў, мультыінструменталіст Д. Галашчокін, спявачкі Г. Чахелі, М. Крысталінская, квартэт «Аккорд». Пайшоў з аркестру ў 1969 і зрабіў спробу сабраць новы біг-бэнд у Гомелі, аднак у 1973 выехаў у Заходнюю Нямеччыну, дзе й памёр. Найбольш вядомыя песні «Парень-паренёк» («Ціха вода»), «Зачем», «1001 такт в ритме», «Мерилю», «Прощай, любовь».

**Гастролі:** у складзе «Weintraub Sincopators» – краіны Еўропы, СССР (1935).

**Фестывалі:** Маскоўскі джаз-фестываль 1967.

**Дыскаграфія:** «Караван» і «Прощай, любовь» (у альбомах «Джаз-оркестр Белорусской ССР п/у Эдди Рознера, 2LP – «Мелодия», 1988); **трэк** «Снежный человек» (сл. М. Пляцкоўскага, у вык. В. Кругловай).

**Кіно, відэа:** фільм «Карнавальная ночь» (рэж. Э. Разанаў, 1958).

Д.П. – на падставе энцыклапедычнага даведніка «Джаз XX век», «СКИФИЯ», СПб, 2001.

**«РЕФЛЕКС»** – мінская група. Утварылася ў 1989 і трымалася накірунку пап-року.

У групе выступалі *Сяргей Брыкса* – вакал, *Аляксандр Ванкевіч* – бас-гітара, Сяргей Герута – клавішныя, Мікалай Логінаў – гітара, Леанід Юркевіч – барабаны. Рэпертуар групы засноўваўся на аўтарскіх расейскамоўных песнях. Група спыніла існаванне ў 1991, калі С. Брыкса распачаў сольную кар'еру. Найбольш вядомая песня «Анастасия».

**Кіно, відэа: кліп** «Анастасия» (1991).

05.08.07//Д.П.

**РУСАК АДАМ (Русак Адам, Rusak Adam)** – музыка, паэт.

Нарадзіўся 11(24).05.1904 у в. Пясочнае Ігуменскага павету Мінскай губ, цяпер – Капыльскі р-н Мінскай вобл., памёр 21.03.1987, пахаваны ў в. Пясочнае. Ад ранніх гадоў навучыўся граць на скрыпцы. У 1925–30 вучыўся ў Мінскім музычным тэхнікуме, з 1928 – музыка аркестру Беларускага радыё. У 1930 скончыў Беларускі музычны тэхнікум па класах валторны і скрыпкі М. Буяноўскага, у 1930–34 вучыўся ў Ленінградскай кансерваторыі па класах скрыпкі і валторны. Працаваў салістам аркестру Ленінградскага Малога опернага тэатру (1932–49), ад 1949 – саліст аркестру Белдзяржфілармоніі, у 1959 выйшаў на пенсію. Пісаць вершы пачаў у сярэдзіне 20-х, друкавацца – ад 1927. Сярод паэтычных зборнікаў – «Песні на словы А. Русака» (1980), на ягоныя вершы напісана каля 300 песень, у тым ліку «Бывайце здаровы!» (муз. У. Захарава і *Ісака Любана*), «Толькі з табою», «Не шукай» (муз. І. Любана), «Лясная песня» (муз. *Уладзіміра Алоўнікава*), «Не за вочы чорныя» (муз. *Юрыя Семянякі*), «Дзе ты, зорка мая» (муз. *Ігара Лучанка*).

**Дыскаграфія: трэкі** «Бывайце здаровы» (у зборніку «Я нарадзіўся тут» – выд. Алеся Сушы, 2000), «Не за очи чёрные» (муз. Ю. Семянякі, у LP «Чараўніцы» – «Мелодия», 1978), «Лясная песьня» (вык. *«N.R.M.»*, у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004).

**Узнагароды:** кавалер ордэнаў Дружбы народаў, Знак пашаны.

**Кнігі:** зборнікі паэзіі «Песні і вершы» (Мінск, 1951), «Песні» (на расейскай мове, Мінск, 1954), «Пад голас баяну» (Мінск, 1957), зборнік «Песні на словы А.Русака» (Мінск, 1975, перавыд. 1980) і інш.

Паводле Белэнцыклапедыі і даведніка «Беларускія пісьменнікі»//Д.П.

**«РЭНЕСАНС»** – ансамбль традыцыйнага джазу з Мінску.

Першая рэпетыцыя калектыву адбылася 21.01.1977, дэбютаваў ансамбль на сцэне 01.04.1977 падчас адкрыцця Мінскага клубу аматараў джаза. Пачаткова выступаў пад назвай «Маэстро диксиленд» і выконваў творы класічнай дыксілендавай літаратуры. Пад назвай «Рэнесанс» ансамбль выступае ад кастрычніка 1980. Першы склад калектыву: Генадзь Крэмер – лідэр, кларнет, Генадзь Якутовіч – тэнар-сакс, Генадзь Невідзюк – трамбон, Марк Гарэлік – карнэт, Уладзімір Снітко – вакал, Сямён Гарэлік – фартэпіяна, Ігар Чайкоў – банджа, Юрый Корчык – кантрабас, *Мікалай Лапцёнак* – барабаны. У сярэдзіне 90-х ансамбль крыху змяніў стылёвыя



арыентацыі, пачаўшы спалучаць творы позняга дыксіленду і ранняга свінгу пераважна ў аўтарскіх аранжаваннях удзельнікаў калектыву. У розны час у яго складзе выступалі *Сяргей Анцішын* – банджа, гітара, Міхаіл Бунін, Аляксей Леановіч – труба, Аляксандр Цюцюноў, *Андрэй Лабчэўскі*, Дзмітрый Хаменка – фартэпіяна, Ігар Швядко – кларнет, Антон Боеў – тэнар-сакс, Святлана Круглова – вакал. У канцэртах спецыяльна запрошанымі выступалі *Віталь Ямуцееў* – тэнар-сакс, *Валерый Шчэрыца* – труба, Валерый Зуйкоў – кларнет, тэнар-сакс, Санкт-Пецярбург. У 2003 калектыў увайшоў у склад *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі* на правах самастойнай творчай адзінкі. На пачатку 2004 ансамбль выступаў наступным складам: М. Лапцёнак – лідэр, Алег Крылоў – кларнет, Андрэй Барыла – тэнар-сакс, Мікалай Фядоранка – труба, Уладзімір Гарчанін – трамбон, Ігар Піліпенка – банджа, гітара, Віктар Пыньцікаў – кантрабас.

**Гастролі:** Расея (Куйбышаў, 1980; Калінінград, 1993; Масква, Яраслаўль, 1998), Грузія (Горы, 1988), Душанбэ (1989), Польшча (Люблін, Пулавы, 1992), Нямеччына (Бон, Кёльн, 1995), Беларусь.

**Фестывалі:** «Куйбышев 1980», Мінск (1981, 1984, 1986, 1993, 1997–99, 2001, 2003, 2004), «Витебская осень» і Міжнародны парад дыксілендаў у Віцебску (1980, 1981, 1983, 1985, 1986, 1989, 1991–93), «Славянский базар» (Віцебск, 1998–2000), «Джаз-янтарь» (Калінінград, 1993), «Old Jazz Meeting. Złota tarka» (Ілава, Польшча, 1998), «Золотой шлягер» (Магілёў, 1999), Міжнародны фестываль біг-бэндаў і дыксілендаў (Вільня, Літва, 2002), «Мюльхайм» (Нямеччына, 2002).

**Узнагароды:** Гран-пры конкурсу «Old Jazz Meeting. Złota tarka» (Ілава, Польшча, 1998).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Рэнесанс» («Ковчег», 1994), CD «Swing Station» («West Records», 2001).

**Кантакт:** renaissance@yandex.ru; +375 (29) 639-67-28, (17) 293-67-28; 220071, Беларусь, Мінск, вул. Берасцянская, д.15, кв.35 (М. Лапцёнак).
21.11.06//Д.П.

**«RASTA»** – гомельская група. Пачынала працаваць у стылі ньюэйдж метал, цяпер выступае ў стылі нэкст эйдж метал.
Утварылася на пачатку 2000, выступаючы складам: Дзмітрый Графаў – вакал, Павел Паўліхін – гітара, Ігар Кавалёў – бас-гітара, Уладзіслаў Сальцэвіч – барабаны (← *«Gods Tower»*). Восенню 2006 калектыў складаўся з наступных музыкаў: Яўген Цясёлкін – вакал (← пачатак 2002), Радзівон Старавойтаў – барабаны (← *«Exhumator»*, верасень 2001), Юрый Сіўцоў – бас-гітара (← *«Gods Tower»*, красавік 2001), П. Паўліхін – гітара, Дзмітрый Аўчыннікаў – клавішныя (← *«Gods Tower»*, 2003).
**Гастролі:** Беларусь (2000, 2002), Масква (2002), Кіеў (2002), Беларусь–Украіна (травень 2004), Расея (восень 2004), Украіна (вясна 2005), Малдова, Польшча, Нямеччына



(2001), тур па Польшчы (2006).
**Фестывалі:** «Арт-сессия» (Гомель, 2000), «Рок-каранацыя 2002», «Metal Heads Mission» (Еўпаторыя, 2003, 2004), «Brutal Assault Fest» (Чэхія, 2006), «Hunter Fest» (Нямеччына, 2006), «Przystanek Woodstock» (Польшча, 2006), «Red Allert Open Air» (Еўпаторыя, 2006, 2007), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007).
**Узнагароды:** «Рок-карона 2006» – галоўная ўзнагарода і ў намінацыі «Цяжкая музыка» (альбом «The Age of Movement»), перамога на цырымоніі «Мистерия звука 2006» у намінацыі «Хард-рок/метал-альбом году».
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Take My Hate» («Moon rec.», Украіна, 2002), «The Age Of Movement» («GO-Records», Беларусь, 2006; «Comp Music», Украіна, 2006, «Mazzar/Mystic Empire», Расея, 2007), сінгл «Between Two Times» («GO-Records», 2005 у Беларусі, «Moon rec.», 2005 ва Украіне, «Мистерия звука», 2005 у Расеі), **трэкі** выдадзены больш чым у 50 зборніках, у т.л. «Origin Of Me» (у зборніку «Metal For The Masses 2» – «EMI Music», 2007).
**Іншая інфармацыя:** інтарэсы калектыву ў свеце прадстаўляе агенцтва «The Flaming Arts Management».
**Кантакт:** www.rasta.by; rasta@tut.by; +375 (29) 672-03-52 (П. Паўліхін).
21.07.07//Д.П., фота Д.П.

**«THE RAVENS»** – мінская рок-група. У складзе калектыву выступалі Сяргей Ісакаў – гітара, Яўген Пліско – барабаны, Юрый Лука – гітара, Дзмітрый Фрыга – клавішныя, Аляксандр Агафонаў – бас-гітара, Алена Ісакава – вакал. Рэпертуар групы

засноўваўся на аўтарскіх творах, якія выконваліся на ангельскай і расейскай мовах.
**Фестывалі:** «Губерталіі» (Гродна, 1997).
**Дыскаграфія: альбомы** MC «Mirror» («Ковчег»), «Reflection» («Ковчег», 1999).
**Кіно, відэа: кліп** «Не уходи» (рэж. *Анатоль Вечар*).
03.03.07//Д.П.

**«REVELATION»** – група, якая ўтварылася ў 1999 і трымаецца стылю атмасферык дум метал.

Калектыў з'яўляецца выключна студыйным праектам, ад самага пачатку выступаючы як дуэт Аляксей Скурат – Сяргей Зібораў.
**Дыскаграфія: альбомы** MC «Forgotten Imperia» («Eldritch music», 1999), MC «Expulsion From The Paradise» («Metal Records», 2000), CD «The Forms Of Suffering Flesh» («Art Music Group», 2004).
**Кантакт:** scurat@rambler.ru; +375 (29) 563-88-91 (Аляксей).
11.04.05//А.І.

**«RICOCHET»** – гомельская група. Працуе ў стылі цяжкай металічнай музыкі.

Узнікла ў 2001. На пачатку 2006 група выступала наступным складам: Максім – вакал, Дзмітрый «Бегемот» – гітара, Дзяніс – гітара (← 2005), Дзмітрый «Гаўрош» – бас-гітара, Дзмітрый «Карл» – барабаны.
**Гастролі:** Літва, Пецярбург, Масква, Кіеў, Еўпаторыя.
**Дыскаграфія: альбом** CD «Ricochet» («Go-Records», 2005).
**Кіно, відэа: кліп** «Городской вал» (2005).
12.10.05//Д.П.

**«ROUBLE ZONE»** – група, якая ўтварылася з ініцыятывы барысаўскага музыкі *Алега «Джагера» Мінакова* ў 1995.

Выконвала музыку ў стылі хард-эндхэві. У першым складзе калектыву выступалі А. Мінакоў – вакал, музыка, Аляксандр «Газіз» Газізаў – гітара (→ *«Сябры»*, *«Крама»*, група У. Ухцінскага), Анатоль Горбач – барабаны (← «Крама»), Аляксандр Пурус – бас-гітара (→ «Крама», *«Mojo Blues»*, *«НЕО»*), Аляксандр Віслаўскі – клавішныя (→ *«Песняры» п/к І. Свечкіна*). Рэпертуар калектыву быў заснаваны на аўтарскіх ангельскамоўных песнях, большасць тэкстаў якіх напісаў *Аляксей Казлоўскі*. Група спыніла існаванне ў 1997 пасля ад'езду А. Мінакова за мяжу.
У 2000 з ініцыятывы А. Газізава была зроблена спроба аднавіць калектыў, аднак пасля выступлення на «Рок-каранацыі» ў 2000 група распалася паўторна. Сярод найбольш вядомых песень «Go Never Give Up», «Wild Woman», «Day Without Your Love», «Put Your Money».
**Фестывалі:** «Рок-каранацыя 1995».
**Узнагароды:** «Рок-кароны 1995» у намінацыях «Група году» і «Альбом году» («Put Your Money… Now!»). Там жа А. Мінакоў быў адзначаны спецыяльным прызам «Лепшы шоўмэн году».
**Дыскаграфія: альбом** CD «Put Your Money… Now!» («Dar Veter Records», 1996).
**Кантакт:** oleg.minakov@telenet.be
07.11.06//Д.П.

# С

**«САВАННА»** – дуэт з Мінску. Утварыўся ў 1998. Першапачаткова выступаў пад назвай *«LIN's»* складам Алена Якавенка – вакал, гітара і Наталля Кутынка-Шэнцюрк – вакал. Пачыналі як артысткі Тэатру моладзевай эстрады. Вядомымі сталі сумеснымі выступленнямі напрыканцы 90-х з групай *«Mojo Blues»* у якасці бэк-вакалістак. Праз некалькі гадоў выбралі самастойную кар'еру, вынікам чаго з'явілася выданне расейскамоўнага альбому з творамі, вытрыманымі ў стылі пап-року. Музыку і тэксты песень удзельніцы ствараюць самі. Дуэт выступае са спецыяльна запрошанымі музыкамі. Найбольш вядомыя песні «Волна», «Не стучитесь».





**Дыскаграфія: альбомы** CD сумесна з «Mojo Blues» – «I Gotta Move» («Ковчег», 1999), сольна «Волна» (аўт. выд., 2003), «Туда» (аўт. выд., 2008).

**Кіно, відэа: кліп** «Не исчезай» (2003).

**Кантакт:** www.savanna.belinter.net; savanna@belinter.net; + 375 (29) 327-87-83.

18.03.08//Д.П., фота Д.П.

**САВАШ ЮРЫЙ (Савош Юрий, Savash Yuri)** – прадзюсэр, музыка, аранжавальнік, аўтар музыкі і тэкстаў. Нарадзіўся 23.03.1960 у Мінску. Ад 1977 да 1991 працаваў ды-джэем і меў уласную сетку відэа-бараў і дыскатэк. У 1978 скончыў ССМШ пры БДК па класе кларнета, у 1981 – факультэт грамадскіх прафесій МРТІ па спецыяльнасці дырыжор аркестру, у 1983 – Маскоўскі электратэхнічны інстытут сувязі. Ад 1984 – саліст (саксафон) аркестру штабу ЧБВА, ад 1991 – дырэктар ансамбля *«Верасы»* і вакальнай групы

*«Camerata»*, адначасова – прадзюсэр-дырэктар арт-клубу «Няміга». У 1994 быў запрошаны прадзюсэрам «Майстроўні беларускай песні» міжнароднай асацыяцыі «Красота и здоровье». Ад 1997 да 1999 – галоўны адміністратар *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Ад 1999 – прадзюсэр РУП «Белканцэрт» і асабісты прадзюсэр *Ірыны Дарафеевай*, прадзюсаваў альбомы «Рэдкі госць», «Рано или поздно», «Пульс маіх хвілін», «Каханачка». Сярод найбольш вядомых твораў песні «Тайна грэшнага спаткання», «Слышу имя» (аўтар музыкі і тэкстаў), аўтар тэкстаў песень «Пульс маіх хвілін» (муз. *Мікалая Няронскага*), «Моя любовь» (муз. *Леаніда Шырына*), «Мой Робинзон» (муз. Г. Літвака), «Так бывает» (муз. *Дзмітрыя Далгалёва*).

**Дыскаграфія: трэкі** «Тайна грэшнага спаткання» (МС «Рэдкі госць» І. Дарафеевай – «Ковчег», 1999, CD «Каханачка» – «West records», 2004), «Музыка ночи» (CD «Рано или поздно» І. Дарафеевай – «Dorisrecords», 2000).

**Кантакт:** yuri@irinadorofeeva.com

23.02.06//Д.П.

**«САДЪ»** – група з Брэсту. Утварылася ў 1990, дэбютаваўшы складам: Уладзімір Серафімаў – музыка, тэксты, гітара, вакал, флейта, Анатоль Харытонаў – бас-гітара, клавішныя, аранжаванне, гукарэжысура, Віталь Кунц – барабаны. Музыка групы ўяўляе з сябе спалучэнне элементаў панку, арт-року, джазу, савецкай эстрады. Самі музыкі вызначаюць стыль як «этнепанк» (ад «это-не-панк»). У 1997 да групы далучыўся Аляксей Казлоў – акардэон, трамбон (→ 1999), у 1998 прыйшла флейтыстка Марына Карпук (Кунц), ад 1999 у групе выступае Аляксандр Катовіч – акардэон.

**Гастролі:** Санкт-Пецярбург, клуб «Лесопилка» (1997), Кіеў (красавік 1999), Кіеў, Днепрапятроўск, Ужгарад (кастрычнік 1999), клубы Масквы (травень 2003), канцэрты ў Расеі (Масква, Санкт-Пецярбург, Яраслаўль, Пскоў, Архангельск, 2005).

**Фестывалі:** фестываль незалежнай і альтэрнатыўнай музыкі «Будь спок» (Магілёў, 1992), усерасейскі фестываль незалежнай музыкі «RockLine» (Кунгур, Пермская вобл., 1998).

**Узнагароды:** Гран-пры Усерасейскага фестывалю незалежнай музыкі «RockLine» (Кунгур, Пермская вобл.).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Мы пред врагом не спустили» («Vigma», 1997), «Перекурчик в деревенском кабаре» («Art Classic Company», 2001, перавыд. «Nikitin Records», Расея, 2006), поўны збор альбомаў МС «Меланхолический садизм» (1992) + «Помойка» (1995), «Мы пред врагом не спустили» + «С котом по эту сторону окна» (1998), «Зоосадъ» (1999) + «Перекурчик в деревенском кабаре» (2000, усё выдадзена «Art Classic Company», 2003), МС «Лучшие САДовые песни» («Art Classic Company», 2003), «Перекурчик в деревенском кабаре» (CD-дадатак да часопісу «Жёлтые страницы», №8(15), 2003, Агенцтва У. Грыўцова, mp3), «Паутинка в небо» (аўт. выд., 2004, перавыд. «Nikitin Records», Масква, 2004), «Садъ. Коллекция» («Меланхолический садизм» 1990–92, «Помойка» 1995, «Мы пред врагом не спустили» 1997, «Зоосадъ» 1999, «Перекурчик в деревенском кабаре» 2000, «Паутинка в небо» 2004, «Да пришли вы



все!» канцэрт 2005 – «Мистерия звука», Расея, 2006); **трэкі** «Чай-хана» (у зборніку «Я в Бресте» – «Брестон», 1998), «С котом» (у зборніку «Новое вторжение клином красных В. А. белых» – «Радыё «Би-Эй», «Новое вторжение», 1999), «Баллада о гордом рыцаре» на верш І. Ірценьева (у зборніку «Я в Бресте 2» – «Брестон», 1999; у зборніку «Новое вторжение фиолетовым по сиреневому» – «Радыё «Би-Эй», «Новое вторжение», 1999), «Любоў» (у зборніку «Вольныя танцы 3» – «БМА-group», 2001), «Есенину» (у зборніку «Я в Бресте» – «Art Classic Company», 2002), «Резинка», «Баллада о гордом рыцаре», «Колхозный панк», «Ангел», «Фонарщик», «Ох» (у зборніку «Я в Бресте 2» – «Art Classic Company», 2003), «Бабадала», «Песня не та» (MP3) (у зборніку «Охота №11» – «Кап-Кан Рекордз»/ «Бомба-Питер», СПб., 2004), «Песня не та» (у зборніку «Ш2-Ш4» – «Ш2»/ «Мистерия звука», Масква, 2004), «Ангел» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», Брэст, 2006).

**Кіно, відэа: кліпы** «Песня не та» (рэж. І. Сівіцкі, А. Канцэвіч, 2004), «Ты и я» (рэж. І. Сівіцкі, А. Канцэвіч, 2004); DVD «Да пришли вы все!» (рэж. І. Сівіцкі, «СКМ», 2005).

**Кантакт:** www.sad-brest.narod.ru; shostak_gennadi@tut.by, nataklim@narod.ru, alekseevsky@yandex.ru; +375 (162) 23-08-90.

21.10.06//Г.Ш.

**САКАЛОЎСКІ НЕСТАР (Соколовский Нестор, Sakalouski Nestar)** – кампазітар.

Нарадзіўся 27.10.1902 у в. Вешкі Докшыцкага р-ну, памёр 13.11.1950 у Мінску. Скончыў БМТ па класе кампазіцыі М. Аладава ў 1931, вучыўся ў БДК. Ад 1926 да 1931 – актор і хормайстар БДТ-3, потым кіраваў самадзейнымі хорамі. Адзін з арганізатараў і хормайстар Ансамбля народнай песні і танца Беларускай філармоніі (1937–41). У 1944–46 – начальнік аддзелу мастацкай самадзейнасці Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК

БССР, ад 1946 – старшы рэдактар рэдакцыі музычнай літаратуры Белдзяржвыдавецтва. Аўтар Дзяржаўнага гімну БССР, песні «Нёман» (на верш А. Астрэйкі), аўтар песень на вершы беларускіх паэтаў, апрацовак больш за 500 народных песень, вакальных сюіт і інструментальных мініяцюр.

**Дыскаграфія: трэк** «Нёман» (у зборніку «Я нарадзіўся тут» – выд. Алеся Сушы, 2000).

Паводле Белэнцыклапедыі.

**САЛАДУХА АЛЯКСАНДР (Солодуха Александр, Saladuha Aliaksandr)** – спявак, выканаўца папулярнага рэпертуару, гітарыст. Нарадзіўся 18.01.1959 у в. Каменка Сергіева-Пасадскага р-ну Маскоўскай вобл. У 1982 скончыў ММІ. Працаваў доктарам, удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці, потым выступаў як саліст эстраднага аркестру Палацу культуры Белсаўпрафу. Ад 1987 – саліст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Быў салістам эстраднага аркестру Беларускага таварыства сляпых, у 1989 пачаў працаваць салістам тэатру песні *Ядвігі Паплаўскай – Аляксандра Ціхановіча*, у 1991 распачаў сольную кар'еру, выступаючы з групай «Карусель». Выконвае песні на расейскай і беларускай мовах, працуючы ў стылі шлягернай песні. Сярод найбольш вядомых песень «Здравствуй, чужая милая» (муз. *Эдуарда Ханка,* сл. Л. Татаранкі), «Виноград» (муз. М. Алейнікава, сл. У. Кубышкіна), «Неравный брак» (муз. *Алега Елісеенкава*, сл. М. Траццякова), «Карусель» (муз. А. Елісеенкава, сл. Ю. Кручанка), «Сахар» (муз. М. Алейнікава, сл. В. Чадзюка).




**Гастролі:** Расея, Украіна.

**Фестывалі:** Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Наваполацк» (1987), «Славянский базар».

**Узнагароды:** лаўрэат «Песні году Украіны 2004» (з песняй «Здравствуй, чужая милая»).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Здравствуй, чужая милая» («Vigma», 1996, перавыд. «Классик-компани», Расея, 2003), «Посвящение женщине» («Монолит», Расея, 1997), «Калина» («Арс», Расея, 2000), «Одинокий» («TON-Records», 2002), «Лучшие песни» («Vigma», 2003), «Сотни километров до любви» («Vigma», 2005), «Любить тебя, родная» (2006).

**Кіно, відэа: кліпы** (рэж. І. Пашкевіч) «Калина», «Любимая женщина», «Моя дорога», «На ветру», «Одинокий», «Сахар» (2005).

**Кантакт:** www.soloduha.by; i_radaeva@mail.ru

06.02.07//Д.П.

**САЛАЎЁЎ АЛЯКСАНДР (Соловьев Александр, Salauyou Aliaksandr)** – гітарыст.
Нарадзіўся 21.01.1975 у Смаргоні Гродзенскай вобл. Вучыўся ў ДМШ па класе баяна, як гітарыст пачаў выступаць у складзе школьнага ансамбля. Скончыў Смаргонскі філіял Мінскага політэхнікуму (1995), БУК (аддзяленне мастацтва эстрады, клас гітары *Уладзіміра Угольніка*, 2000). Дэбютаваў як музыка ў складзе групы «Dracula» ў 1989, у 1994–95 выступаў з групай «Touch Point», у 1995– 96 – у складзе групы *«Крама»,* у 1996–97 – групы «Let's Go». Нядоўга выступаў у складзе джазгрупы *«Новые джазеры»*. У 1998 быў запрошаны ў ансамбль *«Песняры»,* пасля падзелу калектыву ў гэтым жа годзе стаў удзельнікам ансамбля *«Белорусские Песняры»*.
**Гастролі:** гл. «Белорусские Песняры».
**Фестывалі:** у складзе «Крамы» – Міжнародны фестываль «Блюз жыве ў Мінску» (1996), фестываль нацыянальнай песні і паэзіі «Маладзечна 1996»; у складзе «Let's Go» – другі фестываль «Блюз жыве ў Мінску» (1997); у складзе «Белорусских Песняров» – «Славянский базар» (Віцебск, ад 1998 штогод).
**Дыскаграфія:** у складзе «Белорусских Песняров» – гл.
**Кантакт:** aleksandr@belpesniary.ru; +375 (17) 216-76-67.
19.04.03//Д.П.

**САПЕГА АЛЯКСАНДР (Сапега Александр, Sapega Aliaksandr)** – барабаншчык, педагог, менеджэр.
Нарадзіўся 08.09.1963 у в. Бабовічы Гомельскага р-ну. Ігры на барабанах пачаў вучыцца ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве, захапляўся рокам і джазам. Скончыў БДК па класе ўдарных Л. Тунчык у 1988. Па службе ў войску (Смаленскі ансамбль песні і танца) у 1986 атрымаў запрашэнне ад *Уладзіміра Мулявіна* працаваць у моладзевай студыі ансамбля *«Песняры»*. У 1987 разам з *Ігарам Сацэвічам* і Міхаілам Філіпенем пры абласной філармоніі ў Гродне ўтварылі групу *«Рада»*, якая акампанавала *Аляксею Шадзько*, *Дзмітрыю Смольскаму* і інш. Ад 1985 – удзельнік ансамбля ўдарных інструментаў «Percussion Classic», для якога напісаў некалькі п'ес. Ад 1992 да 1998 – музыка *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, у складзе якога сумесна з І. Сацэвічам выступіў ініцыятарам стварэння групы *«Apple Tea»*. У 1995–99 – выкладчык ударных інструментаў эстраднага аддзялення ММВ. Ад 2004 – выкладчык па класе ўдарнай устаноўкі ў БАМе і БДУКу паводле праграмы, заснаванай на ўласнай школе «High Tea Drumming».



Выступаў з майстар-класамі ў Польшчы («3 Międzynarodowe Warsztaty Perkusyjne 2001»), Літве («Kaunas 1998»), Эстоніі («Paiste Trummarite Konkurs 2005»), Латвіі («Saulkrasti 2005»). Адзін з ініцыятараў правядзення ў Мінску фестывалю-конкурсу «Барабанны біт» (2005– 07).
Як менеджэр займаецца запісамі і прамоцыяй ансамбля акардэоннай музыкі *«Фестиваль»*, разам з якім запісаў два альбомы. У 2007 быў прыняты ў грамаду музыкаў, якія граюць на прадукцыі фірмы «Paiste».
Аўтар п'ес для ансамбля ўдарных інструментаў «Афрыканскія танцы», «Парнатаўскія барабаншчыкі», «Рэтра-біт».
**Гастролі:** гл. «Apple Tea».
**Фестывалі:** гл. «Apple Tea».
**Дыскаграфія:** у складзе групы «Фестиваль» – гл.; у складзе «Apple Tea» – гл.; з *А. Шадзько:* «Я буду ждать» (аўт. выд., 1998); з А. Маршалам: «Батя» («Лига прав», Расея, 2002); з *Сяргеем Труханoвічам:* «Нараджэнне таямніцы» («БМА-group», 2003); з групай *«ТТ-34»*: «Грубый помол» (ТТ-34», 2004); з групай *«Крама»*: «Будзь разам з намі. The Best» (аўт. выд., 2005) і «Усё жыцьцё – дзіўны сон» («Go-Records», 2007) і інш.
**Кіно, відэа:** гл. «Apple Tea».
**Кантакт:** www.apple-tea.com; appletea@apple-tea.com; sapegalex@gmail.com belyklyk.livejournal.com; +375 (29) 681-52-30.

15.11.07//Д.П., фота Д.П.

**САРМОНТ БРАНІСЛАЎ (Сармонт Бранислав, Sarmont Branislau)** – кантрабасіст, бэнд-лідэр, кампазітар, аранжавальнік, педагог.
Нарадзіўся 29.06.1939 у Мінску. Ад 1959 да 1962 вучыўся ў БДК па класе кантрабаса С. Хярсонскага, быў выключаны з фармулёўкай «За дыскрэдытацыю звання савецкага студэнта». Ужо ў гэты час з'яўляўся артыстам-інструменталістам БДФ, дзе працаваў па 1971. Заснавальнік і дырыжор біг-бэнду «Зелёный огонёк» (1959–71). З 1971 да 1979 – артыстінструменталіст Мурманскай філармоніі, ад 1979 да 1982 – дырыжор біг-бэнду Мінскай міліцыі. У 1982–91 кіраваў духавым аркестрам Мінскага заводу імя Леніна, у тым ліку ад 1984 да 1987 аднachасова ачольваў біг-бэнд Мінскага клубу аматараў джазу. У 1983–89 выступаў у складзе джаз-трыо *Аляксандра Бурштэйна*, супрацоўнічаў з *Белорусским диксилендом*. Ад 1989 да 2005 – выкладчык ММВ (бас-гітара/кантрабас, імправізацыя, ансамбль, аранжаванне). Сярод вучняў: А. Бурштэйн, *Ігар Палівода*, У. Урман, *Міхаіл Фінберг*, В. Міхновіч, А. Архіпаў, Ю. Васілеўскі. Аўтар аранжаванняў для біг-бэнду, песень, інструментальных твораў, музыкі для кіно і тэатру. Сярод найбольш вядомых твораў мюзікл «Камароўка» (2005, музыка, тэксты – сумесна з Б. Жанчаком), Саната для скрыпкі, «Беларуская рапсодыя» для вялікага духавога аркестру, канцэртныя праграмы «Дюк Эллингтон», «Джордж Гершвін», «Ісак Дунаеўскі», «Вместе с Утесовым» для духавога аркестру «Няміга», музыка да спектаклю «Случайный вальс» Рускага тэатру імя Горкага (рэж. Б. Луцэнка, 2005).



**Гастролі:** у складзе розных калектываў выступаў амаль у 30 краінах свету.
**Фестывалі:** Дэбрэцэн (Вугоршчына, 1963), Вроцлаў (Польшча, 1964), Заграб (Югаславія, 1965), Ліепая (Латвія, 1969, 1970, 1971), Апаціты (1972), «Витебская осень» (1984–86), Мінск (1986–89), Львоў (1988), Фергана (1988), Рыга (1989), Казань (1989), Алма-Ата (1990), Ялта (1992), Гановер (1993).
**Дыскаграфія:** дэма-альбом джазавых кампазіцый «Вуліцы вялікага горада» (2005).
**Кнігі:** зборнік п'ес для бас-гітары (кантрабаса), зборнік п'ес для фартэпіяна «Сонечны зайчык».
**Кіно, відэа:** аўтар музыкі да кінафільмаў «Запруда» (рэж. Карасёў, 1965), «Запіскі Самсона Самасуя» (рэж. *Уладзімір Арлоў*, 1989), «Чортавы лялькі» (рэж. У. Арлоў, 1991).
**Кантакт:** brosar@mail.ru
29.04.06//Д.П., фота А. Смірнова

**САРОКІН УЛАДЗІМІР (Сорокин Владимир, Vladimir Sorokin)** – кампазітар, аранжавальнік, піяніст. Нарадзіўся 23.02.1961 у Магнітагорску, Расея. У 1968–79 вучыўся ў ССМШ пры БДК. У 1984 скончыў БДК па класе фартэпіяна У. Кузменкі, у 1995 – па класе кампазіцыі *Яўгена Глебава*. Працаваў выкладчыкам музыкі (1986–88), у 1988 быў прыняты ў БДФ. З'яўляўся музычным кіраўніком калектываў пад кіраўніцтвам С. Кульпы, У. Крывенкі, А. Цівунова. У 1993–95 выкладаў кампазіцыю ў БДК, ад 1995 і да гэтага часу – аранжавальнік ансамбля *«Сябры»*. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Фестываль» (1993), «Беларусы» (1994, напісана да Дня

незалежнасці Беларусі), «Для згоды людской» (да навагодняга тэлепраекту, 1995), «Карнавал» (да навагодняга тэлепраекту, 1996), «Вяселле» (1999), Гімн беларускай чыгункі (2003).
**Фестывалі:** «Рок-крок» (Гродна, 1988, 1989), «Славянский базар» (Віцебск, 1993–2004), «Халі-хало» (Наваполацк, 1994, 1995), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (1994–2004), «Хрустальная нота» (Масква, 2000), «Шлягер года» (Кіеў, 1998), «Звездный Крым» (Сімферопаль, 2003), «Ноель-Баба» (Турцыя, 1998), фестываль імя С. Манюшкі (Польшча).
**Дыскаграфія: альбомы** CD, MC «Владимир Сорокин» (1998), «Фестываль» («Ковчег», 1998), «Моя мелодия» («Ковчег», 2000), «Лапушка. Песні для дзяцей» («Ковчег», 2004).
**Кіно, відэа: кліп** «Для згоды людской» (рэж. Я. Хрусталёў, 1995).
**Кантакт:** www.orokins.narod.ru; orokins@narod.ru; +375 (29) 644-74-50.
04.12.04//Д.П.

**САФОНАЎ АЛЯКСАНДР «СОФІКС» (Сафонов Александр «Софикс», Safonau Aliaksandr «Sophiex»)**– выканаўца на ўдарных, аўтар і выканаўца электроннай музыкі, прадзюсэр.
Нарадзіўся 21.06.1971 у Гомелі. Ударнымі інструментамі зацікавіўся ў дзяцінстве. Адначасова граў на бас-гітары. Дэбютаваў як барабаншчык у складзе гомельскай групы «История», калі вучыўся ў 8 класе. Неўзабаве група мяняе назву на «Белы крумкач», адначасова А. Софікс выступае з групай «Седьмой океан». Пазней уваходзіць у склад групы «Квентин Дорвард». Ад 1991 да 1993 служыў у войску, па вяртанні зноў далучаецца да групы «Квентин Дорвард», якая ад 1993 выступала пад назвай *«Галерея снов»*. У 1997 распачаў сольную кар'еру, зацікавіўшыся электроннай музыкай. У 2004 як выканаўца на ўдарных пачаў супрацоўнічаць з блюзавай групай *«Al Narrator Orchestra»*. Аўтар школы выканання на ўдарных «Система насыщенной игры». Арганізатар шэрагу канцэртаў электроннай музыкі, у тым ліку з удзелам маскоўскага кампазітара Л. Цімашэнкі (2005).
**Фестывалі:** у складзе «Al Narrator Orchestra» – «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005).
**Узнагароды:** лаўрэат першага нацыянальнага конкурсу электроннай музыкі «Электрозащита» ў намінацыі «Першы на першым», лаўрэат 1 прэміі на конкурсе фестывалю «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005).



**Дыскаграфія: альбом** CD «Музыка для размышлений» (Данія, 2001; «HXT records», Масква, 2003, «TON-Records», Мінск, 2002; перавыд. «West Records», 2005), альбом музыкі для ўдарных «DRUMOТУРГИЯ» («Видеогурман», Масква, 2004).
**Кіно, відэа:** відэафільм «Музыка гор и водопадов» (1998), **кліп** «Дождь» (рэж. А. Софікс, 2007).
**Іншая інфармацыя:** змест альбому «Музыка для размышлений» прызнаны за лекавыя міжнароднымі цэнтрамі здароўя і прыгажосці ў Расеі і Беларусі. Музыку А. Софікса выкарыстоўваюць і радзяць для агульнай рэлаксацыі арганізму і аднаўлення псіхаэмацыйнага стану чалавека такія цэнтры, як Інстытут самааднаўлення акадэміка Нарбекава ў Маскве і Школа пазітыўнай псіхалогіі Аляксандра Свіяша.
**Кантакт:** www.sophiex.com; sophiex@tut.by
25.10.07//А.Ц.

**САФОНАЎ ІГАР «СТЭФ» (Сафонов Игорь «Стэф», Safonov Igor)**– альт-саксафаніст.
Нарадзіўся 19.05.1950 у Магілёве, памёр у Мінску 13.12.1994. У 1966 скончыў Магілёўскую музычную школу па класе баяна У. Паўлава, у 1970 Магілёўскую музычную вучэльню па класе баяна. У 1967–68 самастойна авалодаў саксафонам. У 1970 паступіў у БДК па класе баяна. Правучыўшыся два гады, паступае ў кансерваторыю зноў, гэтым разам на аддзяленне тэорыі музыкі. Аднак праз два гады, з сямейных акалічнасцяў, пакідае навучанне. У 1974–76 – музыка аркестру ЧБВА. У 1976, па дэмабілізацыі, кароткі час працуе ў Маскве ў Г. Гараняна, ад 1977 – удзельнік ансамбля ў міжнародных рэйсах на цеплаходзе «Одесса». Падчас працы на трасах уздоўж узбярэжжа ЗША выступаў у «Карнэгі-холе», у тым ліку ў адным канцэрце са С. Уандэрам.
У 1980 вяртаецца ў Беларусь, працуе ў калектывах АМА, у тым ліку ў рэстарацыях «Каменный цветок» і «Юбилейный». У канцы 80-х працягваў адукацыю ў БІКу. У другой палове 80-х стаў лідэрам джаз-групы, з якой выступіў на шэрагу фестываляў у Беларусі, Літве, Украіне.
У складзе калектыву выступалі *Барыс Бернштэйн*, *Ігар Палівода*, *Уладзімір Ткачэнка*. На працягу многіх гадоў лічыўся лепшым альт-саксафаністам Беларусі, апрача папулярнага рэпертуару, выконваў творы джазавай класікі і сучасных аўтараў.
**Фестывалі:** джаз-фестывалі «Віцебская осень» (1986–89), «Birstonas 1988» (Літва), «Крывы Рог 1989», «Джаз на Днепре» (Днепрапятроўск, 1988).
**Дыскаграфія: альбом** MC «Misty. Памяці Стэфа» («Ковчег», 1996).
08.10.06//Д.П.

**САЦУРА МІКАЛАЙ (Сацура Николай, Satsura Mikalai)** – кампазітар, піяніст, аранжавальнік.
Нарадзіўся 02.06.1952 у в. Пагост Жыткавіцкага р-ну Гомельскай вобл. У 1971 скончыў Гомельскую музычную вучэльню, у 1987 – МІК. Ад 1975 артыст, затым музычны кіраўнік ВІА *«Сябры»*. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Раздолье» (на сл. С. Астравога), «Шлях да Беларусі» (сл. *Ніла Гілевіча*), «Сцежка», «Дзева Марыя» (сл. *Аляксандра Лягчылава*), «Перажывём», «Нашы песні –

наша жыццё» (сл. В. Кавальчука), «На Каляды» (сл. *Леаніда Дранька-Майсюка*).

**Гастролі, фестывалі:** гл. «Сябры».

**Узнагароды:** у складзе «Сяброў» – лаўрэат прэміі ЛКСМБ (1984).

**Дыскаграфія: альбом** МС «Николай Сацура» (1998); **трэкі** «На Каляды» – «Сябры» і «Церніца» (у зборніку «Калядныя песні» – «Ковчег», 1995), «Раздолье» і «Давайте познакомимся» – у міньёне «Давнее» («Мелодия», 1983), «Мария» (сл. К. Камейшы, LP «Всем на планете» – «Мелодия», 1978), «Я сказал своей девушке» (сл. А. Бялевіча), «Не пугайте седых журавлей» (сл. В. Ашаулава, абедзве ў LP «Ты – одна любовь» – «Мелодия», 1980), «Живая вода» (сл. С. Астравога, у LP «Живая вода» – «Мелодия», 1982), «Воспоминание» (сл. А. Ярмоленкі, А. Вулаха, у LP «Шумите, березы» – «Мелодия», 1984), «Памяти Белоруссии» (сл. Б. Алейніка), «Белорусская деревня» (сл. І. Катлярова), «Беларусь сінявокая» (сл. С. Панізніка, усе ў LP «Судьбе спасибо» – «Мелодия», 1985), «Дзе ты?» (сл. *Алеся Ставера*), «Зязюльчына раніца» (сл. *Уладзіміра Карызны*), «Деревенская ночь», «Исповедзь» (абедзве на сл. А. Папярэчнага, у LP «Далёкий свет» – «Мелодия», 1986); гл. «Сябры».

**Кантакт:** www.syabry.com; info@syabry.com; +375 (17) 211-33-42.

07.03.05//Д.П.

**САЦЭВІЧ ІГАР (Сацевич Игорь, Satsevich Ihar)** – кампазітар, аранжавальнік, бас-гітарыст, заснавальнік і лідэр джаз-групы *«Apple Tea»*. Нарадзіўся 23.09.1965 у Камянцы Брэсцкай вобл. Мае няскончаную вышэйшую адукацыю. У 1986 стаў музыкам моладзевай студыі пры БДА *«Песняры»*. Ад 1987 да 1990 выступаў у складзе групы *«Рада»* Гродзенскай філармоніі, пасля чаго – музыка *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, дзе й заснаваў у 1994 «Apple Tea» як малы склад аркестру. У 1997 разам з калегамі групы пакінуў аркестр, утварыўшы самастойную творчую адзінку. Напісаў асноўны рэпертуар калектыву. Сярод найбольш вядомых ягоных тэм «Apple Tea», «Petchi Blues», «Bee Dance», «Simple Waltz», «Kupala's Night», «One More Sad Melody»,



актыўна выкарыстоўваючы прыёмы аранжавання, характэрныя сучаснаму джазу, а таксама матывы мелодый, уласцівыя беларускай народнай музыцы, і яе стылізацыі. Шмат займаецца аранжаваннямі для вядучых беларускіх выканаўцаў, студыйнай работай, напісаў шэраг песень для выканаўцаў папулярнага рэпертуару, у тым ліку «Открой глаза», «Это я», «Танго», «Фа-ла-ду» (усе для *Юліі Скараход* на яе тэксты),

«Острова» для *Дзмітрыя Смольскага*. У апытанні «Белорусской деловой газеты» па выніках 2002 разам з *Іванам Кірчуком* названы лепшым айчынным аранжавальнікам.
**Фестывалі:** у складзе «Apple Tea» – гл.
**Дыскаграфія:** гл. «Apple Tea»; з *Аляксеем Шадзько* – «Бэмс» (аўт. выд., 1997), «Я буду ждать» (аўт. выд., 1998); з *Сяргеем Трухановічам* – «Нараджэньне таямніцы» («БМAgroup», 2003), з групай «*Крама*» – «Будзь разам з намі. The Best» (аўт. выд., 2005) і інш.
**Кіно, відэа:** VC «Angry Girls» («CDL Music», 1998), музыка для тэлесерыялу «Ускоренная помощь» (2000), мультфільмаў «Фантазерка», «Ночевка зверей», «Дверь», **кліп** «Apple Tea» (рэж. *Уладзімір Янкоўскі*, 2006).
**Іншая інфармацыя:** піша вершы, малюе. На канале ОНТ ад 2002 падчас прагнозу надвор'я гучыць напісаная ім мелодыя.
**Кантакт:** www.apple-tea.com; appleigor@gmail.com; +375 (29) 623-65-41.
19.11.06//Д.П., фота Д.П.

**«САША И СИРОЖА»** – дуэт з Мінску. Утварыўся ў 2002 і выступае з размоўна-музычнымі праграмамі. У складзе дуэту спявак *Сяргей Міхалок* («*Ляпис Трубецкой*») і мастак Аляксандр Хацкевіч. Творчы шлях дуэту пачаўся з тэлепраграм гумарыстычна-сцёбнага зместу, паказваных па беларускіх і ўкраінскіх радыё- і тэлеканалах. У 2004 у такой жа манеры ўдзельнікі дуэту разам з мінскай групай *«Метеор»* запісалі шэраг трэкаў і знялі відэакліпы дзеля падтрымкі альбому «СкаТы!».
**Фестывалі:** «КомМиссия» (Масква, 2007).
**Узнагароды:** прыз у намінацыі «Лепшая пацяшальная праграма году на ўкраінскім тэлебачанні» (2004, па версіі часопісу «FHM»).
**Дыскаграфія: альбомы** «Опера для ленивых. Саша и Сирожа на «Альфа-радио». Ч. 1 і 2» (2003), «СкаТы!» («Go Records», 2005); **трэк** «Калыханка» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Калыханка», «Филя», «Динозавр», «Новый год» (усе – рэж. М. Сабураў, 2005), VHS-DVD «Новыя калыханкі» (2005).
**Кантакт:** www.lyapis.com
21.07.07//Д.П.

**СВІРЫДАВА АЛЕНА (Свиридова Алена, Sviridova Alena)** – спявачка, кампазітар, аўтар тэкстаў, выканаўца папулярнага рэпертуару. Нарадзілася 14.08.1965 у Керчы. Скончыла музычна-педагагічнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытуту, працавала канцэртмайстрам, актрысай Дзяржаўнага рускага тэатру імя А. Горкага, супрацоўнічала з *Белорусским диксилендом Авеніра Вайнштэйна*. У 1992 пераехала ў Маскву, дзе распачала сольную кар'еру. У тэлеконкурсе «Песня 1993» выйшла ў фінал з песняй «Просто кончилась зима». Спявае на расейскай мове.
**Узнагароды:** уладальніца прызу «Золотое яблоко» на фестывалі «Поколение1993» за стварэнне лепшага жаночага вобразу на эстрадзе.
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Розовый фламинго» («General Records», 1994), «Бедная овечка» (1996),

«Ночью все иначе» (1997), «Ностальгия по тебе» (1997), «Линия жизни» (2000), «Игра в классики» (2002), «Просто кончилась зима. Новые и лучшие песни» (2003).
**Кіно, відэа: кліпы** «Никто, никогда», «Розовый фламинго» (1994).
**Кантакт:** www.sviridova.ru
16.04.06//Д.П.

**СЕМЯНЯКА ЮРЫЙ (Семеняко Юрий, Semianiaka Yuri)** – кампазітар.
Нарадзіўся 26.11.1925 у Мінску, памёр 16.07.1990. У 1957 скончыў БДК па класе кампазіцыі А. Багатырова. Ад 1947 да 1963 працаваў канцэртмайстрам Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларусі. У 1973–80 – старшыня праўлення Саюзу кампазітараў Беларусі. Аўтар опер, балетаў, аперэт, харавой і камернай музыкі, шматлікіх песень. Сярод найбольш вядомых «Ой, шумяць лясы зялёныя», «Люблю цябе, Белая Русь», «Беларусачка», «Явар і каліна» (на сл. Янкі Купалы), «Ты мне вясною прыснілася» (на словы М. Шушкевіча).
**Узнагароды:** лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1972).
**Дыскаграфія: трэкі** «Ты мне вясною прыснілася» (LP *«Песняры»* – «Мелодия», 1971; зборнік «Мінскі сувенір» – «Мелодия», 1980), «Явар і каліна» (LP «Песняры» – «Мелодия», 1978), «Травы детства» (сл. У. Дзямідава, ансамбль *«Верасы»*, у EP «Верасы» – «Мелодия», 1979), «Не за очи чёрные» (на сл. *Адама Русака*, у LP *«Чараўніцы»* – «Мелодия», 1978).
Паводле Белэнцыклапедыі//Д.П.

**СЕРЁГА** – сцэнічны псеўданім Сяргея Пархоменкі.
Выканаўца расейскамоўнага рэпу, які ён сам называе «спартовымі прыпеўкамі». Нарадзіўся ў Гомелі ў 1979. Займацца музыкай пачаў у першай палове 90-х, найбольш вядомы калектыў, у якім ён выступаў, – «КонтрадаБанда». У 2003 распачынае сольную кар'еру, выконваючы ўласныя расейскамоўныя песні. Сярод найбольш вядомых «Чёрный бумер», «Спартак», «Песня голубя».
**Фестывалі:** «Кофемолка» (Чэбаксары, Расея, 2006).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Мой двор: свадьбы и похороны» (2004, перавыд. у Расеі пад назвай «Мой двор: спортивные частушки», 2004), «Дискомалярия» («Go-Records», 2005).
**Кіно, відэа: кліпы** «Бум!» – разам з *«ТТ-34»* (рэж. Р. Васьянаў, 2004), «Чёрный бумер» (рэж. У. Якіменка, 2004).
**Кантакт:** www.seryoga.ru
01.10.06//Д.П.

**«СЕСТРА»** – група з непастаянным складам удзельнікаў.
Акампануе падчас канцэртаў і працы ў студыі *Аляксею Шадзько*. Упершыню выступіла з такой назвай у 1998. У розны час у гэтым калектыве выступалі бас-гітарысты *Валерый Башкоў*, *Аляксандр Каліноўскі*, гітарысты *Піт Паўлаў* і *Сяргей Анцішын*, піяніст *Канстанцін Гарачы*, саксафаніст *Ігар Люты*, барабаншчык Кірыла Шэвандо.
**Дыскаграфія: альбомы** «Моё!» (аўт. выд., 1999), «Не смотря ни на что» («Bulba Records», 2000), «Вход к себе» (аўт. выд., 2001), «Деликатесы №1»

(аўт. выд., 2002), «Диагноз» (аўт. выд., 2003), «Надеждин пароль» (аўт. выд., 2004), «Тайга» («West Records», 2007); **трэкі** «Я рядом, я не далеко» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Сестра» (у зборніку «20 суперхитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000), «Моя Маруся» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Dream On» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**Кантакт:** www.shedko.net

18.07.07//Д.П.

**СІДАРОВІЧ ЗМІЦЕР (Сидорович Дмитрий, Sidarovich Dzmitry)** – гітарыст, аранжавальнік, кампазітар, паэт.

Нарадзіўся 02.10.1965 у Мінску. У 1987 скончыў БПІ, у 1990 – аспірантуру, у 1992 абараніў кандыдацкую дысертацыю ў галіне тэхнічных навук. У 1978 пачаў пісаць вершы і тэксты для песень, праз два гады сабраў першы склад пад назваю «All». Самастойна вывучыўся граць на фартэпіяна, у сярэдзіне 80-х выступаў як бард, выконваючы ўласныя песні па-беларуску. У 1991 стаў арганізатарам стварэння творчай суполкі *«Камэлот»*, пазней займаўся літаратурнай працай. У 1999 утварыў ансамбль «Гаспадары з-пад Вільні», авалодаў падоўжанай флейтай і дудой. Сярод найбольш вядомых твораў як кампазітара песні «Які ж я беларус?» (1986), «Краіна талераў» (1991), «А дзе ж тыя ваяры?» (на народны тэкст, 1992), «Тры жалуды на цабэрак» (1993), «Пена цёмнага піва» (2000), «Гэй-га, Нямон» (2001). Аўтар музыкі да дакументальных фільмаў «Беларусь, лета 1991» (рэж. У. Колас, 1991), «Турнір» (рэж. І. Волах, 1994), «Зламіць вецер» (рэж. І. Волах, 1998), да мастацкага фільму «Шукальнікі скарбаў» (у суаўтарстве з А. Кішкіным, рэж. І. Волах, 1993), музыкі да спектаклю «Заложніца кахання» (у суаўтарстве з І. Войнічам, тэатр «Вольная сцэна», рэж. В. Мазынскі, 1996).

**Гастролі:** канцэрты ў многіх гарадах Беларусі, у Вільні, Беластоку, Бельску-Падляскім, Ічыне (Чэхія).

**Дыскаграфія:** у складзе групы «Камэлот» – «У краіне талераў» («TON-Records», 1995), сольны бардаўскі МС альбом «Выбірай лепшае» (аўт. выд., 2001); **трэкі** «Грай, дудар» (у зборніку «Вольныя танцы – слухай сваё» – «БМAgroup», 1999), «Пена цёмнага піва», «Гэй-га, Нямон» (у альбоме «Вір» групы *«Стары Ольса»* – «Ковчег», 2001), «А дзе ж тыя ваяры?» (у зборніку «Легенды Вялікага княства», 2000).

**Іншая інфармацыя:** аўтар-складальнік энцыклапедыі «Інфарматыка і праграмаванне» (1994), кнігі «100 великих музыкантов ХХ века» (2001).

**Кантакт:** zmitro@tut.by; +375 (17) 223-66-65, 260-37-67 (х.).

18.05.04//Д.П.

**«СИНИЦА»** – мінская група, якая трымаецца напрамку альтэрнатыўнага року.

Утварылася ў 2003, выступаючы першапачаткова наступным складам: Наталля Сініца – вакал, Глеб «Жалезны» Сівалобчык – гітара (← *«Sarcastic Green»*), Андрэй Мамаеў – бас-гітара, Аляксей Наскоў – барабаны. У 2005 на бас-гітары граў Захар Бабаеў. На пачатку 2007

у групе выступалі Н. Сініца, Павел Карабейнік – гітара, Павел Палонскі – бас-гітара, А. Наскоў. Рэпертуар заснаваны на аўтарскіх расейскамоўных песнях.

**Фестывалі:** «Наша музыка» (2003), «Продвижение», «Рок без границ», «Рок за бобров» (Бабруйск, 2007), удзел у канцэртных праграмах шэрагу байк-фестываляў.

**Дыскаграфія:** выданне дэбютнага альбому запланавана на 2007; **трэк** «Впрочем» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000).

**Кіно, відэа: кліпы** «Уходи» (рэж. У. Маркевіч), «Ты достал» (рэж. *Анатоль Вечар*), «Отпусти» (рэж. Я. Камароў, 2004), «Тоска» (хранікальны, 2005).

**Кантакт:** www.sinitsa.ru

11.06.07//Д.П.

**«СИНЯЯ ПТИЦА»** – вакальна-інструментальны ансамбль з Гомелю. Утварыўся ў 1973 на базе самадзейнага ВІА «Голоса Полесья» пры ДК «Гомельдрэў». У першым складзе калектыву выступалі Міхаіл Балотны – клавішныя, вакал, Сяргей Драздоў – бас-гітара, вакал, Барыс Белацаркоўскі – барабаны, да якіх неўзабаве далучыўся Роберт Балотны – гітара, вакал (← ВІА «Коробейники»). Годам пазней ужо пад назвай «Современник» калектыў выступаў складам: браты Балотныя, Б. Белацаркоўскі (→ 1982), С. Драздоў (→ 1982), Жана Заўялава, Юрый Мяцёлкін, Юрый Яцына. У гэтым складзе ў кастрычніку 1975 калектыў зрабіўся штатным ансамблем Куйбышаўскай філармоніі і пачаў выступаць пад назвай «Синяя птица». Першы сольны канцэрт – 22 лютага 1976 у Тальяці. Ансамбль выконваў песні на расейскай мове, пэўны час (пачатак 80-х) з ім супрацоўнічаў Ю. Антонаў. Найбольш вядомыя песні «Клён», «Ты мне не снишься», «Мамина пластинка». У розны час у калектыве выступалі І. Дацэнка – барабаны (→ «ДДТ»), В. Праабражэнскі – вакал. У 1989 група па кантракце працавала на Кіпры, пасля 1991 практычна спыніў дзейнасць. У 1999 група аднавіла дзейнасць, выступаючы складам: браты Камаровы, С. Драздоў (→ 2002), А. Рудэнка, С. Леўкін, В. Максімава, К. Цыбузаў. У 2003 да калектыву далучаецца Аляксей Зорын – вакал, гітара.

**Гастролі:** гастролі на БАМе (1978), Афганістан, краіны Афрыкі, В'етнам, Лаос, Кампучыя (1985), Куба (1989), ЗША (1991).

**Фестывалі:** «Banska Bystrica» (ЧССР, 1979), «Братыслаўская ліра» (ЧССР, 1979), «Ален мак» (Балгарыя, 1980), «Рок ў змаганні за мір» (Сакалова, ЧССР, 1986).

**Дыскаграфія** (без указання фармату дыскаў): «Клён» (1976), «Ты мне не снишься» (1977), «Прогулка» (1978), «Наедине с собой» (1980), «От любви не убегай» (1981), «Юля» (1982), «Подорожник» (1982), «Синяя птица» во Дворце спорта в Лужниках» (1983), «Белый причал» (1987), «Белый пароход» (1995), «Мамина пластинка» (1996), «Здравствуй и прощай» (1996), «Мир на холсте» (1996), «Когда с тобой любовь» (1996).

11.01.06//А.Ц.

**СКАРАЖОНАК ВАЛЕРЫЙ (Скорожонок Валерий, Skarazhonak Valery)** – спявак.

Нарадзіўся 06.06.1961 у г. Вілейка Мінскай вобл. Вучыўся на вакальным аддзяленні Гродзенскай вучэльні мастацтваў. На сцэне дэбютаваў у 1978 у складзе народнага ВІА «Раніца» ў Гродне. Ад 1979 да 1981 працаваў артыстам Расканцэрту ў Разанскай абласной філармоніі. У 1981–89 – саліст Гродзенскай абласной філармоніі, пазней два гады быў артыстам рыжскага канцэртнага аб'яднання. У 1991–92 – артыст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, ад 1992 да 1998 – мастацкі кіраўнік Вілейскага ГДК. У 1998 быў запрошаны вакалістам у БДА *«Песняры»*. Летам 2003 прызначаны дырэктарам БДА «Песняры», сышоў з гэтай пасады ў 2005.

**Узнагароды:** лаўрэат конкурсу «Красные гвоздики» (1977), конкурсу «Юность Полесья» (1979), лаўрэат II прэміі конкурсу маладых выканаўцаў на Усесаюзным фестывалі польскай песні ў Віцебску (1988).

**Дыскаграфія: трэк** «Nim przyjdzie wiosna» (у альбоме «Всесоюзный фестиваль польской песни» – «Мелодия», 1989); CD «Песняры 2001» («Ковчег», 2001), «Распавядальная» («West Records», 2007).

**Кантакт:** +375 (29) 675-79-60.

19.11.06//Д.П.

**СКАРАХОД АЛЬБЕРТ (Скороход Альберт, Skarahod Albert)** – спявак, аўтар песень, аранжавальнік, прадзюсэр.

Нарадзіўся 23.08.1960 у Мінску. Брат *Юліі Скараход*. У 1981 скончыў БДІФК. Музычную кар'еру распачаў як саліст групы «Дельта», пазней працаваў і як сольны выканаўца. У 1994 заснаваў футбольную каманду зорак беларускай эстрады «Арт-старс», якая цягам наступных гадоў правяла шмат музычна-спартовых акцый, дабрачынных матчаў. У 1996 стварыў тэатр спорту і песні «Дельта-шоу». Выконвае песні пераважна на расейскай мове. Найбольш вядомыя: «Перевернутый мир» (выкананне песні без фанаграмы ў стойцы на галаве), «Счастливая любовь» (А. Скараход – Т. Шпартава), «Мне грустно» (А. Скараход – Т. Шпартава), «Ведунья» (А. Скараход – М. Мілашэўскі).

**Фестывалі:** у складзе «Дельты» – I усесаюзны фестываль польскай песні (Віцебск, 1988), Міжнародны конкурс гульнёвых і забаўляльных праграм (Масква, 1991), «Славянский базар» (Віцебск, 1993), «Срэбраны дэльфін» (Фівіцыяна, Італія, 1999), шэраг фестываляў у Маскве, Лейпцыгу, Дрэздэне, Берліне, Варшаве.

**Узнагароды:** Гран-пры фестывалю «Срэбраны дэльфін» у намінацыі «Сольны выканаўца» (Фівіцыяна, Італія, 1999).

**Дыскаграфія: альбом** CD «Душа» (аўт. выд., 1999).

**Кіно, відэа: кліпы** «Я больше не верю», «Ведунья».

**Іншая інфармацыя:** у тэатр «Дельта-шоу» уваходзяць брэйк-данс каманда «Адамс», шоў-балет «Аніма», майстар спорту міжнароднага класу Вячаслаў Харанека, фокуснік Пётр Стасевіч, праграма паказальных выступленняў па кік-боксінгу і муа-таю.

**Кантакт:** ascorohod@nm.ru; +375 (29) 671-79-82.

22.01.06//Д.П.

**СКАРАХОД ЮЛІЯ (Скороход Юлия, Skorohod Julia)** – спявачка, піяністка.

Нарадзілася 26.07.1969 у Мінску. Скончыла ММВ у 1988 па класе фартэпіяна. Спецыялізавалася таксама як салістка бэнду п/к І. Райхліна. Дэбютавала на сцэне як вакалістка і выканаўца на клавішных у 1985 у складзе пап-рокавай групы «Менск». Ад 1986 да 1990 – салістка групы *«Верасы»*, ад 1990 да 1995 – салістка-вакалістка *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. У 1995 распачала сольную кар'еру. У канцы 90-х з сямейных акалічнасцяў выехала ў Польшчу, дзе вучылася кампазіцыі, у 2005 скончыла Вышэйшую школу менеджмэнту і прамоцыі ў Варшаве па спецыяльнасцях менеджмэнт і кампазіцыя. Найбольш вядомыя песні «Открой глаза», «Это я», «Танго», «Фа-ла-ду» (усе – муз. *Ігара Сацэвіча* на ўласныя тэксты), «Мадонна» (муз. *Васіля Раінчыка*, сл. *Уладзіміра Някляева*), «Мелодия любви» (муз. Г. Казловай, сл. *Аляксандра Лягчылава*).

**Гастролі:** у складзе «Верасоў» – Расея, Югаславія, Камбоджа, Вугоршчына, Украіна, ФРГ, Малдова; у складзе Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі – Польшча, Расея.

**Фестывалі:** Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна».

**Дыскаграфія:** шэраг песень, запісаных на студыі «Верасоў» і на Беларускім радыё, а таксама ў Польшчы.

**Кіно, відэа: кліпы** «Sing To Me» (рэж. І. Пашкевіч, 1993), «For Ever» (рэж. Н. Сідзельнікава, 1987), «Фаэтон» (рэж. Н. Сідзельнікава, 1995).

**Кантакт:** skarahod@op.pl

19.11.06//Д.П.

**СКОРЫКАЎ МІКАЛАЙ (Скориков Николай, Skorykau Mikalay)** – спявак.

Нарадзіўся 19.11.1957 у Гомелі. Скончыў Гомельскую музычную вучэльню ў 1978, БДК па класе вакалу С. Асколкава ў 1983. Ад 1985 – саліст Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Цітовіча, ад 1988 – саліст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Працуе ў жанры класічнай папулярнай песні, спявае на беларускай, расейскай і ангельскай мовах, выконвае песні беларускіх і савецкіх кампазітараў, сусветную папулярную спеўную класіку. Працаваў за мяжой.

**Фестывалі:** «Славянский базар» (неаднаразова).

**Узнагароды:** лаўрэат Першага ўсесаюзнага радыёконкурсу «Новые имена» (1987), уладальнік Гран-пры міжнароднага конкурсу «Музыка свету» (Італія, 1998).

**Дыскаграфія: альбомы** «The Best» («Ковчег»), 2CD «Golden Hit» (канцэртны, «Ковчег», 1997); **трэк** «Лета першага спаткання» (у альбоме «И пока на земле существует любовь» *Ігара Лучанка* – «Мелодия», 1988).

**Кіно, відэа: кліп** «Теплоход» (2001).

**Кантакт:** +375 (17) 284-74-40 (Дзяржаўны канцэртны аркестр).

Паводле Белэнцыклапедыі//Д.П.

**СЛУКА КІРЫЛА (Слука Кирилл, Sluka Kirill)** – спявак, прадстаўнік сучаснай папулярнай песні, вядучы канцэртных і тэлевізійных праграм, прадзюсэр.

Нарадзіўся 15.07.1975 у Мінску. Скончыў прадзюсэрскі факультэт Інстытуту сучасных ведаў. Тэлевізійную кар'еру пачаў у якасці вядучага

дыскатэкі праграмы «Тэлебом» – «Дах для ўсіх», выступаў як аўтар тэкстаў для праграм «Усё нармальна, мама!», «5+5», «Акалада», вёў аўтарскія праграмы «Телек-шоў», «Классика дворов», выступаў як вядучы канцэртаў Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянский базар». У 1998 падпісаў кантракт з расейскай кампаніяй «АРС». Ад 2003, выступаючы як вядучы шоў «Одноклассники» Першага нацыянальнага тэлеканалу, займаецца прадзюсэрскай дзейнасцю (Алена Іванова, рэп-група «Движение у_лица»). У траўні 2004 пачынае ўвасабляць праект «Беларусь и Я» дзеля стварэння вакальна-інструментальнага ансамблю «Беларусь», у якім выступае як аўтар песень і аранжавальнік. У студзені 2005 стварае хіт-парад «Беларусь музыкальная. Новые имена» (www.belorusia.by). Спявае на расейскай мове. Найбольш вядомыя творы «Минск – это я», «Родина моя», «Белоруссия», «Армия нужна», «В небе», «Дай Бог Победе 60!», «Мама», «Самая нежная песня», «Здравствуйте, друзья!», «Просто ветер», «С Новым годом, Беларусь!».
**Дыскаграфія: альбом** CD «Взрослый» («Vigma», 2005); **трэк** «Минск – это я» (у зборніку «Бульба-хіт 2000» – «Bulba Records», 2000).
**Гастролі:** Расея, Нямеччына.
**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск), «Золотой Витязь».
**Кіно, відэа:** удзел у фільме «Поводырь» (рэж. А. Яфрэмаў); **кліпы** «Беларусь и Я» (разам з праектам «Беларусь», рэж. К. Слука, 2004), «Синьорина» (рэж. *Уладзімір Максімкаў*).
**Кантакт:** www.belorusia.by
05.11.06//Л.К.



**СМОЛАВА ПАЛІНА (Смолова Полина, Smolava Palina)** – спявачка, выканаўца сучасных папулярных песень.

Нарадзілася 03.09.1980 у Мінску ў сям'і музыкаў. Скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, ММВ па спецыяльнасці народны хор, у 2005 – БДУК па спецыяльнасці сольныя народныя спевы. Музычную кар'еру пачала з выступаў у складзе дзіцячых фальклорных калектываў. Ад 2001 – мастацкі кіраўнік ансамбля народнай музыкі «Церніца». У 2003 пачала працаваць салісткай Тэатру моладзевай эстрады. У 2004 і 2005 – удзельнік фінальнага рэспубліканскага туру «Еўрабачанне», у 2006 – удзельніца паўфіналу гэтага конкурсу. Працуе

педагогам па вакале з маладымі спевакамі ансамбля «Церніца». Ад 2005 – салістка аркестру ГУУС Мінску.

**Фестывалі:** міжнародны фестываль «Галасы Еўропы», «Еўрабачанне 2006», «Новая волна» (Юрмала, Латвія, 2007).

**Узнагароды:** лаўрэат 1 прэміі на міжнародным фестывалі «Галасы Еўропы», лаўрэат першага рэспубліканскага конкурсу беларускай народнай песні «Галасы радзімы».

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Smile» («Vigma», 2005), «Сад одиночества» («Vigma», 2006).

**Кіно, відэа: кліпы** «Дождь» (рэж. *Уладзімір Максімкаў*, 2004), «Не сошлись» (рэж. У. Максімкаў, 2005), «Сад одиночества» (рэж. Д. Волкаў, 2006).

**Іншая інфармацыя:** прапаршчык, выйшла ў адстаўку ў сакавіку 2008.

**Кантакт:** www.smolova2006.narod.ru

10.03.08//Д.П.



**СМОЛЬСКІ ДЗМІТРЫЙ (Смольский Дмитрий, Smolski Dzmitry)** – спявак, выканаўца папулярнага рэпертуару, аўтар музыкі.

Нарадзіўся 20.07.1970 у Мінску.

У 1987–90 вучыўся ў ММВ на аддзяленні струнных па класе кантрабаса і на эстрадным аддзяленні па класе бас-гітары. У 1977–86 выступаў у складзе ВІА «Іскрынка» і «Юность» Дому піянераў і школьнікаў Заводскага р-ну Мінску, цягам 1987–90 супрацоўнічаў з групамі *«Метро»*, *«Рада»*, «Восточная Европа». У 1991–92 – саліст тэатру песні *Ядвігі Паплаўскай – Аляксандра Ціхановіча*, у 1993–94 – саліст студыі *«Сябры»*, у 1995 распачаў сольную кар'еру. Удзельнік рэспубліканскага адборачнага туру на конкурс «Юрмала 1989», удзельнік тэлепраграм «Утренняя звезда», «50х50». Спявае на беларускай і расейскай мовах. Сярод найбольш вядомых песень «Острова» (муз. *Ігара Сацэвіча*, *Аляксандра Сапегі*, сл. В. Коўзуся), «У бацькоўскім кутку» (муз. *Ігара Лучанка*, сл. *Ніла Гілевіча*), «Позову», «Троіца» (абедзве з муз. Дз. Смольскага на сл. А. Зотава і Дз. Смольскага), «Я читаю тебя по глазам» (муз. Дз. Смольскага, сл. А. Лебедзева), «Смычок и струна» (муз. Дз. Смольскага, сл. І. Аненскага), «Не спеши» (муз. Ю. Вашчука, сл. Я. Ракіціна).

**Гастролі:** СССР, Польшча.

**Фестывалі:** «Славянский базар» (неаднаразова), «Етвызь 1996».

**Узнагароды:** Гран-пры конкурсу на фестывалі «Етвызь 1996».

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Моя звезда» (аўт. выд., 1995), «Счастливчик» (аўт. выд., 1996), «Однолюб» (аўт. выд., 1996), CD

«Избранное» («TON-Records», 2003).
**Кіно, відэа: кліпы** «Острова» (рэж. Н. Сідзельнікава, 1989), «Троіца» (рэж. *Анатоль Вечар*, 1996), «Меня спасли небеса» (рэж. А. Вечар, 2006).
**Іншая інфармацыя:** захапляецца спортам – хакеем, вялікім тэнісам, більярдам, выступае за зборную музыкаў Беларусі «Арт-старс» па футболе.
**Кантакт:** +375 (29) 668-32-36, (29) 563-35-12, (29) 642-03-74.
18.11.06//Д.П.

**СМОЛЬСКІ ВІКТАР (Смольский Виктор, Smolski Victar)** – гітарыст, кампазітар, аранжавальнік, прадзюсэр.
Нарадзіўся 01.02.1969 у Мінску. Ва ўзросце 6 гадоў пачаў навучацца музыцы. Скончыў ССМШ пры БДК па класе віяланчэлі (1984), ММВ па



класе гітары (1989). У 1985 быў запрошаны ў студыю ансамбля *«Песняры»*. У 1988 разам з калегамі па студыі засноўвае групу *«Инспектор»*, якая праз пэўны час ад'язджае на працу ў Нямеччыну. Там група запісвае і выдае ў 1993 першы ў гісторыі беларускай папулярнай музыкі кампакт-дыск. Неўзабаве музыкі групы вяртаюцца ў Беларусь, Віктар застаецца ў Нямеччыне, дзе працуе сесійным гітарыстам, выступае на фестывалі ў Роскілдзе (Данія) з праектам «*Новае Неба*». У 1994 пачынае працаваць у складзе групы «Mind Odyssey». Выступаў як саліст у паказах Сімфоніі для аркестру і электрагітары свайго бацькі кампазітара Дзмітрыя Смольскага. Увосень 1999 як сесійны музыка запісваецца з групай «Rage», пасля чаго атрымлівае запрашэнне ўвайсці ў склад трыо. Прадстаўнік прадукцыі фірм «Yamaha», «Siggi Guitars», «Peavey», «Thomastik-Infeld», «Cordial» на шэрагу міжнародных выстаў і кірмашоў, дацэнт-выкладчык у «Yamaha Music School». Як прадзюсэр і гукарэжысёр супрацоўнічаў з групамі «Silent Force», «GBArts», «Delirious», «Sevens Avenue». На пачатку 2005 удзельнічаў у запісе альбому расейскай групы «Кипелов», з якой даў шэраг канцэртаў у 2005 і 2006.
**Гастролі:** у складзе «Mind Odyssey» – краіны Еўропы; у складзе «Rage» і сола – краіны свету, Еўропы, Расея (2000), Японія (2002).
**Фестывалі:** «Wacken Open Air» (Нямеччына, 1999), «Gods Of Metal» (Італія), «Prog Rock Fest» (ЗША), «Rock Machina» (Іспанія), «Planet Music» (Аўстрыя), «Sweden Rock» (Швецыя), «Busan Fest» (Карэя),

«Quattro» (Японія), «Raismesfest» (Францыя), «Graspop» (Бельгія) і інш.
**Дыскаграфія:** у складзе «Инспектора» – «Russian Prayer» («Ariola-BMG», Нямеччына, 1993), сола міні-CD «Destiny» (1996), CD «The Heretic» (2000), «Majesty & Passion» («Drakkar Classic», 2004, Нямеччына, «СД-Максимум», Расея); у складзе «Mind Odyssey» – «Nailed To The Shade» («G.U.N. Records», 1996), «Signs» («B.Mind Records», 1999); у складзе «Rage» – «Ghosts» (1999), «Welcome To The Other Side» (2001), «Best Of – All G.U.N. Years» (2001), «Unity» (2002), «Soundchaser» (2003).
**Кіно, відэа: кліпы** ў складзе «Mind Odyssey» – «Schizophrenia» (рэж. *Уладзімір Янкоўскі*, 1996); у складзе «Rage» – «Down» (рэж. У. Янкоўскі, 2002), «The Heretic» (рэж. У. Янкоўскі); «From The Cradle To The Stage» (DVD live, 2004); песня «Straight To Hell» гучыць у саўндтрэках да фільмаў «Der Schuh des Manitu», «Traumschiff Surprise».
**Іншая інфармацыя:** выступае як прафесійны аўтагоншчык канюшні «BMW».
**Кантакт:** www.victorsmolski.de
16.04.06//Д.П.

**«СОЛНЕЧНАЯ СТОРОНА»** – група з Бабруйску. Утварылася ў 1979, выконваючы музыку ў стылі рок-н-ролу і нэа-рамантык.



У першым складзе калектыву – Аляксандр Ротань – гітара, вакал, Міхаіл Карасёў – бас-гітара, Генадзь Міхайлаў – барабаны, Вольга Пятрыкіна – вакал, Юрый Цярновы – клавішныя, Сяргей Мароз – гукарэжысёр. Ад 1984 да 1985 у калектыве выступаў Вадзім Сажын – клавішныя, ад 1986 да 1988 на клавішных гралі Рафаіл Гольдман і Аляксандр Старобінец. Ад 1980 да 1982 група працавала як калектыў Кастрамской абласной філармоніі. Рэпертуар засноўваўся на песнях груп «Police», «Deep Purple», «Beatles», Б. Марлі, Ц. Тёрнэр, Дж. Бенсана і інш., а таксама на ўласных песнях, сярод якіх найбольш вядомыя сёння з выканання расейскай групай «БИ-2» – «Дурочка», «Фламенко», «Мой рок-н-ролл», «Алиса», «Старая дорога». Група спыніла існаванне ў 1988.
**Фестывалі:** Другі рэспубліканскі фестываль папулярнай музыкі (Наваполацк, 1988), рок-фестываль у Мінску (1987).
**Дыскаграфія:** цягам 1979–84 былі запісаны 3 магнітаальбомы без назваў, усяго 40 кампазіцый; МС «Смотрите, кто пришел» (1984–85), МС без назвы (1985–88, перавыд. CD М. Карасёвым як «Нечётный воин», 2006, прадзюсэр Шура «БИ-2»).
**Кантакт:** rotan-56@rambler.ru; гл. таксама www.bdva.ru/sol; +375 (225) 58-24-82.
05.04.07//Д.П.

**«40+–»** – мінская група. Сабралася ўвосень 2004 дзеля выканання музыкі, вытрыманай у стылі рытм-энд-блюзу, класічнага року.
Першапачаткова ў групе выступалі Руслан Праўда – бас-гітара (← *«Крама»*), Андрэй «Шэл» Шаломенцаў – вакал, Уладзімір Шчытнікаў – гітара, Канстанцін Франкоўскі – акустычная гітара, Генадзь Шчабічэнка – барабаны, *Аляксандр Насковіч* – гітара, бэк-вакал (← *«Slang»*). Ад 2005 у складзе групы – барабаншчык Уладзімір Гуляеў (← *«Метро»*), у кастрычніку 2005 – увайшоў гітарыст Сяргей Надзежкін (← *«Торнадо»*). Увесну 2007 склад групы быў наступны: Андрэй «Шэл» Шаломенцаў – вакал, акустычная гітара, Р. Праўда, У. Гуляеў, С. Надзежкін, А. Насковіч.
**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (2006), выступ на байк-шоў у Мінску (2006), удзел у тэлепраекце «Живой звук» (2006), «The Global Battle Of The Bands» (2006).
**Дыскаграфія:** сінгл «Дай мне слово» («40+–», 2007).
**Кантакт:** alanslang@tut.by; spm@tut.by
28.05.07//Д.П.

**СПІРЫДОВІЧ АЛЕНА (Спиридович Елена, Spiridovich Alena)** – журналіст, вядучая тэлепраграм і канцэртаў.
Нарадзілася 22.04.1961 у Мінску. У 1983 скончыла факультэт журналістыкі БДУ, у гэтым жа годзе пачала працаваць у дзіцячай рэдакцыі Беларускага тэлебачання. Вядучая канцэртаў фестывалю «Славянский базар» ад 1991, кінафестываляў «Лістапад» ад 1993, «Кинотавр» ад 1997, тэлепраграмы «На скрыжаваннях Еўропы» ад 1999. У 1993–99 была вядучай і рэдактарам тэлевізійнага конкурсу маладых артыстаў эстрады «Зорная ростань». Выступае як вядучая святочных канцэртаў і фестываляў у Беларусі і Расеі.
Паводле Белэнцыклапедыі.

**СПІРЫДОВІЧ УЛАДЗІМІР (Спиридович Владимир, Spiridovich Vladimir)** – гітарыст, спявак, аранжавальнік, аўтар уласных песень.
Нарадзіўся 22.03.1952 у Мінску. У 1974 скончыў фізічны факультэт БДУ па спецыяльнасці радыёфізіка. Творчы шлях у музыцы пачаў у 1968 як удзельнік групы *«Весёлые лисы»*, у 1970–74 быў лідэрам групы *«Аргонавты»*, у 1976–80 выступаў у складзе групы *«Время»*, якая працавала ў ММЦ «Юность». Група «Аргонавты» была, бадай, першай у СССР біт-групай, якая падрыхтавала і паказала праграму з удзелам камернага струннага ансамбля. Ад 1980 займаўся навуковымі даследаваннямі ў галіне гармоніі светабудовы. Сярод найбольш вядомых песень, напісаных па-расейску ў 60–70, «Белое-крепкое», «Скажи, зачем открыта эта дверь?», «Чёрный камень», «Хозяйка», «В лагерях как на войне», «В тех домах...», «Другу», «Хотелось мне большого чистого».
**Фестывалі:** у складзе групы «Весёлые лисы» – І фестываль біт-музыкі (Мінск, 1968), у складзе «Аргонавтов» – рок-фестываль (Мінск, 1971).
**Узнагароды:** 1 месца ў конкурсе рок-фестывалю (Мінск, 1971).
**Дыскаграфія:** дэма CD «Иди сюда» (1996), «Хотелось мне большого

чистого...» (1996), «Маленькие истории» (2003), «Не верь!» (2004), «Когда-то» (2004), «Поэзия доверия» (2005).
**Кантакт:** +375 (29) 362-34-77.
25.02.07//Д.П.

**СТАВЕР АЛЕСЬ (Ставер Алесь, Staver Ales)** – паэт.
Нарадзіўся 10.08.1929 у в. Маргавіца Докшыцкага р-ну Віцебскай вобл., памёр 23.07.1995 у Мінску. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1954), працаваў настаўнікам, у БДФ, Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, у Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП Беларусі. Выступаў у друку з 1949, актыўна супрацоўнічаў з беларускімі кампазітарамі. Сярод найбольш вядомых песень, напісаных на яго вершы, – «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Косіць хлопец канюшыну», «А мне ў шчасце верыцца», «Беларусачка».
**Дыскаграфія: трэкі** «Жураўлі на Палессе ляцяць» (муз. *Ігара Лучанка*, група *«Песняры»*, у альбоме «Зачарованая мая-1» – «Мелодия», 1982, «Песняры 2001» – «Ковчег», 2001, ансамбль *«Сябры»* ў LP «Живая вода» – «Мелодия», 1982), «Дзе ты?» (муз. *Мікалая Сацуры*, ансамбль «Сябры», у LP «Далёкий свет» – «Мелодия», 1986).
Паводле Белэнцыклапедыі//Д.П..

**СТАНКЕВІЧ ГЕОРГІЙ «СТАКАН» (Станкевич Георгий «Стакан», Stankevich Heorhi)** – гітарыст, педагог.
Нарадзіўся 1.12.1955 у Мінску. Скончыў ММВ па класе гітары (1981). Ад 1975 да 1983 працаваў артыстам БДФ, пазней – музыкам мінскага АМА, займаўся выкладчыцкай дзейнасцю, час ад часу ўваходзячы ў склад мінскіх рок-груп (*«Levee Break» Вольгі Аліпавай*, 1995). У канцы 2002 пачаў супрацоўніцтва з *Андрэем Плясанавым*, увайшоў у склад групы *«P.L.A.N.»*, выступаў у ёй да лета 2003, узяўшы ўдзел у запісе дэбютнага альбому. На пачатку лета 2007 увайшоў у склад групы *«НЕО»*, аднак хутка пакінуў калектыў. Адзін з распрацоўшчыкаў сайту blues.by.
**Гастролі:** у час працы ў філармоніі – гастролі па СССР.
**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (1995–97).
**Дыскаграфія:** у складзе групы «P.L.A.N.» – «Блюз у канцы тунэлю» («Студыя «P.L.A.N.», 2003).
**Іншая інфармацыя:** спецыяліст па камп'ютэрах.
**Кантакт:** george_charkin@mail.ru; george_charkin@tut.by
07.09.07//Д.П.

**СТАНКЕВІЧ УЛАДЗІМІР (Станкевич Владимир, Stankevich Vladimir)** – артыст кіно, спявак, прамотар, аўтар тэкстаў.
Нарадзіўся 17.12.1965 у Мінску. У 1990 скончыў акторскае аддзяленне БДТМІ па спецыяльнасці актор драматычнага тэатру і кіно. Здымацца ў кіно і тэлеспектаклях пачаў у 1972. У 1983–84 выступаў як канферансье ў складзе ВІА «Ровесник» ЧБВА, ад 2002 – артыст ансамбля *«Сябры»*. У 1992–95 – вядучы дзіцячай музычнай тэлепраграмы «Тэлебом», у 1994–98 – саліст групы «Elegant Company», ад 1998 да 2000 – артыст музычнага праекту

«Анжелика». Ад 2002 жыве і працуе пераважна ў Маскве, дзе выступае як вядучы шоў-праграм і крэатыўны прадзюсэр прадзюсэрскага цэнтру «Globalsound». Крэатыўны прадзюсэр музычных праектаў «Elegant Company», «Анжелика», «Tory Yutt». Найбольш вядомыя песні створаны з ягоным удзелам для *Анжалікі Ют:* «Заколдованный рай», «Замок из песка» (абедзве – на муз. А. Ют), «Над облаками» (муз. DJ AleX), «Мама-Маруся» (муз. «Ricci e Poveri», сл. народныя, крэатыў У. Станкевіч).
**Гастролі:** СССР, краіны СНД, Польшча, Літва, Эстонія.



**Дыскаграфія: альбом** МС «Игра» («TON-Records», 1994), «Stop Time» («TON-Records», 1996), «Маруся раз!» («West», Украіна, 1997), «Планета любви» («TON-Records», 1998), «Заколдованный рай» («TON-Records», 1999), CD «Убегу» («Globalsound», Расея, 1999).
**Кіно, відэа: кліпы** «Мама-Маруся» (рэж. С. Новікаў, 1997), «Заколдованный рай» (рэж. *Анатоль Вечар*, 1998); **кіно** «Вот и лето прошло» (рэж. А. Агішаў, «Беларусьфільм», 1972), «Мы – хлопцы живучие» (рэж. У. Станкевіч, Беларускае тэлебачанне, 1974), «Операция «Ансамбль» (Беларускае тэлебачанне, 1975), «У Синей бухты» (Беларускае тэлебачанне, 1976), «Судьба барабанщика» (рэж. А. Агішаў, Адэская кінастудыя, 1976), «По секрету всему свету» (рэж. І. Дабралюбаў, «Беларусьфільм», 1976), «Три весёлые смены» (рэж. В. Пазнякоў, «Беларусьфільм», 1977), «Рядом с комиссаром» («Беларусьфільм», 1978), «Петькина авантюра» (Беларускае тэлебачанне, 1978), «Алые погоны» (рэж. С. Гойда, кінастудыя імя А. Даўжэнкі, 1980), «Деревенская история» (рэж. В. Канеўскі, «Ленфильм», 1981), «Сад» (рэж. В. Чацверыкоў, «Беларусьфільм», 1984), «Климко» (рэж. Н. Вінграноўскі, кінастудыя імя А. Даўжэнкі, 1984). «Хотите – любите, хотите – нет» (рэж. У. Колас, «Беларусьфільм», 1986), «Приключения Киловаттика» («Беларусьфільм», 1984), «Призывники» (рэж. Ю. Хашчавацкі, Беларускае тэлебачанне, 1986), «Нонсенс» (рэж. У. Забэла, Беларускае тэлебачанне, 1987), «Начало счастья» («Беларусьфільм», 1988), «Наш бронепоезд» (рэж. М. Пташук, «Беларусьфільм», 1988), «Его батальон» (рэж. А. Карпаў, «Беларусьфільм», 1989), «Благородный разбойник Владимир Дубровский» (рэж. В. Нікіфараў, «Беларусьфільм», 1989), «Слоны» (Адэская кінастудыя, 1989), «Кислородный голод» (рэж. А. Дончык, «Kobza», Канада, 1992).
**Кантакт:** www.posekretu.ru; posekretu@mail.ru; +7 (916) 571-27-98.
11.11.06//Д.П., фота М. Маругі.

**СТАРПОВІЧ АДАМ (Старпович Адам, Starpovich Adam)** – дыджэй, рэдактар, прадзюсэр.
Нарадзіўся 25.07.1972 у Мінску. Сапраўднае імя – Aleh Stasevich.
У 1997 скончыў МДМІ па спецыяльнасці лекавая справа. У 1996–97 – рэдактар аўтарскіх праграм і вядучы на радыё «101,2», ад 1998 і да цяперашняга часу – рэдактар аўтарскіх праграм, вядучы музычных праграм радыё «РОКС-М» («Основной инстинкт», «Fashion Zone»). Ад 2001 і да сёння – выканаўчы прадзюсэр выдавецтва «MSH Records & Publishing», ад 2003 – рэдактар тэлепраграмы «Видимо-Невидимо». Старшыня праўлення беларускага фан-клубу групы «Depeche Mode» «Minsk Devotees». Адзін з ініцыятараў падрыхтоўкі, выдання і прамоцыі альбому «Personal Depeche» («MSH Records», 2002), «Анонимка» («West



Records», 2006), сінглу «Enjoy The Silence» (група *«Крама»* – «MSH Records», 2003).
**Фестывалі:** прадзюсэр фестывалю «Электромантика».
**Узнагароды:** «Рок-карона 2003» у намінацыі «Прадзюсэр году».
**Іншая інфармацыя:** працуе па асноўнай прафесіі.
**Кантакт:** www.depechemode.by; adam@depechemode.by
05.04.07//Д.П.

**СТАРЫКАЎ ГЕНАДЗЬ (Стариков Геннадий, Starikov Genadi)** – гітарыст, кампазітар, менеджэр, педагог.
Нарадзіўся 19.11.1950 у Мінску. Вучыўся ў БПІ. У 1984 скончыў ММВ па класах класічнай гітары ў В. Белышава і А. Кошалева і дырыжавання ў Б. Мацкевіча і Б. Пінчука. Выступаць у складзе мінскіх біт-груп пачаў у сярэдзіне 60-х, граючы на танпляцоўках. Ад 1967 да 1968 – удзельнік біт-групы «2+2», пазней супрацоўнічаў з групай *«Алгоритмы»*. На працягу 1971–74 выступаў у складзе мінскіх груп «Чародеи», «Факиры», «Чары», два гады працаваў як музыка АМА. У 1978 быў запрошаны ў склад ансамбля *«Верасы»*, ад 1982 да 1983 – музыка ансамбля *«Тоніка»*. З 1987 да 1990 – гітарыст аркестру Мінскага цырку. У 1995 заснаваў блюз-рокавы «Стар-клуб» – нефармальнае аб'яднанне музыкаў і аматараў блюзу. У 1996 стаў ініцыятарам правядзення традыцыйных фестываляў «Блюз жыве ў Мінску». Выступае з канцэртамі, піша інструментальную, гітарную, аркестравую музыку і песні. Сярод найбольш вядомых твораў «Славянская сюита»,



«Чарнобыльскі набат», песні «Город мой», «Соловушка», інструментальныя п'есы «Мечта», «My Beautiful Lady», «Гарсія Лорка», цыкл блюзаў «Табліца Мендзялеева» («Залаты блюз», «Плацінавы блюз» і г.д.). Выкладае гітару ў Цэнтры рэабілітацыі і сацыяльнай адаптацыі інвалідаў.

**Гастролі:** у складзе «Алгоритмов» – па СССР; у складзе «Верасоў» – па СССР, ГДР.

**Фестывалі:** у складзе «2+2» – І рэспубліканскі фестываль біт-музыкі (1968); у складзе «Верасоў» – шматлікія ўсесаюзныя і міжнародныя фестывалі; у складзе зборных калектываў «Блюз жыве ў Мінску».

**Узнагароды:** у складзе «Верасоў» – лаўрэат прэміі ЛКСМБ.

**Дыскаграфія:** у складзе «Верасоў»; сольна – шэраг дэма-запісаў, у тым ліку сінгл.

**Кантакт:** +375 (17) 295-92-96.

28.01.06//Д.П.

**«СТАРЫ ОЛЬСА»** – калектыў з Мінску. Выконвае свецкую, папулярную побытавую музыку сярэдніх вякоў, а таксама аўтарскія стылізаваныя творы.

Калектыў склаўся ў Гомелі ў 1999 з ініцыятывы Зміцера Сасноўскага – дуда, ліра, гуслі, мандаліна, варган, перкусія, вакал. Апрача яго, у склад калектыву ўвайшлі Кацярына Радзівілава – блок-флейта, флейта, свірэль (→ 2006), Ілля Кубліцкі – лютня, варган, Аляксандр Чумакоў – дуда, ліра, мандаліна, гуслі, кантэле, гудок, перкусія, вакал, Андрэй Апановіч – ударныя, варган, вакал.

**Гастролі:** канцэрты ў Вільні, Вроцлаве, Цэсісе, Судаку (усё – 2004), серыя канцэртаў у Сардыніі (Італія, 2005), Швецыя, Літва, Польшча (2005).

**Фестывалі:** фестываль вікінгаў у Воліне (Польшча, 2003, 2004), фестываль старадаўняй музыкі ў Мальбарку (Польшча, 2003), «Белы замак» (Мінск, 2000, 2003), «Музыка замкаў і ваколіцаў» (2003), «Старадаўні Нясвіж» (2003), «Наваградскі замак» (2000, 2002, 2003), «Заслаўскі набат» (2002), «Тоже битва» (Масква, 2004), «Рынкавая плошча» (Талін, 2004), «Меч Луцкага замку» (Украіна, 2004), «Хайтабу» (Гамбург, Нямеччына, 2004), «Easy Music» (Швецыя, 2005).

**Узнагароды:** «Рок-карона 2002» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць»; 1 месца цырымоніі «Мистерия звука 2005» у намінацыі «Рэлізы беларускіх фолк-выканаўцаў» (альбом «Сярэднявечная дыскатэка»).

**Дыскаграфія: альбомы** «Келіх кола» («Ковчег», 2000), «Вір» («Ковчег», 2001), «Verbum» («МГА Бацькаўшчына», 2002), «Шлях» (канцэртны, «БМAgroup», 2003), «Ладьдзя



роспачы» (аўдыёспектакль, «БМАgroup», 2004), 2CD «Скарбы ліцьвінаў. Сярэднявечча/Рэнесанс» («БМАgroup», 2004), «Сярэднявечная дыскатэка» («БМАgroup», 2005), «Гераічны эпас» («БМАgroup», 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «У карчме» (рэж. Зм. Сасноўскі, 2003), «Saltarello» (рэж. Зм. Сасноўскі, 2005).
**Кантакт:** staryolsa.com; zsasnouski@tut.by; +375 (17) 289-31-94.
16.04.06//Д.П., фота Д.П.

**«СТАЯ»** – мінская група, гісторыя якой узыходзіць да 1996. Менавіта тады пазнаёміліся двое яе цяперашніх удзельнікаў – Сяргей «Маркус» Адзінец (бас-гітара) і Юрый Хомчык (сола-гітара), якія спачатку ініцыявалі стварэнне групы «Sentinel», што выконвала трэш-метал (дэма «Bound Of Evolution»). У 2000 група пачынае рэпетыцыі ў адным памяшканні з групай «Аризона», і ў красавіку 2003 С. Адзінец разам з гітарыстам Віктарам Новакам і вакалістам Канстанцінам Дударавым утвараюць групу «Стая», запрасіўшы на месца барабаншчыка Паўла Ярмочанку (← «Vir», «Stod»). Дэбютны выступ групы адбыўся 16 траўня 2003 у Мінску ў адным канцэрце з групай «Король и Шут», пасля чаго да калектыву далучаецца Ю. Хомчык. У канцы 2006 выступалі наступным складам: К. Дудараў, С. Адзінец, Ю. Хомчык – гітара, Сяргей Шыдлоўскі – барабаны.
**Фестывалі:** «Рок за бобров» (Бабруйск, 2007), «Red Alert Open Air» (Еўпаторыя, 2007).
**Гастролі:** канцэрты ў Мінску, Віцебску.
**Дыскаграфія: альбом** CD «Страна льдов» («Фоно», Расея, 2005).
**Кантакт:** www.staya.com; staya_band@mail.ru; markus-bass@mail.ru
11.06.07//Д.П.

**«СТОЛИЦА»** – мінская група, якая выступае пераважна у стылі фолк-року, але пры гэтым выконвае творы класічнага рокавагу стылю і інструментальныя кампазіцыі, заснаваныя на джазавых тэмах.

Утварылася ў 1996 з ініцыятывы гітарыста і аранжавальніка *Ігара Волкава*. Апрача яго, у складзе калектыву ў 2004 выступалі Аляксей Корсунаў – бас-гітара, Андрэй Высотскі – барабаны, Андрэй Закаблук – гітара, Алег Сарычаў – клавішныя, Вольга Высотская – клавішныя, Вікторыя Волкава і Алена Гейман – бэк-вакал. Калектыў, не змяняючы складу цягам многіх гадоў, выступаў у шэрагу канцэртных праграм («На скрыжаваннях Еўропы»), на радыё («Музычны рынг»), удзельнічаў у фестывалях.

**Гастролі:** Расея, Беларусь, Польшча, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Швецыя.

**Фестывалі:** «Грифомания» (Мінск, 2000, 2003).

**Узнагароды:** прыз глядацкіх сімпатый на «Грифомании 2001» для Ігара Волкава; пераможца фестывалю «Грифомания 2002».

**Дыскаграфія: альбомы** «Гарэла сосна» (дэма, 2000), «Смотрите в небо» (аўт. выд., 2000), «Караван» (аўт. выд., 2002).

**Кантакт:** white_wolf@mail.ru; +375 (17) 259-46-07, (29) 646-77-05.

20.11.04//Д.П.

**«СТУДИЯ»** – інструментальная група з Баранавічаў.

Была створана ў пачатку 1987 з ініцыятывы кампазітара Фёдара Жыляка з выпускнікоў МІКу. Аснову рэпертуару складалі пераважна аўтарскія кампазіцыі, вытрыманыя ў стылі джаз-року. Група запісвалася на рэспубліканскім тэлебачанні, стала лаўрэатам абласнога фестывалю эстраднай музыкі «Ритмы границы 1987». На рэспубліканскім фестывалі папулярнай музыкі «Наваполацк 1988» была адзначана спецыяльным прызам журы за лепшае аранжаванне. У 1989 у калектыве выступалі Ф. Жыляк – гітара, В. Банковіч – бас-гітара, А. Нагула – клавішныя, С. Крамянчук – саксафон, В. Пашкевіч – гукааператар.

**Фестывалі:** «Наваполацк 1988», І Рэспубліканскі фестываль выканаўцаў джазавай музыкі (Віцебск, 1989).

05.03.06//Д.П.

**«СУЗОР'Е»** – мінская група.

Утварылася ў верасні 1977 як штатны калектыў аднайменнай камсамольска-моладзевай кавярні Мінску, выступаючы складам: *Андрэй Казлоўскі* – вакал, гітара, *Валянцін Пучынскі* – вакал, бас-гітара, *Андрэй Філатаў* – барабаны, Ігар Майскі – клавішныя, *Уладзімір Пучынскі* – гукарэжысёр. Па першым часе група выконвала пераважна вядомыя рокавыя і блюзавыя творы замежных аўтараў, абраўшы за галоўны напрамак выкананне музыкі ў стылях прагрэсіў- і хард-року. Ад 1981 група – штатны калектыў БДФ, у якой працавала да 1991, засноўваючы рэпертуар пераважна на расейскамоўных і беларускамоўных песнях аўтарства В. Пучынскага, а таксама песнях *Ігара Лучанка*, *Уладзіміра Будніка*. У выніку выканання Пастановы ЦК КПСС у 1983 калектыў быў пазбаўлены назвы і расфармаваны. Аднак хутка аднавіў дзейнасць як

інструментальны ансамбль п/к А. Несцяровіча. Пад назвай «Сузор'е» пачалі зноў выступаць з 1986. Музыкі калектыву першымі ўвасобілі на беларускай папулярнай сцэне інструментальныя фрагменты з «Полацкага сшытку», напісалі музыку на фрагменты паэмы «Песня пра зубра» М. Гусоўскага. «Сузор'е» было першай рок-групай у Беларусі, якая набыла статус прафесійнай, запісала першы ў беларускай рок-музыцы магнітаальбом, дала звыш 1500 канцэртаў у розных гарадах СССР.

У сярэдзіне 80-х выступала як акампанавальны калектыў С. Кульпы, а таксама *Надзеі Мікуліч*, узбагаціўшы сваё гучанне народнымі інструментамі. У розныя гады ў складзе групы выступалі *Вольга Аліпава*, Вольга Хіжанкова, *Павел Харэвіч,* Аляксандр Брынцаў, Нэлі Дзянісава (*«Zindan»* → 1991) – вакал, *Аляксей Казлоўскі* – бас-гітара, вакал (← 1982 → 1991, «Zindan»), *Аляксандр Несцяровіч* – клавішныя (← 1983), Васіль Нікалаеня – клавішныя, *Аляксандр Растопчын* – гітара (←1982 ← 1984 *«Тоніка»*, *«Песняры»*). Група запісала музыку для спектаклю «Транслегатор» (Беларускае радыё, 1980), музычнага спектаклю «Клеменс» (Дзяржаўны тэатр імя Якуба Коласа, 1981). Спыніла існаванне ў 1991.

У канцы 2001 з ініцыятывы прадзюсэра У. Пучынскага група была часова аднаўлена і дала некалькі клубных канцэртаў у Мінску, намінальна існуе і ў наш час – А. Казлоўскі і А. Несцяровіч з удзелам запрошаных музыкаў. Найбольш вядомыя песні «Старый мост», «Фортуна», «Весенний день», «Капитан», «Сентябрьская река», «Песня пра зубра», «На шляху дзікіх гусей».

**Гастролі:** СССР, Польшча.

**Фестывалі:** міжнародны фестываль палітычнай песні «Рыга 1978», Усесаюзны конкурс эстраднай песні «Ялта 1981» (дыплом); Другі ўсесаюзны фестываль польскай песні ў Віцебску (1990).

**Узнагароды:** лаўрэат 1 прэміі Міжнароднага фестывалю палітычнай песні «Рыга 1978», «Рок-карона 2001: За ўнёсак у развіццё беларускай рок-музыкі».

**Дыскаграфія:** EP «Старый мост» («Мелодия», 1983), магнітаальбом «Рок-терапия» (1984, самвыдат), LP «Сентябрьская река» («Мелодия», 1987), CD «Кафе», «Рок-терапия», «Нелли + «Сузор'е» (аўт. выд., 2002), «Песня пра зубра» (аўт. выд., 2007); **трэкі** «Let Him Go» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Песня о Родине» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987).

**Кіно, відэа: кліпы** «Я вернусь» (БТ, 1981), «Капитан»; музыка да мультфільму «Про кота Васю и катавасию» (муз. *Эдуарда Ханка*, «Беларусьфільм», 1982).

**Кантакт:** +375 (29) 637-34-72 (А. Філатаў); (29) 651-62-71; rii8@hotmail.com (У. Пучынскі).

19.09.07//Д.П.

**СУЛІМАВА ТАЦЦЯНА (Сулимова Татьяна, Soulimova Tatiana)** – дыджэй, журналіст, тэатральны рэжысёр.

Нарадзілася 11.06.1975 у Мінску.

У 1997 скончыла Беларускую акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці рэжысёр драматычнага тэатру. Ад 1 траўня 1997 працуе вядучай музычных праграм радыё «РОКС-М».

У 2001–02 выступала як вядучая тэлевізійных праграм «Вечерний экспресс» (тэлекампанія «ФИТ»), «Будни» (БТ-1), «Добрай раніцы, Беларусь» (БТ-1). Ад 2000 – аўтар суботняй калонкі ў газеце «Советская Белоруссия». У 1997 паставіла п'есу «Сапог и его носок» Ахтернбуша ў тэатры «Вольная сцэна».

**Іншая інфармацыя:** дырэктар «Рэкламнага агенцтва Таццяны Сулімавай» (ад лютага 2002).

**Кантакт:** sulimovna@mail.ru, sulimovna@rambler.ru

08.01.04//Д.П.

**СУПРАНОВІЧ ВІТАЛЬ (Супранович Виталий, Supranovich Vitali)** – прадзюсэр, выдавец.

Нарадзіўся 14.08.1979 у Мінску. У 1997 скончыў Мінскую вышэйшую тэхнічную вучэльню, у 2003 – БДУК па спецыяльнасці менеджмэнт са-



цыя-культурнай сферы. Абараніў дыплом па тэме «Гастрольна-канцэртная дзейнасць у сферы беларускай рок-музыкі». У 1996 заснаваў й да сённяшняга дня ўзначальвае Беларускую музычную альтэрнатыву (БМА), якая займаецца выданнем музыкі беларускіх выканаўцаў (гл. дадатак) і арганізацыяй канцэртаў і фестываляў.

**Кантакт:** www.bma.home.by; wital@tut.by +375 (29) 649-08-88.

17.07.04//Д.П.

**СУРУС РЫГОР (Сурус Григорий, Surus Ryhor)** – кампазітар.

Нарадзіўся 22.07.1942 ва Улан-Удэ, Бурація. Скончыў БДК у 1969 па класе кампазіцыі А. Багатырова. Ад 1969 да 1972 выкладаў у музычнай школе пры БДК. Працуе ў розных жанрах. З-пад ягонага пяра выйшлі народная музычная камедыя «Несцерка» (паст. у 1979), гераічная музычная камедыя «Судны час» (паст. ў 1984). Аўтар п'ес для эстраднага аркестру «Інтэрмецца» (1969), «Восеньскі накцюрн» (1977), «Лірычны экспромт» (1984), «З добрай раніцай», «Успамін» (1985), «Аднойчы вечарам» (1986); апрацовак беларускіх народных песень, рамансаў, эстрадных песень.

**Узнагароды:** лаўрэат Усесаюзнага конкурсу «Па месцах баявога паходу» (1980).

Паводле Белэнцыклапедыі.

**СУХАРАЎ АЛЯКСАНДР (Сухарев Александр, Sukharau Aliaksandr)** – кампазітар, аўтар тэкстаў, гітарыст, вакаліст.

Нарадзіўся 27.07.1970 у Кізелі Пермскай вобл., Расея. У 1994 скончыў БДУК па класе харавога дырыжавання. У канцы 1998 стаў ініцыятарам стварэння групы *«Экивоки»*, рэпертуар якой быў заснаваны на аўтарскіх расейскамоўных песнях лідэра. У 2000, 2001 працуе за мяжой. У 2002 аднаўляецца дзейнасць групы «Экивоки», аднак з 2003

А. Сухараў пачынае выступаць самастойна. Аўтар песень для шэрагу выканаўцаў папулярнага жанру. Найбольш вядомыя песні «Шапка ондатровая», «Нравится, не нравится», «Около ноля», «Моя собака», «Фонари», «Депрессия» (разам з *Аляксандрам Памідоравым*).
**Гастролі:** Францыя (2006).
**Фестывалі:** «Славянский базар» (1999, 2003, 2004).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Нравится, не нравится» (1999), «Выборное» (2003), «Меня зовут Экивоки» («West Records», 2006).
**Кіно, відэа: кліпы** «Нравится, не нравится» (МТРК «Мир», 1999), «Зеркало» (рэж. *Анатоль Вечар*, 1999), «Шапка ондатровая» (рэж. А. Вечар, 1999), «Моя собака» (рэж. З. Шчарбакоў, 2003), «Семья».
**Кантакт:** www.ekivoki.tut.by; ekivoki@tut.by
03.02.07//Д.П.

**СЫЦЯНКА ЭДУАРД (Сытянко Эдуард, Sytianko Edward)** – музыка, педагог, менеджэр.
Нарадзіўся 25.06.1958 у Бабруйску. У 1969–74 вучыўся ў ДМШ імя Я. Ціноцкага ў Бабруйску па класе флейты С. Фарберава, у 1974–76 у ССМШ пры БДК, у 1976–81 – студэнт БДК па класе флейты В. Харытонава. Прафесійна пачаў выступаць на сцэне ва ўзросце 12 гадоў у духавым аркестры Бабруйскага гарнізону (кір. А. Клешчанка). У 1975 стаў удзельнікам ВІА філалагічнага факультэту БДУ (кір. В. Шувагін), які пазней атрымаў назву *«Университет»*. Падчас вучобы ў БДК быў салістам камернага аркестру кансерваторыі, на апошнім курсе выступаў у складзе сімфанічнага аркестру Вялікага тэатру оперы і балету Беларусі. Ад 1981 – выкладчык школы мастацтваў у Гомелі, ад 1986 – музычнай вучэльні імя Н. Сакалоўскага. Адначасова выступаў як гітарыст і піяніст ВІА ДК Навабеліцкага р-ну Гомелю. У 1986 арганізаваў ансамбль старадаўняй музыкі «Сірынкс», у складзе якога выступаў і гастраляваў па Беларусі і па-за яе межамі да 1991, адначасова кіраваў ВІА «Радуга желаний», у якім граў на гітары. Заснавальнік Акадэміі старадаўняй музыкі пры гомельскім Доме настаўніка, выступаў як флейтыст у дуэце з гітарыстам *Ігарам Шошыным*. Ад 1991 – саліст сімфанічнага аркестру філармоніі Еленя Гура (Польшча), выкладчык па класе флейты музычных школы і вучэльні. Ад 1999 – заснавальнік і ўладальнік артыстычнага агенцтва «Bagatela».
**Гастролі:** у складзе розных калектываў – Нямеччына, Швейцарыя, Іспанія, Данія, Аўстрыя, Чэхія, Фінляндыя.
**Кантакт:** www.mad-zone; dk@bagatela.htm
06.09.03//Д.П.

**«СЬЦЯНА»** – брэсцкая група, у музыцы спалучае элементы панк-року, авангарду, джаз-року, хард-кору, фолку.
Утварылася 1 жніўня 1999 складам: Аляксей Кузняцоў – барабаны, Андрэй Клімус – бас-гітара, Павел Прохараў – гітара, вакал. У канцы 1999 да калектыву далучылася Яўгенія «Пчолка» Хіло (гітара, вакал → 2005), у 2000 – Ілля Дмуха (альт-саксафон), у 2001 – Аляксандр Нікалайчык (тэнар-саксафон). На пачатку рэпертуар калектыву быў заснаваны

на аўтарскіх расейскамоўных песнях, цяпер песні выконваюцца пабеларуску, найбольш вядомыя з якіх «Я еду», «Вясна.by».
**Гастролі:** канцэрт у клубе «Nemo» (Варшава, 2003).
**Фестывалі:** «Wielka orkiestra swiatecznej pomocy» (Беласток, студзень 2001), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2002, 2003, 2005, 2007), «Union of Rock» (Венгажэва, Польшча, 2006).
**Узнагароды:** прыз радыё «Polonia» на фестывалі «Басовішча 2003».
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Рыфмы лёсаў» («Limas», Мінск, 2001), CD «Basowiszcza 2005. The Best» («Сакавік», Брэст, 2005); **трэкі** «Кумба» (у зборніку «Я в Бресте» – «Art Classic Company», 2002), «Амінь» (у зборніку «Я в Бресте 2» – «Art Classic Company», 2003), «Я еду» (у зборніку «Віза N.R.M.» – «БМAgroup», 2003), «Вясна.by» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004, у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», Брэст, 2006).
**Кіно, відэа: кліп** «Можа быць» (рэж. А. Канцэвіч, І. Сівіцкі, 2005).
**Кантакт:** sciana@tut.by; +375 (29) 727-44-83 (Андрэй), (29) 725-29-90 (Аляксей).
21.10.06//Г.Ш.

**«СЯБРЫ»** – вакальна-інструментальны ансамбль з Мінску. Працуе ў стылі традыцыйнай папулярнай песні на беларускай і расейскай мовах. Быў створаны пры Гомельскай абласной філармоніі ў 1974 на базе канцэртнай брыгады *«Песні над Сожам»*. Па першым часе ансамбль выконваў народныя песні, песні беларускіх кампазітараў і творы з рэпертуару ансамбля *«Песняры»*. Ад 1990 – пры БДФ, ад 1992 – творчая адзінка ТА «Студыя «Сябры». У першым складзе калектыву выступалі *Анатоль Ярмоленка* – вакал, *Мікалай Сацура* – клавішныя, вакал, Генадзь Балабанаў – барабаны, Віктар Клімовіч – флейта, саксафон, Валерый Прыгожаў – гітара (→ 1974), Анатоль Шчытаў – бас-гітара, вакал, Віталь Чырвоны – вакал, Віктар Ананчанка – клавішныя, вакал, Аляксандр Аўдзевіч – трамбон. У сакавіку 1976 на чале калектыву стаў *Валянцін Бадзьяраў* – мастацкі кіраўнік, скрыпка, вакал, гітара (→ 1981), у розныя гады ў ансамблі выступалі Мікалай Падгорнаў – вакал, Аляксандр Газізаў – гітара (← 1980, → *«Rouble Zone»*, *«Крама»*), *Валерый Разанаў* – бас-гітара, вакал (← 1982), *Юрый Багаткевіч* – вакал, гітара (← 1985 → «Ражство»), Ю. Хілавец – скрыпка, гітара, вакал (← 1979), *Дзмітрый Смольскі* – вакал (← 1991), У. Ухцінскі – гітара, вакал (← 1991), А. Цераховіч – барабаны (← 1991, 2003 → *«Палац», БДА «Песняры»*), Ф. Жыляк – гітара, вакал (← 1980). На пачатку 2005 «Сябры» выступалі наступным складам: *Алеся* – вакал, Сяргей Герасімаў – гітара, вакал, М. Сацура, А. Ярмоленка, Артур Цамая – барабаны (← 2005), Уладзімір Чыж – гітара, клавішныя, вакал, Святаслаў Ярмоленка – бас-гітара, клавішныя (← 1991). Цягам гадоў ансамбль падрыхтаваў некалькі канцэртных праграм, сярод якіх «Шлях да Беларусі», «Анатоль», «Ёсць лёс у мяне», «Я з вамі не развітваўся ніколі», «Перажывём», «Нашы песні – наша жыццё». Пры ансамблі працуюць моладзевая студыя «Сябры», дзіцячы ансамбль «Буслік» (ад 1993, музычны кіраўнік *Уладзімір Сарокін*).

Найбольш вядомыя песні «Глухариная заря», «Алеся», «Лягу-прылягу», «Полька беларуская», «На полатях», «Ваявода».
**Гастролі:** Чэхаславакія (1977).
**Фестывалі:** «Огни магистрали» (1979).
**Узнагароды:** лаўрэат III прэміі Усесаюзнага конкурсу савецкай песні (1977), II прэміі тэлеконкурсу «С песней по жизни» (1979), прэміі ЛКСМБ (1984).
**Дыскаграфія: альбомы** LP «Всем на планете» («Мелодия», 1978), «Ты – одна любовь» («Мелодия», 1980), «Живая вода» («Мелодия», 1982), EP «Давнее» («Мелодия», 1983), «Шумите, берёзы» («Мелодия», 1984), «Судьбе спасибо» («Мелодия», 1985), «Есть на свете ты» («Мелодия», 1986); CD «Алеся. Песни Олега Иванова» (1995), «The Best» (1995), «От Алеси до Алеси» (2000), «Алеся» (2000), «Оглянись» (разам з В. Разанавым, 2001), «Сябры» (серыя «Звезды эстрады», 2001), «Ваши самые любимые песни» (2001), «Наши песни» («Союз», 2001), «Имена на все времена» («Союз», 2002), «Живи и здравствуй» («Союз», 2003), «Grand Collection» («Союз», 2004); MC «Гулять так гулять» (1995), «Алеся» (1995), «Анатоль-1», «Анатоль-2» (1996), «Я з вамі не развітваўся ніколі» (1997), «Соперница» (разам з Алесяй, 1997), «С Новым годом, строители Минска!» (1998), «Николай Сацура» (1998), «Владимир Сорокин» (1998), «Сябры» (2001), «Сябры» (2002); **трэкі** «Постоялый двор» (у зборніку «Русская тридцатка 9» – «Квадро-диск», 2003), «Белы бусел», «Рассвет» (у зборніку «Песня о Родине» – Мелодия», 1987), «Лазня» (муз. *Леаніда Захлеўнага*, сл. *Аляксандра Лягчылава*, у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Рекордс», 1999); міньёны «Давнее» («Мелодия», 1983), «Белы бусел», «Рассвет» (у зборніку «Песня о Родине» – «Мелодия», 1987), «Остановись, мгновение!» (у аднайменным EP С. Томіна – «Мелодия», 1982).
**Кіно, відэа:** фільм «Ты – одна любовь» (рэж. *Уладзімір Арлоў*, 1979).
**Кантакт:** www.syabry.com; info@syabry.com; +375 (17) 211-33-42.
8.03.05//Д.П.

**«SARCASTIC GREEN»** – група з Мінску, якая трымалася стылю хард-року.

Утварылася ў 1994, у першапачатковым складзе выступалі Сяргей «Болт» Болбат – лідэр, гітара, вакал, Аляксандр «Ганс» Быкаў – барабаны (← *«Ulis»*, *«Новае неба»*, *«Крамбамбуля»*), Глеб «Жалезны» Сівалобчык – гітара, Пётр Латушкін – вакал. У канцы 90-х група прыпыніла існаванне, у 2006 Сяргей Болбат сабраў пад гэтай назвай новы беларускамоўны калектыў, запрасіўшы Артура «Мартына» Мартынава – барабаны (← «Euphoria»), Максіма Пілецкага – гітара, Юрася Туміловіча – бас-гітара.
**Дыскаграфія: альбомы** MC «Stupid Fools Must Die» (студыя «Рекорд», 1996), «Hey People Don't Fuck My Brain» (1997), «Natural Born Killers» (1998); **трэкі:** «Маці Прырода» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМAgroup», 2002).
**Кіно, відэа: кліп** «I Want Live Tomorrow» (рэж. *Тамара Лісіцкая*).
15.07.06//Д.П.

**«SERDCE»** – група з Гомелю. Утварылася ў 1997 і трымаецца стылю тэхна-дэз музыкі.

Песні выконваюцца як на расейскай, так і на ангельскай мовах. У 2006 калектыў выступаў наступным складам: Мікалай Гарошка – гітара, вакал, тэксты, Андрэй Дыбаль – барабаны, Аляксандр Крапіўніцкі – гітары (← «Sufferer»), Аляксандр Харэвіч – бас-гітара (← «Sufferer»).

**Гастролі:** Расея (Масква, 2006).

**Дыскаграфія: альбомы** «Аритмия» («Art Classic Company»), «Cyberly» («Союз»/«Metal Agen», 2006).

**Кантакт:** www.serdce.net

15.07.06//Д.П.



**«SEVEN B»** – блюз-рокавая група з Польшчы.

Утварылася ў Гродне на пачатку 1991 з ініцыятывы Генадзя «Генэка» Лоскі – вакал і Андрэя «Макара» Макарэвіча – гітара. У першым складзе калектыву разам з імі выступалі Сяргей Ажаганец – клавішныя, Дзмітрый Розін – барабаны, Ігар Глушэня – бас-гітара. У аснову стылю групы былі пакладзены блюз-рок з элементамі музыкі фанк, аўтарскія песні і кавер-версіі песень з рэпертуару такіх груп, як «Lynyrd Skynyrd», «CCR», «Free», «Led Zeppelin», «Rolling Stones». Летам 1992 музыкі вырашылі застацца ў Польшчы, дзе распачалі кар'еру ў Беластоку і ваколіцах. Аснову групы складалі Г. Лоска і А. Макарэвіч, у рытм-секцыі выступалі запрошаныя польскія музыкі. У 1997 да групы далучыўся гродзенскі барабаншчык Валерый Новік, у 1998– 2003 бас-гітарыстам групы быў Томаш Дзень, якога ў 2005 змяніў Томаш Сетлак. У 2001 у групу прыйшоў другі гітарыст Марыўш Кухта, замест В. Новіка пачаў граць вядомы польскі барабаншчык Грэгаж Шнайдэр. У лютым 2006 групу пакінуў Г. Лоска.

**Фестывалі:** «Рок-форум» (Гродна, 1991), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1992), шэраг фестываляў блюзавай музыкі ў Польшчы.

**Гастролі:** краіны Еўропы, тур па Нямеччыне (2006).

**Дыскаграфія: альбомы** дэма «Over Doze» (1992), «Acoustic» (1998), «Make Up You Mind» (2003), «Rocktales» (2004).

**Кантакт:** www.sevenb.art.pl; Павел Арцішэўскі +48 604-429-233; manager@sevenb.art.pl; sevenb@sevenb.art.pl

08.11.06//Д.П., фота Д.П.

**«SLANG»** – мінская група.

Утварылася ў сярэдзіне снежня 2001 і першапачаткова выступала наступным складам: *Аляксандр Насковіч –*

гітара, бэк-вакал (← *«Flat»*), Дзмітрый Станкевіч – клавішныя, Андрэй Шабронаў – барабаны, Павел Ткачоў – бас-гітара, Арцём Крычэўскі – гітара (← «Spoonfull»). Стыль – класічны хард-рок і хард-блюз. У верасні 2002 склад групы дапоўніў Сяргей Фядоранка – вакал, у кастрычніку 2004 на месца П. Ткачова прыйшоў Руслан Праўда (← *«Крама»*, часова). У кастрычніку 2004 далучыўся басгітарыст Ігар Кавалёў (← *«Акцент»*). Рэпертуар заснаваны на аўтарскіх, пераважна А. Насковіча, расейскамоўных песнях і інструментальных кампазіцыях. У кастрычніку 2005 калектыў пакінулі А. Насковіч (→ *«40+–»*) і Дз. Станкевіч, на іх месца былі запрошаны Віктар Навумік (← «Акцент», адначасова група *Алены Свірыдавай*, на аснове спецыяльна запрошанага музыкі), Уладзімір Гаўрыленка (← «Крама») і Алег Белкін – гітара. Найбольш папулярныя песні «Три кота», «Другая весна», «Блюз реки», «Я буду ждать».

**Гастролі:** Масква (2005).

**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (2003).

**Дыскаграфія: альбом** CD «Другая дорога» (аўт. выд., 2004).



**Кантакт:** www.slang.by; alanslang@tut.by; slang@home.by; +375 (29) 773-77-75 (С. Фядоранка).

14.11.05//Д.П., фота Д.П.

**«SONCEVOROT»** – група, ўтварылася ў Барысаве ў 2000 і трымаецца стылю дэз/дум-метал.
Першы склад калектыву працаваў у стылі хард-року: Аляксандр Бузун – вакал, Павел Родзін – гітара, Кірыла Дзёмін – гітара, вакал, Аляксей Быкаў – флейта, Аляксандра Грахоўская – вакал, Антон Казакоў – барабаны (← «АнRил»), Георгій Сардалішвілі – бас-гітара. Склад 2005: А. Бузун, П. Родзін, К. Дзёмін, Алеся Рапека – флейта, Ала Жукава – вакал, Антон Казакоў – барабаны, Г. Сардалішвілі.

**Гастролі:** канцэрты па Беларусі.

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2004, 2005), «Стародавні Меджібіж» (Украіна, 2004).

**Узнагароды:** прыз мэрыі Гродка на фестывалі «Басовішча 2004».

**Дыскаграфія:** сінгл «Radzima» («Hazad prods», 2002); **трэк** у зборніку «Hard Life – Heavy Music II» – «БМAgroup», 2002.

**Кантакт:** www.sontsevorot.com; sontsevorot@tut.by; +375 (29) 702-28-54 (Павел), (29) 708-60-87 (Антон).

19.09.05//Д.П.

**«SPASENIE»** – група з Брэсту, якая паўстала ў жніўні 1989.
Выконвае музыку ў стылі пап-року хрысціянскага зместу на расейскай і англьскай мовах. Першапачатковы склад: Ігар Муха – лідэр, вакал, саксафон, Павел Шальпук – вакал,




скрыпка, бас-гітара, Пётр Семянюк – вакал, клавішныя, Таццяна Шальпук – вакал, клавішныя, Аляксандр Барысюк – гітара, Вадзім Семянюк – барабаны. Цягам гадоў склад калектыву практычна не змяніўся, з групай супрацоўнічае шэраг спецыяльна запрошаных музыкаў. Увосень 2006 група складалася з І. Мухі, П. Шальпука, П. Семянюка, Майкла Чобі – бас-гітара, Дзмітрыя Галадко – гітара, Віталя Калежынскага – барабаны.
**Гастролі:** Расея (1990, 2006, 2007), Паўднёвая Афрыка, ЗША, Нямеччына, Англія, Францыя, Украіна.
**Дыскаграфія: альбомы** «Мой Бог – скала» (1991), «Только ты» (1994), «Человек без зубила» (1997), «Бьют часы» (1998), «Exit» (1999), «А солнце за кормой» (2001), «Кардиограмма» (2003), «Crossing The Jordan» («Music Center C», 2004).
**Кіно, відэа: кліпы** «Расстояние» (рэж. С. Васілішын, 2003), «На метр от земли» (рэж. У. Зінкевіч, А. Бутар, 2004), «Плачет небо»/«The Word Was Spoken» (рэж. У. Зінкевіч, 2005).
**Кантакт:** www.spasenie.com; igor@spasenie.com; muhamedik@tut.by; +375 (29) 722-34-56.
05.11.06//А.Р.

**«SPLENETIC»** – мінская група.
**Дыскаграфія: альбом** МС «Synthetic» (аўт. выд., 2000); **трэк** «Мэнталітэт» (у зборніку «Hardcore манія: чаду!» – «БМAgroup», 2002).
**Кіно, відэа: кліп** «The Halt».
03.03.07//Д.П.

**«STOKES»** – мінская група, якая працуе ў стылі пап-року.

Утварылася ў 1996 у Наваполацку, праз пэўны час лідэр групы Аляксей «Стокс» Смалякоў перабраўся ў Мінск. Першапачаткова група засноўвала рэпертуар на ўласных песнях, якія выконваліся па-ангельску. Выдадзены ў Нямеччыне дэбютны ангельскамоўны альбом прадзюсаваў *Віктар Смольскі*. Ад 2000 група перайшла на выкананне аўтарскіх расейскамоўных песень. У 2005 дала некалькі канцэртаў у маскоўскіх клубах, выступіла ў праграме тэлеканалу «О2». Выступала ў сумесных канцэртах з групамі «Animals», «Gorky Park», «Би-2». У 2005 калектыў працаваў наступным складам: Аляк-



сей «Стокс» – гітара, вакал, Кірыла Сенін – бас-гітара, Юрый Вялюга – барабаны, Руслан Парфёнаў – клавішныя (← *«Мясцовы час»*). Найбольш вядомыя песні «Между Минском и Римом», «Еще один раз», «Под куполом небес».

**Гастролі:** канцэрты ў Нямеччыне, Польшчы, Расеі.

**Фестывалі:** «Рок за бобров» (Бабруйск, 2005, 2007).

**Узнагароды:** прыз у намінацыі «Лепшы дэбют» на «Рок-каранацыі 1996».

**Дыскаграфія: альбомы** CD «No Escape» (Нямеччына, 1999, перавыд. «Ковчег», 1999), «Под куполом небес» (канцэртны, «Глория Медиа», 2005); **трэкі** «Ружы цвет» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Под куполом небес» (у зборніку «Рок за бобров» – «West Records», 2005).

**Кіно, відэа: кліпы** «Ещё один раз» (рэж. А. Чацверыкоў, 2003), «Между Минском и Римом» (рэж. А. Чацверыкоў, 2004), «Я помню».

**Кантакт:** www.stokes.ru; the@stokes.ru

11.06.07//Д.П., фота Д.П.

**«STUDIO-7»** – мінская група, якая ўтварылася ў 1982 і праіснавала да 1984, калі на яе базе заснаваліся групы *«Бонда»* і *«Метро»*.

Калектыў выконваў пераважна ўласныя песні на беларускай і расейскай мовах, вытрыманыя ў стылі папулярнага року з дадаткам элементаў музыкі новай хвалі і панк-року. Выступала наступным складам: Вячаслаў Сцяпанаў – вакал, клавішныя (→ «Метро», 1984), Анатоль Дарожка – бас-гітара (→ «Метро», 1984), Сяржук Кныш – барабаны, *Іван Маркаў* – гітара, *Вячаслаў Корань* – гітара, *Ігар Варашкевіч* – гармоніка, вакал. Найбольш вядомыя песні «Время и личность», «Любовь твоя», «Бессмертие».

16.05.05//Д.П.

**«SVET BOOGIE BAND»** – мінская група. Выступае ў стылі бугі-вугі і чыкагскага блюзу.

Утварылася ў 2001, працуючы першапачаткова як дуэт *Святаслаў «Svet» Хадановіч* – Аляксей «Al» Шыловіч – гітары, вакал. У 2003 дуэт даў некалькі канцэртаў з удзелам вакаліста Валерыя Прахожага (Big Val). Пасля сыходу А. Шыловіча ў 2004 група прыняла цяперашнюю назву, выступаючы як квартэт: С. Хадановіч – фартэпіяна, гармоніка, вакал, Арцём Гаўрушын – контрабас, Арцём Крычэўскі – гітара («Spoonfull»), Аляксей Золатаў – барабаны. Пэўны час з групай супрацоўнічалі барабаншчыкі Сяргей Катляроў, Кірыла Шэвандо. Увосень 2006 у групу вярнуўся А. Шыловіч, разам з ім выступалі С. Хадановіч, А. Золатаў, Ціхан Золатаў – бас-гітара (← 2005), Дзмітрый Гаўрылік – гітара (← 2005). Увосень 2006 група перамагла ў беларускім адборачным туры міжнароднага конкурсу «The Global Battle of The Bands», заваяваўшы права паездкі на фінальны тур у Лондан. Канцэрты калектыву ўяўляюць з сябе энэргічнае шоў, у чым вялікая заслуга ягонага лідэра. У рэпертуары – класічныя творы ў стылях блюзу і бугі-вугі, а таксама аўтарскія п'есы С. Хадановіча.

**Гастролі:** Расея (2003–07), Польшча (2005).

**Фестывалі:** «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2003, з ўдзелам Біг Вэла), «Zaduszki bluesowe» (Беласток, Польшча, 2003), «Очаково-Блюз» (Масква, 2003), «Blues.RU» (Масква, 2004), «Blues v lese» (Ржэўніцэ, Чэхія, 2004), «Пустые холмы встречают весну» (Лужа Калужскай вобл., Расея, 2005, 2007).

**Узнагароды:** першае месца ў конкурсе міжнароднага фестывалю «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2003).

**Дыскаграфія: альбомы** «Live At JVL Art Club» (аўт. выд., 2004), «Happy With The Boogie» (аўт. выд., 2004), «Nothing But Love» («Maple Tree Studio», 2005), сінгл «Going 2 London» («Maple Tree Studio», красавік 2007).

**Кіно, відэа:** DVD «Live At JVL Art Club» (канцэрт у клубе JVL, Масква, «ЛюК Видео», 2005).

**Кантакт:** www.svetboogieband.com; contact@svetboogieband.com; +375 (29) 695-51-87 (Аляксандр).

15.05.07//Д.П.



# Т

**«ТАЙЛАНД»** – мінскі калектыў, які ўтварыўся ў 2005 з ініцыятывы Андрэя Дзяркова.

Рэпертуар групы заснаваны на аўтарскіх расейскамоўных песнях, найбольш вядомыя з якіх «Книга перемен», «Острова.net», «Как Такеши Китано».

**Дыскаграфія: альбом** CD «Tabu» (2006).

**Кіно, відэа: кліпы** «Кніга Перемен», «Табу», «Наверх… (но не были вечными)» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2006).

**Кантакт:** www.tay-land.ru

08.05.06//Д.П.

**ТАМЕЛА НАТАЛЛЯ (Тамело Наталья, Tamelo Natallia)** – спявачка, выканаўца папулярнага рэпертуару, аўтар музыкі і тэкстаў песень.

Нарадзілася 30.04.1973 у Калінінградзе, Расея, дзе скончыла музычную школу па класе фартэпіяна, выступала ў складзе дзіцячых харавых калектываў, брала ўдзел у конкурсах маладых піяністаў. У 1989 пераехала ў Мінск. У 1993 скончыла ММВ, аддзяленне харавога дырыжавання, у 1998 – БУК па спецыяльнасці эстрадны вакал. Ад 1993 – салістка *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, ад 2006 – майстар сцэны гэтага калектыву. З 2002 працуе з вакалістамі-пачаткоўцамі на базе Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі. Выступала вядучай праграмы на 1 Нацыянальным канале тэлебачання. Спявае на беларускай, расейскай, ангельскай мовах. Сярод найбольш вядомых песень «Дождись», «Далеко» (муз. і сл. *Леаніда Шырына*), «Не уходи», «Сердце, прости» (на ўласныя музыку і тэксты).

**Гастролі:** Украіна, Малдова, Латвія, Расея, туры па Беларусі.

**Фестывалі:** Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (неаднаразова), «Золотой шлягер» (Магілёў), «Золотой скиф» (Данецк, Украіна, 2000), міжнародны фестываль у Фівіцыяна (Італія, 1999), «Славянский базар» (неаднаразова).

**Узнагароды:** лаўрэат I прэміі Рэспубліканскага конкурсу дырыжораўстудэнтаў (1993), лаўрэат I прэміі конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Маладзечна 1994», лаўрэат III прэміі конкурсу на фестывалі «Золотой шлягер 1996» (Магілёў), лаўрэат III прэміі і прызу глядацкіх сімпатый на конкурсе фестывалю «Золотой скиф» (Данецк, Украіна, 2000).

**Дыскаграфія: альбом** CD «Дождись» («Проспект», 2004).

**Кіно, відэа: кліпы** «Дождись» (рэж. *Уладзімір Максімкаў*, 2004), «Прости» (рэж. У. Максімкаў, 2006).

**Кантакт:** +375 (29) 659-83-36.

05.11.06//Д.П.-А.Р.

**ТАНК МАКСІМ (Танк Максим, Tank Maxim)** – паэт, перакладчык, грамадскі дзеяч.

Сапраўднае імя Яўген Скурко. Нарадзіўся 04(17).09.1912 у в. Пількаўшчына Вілейскага павету Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл., памёр 07.08.1995, пахаваны на радзіме. Вучыўся ў Радашковіцкай беларускай гімназіі, адкуль быў выключаны ў 1929 за ўдзел у забастоўцы. Працягваў адукацыю ў Віленскай расейскай гімназіі. Першыя вершы ўбачылі свет у 1932. Актыўна супрацоўнічаў з нелегальным друкам, на пачатку 30–х быў на падпольнай рабоце, неаднойчы быў арыштаваны польскімі ўладамі. Падчас вайны працаваў у газеце «За Советскую Беларусь», у 1946–67 – галоўны рэдактар часопісу «Полымя», у 1967–90 – старшыня праўлення Саюзу пісьменнікаў Беларусі. Многія вершы паэта пакладзены на музыку, у тым ліку «Завушніцы» (муз. *Уладзіміра Мулявіна*, вык. *«Песняры»*), «На шляху дзікіх гусей» (муз. *Уладзіміра Будніка*, вык. група *«Сузор'е»*).

**Узнагароды:** лаўрэат Ленінскай прэміі (за кнігу паэзіі «Нарачанскія сосны», 1978), Дзяржаўнай прэміі СССР (за зборнік «Каб ведалі», 1948), Дзяржаўнай прэміі БССР (за зборнік «Мой хлеб надзённы», 1966), кавалер 4 ордэнаў Леніна, ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі, залатога медаля «Барацьбіту за мір», медаля Ф. Скарыны і інш.

**Дыскаграфія: трэк** «Завушніцы» (муз. У. Мулявіна, ансамбль «Песняры», у зборніку «Парад ансамблей» – «Мелодия», 1982, у 2LP «Зачарованая мая» – «Мелодия», 1983).

Паводле даведніка «Беларускія пісьменнікі»//Д.П.

**ТАРАС ВАЛЯНЦІН (Тарас Валентин, Taras Valiantsin)** – паэт, публіцыст, сцэнарыст, драматург, перакладчык.

Нарадзіўся 09.02.1930 у Мінску. У 1943–44 партызаніў, у 1948–50 працаваў на Мінскай бісквітнай фабрыцы, адначасова вучыўся ў школе рабочай моладзі. У 1955 скончыў аддзяленне журналістыкі філфаку БДУ, працаваў у гродзенскай літаграфіі, у газеце «Звязда» (1955–62), часопісе «Нёман» (1964–68). Выступае ў друку ад 1948, піша на беларускай і расейскай мовах. Аўтар сцэнарыя тэматычнай праграмы «Через всю войну» на музыку *Уладзіміра Мулявіна* для ансамбля *«Песняры»*. Найбольш вядомыя песні на ягоныя вершы «Провожала сына мать», «Баллада о фотокарточке», «Рисунок тушью», «Багратион», «Возвращение», «Дзве мовы ў мяне».

**Дыскаграфія:** 2LP «Через всю войну» («Мелодия», 1985).



**Узнагароды:** кавалер ордэна Айчыннай вайны 2-й ступені.
**Кіно:** аўтар сцэнарыяў дакументальных стужак «Наш Пімен» (1967), «Зорка Максіма» (1980), «Вяртанне ў першы сьнег» (1985) і інш.
**Кантакт:** +375 (17) 234-06-49.
08.03.05//Д.П.

**ТКАЧЭНКА ЎЛАДЗІМІР (Ткаченко Владимир, Tkachenka Uladzimir)** – гітарыст, кампазітар, аранжавальнік, педагог.

Нарадзіўся 11.03.1953 у г. Лебядзін Сумской вобл., Украіна. У 1977 скончыў БДК па класе скрыпкі. Прафесійную кар'еру распачаў у 1977, калі быў запрошаны ў склад ансамбля *«Песняры»*, ад 1985 – удзельнік *джаз-групы Ігара Сафонава*, ад 1987 – гітарыст, аранжавальнік *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, адначасова – джаз-групы *«Пятый угол»*. Аўтар больш чым 1000 аранжаванняў твораў для біг-бэнду, інструментальных эстрадных і джазавых п'ес, песень, якія гучалі ў выкананні Л. Студневай, *Іны Афанасьевай*, *Валерыя Дайнэкі* і інш., аўтар джазавай Сюіты на тры беларускія тэмы (1986), сімфоній «Бітлз» (1996), «Песняры» (1999), п'есы «Самба Ізраэль» для джаз-групы, п'ес для камернага аркестру. Як гітарыст першым у Беларусі авалодаў тэхнікай выканання тэйпінг, дзеля чаго адмыслова апрацаваў такія тэмы, як «Саўка ды Грышка», «Гоман», «Караван», зрабіў пералажэнне Прэлюдыі і фугі c-moll І.-С. Баха. Актыўна выступае як студыйны музыка, запісваўся з многімі выканаўцамі розных стыляў, аранжавальнік дзесяткаў твораў для «Славянского базара», расейскай тэлепраграмы «Угадай мелодию», гродзенскага жаночага біг-бэнду *«Caprice»*. Пасьлядоўна ўдзельнічае ў канцэртах Мінскага клубу гітарыстаў, ад 2004 выступае ў дуэце «Double Fantasy» з *Віктарам Малчанавым*.



**Гастролі:** у складзе «Песняроў» – ЗША, Мексіка, Куба, Нікарагуа, Трынідад і Табага, ГДР, ЧССР, ВНР, Індыя; Украіна, Расея, Італія і г.д.
**Фестывалі:** гл. «Песняры», група І. Сафонава, Дзяржаўны канцэртны аркестр («Славянский базар» – пастаянна, «Ступень к Парнасу»).
**Дыскаграфія:** у складзе «Песняроў» – гл. 1978–85; МС «Персияночка» Л. Студневай («Ковчег», 1997), «Misty» І. Сафонава («Ковчег», 1996), «Зорка спагады» *Алеся Камоцкага* («Grand Records», 2000), «Ткаченко/Молчанов играют «Битлз» (Санкт-Пецярбург, 2006); «Caprice» (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, 1997), «Пяшчотнасць» (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, 2000), «В джазе только девушки» (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, 2005).
**Кантакт:** +375 (29) 661-21-71.
18.11.06//Д.П., фота А. Прупаса

**«ТОНІКА»** – інструментальны ансамбль БДК, які быў арганізаваны ў 1972 як акампанавальны калектыў спевака *Віктара Вуячыча*.
У першым складзе калектыву выступалі *Аркадзь Эскін* – фартэпіяна, Віталь Барма – труба, *Валерый Шчэрыца* – труба, Анатоль Радзюкоў – саксафон, флейта, Анатоль Архіпаў – бас-гітара, Уладзімір Фядотаў – барабаны, Валерый Гурдызыяне – трамбон. Пазней у калектыве выступалі Сяргей Гурбелашвілі – саксафоны, *Аляксандр Бурштэйн* – фартэпіяна, *Уладзімір Угольнік* – гітара, А. Гітгарц – фартэпіяна (← *«Пане-браце»*) і інш.
**Гастролі:** краіны Еўропы, Афрыкі.
**Дыскаграфія:** міньён В. Вуячыча «Песня, в которой ты» («Мелодия», 1985).

**Узнагароды:** лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1978).
26.02.06//Д.П.

**«ТОРНАДО»** – група з Мінску, якая выступала ў стылі хуткаснага трэш-метал.
Утварылася ў траўні 1987 пад назвай «Агония», пазней, згодна з кантрактам з ангельскай фірмай «RTX», некаторы час выступала пад назвай «Red Dynamite», пасля чаго вярнулася да першапачатковай назвы.
У першым складзе групы выступалі Сяргей Надзежкін – гітара, вакал, Леанід Ляшчынскі – гітара, Васіль Касцючэнка – бас-гітара, Аляксандр Масючэнка – барабаны, Андрэй «Ангус» Піпко – гукарэжысёр, які неўзабаве стаў вядучым вакалістам, аўтарам музыкі і тэкстаў. У групе ўдзельнічалі розныя музыкі, сярод іх Генадзь Плаўнік – бас-гітара, Антон Гаявы – барабаны, у розны час з калектывам выступалі таксама Фелікс



Бухцееў – гітара, Ігар Маскаленка – барабаны (абодва ← «7 герц»). Рэпертуар трымаўся на ангельскамоўных аўтарскіх творах. Група спыніла існаванне ў другой палове 90-х.
**Фестывалі:** «Straszydla» (Польшча, 1992).
**Дыскаграфія:** міні-МС «Apeman» («Ковчег», 1997); **трэкі** «Касіў Ясь канюшыну» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Crazy Dynamite», «Yavohl», «Maniac» (у зборніку «Western Dreams» – «RTX Records», 1993), МС «Invasion» («Eddy Studio», Вялікабрытанія, 1996, як «Red Dynamite»).
**Кантакт:** angus@tut.by
09.12.06//Д.П., фота Д.П.

**«ТРОЙЦА»** – мінскае трыо, якое трымаецца стылю этна-ф'южн. Заснавана ў 1995 *Іванам Кірчуком* з мэтай выканання стылізаванага беларускага музычнага фальклору. Да снежня 1998, апрача лідэра, у групе выступалі Віталь Шкілёнак – бэк-вакал, гітара, домра, бас-гітара (← «Beauty By Mistake» → *«Альтанка»*) і Дзмітрый Лук'янчык – бэк-вакал, барабаны, перкусія, варган (← «Beauty By Mistake» → «Альтанка»). Першы канцэрт адбыўся ў ліпені 1996. Праз год на запрашэнне Ю. Шаўчука трыо выступіла на рок-фестывалі ў Санкт-Пецярбургу, пазней актыўна гастралявала, запісвалася для тэлевізійных і радыёпраграм. У Галандыі быў запісаны і выдадзены дэбютны альбом трыо. У ліпені 1996 «Тройца» адзначана дыпломам I ступені конкурсу «Саступі дарогу!» Фонду Сораса-Беларусь, а ў чэрвені 1997 – дыпломам Фонду Генры Форда ў рамках праекту «Спадчына». Ад студзеня 1999 група выступае новым складам і пад назваю *«Этна-трыо «Тройца»*.
**Узнагароды:** «Рок-карона 1998» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць».
**Гастролі:** Расея, Галандыя, Славенія, Харватыя, Боснія і Герцагавіна, Данія, Аўстрыя, Вугоршчына, Партугалія, Польшча.
**Фестывалі:** «Единый мир», «Мировая музыка» (Масква, 1997), «Рок-каранацыя» (Мінск, 1998), «Mundial», «Oerol», «Virus», «Holnd FSTVL», «Amsterdam Roots Festival», «Het Haarlemmae Hout Festival» (усе – Галандыя, 1998), «Sodobne Ljudske Glasbe», «Mideteran» (усе – Славенія, 1998), «Kavarna Evropa» (Аўстрыя, 1998), этна-фестываль і «Miskolc» (усе – Вугоршчына, 1998), «Славянский базар» (Віцебск), «Expo-98 Festival Mundial Dela Juventud» (Партугалія, 1998), «Mikolajki folkowe» (Польшча, 1998).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Troitsa» («PAN Records», Галандыя, 1998, перавыд. МС «Bulba Records», Беларусь, 2000), «Live at «Oerol» («PAN Records», Галандыя, 1999); **трэк** «Рэчанька» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997).
**Кантакт:** +375 (29) 776-80-22 (Іван Кірчук).
14.11.05//Д.П.

**ТРУХАНОВІЧ СЯРГЕЙ (Труханович Сергей, Trukhanovich Siargei)** – гітарыст, педагог, аўтар музыкі. Нарадзіўся 16.02.1971 у Мінску. Цікавіцца музыкай і ствараць першыя п'есы ды песні пачаў ва ўзросце 10 гадоў. Скончыў ДПТВ-148 па спецыяльнасці чырвонадрэўнік у 1989. Падчас навучання пачаў займацца гітарай. У 2003 скончыў БДУК як



артыст эстрады і выкладчык па класе гітары *Уладзіміра Угольніка*. Выступаў у складзе розных самадзейных калектываў і ВІА. У сярэдзіне 80-х сабраў сваю першую групу «Азарт», потым граў у складзе хард-рокавай групы «Каменный дождь» (пазней – «Рокіс»). У 1991 увайшоў у групу *«Крама»*, у сярэдзіне 90-х заснаваў уласны праект – групу «Sam Gray», якая выконвала музыку ў стылі кантры-року і была адзначана першай прэміяй конкурсу альтэрнатыўнай музыкі «Саступі дарогу!» Фонду Сораса-Беларусь (1996). Пасля гэтага непрацяглы час выступаў як гітарыст ансамбля *«Сябры»*, браў удзел у маскоўскім праекце «А. Олейников и друзья». Ад 2002 сумяшчае выступленні ў складзе «Крамы» і *«Палацу»*.

**Гастролі:** у складзе «Палацу» – Францыя, Нямеччына (Экспа 2000, Гановер).

**Фестывалі:** у складзе «Крамы» – «Тры колеры», «На доўгім бродзе», «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1992, 2006, 2007), «Поколение» (Масква, 1994); у складзе «Палацу» – фестываль дружбы народаў у Боне; «Грифомания» (Мінск, 2003).

**Узнагароды:** у складзе «Крамы» – лаўрэат першай прэміі фестывалю «Басовішча 1992», прыз лепшаму гітарысту на фестывалі «Поколение» (Масква, 1994), «Рок-карона 1999» у намінацыі «Музыкант году».

**Дыскаграфія: альбомы** сольныя МС «Точка невозврата» («Ковчег», 1999), CD «Нараджэньне таямніцы» («БМАgroup», 2003); у складзе «Каменного дождя» – МС «Легион» (аўт. выд., 1990), у складзе «Рокіса» – МС «Мая зямля» (аўт. выд., 1991), у складзе «Крамы» – гл. 1993–2007; МС «Sam Gray» (аўт. выд., 1996); у складзе «Палацу» – «Чужыя дзеўкі» («Aist Music», 2001); CD «А. Олейников и друзья» (аўт. выд., 1998); удзел у запісе альбомаў *Дзмітрыя Даўкша* «А я смотрю в небо», «Я верю», «Напои меня водой», «The Best»; **трэкі** «Run Boy Run», «Baby», «Rockin' & Rollin» (у зборніку «Western Dreams» – «RTX Records», 1993), «Мама, я ўжо не той», «We Are Going Down», «Сабака», «Гэй там, налівай», «Камэндант» (у зборніку «Живые концерты на «Радио Ракурс», т.1» – «Радио Ракурс», Расея, 1996), «Enjoy The Silence» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**Іншая інфармацыя:** прыватна выкладае гітару паводле ўласнай методыкі.

**Кантакт:** s.trukhanovich@mail.ru

23.08.07//Д.П., фота Д.П.

**«ТТ-34»** – гомельская група. Уласны стыль музыканты вызначаюць як энгры трэш-кор.

Утварылася ў 1996 пад назвай «Head Cleaner». Цяперашнюю назву

набыла летам 1999. У першым складзе калектыву выступалі Аляксей Смірноў – барабаны, Канстанцін Астапенка – вакал, Аляксандр Валастноў – гітара, Аляксей Грыгор'еў-Мух – бас-гітара. У снежні 1996 робіцца запіс першага дэма. На пачатку 1998 на месца А. Валастнога прыходзіць Сяргей Кузьмянкоў (← «Entry», «Voodoo»), у ліпені 1998 А. Грыгор'ева-Муху замяняе Валерый Навасельцаў (← «Entry», «Voodoo»), у чэрвені 1999 разам са зменай назвы калектыў пераходзіць да выканання песень на расейскай мове, праз два месяцы склад групы павялічваецца за лік вакаліста Аляксандра Пацёмкіна (← «Entry»).
У 2001 група ўваходзіць у склад незалежнага творчага фармавання «Дети Солнца». За пяць гадоў (1999–2004) музыкі далі больш за 200 канцэртаў, напрацоўваючы матэрыял для дэбютнага альбому.
У 2004 група выступала такім складам: А. Пацёмкін, К. Астапенка, С. Кузьмянкоў, В. Навасельцаў, А. Смірноў, Артур Сцяпанаў – перкусія. На пачатку 2007 з групы пайшоў А. Пацёмкін.
**Гастролі:** Расея (2006), Украіна.
**Фестывалі:** «Калининград In Rock» (1999, 2000), «Брянский драйв» (Расея, 2001), «Пятница, 13» (Масква, 2002), «Байк-шоў» (Масква, 2002),



«Смоленский проект» (2004), «Core Fest Manifest» (Краснадар, 2006), «Крылья» (Масква, 2006), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2007) і інш.
**Узнагароды:** «Рок-карона 1999» у намінацыі «Дэбют году», «Рок-карона 2004–05» у намінацыі «Лепшая альтэрнатыўная група».
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Грубый помол» («Дети Солнца», Мінск, 2004, перавыд. як «Бум!» – «Go Records», 2005).
**Кіно, відэа: кліп** «Джек» (1 версія: канцэртная хроніка групы; 2 версія: рэж. А. Церахаў, 2003), удзел у саўндтрэку да фільмаў «Ночной дозор» (рэж. Ц. Бакмамбетаў, 2004), «Дневной дозор» (2005), «Охота на пиранью» (2006), «Бум!» – разам з Сярогам (рэж. Р. Васьянаў, 2004).
**Кантакт:** www.tt34.com
11.06.07//Д.П.

**ТУРАВА АЛЕНА (Турова Елена, Turova Elena)** – паэтка, рэжысёр-аніматар.
Нарадзілася 26.02.1965 у Магілёве. У 1987 скончыла філалагічны факультэт БДУ. У гэтым жа годзе пачала працаваць на кінастудыі «Беларусьфільм», спачатку асістэнтам рэжысёра, ад 1989 – рэжысёрам анімацыйнага кіно. Як аўтар тэкстаў дэбютавала ў 1992 з песняй «Прощальный джаз» (вык. *Валерый Дайнэка*). Напісала больш за сотню тэкстаў для песень беларускіх выканаўцаў. Аўтар тэкстаў і лібрэта мюзіклаў «Синяя Свита» (муз. *Алега Елісеенкава*, 1993, пастаноўка Маладзечанскага тэатру лялек, Гродзенскага драматычнага тэатру, БТ), «Алые паруса» (муз. *Валерыя Іванова*, 1997, пастаноўка Дзяржаўнага тэатру музычнай



камедыі, Іванаўскага драмтэатру, 2003), спектакляў і кінафільмаў – «Пигмалион» (Тэатр-студыя кінаактора, рэж. А. Яфрэмаў, 2002), «Еще о войне» (рэж. П. Крывастаненка, «Беларусьфільм», 2004). Сярод найбольш вядомых песень «Сбудется – не сбудется» (муз. С. Гяруты, вык. *Іна Афанасьева*), «Бумажная луна», «Поезд» (абедзве – муз. С. Гяруты, вык. *Анжаліка Агурбаш*), «Останься!» (муз. *Мікалая Няронскага,* вык. *Анжаліка Агурбаш*), «Зелёные глаза» (муз. А. Елісеенкава, вык. *Аляксандр Саладуха*), «Кораблик» (муз. С. Гяруты, вык. Аляксандра Гайдук), «Слепая любовь», «Жемчуга» (абедзве – муз. *Генадзя Маркевіча,* вык. І. Афанасьева).

**Фестывалі:** «Славянский базар» (Віцебск).

**Узнагароды:** прыз «За лепшую песню» на кінафестывалі ў Новарасійску (фільм «Еще о войне»), прыз «Хрустальный аист» за лепшую песню («Снег», муз. А. Елісеенкава) на V Нацыянальным фестывалі беларускага кіно (2005).

**Дыскаграфія: трэкі** «Бумажная луна» (муз. С. Гяруты, у зборніку А. Агурбаш – «TON-Records», 1995), «Ангел мой» (у зборніку «Песні артыстаў беларускай эстрады» – «TON-Records», 1998), «После дождя» (у зборніку «Песні артыстаў беларускай эстрады» – «TON-Records», 2003).

**Кіно, відэа: кліпы** «Сбудется – не сбудется» (вык. І. Афанасьева, рэж. І. Пашкевіч), «Зелёные глаза» (вык. А. Солодуха, рэж. І. Пашкевіч), «Бумажная луна» (вык. А. Агурбаш, рэж. *Уладзімір Янкоўскі*), «Останься!» (А. Агурбаш), «Мама» (вык. *Валерый Галаўко*, рэж. І. Пашкевіч).

**Кантакт:** lenaturova@tut.by

02.10.05//Д.П.

**ТУРАНКОЎ АЛЯКСЕЙ (Туренков Алексей, Turankou Aliaksei)** – кампазітар.

Нарадзіўся 09.01.1886 у Пецярбургу, памёр 27.09.1958. У 1911–14 вучыўся ў Пецярбургскай кансерваторыі па класах кампазіцыі А. Лядава і М. Сакалова. Ад 1918 жыў і працаваў у Гомелі, з 1934 – у Мінску. Адзін з пачынальнікаў у Беларусі жанраў масавай песні, рамансу, аўтар опер «Кветка шчасця», «Яснае світанне», сімфанічных і камерных твораў, рамансаў і песень на вершы беларускіх і расейскіх паэтаў, музыкі для тэатру і кіно.

**Дыскаграфія:** песні «Вечар», «Лета», апрацоўкі беларускіх народных песень (у зборніку «Ластаўкі ў стрэсе» – «БМАgroup», 2000).

Паводле Белэнцыклапедыі.

**ТЫШКО ЛЕАНІД (Тышко Леонид, Tyshko Leonid)** – бас-гітарыст, бэк-вакаліст.

Нарадзіўся 09.11.1945. Скончыў музычную вучэльню па класе домры.



У 1968 быў запрошаны ў склад ВІА *«Лявоны»*. Аўтар новай назвы ансамбля – *«Песняры»*. Пакінуў склад «Песняроў» вясной 1982, граў з братам Эдуардам у мінскіх рэстарацыях, займаўся выкладчыцкай дзейнасцю. У 1991 з'ехаў у Ізраіль.

У 2001 з нагоды святкавання 30-годдзя «Песняроў» наведаў Мінск, аднак ад усіх прапаноў адносна далейшага супрацоўніцтва з калектывам адмовіўся. Жыве ў Хайфе, Ізраіль.

**Гастролі:** гл. «Песняры».

**Фестывалі:** гл. «Песняры».

**Узнагароды:** гл. «Песняры».

**Дыскаграфія:** гл. «Песняры».

**Іншая інфармацыя:** піша вершы.

08.11.06//Д.П.

**ТЭРАЎСКІ УЛАДЗІМІР (Теравский Владимир, Terauski Uladzimir)** – кампазітар, хормайстар.

Нарадзіўся 11.11.1871 у м. Раманава Слуцкага павету Менскай губ., памёр 10.11.1938. Творчы шлях у музыцы пачынаў як спявак у капэле Д. Агрэнева-Славянскага. У 1914 стварыў у Мінску адзін з першых у Беларусі харавых калектываў, які ў 1917 быў рэарганізаваны ў Беларускі народны хор. Ад 1917 да 1920 – кіраўнік музычнай часткі Першага беларускага таварыства драмы і камедыі, ад 1920 да 1935 – хормайстар БДТ-1. Аўтар музыкі да драматычных спектакляў, у тым ліку «Паўлінкі», шматлікіх рамансаў і песень на вершы беларускіх паэтаў.

**Дыскаграфія:** «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», «А ў бары, бары» (у зборніку «Я нарадзіўся тут» – выд. Алеся Сушы, 2000).

Паводле Белэнцыклапедыі.

**«ТЯНИ-ТОЛКАЙ»** – група з Мінску, якая працуе ў стылі пап-року.

Утварылася на пачатку кастрычніка 1999. Першы склад: Павел Клышэўскі – бас-гітара, клавішныя, Андрэй Заяц – гітара, вакал, Павел Таймовіч – барабаны. У 2000 да калектыву далучыўся выканаўца на клавішных Кірыла Клішэвіч. Ад гэтага часу склад групы нязменны. Ансамбль зрабіў шэраг гастрольных тураў па Беларусі, арганізаваных FM-станцыямі, моладзевай арганізацыяй «Next Stop – New Life», выступаў у шэрагу тэлепраграм, выконваючы аўтарскія песні пераважна на расейскай мове. Найбольш вядомыя песні «Наши звучат имена», «3000 шагов», «По двум концам провода», «Алмаз», «Дальчужбинушка».

**Гастролі:** туры па Беларусі.

**Узнагароды:** перамога на цырымоніі «Мистерия звука 2006»



у намінацыі «Пап-альбом году» («Как долго я тебя искал»).
**Дыскаграфія: альбомы** «Смеются соседи» («West Records», чэрв. 2001), «Имей в виду» («West Records», кастр. 2002), «Танцевальный» («West Records», кастр. 2003), «3000 шагов» («West Records», крас. 2005), «Как же долго я тебя искал» («West Records», лістап. 2006); **трэкі** «Тяни-толкай» (у зборніку «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000).
**Кіно, відэа: кліпы** «Тяни-Толкай» (рэж. *Анатоль Вечар*), «Имей в виду» (2002), «Модели» (2003), «Санта Клаус» (рэж. А. Шапіра, 2002), «Даль-чужбинушка» (рэж. А. Бутар, 2004), «3000 шагов» (рэж. А. Бутар, 2004), «22 июня» (рэж. А. Бутар, 2005), «Наши звучат имена» (рэж. А. Бутар, 2005), «Океан тайги» (рэж. А. Бутар, 2005).
**Кантакт:** www.tt.westrecords.by; kirill@westrecords.by; taram76@mail.ru
01.03.07//Д.П.

**«TARPACH»** – мінская група. Арганізавалася ў траўні 2002 дзеля выканання музыкі ў стылі красовер. Першапачатковы склад: Святлана Сугака – вакал, Дзмітрый Астапук – гітара, Андрэй Бакей – бас-гітара, Аляксей Рак – барабаны, Алена Сілівонік – гітара. Увосень 2005 з групы сыходзіць С. Сугака, у красавіку 2006 у групе выступаюць Дз. Астапук, Андрэй Макараў – гітара (← 2003), Павел Дармель – бас-гітара (← 2003), Аляксей Яфрэменка – барабаны (← *«Partyzone»*), Вольга Самусік – вакал (← 2006, адначасова *«Zygimont Vaza»*).
**Гастролі:** Польшча (травень 2005).
**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2003–05, 2007), «Juwenalia» (Бяла Падляска, Польшча, 2006), «Рок-кола» (Полацк, 2007).
**Узнагароды:** прыз радыё «Polonia» на фестывалі «Басовішча 2004», І месца ў конкурсе на фестывалі «Рок-кола 2007».
**Дыскаграфія: альбом** CD «Усё будзе...» («БМAgroup», 2005).
**Кантакт:** tarpach-inf@mail.ru; +375 (29) 778-85-49 (Вольга).
29.05.06//Д.П.

**«TAV. MAUZER»** – група з Магілёву. Утварылася ўвосень 2002 на рэштках групы «Равновесие». У жніўні 2003 сабраўся працоўны склад калектыву: Ян «Маўзэр» – вакал, Уладзімір «Колхз» Селядцоў – гітара, Уладзімір «Мядзведзь» Крутаў – гітара, Павел «Капітан» Емяльянаў – барабаны, Ігар «Ігр» Давыдаў – бас-гітара. Першы публічны выступ датаваны вераснем 2003. Паводле вызначэння саміх музыкаў, група выконвае аўтарскія

беларускамоўныя творы ў стылі нью ўэйв/альтэрнатыў метал. Узімку 2003 да групы далучыўся другі вакаліст Андрэй «Бор» Грышчанкоў. П. Емяльянаў адышоўся ў пачатку зімы 2004 (→ «Nevma»). У розны час у складзе групы выступалі Макс «Рабакоп» Рыбакоў – барабаны, Сяргей «Dead» Цэлабёнак – барабаны (адначасова з *«Asguard»* і «Водар Сусьвет»). У пачатку 2007 група складалася з Яна «Маўзэра», У. Селядцова, А. Грышчанкова, Іллі «Іл-83» Касценіча – барабаны, ударныя, Рамана «Ufo» Сашчэкі – сэмплы, клавішныя. Найбольш вядомыя песні «Брудная вада», «Калыханка».

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2005–07), «Рок-кола» (Полацк, 2005), «Воздух» (Петразаводск, Расея, 2007).

**Узнагароды:** лаўрэат конкурсу на фестывалі «Басовішча» (2005), лаўрэат фестывалю «Рок-кола» (2005), «Рок-карона 2004–05» у намінацыі «Дэбют году».

**Дыскаграфія: альбом** «Радасьць» («БМAgroup», 2006).

**Кантакт:** www.mauzer.org; +375 (29) 546-36-66, (29) 185-98-03 (Ілля); (29) 745-40-52 (Ян); (29) 742-74-18 (Уладзімір).

25.07.07//Д.П.

**«TESAURUS»** – мінская рок-група, якая выступае ў стылі сэйнт-року. Утварылася ў жніўні 1997 пад назвай «Армагедон».

Першапачатковы склад: Мікола Пташнікаў – гітара, вакал, Валерый Каргін – бас-гітара, Антон Шырынскі – гітара, вакал, Ілля Кірчук – барабаны, Ягор Клюйкоў – флейта, Максім Клімаў – клавішныя, вакал, Арцём Крышчановіч – скрыпка, Вячаслаў Токар – гукаапэратар. Праз калектыў прайшла вялікая колькасць музыкаў. У чэрвені 2003 група змяніла назву на цяперашнюю і выступала складам: М. Пташнікаў, Віктар Козел – вакал, А. Крышчановіч – клавішныя, скрыпка, Паўлюк Сучынскі – бас-гітара, Аляксандр Валошык – барабаны, Зміцер Гошка – гітара, Аляксандр Кавалераў – гукаапэратар. У канцы 2005 склад групы змяніўся чарговы раз: М. Пташнікаў, В. Козел, Канстанцін Пелых – барабаны, Андрэй Шэпяцюк – бас-гітара, Барыс Ідэльчык – клавішныя. Калектыў часта выступаў на рэлігійных фэстах, на прадпрыемствах і ў навучальных установах, браў ўдзел у праграмах радыё і тэлебачання, выконваючы ўласныя песні па-беларуску. Пра спыненне дзейнасці калектыву было афіцыйна аб'яўлена 12 сакавіка 2006. Найбольш вядомая песня «Ерусалім».

**Гастролі:** гарады Беларусі, Смаленск (2003, 2005).

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2002–05), X міжнародны фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа» (Магілёў, 2002).

**Узнагароды:** прыз на «Басовішчы 2002».

**Дыскаграфія: альбомы** «Басовішча 2002. «Армагедон» (канцэртны, аўт. выд.); «Аднова тэзаўруса» («Parachia Records», 2004); **трэк** «Аднова тэзаўруса» (у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004).

**Кантакт:** www.tesaurus.nm.ru; thesaurus@tut.by; +375 (29) 631-20-33 (Аксана).

25.04.06//Д.П.

**«THANK YOU JESUS»** – група з Мінску. Утварылася ў 1997, трымаючыся стылю класічнага еўрапейскага року таго часу і выконваючы ўласныя песні на ангельскай мове.

У складзе групы выступалі: *Уладзімір «Влад» Благуш* – вакал, гітара, аўтар музыкі і тэкстаў, Сяргей Мядзведзеў – гітара, бэк-вакал (← *«Буржуазия»*, *«Песняры»* →), Андрэй Лукша – бас-гітара, бэк-вакал (← «Буржуазия»), Аляксандр Шчарбакоў – перкусія, акустычная гітара, бэк-вакал, Генадзь Дорфман – барабаны. Група спыніла існаванне ў 1999. Найбольш вядомыя песні «Let Me Be With You Baby», «Everybody's Lonely», «I Need Your Love», «We Could Be Together», «I Don't Know Why You Leave Me».

**Фестывалі:** «Рок-каранацыя 1997, 1998», «Блюз жыве ў Мінску 1999».

**Узнагароды:** «Рок-карона 1997» у намінацыі «Дэбют году».

**Дыскаграфія: альбом** CD «Between No Distance» (Нямеччына, 1997).

**Кіно, відэа: кліп** «Let Me Be With You Baby» (рэж. А. Грабенкін, 2000).

**Кантакт:** +375 (29) 622-28-08 (Андрэй Лукша).

22.09.05//Д.П.

**«TOO LATE: FROZEN»** – калектыў з Брэсту, які выступае ў стылі электра-хард-кору.

Утварыўся як дуэт у 1996 складам: Аляксандр Круцько – вакал і Валерый Сакалоў – клавішныя, гітары, вакал. У 1999 у склад калектыву ўвайшлі Дзмітрый Піскур – вакал і Андрэй Кулік – аператар, сінтэзатарныя ўстаноўкі «Рабочая станцыя».



**Фестывалі:** фестываль альтэрнатыўнай музыкі (Мінск, 1998).

**Дыскаграфія: трэкі** «City of Dead» (у зборніку «Брест-рок-журнал» – «Брестон», 1998), «Игра без правил» (у зборніку «Я в Бресте» – «Art Classic Company», 2002), «No Time» (у зборніку «Я в Бресте 2» – «Art Classic Company», 2003), «Good Cops» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», Брэст, 2006).

**Кіно, відэа: кліп** «Игра без правил» (рэж. А. Пацяйчук, 2003).

**Кантакт:** +375 (162) 27-26-74 (Валерый), (162) 23-45-75 (Аляксандр).

21.10.06//Г.Ш.

# У

**«УДАР»** – група з Брэсту. Утварылася ў 1983 і першапачаткова выступала пад назвай «Эдельвейс» наступным складам: Генадзь Люлькові́ч – гітара, Роберт Бураў – вакал, бас-гітара, Вячаслаў Стрыжак – барабаны. У 1987 група пачала выступаць пад назвай «Удар», выконваючы музыку ў стылі меладычнага хард-року. У лістападзе 1986 у калектыў прыходзіць другі гітарыст Юрый Колычаў (→ *«Cobra»*, *«Wolfshade»*, *«Pulsar»*). У 1990 група спыніла існаванне.

**Фестывалі:** Усесаюзны фестываль «Рок-спорт» (Данецк, 1988), рэспубліканскія «Дні студэнцкай творчасці» (Мінск, 1988).

**Узнагароды:** лаўрэат Усесаюзнага фестывалю «Рок-спорт» (Данецк, 1988).

**Кантакт:** rwa2005@yandex.ru

02.03.05//Г.Ш.

**УГОЛЬНІК УЛАДЗІМІР (Угольник Владимир, Ukholnik Uladzimir)** – педагог, гітарыст, аранжавальнік, кампазітар.

Нарадзіўся 15.07.1953 у Мінску. У 1992 скончыў МІК па класах гітары і эстрадна-духавога дырыжавання. Творчую кар'еру распачаў у 1968 у складзе мінскіх біт-груп. Да 1972 выступаў у такіх калектывах, як «Блики», «2+2», *«Пане-браце»*, «Дисконты». Ад 1973 да 1979 працаваў у складзе ансамбляў БДФ «Орбита-67» і *«Верасы»*. У 1979–80 – артыст канцэртных праграм «Кавказский аул» (Сочы), у 1981–82 – кіраўнік ансамбля БДФ *«Тоніка»*. Цягам 1982–87 працаваў як кіраўнік калектываў АМА Мінску, у 1987–90 – музычны рэдактар тэатру гумару «Христофор». Цягам трох гадоў (1990– 93) – у складзе аркестру Мінскага цырку. Ад 1997 да 2005 – загадчык кафедры мастацтва эстрады БДУК, ад 2006 – выкладчык па класах гітары і імправізацыі інструментальнага ансамбля гэтай кафедры, дацэнт. Сярод вучняў – *Аляксандр Салаўёў*, А. Камлюк, *Сяргей Труханові́ч*, *Ігар Шошын*, М. Фурс, А. Капянкоў, В. Навумік, Д. Парфёнаў. Актыўна выступае з сольнымі канцэртамі ў вялікіх залах і на клубных пляцоўках, супрацоўнічае з Т. Капянковай, *Генадзем Старыкавым*



(дуэт «Старик и Угол»). У рэпертуары як стандарты джазу, блюзу і папулярнай музыкі, так і аўтарскія творы і апрацоўкі народных мелодый. Найбольш вядомыя творы «Дневные сны», «Наивная самба», «Янка-жартаўнік».

**Гастролі:** у складзе «Верасоў» (1975–79), «Тонікі» (1981–82).

**Фестывалі:** «Блюз жыве ў Мінску» (2000, 2001, 2005, 2006), «Saulkrasti Jazz» (Рыга, 2000, 2004), «Грифомания» (Мінск, 2003, 2004, 2006).

**Дыскаграфія: альбомы** «Дневные сны» («Аудиовизуальные технологии», 1998), «Угольник №2» («Ковчег», 2002), «Задушевный рок-н-ролл» («Ковчег», 2005).

**Кантакт:** +375 (29) 689-35-07.

25.02.07//Д.П., фота Д.П.

**«УЗОРЫ»** – гомельскі ВІА, утварыўся ў 1972 пры раённым ДК.

Аснову рэпертуару складаюць апрацоўкі беларускіх народных песень, аўтарскія творы ўдзельнікаў калектыву, а таксама песні айчынных і замежных кампазітараў. Склад 1986: Мікалай Старасценка – бас-гітара, вакал, Аляксандр Радзькін – клавішныя, вакал, Сяргей Жаляеў, Віктар Іваноў – гітара, вакал, Уладзімір Слесарэнка – вакал, Вячаслаў Рабянкоў – гукарэжысёр, Сямён Фрэйман – кіраўнік. Ад 1988 да 1991 кіраўніком калектыву быў *Аляксандр Гулай*. У 2002 на чале калектыву стаў выканаўца на клавішных і басгітары, вакаліст *Мікалай Ушакоў* (← *«Crane's Glee»*). Разам з ім выступалі: Ігар Ладачкін – вакал, Максім Здаравец – гітара, Дзяніс Давыдаў – вакал, барабаны. У канцы 2005 у складзе ансамбля выступалі М. Ушакоў, І. Ладачкін, Станіслаў Гацілаў – вакал, Рафаіль Рахматулаеў – гукарэжысёр, Дз. Давыдаў. Ансамбль выступае ў стылі папулярнай музыкі, выконваючы песні на расейскай, беларускай, ангельскай мовах.

**Фестывалі:** І усесаюзны фестываль самадзейнай творчасці працоўных, Усесаюзны конкурс патрыятычнай песні, рэспубліканскі конкурс эстраднай музыкі «Салігорск 1986», «Арт-сессия» (Гомель, 1996, 2000).

**Узнагароды:** Гран-пры рэспубліканскага конкурсу «Юнацтва Палесся 1986» – «Палескі крышталь»; Ганаровая грамата МК СССР за канцэрты ў зоне Чарнобыльскай АЭС.

**Кантакт:** +375 (232) 53-49-53 (М. Ушакоў).

20.02.06//А.Ц.

**«УНИВЕРСИТЕТ»** – мінская група, утварылася на базе філалагічнага факультэту БДУ у 1974.

У першым складзе калектыву выступалі: Сяргей Вядзьмедзь – гітара (→ *«Верасы»*), Аляксандр Гурны – барабаны, Віталь Шувагін – гітара, вакал, *Эдуард Сыцянка* – флейта, Аляксей Еранькоў – клавішныя, *Аляксей Казлоўскі* – бас-гітара (→ *«Сузор'е»*). Падчас афіцыйных выступленняў група выконвала пераважна песні савецкіх кампазітараў, на танцавальных вечарынах рэпертуар складаўся з кавер-версій твораў заходніх аўтараў, 15-хвіліннай ангельскамоўнай сюіты, інструментальных твораў, песень аўтарства А. Еранькова. Пасля 1979 на месца С. Вядзьмедзя прыходзіць *Аляксандр Растопчын*, А. Гурнага змяняе Віталь Навіцкі, да групы далучаецца спявачка Нэлі

Варатынцава-Дзянісава. У розны час у групе выступалі Мікалай Хаскін – клавішныя, Сяргей Грумо – барабаны, Ілля Герасіменка – саксафон. Група спыніла існаванне ў канцы 1981.

**Фестывалі:** студэнцкі фестываль у Горкім (1976, дыплом II ступені), студэнцкі фестываль у Ераване (1978, дыплом III ступені), Пскоў (1981).

**Кантакт:** Аляксей Казлоўскі (914) 864-14-43 (х.), (914) 471-00-14 (пр.), (212) 821-22-35 (маб.); kozlovski@optonline.net.

16.12.06//Д.П.

**«УЛІС»** – мінская група. Утварылася ў пачатку 1989 і выконвала музыку ў стылі альтэрнатыўнага року. Першы склад: *Вячаслаў Корань* – гітара (← *«Бонда»*), *Сяргей Краўчанка* – бас-гітара (← «Бонда»), Валерый Цыніцкі – перкусія (← «Бонда»), Кірыла Шэвандо – барабаны, Андрэй Патрэй – вакал. У 1990 на месца К. Шэвандо прыходзіць Сяргей Кныш («Бонда»). У 1992 на месца А. Патрэя прыйшоў Алег Тумашоў («Квінта»). На пачатковым этапе аўтарам тэкстаў практычна ўсіх



песень выступаў *Фелікс Аксёнцаў*. Пасля 1993 склад калектыву пачаў істотна змяняцца: адышлі С. Краўчанка, В. Цініцкі, А. Тумашоў, ролю лідэра, асноўнага аўтара песень і вакаліста ўзяў на сябе В. Корань. У розныя гады ў групе выступалі Аляксандр Быкаў – барабаны, Віктар Самарукаў – бас-гітара. На пачатку 2006 у групе выступалі: В. Корань, Павел Ермачэнка – барабаны, Сяргей Кісялёў – бас-гітара, Наталля Куніцкая – клавішныя. Найбольш вядомыя песні «Чужаніца», «Калі імпэрыя зьнікне», «Радыё Свабода», «Пляц Францыска», «Кругі па вадзе», «Краіна ў кратах», «Устану ранкам».

**Гастролі:** Украіна, Польшча, Эстонія, Нямеччына (1990–93), Англія (клубныя канцэрты, 1993).

**Фестывалі:** «Басовішча» (1990–2006), «Музыканты мира детям Чернобыля» (Мінск, 1990), «Рок чистой воды» (Мінск, 1990), «Тры колеры» (Гродна, 1990), «Rock Summer» (Талін, 1991), «Rock-maffia» (Сопат, Польшча, 1991), «29$^{th}$ Sopot Festival» (Польшча, 1992), «Сырок» (Масква, 1990).

**Узнагароды:** 2 прэмія на фестывалі «Тры колеры» (1989).

**Дыскаграфія: альбомы** LP «Чужаніца» (запіс 1989, «Мелодия», 1990; перавыд. CD «БМAgroup», 2004), LP «Краіна доўгай белай хмары» («Polskie nagrania», 1991; перавыд. CD «БМAgroup», 2004), MC «Танцы на даху» («Ковчег», 1993, перавыд. CD «БМAgroup», 2004), «Па-над дахамі» («Ковчег», 1995), «Live 1996» і «Блуканьне» («Ковчег», 1996), «Ратуйце вашыя душы» («Ковчег», 1997), CD «Падарожжа» («Ковчег», 2000), «Люстэрка» (аўт. выд., 2004); **трэкі** «Пакуль спяваю» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай

маладзёжнай» – «Мелодия», 1990, у зборніку «Генэралы айчыннага року» – «БМAgroup», 2004), «Я танчу» (у дэма-зборніку «Belarusian Red Book. Music of Belarus» – Нямеччына, 2006), «Мы ўцякаем» (у зборніку «Дыхаць!» – «Гукі і малюнкі», 2006).
**Кантакт:** www.ulis.home.by; ulisbel@yahoo.com: +375 (17) 288-14-95, (29) 111-84-56 (В. Корань).
06.11.06//Д.П.

**УХЦІНСКІ УЛАДЗІМІР (Ухтинский Владимир, Uhtsinskiy Wladimir)** – спявак, выканаўца папулярнага рэпертуару.
**Дыскаграфія: трэкі** «Мама», «Гитара», «Единственная женщина» (у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999).
**Кіно, відэа: кліпы** «Тройка» (1998), «Лебеди мои».

**УШАКОЎ МІКАЛАЙ (Ушаков Николай, Ushakov Nikolai)** – бас-гітарыст, піяніст, вакаліст.
Нарадзіўся ў 1976 у Гомелі. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. У 1994 увайшоў у склад блюз-рокавай групы *«Crane's Glee»*, разам з якой выступаў да 2002, адначасова з'яўляючыся ўдзельнікам групы *«Галерея снов»*. У 2002 стаў на чале ВІА *«Узоры»*, тым часам на працягу 2002–03 выступаючы ў складзе груп «Regent», «Mysteria». Працуе ў стылі як блюз-року, так і папулярнай і рок-музыкі.
**Кантакт:** +375 (232) 53-49-53
20.02.06//А.Ц.

**«ULTRAВОЖЫК»** – мінскі дуэт аўтараў-выканаўцаў.
Пачынаўся як калектыў, што выконваў парадыйна-іранічныя творы з тэкстамі палітычна-сацыяльнай афарбоўкі на беларускай мове, ужываючы тэхніку міксінгу. Апошні час у творчасці групы пераважаюць філасофскія тэмы. Аснову калектыву складаюць Віктар Кавальскі і Яўген Далевіч. Найбольш вядомыя творы «Атлянтыда», «Фабрыка сноў».
**Дыскаграфія: трэкі** «Атлянтыда» (у зборніку «Прэм'ер Тузін 2005» – «West Records», 2005), «Фабрыка сноў» (у зборніку «Прэм'ер Тузін 2006» – «West Records», 2006).
28.01.06//Д.П.

**«UNIA»** – мінская група, якая ўтварылася ўвосень 2006 і выконвае музыку, вытрыманую пераважна ў стылі фолк-року.
Па першым часе склад калектыву змяняўся вельмі часта, улетку 2007 у ім выступалі Дар'я Трубіна – вакал, Аляксандра Шайко – вакал, Філіп Дылеўскі – барабаны, Павал Палонскі – бас-гітара, Васіль Ярмоленка – гітара, Сяргей Бурдзееў – акардэон, Алег Грынько – дуда, духавыя.
**Фестывалі:** «Фолк-безумие» (Мінск, 2007), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007).
**Узнагароды:** прэмія мэра Гродка і радыё «Рацыя» на конкурсе фестывалю «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007).
**Кантакт:** +375 (29) 253-88-32.
28.07.07//Д.П.

**«UR'IA»** – мінская група, якая выступае ў стылі этна-року з элементамі музыкі ф'южн.

Група ўтварылася ў 1999 з ініцыятывы *Юрыя «Франца» Выдронка* і падчас першага канцэрту выступіла складам: Ю. Выдронак – гітара, вакал, Андрэй Сівец – барабаны, Людміла Крукоўская – бас-гітара, Юрый Задзіран –



сітар, гітара (← *«Чистое серебро»*) плюс дзявочы вакальны квінтэт. Практычна на кожны новы канцэрт, запіс збіраўся іншы склад музыкаў, у розны час з групай выступалі Уладзімір Кульпін – дуда, народныя духавыя, польскія музыкі Барталамей Лех Палыга – саранг, Богдан Халіцкі – перкусія. Рэпертуар калектыву заснаваны на архаічных, рытуальных народных песнях, а таксама на аўтарскіх творах, стылізаваных пад народныя, якія выконваюцца на беларускай мове.

**Фестывалі:** «Таўкачыкі» (Мінск, 2000), «Таўкачыкі» (Мінск-Любань, 2003), «Славянский базар» (Віцебск, 2001).

**Узнагароды:** «Рок-кароны 2000, 2006» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць».

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Весначуха» (аўт. выд., 2000), «Kali-Chakra» («Ariavarta»/«БМAgroup», 2006), «Рай коню» («БМAgroup», 2007), сінгл «Разьвітаньне з казой» (аўт. выд., 2004).

**Кіно, відэа: кліп** «Веснанчуха-балбатуха» (рэж. *Анатоль Вечар*, Ю. Выдронак, 2000; тое ж – рэж. Ю. Выдронак, Польшча, 2005), «Курка-рабушка» (рэж. Ю. Выдронак, 2006).

**Кантакт:** www.kv.minsk.by/uria; ur_ia@yandex.ru; ur_ia@yahoo.com; +375 (29) 669-75-19, (17) 256-75-19.

03.03.07//Д.П., фота Д.П.

**«USPLЁSK»** – група з Маладзечна, якая арганізавалася ў 2000.

Свой музычны стыль ўдзельнікі калектыву вызначаюць як «шчырасць». Рэпертуар уключае аўтарскія беларускамоўныя песні. На пачатку група складалася з Юрыя «Шуста» Шусціцкага – вакал, Глеба «Дзірта» Гневашава – гітара, Паўла Кудрына – флейта, барабаны (→ 2000), да якіх пазней далучыўся Аляксей «Панда» Кужко – бас-гітара, а за ім Ігар «Бэзіл» Стахіевіч – сэмплы і Максім «Макс» Юргевіч – барабаны. Склад актуальны й да гэтага часу.

**Гастролі:** Украіна (2003), Польшча (2006).

**Дыскаграфія: альбомы** «DErMO» (дэма, 2002), CD «КАРАгод» («USPLЁSK», 2005).

**Кантакт:** www.usplesk.org; usplesk@tut.by; +375 (29) 762-99-32.

05.04.06//Д.П.

**«ФЕСТИВАЛЬ»** – мінскі калектыў інструментальнай музыкі, які ўтварыўся ў 1990.

У першым складзе калектыву выступалі Уладзімір Бубен – акардэон, Мікалай Міхалькоў – бас-гітара; Валянцін Лаўрук – барабаны, Васіль Сячко – гітара, Валерый Папіўніч – клавішныя. У аснове рэпертуару разнастайная па стылях і жанрах музыка: арыгінальныя сучасныя творы для акардэона, народная, у стылі мюзэт, музыка, творы джазавай літаратуры ў аўтарскіх апрацоўках. Ад 2000 група выступае як квартэт на чале з дацэнтам БДПІ Уладзімірам Бубнам. Апрача яго, у складзе групы выступаюць Уладзімір Федарук – акардэон (адначасова *«Леприконсы»*), *Аляксандр Сапега* – барабаны (адначасова *«Apple Tea»*), Кірыла Канюшык – бас-гітара (адначасова «Леприконсы»). Калектыў ажыццявіў шэраг запісаў для радыёстанцый у Даніі, Швецыі, Польшчы, Беларусі.

**Гастролі:** канцэрты ў Польшчы, Францыі, Галандыі, Даніі, Швецыі і іншых краінах.

**Фестывалі:** міжнародныя конкурсы і фестывалі ў Нямеччыне (1993), Італіі (1996), Аўстрыі (1995), Літве (1996), Латвіі (1991), Даніі (1996, 1998, 2000, 2002), Швецыі (2002, 2003, 2005).

**Дыскаграфія:** «Domino» (аўт. выд., 2002), «All Of Me» (аўт. выд., 2002), «Vivat Accordeon» («Vigma», 2007).

**Кантакт:** +375 (29) 258-47-88 (У. Бубен); Bubenw2000@mail.ru

29.07.07//Д.П.

**ФІЛАТАЎ АНДРЭЙ «ФІЛ» (Филатов Андрей, Filatau Andrei)** – барабаншчык, гукарэжысёр.

Нарадзіўся ў Мінску 16.12.1954. Скончыў фізічны факультэт БДУ. Упершыню на музычнай сцэне выступіў у 1977 як удзельнік рок-групы *«Сузор'е»*, у складзе якой адпрацаваў да 1991, пасля чаго ўвайшоў у склад квартэту *«Zindan»*. Да 1994 працаваў як сесійны музыка і ўдзельнік розных праектаў. У 1999 пачаў выступаць у трыо *«Mojo Blues»*, ад 2000 адначасова – у групе



*«Крама»*. Ад сярэдзіны 90-х і да канца 2002 з'яўляўся гукарэжысёрам мінскага «Стар-клубу», выступаў як вядучы фестываляў «Блюз жыве ў Мінску». Аўтар тэксту адной з найбольш папулярных песень групы «Сузор'е» «Весенний день».

**Гастролі:** у складзе «Сузор'я» – гл.; у складзе групы «Zindan» – Непал, Нямеччына (1993).

**Фестывалі:** у складзе «Сузор'я» – гл.; у складзе «Mojo Blues» – «Blues na Kujawach» (2002, 2003), «Olsztynskie noce bluesowe», «Torun Blues Meeting», «Blues-Express», фестываль імя Р. Рыдла (Тыхі), усё Польшча, 2003; у складзе «Крамы» – «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2000–03, 2006, 2007).

**Узнагароды:** галоўны прыз V фестывалю імя Р. Рыдла ў Тыхах, Польшча, 2003 – камплект барабанаў «ТАМА».

**Дыскаграфія:** у складзе «Сузор'я» – гл.; МС «Zindan» («Ковчег», 1994); у складзе «Mojo Blues» – МС «Love Across The Ocean» («Ковчег», 1998), CD «I Gotta Move» («Ковчег», 1999), «Against The Destiny» («Ковчег», 2004); у складзе «Крамы» – «Хавайся ў бульбу» («Bulba Records/БМА-group», 2001), «Усё жыцьцё – дзіўны сон» (2007); «Spoonfull» (дэма, 2001).

**Кантакт:** mojoblues@mail.ru; +375 (29) 637-34-72.

26.10.04//Д.П., фота Д.П.

**ФІНБЕРГ МІХАІЛ (Финберг Михаил, Finberg Mikhail)** – трамбаніст, дырыжор, педагог.

Нарадзіўся 21.02.1947 у Мазыры. Скончыў музычную школу па класе скрыпкі, у 1970 БДК па класе трамбону, у 1980 – аспірантуру па класе дырыжавання. У 1970–87 працаваў галоўным дырыжорам аркестру Мінскага цырку, які выступаў у Мінску і Маскве з сольнымі праграмамі з твораў беларускіх кампазітараў і джазавай класікі як *Мінскі эстрадны аркестр*. З 1987 – мастацкі кіраўнік і дырыжор *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Разам з аркестрам падрыхтаваў шэраг спеўных і джазавых праграм (найперш з музыкі найлепшых біг-бэндаў свету), бенефісаў вядучых салістаў аркестру, як сябра і старшыня журы конкурсаў маладых выканаўцаў удзельнічаў у шэрагу фестываляў – «Славянский базар», «Золотой шлягер». Ініцыятар правядзення і арганізатар шэрагу фестываляў папулярнай, джазавай і камернай музыкі ў Мінску, Маладзечне, Заслаўі, Нясвіжы.

**Дыскаграфія:** разам з Мінскім эстрадным аркестрам – LP «Минский эстрадный оркестр» («Мелодия»,



1986); разам з Дзяржаўным канцэртным аркестрам – гл.
**Кантакт:** + 375 (17) 284-68-88.
12.03.06//Д.П., фота Ж. Маёравай

**«ФУ»** – віцебская група. Працуе ў надзвычай стракатым стылі, змешваючы практычна ўсё, апрача папулярнай і экстрэмальнай музыкі. Самі музыкі вызначаюць уласны стыль як гаражны джаз. Утварылася ў красавіку 1993. У першым складзе калектыву выступалі Міхаіл Рубін – гітара, вакал, Аляксандр Кражаў – гітара, вакал, Уладзімір Зайцаў – гітара (1998 → *«Nitkie»*). У кастрычніку 1994 да групы далучыўся барабаншчык Валянцін Касценка, выступаючы да канца 1997 (→ *«Алмазный фронт»*, «Шизгарабэнд» і інш.). Ад жніўня 1998 у групе выступае барабаншчык Дзяніс «Хэм» Дубко, ад жніўня 2003 – басгітарыст Дзяніс Дробны. Музыку і тэксты песень пішуць Міхаіл «Рэактар» Рубін (праграмаванне) і Аляксандр «Саня» Кражаў.
**Фестывалі:** «Смоленский проект 2002».
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Фолк» («BUTT Records» & «Фу», 2002), CD «Психоанализ» («BUTT Records» & «Фу», 2002); **трэкі** ў зборніках «Гимн любимому городу» («Белотон», СПб., 2000), «Психология цветов» («B.U.T.T. vol.1», «BUTT Records», 2000).
**Кантакт:** www.fu.vitebsk.net; the_fu@mail.ru; +375 (29) 639-17-67 (Саня).
15.04.04//Г.Ш.

**«FLAT»** – мінская група. Выступае ў стылі, набліжаным да музыкі канца 60-х, – біг-біт, рок-н-ролу. Утварылася ўвосень 1989 наступным складам: Эрнест Агірэ – гітара, вакал, Алег Кравар – гітара, вакал, *Алег Вінакураў* – бас-гітара, вакал, Ягор Дуднікаў – клавішныя, Дзмітрый Сіленка – барабаны. Ад 1991 у групе выступаў *Сяргей Пятроўскі* – гітара, клавішныя, ад 1995 *Піт Паўлаў* – гітара (→ *«N.R.M.»*), *Віктар Малчанаў* – гітара (1997), *Андрэй Сапоненка* – барабаны (ад 1995), з восені 1996 да пачатку зімы *Аркадзь Юшын* – гітара, ад 2001 з групай супрацоўнічае *Сяргей Анцішын* – гітара. У 2006 група працавала складам: Э. Агірэ, А. Вінакураў, А. Сапоненка, *Андрэй Дзяменцьеў* – гітара (← *«Кали Юга»*, адначасова *«P.L.A.N.»*). Група выконвае аўтарскія песні на ангельскай мове, а таксама стандарты рок-н-ролу і блюзу.
**Фестывалі:** «Тры колеры» (Мінск, 1990), «Beatles Forever» (Мінск, 2005, 2006), «Рок за бобров» (Бабруйск, 2005).
**Узнагароды:** прыз у намінацыі «Адкрыццё фестывалю» на фестывалі «Тры колеры».
**Дыскаграфія: альбом** МС «Street Boogie» («Vigma», 1997); **трэкі** «The Dead of Night» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003), «Write Me a Letter» (у зборніку «Первый Интернационал» – «Vigma», 2006), «Elizabeth» і «Write Me a Letter» (у зборніку «Рок за бобров 2005» – «West Records», 2005).
**Кантакт:** www.flat-music.com; info@flat-music.com; +375 (29) 620-31-55 (Э. Агірэ), (29) 656-50-21 (А. Вінакураў).
30.09.06//Д.П.

# Х

**ХАДАНОВІЧ СВЯТАСЛАЎ «СВЕТ» (Ходонович Святослав «Свет», Khadanovich Sviataslau «Svet»)**– піяніст, вакаліст, выканаўца на гармоніцы, шоўмэн.

Нарадзіўся 23.04.1980 у Мінску. Вучыўся ў музычным ліцэі пры БДК па класе Р. Пукста. У 2002 скончыў БДМІ па спецыяльнасці стаматалогія. Выступаць з канцэртамі пачаў у студэнцкія гады ў складзе блюзавага дуэту «Svet & Al». У 2003 дуэт пачаў супрацоўніцтва з вакалістам Валерыем Прахожым, які выступае пад псеўданімам Big Val. Паралельна ўтвараецца квартэт «Svet & Al Boogie Band», які пасля сыходу Эла ў 2004 прымае назву *«Svet Boogie Band»*. Аўтар музыкі і тэкстаў асноўнага ангельскамоўнага рэпертуару калектыву. У 2006 з гэтымі песнямі група выйграла беларускі адборачны тур міжнароднай музычнай акцыі «The Global Battle of The Bands», атрымаўшы права выступіць у фінале ў Лондане.

**Гастролі:** Расея (2003–07).

**Фестывалі:** «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2003, з ўдзелам Біг Вэла), «Zaduszki bluesowe» (Беласток, Польшча, 2003), «Очаково-Блюз» (Масква, 2003), «Blues. RU» (Масква, 2004), «Blues v lese» (Ржэўніцэ, Чэхія, 2004), «Пустые



холмы встречают весну» (Масква, 2005, 2007).
**Узнагароды:** першае месца ў конкурсе міжнароднага фестывалю «Noc Bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2003).
**Дыскаграфія: альбомы** «Live At JVL Art Club» (аўт. выд., 2004), «Happy With The Boogie» (аўт. выд., 2004), «Nothing But Love» («Maple Tree Studio», 2005), сінгл «Goin' 2 London» (аўт. выд., 2007); **трэкі** «Брось сигарету», «Три кота» (CD «Другая дорога» групы *«Slang»*).
**Кіно, відэа:** DVD «Live At JVL Art Club» (канцэрт у клубе JVL, Масква).
**Кантакт:** www.svetboogieband.com
27.07.07//Д.П., фота Д.П.

**ХАМЕНКА АЛЕГ (Хоменко Олег, Hamenka Aleh)** – спявак, гітарыст, кампазітар, паэт, аранжавальнік, тэле- і радыёвядучы.
Нарадзіўся 04.04.1967 у Мінску. Пачаў выступаць на сцэне ў канцы 80-х, у 1990 скончыў БУК па спецыяльнасці кіраўнік эстраднага аркестру. Працаваў метадыстам-інспектарам па Мінскай вобласці Міжсаюзнага дому самадзейнай творчасці.
У 1992 стаў ініцыятарам стварэння групы *«Палац»*, яе вядучым вакалістам і дырэктарам. Аўтар музыкі і тэкстаў песень «Вецер», «Ночы», «Кола грукатала», аўтар аранжаванняў песень «Як пайду я ў новую канюшню», «Чужыя дзеўкі», «Дзеўка-сямілетка», «А ў заенькі». Пасля сыходу ў 1998 з «Палацу» *Юрыя «Франца» Выдронка* – мастацкі кіраўнік калектыву. Разам з групай здымаўся ў мастацкім фільме «Анастасия Слуцкая», быў аўтарам і вядучым праграмы «Настаўніцкая» на тэлеканале «Лад» (2003–04), вядучым радыёверсіі хіт-параду «Тузін Гітоў». Аўтар ідэі і сцэнарыя фолк-мюзіклу «Возера» (2003, не пастаўлены). У 2004 годзе пастпіў у аспірантуру БДУКу па спецыяльнасці культуралогія.
**Узнагароды:** «Рок-карона 1996» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць», «Рок-карона 2001» у намінацыі «Кліп году» («На турэцкіх палях»).
**Гастролі:** краіны Усходняй і Заходняй Еўропы, Азіі.
**Фестывалі:** «Tanz und Folkfest» (Рудольштадт, Нямеччына, 1994), «Азія дауысы» (Алматы, Казахстан, 1995), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2007) і інш.
**Дыскаграфія:** у складзе «Палацу» – гл.; **трэкі** «Ночы» (у зборніках «Нашествие. Шаг второй» – «REAL Records», Расея, 1999, «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000), «Чужыя дзеўкі» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Русалкі» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000).
**Кіно, відэа:** фільм «Палац» (рэж. Ю. Ялхоў, «Белвідэацэнтр», 1998,



55 хв.), **кліпы** «На турэцкіх палях» (рэж. А. Хаменка, 2000), «А ў лузе» (рэж. *Анатоль Вечар*, 2003), удзел у мастацкім фільме «Анастасия Слуцкая» (рэж. Ю. Ялхоў, «Беларусьфільм», 2003).
**Кантакт:** www.palac.org; palace@tut.by, +375 (29) 616-51-81.
25.12.04//Д.П., фота Д.П.

**ХАНОК ЭДУАРД (Ханок Эдуард, Khanok Eduard)** – кампазітар. Нарадзіўся 18.04.1940 у зернесаўгасе імя Молатава Фёдараўскага р-ну Кустанайскай вобл. У 1962 скончыў ММВ па класе *Яўгена Глебава*, у 1969 – Маскоўскую кансерваторыю па класе Дз. Кабалеўскага і А. Пірумава. У 1969–72 – выкладчык музычна-педагагічнага факультэту Крываражскага педагагічнага інстытуту. Вярнуўся ў Беларусь у 1972. Ад 2003 жыве ў Маскве, памочнік дэпутата расейскай Думы І. Кабзона. Працуе пераважна ў жанры масавай папулярнай песні. Найбольш



вядомыя творы «Зима» (сл. С. Астравога), «Давай поговорим», «Ты возьми меня с собой» (абедзве – на сл. І. Рэзніка), «То ли еще будет», «Я у бабушки живу» (абедзве – на сл. І. Шаферана), «Малиновка» (сл. А. Папярэчнага), «Завіруха», «Молитва», «Конь незацугляны» (усе – на сл. *Генадзя Бураўкіна*), «Счастливый случай», «Прекрасная дама» (абедзве – на сл. Л. Рубальскай), «Вы шуміце, бярозы» (сл. *Ніла Гілевіча*), «Сумны саксафон» (сл. *Леаніда Пранчака*), «Здравствуй, чужая милая» (сл. Л. Татаранкі), «Самурай», аўтар музыкі для кіно і тэатру. Песні выконваюць *«Песняры»*, *«Верасы»*, *«Сябры»*, *Нэлі Багуслаўская*, *Ядвіга Паплаўская* і *Аляксандр Ціхановіч*, *Аляксандр Саладуха*, *Уладзімір Ухцінскі*, *Іна Афанасьева*, А. Пугачова, Э. Хіль, М. Пахоменка, Ю. Багацікаў і інш.
**Дыскаграфія: міньён** «Песни Эдуарда Ханка» («Мелодия», 1984); **трэкі** «Зима» (Вітас, CD «Песни моей мамы» – «Iceberg Music», 2004), «Песенка первоклассника» (А. Пугачова, CD «По острым иглам яркого огня» – «General Records», 1997), «Реченька туманная» (група «Чё те надо?», CD «Приходи-ка на чаек, выпьем водочки» – «Квадро-диск», 2001), «Ты возьми меня с собой» (А. Пугачева, CD «Ах, как хочется жить!» – «General Music», 1997), «Вы шуміце, бярозы», «Салавей спявае» («Сябры», абедзве ў LP «Шумите, берёзы» – «Мелодия», 1984), «Два полі», «Жар-птушка» («Сябры», абедзве ў LP «Судьбе спасибо» – «Мелодия», 1985), «Малиновка» («Верасы», EP «Верасы» – «Мелодия», 1980), «Малиновка», «Завіруха», «Я у бабушки живу»

(у CD «Популярные песни прошлых лет» ансамбля «Верасы» – «Vigma», 1996), «Малиновка», «Я у бабушки живу», «Завіруха» (у CD «От «Малиновки» и до...» дуэту Я. Паплаўская – А. Ціхановіч – «Bulba Records», 2001), «Здравствуй, чужая милая» (А. Саладуха, CD «Сотни километров до любви» – «Vigma», 2005), «Два полі» (сл. *Анатоля Вярцінскага*, у LP «Письмо из 45-го» – «Мелодия», 1985), «Белый аист» (у міньёне *Віктара Вуячыча* і ансамбля *«Тоніка»* «Песня, в которой ты» – «Мелодия», 1985), «Солнышко смеётся» (у LP «Нам мир завещано беречь» – «Мелодия», 1986), «Я поеду в Париж» (сл. *Алега Жукава*), «Счастливый случай» (сл. Л. Рубальскай), абедзве ў LP дуэту *Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч* «Счастливый случай» – «Мелодия», 1990), «Реченька туманная» (сл. А. Папярэчнага, у альбоме «Анна Герман» – «Мелодия», 1979), «Ничего не случилось» (сл. А. Гангава, у EP «Татьяна Кочергина» – «Мелодия», 1981), «Я у бабушки живу» (ансамбль «Верасы», у LP зборніку «Для вас, женщины» – «Мелодия», 1981), «Я у бабушки живу», «Солнышко смеётся» (абедзве ў EP «Бибигуль Омарова» – «Мелодия», 1983).

**Кнігі:** «Пугачёвщина. Теория волны» (1998).

**Кантакт:** khanok@mail.ru

12.11.06//Д.П.-В.Б.

**«ХАРЛІ»** – група з Мінску. Трымаецца стылю пап-року з элементамі фолку.

Утварылася летам 2002 з ініцыятывы *Яўгена Чалышава*, Рамана Арлова і Аляксандра Калтунова. Рэпертуар калектыву заснаваны на аўтарскіх песнях, якія выконваюцца на беларускай і расейскай мовах. Першапачатковы склад Я. Чалышаў, Юрый Вялюга – барабаны, Сяргей Храмцоў – бас-гітара, Уладзімір Эйсмант – гітара, *Карэн Карапецян* – скрыпка. У 2004 у склад калектыву ўваходзілі Я. Чалышаў – вакал, гітара, перкусія (← «НосПоВетру»), *Аляксей Зайцаў* – бас-гітара (← восень 2003), *Канстанцін Гарачы* – клавішныя (← восень 2003, адначасова *«Apple Tea»*), Андрэй Ускоў – гітара (← вясна 2003, *«Apple Tea»*), К. Карапецян, *Міхаіл Пенда* – барабаны (адначасова *«J:морс»*). Групай напісана песня «Футбол», якая цягам сезону 2004 з'яўлялася афіцыйным гімнам клубу «Дынама» (Мінск). Увёсну 2007 у групе выступалі Я. Чалышаў, К. Карапецян, М. Пенда, К. Гарачы, А. Ускоў, А. Зайцаў. Сярод найбольш вядомых песень «Свадзебка», «Родныя мясціны», «Танцы на палянцы», «Снежань», «Наварыла бабуля ежы», «Добрыя людзі», «Матылёк».

**Фестывалі:** «Беларускі турбаміксер» (Мінск, 2002), «Славянский базар» (Віцебск, 2003, 2004), «Золотой шлягер» (Магілёў, 2003).

**Узнагароды:** 1 прэмія імя У. Мулявіна ў намінацыі «ВІА» і прыз глядацкіх сімпатый каналу ОНТ на фестывалі «Золотой шлягер 2003».



**Дыскаграфія:** сінгл «Родныя мясціны» («Arlo Music», 2002), CD «Родныя мясціны» («Vigma», 2004), «Любовь – имя твоё» («Новая музыкальная культура», травень 2007); **трэкі** «Иван да Маня» (у зборніках «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000, «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Танцы на палянцы» (у зборніку «Русские горки», 2004), «Шлях» (у зборніку «Первый Интернационал» – «Vigma», 2006).
**Кіно, відэа: кліп** «Танцы на палянцы» (рэж. К. Наважылава, 2004).
**Кантакт:** www.viaxarli.com
15.05.07//Д.П.

**ХАРЭВІЧ ПАВЕЛ (Хоревич Павел, Kharevich Pavel)** – вакаліст, мультыінструменталіст, аўтар песень, аранжавальнік.

Нарадзіўся 10.04.1959 у Амурскай вобл., Расея. У 1989 скончыў Брэсцкую музычную вучэльню. Музычную кар'еру распачаў у 1984 як вакаліст і гітарыст брэсцкай групы «Треугольник». У 1988 – вакаліст групы «Поле чудес», ад 1989 да 1991 – вакаліст групы *«Сузор'е»*. Ад 1996 да 1998 працаваў у складзе джаз-аркестру «Буг-бэнд». У 1998 распачаў сольную кар'еру ў Брэсце, праз некалькі гадоў аднавіў супрацоўніцтва з «Буг-бэндам». Спявае на расейскай і беларускай мовах, найбольш вядомыя песні «Город над Бугом», «Манящий взор».
**Гастролі:** тур па Брэсцкай вобласці з групай «Поле чудес» (1988); у складзе групы «Сузор'е» – гастролі ў Польшчы, па Далёкім Усходзе, Цюменскай вобласці, у Казахстане, Беларусі.
**Фестывалі:** у складзе групы «Треугольник» – Рэспубліканскі фестываль моладзевай музыкі «Навапалацк 1988».
**Узнагароды:** спецыяльны прыз за артыстычнасць на фестывалі «Навапалацк 1988».
**Дыскаграфія: альбомы** МС «Город над Бугом» («Брестон», 1998), «Ты для меня...» («Брестон», 2000), «Огонь любви» («Брестон», 2001), «Слеза» («Арт-студия», 2005), «Место под солнцем» (2005); **трэкі** ў альбоме «Песня пра зубра» (група «Сузор'е», 2007).
**Кантакт:** +375 (29) 722-96-45, (162) 22-96-45; pashakhar@mail.ru.
03.12.05//Д.П.

**ХАСАНШЫНА КАЦЯРЫНА (Хасаншина Екатерина, Khasanshina Catherine)** – вакалістка, гітарыстка.

Нарадзілася 21.08.1981. Першыя ўласныя песні напісала ва ўзросце 12–13 гадоў. Упершыню з'явілася на сцэне ў 1999 на Брэсцкім абласным фестывалі аўтарскай песні. Тады ж былі запісаны тры акустычныя альбомы (не выдадзены). У 2000 упершыню выступіла з групай. У акустычным варыянце працуе ў стылі аўтарскай песні і бард-року, у складзе групы схіляецца да стылю брыт-пап. Выступала й як журналістка.
**Дыскаграфія: трэкі** «Мама» (у зборніку «Я в Бресте» – «Art Classic Company», 2002), «Капитан», «Троллейбус» (у зборніку «Я в Бресте 2» – «Art Classic Company», 2003).
**Кантакт:** +375 (162) 26-42-17 (пр.), (162) 23-87-82 (х.), адміністратар Ірына Румянцава rumianceva@hotmail.com.
24.03.04//Г.Ш.

**ХВІСЕВІЧ АНДРЭЙ (Хвисевич Андрей, Hvisevich Andrey)** – музыка, ды-джэй, аранжавальнік.

Нарадзіўся 23.03.1977 у Іванаве Брэсцкай вобл. У 1996 скончыў музычную вучэльню ў Маладзечне па класе баяна, у 2002 – БДУК па класе камп'ютэрнай музыкі і аранжавання. У 1997 увайшоў у склад групы *«Камэлот»*, ад 1999 выступаў у складзе групы *«Ur'ia»*. Ад 2001 супрацоўнічае з групай *«Палац»*, для якой зрабіў шэраг дыскатэчных аранжаванняў народных песень.

**Гастролі, фестывалі:** гл. «Палац» (ад 2001).

**Дыскаграфія: альбомы** «Танчыць «Палац» («Aist Records»/«Bulba Records», 2001), «Сьвяточны» («Aist Music», 2003); **трэкі** «Русалкі» (у зборніку «20 супер-хитов, рожденных в Беларуси-3» – «Bulba Records», 2000), «Ночы» (у зборніку «20 супер-хитов, рожденных в Беларуси» – «Bulba Records», 2000).

**Кантакт:** djray@tut.by, +375 (29) 633-03-77.

05.03.04//Д.П.




**ХЛЯСТОЎ АЛЯКСЕЙ (Хлестов Алексей, Hliastou Aliaksey)** – спявак, выканаўца папулярнага рэпертуару.

Нарадзіўся 23.04.1976 у Мінску. Скончыў сярэднюю школу з музычным ухілам па класе фартэпіяна, выступаў у ВІА «Ровесник». Вучыўся ў прафтэхвучэльні. Ад 1991 – на прафесійнай эстрадзе, на працягу трох гадоў працаваў у студыі *«Сябры»*, выступаў у дуэце з братам *Андрэем Хлястовым*. У канцы 1996 з'ехаў працаваць у Бахрэйн, дзе адбыў з перапынкамі 6 гадоў. Вярнуўшыся ў Мінск у лютым 2003, пачаў працу ў студыі і ў выніку з'явіўся шэраг песень. Выступае ў стылі папулярнай песні, спявае пераважна на расейскай мове. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Ворваться в небо», «Ничего не случилось», «Доброе утро».

**Гастролі:** туры па Беларусі, уключна з Прэзідэнцкім аркестрам (2004, 2005).

**Фестывалі:** «Славянский базар» (1994); міжнародны конкурс «Новая волна» (Юрмала, Латвія, 2005).

**Узнагароды:** 1 месца на цырымоніі «Мистерия звука 2005» у намінацыі «Сінглы беларускіх выканаўцаў» («Ворваться в небо»).

**Дыскаграфія: альбом** CD «Ответь мне почему» («West Records», 2003), сінгл «Ворваться в небо» («West Records», 2005), CD «Потому что я люблю» («West Records», 2006); **трэк** «Не сбылось» (у зборніку «XXXL. 11 выпуск»).

**Кіно, відэа: кліп** «Где ты» (разам з Андрэем Хлястовым, рэж. *Уладзімір Максімкаў*).

**Кантакт:** www.khlestov.com; khlestov@tut.by

19.02.06//Д.П.

**ХЛЯСТОЎ АНДРЭЙ (Хлестов Андрей, Hlestov Andrey)** – спявак, выканаўца папулярнага рэпертуару.
Нарадзіўся 20.05.1970 у Мінску. Скончыў ССТВ №8 па спецыяльнасці слесар-рамонтнік. У 1990–92 працаваў адміністратарам рэдакцыі музычных праграм БТ. У 1993–95 – саліст-вакаліст *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, у 1997–99 – саліст ансамбля *«Сябры»*.
У 2000 распачаў сольную кар'еру, ад 2006 – мастацкі кіраўнік вакальнай студыі «Вояж». Спявае на расейскай і беларускай мовах песні, вытрыманыя ў стылі папулярнай музыкі, мае ў рэпертуары творы сусветнай пап-класікі. Сярод найбольш вядомых песень «Будзь разам з намі» (муз. *Алега Аверына*, сл. А. Вавілава), «Твист» (муз. і сл. А. Аверына), «Спасибо тебе» (муз. *Алега Елісеенкава*, сл. С. Пракаповіча).
**Гастролі:** Украіна, Малдова, Расея, Беларусь.
**Фестывалі:** І рэспубліканскі конкурс папулярнай музыкі (Мінск, 1990), Міжнародны конкурс папулярнай песні «Vilnius 1991», «Славянский базар» (Віцебск, 1992), «Sopot 1992» (Польшча).
**Узнагароды:** лаўрэат І прэміі рэспубліканскага конкурсу папулярнай музыкі (Мінск, 1990), лаўрэат Міжнароднага конкурсу папулярнай песні «Vilnius 1991», лаўрэат ІІ прэміі конкурсу маладых выканаўцаў на фестывалі «Славянский базар» (Віцебск, 1992), уладальнік спецпрызу прэсы на Міжнародным конкурсе папулярнай песні ў Сопаце (Польшча, 1992).




**Дыскаграфія: альбом** «Спасибо тебе» («Проспект», 2006).
**Кіно, відэа: кліп** «Где ты» (разам з *Аляксеем Хлястовым*, рэж. *Уладзімір Максімкаў*).
**Кантакт:** +375 (17) 286-03-32.
05.02.07//А.Р.

**«HAIR PEACE SALON»** – калектыў з Мінску.
Першы канцэрт датуецца лютым 2002, калі група выступала складам Алег Вяль – гітара, вакал, Максім Дзевічэўскі – бас-гітара, Аляксандр Вашчыла – барабаны. Група трымалася стылю інды-року з элементамі гранджу, ню-метал, апошні час выразна схіляецца да брыт-року. Увосень 2002 да групы далучыўся Вадзім Дубіна – гітара, на пачатку 2005 Андрэй Козік – клавішныя, гітара, бэк-вакал, у лютым 2006 на месца В. Дубіны прыйшоў Вадзім Ісаеў.
У другой палове 2007 у групе выступалі А. Вяль, М. Дзевічэўскі, В. Ісаеў, Артур Лучкоў – барабаны, Канстанцін Карман – клавішныя, вакал (← *«Jitters»*).
**Фестывалі:** «Puieridetta Musica/Музыка без границ» (Нарва, Эстонія, 2004), «Басовішча» (вольная сцена, Гродэк, Польшча, 2005), «Рок-кола» (Полацк, 2005), «Fiesta Borealis» (Алецка, Польшча, 2006).
**Дыскаграфія:** сінглы «Next Level» (аўт. выд., 2004), «Hover» (аўт. выд., 2005), CD «Split Before, Together




Now» (сумесна з «Jitters» – «West Records», кастр. 2007).
**Кантакт:** www.hairpeacesalon.com; vialic@hotmail.com, hps@mail.by; +375 (29) 608-21-47 (Алег), (29) 664-25-46 (Артур).
25.10.07//Д.П.

**«HAPPY FACE»** – група з Маладзечна.
**Узнагароды:** «Рок-карона 1998» у намінацыі «Дэбют году».
**Дыскаграфія: альбомы** «Grunge?!» (1998), «Рваное время» (1999).

**«HASTA LA FILLSTA»** – група з Мінску.
Утварылася ў 1996, выступаючы ў стылі альтэрнатыўнага року і выконваючы пераважна аўтарскія творы на ангельскай мове. У першым складзе выступалі *Канстанцін Калеснікаў* – бас-гітара, Сяргей Канановіч – гітара, Крысціна Мендзялеева – вакал, Дзмітрый Харытановіч – барабаны. У лістападзе 1998 у групу прыйшоў Уладзіслаў Плюшчаў – бас-гітара. Група спыніла існаванне ў 1999. К. Калеснікаў прымае ўдзел у групах *«IQ48»*, *«Пара Рублей»*, *«Zygimont Vaza»*, *«Крок»*, С. Канановіч – у групах *«Крамбамбуля»*, *«ZET»*, як бас-гітарыст у складзе групы «Pomidor/off», У. Плюшчаў – у групах «Крамбамбуля», «ZET», Дз. Харытановіч – у групах *«Леприконсы»*, «Pomidor/off».
**Узнагароды:** К. Мендзялеева ў 1998 была адзначана «Рок-каронай» у намінацыі «Рок-князёўна».
**Дыскаграфія: альбом** MC «Hasta la fillsta» («Скат рекордс», 1997); **трэк** «Стаіць вярба» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997).
**Кантакт:** www.hastalafillsta.com
20.09.05//Д.П.

**«HELTER-SKELTER»** – мінская група.
Утварылася ў 1986 і напачатку арыентавалася на стыль пост-панку, потым схілялася ў бок хэві-року з элементамі часам глэм-року. Самі музыкі вызначалі ўласны стыль як рок-н-дэс. У канцы 1991 група выступала наступным складам: Міхаіл Лукашэвіч – барабаны, Мікалай Афанасьеў – бас-гітара, Яўген Беленькі – клавішныя, Яўген Цылікаў – гітара (→ *«Partyzone»*), Сяргей Платон – гітара. Група выконвала аўтарскія ангельскамоўныя песні.
05.08.07//Д.П.

# Ц

**ЦВЯТКОВА ІРЫНА (Цветкова Ирина, Tsviatkova Iryna)** – кампазітар, аранжавальнік, піяністка.
Нарадзілася ў 1950 у Загорску Маскоўскай вобл. Скончыла БДК па класе фартэпіяна М. Бергера (1975), па класе кампазіцыі *Яўгена Глебава* (1985). Выступала як піяністка ў складзе ансамбля *«Верасы»*. Аўтар мюзіклу «Казачны круіз», фантазіі для аркестру і сінтэзатараў, песень, шэрагу аранжаванняў. Сябра Саюзу кампазітараў Беларусі.
**Дыскаграфія:** гл. «Верасы».
26.02.06//Д.П.

**ЦІВУНОЎ Алег (Тиунов Олег, Tsivunou Aleh)** – спявак, кампазітар, выступае ў стылі традыцыйнай папулярнай песні.
**Дыскаграфія: трэкі** «Красное танго», «Расцвела сирень», «Ты меня не бросил» (на словы *Аляксандра Лягчылава*, у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999).

**ЦІХАМІРАВА МАРЫНА (Тихомирова Марина, Tikhomirova Marina)** – радыёжурналістка.
Нарадзілася 30.08.1961 у Мінску. У 1980 скончыла ММВ па спецыяльнасці тэорыя музыкі, у 1985 – філалагічны факультэт БПІ імя Горкага. Да 1996 працавала педагогам у музычных і агульнаадукацыйных школах Расеі, Украіны, Мінску, у 1995–96 – галоўны рэдактар прыватнай газеты «Ассорти-пресс» (Савецкая Гавань, Расея), ад 1997 – рэдактар, ад 2001 – каментатар музычнай рэдакцыі Беларускага радыё (канал «Культура», І нацыянальны канал). Займаецца прапагандай музыкі розных часоў і жанраў, пытаннямі гісторыі, эстэтыкі, філасофіі і псіхалогіі мастацтва. Практыкуе рэдкія для Нацыянальнага радыё жывыя канцэрты ў эфіры, аўтар і вядучая такіх праграм, як «Музычны партал», «Ноч блюза», «Джазавы парадокс», «Лёгкая музыка», «Музычная планета», «Залатое сячэнне».



**Фестывалі:** «Золотой шлягер» (Магілёў), «Славянский базар» (Віцебск), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча).
**Кантакт:** www.marina.exists.ru; marina_ti_2001@yahoo.co.uk
16.04.06//Д.П., фота Д.П.

**ЦІХАНОВІЧ АЛЯКСАНДР (Тиханович Александр, Tihanovich Alexander)** – спявак, бас-гітарыст, прадзюсэр.

Нарадзіўся 13.07.1952 у Мінску.

У 1982 скончыў аддзяленне духавых і ўдарных інструментаў БДК па класе тубы Р. Лагонды. Дэбютаваў на сцэне ў 1970, як бас-гітарыст выступаў у шэрагу самадзейных калектываў. Ад 1973 да 1987 – бас-гітарыст, вакаліст ВІА «Верасы», унутры якога ў 1976 утварыўся сямейна-творчы *дуэт Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч*. Ад 1987 да 1989 – саліст Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі. У 1989 разам з Я. Паплаўскай сабраў групу «Счастливый случай», на аснове якога ўзнік Тэатр песні. Новае творчае аб'яднанне зрабілася ініцыятарам правядзення міжнародных фестываляў «Беларусь збірае сяброў», тэлемарафону «К Храму, Миру и Согласию», сумеснай беларуска-расейскай шоў-праграмы «Поп-ТВ», шэрагу іншых акцый з удзелам зорак эстрады СНД і беларускай творчай моладзі. У 1994 Тэатр песні пераўтварыўся ў «Студыю А. Ціхановіча і Я. Паплаўскай». Ад 2002 – музычны кіраўнік тэлеканалу «СТВ», аўтар, прадзюсэр і вядучы праграм «Хит-момент» і «Театральные истории». Генеральны прадзюсэр цэнтру «Профиартвидеон».

Сярод найбольш вядомых твораў як кампазітара песні «Байконур», «Здравствуй, друг», «Вспоминай», «Цыганка», «Белая ружа», «Осень в Версале», «Жизнь – прекрасный миг», «Хозяйка бала», «Говори о любви», «Расшумелись тополя», «История любви».

**Гастролі:** дзяржавы СНД, Балгарыя, Польшча, Вугоршчына, Чэхія, Славакія, Нямеччына, Фінляндыя, Славенія, Манголія, Францыя, Канада, Ізраіль.

**Фестывалі:** палітычнай песні ў Фінляндыі, Балгарыі, Югаславіі, Расеі, «Славянский базар», тэлеконкурс «С песней по жизни», «Песня года» (Расея), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна», «Мело-



дии двух сердец» (Украіна), «Звезды Амура» (Расея), «Магутны Божа» (Беларусь) і інш.

**Узнагароды:** лаўрэат прэміі ЛКСМБ (у складзе «Верасоў», 1979), Ганаровая грамата Вярхоўнага Савету БССР (1986).

**Дыскаграфія:** у складзе «Верасоў» – гл.; у складзе дуэту Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч – гл.; **трэкі** – «Завіруха» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Жёлтый лист» (сл. *Аляксандра Лягчылава*, у LP дуэту Ядвіга Паплаўская – Аляксандр Ціхановіч «Счастливый случай» – «Мелодия», 1990).

**Кантакт:** n-tihanovich@mail.ru, isz@mail.ru; +375 (17) 236-95-03.

08.05.04//Д.П., фота Д.П.

**ЦІХАНОВІЧ НАСТАССЯ (Тихонович Анастасия, Tikhanovich Anastasiya)** – спявачка, выканаўца папулярнага і джазавага рэпертуару.
Нарадзілася 23.12.1980 у Мінску.
У 1999 скончыла Рэспубліканскі каледж мастацтваў, музычнае аддзяленне па класе фартэпіяна, у 2003 – Інстытут сучасных ведаў, факультэт мастацтваў. Дэбютавала на сцэне ў 2000 на Нацыянальным фестывалі песні і паэзіі ў Маладзечне, у наступным годзе брала ўдзел у праграме Міжнароднага фестывалю «Золотой шлягер» у Магілёве, была адзначана дыпломам Міжнароднага фестывалю «Vilnius 2002», выступала ў Літве і Украіне. Выконвае як творы класічнай эстрады, так і джазавыя стандарты. Удзельнічае ў паказах літаратурна-музычнай кампазіцыі «Покаяния двери», выступае як тэлевядучая. Сярод найбольш вядомых песень «Развітанне» (муз. *Ядвігі Паплаўскай*, сл. *Леаніда Пранчака*), «Для счастья полмира» (муз. С. Ждановіча, сл. М. Кожуха).
**Гастролі:** Беларусь, Украіна, Расея, Літва.
**Фестывалі:** «Vilnius 2002», «Мелодыі двух сэрцаў» (Кіеў, 2003).



**Кантакт:** n_tihanovich@mail.ru; isz@mail.ru.
04.02.04//Д.П.

**ЦЫБІН ЮРЫЙ (Цыбин Юрий, Tsybin Yury)** – паэт, прадзюсэр, журналіст, выдавец.
Нарадзіўся 25.12.1954 у Мінску.
У 1977 скончыў БДІНГ. У 1981–89 працаваў музычным аглядальнікам газеты «Знамя юности», у 1986–88 быў адным з арганізатараў і сябраў журы Рэспубліканскага фестывалю папулярнай музыкі ў Наваполацку. Ад 1987 да 1993 – выдавец і галоўны рэдактар часопісу «Популярная музыка», выдавец музычнай газеты «Сорока». У 1988–92 быў прадзюсэрам радыёпраекту «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай», арганізатарам канцэртаў пад гэтай назвай, наладзіў выданне шэрагу альбомаў на фірме «Мелодия» (аўтарскія альбомы Г. і Б. Вайханскіх, А. Длускага, групы *«Мроя»*, двайнога альбому «Хіт-парад «БМ»). У 1990 выступіў як заснавальнік і выдавец паэтычнай серыі выдавецтва «Ковчег» (усяго 8 зборнікаў з вершамі Д. Строцава, *Фелікса Аксёнцава*, *Адама Глобуса*, М. Мермана, Т. Сапач, А. Казанцавай, *Лявона Вольскага*, *Зміцера Лукашука*, С. Кныша, А. Сыса, *Міхала Анемпадыстава*).
У 1992–96 арганізаваў серыю канцэртаў «Рок па вакацыях», асобныя музычныя праекты «Будзь разам з намі», «Рок супраць рэвалюцый», канцэрт Данчыка ў Мінску, займаўся арганізацыяй першых паездак беларускіх музыкаў на фестываль «Басовішча». Ад 1994 да 2007 – заснавальнік і прадзюсэр штогадовай цырымоніі «Рок-каранацыя». Усяго ад 1990 да 2005 выдаў і аказаў падтрымку ў выданні больш чым 250 альбомаў з запісамі беларускіх музыкаў, музычных хрэстаматый, народных казак, радыёпраектаў.

Як паэт піша на расейскай мове, супрацоўнічае з шэрагам беларускіх і расейскіх кампазітараў і выканаўцаў. Найбольш вядомыя песні «На ветру» (А. Буйноў, *Аляксандр Саладуха*), «Страус и фламинго» (*Іскуі Абалян*), «Две свечи», «Самолет» (усе – на музыку *Алега Елісеенкава*), музычных радыёэсэ «Лестница в небо», «Человек, которому хотелось всего», «Танец полнолуния» («Беларуская маладзёжная», 1994).

**Кнігі:** зборнікі паэзіі «На ветру» («Ковчег», 1993), «Ноша» (разам з мастаком І. Шчолакавым, «Ковчег», 1997).

**Дыскаграфія: альбом** CD «На ветру» (зборнік песень А. Елісеенкава, А. Атрашкевіч на ўласныя вершы ў выкананні І. Абалян, А. Буйнова, А. Елісеенкава, Д. Сяргеева, А. Саладухі, 2005).

**Кантакт:** +375 (29) 657-65-85, pasha-cybin@mail.ru

16.07.06//Д.П.

**ЦЫГАНОК АЛЯКСАНДР (Цыганок Александр, Tsyganok Aleksandr)** – гітарыст, аранжавальнік, вакаліст, педагог.




Нарадзіўся 02.09.1956 у г. Шахты Растоўскай вобл., Расея. У дзяцінстве браў прыватныя ўрокі на фартэпіяна, ігрой на гітары авалодаў самастойна. Выступаць на сцэне пачаў у 1974. Ад 1974 да 1975 – удзельнік гомельскага ВІА «Радимичи», ад 1976 да 1978 выступаў у складзе ВІА *«Молодость планеты»*, наступныя два гады – у складзе гомельскай групы «Гонг». Падчас службы ў войску быў музыкам ансамбля песні і танца «Тачанка» ў Барысаве, пасля 1983 утварыў уласны калектыў «Кофейные разговорчики», у 1993 заснаваў групу «Narrator», ад 2004 – *«Al Narrator Orchestra»*. Асноўную ўвагу апошнія гады надае класічнаму блюзу і яго разнавіднасцям: каджун-зайдэка, дып саўс блюз. Піша аўтарскія творы ў згаданым стылі.

**Гастролі:** клубныя канцэрты ў Мінску, Маскве, Кіеве, Берліне.

**Фестывалі:** «Saint-Aman Rock» (Савібр, Францыя, 1995), фестываль альтэрнатыўнай музыкі ў Абердыне (Вялікабрытанія, 1996), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005), «Zaduszki bluesowe» (Беласток, Польшча, 2005).

**Узнагароды:** І месца ў конкурсе на міжнародным фестывалі «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2005).

**Дыскаграфія:** дэма CD «Al Narrator Orchestra» (2004).

**Кантакт:** guitalex@yandex.ru; +375 (232) 77-59-95 (х.).

20.02.06//А.Ц., фота Д.П.

# Ч

**ЧАЛЫШАЎ ЯЎГЕН (Чалышев Евгений, Chalishev Evgenii)** – аўтар музыкі і тэкстаў, спявак. Нарадзіўся 18.03.1983 у Магнітагорску, Расея. У 2003 скончыў Інстытут сучасных ведаў у Мінску па спецыяльнасці артыст эстрады, выкладчык музыкі (па класе *Валерыя Дайнэкі*), у 2006 – Маскоўскі юрыдычны ўніверсітэт па спецыяльнасці юрыст. Музычную кар'еру распачаў у 1999 як саліст праекту «НосПоВетру», у 2002 стаў ініцыятарам стварэння і асноўным аўтарам рэпертуару ВІА *«Харлі»*. Адначасова займаўся сольнай кар'ерай, пісаў творы для беларускіх выканаўцаў *Паліны Смолавай*, *Вольгі Барабаншчыкавай*, Яны, Н. Пальчэўскай, *Ядвігі Паплаўскай* і *Аляксандра Ціхановіча* і інш. У канцы 2005 стварыў ангельска-французскі праект «The Project», пакінуў яго ў ліпені 2007. Удзельнік фіналу расейскага тэлепраекту «Народный артист-2» (Масква, 2004), паўфіналіст міжнароднага конкурсу «Новая волна» (Масква, 2005). Найбольш вядомыя творы – для ВІА «Харлі»: «Танцы на палянцы», «Наварыла бабуля ежы», «Купалiначка», «Любовь – имя твое», «Ниоткуда чудо», «Сьнежань», «Матылёк»; для В. Барабаншчыкавай: «Не поверю», «Возьми меня», «На двоих»; для П. Смолавай: «Пьяная весна».



**Гастролі:** у складзе ВІА «Харлі» – выступленні ў маскоўскіх клубах (2005), Дні славянскай культуры ў Латвіі (Рыга, 2005), гастрольны тур па Беларусі ў рамках праекту «Народный артист» (2005).

**Фестывалі:** V Рэспубліканскі фестываль «Песни юности наших отцов» (Віцебск, 1999), Міжнародны фестываль эстрадных выканаўцаў «Славянская звезда» (Арол, Расея, 2000), міжнародны конкурс эстраднай творчасці «Жемчужина Ялты» (Ялта, Украіна, 2001), «Золотой шлягер» (Магілёў, 2003), «Славянский базар» (Віцебск, 2004), «Народная хвіля. Welcome to Ukraine» (Кіеў, Украіна, 2005), «Танцы на палянцы» (Мінск, 2005), Міжнародны фолкфэст «Siabrouskaja Biasieda» (Беласток, Польшча, 2005).

**Узнагароды:** у складзе ВІА «Харлі»

лаўрэат I прэміі імя У. Мулявіна Міжнароднага фестывалю «Золотой шлягер» у намінацыі «ВІА», лаўрэат II прэміі Міжнароднага конкурсу эстрадных выканаўцаў «Жемчужина Ялты» (Ялта, Украіна, 2002), лаўрэат I прэміі Міжнароднага фестывалю эстрадных выканаўцаў «Славянская звезда 2000», (Арол, Расея).
**Дыскаграфія:** у складзе ВІА «Харлі» – CD «Родныя мясьціны» (2004), «Любовь – имя твоё» («Новая музыкальная культура», травень 2007).
**Кіно, відэа: кліпы** «Танцы на палянцы» (рэж. К. Наважылава, 2003), «Пелагея» (АНТ, 2004), «Сьнежань» (АНТ, 2005).
**Кантакт:** www.viaxarli.com; evgenii_chalishev@viaxarli.com; luda@viaxarli.com; +375 (29) 667-40-52 (Людміла).
15.05.07//А.Р.

**ЧАРАДНІЧЭНКА СВЯТЛАНА (Чередниченко Светлана, Cherednichenko Svetlana)** – спявачка, аўтар уласных песень.
Нарадзілася 22.03.1982 у г. Партызанску Прыморскага краю, Расея. У 1987 з сям'ёй пераехала ў Брэст. Навучэнка бухгалтарскай школы. Першыя песні напісала ў 1996–97. Піша на расейскай мове. У 2000 запісала альбом «Автостоп», у якім арыентавалася на «ленінградскую» школу – творчасць «Алисы», «ДДТ», Башлачова і інш. У 2003 запісала акустычнае дэма «Я – земля», адначасова з аднаразовым электрычным праектам «Птичь» (прадзюсэр Анатоль Харытонаў) запісала песню «Зима», стылёва арыентаваную на пап-рок. У 2006 запісала акустычны альбом «Эгоизмы». У 2000 выступала як музычны журналіст газеты «Брестский курьер», працуе ў абласной бібліятэцы імя М. Горкага. Найбольш вядомая песня «Зима».
**Фестывалі:** фестываль андэграўндавай музыкі «Автостоп 2000» (каля Брэсту, травень 2000).
**Дыскаграфія: альбом** CD «Эгоизмы» (аўт. выд., 2006).
**Кантакт:** +375 (162) 23-99-19 (х.), (162) 23-21-15 (пр.); (29) 795-38-03 (маб.); cherednichenk@yandex.ru.
21.10.06//Г.Ш.

**«ЧАРАЎНІЦЫ»** – жаночы ВІА.
Быў арганізаваны Генадзем Лятынскім у Гродне ў 1971 пры ДК тэкстыльшчыкаў. У пачатковым складзе калектыву выступалі Людміла Лятынская – барабаны, Таццяна Несцерава – саксафон, Лідзія Кіслоўская – піяніна, *Надзея Мікуліч* – бас-гітара, Людміла Маркоўская – гітара. Па першым часе рэпертуар ансамбля засноўваўся выключна на інструментальных п'есах. У жніўні 1974 калектыў быў запрошаны ў штат БДФ, рэпертуар пашырыўся за кошт апрацовак беларускіх народных песень, твораў беларускіх, савецкіх кампазітараў, а таксама расейскамоўных версій твораў з рэпертуару груп «Chicago» і «Blood, Sweat & Tears». У якасці аранжавальнікаў з групай супрацоўнічалі А. Архіпаў, Ю. Рымашэўскі, *Барыс Бернштэйн*, *Аляксандр Бурштэйн*, у 1975–77 вядучай вакалісткай калектыву была С. Кульпа. У 1983–84 у ансамблі выступалі Аляксандра Канстанцінава – клавішныя, аранжаванні, кампазіцыя, Марыя Скірда – гітара, Наталля Калініна – барабаны,

Вольга Макушынская – бас-гітара, Марыя Руткоўская – вакал, труба, Вера Галавачова – вакал, Людміла Пасмурцава – труба, Таццяна Несцерава-Бурунова – саксафон, Людміла Навумовіч – трамбон. Усяго ў рэпертуары калектыву было больш за 500 песень, якія выконваліся на беларускай, расейскай, ангельскай мовах. Найбольш вядомыя «Пах чаборовы» (муз. *Уладзіміра Будніка*, сл. К. Кірэенкі), «Не за очи чёрные», «Ручаёчак-ручаінка», «Зачараваная» (муз. У. Будніка), «Падушачка» (нар., аранж. Ю. Рымашэўскага). Ад 1990 ансамбаль – штатная адзінка Мінскканцэрту. Калектыў спыніў існаванне ў 1992.

**Гастролі:** па СССР.

**Фестывалі:** Усесаюзны конкурс «Алло, мы ищем таланты» (1973), «Огни магистрали» (1978), «Мэрцішор» (Малдова, неаднаразова), «Киевская весна», удзел у культурнай праграме Алімпійскіх гульняў у Маскве (1980).

**Узнагароды:** лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (Масква, 1978).

**Дыскаграфія:** міньён «Чараўніцы» («Мелодия», 1982), LP «Чараўніцы» («Мелодия», 1978).

**Кіно, відэа:** 2 песні ў фільме *Уладзіміра Арлова* «Отрывки из ненаписанного» (пра Я. Глебава)

**Кантакт:** +375 (17) 250-58-58, (29) 766-10-12 (Г. Лятынскі).

27.11.06//Д.П.

**«ЧЕРНЫЙ ДРОЗД»** – група з Кобрыну Брэсцкай вобл.

Выконвае музыку ў стылі канца 60-х мінулага стагоддзя з уключэннем элементаў брыт-пап і іншых сучасных стыляў. Утварылася на пачатку 1996, першапачаткова выступаючы пад назвай «Дрозд» наступным складам: Аляксандр «Дрозд» Нікалайчук – лідэр, вакал, гітара, Андрэй Алексеевіч – бас-гітара, Андрэй Нікалайчук – гітара, Сяргей Пякарскі – барабаны. Пасля некалькіх зменаў складу ад жніўня 2003 у групе выступаюць Аляксандр «Дрозд» Нікалайчук, Андрэй Нікалайчук, Юрый Каралюк – лідэр-гітара, Сяргей «Мартын» Мартынюк – барабаны.

**Дыскаграфія: трэк** «Ты просто монстр» (у зборніку «Брестский рок-журнал» – «Брестон», 1998).

**Кантакт:** +375 (29) 680-28-92 (Юрый).

01.04.04//Г.Ш.

**«ЧЕХОВ»** – мінская група. Утварылася летам 2000 дзеля выканання музыкі ў стылі пап-року.

Ля заснавання групы стаялі аўтар тэкстаў і вакаліст Вячаслаў Бандарэнка і аўтар музыкі гітарыст Раман Арлоў. Песні выконваюцца на расейскай мове. Найбольш вядомыя творы «Ламбретта и Мини», «007», «Ночь миллиона евро», «Выше всего» (з удзелам Уладзіміра Пугача – *«J:морс»*).

**Фестывалі:** «Наша музыка» (Мінск, 2005).

**Дыскаграфія: міні альбом** «Чехов» (аўт. выд., 2002), CD «… все что



движется» («MSH Records», 2006); **трэкі** «Ламбретта и мини» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000).
**Кіно, відэа: кліп** «Ламбретта и мини» (рэж. А. Бартлава, 2002).
**Кантакт:** +375 (29) 630-80-30 (Р. Арлоў).
11.04.06//Д.П.

**«ЧИСТОЕ СЕРЕБРО»** — мінская група, якая трымалася стылі арт-року.
Утварылася ў 1988 як трыо складам: Уладзімір Зялінскі – вакал, гітары, рытм-праграмаванне, Канстанцін Сакалоўскі – клавішныя, Аляксандр Салаўёў – бас-гітара. Рэпертуар калектыву засноўваўся на аўтарскіх творах, якія выконваліся на ангельскай і расейскай мовах. Сярод найбольш вядомых «Карнавал», «Романс». У розны час у групе выступалі Аркадзь Дорфман – барабаны, Алег Хамутоў – гітара, Юрый Задзіран – гітара (→ *«Ur'ia»*), Алег «Паганіні» Усціновіч – бас-гітара (→ *«Лявоны»*). Група спыніла існаванне ў 2003.
**Фестывалі:** «Азія дауысы» (Алма-Ата, 1990), «Тры колеры» (Мінск, 1990).



**Узнагароды:** III прэмія на фестывалі «Тры колеры» (Мінск, 1990).
**Дыскаграфія:** зберагліся запісы, зробленыя ў Мінску (1989), Беластоку (2001).
**Кантакт:** +375 (29) 264-15-42 (К. Сакалоўскі), 114-52-64 (Ю. Задзіран).
20.10.07//Д.П.

**«CHERRYVATA»** – калектыў з Мінску. Утварыўся ў 2003 дзеля выканання музыкі ў стылі эйсід-джаз, трып-хоп, брэйкс і да т.п.
Напачатку група выступала як дуэт складам: Дзмітрый Літвіновіч – аранжаванні, клавішныя, праграмаванне і Аляксей Доўнар – гітара (→ снежань 2006). Увесну 2007 група складалася з Дз. «Diamos Roll» Літвіновіча, Веры «Vera Faith» Новікавай – вакал, Андрэя Карповіча – гітара (адначасова «Parason»), Юрыя Душына – МС, вакал, гітара, Дзмітрыя Шапялевіча – менеджмэнт. У рэпертуары – пераважна аўтарскія песні, якія выконваюцца на расейскай, ангельскай мовах. Найбольш вядомыя «Down Love», «Big Jazz».
**Гастролі:** абласныя гарады Беларусі, Украіна.
**Фестывалі:** «Система электронного безумия» (Мінск, 2004–06), «Походный шелкопряд» (Мінск, 2006).
**Узнагароды:** пераможцы конкурсу «Muzz Drive» у намінацыі «Лепшая група» (Мінск, 2004).
**Дыскаграфія: альбомы** дэма CD «Intro Jagody» («Gizmo Lab records», 2004), «Где!?» («West Records», 2006); **трэкі** «Z.H.» (у зборніку «Natural Selection Volume One» – «Shum Records», 2004), «Aliens» (у зборніку «Natural Selection Volume Three» – «Shum Records», 2005), «Manet»




(у зборніку «Dub Around vol. 2» – «Shum Records», 2006), «Down Love» (у зборніку «Relaxed World 1» – «Shum Records», 2007), «Big Jazz», «Summertime» (у зборніку «Jazzy-Funky-Bossa step 1» – «Shum Records», 2007).

**Кіно, відэа:** асобныя трэкі выкарыстаны ў фільме «Жестокость» (рэж. П. Лунгін, 2007).

**Кантакт:** www.cherryvata.com; cherryvata@inbox.ru, арганізацыя канцэртаў +375 (29) 774-06-32 (Дз. Шапялевіч), прапановы і пытанні супрацоўніцтва +375 (29) 751-38-42, icq 216739975 (Дз. Літвіновіч).

21.04.07//Д.П.

# Ш

**ШАДЗЬКО АЛЯКСЕЙ (Шедько Алексей, Shedko Aliaksei)** – кампазітар, паэт, аранжавальнік, актор. Нарадзіўся 20.02.1962 у Мінску. У 1983 скончыў акторскі факультэт БДТМІ. Працаваў у Тамбоўскай абласной філармоніі, вакалістам групы *«Рада»* Гродзенскай абласной філармоніі (1988–89). Цягам 1989–91 жыў і працаваў у Ленінградзе, дзе выступаў як лідэр групы «Доктор Моро» і запісаў з мясцовымі музыкамі матэрыял першага альбому, выдадзенага пазней у Беларусі. Ад 1992 пастаянна жыве і працуе ў Мінску як музыка і актор Дзяржаўнага рускага акадэмічнага тэатру імя М. Горкага, на сцэне якога выканаў шэраг вядучых роляў у спектаклях па п'есах класічных і сучасных аўтараў. Выступаў у многіх краінах Еўропы. Рэгулярна дае канцэрты, піша песні для тэатральных спектакляў і кінафільмаў. На пачатку музычнай кар'еры выконваў песні па-беларуску на чужыя тэксты. Апошні час спявае выключна па-расейску. Ад 1999 пастаянна выступае з групай *«Сестра»*. Найбольш вядомыя песні «По колено в небесах», «Прощай, мой мальчик», «Моя Маруся», «Сестра», «Я буду ждать», «Ангел», «Романс», «Песня про новую скатерть».

**Фестывалі:** II Усесаюзны фестываль польскай песні (Віцебск, 1990), «Шлягер 1990» (Ленінград), «Калининград In Rock» (1999), «Рок-каранацыя 1998», «Blues Express» (Польшча, 2002).

**Узнагароды:** прыз «За лепшае акторскае ўвасабленне песні» на конкурсе II Усесаюзнага фестывалю польскай песні (Віцебск, 1990), 2 прэмія на фестывалі «Шлягер 1990» (Ленінград), «Рок-карона 1998» у намінацыі «Лепшы аўтар тэксту» («Я буду ждать»).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «По колено в небесах» («Ковчег», 1996), «Бэмс» (аўт. выд., 1997), «Я буду ждать» (аўт. выд., 1998), «Моё!» (аўт. выд., 1999), «Не смотря ни на что» («Bulba Records», 2000), «Вход к себе» (аўт. выд., 2001), «Деликатесы №1» (аўт. выд., 2002), «Диагноз» (аўт. выд., 2003), «Надеждин



пароль» (аўт. выд., 2004), «Тайга» («West Records», 2007); **трэкі** «Александрына» (у зборніку «Песнярок» – «ПанРекордз», 1997), «Я рядом, я не далеко» (у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000), «Сестра» (у зборніку «20 супер-хитов, рождённых в Беларуси» – «Bulba Records», 2000), «Моя Маруся» (у зборніку «Бульба-хит 3» – «Bulba Records», 2000), «Прощай, мой мальчик» (у зборніку «Хіт-парад «Беларускай маладзёжнай» – «Мелодия», 1990), «Dream On» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**Кіно, відэа: кліпы** «Мы» («Взгляд», 1989), «Прощай, мой мальчик» (рэж. Б. Дзедзянёў, 1991), «Берёзка» (рэж. А. Шадзько, 1997), «У меня всё в порядке», «Домой» (2007); DVD «Канцэрт у Сасновым бары» (у дуэце з *Уладзімірам Ткачэнкам*, канал «СТВ» Сасновы Бор Ленінградскай вобл., 2007, не тыражаваны); песні гучаць у мастацкіх фільмах «Рейнджер из атомной зоны» («Беларусьфільм»), «Стая» («Ren-TV», рэж. Г. Лягчылава, 2006).

**Кантакт:** www.shedko.net

05.03.07//Д.П.

**ШАЛКЕВІЧ ВІКТАР (Шалкевич Виктор, Shalkevich Viktar)** – актор, паэт, кампазітар, выканаўца ўласных песень.

Нарадзіўся 09.02.1959 у м. Поразава Гродзенскай вобл. У 1980 скончыў БДТМІ, акторскае аддзяленне па класе А. Бутакова, Ю. Сідарава, Б. Уторава. Песні пачаў пісаць, калі яшчэ вучыўся ў школе. Ад 1980 да 1991 працаваў у Гродзенскім абласным драматычным тэатры, ад 1991 – актор Абласнога тэатру лялек.

У 1992 запісаў першы альбом, сярод іншых – разам з музыкамі групы *«Seven B»*. Для ягоных песень характэрны іронія, сатыра, вострыя сацыяльныя, гістарычныя і палітычныя тэмы. Сярод найбольш вядомых твораў «Жлобская нацыя», «Смутны беларускі блюз», «Баляда пра таварыша Сапегу», «Шчуры Эўропы», «Кароткая гісторыя Беларусі», «Мы ехалі да Магілёва». Напісаў шэраг песень для спектакляў, сярод іх «Тутэйшыя» (1993), «Чортаў скарб» (1994), кінафільмаў – «Слёзы блуднага сына», «Салодкі яд каханьня», «Плач перапёлкі». Песні гэтага аўтара гучаць у польскіх фільмах, прысвечаных Беларусі.



**Гастролі:** Францыя, Нямеччына, Чэхія, Польшча, ЗША.

**Фестывалі:** «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 1992), «Восень бардаў» (Бельск, Польшча, 1992), усепольскі фестываль аўтарскай песні «ORRA» (Варшава, 2004), «Prybyccio bardau» (Варшава, 2005).

**Узнагароды:** Гран-пры фестывалю «Басовішча 1992», Гран-пры фестывалю «Восень бардаў 1992», лаўрэат фестывалю «ORRA» і ўладальнік прызу ў намінацыі «Падзея

фестывалю», Гран-пры на фестывалі «Prybyccio bardau» (Варшава, 2005), кавалер «Ордэна ўсмешкі» (Польшча, 2006).

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Правінцыя» (1993), «Смутны беларускі блюз» (1996), «Баляды і рамансы» («Хартыя'97», 1998), CD «Добрай раніцы. Выбранае» («БМAgroup», 2002), «За 100 крокаў ад Вострай брамы, або Геаграфія ВКЛ і ваколіцаў» («БМAgroup», 2003), «Гарадзенец прызямліўся ў Мінску» («БМAgroup», 2006); **трэкі** «Сьвяты Мікалай» (у альбоме «Сьвяты вечар 2000»), «Ёлачка» (у зборніку «Дні лятуць. Песьні з-за кратаў» – «БМAgroup», 2005).

**Кантакт:** rymvid@tut.by

06.11.06//Д.П.

**ШАРАПАЎ ВЯЧАСЛАЎ (Шарапов Вячеслав, Sharapau Viachaslau)** – выканаўца на клавішных, кампазітар, аранжавальнік, гукарэжысёр.

Нарадзіўся 19.05.1959 у Рэчыцы. У 1979 скончыў Мазырскую музычную вучэльню па класе трубы, вучыўся ў МІКу (2 курсы, да 1984). Дэбютаваў на эстрадзе ў 1981. У 1988 меў запрашэнне ў ВІА *«Синяя птица»*, але дамова засталася не зацверджанай. Ад 1998 – гукарэжысёр НДТРК Беларусі. У 2000 быў запрошаны як аранжавальнік у БДА *«Песняры»*. З ліпеня 2003 – музычны кіраўнік БДА «Песняры». Як гукарэжысёр працаваў практычна з усімі выканаўцамі і калектывамі папулярнай музыкі Беларусі. Сярод найбольш вядомых твораў песні «Княжна», «Ля замкавай гары» («Песняры»), аранжаванні дзвюх песень для праграмы Д. Тухманава, гімн



1 Нацыянальнага тэлеканалу Беларусі, фінальная песня фестывалю «Славянский базар в Витебске», электронныя аранжаванні твораў з рэпертуару ансамбля народнай музыкі «Неруш».

**Гастролі:** у складзе ансамбля «Неруш» – Нарвегія, Данія, Швецыя, у складзе БДА «Песняры» – Расея, Украіна, Нямеччына.

**Дыскаграфія:** CD «Песняры 2001» («Ковчег», 2001), «Распавядальная» («West Records», 2007); «Неруш» («Ковчег», 2001).

**Кантакт:** www.pesnyari.com; +375 (29) 651-14-49, (17) 231-13-34.

03.02.06//Д.П.

**ШОШЫН ІГАР (Шошин Игорь, Shoshyn Ihar)** – гітарыст, кампазітар, аранжавальнік, педагог, прадзюсэр.

Нарадзіўся 02.12.1965 у Гомелі. Вучыўся ў ДМШ па класе гітары В. Кісялёва, ад 1982 да 1986 – у Гомельскім каледжы мастацтваў у В. Лубкова, у 1994 скончыў МІК па класе гітары *Уладзіміра Угольніка*

і аранжавання, пасля чаго выкладаў у Гомельскім каледжы мастацтваў. У 1997–98 займаўся на майстар-класах у Карла Маркеонэ (Нямеччына), Штэфана Рака, Уладзіслава Блахі (Чехія), у 1999 прайшоў курс кампазіцыі і поліфаніі ў маскоўскага кампазітара І. Рэхіна. У 1995–96 выступіў арганізатарам фестывалю «Гитара электро-классик», у 1997 арганізаваў міжнародны фестываль «Ренессанс гитары», выступіўшы адначасова й як яго артыстычны дырэктар. У 1998 разам з В. Кіенем наладзіў выданне першага ў Беларусі гітарнага альманаху «Ренессанс гитары». Ад 1999 праводзіць штогадовыя «Летние гитарные встречи», ад 2000 – прадзюсэр і музычны рэдактар часопісу «Беларуская гітара». У 2001 арганізаваў міжнародны Інтэрнэт-конкурс на лепшы гітарны твор для дзіцячых музычных школ. Аўтар нотных зборнікаў для гітары «Обратное восприятие гитары» (аўт. выд., Гомель, 1991), «Музыка для гитары» (разам з У. Дайчынавічам, аўт. выд., Белград-Гомель, 1998), «Романтическая гитара. Полифонические фантазии на темы «Beatles» (аўт. выд., Гомель, 2000), «Детский альбом» (Гомель, 2005), аўтар дапаможніка «Набор нот на компьютере. Программа Finale» (Гомель, 2005), як прадзюсэр рыхтаваў да выдання зборнікі мініяцюр па выніках конкурсу кампазітараў (Гомель, 2001, 2003, 2004), быў музычным рэдактарам альманаху «Академия классической гитары» (Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, 2003–04). Асобныя творы для гітары друкаваліся ў спецыялізаваных выданнях Польшчы, ЗША.



**Фестывалі:** ад 1998 удзельнічае ў рабоце журы, выступае з канцэртамі, лекцыямі і майстар-класамі на фестывалях і конкурсах у Чэхіі (Брно, 1998), Вугоршчыне (Сэгед, 2000), Польшчы («Сілезкая гітарная восень», Тыхі, 2000, 2002, 2004; «Гданьскія сустрэчы гітарыстаў», 2001, 2003), Сербіі («Гітарны арт-фестываль», Белград, 2005), Украіне (Данецк, 2005, «ГитАс», Кіеў, 2003–05), Беларусі («Поет над Гродно гитара», Гродна, 1999; Усесаюзным гітарным фестывалі, Мінск, 1989; «Менестрель», Віцебск, 2005; «Ренессанс гитары», Гомель-Мінск, 1995–2006; Расеі («Академия классической гитары», Санкт-Пецярбург, 2003–04; «Дуэтино», Чарапавец, 2001; «Мир гитары», Калуга, 2003–05).

**Узнагароды:** залаты медаль Расейскага саюзу майстроў музычных інструментаў «Золотые струны России. Гармония мира» (1999).

**Дыскаграфія:** у якасці прадзюсэра – «Гитара электро-классик» («Vigma»,

1996), CD і MC «Ренессанс гитары» («Vigma», 1999); CD «Пьесы и аранжировки для классической гитары в исполнении лауреатов международных конкурсов» (2001, разам з нотамі і фота), «Романтическая гитара. Пьесы и аранжировки для гитары. Международный фестиваль «Ренессанс гитары» («Vigma», 2003), «Игорь Шошин. Лучшие миниатюры конкурса композиторов» (аўт. выд., 2005).
**Кантакт:** www.shoshyn.narod.ru; shoshin_gomel@mail.ru
09.12.06//Д.П.

**ШОСТАК ГЕНАДЗЬ (Шостак Геннадий, Shostak Gennady)** – журналіст, даследчык папулярнай музыкі.
Нарадзіўся 24.01.1964 у Брэсце. У 1981 скончыў спецшколу-інтэрнат №5 Кіева для сляпых і людзей з абмежаваным зрокам. Ад 1981 да 1985 вучыўся ў музычнай вучэльні для сляпых і людзей з абмежаваным зрокам Курску па класе баяна (аддзяленне народных інструментаў), якую скончыў з адзнакай. У 1985 паступіў у Кіеўскі дзяржаўны педагагічны інстытут (музычна-педагагічны факультэт, кафедра методыкі музычнага выхавання, спецыяльнасць – настаўнік музыкі і спеваў у агульнаадукацыйнай школе), які скончыў з адзнакай у 1990. Ад 1992 да 1995 вучыўся ў аспірантуры пры Кіеўскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Горкага (цяпер – Нацыянальны педагагічны ўніверсітэт імя М. Драгаманава). У чэрвені 1996 абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Музыка масавых жанраў як фактар фармавання музычнай культуры падлеткаў» па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя педагогікі». Упершыню выступіў 14.12.1991 у прэсе з артыкулам «Авангардный рок» у газеце «Комсомольская правда». У 1992–93 друкаваўся на старонках часопісу «Музика» (Украіна), выступаючы з навуковымі артыкуламі па тэме дысертацыі. Адначасова публікаваўся ў рэгіянальных газетах «Губерния» (Архангельск), «OR» (Бранск), «Класс» (Данецк). У 1996–97 удзельнічаў у стварэнні самвыдатаўскага рок-альманаху «Идиллия» (Паўднёваўкраінск Нікалаеўскай вобл., Украіна). У 1997–98 друкаваў падборкі навінаў на старонках



часопісу «Fuzz» (Санкт-Пецярбург). Ад 1997 да цяперашняга часу – карэспандэнт «Музыкальной газеты» па Брэсцкай вобл., выступае з рэцэнзіямі на альбомы, выдадзеныя ў краінах СНД. Цягам 2001– 02 вёў на Брэсцкім абласным радыё праграму «Арт-подвал», прысвечаную некамерцыйнай музыцы Беларусі і краін СНД. Ад 2004 супрацоўнічае з музычнымі сайтамі www.nneformat.ru і www.zvuki.ru. Ад 1998 працуе ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. Пушкіна, выкладае асновы сусветнай музычнай культуры і эстэтыку. Ад кастрычніка 2003 – дацэнт кафедры музыкі і спеваў па спецыяльнасці «педагогіка». Распрацаваў праграму ўвасаблення масавых музычных жанраў у працэс навучання, г.зн. выкарыстання ўзораў джазу, аўтарскай песні, пап- і рок-музыкі на ўроках і факультатыўных занятках па прадметах эстэтычнага цыклу. Асноўныя публікацыі: «Музыка массовых жанров и ее место в формировании музыкальной культуры подростков». Вучэбна-метадычны дапаможнік (з грыфам Міністэрства адукацыі Украіны). – Кіеў: Нацыянальны педагагічны ўніверсітэт імя М. Драгаманава, 1997. – 46 с.; «Массовые музыкальные жанры XX века в системе музыкально-эстетического воспитания». Вучэбна-метадычны дапаможнік: Брэст. Брэсцкі абласны інстытут павышэння кваліфікацыі, 2003. – 112 с.; «Массовая музыкальная культура. Факультативная программа для педагогических вузов». «Асновы мастацтва», Мінск, 2000. №3. С. 40–43. Усяго на жнівень 2005 – 33 навуковыя і вучэбна-метадычныя публікацыі ў акадэмічных выданнях Беларусі, Літвы і Украіны.

**Кантакт:** shostak_gennadi@tut.by; www.shostak.iatp.by; +375 (162) 20-58-68; (162) 21-62-58 (пр.); 224000, Брэст, вул. Інтэрнацыянальная, 25–6.

05.12.05//Г.Ш.

**ШПЯНЁЎ АНДРЭЙ (Шпенев Андрей, Shpianiou Andrei)** – піяніст, аранжавальнік, кампазітар.

Нарадзіўся ў 1941 у Душанбэ. Скончыў музычную школу, музычную вучэльню ў Калінінградзе, у 1968 – БДК па класе фартэпіяна. Працаваў канцэртмайстрам на музычным факультэце Мінскага педінстытуту, ад 1961 да 1966 выступаў як піяніст у складзе аркестру Белсаўпрафу п/к Л. Ляноўскага. Ад 1969 – піяніст, аранжавальнік эстрадна-сімфанічнага аркестру Дзяржтэлерадыё БССР п/к *Барыса Райскага*, адначасова супрацоўнічаў з *Белорусским диксилендом*. У пачатку 80-х выступаў з уласным джазавым секстэтам, у жніўні 1987 быў запрошаны ў *Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі*, дзе працуе як піяніст, аранжавальнік да сёння. Сярод твораў – Канцэрт для габою і аркестру, паэмы для камернага аркестру, інструментальныя творы, якія выконваліся ансамблямі *«Тоніка»* і *«Чараўніцы»*.

04.03.06//Д.П.

**«ШТРИХ_КОТ»** – група з Мінску. Гісторыя групы сягае 1997, калі склаўся дуэт пад назвай «Go-Go». Ад восені 2000 група як квартэт выступае пад цяперашняй назвай.

**Дыскаграфія: альбом** CD «Город и его балконы» (2003).

**Кіно, відэа: кліп** «Очень лень» (2004).

**Кантакт:** shtrihkot.byelarus.com

13.12.06//Д.П.

**ШЧЭРЫЦА ВАЛЕРЫЙ (Щерица Валерий, Shcherytsa Valery)** – трубач, аранжавальнік, выканаўца інструментальнай і джазавай музыкі.
Нарадзіўся 16.03.1947 ва Уладзівастоку. Скончыў МІК у 1986. На прафесійнай сцэне джаз-клубу Днепрапятроўску дэбютаваў у 1964. Ад 1967 да 1969 працаваў у Кіеве ў складзе ансамбля МУС УССР, ад 1970 да 1977 – у складзе Дзяржаўнага эстраднага аркестру Арменіі п/к К. Арбяляна. У 1977 быў запрошаны ў Мінск, дзе ўвайшоў у склад ансамбля *«Тоніка»* БДФ. У 1980 пачаў выступаць у складзе аркестру Мінскага цырку, ад 1987 да 2005 – музыка *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Ад жніўня 2005 – у складзе «Радыёбэнду» Украінскага радыё і тэлебачання. Выступае з клубнымі канцэртамі ў складзе розных джазавых комба. Запісаў вялікую колькасць твораў з аркестрам К. Арбяляна, ансамблем «Тоніка», аркестрам Мінскага цырку, Дзяржаўным канцэртным аркестрам Беларусі, для радыё і тэлебачання, запісваў музыку для кінафільмаў і мюзіклаў, у рэпертуары – творы джазавай класікі, беларускіх кампазітараў.
**Гастролі:** у складзе розных калектываў – Нямеччына, Балгарыя, Польшча, Францыя, Югаславія, Італія, Сірыя, Егіпет, Ліван, ЗША, Японія, Мексіка, Ямайка, Сурынам, Коста-Рыка, Панама, Гайяна, Калумбія.
**Фестывалі:** у Днепрапятроўску, Варонежы, Горкім, Данецку, Маскве, Бялградзе (1977), Мінску, Вільні (2003).
**Узнагароды:** Ганаровы знак Міністэрства культуры Беларусі за значны асабісты ўнёсак у развіццё беларускай культуры (1997).



**Дыскаграфія:** LP «Минский эстрадный оркестр» («Мелодия», 1986).
**Кантакт:** +375 (17) 275-10-95.
04.03.06//Д.П., фота Д.П.

**ШУГАЛЕЙ ВАСІЛЬ (Шугалей Василий, Shugaley Vasiliy)** – паэт, прадзюсэр, менеджэр, музыка, мастак.
Нарадзіўся 31.12.1970 у Мінску, трагічна загінуў 07.03.2004 у Маскве. Скончыў Ленінградскую мараходную вучэльню ў 1989. Вучыўся ў ММВ. Творчы шлях распачаў у 1989, сабраўшы групу *«Ы.Ы.Ы.»*. У 1991 стварыў праект *«БазЫлькі»*, у тым жа годзе падрыхтаваў сольны праект «Очищение зубов». У 1993 у Кішынёве паказаў праект «Мустаж» – новае ўвасабленне «Ы.Ы.Ы.». Паралельна актыўна займаўся графікай, быў супрацоўнікам мінскай прыватнай галерэі «Vita nova». Удзельнічаў у тэлепраграме «А» Цэнтральнага тэлебачання (1991). У 1995 пераехаў у Маскву, дзе стварыў музычны праект «Чоко & Боко». Актыўна займаўся прадзюсэрскай дзейнасцю, распрацаваў ідэю і стварэнне



праекту «Сюрприз от Аллы Пугачевой» (прататып «Старых песен о главном», 1997), займаўся прасоўваннем на музычным рынку груп *«Ляпис-Трубецкой»* (1996–98), «Би-2» (2000), «Запрещённые барабанщики» (1997–98). У 2001 сабраў новы ўласны музычны праект – групу «20000 зажЫгалок».
**Дыскаграфія: альбомы** МС «БазЫлькі» (аўт. выд., 1991); «Только для девочек» (як «Ы.Ы.Ы.», аўт. выд., 1991); **трэк** «Ветер знает» (у міні-альбоме «Ветер знает» групы «Браво» – «General Records», 1995).
11.12.04//П.Ю.

**ШЫРЫН ЛЕАНІД (Ширин Леонид, Shyryn Leanid)** – кампазітар, гітарыст, аранжавальнік, паэт, гукарэжысёр.
Нарадзіўся 11.08.1963 у Салігорску Мінскай вобл. У 1985 скончыў філалагічны факультэт БДУ. Музыкай пачаў займацца ў 1980, падчас навучання ва ўніверсітэце выступаў у складзе факультэцкага ансамбля. Ад 1988 да 1994 з'яўляўся ўдзельнікам групы *«Новае неба»*, для якой пісаў музыку і рабіў аранжаванні. Ад 1995 да 1998 – дырэктар студыі гуказапісу «Меццо форте», ад 1999 – дырэктар студыі эстраднай песні БДУ. Аўтар песень «Февраль» (муз. і сл., вык. група *«Лето»),* «Абарваная струна» (сл. *Алеся Камоцкага*, вык. Стэфан), «Гора – не бяда» (сл. *Аляксандра Лягчылава*, вык. *Ірына Дарафеева*), «Серебрянный дождь» (муз. і сл., вык. Л. Краўцова), «Облака» (муз. і сл., вык. А. Буйнов), «Ничего не случилось» (муз. і сл., вык. *Аляксей Хлястоў*), аранжаванняў для альбому Карла Хламкіна, аранжаванняў, музыкі альбому «Hush» *Карыяны.* У 2006 стаў адным з ініцыятараў стварэння пап-групы «Da Vinchi». Аўтар музыкі да мастацкага фільму «Армия спасения» («Видеофакт», 2000).
**Гастролі:** канцэрты ў Таронта, Канада (разам з М. Мерманам, 1995), канцэрты ў Беларусі ў складзе групы І. Дарафеевай (1999–2000).
**Фестывалі:** у складзе груп «Новае неба» і *«Мроя»* – «Басовішча» (1990–93), у складзе «Новага неба» – «Roskild» (Данія, 1993).
**Дыскаграфія:** у складзе «Новага неба» – CD «Дзеці чорнага гораду» («Ковчег», 1991), «Сон у трамваі» («Ковчег», 1994), «Go Home» («Ковчег», 1995), «Hush» Карыяны (дэма, 2003); **трэкі** «Гора – не бяда» (у зборніку «Красное танго. Песни на стихи Александра Легчилова» – «TON-Records», 1999), «Белая Русь» (у альбоме «Сотни километров

до любви» *Аляксандра Саладухі* – «Vigma», 2005).
**Кантакт:** +375 (29) 659-09-84.
02.02.07//Д.П.

**ШЭЎЧЫК ІЛЛЯ (Шевчик Илья, Shevchik Ilya)** – гітарыст, кампазітар, аранжавальнік, вакаліст. Нарадзіўся 27.02.1967 у Ленінградзе. У 2000 скончыў аддзяленне майстэрства эстрады БДУКу па класе гітары *Уладзіміра Угольніка*. Выступаць на сцэне пачаў у 1987 у складзе групы «Рэй», у 1990–91 з'яўляўся гітарыс-



там групы «Рокіс», ад 1991 да 2000 – удзельнік групы *«Крама»*, адначасова ад 1997 узначальвае групу *«Mojo Blues»*. У творчасці схіляецца да блюзу і рытм-энд-блюзу. Выступае як сесійны музыка, запісваючыся з рознымі групамі Беларусі: *«Нейро дюбель»*, *«Сестра»*, *«Flat»*. У 2003 паводле анкеты польскага часопісу «Twoj blues» быў адзначаны на 55 пазіцыі ў раздзеле «Замежныя выканаўцы» у намінацыі «Гітарыст году».
**Гастролі:** Расея, Польшча, Кітай.
**Фестывалі:** у складзе «Крамы» – «Басовішча» (1991–2002), «Поколение» (Масква, 1984), «Visagimo Country» (Літва, 1996), «Блюз жыве ў Мінску» (1998–2002); у складзе «Mojo Blues» – «Blues na Kujawach» (2002, 2003), «Olsztynskie nocy bluesowe» (2002), «Torun Blues Meeting» (2003), «Blues Express» (2003 – усё Польшча), «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2004).
**Узнагароды:** Гран-пры конкурсу імя Р. Рыдля (Тыхі, Польшча, 2003).
**Дыскаграфія:** у складзе групы «Рокіс» – МС «Народжаны тут» (дэма, 1991), у складзе групы «Крама» – «Хворы на рок-н-рол» («Ковчег», 1992), «Vodka On Ice» («RTX Records», Вялікабрытанія, 1993), «Гэй там, налівай!» («Ковчег», 1994), «Што дапаможа нам» («Ковчег», 1994), у складзе «Mojo Blues» МС і CD «Love Across The Ocean» («Ковчег», 1998), «I Gotta Move» («Ковчег», 1999), «Against The Destiny» («Ковчег», 2004); у складзе групы «Нейро дюбель» – «Народное достояние» (2000).
**Кантакт:** www.mojoblues.info; mojoblues@mail.ru; +375 (29) 659-49-78.
14.04.05//Д.П.

# Ы

**«Ы.Ы.Ы.»** – мінская група, якая, паводле вызначэння расейскага журналіста А. Троіцкага, выступала ў стылі пата-року (паталагічнага року). Утварылася летам 1989 з ініцыятывы *Васіля Шугалея*, які выступаў у ёй як аўтар музыкі і тэкстаў, гітарыст і вакаліст. У першым складзе калектыву, апрача лідэра, выступалі Вячаслаў Зуеў – барабаны, Алег «Паганіні» Усціновіч – бас-гітара (→ 1994 *«Zygimont Vaza»*), Аляксандр Ландзінскі – перкусія, шоў. У пазнейшых складах групы былі Дзмітрый Дзяруга – бас-гітара, Андрэй Тушынскі – барабаны, Артур Гапановіч – акустычная гітара, Аляксандр Кандрацюк – альт, *Павел Юрцэвіч* – труба, клавішныя, Кірыла Лосеў – саксафон, Уладзіслаў Някрасаў – кларнет, клавішныя, Ганна Дубовік, Таццяна Звяздова, Вольга Рамановіч, Святлана Мезінцава – бэк-вакал. Група праіснавала да канца 1993, удзельнічала ў тэлепраграмах «А» ЦТ, «Крок-тусоўка» БТ. На базе гэтага калектыву Васіль Шугалей заснаваў паралельны музычны праект – групу *«БазЫлькі»*.

**Фестывалі:** «Рок-съезд» (Магілёў, 1989, 1991), «Тры колеры» (Мінск, 1990, прыз за арыгінальнасць), «Независимый рок» (Кішынёў, 1993).

**Дыскаграфія: альбом** МС «Только для девочек» (аўт. выд., 1991).

11.12.04//П.Ю.

# Э

**«ЭКИВОКИ»** – група з Мінску. Утварылася з ініцыятывы *Аляксандра Сухарава* ў канцы 1998, выступаючы ў стылі пап-року і выконваючы песні на расейскай мове. Першапачаткова выступала складам: А. Сухараў, Алег Пятровіч – бас-гітара, Аляксандр Кажухоўскі – барабаны, Уладзімір Эйсмант – гітара. У розныя гады ў калектыве выступалі гітарыст *Ігар Волкаў* (← «Гай» → *«Столица»*), барабаншчык Святаслаў Чарнуха (→ «Карлик Поп», *«НЕО»*) і інш. Ад 2000 да канца 2001 група часова прыпыніла дзейнасць. Пасля яе аднаўлення дала шэраг канцэртаў, аднак пад канец 2005 А. Сухараў пачаў выступаць практычна сола, займаючыся аранжаваннямі і напісаннем песень для іншых выканаўцаў. Найбольш вядомыя песні «Шапка ондатровая», «Нравится, не нравится», «Около ноля», «Моя собака», «Фонари», «Депрессия» (разам з *Аляксандрам Памідоравым*).

**Фестывалі:** «Славянский базар» (1999, 2003, 2004).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Нравится, не нравится» (1999), «Выборное» (2003).

**Кіно, відэа: кліпы** «Нравится, не нравится» (МТРК «Мир», 1999), «Зеркало» (рэж. *Анатоль Вечар*, 1999), «Шапка ондатровая» (рэж. А. Вечар, 1999), «Моя собака» (рэж. З. Шчарбакоў, 2003), «Семья».

**Кантакт:** www.ekivoki.tut.by; ekivoki@tut.by

03.09.06//Д.П.



**«ЭЛЬФЫ»** – мінская група. Калектыў утварыўся ў 1971, выконваў як аўтарскія творы, так і кавер-версіі ў стылі рытм-энд-блюзу і року. Першапачатковы склад: Леанід Савін – спеў, лідэр-гітара, Таццяна Мажарына і Зоя Запольская – спевы, Сяргей Пенксік – арган, *Яўген Атстаўноў* – бас-гітара, дадатковы спеў, Яўген Батыркін – барабаны, *Уладзімір Марусіч* – барабаны. У розны час у групе выступалі *Яўген Канавалаў* – лідэр-гітара (← *«Алгоритмы»*), *Аляксандр Герасімовіч* – гітара, Павел Кандрусевіч – гітара.

Ансамбль распаўся напрыканцы 1973.

07.09.03//Д.П.

**ЭСКІН АРКАДЗЬ (Эскин Аркадий, Eskin Arkady)** – джазавы піяніст, кампазітар, аранжавальнік, педагог. Нарадзіўся 24.04.1939 у Харкаве, памёр 12.08.2006, пахаваны ў Мінску. У 1956 скончыў Харкаўскую музычную школу-дзесяцігодку, у 1987 – аддзяленне народных інструментаў БДУКу. Джазам пачаў займацца яшчэ ў школьным узросце, у 13 гадоў ужо актыўна выступаў як рэстаранны музыка. Ад 1955 да 1957 працаваў музыкам у Луганску як удзельнік джаз-аркестру п/к У. Пятрова. У 1958 у Растове-на-Доне заснаваў першае ўласнае трыо. Ад 1961 да 1967 – удзельнік джаз-квартэту ў Разані. У 1961 – музыка кіеўскага аркестру «Дніпро» п/к І. Пятрэнкі, пазней – аркестру Л. Уцёсава. Ад 1967 да 1971 – піяніст у ансамблі «Чанги» Г. Чахелі, пасля чаго пераехаў у Мінск, дзе ўвайшоў у склад ансамбля *«Тоніка»* БДФ (1972–79), потым быў запрошаны ў склад ансамбля *«Песняры»* (1980–86). У жніўні 1987 атрымаў запрашэнне ў склад навастворанага *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*, дзе выступаў як саліст біг-бэнду, так і ўласных трыо і квартэтаў, займаўся падрыхтоўкай маладых музыкаў. Адначасова выступаў у складзе *Белорусского диксиленда*. У 1994 у дуэце з *Барысам Бернштэйнам* цягам трох месяцаў выступаў у Японіі. У 1994–98 працаваў у Еўропе як піяніст «Уральского диксиленда» І. Бурко. Пасля вяртання ў Мінск зноў пачаў працу ў Дзяржаўным канцэртным аркестры, у 1999–2003 выкладаў джазавае фартэпіяна на кафедры майстэрства эстрады БДУКу. Сярод ягоных вучняў Р. Козыраў (БДА «Песняры»), К. Гаўрылава, Л. Багданава. Паралельна актыўна выступаў з канцэртамі як лідэр джазавага трыо, запісваўся з *Ірынай Дарафеевай*, *Вольгай Залескай* і інш. У творчасці трымаўся мэйнстрыму, уключаючы ў рэпертуар як стандарты джазавай класікі, так і ўласныя творы, сярод якіх найбольш вядомыя «Іспанскія напевы», «Мая прыгожая Клара», «Жужаль», «Гуляў казак».

**Гастролі:** у складзе «Тонікі» – краіны Еўропы, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Мексіка; у складзе «Песняроў» – краіны Еўропы, Індыя; у складзе «Уральского диксиленда» – краіны Еўропы, выступленні ў джаз-клубах Парыжу, Лондану, Ліверпулю.

**Фестывалі:** у складзе «Уральского диксиленда» – «North Sea» (Гаага,



1996), Эйндховен, Гётэборг, Эдынбург; у складзе розных калектываў – Куйбышаў, Днепрапятроўск, Данецк (1968), Тбілісі, «Белые ночи» (Ленінград), «Таллин 1967», Ялта, Мінск, «Славянский базар», «Данецк 2004», «Ростов 2004, 2005».

**Узнагароды:** у складзе «Тонікі» – лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1978) у катэгорыі «інструментальная музыка».

**Дыскаграфія: альбомы** CD – у складзе «Igor Bourco's Uralsky Jazzmen»: «Russia Meets America» («Jazz Between Dikes», Галандыя, 1995), «America Meets Russia» («Jazz Between Dikes», Галандыя, 1995), «Oh, Mo'nah. Feaut. Beryl Bryden & Nat Gonella» («Jazz Between Dikes», Галандыя, 1997); «Белорусский диксиленд» («Ковчег», 2004); «What's News?» («Ковчег», 2005).

14.10.06//Д.П.

## ЭСТРАДНА-СІМФАНІЧНЫ АРКЕСТР ГРОДЗЕНСКАЙ ФІЛАРМОНІІ

Утварыўся ў ліпені 2001, першае выступленне датавана 15 верасня гэтага ж году. Мастацкі кіраўнік і дырыжор Барыс Мягкоў. У рэпертуары калектыву сучасная папулярная музыка і класічныя творы джазавай музыкі. Як біг-бэнд выступае ў класічным складзе: 5 саксафонаў, 4 трамбоны, 5 труб, флейта і рытм-група. Сярод удзельнікаў калектыву Уладзімір Драчан – труба, Сяргей Санец – кларнет, саксафон, Аляксандр Краўчук – тэнар-саксафон, Дзмітрый Стэржанаў – трамбон, Алег Іванюга – клавішныя, Аляксандр Пасечнік – барабаны, вакалісткі Таццяна Ушкевіч, Наталля Клімовіч, Надзея Краўчук, Алег Пухаў, Міхаіл Савашэвіч. У складзе біг-бэнду маецца малы склад з салістаў аркестру «Stop-time».

**Фестывалі:** III Рэспубліканскі фестываль эстрадных аркестраў (Мінск, 2001), «Парад оркестров» (Гродна, 2003–06), Міжнародны джазавы фестываль у Калінінградзе (2005), джаз-фестываль у Сувалках (Польшча, 2004), джаз-фестываль ў Аўгустове (Польшча, 2006), «Пружанский блюз» (Пружаны, 2006).

**Дыскаграфія:** DVD «Horne of Puente. Live» (аўт. выд., 2006).

**Кантакт:** boris_myagkov@mail.ru; +375 (152) 52-28-23, (29) 780-25-67; 230001, вул. Вішнёвая, 13–5, Гродна (Барыс Мягкоў).

04.10.06//Д.П.

**«ЭТНА-ТРЫО «ТРОЙЦА»** – другое ўвасабленне трыо «*Тройца*», якое існуе ад студзеня 1999.

Выступае складам: *Іван Кірчук* – лідэр, спеў, гітара, смык, домра, акарыны, жалейкі, дудкі, гуслі, камыш, бамбук, санза, анклюн і г.д., Юрый Паўлоўскі – перкусія, шумавыя інструменты, гонг, бамбукавы ксілафон (← *«Князь Мышкин»*), Юрый Дзмітрыеў – бэк-вакал, гітара, домра, ліра, смык, цытра, драўляны рог. Група выконвае беларускі музычны фальклор у стылі фолк-ф'южн, актыўна выступае ў краінах Еўропы, дзе запісваецца для радыё і тэлебачання. Трыо ўдзельнічала ў праграме «Антропология» (канал «НТВ», Масква, верасень 2000).

**Узнагароды:** «Рок-карона 1998» у намінацыі «Традыцыі і сучаснасць».

**Фестывалі:** «Saraevska zima» (Боснія і Герцагавіна, 1999), «Matav Kalaka Folkfestival» (Вугоршчына, 1999), «Oerol», «Amsterdam Arts Festival», «Veruit de Maat Festival» (усе – Галандыя, 1999), «Pepsi Sziget» (Вугоршчына,1999, 2002), «TRN Fest» (Славенія, 1999), «Mundial», «Haarlemmerhout» (усе – Галандыя, 2000), «Kalaka», «Pepsi Sziget» (усе – Вугоршчына, 2000), «Таўкачыкі» (Беларусь, 2000), «II International Folk Festival», «Lunconcerten In Theatre», «Elastiek Muziek», «Festival te Schijnder», «Bladel-fest», «Zommerparkfest», «Folk Woods» (усе – Галандыя, 2001), «Noc Swietojanska» (Польшча, 2000), «Spotkania folkowe» (Польшча, 2002), «Freesland Folk Fest», «Bladel Fest» (усе – Галандыя, 2002), «Rain Forest World Music Festival» (Барнэо, Малайзія, 2002), «Славянский базар» (Беларусь, 2002), «Киношок» (Расея, 2002), «Ethno-jazz trio» (Малдова, 2002), «A Zene Unnepe» (Вугоршчына, 2005), «Басовішча» (Гродэк, Польшча, 2006), III фестываль беларускай культуры (Вроцлаў, Польшча, 2006), фестываль тэатраў Усходняй Еўропы (Люблін, Польшча, 2006), «На скрыжаванні культур» (Варшава, 2006), «Поўны месяц» (Амстэрдам, 2006), «Folk Wood» (Эйндховен, 2006), «Золотая маска» (Масква, 2006), «Вольнае паветра» (Крупкі, Беларусь, 2006), «Краіна мрій» (Кіеў, 2007).

**Дыскаграфія: альбомы** MC «Live At Oerol» («ETTroitsa», 1999), CD «Zhuravy» («PAN Records», Галандыя, 2001, перавыд. «West Records», Беларусь, 2002),«Сем» («ETTroitsa», 2004); **трэк** «Free State» (у зборніку «Personal Depeche» – «MSH Records», 2003).

**Кіно, відэа: кліп** «Тры янгалы» (рэж. С. Дзмітрэнка, 2007); «Тройца» (45 хв., Нацыянальная тэлерадыёкампанія Беларусі, 1998), «Тройца. Канцэрт 2000 у Мінску» (55 хв., «Белвідэацэнтр», 2002), «Сонцам асвячуся» (Нацыянальная тэлерадыёкампанія Беларусі, рэж. С. Рыбакоў, 2006), музыка для мастацкіх к/ф «Маленькія ўцекачы» («Беларусьфільм», 2004), «Тры талеры».

**Кантакт:** +375 (17) 240-96-10 (Ю. Паўлоўскі), (29) 660-22-01 (Ю. Дзмітрыеў); troitsa_folk@mail.ru

05.09.07//Д.П.

# Ю

**ЮРЦЭВІЧ ПАВЕЛ (Юрцевич Павел, Yurtsevich Pavel)** – трубач, гукарэжысёр, менеджэр.

Нарадзіўся 29.05.1972 у Мінску.

У 1997 скончыў БДУК па спецыяльнасці артыст аркестру, выкладчык па класе трубы. Ад 1991 быў удзельнікам групы *«Ы.Ы.Ы.»*, ад 1995 працаваў у прадзюсэрскім цэнтры «Мэджик АРТ», ад 2003 – супрацоўнік творчага аб'яднання «Осмос». У 2006 прыняў абавязкі дырэктара студыі гуказапісу «Меццо форте». У 1995 займаўся менеджмэнтам і прэзэнтацыяй альбому «Умные вещи» групы *«Нейро дюбель»*, у 2003–04 кіраваў складаннем альбомаў рэміксаў «Комиксы» гэтай жа групы, удзельнічаў у стварэнні альбому «Мануал» *Макса Івашына*, цягам 2006–07 выступіў як менеджэр-прадзюсэр зборніка «Басовішча 2006» і трыб'юту памяці *Васіля Шугалея*. Як гукарэжысёр у тандэме з І. Плевіным (ТА «Осмос») удзельнічаў у запісе альбомаў «Комиксы», «Танкі» групы «Нейро дюбель», «Мануал» М. Івашына, «Крыжы-абярэгі» групы *«Znich»*, «Ragazze» групы *«The UNB»*.

**Кантакт:** www.osmos.ucoz.ru; pavelju@tut.by; +375 (29) 629-86-98.

05.04.07//Д.П.

**ЮШЫН АРКАДЗЬ «АРКАН» (Юшин Аркадий «Аркан», Yushin Arkadiy)** – гітарыст, кампазітар, аранжавальнік, педагог.

Нарадзіўся 05.08.1966 у Мінску. Ігры на гітары вучыўся самастойна. Дэбютаваў у складзе групы «Форпост», супрацоўнічаў з групамі *«Сузор'е»*, *«Крама»*, *Аляксеем Шадзько*. Працаваў як музыка ў Польшчы, Аўстрыі, Турцыі. У 1997 стаў першым музыкам з Беларусі, які паступіў на вучобу у «Berklee Collage of Music» у Бостане, дзе правучыўся адзін семестр. Працягваў адукацыю ў «Music Tech Collage of Music and Recording Arts» у Мінеапалісе, які скончыў у 2002, атрымаўшы адукацыю ў галіне гуказапісу, аранжавання, кампазіцыі, імправізацыі, джазавай гітары.

У ЗША як спецыяльна запрошаны гітарыст удзельнічаў у многіх рэгіянальных і нацыянальных праектах, працаваў як студыйны музыка падчас запісаў Джэнет Джэксан, Мэры Бэт Карлсан, Адзі Ешайя, Пітэра Астраўшка. Кампазіцыі і аранжаванні гучаць у праграмах «Minnesota Public Radio», у «Minneapolis Orchestra Hall» (вакальныя і струнныя аранжаванні для гарадскога хору хлопчыкаў), у выкананні мясцовых джазавых музыкаў («Take Me Higher» у выкананні трыо Энтані Кокса, «Spring, Mississippi» у выкананні «Blue Road Trio»).

**Гастролі:** амерыканскі тур «Peter Ostroushko Duet» (2004).

**Фестывалі:** фестывалі «Блюз жыве ў Мінску» (1996, 1997), «Hades» Jazz Festival (Люблін, Польшча), «Bazilica Block Party Festival» (Мінеапаліс), «Summer Jazz Fest» (Мінеапаліс, 2002).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «These Dreams» – «Blue Road Trio» (прадзюсэрства і аранжаванне), сольныя CD «Messenger» (2001), «Only Strings Would Know» (2004); удзел у запісе альбомаў «ABC Playtime Classical» («Compass Productions», 2002), «Serenity» («Compass Records», 2003), «That Man» Джэнет Джэксан (саўндтрэк да фільму «Chicago» – «Flyte Tyme Records», 2003), «A Brand New Day» Мэры Бэт Карлсан («MBC Productions», 2003), «Wrapped in Love» Мэры Бэт Карлсан («MBC Productions», 2002).

**Кантакт:** arkadiyguitars@hotmail.com

03.10.04//Д.П.

**ЮТ АНЖАЛІКА (Ютт Анжелика, Yutt Angelika)** – спявачка, аўтар музыкі і тэкстаў.

Нарадзілася 05.11.1969 у Сімферопалі. У 1991 скончыла вакальнае аддзяленне Адэскай кансерваторыі па спецыяльнасці акадэмічны вакал. Прафесійную кар'еру пачала ў 1988 як салістка Крымскага ўкраінскага тэатру музкамедыі. Ад 1990 працавала ў эстрадным шоў «Все звезды» (Масква), у 1993 была запрошана салісткай у *Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі*. Ад 1997 – салістка студыі *«Сябры»*. У рамках студыі быў створаны музычны праект «Анжелика», аснову якога склалі А. Ют і *Уладзімір Станкевіч*. Ад 2002 супрацоўнічае з маскоўскім прадзюсэрскім цэнтрам «Promore-music», праект «Анжелика» (прадзюсэр І. Сіліверстаў). Рэпертуар заснаваны пераважна на расейскамоўных песнях, найбольш вядомыя сярод якіх «Я – не забава», «Заколдованный рай», «Замок из песка» (усе – муз. А. Ют, сл. У. Станкевіча), «Берег любви» (муз. П. Картавага, сл. А. Ют), «Мой принц» (муз. А. Ют, сл. У. Мазго), «Я чужая» (муз. А. Чэпікава, В. Маціеўскага, А. Ют, сл. У. Станкевіча, А. Чэпікава), «Над облаками» (муз. DJ AleX, сл. У. Станкевіча), «Запалі агонь» (муз. *Алега Елісеенкава*, сл. У. Мазго), «Прощай» (муз. і сл. А. Нікульшына).

**Гастролі:** СССР, краіны СНД, Польшча, Нямеччына, Галандыя, Літва, Эстонія.

**Фестывалі:** «Крымские зори» (Ялта, 1991), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна 1993», міжнародны конкурс «Vilnius 1993».

**Узнагароды:** лаўрэат Гран-пры конкурсу на фестывалі «Крымские зори» (Ялта, 1991), лаўрэат І прэміі конкурсу маладых выканаўцаў на Нацыянальным фестывалі песні і паэзіі «Маладзечна 1993».

**Дыскаграфія: альбомы** МС «Берег любви» («TON-Records», 1996), «Маруся раз!» («West», Украіна, 1997), «Планета любви» («TON-Records», 1998), «Заколдованный рай» («TON-Records», 1999), CD «Я люблю!» («TON-Records», 2002), «Над облаками» («Promore-music», Расея, 2003), «Прощай» («Мистерия звука»,



Расея, 2006); **трэк** «Я чужая» (у зборніку «Бульба-хит 2000» – «Bulba Records», 2000, у зборніку «БелКП-ПрЕСсНЯ» – «Bulba Records», 2000). **Кіно, відэа: кліпы** «Мой принц» (рэж. М. Носаў, 1996), «Мама-Маруся» (рэж. С. Новікаў, 1997), «Заколдованный рай» (рэж. *Анатоль Вечар*, 1998), «Запрещу тишину» (рэж. А. Вечар, 2001), «Я лечу» (рэж. А. Ібрагімаў, 2002), «Прощай» (рэж. В. Разгулін, 2005).
**Кантакт:** www.angelikamusic.ru; angelikau@mail.ru; +7 (916) 527-92-85.
11.11.06//Д.П.

**«THE UNB»** – гомельская група, утварылася ў кастрычніку 1983. У першым складзе калектыву выступалі Дзмітрый «Дольнік» Дольнікаў – гітара, клавішныя, вакал, Сяргей «Хромой» Храмовіч – бас-гітара, Сяргей «Лашак» Лашакоў – гітара, Віталь «Палкін» Бердніковіч – барабаны. Самі музыкі вызначаюць уласны стыль як інтэлектуальны панк. Рэпертуар групы заснаваны на аўтарскіх расейскамоўных песнях, аўтарства якіх належыць пераважна Дз. Дольнікаву. Падчас запісаў з групай супрацоўнічаюць такія музыкі, як Валерый «Валяр'ян Буракілер» Бурак, Аляксандр Ляўкоўскі, *Ігар Люты*, *Канстанцін Гарачы*, Д. Бударын. У розны час у групе выступалі барабаншчыкі Уладзімір Піскуноў, Юрый Грынкевіч, Стас Астахаў. Зрэдзьчас дае клубныя канцэрты ў Гомелі, Мінску. На пачатку 2007 у групе выступалі Дз. Дольнікаў, Ігар «Фёдар aka IV» Васілеўскі – бас-гітара (← 1994), Андрэй «Гіз» Гінзбург – клавішныя (← 2006), Арцём Залескі – барабаны (← 1997).
**Дыскаграфія: альбомы** MC і CD «Легендарные психопляски» («Superrockers», 1992), «Бад-Зальцунген» («Superrockers», 1993), «Мозг Сигизмунда» («Superrockers», 1993), «Солнце в пивной бутылке» («Superrockers», 1993), «LXX. Копченые ломти экстаза» («Superrockers», 1995), «Ауфвидерзейн, Пабло!» («Superrockers», 1996), «Каверзы» («Superrockers», 1996), «Зов бужумбурских дансингов» («Superrockers», 1997), «92,6» («Superrockers», 1999), «Дакляйневундеркиллербуги. 15 лет экзальтации» («Superrockers», 1999), «Консервированные поцелуи Бисмарка» («Superrockers», 1999), «Песни без баяна» («Superrockers», 2000), «Ну и кто это сделал?» («Superrockers», 2000), «Декольтированный скафандр Бисмарка» («Superrockers», 2000), «Челюскинхед» («Superrockers», 2000), «Популярная тератология» («Superrockers», 2001), «Сосок муравьеда» («Superrockers», 2001), «Гланды любви» («Superrockers», 2003), «Красота» («Superrockers», 2003), «100/20» («Superrockers», 2003), «Гибискус!» («Никитин»/«Aist Music», 2004), «Ragazze» («Superrockers», 2005), «Живцы и студни» («Superrockers», 2006), «Соль» («Superrockers», 2007); **трэкі** «Клаустрофобия» (у зборніку «Вечнозеленое пальто» – «Aist Music», 2001), «Я теперь композитор» (у «Неформатном сборнике альтернативного рока» – «Aist Music», 2002), «Лачплесис» (у «Неформатном сборнике альтернативного рока №2» – «Aist Music», 2003), «Реки обезьяньих слёз» (у зборніку «Recommended Records 15» – «Specialradio», Масква, 2005).
**Кантакт:** www.unbfanclub.narod.ru; +375 (29) 694-70-74 (Дзмітрый).
23.04.07//Д.П.

# Я

**ЯЛФІМАЎ ПЁТР (Елфимов Пётр, Elfimov Piotr)** – спявак, выканаўца папулярнага і пап-рокавага рэпертуару.

Нарадзіўся ў Магілёве. Вучыўся ў сярэдняй школе з музычным ухілам па класе трубы, скончыў магілёўскі ліцэй музыкі і харэаграфіі, дзе працаваў у эстраднай студыі «W», у 2005 скончыў БАМ па класе спеваў. У 2000–03 выступаў салістам мінскай групы «Эгоист», супрацоўнічаў як вакаліст з камандамі КВЗ БДУ і РУДН. Ад 2003 – саліст-вакаліст *БДА «Песняры»*, дзе працаваў да пачатку 2004. Ад 2005 – саліст студыі «Гран-при».

**Фестывалі:** «Noc bluesowa» (Рава Мазавецка, Польшча, 2002), «Славянский базар» (Віцебск, 2004, 2007).

**Узнагароды:** Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў фестывалю «Славянский базар» (2004).



**Дыскаграфія:** альбом «Я хочу» (2006), «Колокола» (2007).

**Кантакт:** www.petrelfimov.ru

12.09.07//Д.П.

**ЯНКОЎСКІ УЛАДЗІМІР (Янковский Владимир, Yankovski Vladimir)** – кінарэжысёр, кліпмейкер.

Нарадзіўся 17.06.1960 у Мінску. У 1972–77 вучыўся ў мастацкай школе на аддзяленні графікі, у 1977–78 працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм» мастаком-мультыплікатарам. Скончыў акторскае аддзяленне БДТМІ ў 1982 па спецыяльнасці актор тэатру і кіно. У 1982–90 – актор Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатру імя Горкага, у 1991–94 – дырэктар і рэжысёр кінакампаніі «ЮВЭПС». Цягам 2000–01 працаваў рэжысёрам-пастаноўшчыкам на кінастудыі «Беларусьфільм». У 1994 заснаваў ТАА «Кинокомпания «Ирреал», у якім з'яўляецца генеральным дырэктарам і рэжысёрам. Рэжысёр-пастаноўшчык фільмаў «Попугай» и «Зеркало» (для тэлеканалу РТР), «Идеальная жена» (2007).

**Фестывалі:** штогадовы ўдзел у шматлікіх міжнародных фестывалях рэкламных фільмаў.

**Узнагароды:** уладальнік прэміі «Золотой граммофон» за кліп «Как упоительны в России вечера...» (група «Белый орёл», Масква, 1999), «Залатой зоркі» на XXI міжнароднай канферэнцыі па якасці (Парыж,



2004), «Плацінавай аркі» на XXII міжнароднай канферэнцыі па якасці (Франкфурт, 2005), прызу «Quality Crown» у катэгорыі «Diamond» на XXII міжнароднай канферэнцыі па якасці (Лондан, 2005), дыпломаў Міжнароднай асацыяцыі рэжысёраў рэкламных фільмаў.

**Кіно, відэа:** аўтар больш чым 560 рэкламных і музычных ролікаў, у тым ліку серыі ролікаў для швейцарскай касметычнай кампаніі «St'Ives», амерыканскай кампаніі медпрэпаратаў «Sagmel, Inc.», часопісаў «Кино-парк», «ТВ-парк», мінеральнай вады «Роса» (Югаславія), гандлёвых марак «Савушкин продукт», «Сухаревич», марожанага «Да-Ду» і «Браво» (Літва), серыі ролікаў «АЛЬФА-банк», «Технобанк», «BELSWISSBank», «UBS-банк», медычнага цэнтру «Нордин», страхавых кампаній «РОСНО», «АСТО», кампаній «Panasonic» (Расея), «Мегафон», «Тинькофф», гандлёвых марак «Audimas» (Літва), «Дядя Ваня» і «Четыре сезона» (Расея), брэндаў і прадукцыі «Serge», «Welcom»; **кліпы** Ф. Кіркорава, Л. Лешчанкі, Н. Бабкінай, І. Дэмарына, А. Дабранравава, І. Шведавай, Р. Ібрагімава, серыя (17 кліпаў) групы «Белый орёл», С. Мінаева, *Анжалікі Агурбаш*, груп «Лицей», «Кипелов», «Винтаж», «Rage», «Mind Odyssey», *«Apple Tea»*.

**Кантакт:** www.irreal.ru; irreal@mail.ru; +375 (17) 267-44-45, (17) 263-51-16, (17) 263-60-47 (fax).

28.02.07//Д.П.

**ЯНУШКЕВІЧ АНДРЭЙ (Янушкевич Андрей, Yanushkevich Andrey)** – гітарыст, кампазітар. Нарадзіўся 22.11.1978 у пас. Свіслач Гродзенскай вобл. Скончыў Ваўкавыскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Пачаў пісаць песні ў 1992. У Ваўкавыску выступаў у складзе лакальна вядомых груп, выконваючы самую розную па стылі музыку. Пераехаў у Брэст у 1999. Там у 2000 стварыў праект «Пополам», які не мае сталага складу і ў якім выступаюць музыкі групы *«Садъ»*, *Кацярына Хасаншына* і інш. Паралельна працаваў у жанры аўтарскай песні, пішучы на тэксты



расейскіх паэтаў пачатку XIX ст., а таксама на ўласныя вершы, вызначаючы гэта як «альтэрнатыўная аўтарская песня». З удзелам сесійных музыкаў у 2000–01 быў запісаны акустычны альбом, які, аднак, выдадзены не быў. Ад 2002 змяніў стыль ў бок пап-року з элементамі фолку, у тым ліку гарадскога. У верасні 2004 пакінуў праект «Пополам» і заснаваў новы пад назваю «Титры».

**Фестывалі:** рэгей-фестываль «Сохраним растения» (Ліда, сакавік 2004).

**Дыскаграфія: трэкі** «Соловейка» (у зборніку «Я в Бресте 2» – «Art Classic Company», 2003), «Что мне до твоих...» (у зборніку «Брестский рок» – «Бесконечный апрель», Брэст, 2006).

**Кантакт:** Janushkevich@mail.ru; +375 (162) 24-73-27, (29) 656-72-36.

21.10.06//Г.Ш.

**ЯРМОЛЕНКА АНАТОЛЬ (Ярмоленко Анатолий, Yarmolenka Anatol)** – эстрадны спявак.



Нарадзіўся 15.11.1947 у г. Казацін Вінніцкай вобл., Украіна. У 1976 скончыў Гомельскую музычную вучэльню. Музычную кар'еру распачаў у самадзейнасці. Падчас службы ў войску быў салістам Ансамбля песні і танца Бакінскай акругі супрацьпаветранай абароны. У 1969 пачаў працаваць у канцэртнай брыгадзе «Беларускі сувенір» Гомельскай філармоніі. У 1971–74 – удзельнік калектыву *«Песни над Сожем»*. Ад 1974 – вядучы саліст ансамбля *«Сябры»*, пазней – яго мастацкі кіраўнік, ад 1992 – мастацкі кіраўнік ТА «Студыя «Сябры». Спявае на беларускай і расейскай мовах, у рэпертуары песні *Мікалая Сацуры*, А. Іванова, *Ігара Лучанка* і інш.

**Узнагароды:** прэмія Ленінскага камсамолу Беларусі (1984).

**Дыскаграфія:** гл. «Сябры»

**Кіно, відэа: кліп** «Офицеры Беларуси» (рэж. *Анатоль Вечар*).

**Кантакт:** www.syabry.com; info@syabry.com; +375 (17) 211-33-42.

25.04.06//Д.П.

**ЯЎТУХОВІЧ ДЗМІТРЫЙ (Явтухович Дмитрий, Yavtuhovich Dimitri)** – кампазітар, аранжавальнік, піяніст.

Нарадзіўся 23.08.1962 у Гомелі. Скончыў спецыяльную музычную школу ў Гомелі (1976), там жа – музычную вучэльню (1982), у 1987 – БДК па класе кампазіцыі Дз. Смольскага, аспірантуру пры БДК (1990). Піша музыку ў розных стылях і жанрах: сімфанічную, харавую, камерную, рамансы і песні, інструментальную музыку, музыку для кіно і тэатру, джазавыя п'есы і музыку для



дзяцей, якія выконваліся ў Расеі, Нямеччыне, Аўстрыі, Польшчы, ЗША, Украіне. Займаецца педагагічнай дзейнасцю. Сябра Саюзу кампазітараў Беларусі ад 1990. Дэбютаваў як канцэртмайстар у Гомелі ў 1978. Ад 1982 – артыст Гомельскай філармоніі, ад 1986 да самага канца 1988 – вакаліст і піяніст ансамбля *«Песняры»*, ад 1992 да 1993 – кіраўнік дзіцячага ансамбля «Бусляня» Беларускага радыё і тэлебачання, ад сакавіка 1991 да жніўня 1993 – канцэртмайстар па вакале *Дзяржаўнага канцэртнага аркестру Беларусі*. Ад лета 1993 – аўтар-выканаўца і кампазітар-аранжавальнік студыі *«Сябры»*. Ад восені 1993 жыве ў ЗША, Нью-Джэрсі, дзе выступае ў расейскіх рэстарацыях, дае прыватныя ўрокі, узначальвае хор Свята-Еўфрасіннеўскай царквы ў Саўс-Рывэр. Выступае пад псеўданімам Дзіма Мінскі, мае тры аўтарскія праграмы на радыёстанцыі «Новая волна». Найбольш вядомыя творы «Даставай, Язэп, гармонік», «Пад зоркаю Пагоні», «Не кляніце мяне», «А ў гасцях», «Пяшчота», «Добрай ночы», «Калыханка». У 1994 у ЗША быў выдадзены зборнік песень «Book Of Songs».

**Гастролі:** у складзе «Песняроў» – усе паездкі з восені 1986 да 1988.

**Фестывалі:** Першы ўсесаюзны фестываль польскай песні ў Віцебску (1988), «Славянский базар» (1992, 1993), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (1993).

**Дыскаграфія: альбомы** CD «Mystery of The Dark Ocean. Cool Jazz & Light Piano Compositions, 1985–99» («Retrieve Records», 2002), «Беларускі альбом» (рэміксы старых песень разам з *Юрыем Багаткевічам* і «Сябрамі», аўт. выд., 2004), «Ласточка, пой! Лучшее и неповторимое» (аўт. выд., 2004).

**Кантакт:** www.minsky.vily.net; dy23ma@yahoo.com

24.10.05//Д.П.

**ЯШКІН ВАЛЕРЫЙ (Яшкин Валерий, Jashkin Valeriy)** – піяніст, лібрэтыст, журналіст, рэжысёр-пастаноўшчык.

Нарадзіўся 20.12.1940 у Гомельскай вобл., памёр 10.01.1997 у Маскве. Падчас службы ў ЧБВА пазнаёміўся з будучымі ўдзельнікамі ансамбля «Лявоны» (пазней – *«Песняры»*), у склад якога быў запрошаны ў 1968 як піяніст і выканаўца на калёснай ліры. Скончыў тэатральны інстытут па спецыяльнасці рэжысура, вышэйшыя рэжысёрскія курсы пры ГИТИСе, выкладаў у Расейскай акадэміі тэатральнага мастацтва, кандыдат мастацтвазнаўства. У складзе «Песняроў» выступаў да 1975. Аўтар лібрэта оперы-прытчы «Песня пра долю», лібрэта рок-оперы «Сказание о Емельяне Пугачёве» і рок-араторыі

«Мастера» (абедзве – для ансамбля «Ариэль»). Аўтар шэрагу артыкулаў на музычныя тэмы ў перыёдыцы («Вокально-инструментальные ансамбли», 1980), у сярэдзіне 90-х разам з *Аляксандрам Дзямешкам* падрыхтаваў і выдаў анталогію твораў «Песняроў» («Мороз Рекордз») з 8 CD.
**Гастролі:** гл. «Песняры».
**Фестывалі:** гл. «Песняры».
**Дыскаграфія:** гл. «Песняры».
**Кнігі:** «На полпути от эстрады к театру» (Масква, 1995).
03.04.06//Д.П.

**«YAR»** – дуэт з Мінску, якія выступае ў стылі этна-авангард.
Існуе ад красавіка 2002, нязменна выступаючы складам: Наталля Пятровіч – віяланчэль, Марыя «Яр» Лагодзіч – спевы, дудкі, перкусія. Да 2003 дуэт выступаў у складзе групы *«Ur'ia»*. Дуэт выконвае ўласныя апрацоўкі народных песень і стылізаваныя пад народныя аўтарскія творы М. Лагодзіч.
**Гастролі:** Нямеччына (2004), Польшча (2005).
**Фестывалі:** «Mikolajki Folkowe» (Польшча, 2002, 2003), «Burg Waldek» (Нямеччына, 2003), «Singetrafen» (Нямеччына, 2003–05), «Fimu» (Бельфар, Францыя, 2003), «Jawornik» (Польшча, 2005), «Таўкачыкі» (Мінск, 2004), Нацыянальны фестываль песні і паэзіі «Маладзечна» (2003).



**Узнагароды:** I месца ў конкурсе «Scena otwarta» ў рамках фестывалю «Mikolajki Folkowe» (Польшча, 2002) і галоўны прыз – запіс на тэлебачанні у Варшаве; спецыяльны прыз журы на конкурсе ў рамках фестывалю «Burg Waldeck» (Нямеччына, 2003).
**Дыскаграфія: альбомы** CD «Яр» (дэма, 2003), «Вясна красна» («БМAgroup», 2004).
**Кантакт:** lagodichfolk@mail.ru; +375 (29) 765-77-36.
11.01.06//Д.П., фота Д.П.

# ДАДАТКІ

## Каталог выданняў «БМАgroup»

Агінскі Міхал Клеафас — «Успамін» (2006, CD BMA 075).
«Бонда» — «Лепшае» (2006, CD BMA 083).
«Варта вежы багоў» (2CD, 2005, міжнародны трыб'ют «Gods Tower», CD BMA 066 S).
«Вольныя танцы: альтэрнатыва_by» (зборнік, 2001, CD BMA 005).
«Вольныя танцы: новая альтэрнатыва» (зборнік, 2000, CD BMA 002).
«Вольныя танцы: слухай сваё» (зборнік, 1999, CD BMA 001).
Геніюш Ларыса — «Жыць для Беларусі» (зборнік, 2005, CD BMA 065).
«Генэралы айчыннага року» (зборнік, 2004, CD BMA 030).
«Госьціца» — «Пералёт-трава» (2004, CD BMA 037).
Данчык — «Беларусачка» (1978, перавыд. 2006, CD BMA 068).
Данчык — «Мы яшчэ сустрэнемся» (1992, перавыд. 2006, CD BMA 079).
Данчык — «Я ад вас далёка» (1985, перавыд. 2005, CD BMA 064).
Данчык/Барткевіч — «Мы адной табе належым...» (1989, перавыд. 2006, CD BMA 074).
Забэйда-Суміцкі Міхась — «Ластаўкі ў стрэсе» (2000, CD BMA 003).
«Зьмяя» — «Гост густа дусту» (ліпень 2007, BMA 086).
«Зьмяя» — «Усё дзеля вас» (2005, CD BMA 052).
«Каляды» (збор аўтэнтыкі Юрыя Выдронка, 2005, CD BMA 060).
«Камэлот» — «У краіне талераў» (1995, перавыд. 2004, CD BMA 038).
Кася & «Новае неба» — «Акустыка» (2005, CD BMA 063).
«Крама» — «Vodka On Ice» (1993, перавыд. 2003, CD BMA 026).
«Крама» — «Наваполацак'96» (2004, CD BMA 033).
«Крама» — «Хавайся ў бульбу» (2001, сумесна з «Bulba Records», CD BMA 010).
Легенды Вялікага Княства (зборнік, 2000, CD BMA 004).
Легенды Вялікага Княства 2 (зборнік, 2005, CD BMA 051).
«Ліцьвіны» — «Галуб на чарэшні, галубка на вішні» (1992, перавыд. 2002 сумесна з «Limas», CD BMA 016).
«Ліцьвіны» — «Неба і зямля» (1994, перавыд. 2004 сумесна з «Limas», CD BMA 046).
«Ліцьвіны» — «5 Сакавіка» (1996, перавыд. 2004 сумесна з «Limas», CD BMA 047).
Манюшка Станіслаў — «Песьні з-над Нёмна й Дзьвіны» (2004, CD BMA 043).
«Мроя» — «28-ая зорка!» (перавыд. 2006, CD BMA 082).
«Мясцовы час» — «Мой дом»/«Ускраіна» (1989–90, сумесна з «Prynamsi Records», перавыд. 2005, CD BMA 069).
«Мясцовы час» — «Слота/Халі-Галі» (1988-99, перавыд. 2006, CD BMA 080).
«Народны альбом» (супольны праект 1997, перавыд. 2003, CD BMA 024).
«Нейро Дюбель» — «П.И.О.Т.К.У.К.У.К.» (2002, CD BMA 011).

«Новае неба» — «Мая краіна» (2006, CD BMA 084).
Новік-Пяюн Сяргей — «Зорачкі» (2006, CD BMA 078).
«Палац» — «Folk Modern» (1995, перавыд. 2005, CD BMA 062).
«Палац» & dj Ray Хвісевіч — «Палац танчыць» (2001, перавыд. 2003, CD BMA 025).
«Пасадзіў DEAD RAPку/Rap Not Dead» (зборнік, 2004, CD BMA 029).
«Піўны альбом» (супольны праект, 2004, CD BMA 050).
Равенскі Мікола — «Магутны Божа» (2001, CD BMA 009).
«Стары Ольса» — «Гераічны эпас» (2006, CD BMA 071).
«Стары Ольса» — «Скарбы ліцьвінаў» (2CD, 2004, CD BMA 049 S).
«Стары Ольса» — «Шлях» (2003, CD BMA 021).
«Століншчына» (экспедыцыя Івана Кірчука, 2005, CD BMA 057).
«Сьвяты вечар 2000» (1999, перавыд. 2003, CD BMA 022).
«Сэрца Эўропы In Rock» (зборнік, 2001, CD BMA 007).
Сяржук Сокалаў-Воюш — «Нефармальны беларус» (2001, CD BMA 006).
Сяржук Трухановіч — «Нараджэньне таямніцы» (2003, CD BMA 015).
«Тарпач» — «Усё будзе...» (2005, CD BMA 059).
«Троіца» — «Troitsa» (1998, перавыд. 2004, CD BMA 040).
Цярэшчанка Вальжына — «Хтось кранууўся крылаў» (2003, CD BMA 023).
Шалкевіч Віктар — «Баляды й рамансы» (1998, перавыд. 2006, CD BMA 077).
Шалкевіч Віктар — «Гарадзенец прызямліўся ў Менску» (Live, 2006, CD BMA 073).
Шалкевіч Віктар — «Добрай раніцы» (2002, CD BMA 012).
Шалкевіч Віктар — «Смутны беларускі блюз» (1996, перавыд. 2006, CD BMA 076).
«Я люблю ліцэй: веру ў цябе!» (супольны праект 2004, CD BMA 031).
«Я нарадзіўся тут» (супольны праект 1999, перавыд. 2003, CD BMA 027).
«B.N.» — «Жыве рок-н-рол!» (2006, CD BMA 081).
«B.N.» — «Не трывай!» (2003, сумесна з «Prynamsi Records», CD BMA 028).
«Deadmarsh» — «Грані» (2003, сумесна з «DeathBell Prd.», CD BMA 019).
«Guda» — «Ігры багоў» (2005, CD BMA 053).
«Hard Life — Heavy Music I» (зборнік, 2001, CD BMA 008).
«Hard Life — Heavy Music II» (зборнік, 2003, CD BMA 018).
«Hard Life — Heavy Music III» (зборнік, 2004, CD BMA 048
«Hardcoreманія: чаду!» (зборнік, 2002, CD BMA 013).
«Imprudence» — «Road To Nowhere» (2005, CD BMA 056).
«Indiga» — «Дні» (2004, CD BMA 039).
«Indiga» — «Заенька» (2006, EP, CD BMA 070).
«Kriwi» — «Hej loli» (1996, перавыд. 2005, CD BMA 061).
«Osimira» — «Прошча» (2004, CD BMA 042).
«P.L.A.N.» — «Piosenki samotnego licwina»/»Znić nadziei» (2005, CD BMA 067).
«P.L.A.N.» — «Вялікае калі ласка» (2004, CD BMA 045).
«Partyzone» — «Сьмерці няма» (2005, CD BMA 058).
«Partyzone» — «Трэба рабіць» (2002, сумесна з «Prynamsi Records», CD BMA 014).
«Postscriptum» — «Вандроўка» (2005, CD BMA 054).
«ULIS» — «Краіна доўгай белай хмары» (1990, перавыд. 2004, CD BMA 035).
«ULIS» — «Танцы на даху» (1993, перавыд. 2004, CD BMA 036).
«ULIS» — «Чужаніца» (1989, перавыд. 2004, CD BMA 034).
«Ur'ia» — «Весначуха» (2000, перавыд. 2004, CD BMA 032).
«Ur'ia» — «Калі чакра» (2006, CD BMA 072).
«Ur'ia» — «Рай коню» (2007).
«Viza Незалежнай Рэспублікі Мроя» (2003, трыб'ют «N.R.M.», CD BMA 020).

«Yar» — «Вясна красна» (2005, CD BMA 044).
«ZigZag» — «Bionic@» (2005, CD BMA 055).
«Znich» — «Запаветы апошняга старца» (2003, CD BMA 017).
«Znich» — «Язычнік я» (1997, перавыд. 2004, CD BMA 041).
«Zygimont Vaza» — «Distortion» (2007).

# Каталог выданняў «Ковчег»

Агінскі Міхал Клеафас — «Паланезы» (2006).
«Алегриас» — «Вечерняя самба» (2000).
«Алмазный фронт» — «Жизнь в городе без моря» (1999).
«Аляксандра і Канстанцін» — «За ліхімі за марозамі» (2001).
Андэрсен Г.Х. — «Гадкий утёнок», «Соловей». Чытае А. Вечар.
Андэрсен Г.Х. — «Стойкі алавяны салдацік. Інсцэніроўка».
Аркестр п/к В. Сарокі — «Канцэрты ў Францыі».
Асімовіч Дзяніс — «П'есы для гітары».
Асмалоўскі Барыс — «Музыка солнца».
Атаманаў Алег — Песні Марыны Марозавай на вершы А. Кальцова.
«Атоми» — «Язык стволов».
Атрашкевіч Алена — «Лодка детства». Песни.
Бандарэнка Андрэй — Православные песнопения.
Баравы Фёдар — «Нет меня без тебя». Песні на вершы Ф. Баравога выконваюць І. Афанасьева, В. Дайнэка, Л. Лют і інш.
Баянава Ала — «Я песне душу отдала».
Беларуская гітарная музыка:
- вып. 1. В. Жывалеўскі, Я. Грыдзюшка, ансамбль «Класік-Авангард».
- вып. 2. Д. Асімовіч. П'есы вядомых кампазітараў.

Беларуская музычная літаратура. Фонахрэстаматыя, вып. 1–5 (сумесна з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь).
Беларуская сімфанічная музыка, вып. 1. Творы Я. Паплаўскага, Г. Гарэлавай, У. Дамарацкага.
Беларуская фартэпіянная музыка, вып. 1. Барыс Бергер.
Беларускія народныя казкі.
Беларуская хіт-калекцыя:
- вып. 1. «Гарачыя танцы». Танцавальныя шлягеры ў выкананні І. Афанасьевай, А. Саладухі, А. Елісеенкава, груп «Ляпис Трубецкой», «Rouble Zone», «New Jack Citi» і інш.
- вып. 2. «Душевные песни». Эстрадныя хіты ў выкананні А. Саладухі, А. Елісеенкава, Дз. Смольскага, Н. Мікуліч, В. Дайнэкі і інш.

Беларускі джаз, серыя:
- вып. 1. Дыксіленд «Рэнесанс» (1994).
- вып. 2. Ігар Сафонаў, «Misty» (1996).
- вып. 3. Група «Apple Tea», «Пчаліны танец» (1996).

«Белорусские Песняры» — «Только с тобой» (1999).
«Белорусский диксиленд». 1969–1988 (2004).
Блаженный Вениамин — «Стихи разных лет».

«Бонда» — «Анталогія» (1999).
«Бонда» — «Лепшыя песні» (1999).
Браты Хлестаковы — «40 миль плохой дороги».
«Будзьце аптымістамі…». Канцэрт у Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў 4.06.1996 г. з удзелам гуртоў «Новае неба», «Палац», «N.R.M.», «Ляпис Трубецкой» (1996).
«БУМ-БАМ-ЛІТ» — «Тазікі. Тэксты».
«Бяседа» — «Спявай, душа народная».
«Бяседа» — «Чарка на пасашок».
Вайнштэйн Авенір — «Чистосердечное призвание».
Вайханскі Юрый — «О тебе».
Вайханскія Галіна, Барыс, Юрый — «Анинские ночи».
Вайханскія Галіна, Барыс, Юрый — «Не говори мне ничего».
Вайханскія Галіна, Барыс, Юрый і Каця — «Сакура» (1997).
Вайцюшкевіч Зміцер — «Цацачная крама» (2001).
Валодзін Міхаіл — «Прощай, Неаполь».
«Воображаемые люди» — «Выход в небо» (2000).
Вуячыч Віктар — «Адрес моей любви».
«Галерея снов» — «Мечта по заказу».
Гарына Зоя — «Улыбка Луны» (1999).
Гарэлава Галіна — «Два зимних эстампа». Музыка для гитары (2007).
Гауф В. — «Каліф-бусел». Інсцэніроўка.
«Гиля ромен». Цыганские песни.
«Глас». Хоровое пение.
Глёбус Адам — «Песьні» (2004).
«Глюки» — «Humanoid» (кастр. 2007).
«Грымата» — «Люблю наш край».
«Грымата».
Грыцкевіч Усевалад — «Свіцязянка». Сюіта на вершы А. Міцкевіча.
Данская Паліна — «Всё решено» (2006).
Дарафеева Ірына — «Рэдкі госць» (1999).
Дзіцячы хор «Алые паруса».
Дзяржаўны акадэмічны аркестр Беларускай філармоніі, дыр. П. Вандзілоўскі — Л. Бетховен. Канцэрт для скрыпкі і аркестру рэ мажор.
Дзяржаўны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча — «Звонкія галасы Беларусі».
Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь — «Інструментальная музыка».
Дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь, маст. кіраўнік Ігар Мацюхоў:
«Отче наш».
«Магутны божа».
Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі п/к М. Фінберга:
«Джазавы канцэрт» (1997).
«Пад родным небам». Песні Э. Зарыцкага на вершы Н. Гілевіча.
«Песні Ігара Лучанка».
«Рок-н-рол».
Длускі Анатоль — «Исповедь» (2001).
Длускі Анатоль — «Только этого мало…» (1997).
Елісеенкаў Алег, Цыбін Юрый — «Любовь и небо». Песни и стихи. Спяваюць А. Елісеенкаў, А. Саладуха, чытае Ю. Цыбін.

Залаты фонд беларускага рок-н-ролу:

вып. 1. «Бонда», «Уліс», «Мроя», «Рэй», «Мясцовы час», «Блізняты» (1996).

вып. 2. «Бонда», «Уліс», «Мроя», «Мясцовы час», «Тутэйшыя хлопцы», «Крама», «Новае неба» (1996).

вып. 3. «Золотая середина», «Отражение», Алексей Шедько и «Доктор Моро», «Гранит», «Метро», «Сузор'е», «Зартипо» (1996).

вып. 4. «Палац», «Уліс», «Крама», «Новае неба», «Мроя» (1996).

вып. 5. «Инспектор», «Zindan», «Flat», «Red Dynamite», «Why Not» (1996).

Загумёнаў Ігар — «Тры расейскія літары» (ліпень 2007).

Залеская Вольга — «Гадание на зеркале» (1997).

Залеская Вольга — «Гадание на яблоке» (1996).

«Зімняй прыцягі танга». Песні на вершы Валянціны Аколавай.

«Зорная ростань». Маладыя эстрадныя выканаўцы — лаўрэаты тэлефестывалю «Зорная ростань» (Сумесна з Нацыянальнай тэлерадыёкампаніяй).

Івашын Макс — «Песенки пожилого гоблина» (1997).

«Іграй, гармонік» — розныя выканаўцы (1997).

Каваліў В. — «Мир ненаписанных картин».

Казанцава Алена — «Белоснежка» (1996).

Казанцава Алена — «Ненаглядная ты моя». Стихи и песни.

«Калядныя песні». Розныя выканаўцы (1997).

Камерны аркестр Рэспублікі Беларусь — XVI Международный фестиваль музыки в Полоцке, 2002 г. И.-С. Бах, А. Вивальди.

Камоцкая Кася і «Новае неба» — «Лепшае» (1999, 2006).

Капэла хлопчыкаў п/к У. Глушакова (1996).

Кароткіна Ганна — кантата «Стих покаянный», «Молитва во скорби».

«Князь Мышкин» — «Вальсики» (1995).

«Князь Мышкин» — «Горячий финский зартипос» (1998).

«Князь Мышкин» — «Жеко» (1995).

«Крама» — «Гэй, там, налівай» (1994).

«Крама» — «Камэндант» (1995).

«Крама» — «Лепшыя песні» (1995).

«Крама» — «Хворы на рок-н-рол» (1993).

«Крама» — «Што дапаможа нам» (1998).

«Крупіцкія музыкі» — «Дадарэньку-гаспадэньку».

Крымер Алег — Фартэпіянная музыка, вып. 1.

Крымер Алег — Фартэпіянная музыка, вып. 2.

«Крэсіва» — «Голас душы».

Кузьміцкі Ігар — «Возвращаясь домой». Пьесы для гитары.

«Купалінка» — «Зорка Венера».

«Купалінка» (1997).

«Купалінка» (1998).

Лепшыя песенныя нумары Беларускага КВЗ.

«Лесвіца ў нябёсы». Фантазія па матывах музыкі «Лед Зепелін», Роберта Планта і Рычарда Баха.

«Летарпия» — «С этой стороны Луны».

Лойкі Сафія і Алесь — «Made in Belarus».

Лучанок Ігар — «Зачарованая мая». Розныя выканаўцы.

Лучанок Ігар — «Спадчына». Розныя выканаўцы.

Лучанок Ігар і ансамбль «Сябры».

Лучанок Ігар, «Песняры» — «Гусляр».
«Люблю цябе, Белая Русь». Песні на вершы Уладзіміра Карызны.
Макарава Анжэла — «Не плач, маладзіца».
«Максім» — Палівода Ігар, Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі п/к М. Фінберга (перавыд. CD 2005).
«Маладыя галасы Беларусі». П. Смолава, А. Шумак, А. Край, В. Змуршчык, І. Буслай і інш.
Маркаў Іван і «Little Blues Band» (1998).
Марозава Марына — «Ностальгия». Пьесы для кларнета и фортепиано.
Марозава Марына на вершы Таццяны Мушынскай — «Тихо музыка в дом мой вошла».
Мерман Марк — «Торонто и т.д» (1996).
Мікуліч Надзея — «Ах, любовь моя» (2006).
Мікуліч Надзея — «В саду вселенной».
Мікуліч Надзея — «Тем, кто любит».
Мікуліч Надзея — «Я — артыстка».
Мінскі брас-квінтэт — «От Баха до «Битлз».
Мінскі квартэт кларнетаў.
«Мроя». Песні з альбомаў 1988–1990 гг. (1992).
«Музыка дынастыі Агінскіх» (2006).
«Музыка солнца». Песни на стихи Б. Осмоловского.
Музычная гасцёўня:
вып. 1. «Народная музыка» — ансамблі «Купалінка», «Свята», «Харошкі» і Дзяржаўны ансамбль танца п/к В. Дудкевіча (1997).
вып. 3. «За маладых» — «Палац», «Сваякі», «Янка», «Свята» і інш. (1997).
«Мясцовы час» — «Наша ўскраіна» (1991).
«На вуліцы гармонь іграе». Ансамблі «Вяселле», «Свята» і Міхась Пацук.
Навуменка Якаў — «Кружева сирени» (2006).
Навуменка Якаў — «Сіні сон».
«Народны альбом» (1997).
Народны ансамбль народных інструментаў выкладчыкаў ММВ (1999).
Народны ансамбль народных інструментаў п/к Я. Валасюка.
Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Беларусі імя І. Жыновіча, гал. дырыжер Міхаіл Казінец.
«Наш талант и любовь — родной Беларуси». Н. Мікуліч, ансамбль «Сябры», Я. Навуменка, У. Правалінскі, У. Угольнік, ансамбль «Свята» і інш.
«Нейро дюбель» — «Ворсинки и катышки» (1999).
«Неруш» — Беларускія народныя песні і танцы.
«Неруш» — Беларускія народныя песні.
«Неруш» — Народныя песні розных рэгіёнаў Беларусі (1997).
«Несцерка». Народная музычная драма.
Несцярэнка Юрый — «Пиротехнические этюды» (кастрычнік 2007).
Несцярэнка Юрый — «Сьвята вялікіх дажджоў» (2006)
«Новае неба» — «Go Home» (1995).
«Новае неба» — «Выбранае» (1997).
«Новае неба» — «Дзеці чорнага гораду» (1991).
«Новае неба» — «Мая краіна» (1996).
«Новае неба». Песьні розных гадоў.
«Новае неба» — «Сон у трамваі» (1994).
«Новае неба» — «Цэпэліны» (1999).
Нябаба Лідзія. Романсы и песни.

Оркестр народных инструментов БГУ.
«Отчизна моя, тебе присягаю»: вып. 1., вып. 2., вып. 3.
«Палац». Лепшыя песні (2000).
«Пани Хида» — «Истории».
«Пани Хида» — «Рай для фей».
Паплаўскі Яўген — «Творы».
Пауль Лиссе — «Оглянись».
Паўлёнак Галіна — «Ave Maria».
Паўлёнак Галіна. Романсы русских композиторов.
Пацук Міхась — «Спевы».
Пацук Міхась і ансамбль «Вяселле».
Песні беларускіх бардаў. Ліза Лямбовіч, Алесь Гілевіч, Кася Камоцкая, Валерый Пазнякевіч, Лера Сом, Вальжына Цярэшчанка, Алесь Камоцкі, Сяржук Сокалаў-Воюш.
Песні на вершы Леаніда Пранчака:
«Галоўныя словы». Розныя выканаўцы (1999).
«Між Ню-Ёркам і Менскам». Розныя выканаўцы (2000).
«Пад зоркаю Пагоні». Розныя выканаўцы (1999).
«Пяшчота». Розныя выканаўцы (2000).
«Талака». Песні пра Беларусь. Розныя выканаўцы (1998).
«Цік-так ходзікі». Песні для дзяцей. Розныя выканаўцы (1999).
«Песняры» — «Песняры 2001».
«Радавод». Фальклорны ансамбль ЗАТ «Атлант».
«Рок после каникул». Канцэрт з удзелам груп «Уліс», «N.R.M.», «Крама», «Новае неба», «Flat», «Торнадо», «Rouble Zone», Аляксея Шадзько і Аркадзя Юшына.
«Рок супраць рэвалюцый». Канцэрт з удзелам груп «Новае неба», «Zindan», «Уліс», «Мроя», «Крама» (1994).
Сабераў Валерый. Композиция на стихи А. Галича.
Сабераў Валерый — «Сказки и басни о наших знакомых».
Салодкія Святлана і Уладзімір.
Сарокін Уладзімір — «Фестиваль» (1998).
«Свята». Народная музыка (1998).
Скорыкаў Мікалай — «Golden Hit» (1998).
Скорыкаў Мікалай — «The best».
Скрыган Ян. Творы для гітары.
«Сованарола» — «Шалые и опустошенные».
«Стары Ольса» — «Bip» (2001).
«Стары Ольса» — «Келіх кола» (2001).
Студнева Лілія — «Персияночка». Песни на стихи М. Цветаевой (1997).
Сурус Рыгор — «Однажды вечером». Эстрадные пьесы.
Сярых Валянціна — «Дзень-залацень».
Сярых Валянціна і дзіцячы ансамбль «Званочкі».
Тамашэвіч Іван — «И открылись очи у души».
«Танец поўні. Прагулка са Стынгам».
Театр эстрадного искусства «Колорит».
Тэатр гумару «Христофор» — «Третьим будешь?»
Тэатр гумару «Христофор» — «Хорошо сидим».
Угольнік Уладзімір — «Задушевный рок-н-ролл» (2005).
«Уліс» — «Live 1996» (1996).

«Уліс» — «Блуканьне» (1996).
«Уліс» — «Краіна доўгай белай хмары» (1991).
«Уліс» — «Падарожжа» (2000).
«Уліс» — «Па-над дахамі» (1995).
«Уліс» — «Ратуйце вашы душы» (1997).
«Уліс» — «Танцы на даху» (1993).
«Уліс» — «Чужаніца» (1990).
Філіпава М. — «Глазастая бессонница». Романсы на музыку М. Марозавай.
«Харошкі». Беларускі дзяржаўны харэаграфічны ансамбль.
Цесакоў Кім — «На игле времени».
«Чалавек, якому хацелася ўсяго». Памяці Фрэдзі Мэрк'юры.
«Чистый голос» — «На войне, как на войне».
«Чистый голос» — «Пой, славянская душа» (2000).
«Чистый голос» — «Рождение на небесах» (2000).
Чэрвоная Майя — «В гостях у инструментов симфонического оркестра».
Шадзько Аляксей — «По колено в небесах» (1996).
Эскін Аркадзь — «What's New?» (2005).
Яравы Якаў — «Годы, отданные песне».
Ясень Міхаіл — «Письмо из 45-го». Розныя выканаўцы.
«Allabama» — «Маруся».
«Collegium musicum» — «Жемчужины классической музыки».
Coostof Alex — «Chrosinclasticum Infundibulum».
«Dispoziya» — «Электронная музыка».
«Kriwi» — «Hei-Loli» (1995).
«Kriwi» — «За туманам» (1997).
«Kriwi» — «Людзям» (1999).
«Mojo Blues» — «Against The Destiny» (2004).
«Mojo Blues» — «I Gotta Move» (1999).
«Mojo Blues» — «Love Across the Ocean» (1998).
«N.R.M.» — «LaLaLaLa» (1995).
«N.R.M.» — «Акустычныя канцэрты канца XX-стагоддзя» (1999).
«N.R.M.» — «Одзірыдзідзіна» (1996).
«N.R.M.» — «Пашпарт грамадзяніна N.R.M.» (1998).
«N.R.M.» — «Самотнік» (2000).
«Postscriptum» — «Дом на синих холмах» (1997).
«Ravens» — «Mirror».
«Ravens» — «Reflection» (1999).
«Stokes» — «No Escape» (1999).
«Tornado» — «Apeman» (1997).
«ZET» — «З Новым годам!» (2003).
«Zindan» — «Лучшие песни» (1996).

# Каталог выданняў «West Records»

Агурбаш Анжаліка — «Правила любви» (красавік 2005).
Алеся — «О главном» (красавік 2005).
«Аляксандра і Канстанцін» — «Автономная навигация» (студзень 2006).
«Аляксандра і Канстанцін» — «Мой Галілей». Лепшае (ліпень 2004).
«Анонимка» — «Анонимка» (травень 2006).
Атморави — «Романтика» (кастрычнік 2006).
Барабаншчыкава Вольга — «Дорога в небо» (верасень 2006).
Барабаншчыкава Вольга — «Не поверю» (максі-сінгл, травень 2005).
БДА «Песняры» — «Распавядальная» (верасень 2007).
Вайцюшкевіч Зміцер — «MW» (ліпень 2005).
Вайцюшкевіч Зміцер — «Лірыка» (лістапад 2007).
Вайцюшкевіч Зміцер — «Месяц і Сонца» (верасень 2005).
Вайцюшкевіч Зміцер — «Паравоз каханьня» (снежань 2004).
Вайцюшкевіч Зміцер — «Песьні з доўгай шуфляды. Нявыдадзенае» (верасень 2006).
Вайцюшкевіч Зміцер — «Танга з ружай» (люты 2006).
Дарафеева Ірына — «Каханачка» (снежань 2004).
Зборнік «БРАТ INFO №1» (лістапад 2005).
Зборнік «Золотая 20-ка. Весна 2006» (сакавік 2006).
Зборнік «Золотая 20-ка. Зима 2006» (лістапад 2005).
Зборнік «Золотая 20-ка. Зима 2007» (снежань 2006).
Зборнік «На перекрестках Европы» (снежань 2004).
Зборнік «Прэм'ер Тузін 2005» (верасень 2005).
Зборнік «Прэм'ер Тузін 2006» (лістапад 2006).
Зборнік «Рок за бобров 2005» (травень 2006).
Зборнік «Шедевры вокальной классики в исполнении лучших голосов Беларуси» (верасень 2006).
«Йо-Йо» — «Давай дружить» (кастрычнік 2007).
«Клёндайк» — «Разное время» (травень 2007).
«Клёндайк» — «Я знаю» (люты 2006).
«Крама» — «Будзь разам з намі. The Best» (красавік 2005).
«Крамбамбуля» — «Radio Крамбамбуля 0,33 FM» (снежань 2004).
«Крок» — «KROK» (травень 2006).
«Куклы» — «SankiCrew» (травень 2004).
«Куклы» — «Дисциплина Хаоса» (верасень 2005).
«Лекарство от меланхолии» — «Ломтик манго» (люты 2007).
«Лекарство от меланхолии» — «Прости-прощай» (снежань 2004).
«Ляпис Трубецкой» — «Золотые яйцы» (красавік 2004).
«Нейро дюбель» — «Stasi» (снежань 2007).
«Нестандартный вариант» — «Не как все...» (люты 2004).
«Неумолкаемые» — «Пойдем с нами» (студзень 2006).
«Новый Иерусалим» — «Неба осколки» (перавыд., студзень 2005).
«Новый Иерусалим» — «Я подарю тебе» (максі-сінгл, красавік 2005).
«Песняры» — «Почему не ведаю» (травень 2004).

Плотнікава Вольга — «Где-то» (чэрвень 2005).
Плотнікава Вольга — «Так бывает» (лістапад 2007).
Софікс — «Музыка для размышлений» (лістапад 2005).
«Стары Ольса» — «Сярэднявечная дыскатэка» (чэрвень 2005).
Сухараў Аляксандр — «Меня зовут Экивоки» (чэрвень 2006).
«Тяни-Толкай» — «3000 шагов». Баллады (люты 2005).
«Тяни-Толкай» — «Как же долго я тебя искал» (лістапад 2006).
Хлястоў Аляксей — «Ворваться в небо» (максі-сінгл, красавік 2005).
Хлястоў Аляксей — «Потому что я люблю» (снежань 2006).
Шадзько Аляксей — «Деликатесы» (сакавік 2004).
Ядвіга Паплаўская–Аляксандр Ціхановіч — «Давай сегодня встретимся» (травень 2005).
«Atlantica» — «Atlantica» (ліпень 2004).
«Atlantica» — «Heavenly» (люты 2005).
«Atlantica» — «Urbanoid» (люты 2007).
«beZbileta» — «Кино» (травень 2007).
«CherryVata» — «Где!?» (ліпень 2006).
DJ Boston — «DJ Boston feat. Ellen Mendonza» (красавік 2006).
DJ Школьник — «Back To The Old School vol. 9» (лістапад 2005).
«Drum Ecstasy» — «Drum Ecstasy» (травень 2004).
«Drum Ecstasy» — «Drums Only» (кастрычнік 2004).
«Drum Ecstasy» — «H.D.M.» (снежань 2005).
«Garadzkiya» — «Garadzkiya» (перавыд. 2003, верасень 2005).
«IQ48» — «Вар'яты» (люты 2005).
«J:морс» — «Адлегласць» (лістапад 2007).
«J:морс» — «Апрель» (красавік 2005, перавыд. красавік 2006).
«J:морс» — «Босиком по мостовой» (кастрычнік 2006).
«J:морс» — «Ледоколы Live» (красавік 2007).
«J:морс» — «Мое Солнце» (кастрычнік 2005).
«J:морс» — «Монтевидео» (сакавік 2004).
«Jitters»/«Hair Peace Salon» — «Split Before, Together Now» (кастрычнік 2007).
«Manzhura» — «Это серьезно» (максі-сінгл, сакавік 2006).
«N.R.M.» — «LaLaLaLa» (перавыд., студзень 2007).
«N.R.M.» — «Spravazdaca 1994-2004» (красавік 2004).
«N.R.M.» — «Тры чарапахі» (чэрвень 2005).
«Naka» — «Тебе» (лістапад 2005).
«Neo» і сімфанічны аркестр — «Дикая охота. Mixt» (травень 2005).
«Zet» — «З новым годам!» (жнівень 2004).

# Каталог выданняў «Vigma»

Абасава Гюнэш — «Гюнэш» (2006).
Барткевіч Леанід — «Аксамітны вечар» (2004).
Барткевіч Леанід — «Березовый сок» (2004).
Барткевіч Леанід — «Мой родны кут» (2004).
Барткевіч Леанід — MP3 (тры альбомы і «Не во сне ли», 2005).

«Белорусские Песняры» — «Любимые песни.RU» (2005).
«Верасы» — «Популярные песни прошлых лет» (1996).
Відава Ірына — «Любовь сказала Да!» (2006).
«Гитара электро-классик». Розныя выканаўцы (1996).
«Замова». Песні на вершы У. Някляева (1996).
Кавалёў Сяргей — «Точка by» (люты 2007).
«КаСлука ДаКавалёв» — «На потом» (1997).
«Леприконсы» — «Без даты» (красавік 2007).
«Ляпис Трубецкой» — «Капитал» (травень 2007).
«Нейро дюбель» — 2CD MP3 (2006).
«Первый Интернационал». Розныя выканаўцы. (2006).
«Песни из мультфильмов». Розныя выканаўцы (2006).
«Песняры» — «Золотой диск» (зборнік, 2005).
«Ренессанс гитары». Розныя выканаўцы (1999).
«Романтическая гитара». Пьесы и аранжировки для гитары. Международный фестиваль «Ренессанс гитары». Розныя выканаўцы (2003).
Саладуха Аляксандр — «Сотни километров до любви» (2005).
Саладуха Аляксандр — «Здравствуй, чужая милая» (1996).
Саладуха Аляксандр — «Лучшие песни» (2003).
Саладуха Аляксандр — «Любить тебя, родная» (2006).
Слука Кірыла — «Взрослый» (2005).
Смолава Паліна — «Smile» (2005).
Смолава Паліна — «Сад одиночества» (2006).
«Харлі» — «Родныя мясціны» (2004).
«B.N.» — «Не трывай» (2003).
«Flat» — MC «Street Boogie» (1997).

# Каталог выданняў «Новая музыкальная компания»

Беларускія казкі, выд. 1. Чытае Алег Хаменка.
Беларускія казкі, выд. 2. Чытае Алег Хаменка.
Беларускія казкі, выд. 3. Чытае Алег Хаменка.
«Вірус ліха» — «Жизнь бьет ключом» (2006).
Даўкш Дзмітрый — «The Best» (2005).
Дацкевіч Вячаслаў — «My Love For You».
Дацкевіч Вячаслаў — «Музыка из французского кино и не только…»
«Дрозды» — «Прилетели» (2006).
Морган Андрэй — «Чужая жена».
«Нагуаль» — «У земли под юбкой» (2005).
«Нейро дюбель» — «Умные вещи», 2CD.
«Палац» — «Дарожка».
«Палац» — «Сьвяточны» (2003).
«Палац» — «Чужыя дзеўкі» (2001).
«Пару рублей» — «Трезвый расчет» (2006).

«Реггей восточных славян», выд. 1. Розныя выканаўцы (2005).
Смолава Паліна — «Сад одиночества» (2006).
«Харлі» — «Любовь — имя твоё» (травень 2007).
Ялфімаў Пётр — «Я хочу» (2006).
Oleg Spitsyn & Chermen — «Drive» (2007).
«Svet Boogie Band» — «Nothing But Love» (2005).

# Анкета для асоб

1. Прозвішча, імя (рас., бел., англ.)
2. Дзень, месяц, год і месца нараджэння (даты жыцця)
3. Адукацыя (што і калі скончыў, па якім класе/спецыяльнасці)
4. Творчы шлях (асноўныя этапы, па гадах)
5. Найбольш вядомыя творы (для кампазітараў і паэтаў, аранжавальнікаў; прадзюсэры і менеджэры — праекты і выканаўцы; гукарэжысёры — калектывы, альбомы; для журналістаў — аўтарскія праграмы, друкаваныя органы і г.д.)
6. Удзел у фестывалях, гастролі
7. Узнагароды (музычныя, ганаровых званняў не згадваць)
8. Дыскаграфія
9. Кіно, відэа (назва кліпу, рэжысёр, год)
10. Іншая карысная інфармацыя
11. Кантакт (па жаданні: e-mail, тэлефон, Інтэрнэт і г.д.)

Подпіс, дата запаўнення, кантактныя тэлефоны/мэйлы

# Анкета для калектываў

1. Час утварэння, назва, першы склад
2. Стыль, якога прытрымліваецца група
3. Змены ў складзе (цягам гадоў, назваць найбольш вядомых музыкаў)
4. Склад на момант запаўнення анкеты
5. Удзел у фестывалях, гастролі
6. Музычныя ўзнагароды
7. Дыскаграфія (назва альбому/сінглу, фірма-выдавец, год)
8. Кіно, відэа (назва кліпу, рэжысёр, год)
9. Кантакт (па жаданні: e-mail, тэлефон, Інтэрнэт і г.д.)

Подпіс, дата запаўнення, кантактныя тэлефоны/мэйлы

# Змест

*Прадмова* — *3*

*Умоўныя скарачэнні* — *6*

**А** (A) — **7**
**Б** (B) — **30**
**В** (V, W) — **51**
**Г** (G) — **72**
**Д** (D, J) — **84**
**Е** (E) — **104**
**Ж** (Zy) — **106**
**З** (Z) — **108**
**І** (I) — **119**
**К** (K, C) — **123**
**Л** (L) — **157**
**М** (M) — **171**
**Н** (N) — **198**
**О** (O) — **215**
**П** (P) — **219**
**Р** (R) — **249**
**С** (S) — **259**
**Т** (T) — **296**
**У** (U) — **308**
**Ф** (F) — **313**
**Х** (H) — **316**
**Ц** — **324**
**Ч** (Ch) — **328**
**Ш** — **333**
**Ы** — **342**
**Э** — **343**
**Ю** (U) — **347**
**Я** (Ya) — **350**

**ДАДАТКІ**

*Каталог выданняў «БМAgroup»* — *355*
*Каталог выданняў «Ковчег»* — *357*
*Каталог выданняў «West Records»* — *363*
*Каталог выданняў «Vigma»* — *364*
*Каталог выданняў «Новая музыкальная компания»* — *365*
*Анкета для асоб* — *366*
*Анкета для калектываў* — *366*

*Даведачнае выданне*

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ
## беларускай папулярнай музыкі

Рэдактар *Дзмітрый Падбярэзскі*
Макет *Наталлі Канаш*
Карэктар *Антаніна Хатэнка*

Падпісана да друку 21.04.2008. Фармат 60x90 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Letterica. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 23. Ул.-выд. арк. 20,6+3,8.
Наклад 2000 асобнікаў. Замова 2347.

Выдавец Зміцер Колас.
ЛИ 02330/0133412 ад 14.10.2004.
220023, Мінск, пр. Незалежнасці, 105–14.

Надрукавана з арыгіналу-макету заказчыка
на Мінскай фабрыцы каляровага друку.
ЛП 02330/0056853 ад 30.04.2004.
220115, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.



# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ беларускай папулярнай МУЗЫКІ

Гэтая кніга — першая ў гісторыі Беларусі спроба сабраць пад адной вокладкай інфармацыю пра асоб і калектывы, якія ў той ці іншай меры засведчылі сябе ў розных стылях і напрамках таго, што можна лічыць папулярнай музыкай. Даведнік, зроблены адпаведна стандартам зборнікаў «Хто ёсць хто», змяшчае інфармацыю пра творчы і жыццёвы шлях выканаўцаў, кампазітараў, паэтаў, прадзюсэраў, кліп-мэйкераў, гукарэжысёраў, выдаўцоў і іншых прадстаўнікоў папулярнай сцэны краіны, а таксама тых, хто нарадзіўся ў Беларусі і працуе цяпер па-за яе межамі.

ISBN 978-985-6783-42-8

9 789856 783428 >

ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ беларускай папулярнай МУЗЫКІ